# Першацвет Адраджэння



Хай жыве для славы вечнай
Край наш родны — Беларусь!

А. Мілюць.

# ПЕРШАЦВЕТ АДРАДЖЭННЯ



Вучэбны дапаможнік
па беларускай літаратуры
для старэйшых класаў сярэдняй школы

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі і навукі*
*Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
«НАРОДНАЯ АСВЕТА»
1995

ББК 83.3(4Беи)я721
П 27
УДК 882.6.09(075.3)

Складальнікі:
М. А. Федасеенка, Т. П. Прохарава, Г. М. Разанава,
Г В. Марчук, Э. В. Садаўнічы, А. С. Новікава.

**Першацвет адраджэння:** Вучэб. дапам. па беларус. літ. для ст. кл. сярэд. шк./Склад. М. А. Федасеенка, Т. П. Прохарава, Г. М. Разанава і інш.— Мн.: Нар. асвета, 1995.—511 с.
П27
ISBN 985-03-0216-X.

П $\frac{8820600900-003}{М 303(03)-95}$ 162—95

ББК 83.3(4Беи)я721

ISBN 985-03-0216-X

© Складанне М. А. Федасеенка, Т П. Прохарава, Г М. Разанава, Г В. Марчук Э В Садаўнічы, А С. Новікава, 1995

# ВЯРТАННЕ ДА КРЫНІЦ

Мы ўзышлі не з насення, што ветрам занесена,
Мы не з дзікай травы самарослыя парасткі.
У глыбінях зямлі, гераічнай і песеннай,
Нашых душ карані — з вузлякамі упартасці.
Каліноўскі дарэшты пазбавіў нас кволасці —
Веру-мужнасць сваю завяшчаў нам з-пад вісельні.
З гнеўнай лірай Купалы і з эпасам Коласа
Мы спазналі сябе і свой голас узвысілі...

*Ніл Гілевіч.* Лірычны каментар да нашага радаслоўя.

У наш век, сумна знакаміты замоўчваннем адных гістарычных фактаў і фальсіфікацыяй другіх, адзіная магчымасць далучыцца да праўды, да сапраўднай гісторыі нацыі — вяртанне да вытокаў, да нашых крыніц. Мы запрашаем вучняў-старшакласнікаў, заўтрашніх абітурыентаў, студэнтаў, бакалаўраў да знаёмства з цікавейшымі старонкамі духоўнай спадчыны беларусаў — тэкстамі літаратурных твораў, якія сведчаць пра багацце і самабытнасць нашай культуры, а таксама пра захаванне і плённае развіццё яе традыцый.

Прапанаваны дапаможнік для вучняў старэйшых класаў агульнаадукацыйных школ і іншых сярэдніх навучальных устаноў утрымлівае творы каля васьмідзесяці пісьменнікаў XIX — 30-х гадоў XX стагоддзя. На працягу многіх дзесяцігоддзяў не толькі вучні, але і большасць старэйшых чытачоў ведалі літаратуру гэтага амаль паўтарастагадовага перыяду літаральна па некалькіх імёнах — В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Багушэвіч, Цётка, М. Багдановіч, Я. Колас, Я. Купала... Акрамя твораў гэтых славутых аўтараў, уключаных у кнігу, вы аднымі з першых зможаце прачытаць таксама творы К. Лейкі і К. Каганца, Г. Леўчыка і В. Ластоўскага, А. Мрыя і Л. Калюгі, якія не толькі не вывучаліся ў школе, але амаль не выдаваліся і таму знаёмы толькі спецыялістам. Акрамя таго, вы атрымаеце і кароткія біяграфічныя звесткі пра аўтараў.

Пашырэнне і паглыбленне ведаў беларускай моладзі ў галіне мастацтва слова, бліжэйшае знаёмства з нацыянальнай літаратурай XIX стагоддзя, пачатку і 20—30-х гадоў XX стагоддзя ўяўляецца на сённяшні дзень вельмі важным, нават неабходным, таму што названыя перыяды

гісторыі беларускай літаратуры з'яўляюцца цэлымі культурнымі эпохамі.

Новая беларуская літаратура, якая дасягнула выдатных вышынь у XIX стагоддзі,— гэта літаратура глыбока народная, прасякнутая пафасам патрыятызму і чалавекалюбства. Яе выдатныя стваральнікі — Ф. Савіч, У. Сыракомля, В. Каратынскі, А. Абуховіч, Ф. Багушэвіч і многія іншыя паэты, пісьменнікі, вучоныя — былі не толькі таленавітымі літаратарамі, але і актыўнымі ўдзельнікамі літаратурна-грамадскага руху. Менавіта яны, нягледзячы на афіцыйную забарону ўсяго беларускага — мовы, літаратуры, нават назвы Беларусь,— уздымалі на новую вышыню вуснапаэтычную творчасць беларусаў, перадаючы яе хараство ў сваіх творах, узбагачалі нацыянальную мову, заклікалі народ да ўсведамлення нацыянальнай годнасці.

Пачатак XX стагоддзя, калі Беларусь спазнала шматлікія сацыяльныя буры, стаў для беларускай літаратуры перыядам выспявання яе ідэалаў, стварэння бліскучых шэдэўраў, якія заклалі падмурак нашай літаратурнай класікі. Да сённяшняга дня застаюцца неперاўзыдзенымі па сваіх мастацкіх вартасцях творы М. Багдановіча, Я. Коласа, Я. Купалы, М. Гарэцкага. Літаратуру гэтай пары часам называюць «нашаніўскай», падкрэсліваючы тым самым тую выключную ролю, якую адыграла ў яе развіцці газета «Наша ніва» (выходзіла ў Вільні ў 1906—1915 гг.). Гэтая газета была не проста друкаваным выданнем, яна стала цэнтрам беларускага культурнага і палітычнага адраджэння, літаратурна-грамадскага руху. Дзякуючы «Нашай ніве» не толькі ўбачылі свет многія творы класікаў нашай літаратуры (Я. Купалы, Я. Коласа, Ядвігіна Ш.), яна спрыяла фарміраванню светапогляду і творчасці М. Багдановіча, А. Гаруна, М. Гарэцкага, Я. Журбы. За вельмі кароткі адрэзак часу — з пачатку стагоддзя да 1917 года — беларускае мастацкае слова ўзбагацілася новымі імёнамі і новымі жанрамі (раман, санет, трыялет, раманс), што ўзвысіла яго да вяршыняў еўрапейскай і сусветнай культуры.

Перыяд 20—30-х гадоў — напэўна, найбольш супярэчлівы і таямнічы ў гісторыі беларускай літаратуры. Доўгі час разгадаць гэтую таямніцу было немагчыма з-за амаль поўнай адсутнасці літаратурнага матэрыялу: многія імёны, творы, факты замоўчваліся, забаранялася іх выданне і нават упамінанне. А гэта ж быў час адраджэння беларускасці, станаўлення маладой краіны і маладой літаратуры,

час пошукаў новых ідэй, барацьбы «старога з новым». Адсюль — незвычайнае багацце твораў, маладых талентаў, рознага роду літаратурных аб'яднанняў і груповак.

Побач з ужо вядомымі, сталымі пісьменнікамі (Я. Коласам, Я. Купалам, З. Бядулем, М. Гарэцкім) пачынаюць працаваць М. Зарэцкі, М. Чарот, К. Крапіва, Я. Пушча, У. Дубоўка і многія іншыя.

Асноўныя тэмы прозы і паэзіі 20—30-х гадоў — тэмы рэвалюцыі, новага жыцця — у кожнага з пісьменнікаў гучалі па-свойму. І гэта выразна адчувае чытач, пазнаёміўшыся хаця б з той невялікай часткай твораў, што змешчаны ў дапаможніку. Згодна са сваімі палітычнымі і эстэтычнымі поглядамі, літаратары таго часу ўжо ў пачатку 20-х гадоў гуртуюцца ў аб'яднанні. Самыя вядомыя і, безумоўна, найбольш значныя літаратурныя аб'яднанні 20—30-х гадоў — «Маладняк» і «Узвышша».

Маладнякоўцы аб'надаліся ў 1923 годзе і ў снежні пачалі выдаваць часопіс «Маладняк». У розны час членамі «Маладняка» пабывалі амаль усе маладыя празаікі і паэты — К. Чорны, У. Дубоўка, П. Галавач, С. Баранавых, А. Дудар, А. Вольны і многія іншыя. Літаратура «Маладняка» — яркі ўзор рэвалюцыйнай паэзіі, апяванне барацьбы за «новага чалавека», новае жыццё, непрынянцце ўсяго старога, традыцыйнага, дарэвалюцыйнага.

У 1926 годзе ўтварылася літаб'яднанне «Узвышша», куды ўвайшлі тыя пісьменнікі і паэты, якія «перараслі» юначую захопленасць «Маладняка» ідэямі змагання — К. Крапіва, Я. Пушча, П. Глебка, М. Лужанін. Пісьменнікі-ўзвышэнцы асноўную вартасць сваёй творчасці бачылі ў захаванні традыцый класічнай літаратуры, узвелічэнні народа-працаўніка, чалавека-стваральніка. Тая пазіцыя, на якой стаялі пісьменнікі — члены «Узвышша», разыходзілася з палітыкай і ідэалогіяй дзяржавы, таму ў 1931 годзе аб'яднанне было разагнана, многія яго ўдзельнікі трапілі ў турму, у ссылку (У. Дубоўка, А. Мрый, М. Лужанін, К. Чорны), а А. Бабарэка і Т. Кляшторны былі расстраляны.

Выдатныя ўзоры паэзіі былі створаны і ў Заходняй Беларусі. Магутны нацыянальны рух у гэтым рэгіёне атрымаў мастацкае асэнсаванне ў вершах В. Таўлая, М. Васілька, М. Машары. Адметнай з'явай стала паэзія Н. Арсенневай поўная лірыкі, тонкіх пачуццяў і прыгажосці; разнастайнасцю тэматыкі, філасофскай глыбінёй вызначаюцца надзвычай самабытныя вершы У. Жылкі, Л. Геніюш.

Здзіўляе не толькі тэматычная разнастайнасць твораў,

сабраных у гэтай кнізе,— глыбока ўражвае багацце вобразаў, маляўнічасць мовы. Вы знойдзеце тут міфалагічныя, фальклорныя матывы (вершы М. Багдановіча, А. Гаруна), рамантычную ўзнёсласць і рэвалюцыйны пафас (паэзія А. Дудара, М. Чарота), філасофскую заглыбленасць, элегічныя інтанацыі (творы У. Жылкі, А. Гаруна, У. Дубоўкі); вершы Н. Арсенневай: пейзажную лірыку, напісаную ў вельмі своеасаблівай, нетрадыцыйнай для тагачаснай беларускай паэзіі мяккай, «акварэльнай» манеры, якая дэманструе надзвычай высокую культуру верша. Акрамя таго, у вас ёсць магчымасць упэўніцца ў тым, што і ў тыя складаныя, трагічныя гады нашай літаратуры быў уласцівы сатырычны пафас. Пра гэта сведчаць багатыя на гумар, трапныя дэталі творы А. Мрыя, Л. Калюгі, К. Крапівы, актуальнасць якіх выразна адчуваецца і сёння.

Складальнікі хрэстаматыі ставілі перад сабой і яшчэ адну задачу — дапамагчы маладому чытачу адчуць адметнасць эпохі, «ужыцца» ў адпаведны літаратурны перыяд. Дзеля гэтага некаторыя творы (апавяданні В. Ластоўскага, А. Мрыя пададзены ў арыгінальным напісанні згодна з нормамі тагачаснага правапісу.

І можна бясконца доўга пералічваць імёны, назвы твораў, кніг, якія складаюць наш неацэнны скарб, нашу нацыянальную літаратуру. Спадзяёмся, што гэтая кніга, дзе сабрана невялікая, але вельмі цікавая і важная частка ўзораў беларускай слоўна-мастацкай творчасці, дапаможа вам зведаць яшчэ не пазнанае, зарыентавацца ў гісторыі нашага народа. І можа так стацца, што, прачытаўшы яе, вы,перафразуючы У. Караткевіча, з годнасцю скажаце: «Калі ёсць у народа такая літаратура — не загіне да веку народ!»

*Ізольда Ківель*

# ЯН ЧАЧОТ
## (1796—1847)

Ян Чачот з'яўляецца адным з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры і збіральнікам беларускага фальклору. У свой час хораша і вычарпальна сказаў пра яго паэт У. Сыракомля, вызначаючы месца і значэнне Чачота для развіцця беларускай культуры: ён першы «песціўся... з мовай і паэзіяй беларускага народа, сабраў яго песні, удала перакладаў іх вершам на польскую мову, выдаў іх у арыгінале, сам рабіў спробы пісаць песні на гэтай мове, сабраў народныя прыказкі і, зрабіўшы над мовай шмат трапных заўваг, заклаў першыя падваліны яе граматыкі». Народалюбства паэта, пільная ўвага да народнага жыцця і творчасці яскрава вытлумачваецца ўсім яго жыццёвым шляхам.

Паходзіў Ян Чачот з сям'і дробнай шляхты, бацька яго быў арандатарам. Нарадзіўся ён у засценку Малюшыцы Навагрудскага павета, скончыў дамініканскую школу ў Навагрудку, пасля вучыўся ў Віленскім універсітэце, дзе пасябраваў з Адамам Міцкевічам. Універсітэт Я. Чачоту так і не давялося скончыць, таму што прыходзілася перарываць вучобу, каб зарабіць на навучанне, а ў 1823 г. уладамі было выкрыта польскае нацыянальна-патрыятычнае студэнцкае таварыства філаматаў, і паэт, як адзін з яго кіраўнікоў, быў зняволены ў Віленскую турму, потым сасланы на Урал.

У літаральным перакладзе слова «філамат» азначае «аматар слова». Яшчэ яны сябе называлі «філарэтамі» — аматарамі мудрасці, прамяністымі. У памяці наступных пакаленняў паняцце «філамат» звычайна ўвасаблялася ў вобразе рамантычнага юнака, прагнага да навукі, палымянага патрыёта Айчыны, пасля — выгнанніка, пакутніка за свае высокія ідэалы. У зараджэнне, станаўленне новай беларускай літаратуры творчая дзейнасць філаматаў унесла значны ўклад.

Пасля вяртання на Беларусь у 1833 г. Ян Чачот, за-

рабляючы на жыццё, працуе ў розных месцах — сакратаром кіраўніцтва Бярэзінскага канала ў Лепелі, бібліятэкарам у графа Храптовіча ў Шчорсах. Увесь гэты час Чачот збірае беларускія народныя песні і прыказкі, складае слоўнік, займаецца апісаннем фанетычных асаблівасцей беларускай мовы, яе асноўных граматычных нормаў. У 1837—1846 гг. у Вільні выдае шэсць тамоў складзенай ім кнігі «Вясковыя песні з-пад Нёмана і Дзвіны, некаторыя прыказкі і ідыёмы». Гэта было першае па часе выданне беларускага фальклору. У кнізе ён змяшчае і каля 40 уласных твораў, стылізаваных пад народныя песні. У сваіх вершах ён выказвае шчырую любоў да мужыка, зычыць яму шчасця, дае дыдактычныя парады, навучаючы жыццю. Відавочна, што цікавасць Яна Чачота да беларускай мовы, да вуснай народнай творчасці, уся яго дзейнасць як вучонага-этнографа абумоўлена чуйным клопатам аб сацыяльных нізах грамадства, перш за ўсё — аб прыгонных сялянах, марай аб іх чалавечым жыцці, дабрабыце, культуры.

Памёр Ян Чачот у беднасці ў Друскеніках і пахаваны ў вёсцы Ротніца.

* * *

А мая ж ты кветачка,
А мая ж ты птушачка,
А мая ты зоранька,
А мая ты дзеванька,
Што ж мне, беднаму, рабіць,
Штоб з табою век свой жыць?

Калі будзеш гараваць,
Айца, матку шанаваць,
У свята да цэрквы хадзіць,
Па карчомках не блудзіць,
Мяне верненька любіць,
Век свой будзем разам жыць.

* * *

Поле, поле шырокае,
Неба, неба глыбокае!
Божа, ты наш вечны пане!
Прымі ад нас павітанне!

Уся зямля слонцам ззяе,
З ясным небам размаўляе,
Што ўсё гэта тваім дарам,
Што ты света гаспадарам.

З ясным небам і зямлёю,
Чолам мы перад табою!
З чыстым сэрцам і душою,
Чолам мы перад табою!

Благаславі твае дзеткі,
Працу нашу і палеткі,
Благаславі ўсе людзі,
Няхай усім добра будзе!

* * *

Калі ў зямлю зерне кінеш,
    Нясе табе зёран ста;
Як зарыеш ў зямлю грошы,
    Грошы табе паесць ржа.
Чаму ж багач гаршчок грошы
    У сыру зямлю закапаў?
Штоб паела ржа чырвонцы,
    Гаршчок грошай штоб прапаў.
Хто ведае, што смерць нясе:
    Ці гарачка, ці пярун?
Як не скажаш, то не найдзе
    Грошай тваіх сын-пястун.
Лепш бы купіць солі, мыла,
    Нарогаў, сярпоў і кос,
І штоб сынок для прадажы
    Ўсюды па сёлах павёз.
Меў бы і ты заработак,
    Ўсё б дома было ў нас;
Не ждалі б мы кварты солі,
    Нім пройдзе жыдом шабас.
Не ржавелі бы чырвонцы,
    Чорт не браў бы іх у зямлі;
Не быў бы ты бедны з грошмі,
    Ні бедны без грошай мы.

## ІГНАТ ЛЕГАТОВІЧ
## (1796—1867)

Ігнат Легатовіч нарадзіўся на Гродзеншчыне ў вёсцы Малая Капліца. Пасля заканчэння Віленскага універсітэта ў 1817 г. дваццаць два гады працаваў настаўнікам лацінскай мовы ў Мінскай гімназіі, затым — наглядчыкам павятовых вучылішчаў на Віцебшчыне. Апошнія два дзесяцігоддзі, страціўшы зрок, зноў жыў у Мінску. Вядома, што І. Легатовіч сябраваў з В. І. Дуніным-Марцінкевічам. Пісаў па-польску папулярныя ў свой час эпіграмы на дваран і чыноўнікаў, афарызмы, якія ўвайшлі ў кнігі «Эпіграмы» (1848) і «Апафтэгмы» (1854). У 1838 г. ён даслаў у альманах «Баян» пад назвай «Песенька на беларускай гаворцы» верш «Скажы, вяльможны пане...» па жанру і зместу блізкі да ананімных беларускіх гутарак першай паловы XIX ст. За публікацыю гэтага верша з непрыхаванай пагрозай прыгоннікам-панам цэнзура канфіскавала альманах, а выдаўцоў яго прыцягнула да адказнасці.

### СКАЖЫ, ВЯЛЬМОЖНЫ ПАНЕ...

— Скажы, вяльможны пане,
Што ў нашым будзе стане?
Бо мне нешта казалі,
Што вы няслушна давалі
У марцы подушнэго?
— А тобе, хлопе, цо до тэго?
— Праўда, што вы панамі
Пакуль жывіцё над намі...
Але што з таго будзе,
Калі станем на судзе?
Не скажаш, пане, тэго:
«Цо тобе, хлопе, до тэго?..»

## ВІНЦЭНТ ДУНІН-МАРЦІНКЕВІЧ
## (1808—1884)

В. Дунін-Марцінкевіч сваёй творчасцю на беларускай мове пэўным чынам абагульняе развіццё айчыннай літаратуры XIX ст. Ён з'яўляецца першым у новай беларускай літаратуры пісьменнікам, творчасць якога вылучаецца

шырынёй ахопу істотных з'яў рэчаіснасці, разнастайнасцю ў жанравых адносінах, узнімае здабыткі паэтычнага фальклору да літаратурнага мастацкага ўзроўню. Ён прызнаны першым класікам новай беларускай літаратуры.

Нарадзіўся В. Дунін-Марцінкевіч у фальварку Панюшкавічы Бабруйскага павета Мінскай губерні ў сям'і збяднелага шляхціца, дробнага арандатара. Скончыў Бабруйскую павятовую школу, вучыўся на медыцынскім факультэце — паводле супярэчлівых звестак — ці то Віленскага, ці то Пецярбургскага універсітэта. Яго навучанне там спыніла хвароба. У 30-я гады працаваў чыноўнікам у розных мінскіх установах. З 1840 г. яго пастаянным месцам жыхарства становіцца фальварак Люцінка ля Івянца. Але да паўстання 1863 г. ён часта жыве ў Мінску, дзе бярэ самы актыўны ўдзел у беларускім літаратурным, грамадска-культурным руху, будучы гарачым прыхільнікам нацыянальнай ідэі. У гэты час аб'ездзіў усю Беларусь. У 1864 г. трапляе ў Мінскую турму і знаходзіцца ў ёй пад следствам больш года. З-за адсутнасці доказных улік арганізацыі паўстання на Міншчыне В. Дуніна-Марцінкевіча з астрога адпраўляюць у Люцінку пад строгі жандарскі нагляд з забаронай выезду, а яго старэйшую дачку Караліну высылаюць у Сібір. Пахаваны В. Дунін-Марцінкевіч каля вёскі Падневічы паблізу шляху з Івянца ў Мінск.

Пры жыцці В. Дуніна-Марцінкевіча былі надрукаваны на беларускай мове чатыры вершаваныя зборнікі «Гапон», «Вечарніцы і Апантаны», «Цікавішся? Прачытай!», «Беларускі Дудар» (1855—1857 гг.). Многія яго творы ўпершыню ўбачылі свет толькі пасля 1917 г., а шмат з іх дасюль не адшуканы.

Самым ранні творам, дзе пісьменнікам быў створаны першы значны вобраз прыгоннага селяніна Навума Прыгаворкі з выразным нацыянальна адметным характарам, з'яўляецца лібрэта оперы «Сельская ідылія» (1846), напісанае для арганізаванага В. Дуніным-Марцінкевічам беларускага тэатра музычнай камедыі, у якім ён быў і драматургам, і кампазітарам, і рэжысёрам, і акцёрам, і спеваком.

У 50-я гады В. Дунін-Марцінкевіч напісаў шмат вершаваных аповесцей, якія маюць жанравыя рысы як паэм, так і эпічных твораў. Найбольш значнымі з іх па зместу, па глыбіні адлюстравання важнейшых бакоў

тагачаснага жыцця Беларусі і яе гісторыі з'яўляюцца «Гапон», «Вечарніцы» (1855), «Купала» (1856), «Травіца брат-сястрыца», «Шчароўскія дажынкі», «Быліцы. Расказы Навума» (1857).

У паслярэформенныя гады пісьменнік стварае, бадай што, найбольш сталыя ў ідэйна-мастацкіх адносінах творы: фарс-вадэвілі «Пінская шляхта» (1866) і «Залёты» (1870). У першым, які стаў хрэстаматыйным творам беларускай літаратуры, ён канчаткова пазбаўляецца сваіх ідэалізаваных поглядаў на шляхту і з'едліва выкрывае і высмейвае яе невуцтва і напышлівую амбіцыёзнасць разам з характэрнымі рысамі дзяржаўнага ладу царскай Расіі. У «Залётах» В. Дунін-Марцінкевіч малюе яскравы вобраз новага гаспадара жыцця, які выйшаў з былога прыгоннага сялянства і ўсё больш рашуча адсоўвае на задні план шляхту. П'еса набывае пэўную актуальнасць і надзённасць у цяперашні час, калі ў краіне ўсталёўваюцца рыначныя эканамічныя адносіны.

## ЗАЛЁТЫ

*Фарс-вадэвіль у адным акце*

(Скарочана)

АСОБЫ:

Ян Пачціўскі, маршалак
Аляксандр Сакальніцкі, суддзя
Адэля, яго дачка, 18-ці гадоў
Адольфак, сын Сакальніцкага, 12-ці гадоў
Станіслаў Зацнеўскі, малады памешчык
Антон Сабковіч, арандатар
Даміцэля, яго сястра
Пятрук, парабак
Гапон Барычка, селянін
Куліна, яго жонка
Марыся, іх дачка
Мордка, жыд-цесля
Ключвойт

Дзея адбываецца спачатку ў кватэры Сабковіча,
далей — у лесе перад сялібай Барычкі,
на заканчэнне — у доме Сакальніцкага.

## Сцэна 1

Сцэна прадстаўляе невялічкі пакой, у каторым направа — два акны, налева і прост — дзверы. З левай стараны — стол, на каторым Даміцэля прасуе хустачку для брата, Сабковіч, зусім ужо апрануты і толькі без фрака, каторы вісіць на крэсле,— падкручваецца і ўзіраецца ў туалетавае люстэрка, а пасля бразгае грашыма ў кішэні і спявае.

Сабковіч і Даміцэля

№ 1

Сабковіч. Маю грошы, маю я;
Мне ніхто тут не раўня;
Прад маёй машонкай поўнай
Гнецца роўны і няроўны.
Як ганяў скаціну ў лес,
Кожны чуць не з фігай лез,
А як стаў багат сягоння,
Б'юць паклон мне на паклоне.
*(Гаворыць.)*

Дык што ж... ці ж я не прыгожы хлапец? *(Круціцца па пакоі.)* Паўзірайся, сястрыца... Цяперака, як прычаплю паўпэруку, мая Адэльця напэўна з радасцю пойдзе за мяне... дык што ж...

Даміцэля. Ці не паспяшаўся, мой даражэнькі, называць яе сваёю,— не будзь такім пэўным, каб не ашукацца...

Сабковіч. Дык што ж... або я не маю грошай?

Даміцэля. Мне здаецца, з дзяўчынай добрага роду і багатай на ўсё трэба мець яшчэ нешта, апроч грошай.

Сабковіч. Цікавасць! Дык што ж... чаго ж гэта яшчэ патрэбна?

Даміцэля. Перш-наперш, мой даражэнькі, кавалер, што заляцаецца да паненкі, павінен быць таго самага стану, як і яна; — калі ж ён з ніжэйшага стану, то павінен, прынамсі, мець славу вучонага і разумнага,— інакш той стан, да каторага належыць паненка, будзе крычаць, што гэта мезальянс, і адгаворыць не толькі бацькоў, але і паненку, калі б ты нават ёй і падабаўся. Другое,— трэба, каб кавалер быў адукаваны, калі не лепш за паненку, дык і не горш, гэта дзеля таго, каб ёй не было сорамна за свайго мужа. Трэцяе, і самае важнае,— каб той, што заляцаецца, меў добрую славу ў людзей; а ты, мой брацейка,— даруй, што праўду скажу,— не можаш пахваліцца ні першым, ні другім, ні трэцім.

Сабковіч. Дык што ж... цікавасць... Адным словам разаб'ю ўсе твае наймудрэйшыя довады: маю грошы,— а грошы цяперака для ўсіх станаў надта ласая рэч. *(Стукаючы па кішэні, пяе.)*

№ 2

Грошы ўсім кусочак ласы,
Хоць хто мае іх даволі,
Ўсё ж к ім прэ, як да каўбасы,
Калі ўбача ў каго болей.

Вось ліхвяр, што кублы мае
Поўны золатам набіты,
Блізкіх, дальшых абірае,
Век працэнтамі не сыты.

Даміцэля. Праўда. У цяперашніх цяжкіх часах шмат паненак, заплюшчыўшы вочы, пайшло бы за багаццем, але шчасця і дабра ад гэтага няма чаго і спадзявацца: усё жыццё ваша атруцілася б сваркамі ды калатнёй. Панна Адэля не такая. Каб меў нават багацце Крэза, і тады б яе да сябе не прынадзіў; яна шукае чагосьці іншага, большага за золата.

Сабковіч. Цікавасць!.. Дык што ж.. чаго ж гэта?..

Даміцэля. Я табе ўжо казала аб гэтым і магу ў некалькіх словах сказаць яшчэ раз: добрай славы ў людзей, навукі, адукацыі і полеру*, дзякуючы каторым ты не сароміў бы таго стану, да каторага яна належыць.

Сабковіч. Э! пляцеш, мая даражэнькая. Дык што ж... Каб я не меў розуму, то і грошай не сабраў бы. Што датыча якогасьці тамака полеру, каторага быццам, як ты кажаш, мне бракуе,— яго старчыць для мяне: усюды патраплю вясці сябе не горш за якога лішне разумнага з пустымі кішэнямі,— дык што ж... Ось, напрыклад, шумна ўходжу да панскай салі, поўнай гасцей, дык што ж... прыбліжаюся да пані-гаспадыні, трымаючы левую руку ў кішэні, а праваю, як бы не хочучы, цісну ёй ручку так — па-панску і кажу праз нос: коман ва, як здароўечка, як ідзе гаспадарка, і так далей,— цікавасць... Дык што ж... пасля падыходжу да гаспадара, з каторым, як роўны з роўным, цалуюся; далей, усунуўшы ўжо абедзьве рукі ў кішэні, як бы не хочучы, бразгаю сумысля ўсыпаным туды золатам, навокал з гары ўзіраюся і з павагаю... дык што ж... ківаю галавою адным ніжэй, другім менш

нізка — павэдля багацця і становішча іх, дык што ж... Потым іду да паненак і, як бы ненарокам, кідаю залатую манету на зямлю, і раблю гэта ведама тады, калі блізка, дык што ж... лёкай круціцца; ён, падбегшы, падымае грошы і хоча мне аддаць,— тады я спакойна, арыстакратычна кажу: «Пакінь гэта сабе, даражэнькі», і... дык што ж... Як бы нічога не было, пачынаю з паненкамі... дык што ж... жартаваць, бразгаючы ўсё золатам у кішэнях; вяду гутарку аб пагодзе, апратках, хлапцах ці аб нечым падобным, дык што ж... А! а! ці ты ведаеш, сястрыца, што я ўжо і кантраданса ўмею скакаць... Дрыгальскі мяне крыху падмуштраваў, толькі другая хвігура неяк нядобра ідзе. Паглядзі, мая даражэнькая, шак жа ж* ты шмат бачыла скокаў, дык што... дык можаш папраўдзе асудзіць... *(Пачынае скакаць і пяе.)*

### № 3

*Дуэт*

Сабковіч

Тра-ля-ля-ля, тра-ля-ля-ля! —
Стань ля боку, ўгледзься здаля
Да паставы, да натуры.

Даміцэля

Чысты мех з мядзведжай шкуры!

Сабковіч

Дык што ж... Суд крыху застрогі,
Глянь! Як поўзам ходзяць ногі,
Стан схілісты і павабны...

Даміцэля

Ах, які ж ты ўвесь нязграбны!

Сабковіч і Даміцэля *(разам)*

Перабіра ты сярдзіта,
Кпіш без літасці — і квіта!
Мяне знаюць не такія,
Так скачу, як і другія.

Не да скокаў ты суджоны,
Да сахі і да бароны:

Ногі крывы, як кавёлы,
Значна, што з Смаргонскай школы.

*(Скачучы, прыбліжаецца да дзвярэй, што знаходзяцца прост сцэны, і, штурхнуўшыся аб парабка Петрука, што ў гэты момант уваходзіць, падае на зямлю.)*

**Сцэна 2**

Тыя самыя і Пятрук — парабак

Сабковіч

Вось уцяў! аж цёмна ў воку;
Ах, чорт лысы ды шалёны! —
Стой тут. З месца ані кроку!

Пятрук *(скрабучы галаву, нізка кланяецца)*

Няхай будзе пахвалёны!

Сабковіч *(устаючы)*

Ехаць меўся ў важны госці,—
Гад звіхнуў нагу у косці,
На манеры мо быць страта.

Даміцэля

Раджу, лепш пільнуйся хаты.

*Тэрцэт*

Сабковіч

Дык не веру ў прадчуванне,
З паваротам жджы шчаслівым:
Веру ў мілачкі каханне,
Бо ўсе з іх к рублям жычлівы.

Даміцэля

Не вер золату, васпане,
Паварот мо быць слязлівы:
Той казання не дастане,
Хто адно глядзіць нажывы.

Пятрук

Даўно пас скацінку ў полю,
А цяпер пан над панамі.
Дай свінні рог, дурным — волю,
Свет павернуць ўверх нагамі.

Сабковіч *(кажа)*. Што, медзвяжонак! — Ці справіўся з інтарэсам, за каторым я цябе пасылаў?

Пятрук. Кепска, паночак. Сказалі там у Кію, што гэта нячысты антэрас.

Сабковіч. Дурны! Колькі разоў казаў я табе, каб ты, адказваючы, казаў на мяне — ясны пане.

Пятрук. Эт, пано... хацеў сказаць: ясны пане; — я чалавек бывалы, зубы з'еў на дворскай службе,— і па Вільні не раз цягаўся; ото ж часта мне здаралася сустрэцца паміж шляхтай з гутаркай, што «ясне — згасне, а маспане — застане».

Сабковіч. А цяперака да справы — дык... Ці валоў ты замяніў?

Пятрук. Не пано... ясны пане — пастух не прыступіў.

Сабковіч. Ты, мусіць, не даў яму рубля?

Пятрук. Гдзе там! Я і другі яму суліў ад імя ясна пана, да, псяюха! вельмі цвёрды на сумленне; сказаў, што гэта і стыдка і брыдка людзей абманываць. Кажа, прадаўшы валы па шэсцьдзесят рублёў кормныя, пасля замяніць іх худымі,— гэтакага кепства і жыд не зробіць, а па... тфу! Прападай ты з яснасцю, усё забываю... а яснаму пану, кажа, за такую штуку Бог у гаспадарцы не дасць спору. Я яму гэтак: вялікая бяда абшукаць жыда,— то ж не хрышчоны!.. Ён жа і не спазнае, бо і тыя рыжыя і гэтыя, капля ў каплю, схожыя. Бяры два карбаванцы да аддай два кормныя, а места іх пастаў у гурме, каторыя я цяпер прыгнаў,— жыд не сцяміцца, забярэ, якія знайдзе ў аборы. Гдзе там! ён у другую дудку, баш, свішча. Кажа, што чы жыд, чы хрысціянін — усе людзі роўныя перад богам, а атуманіць чы таго, чы другога, асабліва па... яснаму пану,— і сорамна і грэшна. Што было рабіць? Я, вось тая сабака, падхмыліўшы хвост, як няпышны пан. пагнаў валы назад.

Даміцэля. Бачыш, Антосечка! Просты мужык, без прасветы, а якую даў табе маральную навуку. Ці не час ужо апамятацца і пакінуць усялякія махлярствы, ашуканствы, за каторыя і на гэтым свеце прад людзьмі, і на тым перад богам прыйдзецца парахавацца. Будзь пэўным, што шахраванне будзе гладка схадзіць, пакуль гэтага будзе не праз меру.

Пятрук. Гэта, кажуць, паненачка, пакуль збан ваду носіць, пакуль не парвецца вуха, а там...

Сабковіч. Маўчы!

Пятрук. Ну... маўчу!..

Сабковіч. Ты, сястра, выводзіш мяне з цярпення.

Я выйшаў ужо з-пад апекі і не люблю, каб нехта, хоць бы і сястра, мяшаўся ў мае справы... Ідзі лепш да сваёй гаспадаркі і не лезь туды, куды не трэба.

Даміцэля. Ай, брацейка! Глядзі, каб з часам не пашкадаваў, што не слухаў рады свайго прыяцеля, сястры. *(Пайшла, закрыўшы вочы хусточкай.)*

### Сцэна 3

Тыя ж, апроч Даміцэлі

Сабковіч. А ты, асёл, чаго яшчэ чакаеш? Ідзі ў гумно!

Пятрук *(чухаючы галаву)*. Вось я да па... цьфу! — прападай ты з панам! Хацеў сказаць: да яснага пана,— маю просьбу.

Сабковіч. Дык чаго табе?.. *(Падыходзіць да акна.)*

Пятрук. Гэта ж ужо позняя восень, зараз будзе зіма, а ў мяне няма кажуха. Хацеў бы прасіць, штоб ясны пан даў мне кажух.

Сабковіч. Прыбліжся і глянь у акно — чыё тамака быдла на сенажаці? — дык што ж...

Пятрук. Гэта любінскае.

Сабковіч. Ось будуць кажухі не толькі для цябе, а і для мяне нават — шак жа ж і я яшчэ не маю; а добра будзе ўзімку, устаўшы спазаранку, у цёплым кажусе абысці гаспадарку.

Пятрук. Як жа гэта, ясны пане? Чы пан думае ў Любінску купіць авечак і пашыць новыя кажухі? Да там жа на сенажаці не відна авечак і, кажысь, у любінскім двары саўсім іх нямашака.

Сабковіч. Асёл!.. Пастарайся добра, і будзем мець кажухі задарма. Вазьмі трох парабкоў, займі ўсё быдла ў хлеў. Сённека холадна, і людзі прыйдуць напэўна прасіць аддаць заграбленае ў кажухах,— тады не аддавай быдла, пакуль не пакінуць іх быццам у заставу. А кажухі, папаўшы ў нашы рукі, так і застануцца,— гэта ўжо мая справа, дык што...

Пятрук. Па... Цьфу табе! Ясны пане! Яны ж не на нашай, да на сваёй пасуць сенажаці. Штоб хоць адна штука перайшла граніцу, а то ўсё быдла ходзіць на любінскай.

Сабковіч. Дурны!.. дык што... зайдзіце ззаду любінскім лесам і займіце, а калі б хацелі перашкодзіць, дык пастухам задайце чосу, дык што... тамака пасуць малыя дзеці і не патрапяць вам перашкодзіць: не будзе вам шмат клопату — угледзеўшы вас, уцякуць.

Пятрук. Чы гэта будзе па-панску? Ладна ж сягаць па чужое дабро?

Сабковіч. Хоць не прыгожа, але складна дастанем сабе задарма колькі кажухоў.

Пятрук. Кажуць старыя людзі, што чужое дабро не грэе.

Сабковіч. Супакойся! Каб толькі мяккае ды з воўны, а, напэўна, грэць будзе.

Пятрук. Які цяпер свет настаў, мой божа мілы! Як паны началі браць вельмі на розум да сляпіць разумныя ксёнжкі, то горш ад нехрышчоных сталі круціць да муціць. *(Пяе.)*

№ 4

Верх дном паставілі свет гэты!
Не так было у даўны леты;
Як началі хітрыць-мудрыці,
То здуру сталі ўсе круціці.

Даўней усяк бога баяўся,
Дабра чужога, баш, чураўся,—
Цяпер стараюцца панята,
Калі б пакрыўдзіць свайго брата.

А гдзе ж сумленне — боязнь божа?
Быццё тако з разбоем схожа.
Пакіньце цнотай шахраваці,
Панкі, лепш станьце працаваці!

Пры працы мысль людска свабодна,
Бо праца госпаду угодна.
Шавец, што шылам зарабляе,
Спакойнае сумленне мае.

Сабковіч. Што гэта... Ты смееш павучаць мяне!..

Пятрук. Паночак... Цьфу ты, пропасць! — хацеў сказаць — ясны пане — то ж ведама стара гутарка: хлеб еш, праўду рэж!

Сабковіч. Дык я табе пакажу гутарку, дык што... ідзі і рабі тое, што кажу, інакш дастанеш кіем.

Пятрук. Нечага казаць, на чыём вазку едзеш, таму і песеньку спявай. Пайду грабіць быдла, але што будзе пасля?

Сабковіч. Дык што... не твая бяда, ідзі!

Пятрук пайшоў.

## Сцэна 4

С а б к о в і ч *(адзін)*

С а б к о в і ч. Усе кажуць, што я жыву людскою крыўдай,— дурні! Ось у тым і розум, гэта і штука, каб умець выкарыстаць абмылкі і някемнасць другіх. А сумленне? *(Думае.)* Глупства сумленне!

№ 5

Дзе ні кінь ад краю к краю,
Будзь сумленным — кожны бае.
Ну, і ўсё брахня на свеце,—
Ў губе — цнота, ў сэрцы — смецце.
Вось багач гавора з вамі,
Ўсіх багаціць ён славамі,
А ту ж збоку, як не знае,
Што хтось з голаду канае.

*(Кажа.)*

Дык што... дурны той, хто гоніцца за сумленнем, калі яно пакінула нас і ўцякло на край свету. Дык што... Золата — гэта ўсё. Хто мае яго, той патрапіць нават перацягнуць на сваю старану сумленне... Але час ужо ехаць да маёй найдаражэйшай. *(Прычапляе паўпэруку на галаву.)* Дык што... Сённека нарэшце канец, выясніцца мая справа. Пры такіх яе дастатках, асабліва матэрыяльных, я, напэўна, буду шчаслівы з ёю. Папраўдзе, нашто мне здаўся яе пасаг? Але ўсё ж такі дзесяць тысячак — гэта грошы, і ніколі не зашкодзіць павялічыць імі тое, што я сабраў. *(Хоча ісці ўжо.)* Але што гэта тамака зноў за гоман? Сённека мяне замучаць начыста ўсялякімі справамі. *(Сеў.)*

## Сцэна 5

Сабковіч і М о р д к а (цесля)

М о р д к а *(кланяючыся)*. Дабрыдзень пану,— ны! А што будзе з намі?..

С а б к о в і ч. Дык што... што мае быць? Пачынай строіць свіран, а тады атрымаеш свой задатак і за работу — дык што...

М о р д к а. Хас ду гэгэрт,— цікавасць! Як жа строіць, калі пан псы ўгаворы патрабаваў цаго інсага, а цяперака, калі я, дзеля пэўнасці, каб каго інсага не ўзяў да працы, даў сэсць рублёў задатак, пан ставіць мне куды цязэйсыя

варункі. Ны... агруль — гэтакім парадкам я і да паловы работы даедзе, а праем усё, колькі ўгаварыўся.

Сабковіч. Гэта ўжо тваё дзела; прападуць шэсць рублёў, калі не возьмешся за работу — дык што...

Мордка. Ны! цікавасць! Як жа да яе брацца, калі мне будзе вялікая крыўда?

Сабковіч. Задатак твой прападзе, а я вазьму другога майстра, дык што...

Мордка. Гівалт! Так зэ змовы не было аб такой работа, якая пан цяперака мне дае...

Сабковіч. А ці маеш, пархуць, пісаны ўгавор?

Мордка. Ны!... насто ён, для якога глупства, ці не досі панскае слова,— агруль!

Сабковіч. Дык што... слова — вецер, а распіска — гэта грунт, мой даражэнькі; дурань верыць на слова, а разумны карыстае з таго, дык што... Ось я ўжо такога трэцяга ашукаў і зарабіў гэткім парадкам дваццаць рублёў. Яшчэ злаўлю так са двух, і свіран мне нічога не будзе стоіць.

Мордка. Ны! А ці гэта будзе па-панску — бедных майстроў асуківаць — хас ду гэгэрт?

Сабковіч. Досі ўжо, мой даражэнькі, шахраваць вашаму брату, цяперака на нас прыйшоў чарод двойчы адплаціць вам,— дык што...

Мордка *(сціхаючы)*. Цікавасць! да цаго дайсло! *(Зноў цмокае.)* Мусіць, хутка будзе канец свету... Ны!.. сто за будзе?..

Сабковіч. Дык што... што будзе? Ось, калі не возьмешся за работу, твае шэсць рублёў фарвал, дык што...

Мордка *(энергічна)*. Хай гэта мая ўбогая і крывавая праца застанецца пану на хаўтуры. Будзь пан здароў! *(Пайшоў.)*

Сабковіч *(услед за ім)*. Ах ты, шахрай!.. жыд паскудны! Ён яшчэ клясці мяне будзе!.. Дык што... Але чаго ж я злую?.. Трэба быць справядлівым, хай гэты бядак пацешыцца за свае грошы хоць кляцьбой,— дык што... А цяперака ў дарогу. Гэй! ёсць тамака хто?

## Сцэна 6

Сабковіч і Марыся

Сабковіч. А! ты яшчэ тут. Добра, прыбяры тутака ў пакоі, вынесі стол і можаш сабе збірацца да бацькоў.

Якраз учора скончыўся год твае службы ў мяне,— дык што...

Марыся. А заплату,— чы ад пана, чы ад паненкі адбяру? Я ж чэраз цэлы год ні граша ад пана не мела.

Сабковіч. Праўда, праўда, мая даражэнькая, дык што... Прыбліжся і паслухай: трэба нам яшчэ парахавацца. *(Сеўшы, вымае з бумажніка картачку і чытае.)* Паступіла ты да мяне 17 траўня,— дык што..

Марыся. Так!

Сабковіч. І згадзілася за 18 рублёў у год.

Марыся. Так, паночак!

Сабковіч. Не сто раз казаў я вам называць мяне ясным панам,— дык што...

Марыся. Так, ясны пане!

Сабковіч. 18 кастрычніка ты захварэла і праляжала тры тыдні,— дык што...

Марыся. Бо па... ясны пане не даў, вэдле ўмовы, кажуха,— я празябла і захварэла.

Сабковіч. Фі! мая даражэнькая, грэх так лгаць, дык што... Цёпла было, як улетку, і ты захварэла ў самы гарачы рабочы час. Я быў змушаны наняць на твае месца падзёншчыцу, і плаціў я ёй двузлоты ў дзень... За тры тыдні гэта выйдзе шэсць рублёў трыццаць капеек. А дзеля таго, што ты праз тры тыдні нічога не рабіла, ляжала ела дарма хлеб і нямала клопату рабіла маёй сястры,— я табе рахую яшчэ па трыццаць капеек у дзень: — разам гэта будзе дванаццаць рублёў трыццаць капеек, дык што... Я абмыліўся,— не трыццаць, а шэсцьдзесят капеек. Цяперака далей — дык што... памятаеш, як у верасні быдла патаптала мне дзесяць град капусты — за тое, што вы не пільнавалі быдла, я налажыў на ўсіх вас па тры рублі штрафу,— дык што...

Марыся. Але ж, ясны пане, быдла належыць да пастуха.

Сабковіч. Ціха! — дык што... маўчы і слухай. Я заўсёды старых прытрымваўся законаў — шак жа ж і ў вас у канцылярыі ўся грамада адвячае за аднаго. Дык ось што... за капусту тры рублі штрафу. Трэцяе: на каляды, памятаеш — прасілася ты на два дні да хворай маткі, дык што... я маю мяккае сэрца, пазволіў табе пайсці, а ты, заместа двох, праседзела тамака шэсць дзён. Дык што.. сама прыстанеш на гэта, што за чатыры дні справядліва будзе адрахаваць табе найменш па дваццаць капеек,— дык што... гэта будзе рубель; сама бачыш, які я справядлівы... Далей, за тое, што ты прыйшла на чатыры дні

пазней, як трэба,— два рублі. Дык што... усяго-наўсё выходзіць: васемнаццаць рублёў шэсцьдзесят капеек, але я, маючы на ўвазе тваю шчырую службу, дарую табе гэтыя шэсцьдзесят капеек... дык што...

Марыся. Паночку, ясны пане! Чы ж я цэлы год дарам працавала?

Сабковіч. Дык што... шак жа ж ты сама чула, мая даражэнькая, што ні за што я табе шмат не палічыў.

Марыся. Не, гэтак не будзе,— я за сваю крыўду падам да пасрэдніка жалабу.

Сабковіч. Што? Ты мяне страшыць будзеш? Пісні толькі — ураз жа дам знаць, што ты мяне абакрала. Мусіць, памятаеш, як я на трэці дзень тваёй службы ў мяне, паслаў цябе шукаць паненку ў пакоях на гары; не даждаўшыся, сам пайшоў і бачыў, як ты выходзіла з пакоя, у каторым я трымаю свае грошы. Хіба ты не шукаючы сястры туды заходзіла, бо яна тамака ніколі не бывае, дык што...

Марыся. Па... ясны пане! Чы гэта па-хрысціянску — крыўдзіць так бедную дзяўчыну? Паслаў пан да пакоя шукаць паненкі,— я, шукаючы ўсюды, заглянула і да таго пакоя; то ж я не ведала, чы ёсць там якія грошы, чы няма. У пакой я не ўхадзіла, бо, як угледзела, што там на стале ляжаць грошы, то, старопіўшыся, ужо не пакідала дзвярэй, чакаючы, штоб чы пан, чы паненка прыйшлі. Чаму ж пан тагды не казаў мяне абшукаць, а цяпер так крыўдзіш?!

Сабковіч. Дык што... не маю і часу і ахвоты гутарку з табой разводзіць. Прыбяры ў пакоі, здай паненцы начынне і ідзі сабе з богам, а калі піснеш, што я табе не заплаціў, ураз жа дам знаць, што мяне абакрала, і ўсе будуць пальцамі на цябе паказваць, дык што... *(Пайшоў.)*

### Сцэна 7

Марыся (адна)

Марыся. Мой божачка міленькі! Служыла ж я ў паноў, да нідзе мне такой крыўды і такой вялікай ганьбы не давялося сустрэці. Усе паны былі добрыя, адзін толькі нашоўся круцель. *(Плача.)* Няхай жа слёзы мае падуць на яго душу. Што я цяпер буду рабіць? Спытаюць бацька, маці — многа чэраз год зарабіла? *(Малая паўза.)* Да мая ж у тым віна? Ведала ж я, бяздольна, што натраплю на такога круцяля? А як чыста мая душа, так смела раскажу

бацькам маю крыўду,— яны ўймуцца за сваю ядыначку і да пасрэдніка пададуць жалабу.

### Змена дэкарацыі

Сцэна прадстаўляе бераг лесу: углыбі відаць вёску; налева — багаты двор, а направа, каля лесу, таксама ў глыбі сцэны, мужычая хата. З-за дрэў відаць высунутыя да паловы калёсы, на каторых спіць Гапон Барычка, звесіўшы галаву; каля яго спіць, седзячы, апёршы галаву ў луку калёс, яго жонка Куліна. Выходзіць з двара Пятрук з кароткай люлькай і ў задуме гаворыць.

## Сцэна 9

Пятрук (адзін)

Пятрук. Ледзь адпрог коні, так зараз выбег са двара, штоб пабачыцца з каханай Марысяй. Пан у залёты, і фурман чэраз плоты. Ну, ужо гэтаму пану, то, пэўна, служыць пякельная сіла: што толькі задумае, то зараз і збудзецца. Выязджаючы із дому, бедаваў, што на трох канях гоніць у залёты; глядзі ты! — чы даехалі мы да Машанскай карчмы, аж якісь жыд ляціць на каламажцы, а обак тут жа прывязана кабылка прыгожанька, аж міла на яе палюбавацца,— ножкамі перабірае — вось паненка ў танцы,— пырскае весела, шыю ў дугу сагнуўшы. Пан аж казаў прыстаці, штоб падзівіцца красотцы. Пытае жыда, чы не прадасі? А паганцы тое і падавай! Слова за словам — старгаваліся пятнаццаць рублёў. Гэта ж рэч няслыхана! Я ад слова даў бы за яе трэйчы пятнаццаць да і яшчэ дзесятак дабавіў бы. Здаецца толькі, чы не крадзеная? што так за ніштo амаль уступіў. Пэўна, і пан тое спазнаў, бо адразу засуліў малу цану, а жыд-псюга і згадзіўся. Тут мяне пан скарэй па хамут і пастронкі конна дадому пагнаў, а сам астаўся чакаць у Машанскай карчме; і аж душа расла, як мы чацвярнёй сюды падкацілі пад ганак. *(Думае.)* Цьфу ты, пропасць! Здаецца, я гэту клячку гдзесь бачыў... Гнедзенькая... з белаю латкаю на лбе... та ж белакапытка. Ну, вось аніяк не прыпомню, а яна мне знаёмая... *(Падыходзіць да калёс і, агледзеўшы сплючых, спыняецца здзіўлена.)* А-а-а! Гэта што за дзіва? Бацькі Марысі! Які дур на іх напаў, што падкацілі пад лес калёсы дый, улёгшыся на іх, паснулі? А-а! *(Стукнуўшы рукой у галаву.)* Пачакай! Чы не ў іх я толькі бачыў капля ў каплю схожую кабылку? Здаецца, так, так, так... Цяпер сцяміў! Але цыт! Куліна прасыпаецца. Схаваюся за дзерава да паслухаю, які чорт іх сюды загнаў. *(Хаваецца.)*

### Сцэна 10

Гапон і Куліна

Куліна *(пацягваецца, пазяхаючы; працірае вочы; аглядаецца на ўсе стораны спуджаная; саскоквае з калёс, заглядае ў глыб лесу, а пасля будзіць мужа).*

№ 8

Дзед! дзед, дзед, дзед!
А кабылкі нашай нет!

Гапон *(у тым часе, як яна пяе, злазіць з калёс і, аглядаючыся на ўсе бакі, адказвае).*

Чы ты, баба, ашалела!
Гдзе ж ты кабылку падзела?
Ты ж наперадзе сядзела,—
Дык на вошта ж ты глядзела?

Куліна. То ж ты, Гапонка, мужчына!
К табе належыць скаціна.
Мая ж толькі віна цэла,
Што наперадзе сядзела.
І ты ж сядзеў на калёсах,
Нос твой быў аж пры атосах;
Відаць, мы абое спалі,
Як у нас кабылку кралі.

Гапон і Куліна *(разам).*

Где ты кабылку падзела?
Чы прыгаворкі не знаеш?
Не вер у свеце нікому:
Каню ў полі, жонцы ў дому;
Бо хто толькі жонцы верыць,
Той як сітам ваду мерыць.

Куліна. Палядзь толькі! — та ж мы амаль да самай хаты даехалі. Відна, тутка скацінка астанавілася траву скубці, а як гэта свавольніца Марыся ўгледзела, што мы спім на калёсах, пэўна з парабкам ціха адпраглі клячку і завялі яе ў хлеў. Зазаву толькі Марысю — абачыш, што ты крычаў на мяне несправядліва. *(Падыходзіць пад хату і кліча.)* Марыся! о, Марыся!..

## Сцэна 11

Тыя самыя і Марыся

Марыся *(выбягаючы з хаты)*. Хваліць богу! — вось і бацькоў дачакала. Як можна было так доўга сядзець у месце? Маці казала, што к абеду верніць, а тут ужо і вечар на дварэ. *(Падышоўшы бліжэй.)* А гэта што? гдзе кабылка? Да на чом жа бацькі прыехалі?

Гапон. Бачыш, дачушка,— едучы, мы абое паснулі і самі не сцямім, як тутка апынуліся. Чы ж вы з парабкам не выпраглі кабылкі?

Марыся. Парабак у лесе драва сячэ, а я ў вочы не бачыла кабылкі!

Гапон. Ах, доля ж наша горкая! Відна, як мы крэпка паснулі, зладзеі адпраглі скацінку; трэба папрасіць каня ў суседа і гнацца.

Куліна. Чы ты адурэў, чы што? Куды ты пагонішся? Для цябе дзесяць дарог, а для злодзея адна.

Гапон. Да няго ж, рукі сашчаміўшы, тут стаяць да галасіць? Гэта ж цэла маё багацтва. Добра мне казаў кум Тодар: «Не купляй ад аканома скацінкі,— рукой не пойдзе, на крадзеным, баш, аўсе ўскормлена»; вось і праўда! А тут яшчэ абяцаў аконаму на гэтым тыдні аднясці рэшту грошы, недаплачаных за клячку. Што я, бяздольны, зраблю?

## Сцэна 12

Тыя самыя і Пятрук

Пятрук *(выходзіць з-за дрэў)*. Нех бэндзе пахвалёны!

Гапон. На векі векаў!

Марыся. Ах! *(Спусціўшы вочы, нязначна ўзіраецца на Пятрука і грозіць яму пальцам.)*

Пятрук. Дабрыдзень, ойча Гапоне! Дабрыдзень, маці Куліна, дабрыдзень, Марыся! *(Кожнага цалуе ў руку.)* Якая тут у вас вазня?

Гапон. Баш! мы з кабетай ехалі ранкам з места дый на калёсах паснулі. Панас,— няхай яму дабро! — сваім гашчэннем амарочыў нам галовы, дык вось прыгода сталася: пад самым домам злодзей выпраг кабылку. А ты, Петручок,— што ты ў нас робіш,— пэўна, за Марысяй прыцягся?.. Кепска, што для дзяўчат кідаеш службу. То ж нішто з гэтага не будзе,— я ўжо Марысю абяцаў Панасу. Ён, баш, мне дакляраваў пазычыць трыццаць

рублёў даплаціць аканому за кабылку. Ой, горкая ж мая долечка! Гдзе я адшукаю яе?..

Пятрук. Ойча Гапоне! не прагневайся да паслухай мяне з увагай. Я хоць яшчэ і не стары, да пацягаўся па божым свеце здаволі; быў і на кані і пад канём. Ой, не з адной печкі прыйшлося мне на долю хлеб спажываць. У вас адно дзіцятка,— гэта, кажуць, як вока ў лбе! Так калі вы адпусціце яе ў чужую хату й яшчэ да мужыка не па сэрцы, то бедна зязюлька, таскуючы па бацьках, гатова і замерці. А вы ж тут без яе чы будзеце весялы? То ж ужо спрабавалі, адпусціўшы на службу. Чы ж не маркотна было па дачушцы? Да і хату хто паддзержыць, то ж не маеце дзецюка. Яна ж, бедна, будзьце пэўны! за Панасам не нажывецца,— таска без пары звядзе яе ў магілу; тагды чыя ж рука на старасць прымкне вашы вочы? Хто на магілках памяне душачкі вашы?

Куліна *(плачучы)*. Праўда, праўда, мой Петручок! Я не сто раз тое ж казала, да, на ліха, вельмі ўпарты. *(Марыся плача, закрыўшы вочы хвартушком.)*

Пятрук. Як казёл у капусце!

Гапон. Бачыш, мой Петручок, ён пазычае мне трыццаць рублёў.

Пятрук. Паслухайце ж! Я лепшую падам раду; нараю вам такога, што і дачушкі вашай не выведзе з дому; места трыццаці — пяцьдзесят рублёў, і то не пазычыць, а так дасць вам за запамогу гаспадаркі. Да што яшчэ важней,— скацінку вашу адшукае, а вы ўзаем вазьміце яго к дачцэ ў прымакі. Чы гэтак складна будзе?

Гапон. Да мой жа ты лебедзька! нарай жа ты нам гэтага дабрадзея!

Куліна. Штоб толькі Марыся не чуралася, а то яна, бедная, за Панаса ўжо выплакала зрэнкі.

Марыся. Калі не за Панаса і пры бацьках астануся, то ўжо і плакаць не буду.

Пятрук. Ага!..

> Спазнала галубка, скуль самец буркуе,
> Тужыць перастала, ручнікі гатуе.

Марыся. Паганец ты, без кепікаў то ж ні мінуты ладам не пагаворыш! *(Б'е яго, ён адскаквае.)*

Гапон. Што гэта ты добрага чалавека кулакамі частуеш?

Пятрук. Нічога, ойча Гапоне! Ведаеце прыпавесць: хто каго любіць, той таго чубіць. Ото ж сужаны, каторага вам раю,— гэта я сам, а калі ваша ласка будзе прыняць

мяне ў прымы к Марысі і паблагаславіць нас — чаго і яна вельмі хоча, хаця, дзеля сарамлівасці, быццам чураецца,— то наперад вазьміце ад мяне пяцьдзесят рублёў, з каторых трыццаць сягоння ж аднясіце аканому.

Гапон. А як жа з кабылкай будзе?

Пятрук. Дзеля кабылкі вось што выкрываецца: як вы на калёсах паснулі, а яна прыстала, жыд якісь, канакрад, ціхенька адпрог, а сустрэўшы нас сягоння па палудні,— пусціўся з маім панам у торг; слова за слова, кабылка за пятнаццаць рублёў перайшла к нам, а цяпер у стайні нашага двара авёс з другімі коньмі спакойна пажывае.

Гапон. Чы ж твой пан не сцяміў, што яна крадзеная, а асабліва, што нехрыст так танна яе ўступіў?

Пятрук. Мой пан лепш любіць купляць крадзенае, бо кепствам можна адбаярыцца. Ото ж, ойча Гапоне, ідзіце да аканома, аддайце грошы і папрасіце, штоб заглянуў з вамі да стайні; а калі спазнаеце, што гэта ваша клячка, то, нічога нікому не кажучы, на ўсю ночку ляціце да стану, аб'явіце там аб кражы і ў каго яна цяпер знаходзіцца; та ж прасіце, штоб вам яе вярнулі.

Куліна. Вось, здаецца, малады, а старога дурня навучыў розуму. Мы пойдзем у хату, а вы падкаціце пад паветку калёсы ды ідзіце за дзелам.

Пятрук *(паказваючы на Марысю)*. А з намі што будзе?

Гапон. Бяры яе, бяры! Няхай вас бог благаславіць, як мы благаслаўляем, атцоўскім сэрцам прымаем цябе за сына. Толькі ж глядзі, трымай вуха востра! бо з яе будзе задорлівая жонка,— пайшла, баш, па матцы.

Куліна. Не зважай на яго брахню, мой Петручок, яшчэ не выцверазіўся.

Пятрук. Не журыцеся, ойча Гапоне, а паслухайце прыпавесці:

Змагла піла хвою, дуб,—
Жалеза спіліла,
Ды не цвёрдай сталі зуб
Суздром вышчарбіла.

Выходзяць: Гапон, за ім Куліна, далей Пятрук, а за імі ідзе Марыся і б'е кулаком па карку; Пятрук павяртаецца да яе і, смеючыся паўтарае апошняе слова: «вышчарбіла».

## Змена дэкарацыі

Зала, прыбраная па-панску; направа — канапа, а перад ёй — доўгі стол, накрыты вялікім, аж да самай зямлі, узорыстым настольнікам; з левага боку і ўглыбі — дзверы.

## Сцэна 13

Адэля (адна)

Адэля *(выходзіць у задуме з бакавых дзвярэй і, крыху пачакаўшы, кажа)*. О, салодкія, залатыя сны маладога ўяўлення! Як хутка вы праляцелі!.. Сённейка мне наказуюць паважна глядзець на жыццё. *(Думае.)* «Дачушка мая, ты скончыла ўжо васемнаццаць гадоў,— час ужо табе падумаць аб тым, да чаго створана кожная кабета. Я выбраў табе мужа. Чалавек гэта хоць і не малады, але сталы, багаты, а што найважней — першы гаспадар. Мне здаецца, што пад яго апекай дарога твайго жыцця будзе слацца кветкамі...» Так казаў мне бацька. Дагадваюся, аб кім ён думае,— аб Сабковічу: той другі ўжо дзень тутака гасціцца. *(Малая паўза.)* Гэтакім парадкам, без мяне і маёй згоды распараджаюцца маёй будучыняй... *(Думае, а пасля, тупнуўшы нагой.)* Не! Так не будзе... Мае бацька ўласці нада мной, але, мусіць, не захоча быць маім тыранам і змушаць мяне выйсці за ненавіснага мне чалавека. Ах,— гэты Сабковіч!.. Глядзець на яго не магу. *(Паказваючы на сэрца.)* Нешта тамака гаворыць, што з ім я ніколі не магла б быць шчаслівую. Але, калі бацька захоча мяне змусіць, што я зраблю, нешчаслівая?! Каб жа ж хаця прыехаў гэты Стась, то б я з ім параілася. *(Думае.)* Фі, мне не выпадае яго так называць,— ён для мяне цяперака пан Станіслаў. *(Паўза.)* Мілы божанька! Як цяперака падумаю сабе — якая я была дагэтуль шчаслівая. Бацькі мяне галубілі і нават гэтым самым псавалі; цэлы свет так усміхаўся мне, Стась... *(Аглянулася.)* Хачу сказаць — пан Станіслаў,— з самага маленства, кожную хвілю, на кожным кроку, у кожным найменшым нават выпадку, быў такі шчыры мой прыяцель. О, добра я памятую ўсю сваю мінуўшчыну!

№ 9

*Раманс*

Помню, дзяўчынкай быўшы малою,
Калі дзіцячы думкі снавала,

Стаська свавольны бегаў за мною,
З ім я дурэла, ў цацкі гуляла.
Ах, ішлі нам светла дні тыя,
Думкі йшчэ помняць іх маладыя.

*(Хвіліну падумаўшы, тупае нагой і кажа.)* Паскудны Стаська! Калісьці штодзённа бываў у Парэччы; адну хвіліну не мог абысціся без мяне, а цяперака, калі ён найбольш мне патрэбны, як у ваду кануў. Ужо трэці дзень, як не прыязджае. *(У пачатку гэтага маналога Station Станіслаў Зацнеўскі, увайшоўшы ціхенька, крадзецца, а потым патэтычна гаворыць. Адэля пры першым слове Станіслава, спудзіўшыся, ускрыквае: «Ах!»)*

## Сцэна 14

Станіслаў і Адэля

Станіслаў. Як дух выкліканы, стаю прад маёй паняй і стаю страшэнна замаркочаны.

Адэля. Чаму ж гэта?

Станіслаў. Што гэта, пані, пытаешся? Ці Сабковіч не госціць у вас і ці пані не абяцала яму сваёй рукі?

Адэля. Праўда, бацька наладжвае гэта, але што пану ад гэтага?

Станіслаў. Пані мяне пытаешся аб гэтым... Пані, з катораю змалку аж да сягоння мы прабегалі рука аб руку, шануючы свайго жыцця так, што ні адна калючка найменшай нязгоднасці не зраніла нашага сэрца.

Адэля. Дзеля таго, што пан стараўся, каб я гэтых калючак не знала; але да чаго кіруецца ўся гэта гутарка?

Станіслаў. Адэля,— выбачайце,— панна Адэля,— ці ж з маіх пастулкаў, з маіх вачэй ты не вычытала таго, як ты дарага майму сэрцу? Я жыць не магу без пані; пры мыслі, што магу страціць цябе,— шалею. О, ты кінула на мяне страшныя чары!..

*(Пяецца так, як «Кветкі» Ст. Манюшкі)*

Адэлька-анёлак,— ты сонца, ты кветка!
Зрачыла мяне ты паглядам
І сэрца ўзяла мне, як колас з палетка,
Спакой мой забіла, як звадам.
Наяве абраз твой у думках кляціцца,
І сон мне абраз твой салодзе,
Майго адчування і дум ты царыца,
Дух твой ад мяне не адходзе.

А д э л я. Ах, чаму ж так позна, Станіслаў, адкрываеш мне сваю душу?!

С т а н і с л а ў. Пані Адэльця, ты магла навучыцца, з маленства ідучы бок а бок са мною, чытаць у маім сэрцы. Ці ж мог я прасіць тваёй рукі, не ўпарадкаваўшы сваіх дзел, запутаных у час маленства маімі апекунамі? Ці мог я думаць аб тым, каб увесці ў клетку птушачку, не ўстроіўшыся так, каб гэта няволя, канешная ў грамадзянскім жыцці, была для яе раем? Мой гонар і пашана, якую я маю для пані і бацькоў пані, не пазвалялі мне да часу непакоіць нявіннае сэрца тайным каханнем. Я пастанавіў, што як толькі незалежна ўстроюся, выліць прад паняй тое, што чую, і, атрымаўшы пазваленне пані, прасіць у бацькоў вашай рукі, так патрэбнай для майго шчасця. Адзін раз толькі — ах! — залатымі літарамі запісана гэтая хвіліна ў маім сэрцы... Пані тагды кончыла пятнаццаць гадоў. Прыехаўшы з універсітэта, знайшоў я вас над сшыткам, занятаю чыстапісаннем, у пакоі нікога не было. Я, зможаны магнетычным узглядам пані, забыўся і адкрыў сваю душу... О, памятна для мяне гэта салодкая і найшчаслівейшая хвіліна ў маім жыцці!

Як пытаў цябе, галубка,
Ці ў спадобу я табе,
Стыду свет убачыў з губкаў,
Мой анёлак,— так ці не?

*(Кажа.)* Як пані думае, што я зрабіў з тою паперкаю, на каторай твая ручка напісала такі дарагі для мяне прыгавор?

А д э л я. Ты яе, пэўна, падзёр.

С т а н і с л а ў *(вымаючы медальён з-за пазухі)*. Абмылілася ты. У золата яе аправіў і заўсягды нашу яе пры сэрцы і нават магу ўпэўніць, што гэта мілая для мяне памятка пойдзе са мною ў магілу.

А д э л я *(выцягвае да яго абедзве рукі)*. О, мой даражэнькі Стасю, які ты добры, шляхетны!

С т а н і с л а ў. Значыцца, ты мяне любіш?

А д э л я *(наіўна)*. Здаецца... але найлепш сам асудзі, дружа, з таго, што ў душы маёй робіць кожная твая бытнасць у нас.

У садочку цвітучым па сцежачках, польнай
Пахучай травіцай засланых,
Я змалку дзён з Стасем гуляла свавольна,
На воку бацькоў мілаваных.

*(Кажа.)* Дык вось, сам асудзі, дружа, ці гэта каханне, ці, можа, толькі прыязнь.

Станіслаў. Дзякую табе, анёлчыку даражэнькі, за шчырае прызнанне твайго нявіннага сэрцайка. Калі бог дасць споўніцца нашым найгарачэйшым жаданням і злучыць нас назаўсёды, тады пасвячу ўсё сваё жыццё на тое, каб зрабіць цябе шчасліваю.

Адэля. Але як жа ж мы пазбудземся гэтага Сабковіча?

Станіслаў. Супакойся, даражэнькая! Хаця я не быў пэўны свайго шчасця, усё ж такі, пачуўшы ў нашым куце аб тым, з якою мэтай гэты зладзюга прыехаў да вас,— асабліва, што і ён сам, немаведама чаму, усюды гаворыць аб сваіх планах,— не адкладаючы паехаў да маршалка Пачціўскага,— прызнаўся яму, што хачу жаніцца з табой, і казаў аб залётах гэтага інфаміса Сабковіча. Маршалак пазелянеў ад злосці, даведаўшыся, што яго прыяцель, каторы хваліцца, што адразу пазнае чалавека і чаго ён варт, так страшэнна абмыліўся і не толькі прымае ў сябе чалавека, катораму не можа быць месца сярод справядлівых людзей, але нават абяцае аддаць за яго сваю дачку. Ён добра знае Сабковіча, каторы служыў за пісара ў яго сваякоў Сулікоўскіх і добра іх абскубаў. Гэты першы яго крок на свеце быў першым і самым галоўным фундаментам яго багацця, якім ён цяперака так хваліцца, а каторае ён здабыў падобным спосабам. Маршалак паслаў мяне папярэдзіць, каб пані да яго прыезду, барані бог, не зрабіла ніякага рашучага кроку. Не трэба было мяне падганяць, ускочыў на сівака,— а мой арабчык як бы згадаў, што мне пільна, пусціўся з ветрам навыперадкі. Праз няпоўных сорак пяць мінут я быў ужо ў хвортні мілага для мяне з памятак вашага саду; я пацалаваў свайго коніка, каб падзякаваць яму, і прывязаў яго да плота, а сам ціхенька, каб ніхто не згледзеў мяне, як вуж шмыгнуў да дому і ось стаю прад паняй. Толькі жэўжык Адольфак, каторы ў садзе сярод агрэсту шукаў птушачых гнёздаў, спаткаўся са мной, але ён наш сябрук,— ненавідзіць Сабковіча. Кажа, што як згледзіць яго, дык яму прыпамінаецца слаўны начны парыжскі герой, Картуш, біяграфію каторага ён нядаўна чытаў у «Прыяцелю народа». Я паставіў гэтага хлопца, каб пільнаваў і сказаў мне, калі бацька з Сабковічам будзе вяртацца з прагляду гаспадаркі. Дык вось трэба кратацца, каб як найхутчэй выкурыць адсюль гэтага зладзюгу. *(Вымае з кішэні зложаную паперу.)* Гэта, даражэнькая Адэльця, песенька,

каторую заспявай як-кольвечы, быццам вучачыся, тады, калі Сабковіч будзе адзін у гэтым пакоі. Толькі голасна і выразна, каб ён пачуў; калі ён мае хоць крыху розуму, дык ураз жа павінен уцячы.

## Сцэна 15

Тыя самыя і Адольфак

Адольфак *(убегшы)*. Бацька з Картушом вяртаюцца, ужо на ганку. Уцякай, пане Станіславе, у гэтыя дзверы, бо ў тых можаш спаткацца.

Станіслаў. Памятай, Адзя, каб не доўга тутака бацька быў з Сабковічам і як-кольвечы знайдзі прычыну, каб яго выклікаць адгэтуль.

Адольфак. Будзь спакойны, уцякай. *(Станіслаў пайшоў.)*

Адэля. Адзя, добры хлопчык, не кажы так наперад, бо можаш папсаваць усе нашы планы. Хадзем. Я дам табе канфітур.

Адольфак. Ого, ці я баба, каб я не мог датрымаць сакрэту? Хітрая ты, мая сястрычка... *(Пайшлі.)*

## Сцэна 16

Суддзя Сакальніцкі і Сабковіч

Суддзя. Так, пане Антоні, ведаю, што не шукаеш пасагу, але я хачу быць акуратным і дзеля таго ўраз па шлюбе адрахую табе дзесяць тысячак банковымі білетамі; далажыўшы іх да свайго капіталу, зможаце купіць добры маёнтак.

Сабковіч. Гэта ўжо панская справа, а я, у свой чарод, магу ўпэўніць дарагога суддзю, што не ганюся за капіталам; глаўнае маё жаданне — быць панскім сынам і мужам шаноўнай дачкі вашай.

Суддзя. Веру, веру, пане Антоні! О, я мігам патраплю пазнаць чалавека,— нездарма завуся Сакальніцкім. Я адразу пазнаў, што ты справядлівы чалавек.

## Сцэна 17

Тыя самыя і Адольфак

Адольфак. Тата, аліндар чакае ў габінеце на тату; кажа, што мае пільны інтэрас.

Суддзя. Іду. Выбачайце, пані Антоні, што я мушу цябе тут аднаго пакінуць, але ўраз прышлю табе мільшую

для цябе асобу,— не замаркоцішся. Пайдзі, Адзя, да сястры, і скажы ёй, каб прыйшла да дарагога госця. *(Пайшоў.)*

Адольфак. Можа, сястра не здолее ўраз сюды прыйсці: ёй прыслалі якуюсь песеньку, і яна цяперака яе чытае, а ўраз пан пачуеш, як будзе спяваць. *(Выбягае, смеючыся.)*

## Сцэна 18

Сабковіч (адзін)

Сабковіч. Дык што... Стары дурань думае, што яго дачка мне даўпадобы. О, прайшлі ўжо тыя часы, калі хлопцы за адзін узгляд красоткі гатовы былі скочыць у агонь, у воду. Дык што... у цяперашніх часах усё залежыць ад грошай. Праўда, панна Адэля і пекная і разумная дзяўчына, дык што... каб не мела звінячай прыманкі, то, напэўна, я нават і не падумаў бы, каб ажаніцца з ёю. І яна, мне здаецца, таксама, дык што... родная дачка Евы. Ведаючы ад людзей, што я багаты, надта, мусіць, хоча выйсці за мяне замуж і, што больш, любіць мяне, галубка. Дык што... Ось і прадчуванні сястры. О, я хаця і не лізнуў кніжнай адукацыі, дык што... але згадаў сваім дурным розумам, што грошы ўвядуць мяне ў вышэйшыя сферы, дык што... *(Чутно, як нехта пачынае іграць на фартэпіяна.)* Ось, як уважаю, яна хоча мяне забавіць музыкай, дык што... для мяне больш прыемнасці робіць шуршанне банкавых білетаў дарагога бацькі, як іграцы яго дачкі. Ціха, нешта пяе, дык што... паслухаем. *(За кулісамі чуцен спеў, часта прарываны, як бы хто вучыўся.)*

Адэля *(за сцяной)*.

Часта між людзьмі бывае,
Праўда ў тых, хто грошы мае,—
Бразне вошуст кішанёю,
Гнецца ўсё прад ім лазою.

Сабковіч. Дык што... Ці ж не добра я мяркую?

Адэля *(далей)*.

Ёсць тут пан з паноў Сабковіч,
Што ўсе дражняць «дарабковіч».
*(Паўза.)*

Сабковіч. Што гэта? Аба мне пяе,— хітрая, далікатная; спяваючы, хоча выказаць тое, што чуецца. Глядзіце, трэба ж гэта! Паслухаем, што далей будзе.

Адэля.

Свінапас быў змалку летаў,
Сёдні дзьмецца, як цар света...

Сабковіч.

Што, што?.. О!.. *(Атарапеўшы.)*

Адэля.

Скуль жа пыха ў гэтай шэльмы?
Вота ж верыць ў грошы вельмі,
Бо на службе пры палацы
Доўгіх рук не жалеў працы.

Сабковіч.

І гэта нават?! Дык што...

Адэля.

На зладзейскай ехаў снасці,
Краў, што можна было ўкрасці:
Срэбра, медзь, нават раменне,—
Ўсё ў свае спіхаў кішэні.

Сабковіч. Скуль жа ж, да чорта, яна аб гэтым знае?.. *(Зусім збіты з панталыку, слухае далей.)*

Адэля.

Боскіх праўд забыўшы дбаці,
Як той Крэз, сабраў багацце;
Сёдні балі выпраўляе,
Каб падхлебнікаў мець зграю.

Сабковіч. Гэта інтрыга недапечанага акадэміка, дык што... Нічога не зробяць. Калі бацька на маёй старане, пастаўлю на сваім. Лёгка растлумачу, што гэта інтрыга, да каторай, дык што... належыць і яго дачка.

Так, паненачка, так, пане акадэмік! Вы, як я бачу, згаварыліся, каб выжыць мяне з гэтага дому, але страшэнна вы абмыліліся. Бацька мае да мяне слабасць, я выдумаю казку, быццам пан акадэмік баламуціць яго дачку і, хочучы маёй адправы, кідае на мяне ўсялякія бруды. О, пачакайце, галубочкі, не ўдасца вам тое, што вы хочаце зрабіць!

## Сцэна 19

Сабковіч і Адольфак

Адольфак *(убегшы)*. Пан маршалак Пачціўскі з панам Зацнеўскім толькі што прыехалі. Пан Станіслаў на сваім арабчыку. Які гэта пекны конік, проста цацачка...

Сабковіч *(страшэнна перапуджаны)*. Што, што, што? Маршалак Пачціўскі? Дык што... гдзе ён?

Адольфак. На ганку з бацькам вітаюцца; але пан маршалак на хвілінку толькі заехаў дзеля таго, што мае пільны інтарэс у горадзе, а міма праязджаючы, як ён казаў, не выпадае не заехаць, каб даведацца аб здароўі дарагога суседа. Нават коней не пазволіў адпрагчы, як ні прасіў яго бацька.

Сабковіч. О, даў бы ж то бог, каб ён, дык што... як найхутчэй выехаў адсюль. *(Наголас.)* Слухай, Адольфак! Дык што... як тутака можна выйсці ў сад, каб не спаткацца з новым госцем? Дык што... бачыш, мой даражэнькі, я не хацеў бы спаткацца з маршалкам, ён гневаецца на мяне за тое, што я так даўно не быў у яго. *(Убок.)* Да чорта,— ён бы мяне выкінуў за карк. *(Наголас.)* Дык што...

Адольфак. У сад адзін выхад — праз глаўныя дзверы і ганак, гдзе цяперака тата гутарыць з маршалкам; другі — праз пакоі Адэлькі, але цяперака тудой прайсці не можна: апранаецца. Бяда невялікая, што маршалак крыху прыстыдзіць пана за гэта, пан паабяцаеш незадоўга быць у яго, і будзе згода. Але чутна ўжо іх гутарка; бацька, мусіць, вядзе госця сюды. Пайду падганю сястру, каб хутчэй сюды выйшла. *(Выбягае.)*

## Сцэна 20

Сабковіч (адзін)

Сабковіч. Ось папаўся, дык што... Маршалак такі злы на мяне за Сулікоўскіх і Валовічыху, што, пабачыўшы мяне тутака, гатоў зрабіць мне вялікую непрыемнасць і настроіць проці мяне суддзю, дык што... Ён заехаў толькі на хвіліну. *(Бегае па пакоі, заглядаючы ва ўсе куткі.)* Каб знайсці тутака месца, каб схавацца? Дык што... Праз хвіліну суддзя не паспеў бы параіцца з маршалкам аб пастанове, дык што... сваёй дачкі. *(У гэтым месцы Адольфак паглядвае праз бакавыя дзверы, што робіць Сабковіч.)* Як на бяду, няма падхадзячага месца, каб схавацца. Ах, дык што... схаваюся пад стол; даўгі настольнік патрапіць схаваць мяне ад маршалка. *(Лезе пад стол і нацягвае крыху настольнік, каб закрыць сябе, але не ад публікі; гэтак схаваўшыся, высунуў галаву з-пад настольніка і кажа.)* Дык што... чартоўскі непрыемнае палажэнне залётніка! Каб жа ж хоць паненка ацаніць гэта патрапіла. Але ціха, нехта ідзе; буду сядзець спакойна і паўзіраюся, што тутака будзе рабіцца. *(Хаваецца.)*

## Сцэна 21

Адольфак і Сабковіч

Адольфак *(увайшоўшы з дубчыкам у руках, кажа ў старану)*. Ага, Картуш, папаўся ў мышалоўку! Пачакай, памучу я цябе добра тутака. *(Гамоніць.)* Трэзор, праклятая сабака! Куды ж яна падзелася? Трэба яго пакарміць дзеля таго, што ўраз пойдзем на цецерукоў з панам Station Станіславам. Усюдах набегаўся, шукаючы яго. Трэзор, Трэзор! Мусіць, улез пад стол і спіць тамака спакойна. *(Штурхаючы дубчыкам пад настольнікам.)* Трэзор, вылазь хутчэй!

Сабковіч *(выглядаючы з-пад стала, у старану публікі)*. Дык што... дзеля любві к паненцы, а хутчэй дзеля грошай яе таты, буду хвіліну Трэзорам: мажа настрашу хлапчука. *(Бурчыць, як сабака.)*

Адольфак. Што,— ты гэтак, пачакай, гад! Я ўраз выганю цябе з-пад стала. *(Мацней штурхае дубцом пад сталом.)*

Сабковіч *(да публікі)*. О, на раны Хрыста! дык што... страшнае палажэнне. Хто мяне выратуе з гэтага пекла? Пачну брахаць, можа, гэтым яго настрашу. *(Заядла брэша.)*

Адольфак. Не спудзіш мяне гэтым, ведаю, што не ўкусіш мяне, выкуру цябе адгэтуль.

Усунуў палец пад настольнік і, сарваўшы з галавы Сабковіча паўпэруку, уцякае да сярэдніх дзвярэй; Сабковіч, забыўшыся, выскачыў з-пад стала і, даганяючы Адольфака, наскочыў на ўваходзячых: маршалка, суддзю і Станіслава: з бакавых дзвярэй выходзіць Адэля. Усе стаяць здзіўленыя; Адольфак, бегучы да дзвярэй, безупынна гамоніць.

Адольфак. Ах, чорт, чорт!..

## Сцэна 22

Маршалак, суддзя, Станіслаў, Адэля, Адольфак і Сабковіч

Сабковіч *(ад страху непрытомны стаіць каля дзвярэй)*.

Суддзя *(Адольфаку, затрымаўшы яго і ведучы за вуха пасярод сцэны)*. Што гэта, сарвігалава, за камедыі вырабляеш тутака?

Адольфак. Я, татачка, зусім нявінны: я шукаў Трэзора, і мне здалося, што ён спіць пад сталом; я і паштурхаў тамака кійком; пад настольнікам нешта забурчала ды нават пачало брахаць. Тады я разгневаўся і,

усунуўшы руку пад стол, каб выцягнуць адтуль сабаку... і, немаведама чаму, трапіла мне ў руку гэтая барада, а замест Трэзора — выскачыў з-пад стала пан Сабковіч. Я, спуджаны, уцякаючы, крычаў: чорт, і якраз тата прыйшоў.

Суддзя. Што гэта, пане Сабковіч? Падбліжцеся, я пазнаёмлю пана з маім прыяцелем, маршалкам.

Маршалак. Знаю я яго добра. Што, васпан, тутака робіш? Як ты пасмеў лезці ў дом справядлівых людзей?!

Сабковіч *(перапуджаны)*. Дык... дык... дык... пане маршалак; дык... дык... я прыехаў, дык... да пана суддзі, дык... даведацца, дык што... можа, мае прадаць жыта ці лён.

Адольфак *(падняўшы настольнік, глядзіць пад стол)*. Далібог, тутака няма ані лёну, ані жыта.

Суддзя *(глядзіць па чарзе то на маршалка, то на Сабковіча)*. Пане Антоні, растлумач, што ты рабіў пад сталом?

Сабковіч *(непрытомны)*. Дык... дык... дык...

Маршалак *(дражнячы)*. Дык... дык... Ось я табе, дарагі суддзя, растлумачу ўсё чыста. Гэта птушка, даведаўшыся аб маім прыездзе і не хочучы спаткацца са мной,— ён ведаў добра, што я яго па галоўцы не пагладжу,— не могучы ўцячы дзеля таго, што мы надходзілі, схаваўся пад стол. А ты, дарагі дружа, каторы ўраз патрапіш ацаніць чалавека,— страшэнна абмыліўся, прымаючы ў сваім доме гэту ягадку; а што найгоршае — хацеў выдаць за яго сваю дачку. Мушу табе адкрыць вочы: Сабковіч — невядомага роду, гадоў з дваццаць таму назад пасвіў быдла ў сваіх сваякоў; навучыўшыся крыху чытаць і пісаць, дастаў, на няшчасце маіх сваякоў Суlікоўскіх, месца пісара і тамака, добра нахапаўшыся, пакінуў службу. Праз нейкі час мы яго бачым у пані Валовічыхі, кабеты з анёльскім сэрцам і надта даверчывай. Не марнаваў ён і тамака часу, добрым прыкладам чаго можа быць здарэнне ў адным мястэчку, гдзе людзі Валовічыхі, пазнаўшы на конях «дарабковіча» хамуты сваёй пані, хацелі зацягнуць яго ў стан і, каб не ўцёк, добра меўся б галубок. Але найвялікшай запамогай яму была смерць графа Багацкага. Нябожчык, падаючы ў ваду, выкінуў з бакавой кішэні бумажнік, а як ён трапіў да Сабковіча, ведама не толькі богу, а і людзям. Ось скуль яго багацце! Потым ён узяў у арэнду нямалы хвальварак і заняўся быццам таргоўляй, каб замрочыць людзей. Вось хто Сабковіч, каторага ты, дарагі суддзя, прыняў

у сябе. Ну, што, шаноўны, што адкажаш мне на тое, што я сказаў?

Сабковіч. Дык... дык... Пане маршалак, якісьці непрыхільнік мой набрахаў, а пан маршалак паверыў.

Суддзя. А я, неасцярожны, толькі што не зрабіў найвялікшага глупства, дзякуючы сваёй даверлівасці. О, даруй, пане маршалак! Якая падзяка належыць ад мяне і дачкі пану... *(Цісне яму руку.)*

У часе гэтай сцэны Зацнеўскі і Адэля ціха гутараць; Адольфак круціцца каля Сабковіча, аглядаючы яго з цікавасцю з усіх старон, і ад часу да часу мяшаецца да гутаркі сястры з Станіславам Зацнеўскім.

Маршалак. А цяперака, васпан, ідзі туды, скуль прыйшоў, і не рабі ганьбы справядлівым людзям сваёй бытнасцю. Шукай людзей, роўных сабе.

Сабковіч. Дык... дык што, пане маршалак, дык пан праз меру суровы для мяне, дык што... дык што...

Суддзя. Я прасіў бы, каб асан як найбарджэй пакінуў мой дом, а што датычыцца таго, аб чым мы з асанам гаварылі, я прашу ні слова нікому не казаць. Пан прыязджаў купляць семя, лён.

Адольфак. Пад сталом...

Суддзя. Маўчы, Адольфак. *(Сабковічу.)* Калі б я даведаўся, што ты распаўсюджваешся аб тым, аб чым я з табой вёў гутарку, то будзеш мець дзела са мной.

Станіслаў. Не з панам, дарагі суддзя, але з «недапечаным акадэмікам».

Маршалак. Гэта ў яго інтарэсе... Я трымаю адзін канец ніткі, па каторай ён, за недатрыманне сакрэту, можа трапіць у непрыемны дом. Ідзі. *(Сабковіч хоча ісці.)*

## Сцэна 23

Тыя самыя і Ключвойт

Ключвойт. Хай будзе пахвалёны!

Суддзя. На векі векаў. А што, даражэнькі, скажаш?

Ключвойт. Выбачайце, я, даведаўшыся, што тутака пан Сабковіч, зайшоў паведаміць, што станавы яго трэбуець у справе мужыка Гапона Барычкі, каторы заявіў, што ўчора ўкралі ў яго маладую кабылку, каторую ён купіў у тутэйшага аканома. Гэта пацвердзілі як ён сам, так і некалькі суседзяў. Дзеля таго, што кляча гэтая ў пана Сабковіча і ён прыехаў сюды на ёй, мне наказалі клячу забраць і аддаць, каму яна належыцца, таксама і кажухі, каторыя незаконна ён заграбіў у любінскіх лю-

дзей. Яго самога наказалі даставіць у стан для дапросу.

Маршалак. Дык рабі, што табе наказана.

Ключвойт *(Сабковічу)*. Пойдзем, паночку! *(Пайшлі.)*

Адольфак *(услед ім)*. Бяры, пан сваю пэруку, каб нас не ганьбіла ніводная яго рэч. *(Кідае за дзверы пэруку.)*

Суддзя. Ніколі сабе не дарую, што я гэтак аганьбіў маю дарагую Адэльцю, пазволіў гэтаму злодзею прасіць яе рукі. Не ведаю, як загладзіць сваю віну.

Маршалак. А ёсцека адзін найлепшы спосаб: не адкладаючы, выдаць яе замуж.

Суддзя. О, гэта было б найлепш, але за каго? Калі, як назло, нямашака ніводнага залётніка.

Станіслаў *(да Адэлі)*. Прыходзіць рашучая хвіліна, ад каторай залежыць для нас усё. Божа, памажы нам!..

Маршалак. І гэта чалавек з саколім вокам!.. Ці ж не ведаеш, што прымаеш у сваім доме нават надта часта дзецюка, каторы хацеў бы аддаць усё сваё жыццё, каб ашчасліваць тваю дачку, і на каторага і яна змалку глядзіць надта прыхільна.

Адэля *(застыдзіўшыся, боязна)*. Пане маршалак...

Суддзя. Хто гэта можа быць? Хіба пан Станіслаў? Чаму ж тады раней не адкрыў мне сваіх думак? Не было б гэтых нешчаслівых залётаў.

Маршалак. Трэба быць сватам. Так, дарагі суддзя,— Станіслаў любіць тваю дачку; дагэтуль нічога не казаў таму, што хацеў упарадкаваць свае справы і прыбраць гняздзечка для свайго найвялікшага скарбу. Быць можа адкладваў бы і яшчэ, але сённяшняе здарэнне змусіла яго паспяшацца з апошнім крокам. Твая дачка толькі сённейка даведалася, як ён яе любіць. Сённейка ён раскрыў прад ёй сваё сэрца і, дастаўшы пазваленне, просіць у цябе яе рукі,— прасіў мяне сватаць. Маладыя, падайдзіце да бацькі і прасіце на каленях пазвалення і благаслаўлення. *(Станіслаў стаў на калені перад Сакальніцкім, а Адэля, засароміўшыся, мітрэжыцца.)* Панна Адэля, смела стань на калені з правай стараны і загляні бацьку ў вочы так, як глядзіш, калі хочаш яго збаламуціць. Магу ўпэўніць, што змякне, як воск, і злучыць вашы рукі.

Адэля *(стаўшы на калені)*. Дарагі татачка! Я люблю яго. *(Цалуе бацьку ў руку, закрываючы гэтак вочы свае.)*

Суддзя. Ага, баламутка, а я не мог дагадацца! Адгэтуль перастану верыць свайму сакалінаму воку, а то, як

відаць, з гадамі прытупілася. Ну, мае дзеткі, калі любіцесь, то хай бог у небе, як бацька на зямлі, вас благаславіць! Устаньце і дайце вас абняць.

А д э л я. Татачка, даражэнькі, які ты добры!

С у д д з я. Усе мы павінны падзякаваць пану маршалку.

А д о л ь ф а к. Я таксама званіў на гэтае казанне і маю права, як брат, благаславіць вас. *(Патэтычна.)* Прыбліжся, пара буркуючых галубкоў, хай і я вас благаслаўлю. *(З павагай благаслаўляе.)*

С т а н і с л а ў. Брацейка даражэнькі, ты таксама шмат зрабіў для нашага шчасця,— чым мы можам выказаць табе сваю падзяку?

А д о л ь ф а к *(са слязьмі ціскае ім рукі).* Любіце мяне так, як і я вас люблю. *(Наіўна да Станіслава.)* А паедзем сённейка на цацерукоў?

С у д д з я. Ну, дзякаваць богу і дарагому маршалку, што залёты нашы сягоння добра скончыліся; хай жа ж яны, як цяперака для мяне, так і для ўсіх бацькоў будуць навукай, што, шукаючы для свайго дзяцёнка прыяцеля на ўсё жыццё,— павінны галоўным чынам звярнуць увагу,— хавай божа, не на багацце, але на сэрца, навуку і славу ў людзей таго, хто хоча быць мужам дачкі.

Канец

## ФРАНЦІШАК САВІЧ
## (1815—1845(?))

Нядоўгае жыццё Францішка Савіча прасякнута чароўнай рамантыкай барацьбы за вызваленне прыгнечанага народа з-пад уціску самаўладства і падобнае да захапляючага прыгодніцкага рамана. Пра важнейшыя падзеі сваёй біяграфіі ён расказваў паэту Аляксандру Грозе, апавядаў у сваіх незакончаных мемуарах.

Паходзіў Ф. Савіч з сям'і светара з палескай вёскі Валяцічы, што каля Пінска. Падчас навучання ў Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі ў 1833—1838 гг. ён узначальваў студэнцкае «Дэмакратычнае таварыства» і пад кіраўніцтвам вядомага польскага рэвалюцыянера Ш. Канарскага (расстраляны царскімі ўладамі ў пачатку 1839 г.), эмісара эміграцыйнай «Маладой Польшчы» на землях Украіны і Беларусі, рыхтаваў новае паўстанне. Пасля разгрому «Таварыства» жандарамі быў сасланы радавым салдатам у дзеючую армію на Каўказ. У 1841 г., якраз

перад тым, як яго, «самага важнага і злоснага злачынцу», запатрабавалі вярнуць назад у Вільню, ён уцёк і з вялікімі цяжкасцямі і перашкодамі дабраўся да Таганрога, хацеў морам выехаць за мяжу. Гэты намер яму не ўдалося здзейсніць. Тады Ф. Савіч паспрабаваў па сушы перайсці ў Румынію з цыганамі. Але яго схапілі. Пратрымаўшы амаль два гады ў Цірасапальскай турме як бадзягу, зноў аддалі ў салдаты. З Чарнігава, дзе Ф. Савіч цяпер служыў, ён вырваўся дзякуючы фельчару, які выправіў яму дакументы. Але зноў жа з-за недарэчнай выпадковасці (вывіхнуў нагу) яму давялося затрымацца ў мястэчку Янушпаль. Там, каб зарабіць на жыццё, пачаў практыкаваць як медык і хутка заваяваў павагу ў насельніцтва і мясцовага начальства. І вось тады, калі, здавалася, ужо нішто не магло перашкодзіць яму ажыццявіць свае планы, ён, лечачы іншых, сам захварэў на халеру і памёр, быў пахаваны ў Астрожку на Украіне.

У гісторыі беларускай літаратуры Ф. Савіч вядомы як аўтар верша «Дзе ж тое шчасце падзелася?..», напісанага яшчэ ў студэнцкія гады. Хаця твор гэты захаваўся не цалкам, усё ж у ім выразна выяўляюцца асноўныя ідэі, якія вызнае паэт: пякучы боль за прыніжаны стан чалавека, нянавісць да «тыранскіх» сіл, што прыгнятаюць яго, перакананне ў неабходнасці яднання ўсіх народаў для барацьбы з імі, перш за ўсё — з царызмам, у імя вольнасці людзей. Па поглядах, па стаўленні да сялянскіх мас і вызначэнні іх ролі ў змаганні з прыгнятальнікамі Ф. Савіча можна лічыць папярэднікам Кастуся Каліноўскага.

Ф. Савіч пісаў мемуары, многія з напісаных вершаў сталі народнымі песнямі. У мемуарах Э. Паўловіча «Успаміны з-пад Віліі і Нёмана» (1882) апублікаваны верш Ф Савіча «Там, блізка Пінска, на шырокім полі».

Дакладная дата смерці невядомая.

* * *

«...Дзе ж тое шчасце падзелася?..
Дзе глянеш, людзі брашчаць ланцугамі,
Дзе кінеш — слёзы, аж жыці няміла,
Бо з чалавека высысаюць сілы...
Ліцвін, валынец, падайце ж мне рукі,
Так — прысягаем на госпада-бога,
Царам — на згубу, панам — для навукі,
Што на той зямлі не паўстане і нога —

Ані гэта паганска, ані гэта тыранска,
Хоць укараніцца, як сіла шатанска!
А хто няшчыры, хто несправядлівы,
Няхай прападзе з родам і з насеннем
Няхай чорт зрэжа з чадам, з пакаленнем!»
Сказаў, усе трое пацалавалiсь,
І па чарцы выпілі гарэлкі,
І па калачу ўзялі з тарэлкі,
І доўга сабе мілавалiсь.
А сонца свеціць і вецер не ґудзе,
Бо здзівіліся, што ты вольны, людзе!

## АРЦЕМ ВЯРЫГА-ДАРЭЎСКІ (1816—1884)

Нарадзіўся паэт у мястэчку Кублічы Лепельскага павета. Пасля заканчэння Забельскай гімназіі паступіў на службу ў канцылярыю рэвізійнай камісіі пры Віцебскім губернскім дваранскім дэпутацкім сходзе. На Віцебшчыне ён пражыў да 1863 г., калі, пасля ўдзелу ў паўстанні ў якасці камандзіра віцебскага атрада, быў прыгавораны да 8 гадоў катаржных работ на горных заводах Сібіры. У канцы 60-х гадоў катаргу яму замянілі на пажыццёвую высылку. Пахаваны ў Іркуцку. Лёс выгнанніка і пакутніка з бацькам падзяліла яго дачка Габрыэля.

Творчая дзейнасць Вярыгі-Дарэўскага на ніве паэзіі звязана з Віцебшчынай, дзе вакол яго гуртаваліся паэты, якія пісалі па-беларуску. Сябры называлі Вярыгу-Дарэўскага Наддзвінскім Дударом, сам ён падпісваў свае вершы на беларускай мове псеўданімам Беларуская Дуда. Вядома, што ён напісаў творы «Літвінам, што запісаліся ў мой «Альбом», на развітанне», «Думка», «Быхаў», «Паўрот Міхалкі», «Бяседа над Нёманам», «Скромны ў бяседзе не страціць», «Бедны наш Лукаш», «Яшка і Цімошка», «Дзіця дзвюх матак», паэму «Ахульга», драму «Гордасць», пераклаў на беларускую мову паэму А. Міцкевіча «Конрад Валенрод». На жаль, даследчыкам удалося адшукаць вельмі нямногія з іх.

Найбольш значным з таго, што засталося з творчай спадчыны паэта, уяўляецца рукапісны альманах, які называюць «Альбомам Вярыгі-Дарэўскага». Па яго просьбе ў альманаху пакінулі свае празаічныя і вершаваныя запісы многія вядомыя літаратары і дзеячы беларускай культу-

ры 1850-х гадоў: Уладзіслаў Сыракомля, Вінцэсь Каратынскі, Эдвард Антоні Адынец, Ігнат Ходзька, Адам Кіркор, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Мікалай Караткевіч і інш. Гэтыя запісы выразна перадаюць тую атмасферу, якая склалася вакол праблем беларускага народа і яго культуры, выяўляюць разнастайнае стаўленне да беларускага селяніна і — самае галоўнае — рознабакова малююць светлае і чыстае аблічча паэта А. Вярыгі-Дарэўскага, гуманіста, праўдалюбца, заклапочанага пытаннямі пераўтварэння жыцця сялянства. Па словах Адынца, у альманаху паэт «узбуджаў нянавісць да багатага панства». А Ялегі Францішак Вуль ад імя наддзвінскага мужыка ў сваім экспрэсіўна-вобразным, дынамічным вершы, раскрываючы пафас творчасці А. Вярыгі-Дарэўскага, пісаў:

Грудзяй цэлай гудзі смела
На увесь мужыцкі свет,—
Што пасееш, будзе цэла,
Будзе некалі і цвет...
Белы рожы — то за гэта,
Што ты совесць беліш нам,
Што нас вывеў ад Яхвета,
Хоць нам бацька, кажуць, Хам.

Свае чалавекалюбныя перакананні паэт сцвярджаў не толькі на словах — у сваіх вершах, ён ярка пацвердзіў адданасць ім і на справе — падчас паўстання 1863 года.

## ДУМКА

«Плыві, плыві ты, Дзвіна серабрыста,
Аж там, у сама Балтыйскае мора,
І пракаціся там, дзе душа чыста
Майго Фядола прападае з гора.
Не страш яго там маімі слязамі,
Ні аб рабятках не кажы худога,
Што на кусочках хаджу з сіратамі,—
Не кажы, рэчка, а пацеш мілога».—
Паплыла рэчка, слязінкай бліснуўшы,
З роднай зямелькі, шэпча берагамі;
Бедна салдатка, дзетак абхінуўшы,
Рэчкінай думкі слухала з слязамі:
«Мая сястрыца, салдатка-сіротка!
Маліся богу і перастань плакаць.
А я ж чысценька, рэзва і красотка,
А і мне сэрца бударажыць слякаць.

Таго, што хочаш, табе не дажыцца,
Ні тваім дзеткам, сястрыца сардэчна,
Ні мне ў мора цэлай не праліцца;
Мне плысці вечна, табе чакаць вечна».
Бедна салдатка душу аблягчыла
Ды з Дзвіной слёзы горкі раздзяліла;
Гэта паплыла, як і даўней плыла,
Тая чакае, як даўней чакала.

* * *

Бо шчасце, бо долю
Калі ж мы пабачым,
Няўжо ж то мы з гора
Ўсё плачам і плачам...

## УЛАДЗІСЛАЎ СЫРАКОМЛЯ (1823—1862)

Беларускі і польскі паэт Уладзіслаў Сыракомля (Людвік-Францішак — Уладзіслаў Аляксандравіч Кандратовіч) нарадзіўся ў фальварку Смольгава Бабруйскага павета. Бацька паэта, каморнік па прафесіі, не меў уласнай зямлі, і сям'я часта пераязджала з месца на месца, арандуючы зямлю ў розных фальварках. Таму маленства і яго яскравыя ўражанні звязаны ў Сыракомлі з мясцінамі Салігоршчыны (ф. Яськавічы), Капыльшчыны (ф. Кудзінавічы), Стаўбцоўшчыны (ф. Мархачоўшчына).

Добрую адукацыю Людвік Кандратовіч атрымаў, калі вучыўся ў дамініканскіх школах Нясвіжа (1833—1835) і Навагрудка (1836—1837). Але сапраўднай самаадукацыйнай школай, неабходнай крыніцай ведаў стала для будучага пісьменніка праца ў Нясвіжскай канцылярыі Радзівілаў (1840—1844), дзе перад маладым дапытлівым чалавекам адкрыліся багацейшыя бібліятэчныя і музейна-архіўныя скарбы. Тут ён не толькі вывучае гістарычныя матэрыялы, знаёміцца з лепшымі ўзорамі сусветнай літаратуры, але і сам спрабуе пісаць — 1842 годам датаваны яго першыя спробы — жартоўныя прысвячэнні і цыкл санетаў «Нясвіжскія ўспаміны».

Вясною 1844 г. Людвік Кандратовіч пераязджае ў арандаваны ім фальварак Залуча. Маляўнічая прырода Стаўбцоўшчыны спрыяла плённай творчай працы паэта. У гэтым жа годзе ў друку з'яўляецца першы твор У. Сы-

ракомлі — пачутае ў Міры і запісанае вершам апавяданне «Паштальён». Мала хто ведае, што менавіта гэтая вершаваная гутарка пры скарочаным варыянце перакладу Л. Трэфалева на рускую мову стала папулярнай рускай народнай песняй «Ямщик» («Когда я на почте служил ямщиком»). Увогуле творчасць У. Сыракомлі цесна звязана з вуснай народнай творчасцю беларускага народа, яго традыцыямі, гісторыяй. Робячы фальклорныя запісы, паэт не выдаваў іх асобнымі кніжкамі, а выкарыстоўваў лепшыя ўзоры ў сваіх творах.

У 1852 г. паэт з сям'ёй пераязджае бліжэй да Вільні — у фальварак Барэйкаўшчына, дзе працягвае працаваць над кнігамі «Вандроўкі па маіх былых ваколіцах» і «Маргерам». Творчасць У. Сыракомлі была вельмі шматгранная — тут і гістарычныя даследаванні, і краязнаўчыя нарысы, і археалагічная праца. Ён першы пачаў манаграфічнае даследаванне гісторыі Мінска, працягам якога стала праца «Хроніка горада Мінска», на краязнаўчагістарычным матэрыяле напісаны вялікія працы — «Падарожжа па Літве ў напрамках ад Вільні», «Нёман ад вытокаў да вусця».

Навукова-даследчая, гістарычная і літаратурная дзейнасць У. Сыракомлі не магла быць незаўважанай, і неўзабаве яго запрасілі працаваць у Віленскі музей старажытнасцей, дзе ў 1860 г. уручылі дыплом ганаровага члена Віленскай археалагічнай камісіі. У. Сыракомля займаўся таксама раскопкамі археалагічных курганоў.

У 1861 г. Уладзіслаў Сыракомля трапляе ў Варшаву, а потым у Ломжу, Сувалкі, Коўна, дзе ўдзельнічае ў антыўрадавай маніфестацыі. Гэта паслужыла прычынай яго арышту. Паэту пагражала высылка ў Сібір, але выратавалі сябры. Аднак улады забаранілі яму жыць у Вільні, і паэт вымушаны быў ехаць на сталае пражыванне ў Барэйкаўшчыну, дзе ён і памёр ва ўзросце 39 гадоў.

З твораў, напісаных У. Сыракомлем на беларускай мове, захаваліся два вершы — «Добрыя весці» (1848) і «Ужо птушкі пяюць усюды» (1861).

## СМЕРЦЬ САЛОЎКІ

(Урывак)

За кратамі з дроту, у вулічным гудзе
Салоўка замкнёны,
Ды прага спявання, праймаючы грудзі,
Расце неўпынёна.

Не маеш тут ценю, алешнік з ляшчынай
Цябе не заслоніць,
Не маеш і ўторы — твае ручаіны
З шырокай аблоні*[1].
Няма і каханай тут, дзеля каторай
Мог з песняй памерці.
Не вырвацца ў вольныя неба прасторы,
Не выпусцяць дзверцы,
Бо тут не вятрыскі, а колы грукочуць,
Трасуцца будынкі,
І пыл з-пад карэт запарушвае вочы,—
Ляціць без упынку.
Замест ручаіны натоўпы, як воды,
Віруюць і плешчуць.
Ды дзе ж тут зацішак? Дзе ж тая свабода,
Каб голас даць вешчы?
Ад спёкі і пылу хістае галоўку,
Як сэрца трывае...
Але калі хто нарадзіўся салоўкам,—
Да скону спявае.

## ПАШТАЛЬЁН

Тут п'юць і гуляюць, адзін ты не п'ян,
А сумны, як вязень прыкуты.
Вазьмі сабе чарку, сядай на тапчан,
Скажы, што ў цябе за пакута?

Ні бомы, ні дудка, ні смех вечарын
Развеяць твой смутак не могуць,
Два леты жывеш тут, а светлай пары
Ці меў ты часінку, нябога?

— Ой, горка і смутна мне ўсюды, браток,
Няміла на свеце, няміла!
Дай чарку! Скажу, калі вып'ю глыток,
Як доля мяне падкасіла...

На пошту я трапіў зусім малады,
Фурман з мяне ўдаўся зухвалы,
А волі не меў, дый ганялі тады:
Хоць свята, хоць ноч — усё мала!

---

[1] Зорачкай (*) пазначаны словы, тлумачэнне якіх даецца ў слоўніку ў канцы кнігі.

Ад рання да змроку, ад змроку да дня
Вазіў я паноў і пакеты;
Заробіш рубля — і пад карчму каня:
Гуляй, весяліся да свету!

Ашукваў дзяўчат, зневажаў дружбакоў,
Быў з пісарам за панібрата!
На коні як свісну — аж іскры з падкоў,—
І лейцамі сівых не кратаў.

На мосце зайграю ў вясёлы свой рог,
Кагось абганю ці спаткаю.
Вязу паніча ці паненку. Дальбог,
Два злотых як бач атрымаю.

Ды сэрца аддаў я дзяўчыне-красе
З убогай вясковай хаціны.
Дарогі туды кіраваліся ўсе,—
Пабыць з ёй хацеў хоць хвіліну.

Была нейк у пісара справа ўначы,
Паклікаў мяне да сябе ён.
Іду, сваю долю цішком кленучы,
А ў полі скуголіць завея.

«Вязі эстафету!» — «Ой, ліха звяло,—
Шапчу сабе,— ў полі ні тропу...»
А сам за пакет, за каня, за сядло!
Ганю каркаломным галопам.

Мяцеліца круціць, упыну няма,
Страшэннае скрозь бездарожжа,
Слупы верставыя мільгаюць старчма,
Пад'ехаў пад трэці — а божа!

Пачуўся мне плач, хоць віхура гула,
Хтось клікаў, прасіў дапамогі,
Падумаў я: «Згіне, сляпая імгла,
У снезе не знойдзе дарогі...»

Каня павярнуў, аж здалося, нібы
Хтось шэпча: «Куды ты, дзівача?
Ды лепей у вёсцы той час перабыць,—
Дзяўчыну сваю хоць пабачыш!»

Страх сэрца мне сціснуў, забіла духі,
Чало зледзянела ад поту;
Я ў рог затрубіў, каб не чуць, стаць глухім,
Пагнаў сівака праз сумёты.

Я еду дадому, за трое ганей
Вяртаецца страх непазбыты,
А сэрца ўсё шэпча крадком, як раней,
Бразджыць, як званочак разбіты.

Конь чмыхнуў пры слупе, спыніўся наўзбоч:
У снезе, пад плахтаю* белай,
Жанчыну я згледзеў, яна ўжо за ноч,
Як дрэва, уся скасцянела.

Я снежную намець абтрос з яе шат
І труп падцягнуў да дарогі...
Абцёр ёй аблічча. Была гэта, брат...
Дай чарку... Не маю больш змогі!

## ШТО ЎМЕЮ НАМАЛЯВАЦЬ

Калі трапіць у рукі аловак выпадкам
І, не знаючы што, маляваць я вазьмуся,
Заўжды выйдзе ў мяне беларуская хатка,
Ці касцельчык, ці двор і з буслянкаю бусел.

Я другога не ўмею падаць на паперы,
Толькі вобраз, што ў сэрцы назаўжды адбіўся.
Шчыра прагнуў наўчыцца, ды згаслі намеры:
Панскі гмах не адолеў — аловак скрышыўся.

Каб то хата была, я штрыхамі б выводзіў
Саламяную стрэшку, акенца малое...
А ў сярэдзіне — люд працавіты у згодзе —
Дзецюкі і дзяўчаты, дзядок з барадою.

Маладосць — у каханні, надзеі і ў думе,
Век пахілы, што згадак грабе папялішча,—
Людзі мары сардэчнай не страцілі ў тлуме,
Хоць праз шчыліны вецер аб нэндзы* ім свішча.

Каб вясковы касцёл! Вось старая званіца,
З драніц збітая вежа — малюецца проста!

Бачу дзетак я там, што прыходзяць вучыцца,
І плябана* да іх нахілёную постаць.

Ці стары арганіст, адспяваўшы кантычкі,
На вячэрню ў касцёле ўрачыста зазвоніць,
Гэты звон у прастор, узлятаючы, кліча,
Ажно рэха трымціць па зялёнай аблоні.

Каб маленькі дварок са стадолай і садам!
Сам сабой з-пад алоўка бяжыць без памылкі.
Дуб ля ганка чало пахіліў са спагадай
Над дубкамі, што з роду хацінскіх асілкаў.

Вось і вычарпаў талент, мізэрна і марна,
Ганарыцца няма чым — убогія рэчы!
Крыж хіба што яшчэ намалюю цвінтарны,
Пад якім поруч з бацькам хацеў бы я легчы.

## ВІНЦЭСЬ КАРАТЫНСКІ
## (1831—1891)

Імя гэтага пісьменніка-дэмакрата мала вядома беларускаму чытачу. Магчыма, гэта можна растлумачыць тым, што па-беларуску ён напісаў усяго толькі тры вершы — «Уставайма, братцы!..», «Далібог-то, Арцім» (гэты верш В. Каратынскі ўпісаў у альбом паэта А. Вярыгі-Дарэўскага) і «Туга на чужой старане». Аднак нельга забываць, што паэт жыў у той час, калі беларуская мова была забаронена. І ўсё ж творы В. Каратынскага, напісаныя па-польску, варта чытаць і ведаць, бо тэматычна яны звязаны з Беларуссю. Асабліва цікавыя ў гэтых адносінах яго гістарычныя і краязнаўчыя нарысы і артыкулы.

Нарадзіўся Вінцэсь Каратынскі на Навагрудчыне, у вёсцы Селішча. Адукацыяй займаўся самастойна. У хуткім часе ён здабыў славу выдатнага настаўніка, якога запрашалі вучыць дзяцей жыхары навакольных вёсак. У 19-гадовым узросце Вінцэсь знаёміцца з паэтам У. Сыракомлем і застаецца працаваць у яго сакратаром. Тут ён многа чытае, начыста перапісвае Сыракомлевы творы, вывучае старыя хронікі. Такія абставіны спрыялі абуджэнню і фарміраванню творчых здольнасцей маладога сакратара.

Першы яго верш «Над калыскай» быў надрукаваны ў 1856 г., а праз год выйшаў зборнік паэта «Чым хата багата, тым і рада», дзе паэт з болем расказвае пра гарот-

нае жыццё беларускай вёскі. Аднак ён не толькі канстатуе факт цяжкога сялянскага лёсу, а спадзяецца на лепшае будучае працоўнага люду («Першы дзень вясны»). Найбольш дэмакратычныя перакананні паэта адлюстраваны ў паэме «Таміла». З любоўю, але без прыхарошвання намаляваў В. Каратынскі вобраз галоўнага героя паэмы — старога селяніна Тамілы, які жыве ў галечы і не мае магчымасці выбрацца з яе. Даведзены да адчаю панскімі паборамі, Таміла прадае свайго адзінага каня і застаецца без капейкі:

Купілі каня цыганы аж падвечар,
Пасля абакралі, як мелі на мэце.
Нявaрта й казаць пра агіду такую,
Бо кроў нашу піць усялякі мяркуе,—
І ўжо так вядзецца на ўсім белым свеце...

З 1866 г. В. Каратынскі жыў у Варшаве, супрацоўнічаў у розных перыядычных выданнях. Там ён друкаваў свае нарысы і артыкулы пра Беларусь і яе славутых людзей.

Плённа працаваў В. Каратынскі і як перакладчык. На польскую мову ім перакладзены творы Ж. Беранжэ, А. Пушкіна, М. Лермантава, Л. Талстога, Г. Гейнэ. Падрыхтаваў і выдаў збор твораў У. Сыракомлі ў 10 тамах (1872).

## ДЗВЕ БУДОЎЛІ

(Фрагменты)

З прыемнасцю глядзеў я калісьці на дзве ўцалелыя вежы старога замка ў прынёманскім Навагрудку. Невядома, ці будаваў яго Міндоўг, заснавальнік пераноснай, паводле тагачаснага звычаю, сталіцы на левым беразе Нёмана, патрэбнай яму як умацаваны лагер для барацьбы з Кіеўскай Руссю. Навагрудскі замак, зруйнаваны дарэшты толькі ў мінулым стагоддзі, быў пабудаваны з чырвонай цэглы і вялізнага камення сама меней пяцьсот гадоў назад і цяпер яшчэ выкрасае іскры пры ўдарах жалезам. Адна вежа, звернутая да Кавальскай вуліцы, заўсёды асабліва здзіўляла мяне сваёй непаўторнай сілаю. Частка насыпу пад ёй абсунулася, пярун разадраў яе ад верху да долу, і адна сцяна цалкам, а дзве часткова разваліліся; таму цяпер другая палова вежы стаіць ужо толькі на адной сцяне, як хата на курынай назе ў казцы. Стаіць так ужо дзесяткі гадоў, і ў кожнага выклікае пытанне: як жа, нябога, сумела ў такой паставе ўтрымацца?

Як жа яна адважваецца сваімі руінамі здзекавацца з нашага прагрэсіўнага часу, калі вышэйшая матэматыка, фізіка, механіка пайшлі служыць будаўніцтву, калі, аднак, адзін за адным развальваюцца новыя гмахі, здараецца, нават перад заканчэннем? У нас у Варшаве падчас будаўніцтва на Дзікай ці Воўчай вуліцах руіны дамоў засынаюць няшчасных рабочых — і мы, аслупянелыя, глядзім, як штабялі збітых паспешна дамавін вязуць проста на дзядзінец, каб схаваць у іх ахвяры. Там, пад вежаю, што стаіць на адной сцяне, чарада галасістай дзетвары перасыпае пясок, выбірае каменьчыкі, карабкаецца на мур па цагляных выступах і стралою злятае па асыпцы ў роў — і як ні ў чым не бывала з абуджаным апетытам вяртаецца дадому цэлая і здаровая. Чаму такая розніца? А таму, што там трымаліся адной сістэмы правядзення работы, а тут хапаюцца за другую. Там клікалі на дапамогу час, і час, як таварыш па працы, ашчаджваў сваё тварэнне; тут робяць насупор яму, таму ён і помсціцца зласліва. Там за прыклад браліся пчолы, што мазольна лепяць пляйстры воску; тут ходзяць сцежкамі павука, што распінае зграбную сетку, якая лопаецца ад слабага павеву. Там паволі будавалі і дабудоўвалі пакаленні дзеля выгады пакаленняў; тут адразу ж лепяць шыкоўныя фасады, абы толькі спакусіць набыўца. Там клапаціліся пра дзяцей; тут выглядае так, як быццам мы дрэнныя бацькі — бяздзетныя...

Не думайце, што толькі ў чужым воку я старанна вышукваю парушыну недахопаў. У нашым літаратурным цэху таксама не трэба са свечкай шукаць вока, у якім тырчыць цэлае бервяно. У тлумным кірмашы грахоў, якія мы дапускаем у пісьменніцкім будаўніцтве і за якія, можа, калі паспавядаемся перад трыбуналам чытачоў, адзін з самых цяжкіх, несумненна, балбатлівасць. Не адзін з нас піша кожны год у часопісы і штотыднёвікі столькі, колькі Міцкевіч напісаў за ўсё жыццё. А што ж тады гаварыць аб параўнанні з нейкім там Дэмасфенам ці Гарацыем, якія пакінулі ледзь па аднаму тому! На жаль, з нашымі працамі, напісанымі паспешліва, адбываецца тое ж самае, што і з некаторымі дамамі на Дзікай і Воўчай. Застаецца толькі ўцеха, што калі такая праца праз хвілю ператворыцца ў руіны, то нікога, прынамсі, не засыпле, акрамя ўспамінаў пра імя аўтара.

## УСТАВАЙМА, БРАТЦЫ!..

Уставайма, братцы, да дзела, да дзела!
З поўначы певень залопаў крылом.
Ну жа, каб жыва работа паспела,
Выслаць гасцінец жаўценькім пяском!

Дружна, грамада, ў сардэчнай ахвоце,
Духам насілкі на плечы уздзень!
Ох, толькі ноччу няспорна ў рабоце!
Узыдзі нам, сонейка! Прывядзі нам дзень!

Едуць к нам, едуць дарагія госці —
Зямель шырокіх моцны гаспадар.
Верныя служкі пры яго мілосці,
Дабра і шчасця за ім доўгі шар.

Як хадзіў пан-бог па земскай дарозе,
Кожын слаў світу ды зялёну віць.
Што ж разасцелем мы сваёй ўспамозе?
Узыдзі нам, сонейка! Скажы, што рабіць!

Гдзе яго прымем? Чорная святліца,
Залатых тканак не судзіў нам бог.
Што наймілейша — то матка-зямліца,
Жоўты пясочак на яе палёг.

Цябе ж на плечах, зямля дарагая,
Велькаму госцю пад ножкі нясу.
Ох, ды расою пясок прамакае!
Узыдзі нам, сонейка! Падбяры расу!

Зара-зараніца бяжыць ужо з неба,
Любачкі звёзды бліснулі жывей.
З богам, браточкі, канчайма, што трэба!
Лёгка на сэрцы, а вачам святлей.

Зарыца кажа: вы — божыя дзеткі;
Звёзды міргаюць: братам стане пан...
Вот туман цёмны рынуў на палеткі.
Узыдзі нам, сонейка! Разгані туман!

Божае сонца бліснула на галі,
Дзяньку вясёла гуляць на дварэ,
Шле да нас пташкі, каб пецъ памагалі,
Туман прагнала, расу падбярэ.

І наша сонца да нас прыбывае,
Дабро і шчасце рассявае ён...
Здароў будзь, велькі гаспадару края!
Здароў будзь, сонейка! Паклон! О паклон!

* * *

Хочаш вялікае штось сатварыць,
Прыклад з прыроды вялікай бяры:
Ціха скалу час разбурыць у тло,
Каб на зямлі плённа жыта расло;
Ціха экватар разносіць цяплынь,
Каб улагодзіць полюса стынь;
Ціха ліецца ад сонца прамень,
Каб навакола жыццё было, дзень;
Ціха сусвет паўтарае ізноў
Круг ля крыніцы меры й гадоў —
Глянь на прыроду, рабі, як яна:
Думай, працуй і маўчы, як труна.

## ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ (1840—1900)

Паўстанне 1863—1864 гг., якое ўскалыхнула абшары Беларусі, Літвы, Польшчы, паўплывала на далейшы лёс многіх сыноў Беларусі. Дваццацічатырохгадовы сын Казіміра і Канстанцыі з Ашмянскага павета, Францішак Багушэвіч мусіў пасля паўстання пакінуць родную сядзібу, а крыху пазней, калі таварышы звінелі кайданамі па сібірскіх этапах, ён з'ехаў на Украіну, ды не на месяц, а на цэлых дваццаць гадоў. Уявіць цяжка, але гэта факт, іменна на дваццаць гадоў лёс і абставіны разлучылі будучага паэта, публіцыста, асветніка нашага першага адраджэння са сваім родным краем. Здаецца, ужо тады ён вызначыў для сябе крэда і жыццёвую мэту. «Народная свобода — следствие просвещения»,— гэтыя словы А. Пушкіна сталі крэда для Францішка, а мэтаю — абуджэнне самасвядомасці беларуса. Свядома ён стаў на шлях актыўнага асветніка. Таму не дзіўна, што малады Багушэвіч, як, дарэчы, і яго паслядоўнікі, пачынаў настаўнікам.

Нарадзіўся Францішак-Бенядзікт у Свіранах, якія арандавалі яго бацькі, праўда, з часам сям'я перабралася з Літвы ў Кушляны Ашмянскага павета. Разам з братам Францішка аддалі ў 1852 г. у Віленскую гімназію. Там са здольным хлапчуком вучыліся таленавітыя сябры, будучыя ўдзельнікі паўстання 1863 г. Атрымаўшы атэстат,

Францішак падаўся ў Пецярбург ва універсітэт і быў залічаны на першы курс, але не стаў студэнтам. Чаму? Не згадзіўся з новымі студэнцкімі правіламі. Мажліва і так. Паехаў у Нежын, на Украіну, і падаў заяву дырэктару юрыдычнага ліцэя. Вучоба закончылася ў 1868 г., і будучы паэт пачаў працаваць судовым следчым у Чарнігаве, у Кралявецкім павеце, зноў у Чарнігаве, а потым у Волагдзе, пасля накіроўваецца ў Канатоп. Безумоўна, украінская песня, паэзія Шаўчэнкі, нацыянальная свядомасць інтэлігенцыі натхнялі Багушэвіча да творчасці.

Расстанне з радзімай, доўгачаканае вяртанне, праца ў Вільні адвакатам. Першыя свае вершы «Новы 1886 год», «Прывід надзеі» Францішак Багушэвіч напісаў на польскай мове. Ад гэтых часоў і пачынаецца паэтава сяброўства з вучоным мецэнатам Янам Карловічам, які ўхваліў паэтычныя спробы і, што важна, падтрымаў паэта матэрыяльна. За сем гадоў польскі часопіс «Край» змясціў звыш паўсотні артыкулаў ды нататак паэта. Тады ж Багушэвіч, які пачаў пісаць на роднай мове, занатаваў сваё знакамітае, надзённае і сёння: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі».

1891 год. Кракаў. Тут выходзіць першы зборнік паэта «Дудка беларуская». Праз тры гады ўжо ў Познані выдаецца другі зборнік «Смык беларускі». Ніхто тады, акрамя сяброў-таварышаў, і не ведаў, што за псеўданімамі Мацей Бурачок і Сымон Рэўка з-пад Барысава «хаваецца» адвакат, абаронца сялян Ф. Багушэвіч. Ён не крыўдаваў, што няма славы: трэба ж было некаму адраджаць пасля паўстання Каліноўскага новае беларускае слова, нацыянальную свядомасць, і ён рабіў гэта таленавіта, сціпла, непрыкметна, але вельмі дасканала. Любоў да народа нараджала талент, талент множыў любоў. Можа таму ён, мужыцкі заступнік, калісь напісаў: «Весці справу Вольскага задарма згодзен». І гэта не адвакацкая міласэрнасць, гэта быў яго жыццёвы прынцып. А сам Багушэвіч, трэба сказаць, знаходзіўся пад моцным ціскам матэрыяльнай нястачы.

Справы трохі палепшыліся, калі атрымаў спадчыну ды пераехаў у Кушляны. Тут усяго сябе, ужо цяжка хворы, аддаваў паэзіі. Скажам і не памылімся, што Багушэвіч зоркай найпершай велічыні ўзышоў на беларускім Парнасе.

За год да смерці ён здаў у друкарню зборнік апавяданняў і трэці зборнік вершаў «Скрыпка беларуская». На жаль, іх лёс дагэтуль невядомы.

Паэзія нашага песняра жыве, абуджаючы ў душах такі патрэбны ўсім матыў жыццялюбства, роднасці з зямлёю сваёй і сваім народам.

Ф. Багушэвіч паміраў з надзеяй, што распачатая ім асветніцкая хваля набярэ моцы. І ён не памыліўся. Праз год пасля яго смерці Цётка атрымала пасведчанне хатняй настаўніцы, а Я. Колас закончыў вучобу ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, а ў Радашковічах пачаў працаваць перапісчыкам у судовага следчага Я. Купала. Менавіта ім лёс наканаваў узняць песню Багушэвіча і на крылах свайго таленту несці беларускую душу да людзей, знаёміць з ёй увесь славянскі свет.

* * *

Прэч бутэлькі, люлькі, карты!
Марна траціць час не варта.
Хай жывыя рушаць з кіем
У святы паход!

Нас не край далёкі кліча
Вывучаць чужы нам звычай,
Нас чакае ў нашым краі
Родны наш народ.

Трэба ведаць наша поле,
Блізкіх нам братоў нядолю,
Што работай, кроўю, потам
Кормяць усіх нас.

Панясём жа пад іх стрэхі
Промень і святла, і ўцехі,
І настане час світання —
Абуджэння час!

Хай жа ўсе, усе, хто можа,
Возьмуць свой кіёк дарожны,
У край айчынны час ісці нам
Вывучаць свой люд.

## КАЛЫХАНКА

Люлі, сынок, люлі, люлі!
Усе курачкі паснулі,
Ой, паснулі і курчаткі
Пад скрыдэлкам сваей маткі;

А ты чаго не спіш, сынку,
Як бы чуў ліху гадзінку?
Можа, будзеш калі панам
Ці вялікім капітанам,
А як матка прыйдзе ў госці,
Ой, то будзе ёй радосці...
Сядзе матка ў кут на лаве,
Сын хлеб-соль прад ёй паставе.
Ручкі, ножкі пацалуе,
Памілуе, пажалуе;
Пачастуе мядком сытным,
Блінком мякенькім падсітным,
Піражочкам і з начынкай,
Верашчачкай гарачынькай...
Люлі, сынок, люлі, люлі...
Бо ўжо курачкі паснулі.
Ой, то будзе рада матка,
Хоць і простая салдатка,
А ўсякі шапку здыме,
Як дазнаецца аб сыне,
Люлі, сынок, люлі, люлі...
Бо ўжо курачкі паснулі.
Можа, будзеш калі панам
Ці вялікім капітанам,
Людцоў Божых будзеш біці,
Цяжка будзе ў свеце жыці,
Будуць клясці, як ліхога,
Прасіць смертанькі ад Бога.
Люлі, сынок, люлі, люлі...
Бо ўжо курачкі паснулі.
Тагды матка прыйдзе ў госці,
Сын выкіне стары косці,
Жабруючы, пойдзе ў вёску,
Будзе прасіць Матку Боску,
Каб забыцца ёй аб сыне,
Каб не ведаць, гдзе ён згіне,
Люлі, сынок, люлі, люлі...
Бо ўжо курачкі паснулі.
Ой, не будзь ты лепей панам,
Ні вялікім капітанам,
Будзь, чым матанька радзіла,
Каб у госці не хадзіла,
Каб век з табой векавала,
Гаравала, працавала...
Люлі, сынок, люлі, люлі,

Усе курачкі паснулі,
Ой, паснулі і курчаткі
Пад скрыдэлкам сваей маткі.

## ПЕСНЯ

Чаго бяжыш, мужычок?
— Паганяе мароз.
Чаму ляжыш, мужычок?
— Бо ўрадніка вёз.
Чаго ты п'еш, мужычок?
— Бо і хлеба не еў.
За што б'еш, мужычок?
— Бо і сам тое меў.
Нашто ты краў, мужычок?
— Бо свайго не пазнаў.
Чаму ты лгаў, мужычок?
— Бо хтось праўду украў.
Чаму чорны, мужычок?
— Бо ў хаце курыць.
Не праворны, мужычок?
— Бо ўсякі журыць.
Чаму цёмны, мужычок?
— Бо пад цёмным сяджу.
Чаму бяздомны, мужычок?
— Бо чужога гляджу.
Чаму хіцёр, мужычок?
— Бо дурны, як варона.
Чаму ўмёр, мужычок?
— Уцякаў ад «закона»!

## ВОЎК І АВЕЧКА

Злавіў воўк ягнятка
І панёс жывое!
Плачуць сын і матка,
Як бабры, абое.
Воўк над маткай злітаваўся,
Як які аконам,
У аўчынку перабраўся
Ды ідзець з паклонам.
«Прыйшоў,— кажа,— я здалёчку
Расказаць пані авечца
Добру вестку аб сыночку,—
Як яму цяпер жывецца.

Не пазнала б ніколі,
Такі стаў дасужы
І жывець сабе на волі,
Без бяды, без нужы.
Зубы выраслі з клыкамі,
І адпалі рожкі,
Ножкі цяпер з пазурамі,
Хвост даўжэйшы трошкі.
І ўжо воўка не баіцца,
Ў хлеў ніхто не гоне;
Мае чым абараніцца
І другіх бароне!
Прыйдзі, імасць, да нас ў госці,
Справім сабе вечарынку:
Будзе мяса, будуць косці,
Будзем есць без адпачынку!»
«Дзякуй, дзякуй, ягамосці,
За весці такія!
Няхай прыйдзе сын у госці,
Пагляджу, ці вые?
Бо, кажуць, меж вамі
Трэба быць ваўкамі.
Я ж па-воўчу не умею
Ні выць, ні есці, ні лгаць.
Ды скінь скурку, дабрадзею,
Бо зубкі відаць».
І авечка, хоць дурная,
А воўка ж пазнае!

## СВЕДКА

У нядзелю ранюсенька заходзіць да мяне Панасюк. Тое ды сёе, а потым кажа: «У тую суботу каб быў ты ў воласці ў сведкі на суд».— «Як у сведкі, дык у сведкі. Хоць я нічым нічога, казаў той, нікому ніколі».

Прыходжу — сядзяць. Я зірк — і ён тут, наш Бартак храмы.

Пытаюць суддзі: «А ты што знаеш аб гэтым дзеле?»

«Чаму,— кажу я,— не знаю? Ведама, усё, казаў той, знаю».

«Ну, дык кажы!»

«Як казаць,— кажу,— дык і скажу ўсё. Так і так,— кажу,— у мяне,— кажу,— Каруська (гэта жонка мая) надта, гадзіна, рана ўстае. Так якасьць пасля Пятра, якраз пасля нядзелі, чуць зорачка занялася, яшчэ нават і дзяр-

кач на балоце ні разу не дзёрнуў, калі яна прыходзе да мяне і будзіць: «Юзук, Юзук!» — «Ці ты,— кажу,— здурэла, ці што такое? Гэта ж,— кажу,— нядзеля».

«Гэта,— яна кажа,— учора была нядзеля».

Я схамянуўся: праўда, учора! Як так, дык так. «Ідзі ж ты,— кажа,— касіць на Лабок».

А той Лабок, каб ваша ведалі,— дык чысты лабок. Як пойдзеш касіць, дык сцімбіркі толькі дзылінкаюць ля касы ды казельчыкі скачуць, а сена толькі, сколькі валасоў вунь на галаве ў пана суддзі (адзін лысы быў)...»

«Ну, ну,— той кажа,— да дзела гавары! Ці відзеў?»

«Відзеў,— кажу,— чаму не відзець? Святлюсенька стала, покі расчухаўся. Вот расчухаўся, пайшоў пад свірон — узяць бы касу, а касы нямаш: сюды — нямаш, туды — нямаш! Ніяк не спомню, гдзе дзеў. Аж я гэта, як рэзаў барана яшчэ з восені ды ўткнуў у сцяну, дык яе там ці ржа пабіла, ці мышы вышчарбілі. Давай я яе кляпаць, а яна — давай крышыцца. Кляпаў-кляпаў, кляпаў-кляпаў...

Віджу — нічога не будзе, пара палуднаваць. Папалуднаваў, праўда — Каруська кіслага малака дала крышку, а ў нас перадойка гэты год была, казалі, палявала, а цяліцца — не цялілася. Пад'еўшы трошкі, думаю: падбягу да Барткі храмога,— вот і ён тут, не дасць салгаць,— пазычу касу. Пакуль тое ды сёе, туды ды сюды, калі і сонечка стала хавацца. Прыляцеў да Барткі храмога (а ён сусед), калі яго няма. Косіць, кажуць, тыкі ж на Лабку (і ў яго такія ж сцімбіркі); калі я слова сказаць, і Бартак тыц у хату,— і зараз пацямнела. Мы сабе аб тым ды аб сім, а пасля таго я пайшоў дахаты вячэраць. Як дзісь помню, еў зацірку з малаком. Дык чаму ж я не знаю? Усё знаю.

«А відзеў ты (пытаюць суддзі), як Пятрук Сушка Бартку біў?»

«Калі?» — пытаю.

«Да тагды, як тое было?»

«Не ведаю»,— кажу.

«Які ж ты сведка?»

«Але,— кажу,— які ж я сведка?»

І пайшоў дахаты.

А, праўда, па дарозе зайшоў да Барчыхі. А больш, дальбо, нічога не ведаю.

*Прыпісваецца Ф. Багушэвічу*

## ПАЛЯСОЎШЧЫК

(Апавяданне старога лесніка)

Трэці год ужо быў лесніком на графскай пушчы, хадзіў цягам па лесе, па оступах і ведаю, што мядзведзь ёсць-то ёсць, але Бог бараніў спаткацца аж да гэтага года: ды і цяпер не ведаю, ці відзеў я мядзведзя, ці не відзеў.

А вот як было: якраз у задушны дзень. Той дзень на ляпорт мы ўсе сабраліся. Прыйшлі рана, меўся лоўчы паляваць, ды штосьці з жонкай пабіліся, ці што, от так, яму было не да палявання, і пратрымаў нас да вечара, без нічым нічога, а пад вечар загадаў дроў нарубаць, так да ночы звялося.

Ноч цёмная, мне дахаты трэба ісці праз маю пушчу, праз оступ; дарогі ніякай няма, ідзеш логам, пасля градой, а пасля ізноў оступ; праз ручаёк доўгая старая ёлка, можа, ужо гадоў сто ляжыць вываратня, і па ёй пераходзім, бывала.

Якраз даходзячы да той вываратні, думаю сабе: «Вот, Божа барані, цяпер мядзведзь на спатканне...»

Аж шапка паднялася, аж сэрца ёкае, улез на вываратню, пугач недзе стогне ў старым дубе,— яшчэ страшней стала...

Калі чую: вываратня аж калышацца, хтосьці ідзе з другога канца на спатканне... Так і ёсць, ён, мядзведзь, сапець, аж страх. А дожджык як з рэшата сыпе. А ведаю я, што мядзведзь палахлівы, але ж і я не надта, каб ад яго смялейшы. Дай, думаю, спалохаю я яго. Як зараву я памядзведжаму — уга! А ён — шабалдыхць у балота, а крыкнуў, як чалавек: «Ах!»

Лячу бардзей дахаты, ці не задраў ён маёй каровы? Не, цэла, дзякаваць Богу, ходзе па гародчыку. Я ў хату шусць. «Жонка,— кажу,— мядзведзь за малым не задраў твайго Юзука!» Калі жонкі і ў хаце няма, дзеці спяць, сучка ляжыць пад сталом, смалякі гараць на прыпечку, і бульба прэе. Што за прычына? Я туды, я сюды — няма жонкі; ці не павесілася, думаю, са злосці, што мяне няма, а яна тыкі злая. Калі пачакаўшы трохі, і яна ідзець у хату — уся мокрая, а дрыжыць, як лісток.

«Жонка,— кажу,— мядзведзь за малым не задраў твайго Юзука».

«А Божа ж мой, Божа, гэта,— кажа,— пэўне, той самы і мяне, спаткаўшы, хацеў задраць; як зароў, дык аж я ў балота па шыю ўляцела».

«Гдзе ж ты,— кажу,— яго спаткала?»

«На чортавай пералазцы (так завецца тая вываратня); ішла цябе спатыкаць ці з двара дахаты клікаць».

«А я,— кажу,— ішоў дахаты і на той пералазцы спаткаў мядзведзя і спалохаў яго, дык ён у ручай зваліўся».

«А можа, то я была?»

«Вот,— кажу,— я бы цябе не пазнаў? То мядзведзь быў, пэўне. Вот ты дык, можа, мяне спаткала, а не мядзведзя».

«Але? Нябось,— кажа,— я добра прыгледзелася: і морда яго, і хвост кароценькі, і зароў як трэба, аж засмярдзела».

«А бадай цябе пярун спаліў! Давай, баба, бялізну змяніць!»

Ну, так і будзе — нячыстая сіла, думаю, нас абое ў медзвядзёў перакінула, а мы самі і не ведалі, бо і чаго ж мне па-мядзведжаму раўці і ўсё рабіць, як мядзведзь са страху?..

Дык і хто яго ведае, ці відзеў я мядзведзя, ці не відзеў.

## АЛЬГЕРД АБУХОВІЧ (1840—1898)

**Здараецца часам так, што творчая асоба ацэньваецца не толькі сваімі творамі, але і грамадзянскім учынкам, выбарам сэнсу жыцця, якое найчасцей служыць высокім прыкладам для ўсіх астатніх, хто толькі пачынае разумець такія паняцці, як народ, духоўнасць, культура, вера. Усё трагічнае жыццё напаўзабытага беларускага пісьменніка Альгерда Абуховіча (псеўданім Граф Бандынелі) — яскравы доказ такой аксіёмы. Давайце ўважліва ўчытаемся ў нататкі сучасніка Абуховіча, яго вучня, пісьменніка і грамадскага дзеяча Язэпа Дылы:**

**«...У 1893—1894 годзе я быў вучнем трэцяга класа Слуцкай гімназіі, мой бацька, вярнуўшыся са службы, папярэдзіў маю маці, што вечарам у нас будзе госць.**

**— Ты, пэўна, чула пра пана Абуховіча? Паны лічаць яго дзіваком, бо ён адрокся ад маёнтка і сям'і і жыве на свой уласны заробак, знаецца з простымі людзьмі і нават піша вершы на простай мове, мове мужыкоў і рамеснікаў. Ён праз сваіх знаёмых гімназістаў даведаўся, што нашы хлопцы абодва вучацца ў гімназіі, і прыйшоў да мяне ў кантору, каб са мною пазнаёміцца, і вельмі мяне і цябе хваліў за тое, што мы так дбаем пра навучанне сваіх**

дзяцей... Я запрасіў да нас гэтага прыяцеля працоўнага народа, добрага і прыязнага людзям чалавека.

А вечарам таго дня мы слухалі яго, Альгерда Абуховіча, вершы на беларускай мове, пераважна байкі. У іх пісьменнік умела, у трапных выразах і словах высмейваў паноў і падпанкаў, заможных сялян і фанабэрыстых шляхцюкоў, ксяндзоў і царскіх «чынадралаў»...

Помніцца, што яшчэ разы са два Альгерд Абуховіч быў наведвальнікам нашай сям'і, і кожны раз пасля слухання яго баек, сатыры і вершаў мацнела ў мяне любоў да роднай мовы, і я ўжо не са слязьмі ў душы, а з гнеўнай упэўненасцю абараняў сваю родную мову, называючы тых, хто ставіўся з пагардай да яе, здраднікамі свайго народа.

Абуховіч вельмі добра валодаў французскай, італьянскай, англійскай і нямецкай мовамі. Лёгка чытаў на іспанскай мове.

На працягу некалькіх гадоў свайго знаёмства з пісьменнікам я меў магчымасць паслухаць пераклады Абуховіча з «Фауста» Гётэ, з «Разбойнікаў» Шылера, некаторых вершаў Віктора Гюго, Байрана, Дантэ. Уражанне ад пачутага ў мяне было моцнае.

Трэба таксама зазначыць, што ў Абуховіча былі пераклады з твораў А. Пушкіна, М. Лермантава, А. Міцкевіча, М. Канапніцкай, У. Сыракомлі.

Альгерд Абуховіч быў сынам заможнага землеўласніка на Случчыне. Разам з Казімірам Аколавым ён прымаў удзел у паўстанні 1863 года. Пасля адбыцця кары і вяртання ў сям'ю ён паставіў пытанне, каб зямлю аддалі былым прыгонным — сялянам. Супраць Альгерда Абуховіча ўзнялася яго сям'я, родная сястра, што замужам была за Ёдкам, таксама і іншая радня. Паколькі Альгерд Абуховіч быў цвёрдым у сваім рашэнні, яму, пасля вострых спрэчак, прыгразілі абвяшчэннем яго вар'ятам. У тыя часы такія справы не былі навіною, і царская адміністрацыя падтрымлівала тых, хто хацеў уціхамірыць падобных бунтароў супраць «асноў грамадскага жыцця». Тады Альгерд Абуховіч выбраў са сваёй бібліятэкі самыя любімыя кнігі і пакінуў родны дом».

Вось такі ён быў — Альгерд Абуховіч. Для некага, ачарсцвелага душою, без роду і племені, ён быў «дзіваком»; для такіх, як Язэп Дыла, для нас, ён — сумленны працаўнік літаратуры, пачынальнік першай хвалі адраджэння, энцыклапедыст. Прыйшоў час, і мы з пакаяннем вяртаем памяць яшчэ аб адным таленавітым сыне Беларусі. Яшчэ дадамо. Альгерд Якаў Абуховіч-Бандынелі нара-

дзіўся ў радавітай шляхецкай сям'і. У 1852 г. бацькі аддалі Ольдзю ў Слуцкую гімназію, але ўжо ў 1856 г. малады Альгерд едзе вучыцца ў Еўропу. За сем гадоў вучобы ў Жэневе, Парыжы ён стаў усебакова адукаваным чалавекам. Яшчэ ў гімназіі спрабаваў займацца літаратурнаю працаю. Публікацыі пры яго жыцці пакуль не выяўлены. Яго знакамітыя, таленавітыя байкі пачалі публікаваць у беларускім друку недзе ад 1915 г. Пакуль не адшукана і творчая спадчына байкапісца. Цяжкі быў жыццёвы і творчы лёс гэтага чалавека, але ж, моцны духам, ён адолеў перашкоды і сваёй сціплаю працаю прынёс гонар беларускай літаратуры.

Памёр Альгерд Абуховіч у Слуцкай багадзельні.

## ВОЎК І ЛІСІЦА

«На́ табе, нябожа,
Што мне нягожа».

Раз папалася лісіцы
Ажно тры злавіць курыцы.
Падушыла; дзве з іх з'ела,
Трэццю скрыла. Сама села —
Як па працы — пад стажком.
Воўк галодны йшоў нішком.
А што з кумою быў знаём,
То такую рэч павёў:
— Ах, сястрыца,— кажа кум,—
Я ад рання браў на вум,
Каб што-кольвек мне пад'есці,
А тут на злосць негдзе ўлезці.
Падхапіў бы я хоць птушку...
Да авец падходзіў збочку,
Ды пастух чупрыну чэша,
І сабака прытым брэша,—
Падступіцца няма складу!..
Дай ты, кумка, яку раду!
— Ох, мой куме даражэнькі!
То ж стог сена цалюсенькі.
Еж, як хочаш,— не шкадую,
Хоць апошнім, ды частую!
— Дзякуй, дзякуй! — сказаў шэры
І пацягся без вячэры.

## СУД

Там, дзе пушча, за прасёлкам,
Калісь ліс жыў з шэрым воўкам
І, як весць людская кажа,
Жыло згодна племя ўража,
Ды да часу.
Хутка сварка там пайшла
Ўкрыўдзіў нечым ліс ваўка,
Дайшло дзела да суда
Можа, праўда, можа, не,—
Адвакаты — два сабакі на судзе
Кожны брэша, на праціўніка вядзе
А суддзёю быў глушэц,
Ён разумны ці глупец,
Тое трудна разгадаць,
Адно толькі, як чуваць,
Што рашыў ён дзела так:
Выгнаць з суду ўсіх сабак,
А воўк з лісам плоцяць штраф
Воўк — бо хлусіць ён напрасна,
Ліс — бо злодзей.
Гэта ясна:
Круцялёў чым разбіраць,
Лепш абодвух пакараць.

## СТАРШЫНА

Хоць які парадак дай,
Адно тое, братка, знай,
Што крутнёю ўсё пакруціш
І найлепшэ збаламуціш.

---

Льва-манарха воўк прасіў,
Каб вайтом яго зрабіў.
Бо авечкі скрозь ў бязладдзі,
Шкодзяць вельмі ў панскім садзе
Ды і самі прападаюць,
Бо, як жыць, яны не знаюць.
І ліса за ім прасіла
(Яе жонка льва любіла).
Воўк з лісіцаю звязаўся
І, як можна, так стараўся:
Дзе прасілі, дзе ўздыхнулі,
Дзе гасцінца падаткнулі

Каб дабіцца да медалі,
І плацілі, і прасілі, і стагналі...
Леў гаворыць: — Ходзяць толкі,
Што авец з'ядаюць воўкі.
І сазваць сказаў народ
На звярыны вольны сход,
Паспытаць усіх звярат:
· Воўк ці добры, ці ён гад?
Чыны важны ўсе прыйшлі,
Ўсё начальства тут было,
Ды прычыны не знайшлі,
Зла аб воўку не чутно:
Пад судом ён, бач, не быў
І з начальствам добра жыў,
Дык медаль пан войт надзеў
На авечы цэлы хлеў.
А авечкі што сказалі? —
Іх на сход зусім не звалі,
А ўпісана ў пратаколе,
Што «авечкам дана воля».

## ЯНКА ЛУЧЫНА
## (1851—1897)

Пачынаць любую справу цяжка, асабліва літаратурную. Іван Люцыянавіч Неслухоўскі (псеўданім Янка Лучына) жыў у другой палове мінулага стагоддзя ў Расійскай імперыі. Паэт піша свае творы на польскай, рускай і беларускай мовах. Ён быў зроднены з моваю народа свайго і, дзякуючы ёй, сцвердзіў сябе як асоба, як паэт. У тыя часы літаратарам, беларусам па паходжанню, можна было выдаць свае кніжкі сціплым накладам у двух гарадах — Кракаве і Санкт-Пецярбургу. Кракаў быў за межамі царскай Расіі. Прагрэсіўная руская газета «Минский листок», трэба аддаць ёй належнае, друкавала, акрамя рускамоўных твораў, і беларускія вершы.

Ян Неслухоўскі нарадзіўся ў Мінску. Род ягоны імяніты. Дзяды яго былі ваяводамі, суддзямі, мелі маёнткі ў Пінскім павеце. Сям'я Неслухоўскіх жыла ва ўласным доме. Выдатна ў сям'і калежскага асэсара выхоўвалі дзяцей. Чатырнаццацігадовы Ян паступіў у Мінскую гімназію адразу ў трэці клас, скончыў яе ў 1870 г. у ліку лепшых вучняў і падаўся ў Пецярбург ва універсітэт. Паступіў, але матэматыка не вабіла яго, пайшоў вучыцца на інжынера.

Вучыўся, адзін час працаваў на чыгунцы аж у Тыфлісе, затым вярнуўся ў Мінск, нечакана захварэў, уладкаваўся ў тэхнічнае бюро Лібава-Роменскай чыгункі і пачаў пісаць вершы. Раней ён рыфмаваў словы толькі ў лістах да сяброў, а ў 1886 г. дэбютаваў вершам «Не ради славы иль расчета».

Якая ўсё ж існуе нябачаная, магутная сувязь і роднасць славянскіх культур! Прыехалі ў Мінск артысты з Украіны. Артысты падалі прыклад нацыянальнага самавызначэння. Янка Лучына цяпер будзе толькі на роднай мове абуджаць сацыяльную і нацыянальную свядомасць. І зажыло зноў беларускае слова, выведзенае на людзі паэтам, і вершы нараджаліся шчырыя, натуральныя, і паўсталі ў яго вершах думы і надзеі мужных, цярплівых і сціплых беларусаў. Ахвотна друкуюць яго вершы польскія штотыднёвікі «Жыццё», «Край», «Польскі голас» і іншыя. Ці не ўпершыню Я. Лучына і Ф. Багушэвіч вывелі ў сваіх вершах вобраз мужыка-беларуса, стан яго душы, побыт, гаворку. Гэта адкрыццё простага чалавека не пазбаўляла вершы лірызму і эмацыянальнасці.

Пасля смерці Я. Лучыны руплівыя нашчадкі і прыхільнікі яго паэзіі выдалі ў Пецярбургу кнігу вершаў «Вязанка». Па сённяшніх мерках паэт напісаў небагата, але ці ж колькасцю вымяраецца паэзія! Я. Лучына быў асветнікам, не даў памерці роднай мове, умацаваў духоўнасць народа і надзейна перадаў эстафету таленавітым паслядоўнікам. За гэта яму наша пашана і падзяка.

## ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

Ой! Скажэце, скажэце,
Як жыць трэба на свеце?
Хмары скрылі нам сонца,
Вецер вые над нівай,
У каторай старонцы
Шукаць долі праўдзівай?
Той улева, той управа
Хочуць весці нас радай,
Трэці надта цікавы,
Куды пойдзем грамадай.
Ні адзін жа не скажа,
Куды будзе дарога...
Што нам братне, што ўражжа
Пытай праўды у бога.
Папытайся сумлення

Дый розум мей ўласны,
Як наскочуць здарэння
Ці прыпадак няшчасны,
А то думай на сходзе
Ці пытайся у Іцка.
Што ж, каго там абходзе
Наша доля мужыцка.

## СТАРАСЦЬ НЕ РАДАСЦЬ...

Пiлiп

Старасць не радасць, куме! Не раўнуючы як той конь, быў ды з'ездзіўся, так і я...

Грыгор

Яшчэ ж не саўсім з'ездзіўся. Па том адначэ на вас, куме, старога трэба са двое маладых сягонняшняга гатунку каб падужалі

Пiлiп

Ой не! Не тое яно!.. Бывала, па паўбочкі жыта, ускінуўшы на плечы, нясу, а цяперака і самога сябе часамі панесці цяжка. Ну! на тое — век мой вялікі... Лічыце ж, што мой старшы сынок Ян пад Севастопалем галоўку палажыў З другое дачкі Уляны, што за Прахорам, унучку, ужо гады чатыры, як замуж аддавалі. Другіх дзетак Бог забраў, а гэтыя два мае блазны... дык гэта ж саўсім смуроды проціў братоў, а і яны ўжо на лес гледзячы павырасталі А ці мала на вяку ўсякага ліха перабылося?

Грыгор

А ёй!

Пiлiп

Тое ж то яно! Вось і цяпер і маю тую думку, што не жыць мне другога веку. Малады можа, а стары дык мусіць. Прызнацца, куме, не хацелася бы сякі-такі лад, што ў хаце пазаводзілі, пабачыць на старасці лет маіх папсованым Што ж? падзяліўшы на двое і поле, і сенажатку, і хатку і ўсякую худобу і таму і другому — не быць гаспадаром як мае быць... Не папнешся, калі няма на чым... От я, значыцца, і пастанавіў сабе так дзяліць маіх дзетак: аднаму здам гаспадарку, другому грашмі дам тое, што яна варта Хочаш, купляй зямлю, будуйся, гаспадар, хочаш, за другое што бярыся... як сам ужо знаеш...

Грыгор

Ну, а сыны што на гэта?

Піліп

От тут-то і самы клопат! І той бацькаўшчыну хоча і другі... Мы, кажуць, тату, тут параслі, тут і жыць хочам. Каб я, значыцца, аднаго сына відзеў за што лепшае проціў другога, ну сказаў бы, так!.. і канец! — так хачу, так і будзе. Дык што ж тут парадзіць, калі абодва, дзякаваць Богу, мае хлопцы і працавіты, і не лайдакі, і сумленны, і мяне старога і шануюць і слухаюць!..

Грыгор

Але ж... гэта і мы відзім...

Піліп

Вось жа, уважайце сабе, куме, які спосаб Бог мне і думцы пасылае... Не дзіва, што і Антось і Змітрук у мяне слухмяныя хлапцы, бо я яшчэ і цяпер і за лоб і бізуном задам, абы што... Пабачым, як яны спраўляцца будуць, па сваёй волі жывучы!.. Няхай жа Антось з віцінай* сходзіць аж за граніцу і раз і другі, а Змітрука аддам пану, ён бо, бачыце, пытаўся ў нас хлапца да гаспадаркі, аж кудысь на Украіну, казалі, ці што... Ну, няхай хлопцы свету пабачуць... Вось мы тагды і пабачым... (Уваходзіць Кацярына.)

Кацярына

Што? што ты кажаш?.. кабы дзецюкоў нашых немаведама куды пасылаць?.. Ды не, ды што ты гэта!.. Што ты гэта, стары, уздумаў?.. Ці, дзякаваць Богу, у хаце няма куды дзецца?.. Ці што якое... ці роднаму дзіцяці хлеба шкадуеш?..

Піліп

Ціха!.. не крычы!.. бабскі твой розум, як за грош люлька!.. Што ж, на згубу, ці што, альбо на век сыноў пасылаю. Дзеля іх жа дабра і навукі, вось што! Не бойся, і звернуцца і нацешымся імі, і нам з табою скажуць: дзякуем! за гэта самае... Чаго раскудахталася?.

## З ПАЭМЫ «ГАНУСЯ»

Заходзіць сонца за горы,
Пакладісь цені па лесе,
Вяршына старой аборы
Пазалацілась на стрэсе

Вось вецер цёплы ад рэчкі
Нясе пах з лесу жывіцы,
І польных кветкаў, і грэчкі,
І мурматанне крыніцы.

Як ціха! Там, у патока,
Кулік часамі засвішча;
Толькі здалёка, здалёка
Шуміць з карчомкі ігрышча

Знаць, там гуляюць і рады,
Знаць, весяляцца багата,
Гутараць старцы грамады
І скачуць хлопцы, дзяўчаты.

Чаму ж па лесе, па полю,
Як воўк, адзін я заўсюды?
І плачу ціха на долю,
Поўны смутку і нýды?

Чы не такі я, як людзі?.
Чаму ж грамады дзічуся?
Ой, жаль мне ўеўся у грудзі
Па табе, зорка Ганрся!

Дзеля багацтва — старому
Ўсе твае крáсы дзявочы!.
Дзеля худобы — з сарому
Не кажу людзям я вочы!

Толькі між хвоі, бярозы
Бягуць па лесе у сваты
Мой голас смутны і слёзы
Ганеся, зорка мая ты!.

# КАНДРАТ ЛЕЙКА
# (1860—1921)

Імя гэтага пісьменніка і педагога зусім нядаўна стала шырока вядомым. Нарадзіўся ён у вёсцы Збочна, якая знаходзіцца недалёка ад Слоніма. Чытаць Кандрат навучыўся рана, і хутка яго паслалі ў Азярніцкае вучылішча, дзе ён быў любімым вучнем настаўніка Вікторскага. Акрамя вучобы, хлопчыку трэба было дапамагаць сям'і, і ён працаваў пастушком. Аднойчы прастудзіў ногі, і гэта хвароба давала аб сабе знаць усё жыццё.

Кандрат скончыў школу, і настаўнік Вікторскі, бачачы вялікія здольнасці хлопчыка, зрабіў усё магчымае, каб К. Лейка вучыўся ў Свіслацкай семінарыі за казённы кошт. Пасля яе заканчэння працаваў настаўнікам. У гэты час Кандрат Лейка пачынае пісаць творы на забароненай тады беларускай мове.

Ногі пісьменніка не пераставалі балець, і ён вымушаны быў змяніць клімат і пераехаць у Харкаўскую губерню, дзе працаваў настаўнікам у Аснавянскім народным вучылішчы. Праз некаторы час, набыўшы званне настаўніка павятовага вучылішча, Кандрат Лейка пачаў працаваць у вучылішчы для сляпых дзяцей. Гэта, як ён сам пазней казаў, была яго любімая праца. Але хутка ён зноў пераязджае ў Беларусь і пачынае друкавацца ў газеце «Наша ніва». Яго творы вельмі спадабаліся чытачам, і ў 1914 г. Янка Купала пачаў збіраць матэрыялы для выдання асобнага зборніка твораў Кандрата Лейкі. Але ж кніжка не была падрыхтавана. У 1918 г. у пісьменніка адняліся ногі, хвароба прыкавала да пасцелі. Яго перавезлі ў горад Здалбунаў Ровенскай вобласці, дзе жыў яго родны брат і дзе яго маглі даглядаць.

Да канца сваіх дзён пісьменнік не пераставаў пісаць, хоць гэта і было вельмі цяжка. Увесь час ён хацеў вярнуцца на сваю радзіму, памерці на роднай зямлі. Але гэта яго мара так і не збылася. Ён памёр у Здалбунаве і там жа пахаваны.

## КУЛЬГАВЫ ДЗЯДЗЬКА РАМАН

(Беларускія тыпы)

Ці зналі вы майго кульгавага дзядзьку Рамана?

Не, вы яго не зналі... З пісьменных яго ніхто не знаў, але простыя, цёмныя людзі ўсе яго добра зналі.

Ён жыў у канцы сяла Збочнага ў маленькай, запаў

шай у зямлю па самыя вокны, хатцы. Жыў не адзін, а з сваімі двума стрыечнымі братамі, з іх жонкамі і дзецьмі. Аб тым, каб жаніцца самому і абзавесціся сваім гняздом, Раман ніколі і не думаў Дый якая б дурная кабета за яго пайшла, калі ён зусім не меў ног і не хадзіў па зямлі, як другія людзі, а поўзаў, за што і празвалі яго паўзуном Ногі ў Рамана аднялiся яшчэ ў дзецтве ад нейкай ліхой хваробы

Адняўшы ногі, Бог нагрbody дзіў яго тым, што даў яму над та цікавы розум і здатныя да ўсяго рукі. На што, бывала, кульгавы ні гляне сваім вокам — усё сам зробіць, і не маг ло знайсціся ў гаспадарцы такога дзела, каторага б ён не абмысліў як трэба і не справіў.

Жанкам Раман гастрыў нажы, шыў чаравікі, вязаў бёрды; мужчынам галіў бароды, кляпаў косы, правіў хамуты, падпраўляў старыя боты і рабіў шмат чаго іншага

Апрыч здольнасці да ўсякага майстэрства, Раман яшчэ і пісьменны быў: ён добра ўмеў чытаць друк па-польску і па-руску, разбіраў скорапіс і мог нават распісацца за няграматнага.

Усякі будзённы дзень Раман уставаў да свету і з пацерамі прынімаўся за работу: рэзаў на кускі калінавыя кіі, шчапаў іх на драначкі, стругаў трысцё і вязаў бёрды або з старых халяў шыў каму-небудзь башмакі ці падшываў лапці. Вечарамі, дакончыўшы сваю работу, Раман памагаў жонкам братнім у іх рабоце: чысціў бульбу, крышыў капусту, малоў семянё або забаўляў плакаўшых дзяцей, ка торых надта любіў і шкадаваў.

Не даваў сабе Раман спачынку і ў свята. Устаўшы з пасцелі раненька, ён па заведзенаму звычаю перш галіўся, потым умываўся і пачынаў маліцца. Маліўся доўга, набожна і з жалем вымаўляючы кожнае слова; а дакончыўшы маліцца, моцна біў сябе ў грудзі кулаком, кажучы: «Божа вялікі! адпусці мне цяжкія грахі, як вольныя, так і нявольныя... Ці словам, ці дзелам, ці памышленнем саграшыў проціў цябе, Божа з высокасці,— злітуйся нада мною грэшным і адпусці мае цяжкія віны...»

Слухаючы збоку гэты набожны лямант, здавалася, што Раман на сваёй душы мае нейкі цяжкі грэх, што ён, можа, забіў каго або дапусціў сябе да якой-небудзь вялікай распусты. Але ўсім ведама было, што Раман ні ў чым не прашкапіўся* і не тое, што чалавека,— мухі і тае ніколі не скрыўдзіў, з сваёй убогай хаты нікуды не выпаўзаў і апрыч сухога хлеба з бульбай, ніякіх трункаў* і ў вочы не бачыў

Дарма што Раман нікому не зрабіў ніякай крыўды, але ён лічыў сябе вялікім грэшнікам перад Богам; маліўся яму, як самы цяжкі праступнік, і стараўся як можна больш рабіць людзям дабра, каб праз тое дагадзіць Богу.

У кожнае свята, па абедзе, нізенькая і цёмная хатка Рамана напаўнялася простым, бедным людам, што з усіх вёсак прыходзіў да кульгавага дзядзькі на раду аб розных сваіх справах.

От прыйшоў, апіраючыся на тоўсты сукаваты кій, дзед Якуб і, усеўшыся на лаве, жаліцца Раману, што над ім надта здзекуюцца стараста і старшына, да просіць напісаць на іх жалабу міравому пасрэдніку, каб ён разабраў гэту крыўду.

— Добра,— кажа кульгавы дзядзька,— напішам.. Крыўду трэба звадзіць, каб і звання яе не асталося паміж людзьмі.

Прызываюць суседскага хлопчыка, што ходзіць да школкі, і той пад Раманаву дыктоўку піша пасрэдніку жалабу на старшыну і старасту.

Не паспеў дзед Якуб падзякаваць за просьбу і выйсці за парог, як скрыпнулі дзверы, і ў хату ўвалілася тоўстая кабета і, трошкі аддыхаўшыся, затараторыла:

— Раманка, мой ты саколік, палічы, колькі будзе таму рокаў, як умёр мой гаспадар. Справу гэту трэбуе ад мяне ненашта стараста, але я сама ніяк не магу злічыць...

Падумаўшы, Раман кажа жонцы:

— Пасля твайго гаспадара праз пяць гадоў і тры месяцы памёр Янка Сянькевіч, а пасля Янкі праз тры рокі і шэсць месяцаў адышоў на той свет Пятрусь Шчарбацюк, а з таго часу, як памёр Пятрусь, прайшоў ужо адзін рок і тры месяцы,— значыцца, ад смерці твайго гаспадара прайшло дзесяць гадоў. Гэтак і скажы старасце.

— І гэтак праўда, дзядзюхна, будзе?

— Праўда,— успакайвае яе Раман,— як аман у пацерах!

Тоўстая кабета, падзякаваўшы, ідзе сабе дадому.

За ёю ў хату ўваходзіць маладая салдатка з пісьмом у руках і просіць дзядзьку, каб барджэй прачытаў яго.

Дзядзька ледзьве-ледзьве разбірае пісьмо па складах. Жонка, схіліўшыся над ім, слухае і паціху плача, бо яе мужык-салдат у пісьме жаліцца, што цяжка служыць у чужой старане, што здароўе надта благое...

Дачытаўшы пісьмо да канца, Раман, звярнуўшы яго, аддае салдатцы; тая хавае яго за пазуху,— пасля, выцершы хустачкаю заплаканыя вочы, кажа:

- Я яшчэ да цябе, дзядзюхна, маю просьбу: будзь ласкаў, скажы, ці можна будзе ў аўторак на той нядзелі, што прыйдзе, сушыць сена: якая на гэты дзень выпадае пагода?

Кульгавы дзядзька дастае з паліцы старую запэцканую ў сажу кніжку і, развярнуўшы яе, доўга разглядае там нейкія стоўбікі, лічбы і надрукаваныя кружочкі і паўкружочкі; после, абярнуўшыся да кабеты, кажа:

- У панядзелак на тым тыдні, што будзе, месяц мае рушыць з поўдня. Якая будзе пагода ў панядзелак, гэтакая будзе пагода і ў аўторак. Калі ў панядзелак не будзе дажджу — у аўторак смела ідзі растрасаць капіны сена.

Кабета дзякуе і ідзе дадому.

Вечарамі кожнае свята мужчыны з усяго сяла збіраюцца да Рамана галіцца, стрыгчыся, а то і так пабалагурыць а тым ды а сім.

Гэтак і праходзіла ўсё Раманава жыццё: буднямі ён рабіў бёрды, шыў чаравікі, набіваў вёдры, кляпаў косы, а ў свята чытаў салдацкія пісьмы, памагаў суседзям у іх гаспадарскіх рахунках, абвяшчаў наперад пагоду, галіў і стрыг мужчын,— адным словам, кульгавы дзядзька дзеля бедных вясковых гаспадароў быў залаты чалавек.

Але, працуючы на людзей і дзень і ноч як у будні, так і ў свята, Раман усё ж такі не меў добрага заработку; і ў хаце яго не тое, што якой акрасы, часта не было нават і чорнага хлеба, і ўся яго сям'я не раз галадала. Дзе ж тут што зарабіць, калі да яго ішлі адны бедакі, ці галышы, як іх называюць у Беларусі пад Слонімам. Зробіць, бывала, кульгавы дзядзька бярдо або сшые боты, і яму за гэта дасць паўзлотку, многа — злоты, а то і проста — кусок хлеба; а другі і гэтага не дасць, а, узяўшы падпаху работу, толькі скажа:

— Не гневайся, майстраньку, па восені, можа, Бог дасць, будуць лішнія медзякі, то ўжо тады і заплачу табе...

— Нічога, братка, памірымся... Калі не заплаціш ты, то Бог заплаціць,— адказваў кульгавы.

Аднак прыходзіла і адходзіла восень, за ёю паўзла маразлівая зіма, а медзякоў лішніх ні ў каго не было, і Раману за работу ніхто не плаціў...

Часта да Рамана заязджалі жабракі з Палесся і падбухторвалі яго, каб ён з імі ехаў жабраваць.

— Як паедзеш з намі жабраваць,— гаварылі яны яму,— то азалоцішся. На Палессі будзеш у кірмашны дзень збіраць не менш, як рублёў дзесяць або і два-

наццаць, бо там надта людзі добрыя і жаласлівыя.

Не, браткі,— адказваў ім Раман,— гэтага не будзе, каб я пайшоў жабраваць... Хоць адняў у мяне Бог ногі, але даў моцныя і да ўсяго здольныя рукі. Пакуль буду жыць, датуль буду працаваць і Бога хваліць!

І жабракі, не дабіўшыся нічога, з вялікім сорамам ад'язджалі дадому.

От ужо і састарыўся Раман. Зніклі сілы; работа з рук валіцца, стаў часта хварэць; а после і зусім занядужаў Ляжыць кульгавы дзядзька ў лахмоцці на запеку і цяжка стогне. Твар пазелянеў, вочы патухлі і ўваліліся; сам ледзьве-ледзьве дыша. Сабралася каля хворага ўся сям'я,— плачуць...

Раман раскрыў вочы, глянуў на радню і кажа:

Выбачайце, мае саколічкі, можа каго абідзеў . Я ўжо паміраю. Бывайце здаровы... Там, пад запекам, у кутку закапаны чатыры злоты; я іх прыгатаваў на пахаванне Злоты аддасцё Адаму, каб зрабіў труну; два злоты бацюшцы за адпяванне, а злоты падзяліце паміж жабра камі, каб памянулі маю грэшную душу...

Сказаўшы гэта, Раман цяжка ўздыхнуў і навекі закрыў свае вочы

## НА НАДВОРКУ І Ў ХАЦІ

Жонка разаслала на надворку радно* і рассыпала на ём жыта, каб прасушылася перад узмолам. Як адно яна адышла ад радна, зараз з загумення прыляцело на жыта два вараббя: адзін малады, жвавы і спрытны, а другі стары, вахлаты з крывымі перабітымі нагамі.

Малады сеў на жыта і, падскокваючы, пачаў кляваць зярнята, а стары стаяў каля радна і сумна глядзеў на свайго таварыша, як той коўтаў смашную страву Хацеў і ён клюнуць зярнятко, але нахіліўся на крывых нагах і трашкі не ўпаў

Малады варабей, наеўшыся жыта, абярнуўся да старо го, нешта джыўкнуў яму і стаў зноў кляваць жыта. Набіў шы зярнятамі поўную дзюбку, ён падскочыў і сеў проці старога вараббя. Стары прысеў і шыроко раззявіў свой роцік, а малады падняў голаў і пачаў кідаць із свае дзюбкі ў рот старому зярняты.

Як адно стары наеўся, абодва вараббя падняліся і джыўкнуўшы вясёло, паляцелі зноў у загумення.

У хаці на запеку ў пасцелі сядзела падслепаватая бабуся і ела з міскі крупнік. Рукі яе дрыжалі ад старасці, і яна аблівала крупнікам сяннік і радно, якімі ўкрывалася

Сынавая, угледзеўшы гэто, падышла да старое і закрычала:

— Зноў запэцкала ўсю пасцель, сляпая сава. . Толькі і работы, што за табою даглядай кожны дзень. І калі ўжэ цябе спрутак возьме, дармаедка...

Аблаяўшы старую, сынавая вырвала з яе рук міску з крупнікам і паставіла на палічку. Бабуся сядзела галодная і горка плакала...

## ЮРКО І БУСЕЛ

Звіў бусел на Юркавым гумне гняздо. Бусліха нанесла яец і выседзела дзяцей. Як адно буслянята вылупіліся з яец, бусліха паляцела на балото шукаць ім смачнае стравы. На балоці над бусліхаю страслася бяда: нейкі дрэнны хлопчык, падкраўшыся, разбіў ёй каменем галаў, і яна лішылася жыцця. Буслянята асталіся сіратамі.

Бацько іх, стары бусел, пабедаваў трошкі, пагараваў і ўзяўся гадаваць сваіх дзяцей: ён кожны дзень па некалькі разоў лятаў на балото, збіраў, што знаходзіў там лепшайшаго дзеля стравы, і адносіў у гняздо сваім дзеткам. Буслянята ў дабрэ раслі, паўнелі і ўчыліся лятаць пад даглядам свайго бацька. Падросшы, яны пачалі самі сабе здабываць яду.

Зараз пасля Усплення буслэ сталі збірацца на адлёт у вырай. На ўзгорку, недалечко ад Юркавага гумна, злецелася іх мо штук з дваццаць. От і стары бусел зняўся з Юркаваго гумна і паляцеў з сваімі сынамі да таварышоў. Прыляцеўшы да гурту, ён спусціўся на зямлю і заклекатаў, быдто гаворачы:

— Паглядзеце, браткі, якіх я вам маладцоў прыставіў.

Буслэ, падняўшы головы, клёкатам радасна прывіталі маладых таварышоў. На другі дзень старыя і маладыя буслэ зняліся і гуртком паляцелі ў вырай...

На Тройцу ўмерла Юркава жонка і аставіла асірацелымі двох хлопчыкаў: Зыдарка пяці гадочкаў і Гарасімка трох гадкоў. Хлопчыкі хадзілі голыя і галодныя, бо бацько іх штодзень зранку да поўначы сядзеў у карчме, лайдачыў, а на дзяцей сваіх не звяртаў ніякое ўвагі. Як галодныя дзеці прасілі хлеба, Юрко крычаў:

— Гдзе я вазьму вам хлеба, гіцлі,— мне самому нечага жраць... Ідзеце жабраваць, шчаняты!..

Без догляду дзеці не маглі доўга жыць: Зыдарка ўпаў у рэчку і ўтапіўся, а Гарасімка памёр з голаду. Хавалі хлопчыкаў чужыя людзі, а бацько ляжаў у карчме п'яны.

## БЧОЛЫ

Пайшлі ў вуллю непарадкі,
Не слухаюць бчолы маткі.
— Трэба матку нам прагнаці
І новы жыццю ўклад даці;
Тако ж труцняў цэлу роту
Трэба выгнаць на работу,
Годзі ім салодка спаці,
Хай мяды ляцяць збіраці.
Гэдак бчолы ўсе крычалі
І з'яднаўшысь бунтавалі.
Матка збітая упала,
Захварэла дый сканала;
Труцні ў поле паўляталі
І там з голаду прапалі.
Бчолы, што ў рабоці млелі,
Цяпер у вуллю сядзелі,
Урад вольны закладалі,
Новых радчых выбіралі.
Ішлі спрэчкі і гамоны,
Вулей стаў быдто шалёны.
Адзін кажэ: «Гэдак будзе!»
Другі крычыць: «Не, не будзе!»
Справа гук: «Давайце матку!»
Злева: «Выгнаць іх дзеля
парадку!»
Калоцяцца, спрачаюцца,
А работы чураюцца.
Прайшло лето — німа ладу,
Ні прыплоду, ні ураду.
Мёды зсяклі, сатэ спрэлі,
Бчолы ў зіму пакалелі...
Напрадвесну вулей пусцеў,
Толькі чарвяк у вуглу сядзеў.

## СТАРЫ УЛАС
## (1865—1939)

Нарадзіўся Стары Улас (сапраўднае прозвішча Уладзіслаў Пятровіч Сівы-Сівіцкі) у Валожыне. Застаўшыся круглым сіратою, спачатку гадаваўся пад апекаю цёткі, а калі падрос, пайшоў у памочнікі да кухара графа Тышкевіча. Працавіты хлопец праз некаторы час ужо выконваў

работу кухара, потым быў аб'ездчыкам, а ва ўзросце трыццаці гадоў стаў ляснічым.

Аб'язджаючы абшары Налібоцкай пушчы, назіраючы за прыродай у розныя поры года, Сівы-Сівіцкі не мог не захапляцца роднымі краявідамі, якія цешылі сэрца, натхнялі на творчасць. Таму шматлікія яго вершы прысвечаны роднай прыродзе, яе прыгажосці. Тэматыку для вершаў давала таксама штодзённая праца ляснічага, назіранні за жыццём звяроў і птушак, збіранне вуснай народнай творчасці. Усё гэта ўплывала на моўнае багацце вершаў Старога Уласа.

У 1914 г. ён быў пераведзены на службу пад Ашмяны, потым жыў нейкі час у Вільні, працаваў у Сужанах Віленскага павета. Запаветная мара прыдбаць зямлю споўнілася ў 1934 г., калі за службу Стары Улас атрымаў ад графа Тышкевіча кавалак зямлі ў Шашэльгішках таго ж павета. Але нядоўга працаваў ён на ўласнай зямлі — у 1939 г. паэт памёр ад запалення лёгкіх. Пахаваны на Сужанскіх могілках.

З 1909 г. Стары Улас пачынае друкавацца ў «Нашай ніве». Ён — паэт эпічнага складу. Кожны яго верш — вынік назіральнасці, нейкай падзеі альбо здарэння. У сваіх вершах Стары Улас сцвярджаў маральныя прынцыпы чалавека-працаўніка, гумарыстычна высмейваў заганныя людскія звычкі — п'янства, гультайства, хабарніцтва, казнакрадства. Цікавыя яго разважанні на адвечную тэму — бацькі і дзеці — у вершы «З кутка праўды». Калісьці, разважае паэт, у маладосці бацькі былі такімі ж, як і іх дзеці, а можа, нават і горшымі, таму бацькам трэба не наракаць на дзяцей, а памагаць ім. Некаторыя вершы паэт складаў на аснове народных легенд, паданняў. Яго ў першую чаргу цікавіла маральная падаснова легендарных падзей.

У 1909 г. Стары Улас друкуе паэму «Год беларуса» — вельмі адметны твор у дарэвалюцыйнай беларускай паэзіі. Асноўныя дзеючыя асобы ў паэме — беларускі селянін і беларуская прырода. Паэма напісана народнай мовай і насычана тыповай народнай вобразнасцю.

## НЕ СПАНАТРЫЎ*

Як чутно, дык гэтак, мусі,
Ў нас на цэлай Беларусі
Кожны двор і кожна хата
Мае прыказак багата

Ў кожнай справе, ў кожным дзеле,
Як падумаеш тыкеля.
А спісаць іх ўсе з натуры,
Дык валовай мала скуры.
Але прыказкі ўсе гэты
Не ліхой бываюць мэты,
Іх прыкмеціць толькі штука,
А там — кожнаму навука...

Ў адной вёсцы даўнавата
Жыў адзін мужык багата,
Так, як іншы раз бывае,
Калі ў масле сыр плывае.
Меў і грошай, і будынку,
І харошую скацінку,
Меў дачушку і сыночка —
Удалога адзіночка.
А пражыўшы веку спора,
Як прачуў канец свой скора,
Залёг стары ў караваці
Ды дзяцей к сабе стаў зваці.
«Дзеткі,— кажа,— мае мілы,
Я ўжо блізак да магілы!
Табе, дочка, трэба будзе
З волі божай пайсці ў людзі.
А ты, сынку, як Бог здарыць,
Калі будзеш гаспадарыць
Водле бацькаўскага ладу,
Дык старога помні раду:
Калі ты ідзеш з сахою,
З возам, з бараной, з сяўнёю,
Не кажы, ідучы з дому,
«Памажы, Божа!» нікому.
А другое знай, ці чуеш? —
Як арэш ці барануеш
Ды дамоў будзеш адходзіць,
Абгародзіць не зашкодзіць.
І нарэшце помні гэта:
Ці то восень, вясна, лета,
Ці зіма — каб круглым годам
Табе яда была з мёдам».
Расказаўшы гэта сыну,
Ён у тую ж часіну,
Так казалі ўсе аб гэтым,
І расстаўся з божым светам

Яго пекна пахавалі,
Успамінкі, бач, спраўлялі,
Прадаўшы на то карову,
Далі на мшу трырублёву,
А яшчэ тры разы столькі
Заняслі у манаполькі*.
Прызабыўшы крыху гора,
Сястра замуж выйшла скора.
Брат быў справіў ёй вяселле
І ўсяго на наваселле
Даў і нават не скупіўся.
Ды жаніцца сам жаніўся.
А натуру меўшы шпарку,
Ўзяўся сам за гаспадарку.
Як ідзе ці едзе, можа,
То не дасць «Памажы, Божа!».
А араць ідзе з сахою,
Вязе плоту воз з сабою,
І як толькі араць годзе —
Што ўзарэ, тое гародзе.
После даў сабе выгоду:
Накупляў і пчол і мёду,
Есць уволю і сыцее,
Але штось не багацее.
Парой не ўсее, не уробіць,
Дык і збожжа ўжо не родзіць.
І карысці няма з плоту,
Ды сагнаў з мёду ахвоту.
Спахмурнеў хлапец, казалі,
Ды смяяцца з яго сталі:
Ці пашкоджана сяліба,
Ці з мазгоў сышоў ён хіба?
Ён-то неяк раз вясною,
Сеўшы ў полі пад мяжою,
Аб сваім думаў няшчасці,
Плакаць стаў і бацьку клясьці,
Што не шэнціць і не родзіць.
Аж мяжою падыходзіць
Да яго дзядок старэнькі,
Ўвесь, як галубок, сівенькі,
І з кіёчкам, торба бела
На плячах яго вісела,
Ды каптанік на ім новы,
На нагах лапці ліповы.
З яго вочак святлом біла.

Стала хлопцу неяк міла.
А як стаў, разгаварыўся.
Дзядок стаў пытаць паволі,
Чаго плача ён на полі:
«Ці бацькоў то смерць забрала?
Ці няшчасце напаткала?
Ці жыццё табе дадзела?
Гавары мне, сынку, смела!»
«Не, не маю я нічога,
Ані крыўды ні на кога,
І ніхто мне не пашкодзіў —
Мяне бацька мой сазводзіў».
Ды прызнаўся перад дзедам,
Як той есці казаў з медам,
Гарадзіць пашню на полі,
Прытым не казаць ніколі,
Ідучы на поле з дому,
«Памажы, Божа!» нікому.
Паківаў дзед галавою:
«Сынку, робіш ты не тое
І на бацьку дарма брэшаш,
А за гэта цяжка грэшыш.
«Памажы, Божа!» не даці —
Гэта значыць не заспаці
І старацца, мой саколе,
Чым найраней выйсці ў поле.
Дык не ты ўжо дасі людзям —
Табе кожны даваць будзе.
З гарадзьбой рэчы такія:
Узарэш гонцы*, другія,
Абжэнь* сошкай ці баронкай,
Абгародзіш баразёнкай.
З мёдам то такая справа:
Кожная салодка страва
З'ясі смачна, мёд пачуеш,
Калі добра папрацуеш».
Рэкшы гэта, дзед старэнькі
Зноў мяжою праз засценкі
Ўжо далёка апынуўся.
Покуль з думак быў ачнуўся
Наш хлапец, ніхто аднача
Анідзе дзядка не бачыў.
Скуль узяўся і дзе дзеўся,
І што ён рабіць тут меўся,
Хто ён быў, ніхто не знае.

Быццам сам Бог, хлопец бае,
Бо з той пары ў яго хаце
Скора знайшлося багацце,
Стала зноў радзіць на полі,
І ўсяго было даволі
А суседзі яго тыя,
Людзі злосныя, благія,
Што смяяліся, брахалі
Завідаваць яму сталі,
Гэтак бывае часамі,
Але ведаем і самі,
Што на свеце так бывае
Хто працуе, той і мае!

## У ДАЖДЖЛІВЫ ЧАС

Доўга у хаце нашыя брацці
Рукі злажыўшы сядзелі,
Бо, як на згубу, дождж ліў як з лубу,
Ліў праз чатыры нядзелі.

Цяпер жа многа выслаўляць Бога
За яго ласку патрэба,
Як за пагоду, так за ўроду,
Што яе выслаў нам з неба.

Ўжо пан Макары у календары
Жарку пагоду нам піша,
Сонейка грэе, і ветрык вее,
Спелую ніўку калыша.

Жнейкі рупліва рэжуць на ніве,
Ўюць перавяслы не слабкі,
Вяжуць снапамі, кладуць радамі,
А после ставяць у бабкі.

А на балоце ў гразі і поце
Нашы мужчыны працуюць:
Травіцу косяць, сушаць, выносяць,
Свежае сена гатуюць.

Цяпер у хатцы можа астацца
Сівавалосы дзядуля,
Унукаў кучка, котка і сучка
Або старая бабуля.

У дождж і слоту, буру, грымоту
Мы са слязамі ўздыхалі.
Прайшла трывога, як з ласкі Бога
Добрай пагоды прыждалі.

Як на пачатку, так на астатку
Дай, Божа, зжаці, звязаці
Хлеб гэты новы, свежы, здаровы,
Ў добрым здароўі спажыці.

## БОЯЗНА

У цяжкім змаганні з цёмнай сілай,
Гдзе шмат мазольнай работы,
Добрыя людзі вестачкай мілай
Нам паддавалі ахвоты.
І часам слоўца адно, другое,
Сказана добра у пору,
Падніме духа, адгоніць злое
І як бы зверне з плеч гору.
Але і з верай моцнай і правай
Ніхто прапасці не можа,
І нашай чыстай і пэўнай справе
Сам Бог напэўна паможа.
Адна рэч толькі ў гэтай рабоце
Варта дапраўды увагі,
Каб нам пры нашай добрай ахвоце
Ды не забракла адвагі.
Каб, як раслінка ў зелені дзікай,
Мы так без сонца не счэзлі
Ды гэтак з думкі надта вялікай
Хаця б на печ не палезлі.

# КАРУСЬ КАГАНЕЦ
# (1868—1918)

**Сапраўднае прозвішча Каруся Каганца — Казімір Карлавіч Кастравіцкі. Нарадзіўся ён у Табольску. Бацька яго паходзіў з даўняга баярскага роду (ён быў раднёю Міхаіла-Апалінарыя Кастравіцкага, дзеда вядомага французскага паэта Гіёма Апалінэра), але ў сярэдзіне XIX ст. валодаў толькі фальваркам Навасёлкі пад Койданавам, да якога было прыпісана 6 сялянскіх двароў, што плацілі чынш. За ўдзел у паўстанні 1863 г. бацька быў высланы ў Сібір,**

а зямля канфіскавана. У Табольску бацька знайшоў службу. А праз 9 гадоў Кастравіцкія атрымалі дазвол вярнуцца на радзіму.

Яны знайшлі прытулак у вёсцы Засулле, непадалёк ад Стоўбцаў. Неўзабаве памёр бацька, і малому Казіміру прыйшлося наняцца пастушком. Жыццёвыя нягоды сям'і абцяжарваліся калецтвам Казіміра: яшчэ ў Табольску ён упаў з акна на вуліцу і моцна пакалечыўся. Пазней, у Засуллі, яго прывалілі цяжкія вароты, і ў Казіміра вырас горб.

Потым сям'я пераехала ў Юцкі (Прымагілле), што каля Койданава, дзе на Казіміра лёг увесь цяжар гаспадарчых клопатаў.

Вучыўся К. Каганец спачатку дома, пасля ў Мінскім гарадскім вучылішчы. Скульптурным майстэрствам авалодаў у Маскве і Пецярбургу, але вучобу там не закончыў, бо не было сродкаў. Дзе толькі яму не давялося працаваць: у мастацкай майстэрні і ў лясніцтве, настаўнікам малявання і аканомам, займаўся сельскай гаспадаркай.

К. Каганец прымаў актыўны ўдзел у беларускім нацыянальна-вызваленчым руху, быў членам Беларускай сацыялістычнай грамады. За ўдзел у рэвалюцыі 1905 г. трапіў у Мінскую турму, дзе прасядзеў да мая 1906 г. У 1910 г. ён зноў трапіў у засценак на цэлы год.

Літаратурную дзейнасць К. Каганец пачаў у канцы XIX ст. Пры жыцці друкаваўся мала. Творчая спадчына К. Каганца цалкам да нас не дайшла. Асобныя яго публікацыі змяшчаліся ў газеце «Минский листок» і «Северо-Западный край».

К. Каганец — цікавы і самабытны празаік. Большасць яго празаічных твораў — гэта своеасаблівая апрацоўка фальклорных матэрыялаў: народных легенд і гістарычных паданняў, казак і жартаў. На гістарычным матэрыяле стварыў драмы «Старажовы курган» і «Сын Даніла», напісаў дзве бытавыя драмы: «У іншым шчасці няшчасце схавана» і «Двойчы прапілі», а таксама вадэвіль «Модны шляхцюк».

## ЗАСУЛЬСКІЯ ТУРЭ

Есць у нашым краю сяло Засулле, а каля таго сяла, на краю баханскага балота, ляжаць тры вялізныя камяні, што Турамі завуцца. Два з іх большыя ляжаць поплеч, як два пірагі зліпшыся, а трэці меншы, круглы, як баханок, ззаду паміж пірагоў паложаны.

Вота ж, як старыя людзі павядаюць, гэтыя каменні калісь-то людзьмі былі такімі, як і мы. Гэта было яшчэ тады, як наш край у паганстве быў, а толькі чутка хадзіла, што ад Кіева нека новая вера разыходзіцца і штораз далей і далей па гарадах, сёлах і сялібах пашыраецца. І ад гэтае чуткі страшна людзям станавілася. Баяліся новае веры, як заразы якой.

Людзі зыходзіліся ў святыя дубровы ды гаі, там раіліся і прыносілі ахвяры багам, каб уласкавіць і ўпрасіць аб помачы процiў насуваючай з поўдня страшнае навіны.

Вот у адным сяле пад Сулаю разышоўся пагавор, што да аднаго гаспадара, каторы жыве за сялом на адзіноце і Турам прызываецца, па начах прабіраецца нейкі невядомы чалавек з вялікаю барадою, з доўгімі валасамі, павучае гаспадара таго новай веры. Сталі сяляне паглядаць, і дзе каторыя з іх бачылі, як невядомы з гаспадаром, з гаспадыняй і з малымі іх сынамі кланяліся нейкім рагачам. Сталі прызірацца да гэтых рагачоў і дагледзелі, што яны пароблены з залезных шынаў, зложаны накрыж.

Тых крыжоў налічылі тры: адзін вялікі пасярэдзіне, а два малыя абапал яго. Сабралі сход і ўраілі, каб сям'ю і сялібу тых Тураў знішчыць дазвання, каб і следу не было.

Аднэй гэтак раніцай запрагае той апрычны гаспадар ваḑы араць ехаць, ажно бачыць: з сяла народ да яго валіць — хто з сякераю, хто з пілою, хто з насекаю*, а хто проста з кіем. Сцяміў ён бяду немінучую. Кінуўся ў хату, разбудзіў жонку і сына, сам узяў вялікі крыж, а ім даў па малому і чым дужы ў лес. Сяляне тое як забачылі,— зараўлі ад злосці ды кінуліся ўдагонку. Турэ тыя ўцякалі на ўсю моц, ажно разам спыніліся, бо прыбеглі к вялікаму непраходнаму балоту. І апанаваў іх вялікі страх, ды кажуць яны:

— Што мы з новае веры скарысталі? Бадай мы той час лепш каменнямі сталі, як малі яе пазнаваць!

Тады бог і перакінуў іх за гэта ў каменне. Прыбягаюць людзі ўслед за імі — аж нідзе нікагутка, адно тры каменні ляжаць.

— Вот табе і нашы Турэ! — кажуць сяляне, апусціўшы рукі.

Турамі завуцца тыя каменні і цяпер, а крыжы пазнаходзілі ў зямлі ўжо за нашых часоў. Яшчэ гадоў дваццаць таму жылі тыя людзі, што з тых крыжоў нарогі (лемяшы) рабілі.

## ВІТАЎКА

Хто не знае станцыі Хваніпаль, першай ад Мінску на дарозе на Бярэсце? А каля станцыі і двор таго ж наймення стаіць. Насупроць таго двара, праз балоты і рэчку Хамычку, стаіць дзервяная цэрква, нізкая і шырокая, рубленая на квадрат. Стаіць гэтая цэрква паргазшы ў балоце, і толькі па кладкам да яе ходзяць. І дзіву чалавек даецца, што гэта собіла людзям у такім мейсцы цэркву будаваць.

Вота ж паслухайце, што старыя людзі гавораць.

Тут, дзе цэрква цяпер стаіць, колісь быў груд, а на тым грудзе стаяў двор дужа багатага баярына, на імя Віт. Жыў той Віт па праўдзе, у веры, і Бог быў на яго дужа ласкаў Вота ж пайшла трывога вялікая, што швед у наш край наехаў і горш усякага татарына грабіць і пустошыць, а над народам здзекуецца. Віт быў удавец і меў адну дачку, вельмі красную панну. Вітаў двор быў прыродаю забяспечан ад ворага: спераду непраходным балотам, што і цяпер цягнецца абапал рэчкі Хамычкі, хоць шмат ужо сушэйшае, як за тыя часы: а за балотам і за дваром цягнуліся бясконцыя, адвечныя лясы,— тая старана і цяпер пушчаю завецца. Віт з дачкою, гэта цямячы, а прытым, як людзі набожныя, на Бога надзею пакладаючы, былі спакойны ў сваім дварэ. Але, знаць, слава пра яго багацце далёка ішла.

Аднае гэтак ночы, калі ў дварэ ўсе крэпка спалі, спаў і сам баярын Віт, спала і красная яго дачка. Чуе гэта Віт праз сон зычны голас: «Віце, Віце! Устань і выстралі!» Віт прахапіўся, аж нідзе нічога не чуваць. Ён ізноў стаў засыпаць ды ізноў чуе: «Віце, Віце! Устань і выстралі!» Ён і на гэты раз прахапіўшыся і нідзе нічога не бачачы і не чуючы,— стаў драмаць ды зноў чуе: «Віце, Віце! Устань і выстралі!» Тагды ён ужо мусіў устаць і, узяўшы стрэльбу, выйшаў на перамёт і бачыць, што шведы ўжо гаспадараць у яго на дварэ. Ён, тое ўбачыўшы, дужа спалохаўся, і, як трымаў стрэльбу, так і выстраліў на вецер, а сам пабег у пакоі дачку будзіць. Толькі пабудзіў,— чуюць на дварэ якісь голас падняўся. А калі яны выйшлі паглядзець, бачаць — шведы ў вялікай замешцы хочуць з двара ўцячы ды, не папаўшы ў вароты, ціснуцца на платы, душацца, калечацца, а каторым і ўдалося з двара выбрацца, тыя, чуваць, ратунку крычаць, папаўшы ў балота або ў рэчку. Так да раніцы ніводнага з тых шведаў жывога не засталося, бо, паслепшы воляю божаю ад Вітавага стрэлу, усе пагінулі, каторыя ў дварэ падушыліся, каторыя

ў рэчцы і балоце патапіліся, а каторыя патрапілі ў лес, тых звер люты парэзаў.

Вот на тую памяць, што Бог яго ад шведскай рукі захаваў, паставіў ён сярод свайго двара цэркву мураваную і вельмі яе ўкрасіў.

Жывуць так Віт з сваёю дачкою, краснаю паннаю, ізноў у дастатку і супакоі. Адно нячыстая сіла не дрэмле, і пакусы вялікую сілу маюць. І ўпаў наш баярын у вялікі грэх, так што зямля нават здрыганулася. І аступіўся той узгорак, на каторым двор стаяў, і рынуліся мураваныя палацы і пахавалі пад сабою грэшнага баярына. Дачка ж таго баярына зышла дзесь у далёкі манастыр і там веку даканала. Чэлядзь па свету разышлася, а двор той штораз болей і болей стаў у балота пагрузаць і аднае ночы саўсім затануў. Толькі на тым мейсцы, дзе цэрква стаяла, людзі распяцце знайшлі. Потым паставілі на тым мейсцы цэркаў дзераўляную і тое распяцце ў ёй паставілі. І праславілася тое распяцце цудамі рознымі, і ўсякі год на Уздзвіжанне збіраецца там шмат багамольцаў з усіх канцоў нашае зямлі. Завецца тое мейсца Вітаўка, або Вітавец. Там і цяпер у балоце можна абмацаць кавалкі муру.

## ПРЫЛУКІ

Не летась, не залетась, а калісь у старыну, як мы самі сабою яшчэ жылі, тое, што казаціму, было.

У адным месцы абапал Птыча-рэкі высяцца дзве горкі дужа красныя, а пасярод ракі востраў ляжыць. На той гарэ, што па правым беразе, стаяў двор знатнага баярына, іменем Яраслаў.

Дый красен жа той двор быў, увесь у садах, будынкі ўсе спраўныя былі, а ўвакруг тынам белым абведзены; ад двара дый да шляху былі прысады ліповыя.

Быў дзень ясны, харошы, ведама, як у пачатку лета бывае, калі яшчэ лугі зіхацяць кветкамі, птушкі заліваюцца рознымі галасамі, рыба ў рэчцы раз у раз плюхае, разганяючы шырока вакорыну, пчолы і ўсякія мошкі ды казяўкі цэлымі раямі завіхаюцца каля кветак. Дзе ні глянь — усюды жыццё кіпіць, а сам пазіраеш на ўсё гэта неяк радасна.

І вот па прысадах тых, у прыятным прахалодзе, любуючыся прыродаю і самі сабою, прахаджваліся малады баярын Яраслаў са сваёю паняю, маладою жаною, краснаю Люблянаю. Ходзяць яны і цешацца, ажно дарога задуднела, і на ўзмыленым кані паявіўся ўвесь запылены

княжы ганец і, сукланіўшыся баярству, павяшчае нядобрую навіну, што вораг рубеж перайшоў і дужа наш край пустошыць і што князь прыказаў усім сваім баярам на вайну, чым дужы, пасняшаць.

Баярын рад чыну даказаць, сабе славы прыдбаць: хутка сабраў сваю дружыну і паехаў.

Спачатку баярын слаў часта ганцоў да любай жонкі, а далей — ні ганцоў, ні самога штось не чутно стала. І затужыла вельмі красна пані Любляна — усё выходзіць на шлях ды ўдаль пазірае, ды ўсё дармо.

Прайшло лета, настала зіма, а любага Яраслава як няма, так і няма. Прыйшла ізноў вясна. Выйшла раз красна Любляна ў канец прысад і як толькі на шлях зірнула, так дужа і зрадзела: бачыць, коціць дружына, а наперад любы вараным канём едзе. Ды нядоўга яе радасць была, бо, як той пад'ехаў бліжэй, пазнала, што гэта другі.

Той пад'ехаў, сукланіўся, а яна і думае: «Можа, ён што пра майго ведае?..» Просіць яго к сабе ў харомы спачыць трохі. Той рад, прыстае, ідзе за ёю ў святліцу. Яна, яго за стол пасадзіўшы, гукнула на слугі, сказала прынесці піва, мёду і ўсялякай стравы; стала яго частаваці і яго пытаці пра мужа любага. Той, пагадаўшы, так ёй павядае: «Не хочацца мне табе, красна пані, жалю задаваці, ды мушу... Вото ж бачыш, твой муж, а мой друг сардэчны, быў цяжка ў баі ранены і, уміраючы, кажа мне так: «Слухай, дружа! У мяне е жонка, дужа красная пані, а ты яшчэ не жанаты, так успакой мяне перад смерцю, бо мне скора канец,— пакляніся заступіці ёй маё месца!» Што ж я меў рабіць? Мусіў прысягнуць і цяпер ад прысягі адступіціся мне нельга... Так пані няхай мя выбачыць і будзе прыхільна!»

Тая тое як учула, давай плакаць, галасіць і слухаць яго не хоча.

Плакала яна дзень, плакала другі, а на трэці і падумала: «І чаго я гэтак плачу?.. Што я тым памагу?. Адно лічка сваё красна папсоваю...» — і на чацвёрты дзень гутарку з ім прыязну павяла, а на пяты — так і жартаваць сталі, а далей і пабраліся.

Прайшло ізноў лета, прайшла зіма, а за зімою — вясна, а за вясною і лета настала. Сядзяць гэта той прыезджы баярын з краснаю Люблянаю, як галубкі ў парачцы, і сабою цешацца ды любуюцца. Ажно разам Любляна як крыкне і, хапіўшыся за сэрца, абамлела. Той — зірк: ба чыць — перад ім Яраслаў стаіць...

Хапіліся спярша за шаблі, а далей Яраслаў адумаў

шыся, кажа: «Адзін з нас павінен умерці, дык няхай Бог судзіць каму. Вазьмі ты сабе лук і сагайдак з стрэламі і ідзі на гару за рэчку, а я вазьму сабе і стану на гэтай гарэ, і будзем страляцца».

Як сказаў, так і ўчынілі: выпусцілі па страле — нічога, выпусцілі па другой — нічога, а па трэцяй як выпусцілі, так абодва аж асунуліся, як два падкошаныя каласочкі.

Тое месца з тых пор «Прылукамі» стала звацца. І цяпер там стаяць мураваныя харомы і ліповыя прысады, і жыве там пан дужа багаты, толькі той пан цяперашні не наш, а прыйшлы з намор'я, але дабраваты сабе.

## НАВАСАДСКАЕ ЗАМЧЫШЧА

Над рэчкаю, над Слаўкаю, недалёка святога месца Студзянца, дзе з-пад дарогі на гары вада цудоўная выліваецца і спадае ў яр глыбокі, а ярам у Слаўку цячэ, а Слаўка па каменнях шапоча,— стаіць княскае гарадзішча.

Высокія берагі Слаўкі парасталі ўсякім лесам: раслі там і дубы магучыя, і светлыя ясені, і клёны, і альшыны, і асіны, і бярэзіны касатыя, і бразгаліны касцястыя, і чаромхі пахучыя,— ды многа ўсяго было.

Над усім гэтым западала ночка цёмная. Неба было засуплена чорнымі хмарамі, а вецер сярдзіты раз-паразу зрываўся і з шумам і свістам пралятаў над гарамі, над лясамі і над тым гарадзішчам, маўляў, штось нядобрае павяшчаў.

Усе ў гарадзішчы ў тым спалі. Спалі і ў месце, што ляжала ў кліну між Слаўкай і Ус-рэкай. Адна толькі душа ў гарадзішчы не спіць: паволі ўсё ходзіць і, знаць, думу цяжкую думае, бо аж пот на белым лобе выступае перлістымі кроплямі.

А хто гэта ходзіць, як не княжна, слаўная красою і багацтвамі сваімі? І ростам высока і ліцом красна, хоць не так-то ўжо і малада. І грудзі яе поўныя высока падымаюцца, і вочы карыя аж у цемнаце свецяцца, а буйныя косы вецер па воздусе трэпле.

Ходзіць княжна гордаю ступою, ды на сэрцы яе, знаць, невясёла, бо ўсё то рукі заламае, то вяла іх апусціць, то ўздыхне цяжка, як канаючы, то аберуч галаву сцісне; то, быццам на штось адважыўшыся, вочы падыме і ўдаль смялей гляне і заходзіць байчэйшаю ступою, а праз момант ізноў яе сэрца зойдзецца, і рукі павіснуць, і вочы затуманяцца, і ногі як бы падкашывацца стануць Ды

вось яна канцом на штось адважылася. Пайшла хуткаю ступою ў гарадзішча, чэлядзь сваю будзіць, усе багацтвы свае прыказвае збіраці і што дарожшае, то ў скрыню каваную кладзе, а што меней вартае, тое чэлядзі раздае. Сабраўшы ўсё і спакаваўшы, скрыню зачыніла на тры замкі, а ключы на залаты паясок нанізала і туга ім падпяразалася. Тады, сеўшы на скрыню, горка заплакала:

— Няма ў мяне ні шчасця, ні долі, ні вернага друга, няма мне з кім дзяліцца ні сваею красою, ні каханнем, ні багацтвам вялікім, а маладосць мая ўцякае, лічка маё бела пажаўцела, грудкі мае поўныя сталі вянуць, вочкі карыя — ліняці, буйныя косы — выпадаці, а сэрца маё стала заміраці... Няхай жа, калі так, я згіну і ўсё са мной: і думкі мае, і каханне маё, і жаданне, і краса, і багацтвы мае, бо так сіратліва жыці не пад сілу мне!..

І загадала сваім служкам прывязаці сябе да скрыні і кінуць у студню дужа глыбокую і поўну вады, што ў тым гарадзішчы на дварэ была. Загудзела, зараўла навальніца з неба з громам, з градам, з пярунамі ды маланкамі, а прайшла навальніца, і краснай княжны не стала... Кінулі яе верныя служкі ў студню глыбокую, і апусцела зараз тое гарадзішча, а после і саўсім яго не стала. Толькі гара з валам ды студняй, поўнай камення, тое месца азначае. Скора вораг люты сюды найшоў, людзей павыразаў, хаты з зямлёю зраўнаваў, а тое месца, дзе места было, людзі Рэзанамі празвалі.

Каму ж з таго месца Бог судзіў жывым астацца, тыя трохі аддаль на гары, над крыніцамі, пабудаваліся насупроціў таго ж гарадзішча і Студзянца і празвалі сваё новае селішча «Навасадамі».

* * *

Ветры буйныя загулялі —  
Іскры нашы заблішчалі,  
Штораз болей разжыгаліс,  
Красным светам распаляліс.  
Яшчэ вецер падыхае —  
Ў іскры полымца шыбае  
Вогненнымі язычкамі,  
Розных кветаў аганькамі.  
У кастры ахаладалым  
І быллём ўжо зарасталым  
Язычкі замігаталі,  
Па паленнях заскакалі

І у купачкі збягаюць —
Свет навокал раскідаюць,
Хутка вецер зноў зайграе
Увесь касцёр запылае,
Свет над намі засіяе,
Шчасце ў хату завітае!

## НАШ СЫМБОЛЬ

Адважна, брацця, наперад ідзеце
Цвёрдай і правай ступою!
Кожнаму смела ў вочы глядзеце,
Праўду нясеце з сабою!
За родну країну, звычай і мову,
За гонар груддзю ставайце!
Да будзьце верныя сваему слову,
З праўдай заўсюды трывайце!
Тады вы усякую зможаце сілу,
Ворагам прыйдзе скаранне!
Правым дасць Бог нарадачку мілу,
Шчасце і радасць настане!

# ЯДВІГІН Ш.
# (1868—1922)

**Жыццёвы шлях Ядвігіна Ш. выпаў на пералом двух стагоддзяў, двух сацыяльных эпох. Складаным было яго жыццё, і нялёгкай была яго творчая біяграфія.**

**Нарадзіўся Антон Іванавіч Лявіцкі — такое сапраўднае імя Ядвігіна Ш.— у мястэчку Добасна Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні ў сям'і ўпраўляючага.**

**У дзевяць гадоў Антось пайшоў у прыватную школу, якую арганізавала дачка Дуніна-Марцінкевіча. Пасля яе заканчэння нейкі час вучыўся на медыцынскім факультэце ў Маскоўскім універсітэце, але скончыць яго не давялося. За ўдзел у студэнцкіх хваляваннях Ядвігін Ш. быў выключаны з універсітэта. Тады ён здаў экзамен на аптэкарскага практыканта і стаў працаваць у мястэчку Радашковічы.**

**Літаратурную дзейнасць пісьменнік распачаў яшчэ ў турме, дзе ён пераклаў на беларускую мову апавяданне У. Гаршына «Сігнал». Пачатак літаратурнай дзейнасці Ядвігіна Ш. часта звязваюць з гэтым перыядам, але ж актыўны ўдзел пісьменніка ў развіцці беларускай літара-**

туры пачаўся толькі ў 1906 г., калі ён упершыню выступіў з апавяданнем на беларускай мове «Суд». З гэтага часу пісьменнік становіцца актыўным супрацоўнікам першых легальных беларускіх газет «Наша доля» і «Наша ніва».

На працягу ўсёй сваёй творчай дзейнасці Ядвігін Ш. адчуваў моцны ўплыў народнай творчасці. Першыя апавяданні пісьменніка часта прадстаўлялі сабою проста літаратурную апрацоўку народных паданняў, казак, анекдотаў («Важная фіга», «Хлеб», «Суд», «Вяселле» і інш.).

Большасць апавяданняў Ядвігіна Ш. маюць алегарычны характар. Часта яго называюць байкапісцам.

Ядвігін Ш. актыўна ўдзельнічаў у грамадскім і палітычным жыцці, выступаў на старонках перыядычнага друку па праблемах беларускага нацыянальнага адраджэння. У сваіх творах адлюстраваў пэўны перыяд гістарычнага жыцця беларускага народа.

Цяжка хворы, Ядвігін Ш. выехаў у Вільню, а праз два гады памёр ад сухотаў.

## ШЧАСЛІВАЯ

Не першына: калі шанцуе, то і Халімон танцуе, а іншаму: куды ні кінь, усюды клін. Вось гэткія кліны скрозь спатыкаў на сваім жыцці Юрка Сухавей. Вёска вялікая, зямля ўдалася, усе жывуць дастатна, багата, адзін Юрка канец з канцом чуць-чуць звяжа. І каб-то сям'ёй праз лад ужо абсыпаўся, ці там гультаём такім ужо ўдаўся, або, не тут кажучы, да чортава зелля ласым быў,— ані думаць! А тым часам, як ні завіхаўся, як ні кідаўся Сухавей,— усюды спудлуе*. Нажыве парсюка карміць — не есць; купіць карову — прычэпіцца нейкае ліха — капыты задзярэ; конь — на роўнай дарозе ўлегцы — нагу зломе... але гэта што! Мо Юрка купляць не ўмее, мо даглядаць, абхадзіцца з жывёлай не складзен — хай і так. Чаму ж, калі ваўкарэзіна барана з поля сцягне — то пэўна Юркі; каршун курыцу дзярэ — толькі Юркі; сабака ашалеў — ну, значыцца, Юркі; жарабё ў студні ўтапілася — і не пытай — Юркі! Усё Юрку не ўдавалася, а найгорш не ўдалася яму, паміж намі кажучы, жонка — Тадора. Апісваць яе вам не буду: хто такую жонку мае — той сам ведае, а хто не мае — хай жыве (Тадор хапае на свеце) — вось і будзе ведаць... Мусіць-то, не дарма казалі суседзі аб Сухавею, што дзве пілы ў хаце: адной — сам дровы рэжа, а другая — яго самога пілуе... А найгорш пілавала свайго мужыка Тадора за беднасць у хаце. А як тут было разбага-

цець Сухавею пры гэткім яго шчасці? Добра і то, што галоднымі не сядзелі. Добра каму, але не для Тадоры. Хай бы лепш прыгаладаць, абы грошы ў запасе былі, багатырамі звацца.

Тым часам гады мінаюць, а багацця як няма, так няма. Што тут рабіць? Вось і надумалася Тадора выправіць свайго да знахара па раду: мо з вачэй ім гэтак вядзецца. Доўга скроб патыліцу Юрка, але такі паехаў. На трэці дзень ледзь вярнуўся Сухавей, і то ўночы, Тадора і не чула (нашто Богу грашыць: паспаць любіла смачна), як увайшоў ён у хату, як доўга капашыўся, пакуль не ўзлез на палок і таксама смачна і моцна не захроп.

Назаўтра, як толькі накінулася з пытаннямі на мужыка Тадора, ён і прызнаўся, што ўся віна ў няшчасці з дабыткам яго — Юркі (так знахар яму і сказаў).

А віна вось у чым. Нябожчык бацька пакінуў замазаны гаршчочак з грашыма, а ён крыўся з ім дагэтуль перад жонкай, дык Бог за тое, відаць, і кару насылаў на яго дабро. І, збедзіўшыся, нясмела аддаў Юрка той гаршчочак жонцы.

Тадора, першы раз трэснуўшы кулаком мужа з радасці (тыя кулакі, што бывалі — заўсёды ў злосці) і схапіўшы ў дрыжачыя свае рукі скарб, стала трэсці ім каля вуха: там і звінела, і шуршэла; былі, відаць, і пабразгачы, былі, мусіць-то, і паперкі.

Як кот з салам, лётала Юрчыха з гаршчком, каб дзе лепш яго захаваць; урэшце ўпхнула яго сабе пад сяннік.

З гэтага часу, хоць, праўду кажучы, гаспадарка таксама не ладзілася, але жыць стала спакайней. Тадора моўчкі соўгалася па хаце, не лезла больш у вочы мужыку, Юрка ажно павесялеў.

Не раз, бывала, дагаварваўся, усміхаючыся, Юрка да таго гаршчочка, каб як пажывіцца падмогі на гаспадарку, але Тадора слухаць не хацела; не хацела нават адпячатаць і палічыць сваё багацце. Выме гаршчок, патрасе яго, прыслухваючыся, каля свайго вуха, патрасе ім каля вуха Юркі дый зноў, запхнуўшы пад сяннік, радасная, шчаслівая клалася на пасцель, цешучыся, як гэты скарб муляў яе бакі.

Але, ці то гаршчок гэты такі цвёрды быў, ці то думкі неспакойныя, а цэласць скарбу дакучалі Тадоры, а мо адно і другое, толькі сон зусім прапаў у яе. Прапаў спярша сон, а пасля прапала і ахвота да яды. Стала Тадора ў вачах бялець, сохнуць. Раілі суседкі Тадоры ўдацца да знахара, але яна і слухаць не хацела. Не жалела Юрчыха

апошняй двузлоткі на знахара, каб разбагацець, але цяпер хоць бы і сабе — ні за што не згадзілася б надпачаць скарбу.

Дый нашто ёй лячыцца, калі ёй нічога не баліць. Галава толькі круціцца, іншым разам млосна крыху робіцца,— дык не дзіва: не спіць, зусім не спіць. Вось каб хоць разок заснула, як даўней спала: моцна, смачна, і ўсё б было добра...

І Тадора заснула, моцна заснула: навекі, а па яе высахшым, збялеўшым твары відаць было, што ўмірала радасная, шчаслівая — умірала багатая.

А Юрка, дастаўшы яшчэ з-пад цёплага цела жонкі гаршчок, выйшаў на двор і бразнуў ім аб камень. Адтуль пасыпаліся брудныя паперкі газецін і бляшаныя гузікі..

## ВАСІЛЬКІ

Васількі закрасавалі... Не, не закрасавалі!

Дзе ж ім цяпер красаваць? Холад. Зіма. Снег. Не закрасавалі васількі; гэта толькі перад вачамі маімі міганулі яны. Нават не перад вачамі, а так недзе: не то ў думках, не то ў душы ці сэрцы? Не ведаю дзе. Міганулі васількі: васількі ў жыце... неба, як васількі... як васількі, вочкі... міганулі васількі і... счэзлі!..

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

У красе нашага жыцця мы любім, як красуюць васількі...

А калі паблекнуць васількі, паблекне неба, паблекне на душы, а на сэрцы ляжа холад; калі зямлю пакрые снег, а на тваю галаву быццам сыпне шоран*; калі маеш штодзённы цёмны, горкі хлеб,— тады толькі ўспомніш, што гэта — ад васількоў, ад іх красы, бо... адкрасавалі васількі...

## ДЗЕД ЗАВАЛА

(Урывак з паэмы)

Жоўтага пясочку —
Ды і таго мала —
Меў наш дзед па бацьку;
Зваўся ён Завала.
Ліхая хацінка
Саломаю крыта,
Ліхая адрынка
Ды адно карыта;

З крадзенага лесу
Лава, стол у хаце,
Міска і дзве лыжкі —
Вось і ўсё багацце!
Праўда, у аборы,
Як каза, кароўка
З голаду рыкала.
Звалася Чарноўка.
Сваёй гаспадаркі
Не любіў Завала,
Так і з ёй карысці
Меў саўсім ён мала.
З стрэльбачкай на плечах
Ды у зубах з люлькай
Кожны дзень спаткацца
Маглі б вы з дзядулькай
Саўсім яшчэ цёмна,—
Так не раз бывала,
Дзед ужо у лесе —
Яшчэ пушча спала...
Гэтакага лесу
Нам ужо не бачыць,
Бо каморнік штодня
З жыдам яго значаць,
На шнуры лес рэжуць,
Нумары стаўляюць...
Колькі пнёў у лесе
Яны пасчытаюць?!
І от з таго часу,
Як лічыць пачалі,
Звер і птушкі нават —
Тыя замаўчалі...
І не дзіва, брацця:
Цяпер наш Рыгорка
Кожны пень абліча
З любога прыгорка.
...Казаў: спала пушча.
Толькі дзед Завала,
Як у сад знаёмы,
Цягне там, бывала.
Пакуль пройдзе выган
Ды шнурамі поле.
Моліцца і боскай
Аддаецца волі;
А як толькі ступіць

На край лесу цёмны,—
Гоц праз пні, калоды,
Як той непрытомны!
Бо у пушчы сцежак,
Ні дарог не будзе;
Хто не знае лесу,
Той, як бач, заблудзе!
Ні Завале сцежак,
Ні дарог не трэба.
Стрэльбачку на плечы,
Люльку, кусок хлеба...
Тут сасна-таўстуха,
Дуб зараз пузаты,
Там — часаў з павалы
Упорку да хаты;
Скора будуць ёлкі
Тры зараз зламаны,
Далей — корч рагаты,
Добра дзеду знаны:
Дзесяць год мінула —
Пахаваў старуху,
Калядамі потым
Тут забіў маруху*.
За карчом жа скора
Будзе там палянка,—
Некалі стаяла
Тут чыясь зямлянка;
Драбняк за палянкай
Цягне яшчэ з гоні,
Тут, загнуўшы летась,
З'елі ваўкі коні.
Потым бор высокі —
Сасна ў сасонку!..
Слухаў дзед Завала...
У адну старонку:
Нібы нехта шэпча,
Нібы хтось смяецца,
Нібы сціха плача —
Так усё здаецца...
Дзед на гэты шэпты,
Крадучыся ціха,
Стаў бліжэй падходзіць —
Не баіцца ліха!
Выйшаў на паляну
Стары дзед Завала,

Туды-сюды глянуў —
Чуць тады світала;
Праз палянку рэчка
Бяжыць, шуміць, плача,
Дзед па пнёх праз рэчку
На другі бок скача;
А там пень дубовы
Ростам з чалавека —
Выпалена сэрца,
Стаіць, як калека.
У дзюпле рассеўшысь,
Як у сваёй хаце,
Стаў вымаць дзядуля
Тут сваё багацце:
Порах, шрот, пістоны
І кавалак хлеба,
Стрэльбачку паставіў,
Глянуў ён на неба:
Там — высока недзе —
Хмаркі, як каточкі,
То як вол лабаты
Або нібы бочкі...
Змяняюцца хмаркі:
То з іх лось рагаты,
То з іх птах вялікі,
То шнурамі хаты..
А ужо і пушча
Стала прабуджацца,—
Некамусь ды трэба
Першым адазвацца
Аж тут калі плёхне
У віры пры рэчцы:
Шчупаку паснедаць
Нехта пападзецца!
Потым на балоце
На сасне-старушцы
Глушэц заіграўся,
Як смалой на пужцы
Хіба што глухі ён,
Бо, каб прыслухаўся,
Сваёй песні пэўне
Сам бы застыдаўся!
Гэтакую песню
Першы дрозд-спявака
Прыняў за знявагу

Свайго брата-птаха:
На шчыт елкі сеўшы,
Стаў свістаць, смяяцца,
Што той песняй можа
З салаўём раўняцца
Цецярук хоць сватам
Глушцовым лічыўся,
Але з стыду, злосці
І ён расхадзіўся:
Шыкнуў ды стаў лаяць
Як мага ён свата,—
Не меў ён ляпшога
Да лаянкі хвата.
Гаспадар у лесе —
Дзяцел наш насаты —
Не любіў, каб сварка
Выхадзіла з хаты.
Як абухам, грукнуў
У сухую елку
Каб усцішыць сварку,
Каб не было згелку*,
Памачніцы-жоўны
Тут жа затрашчэлі,—
Дзятлаву каманду,
Відаць, зразумелі.
І, як макам сеяў,
Так прыцiхла пушча,
Толькі рэхам недзе
Адазвалась гушча..
Доўга дзяцел слухаў,
Наставіўшы вуха,—
Зляцеў пасля ў кузню
І стаў каваць глуха.
Як бы на каманду
Пушча заіграла.
Песні, шум і гоман,—
Слухаў дзед Завала..
Павіднела лепей
Ужо на паляне,—
Змерыўся дзед вокам,
Стрэльба дзе дастане;
Рука затраслася,
Як у цэль ён змерыў,
Але б яшчэ трапіў
У добрага звера.

Сядзіць і чакае,
Ў свет глядзіць далёкі;
Бач, ляціць і заяц,
Белы, касавокі;
Толькі што займацца
Гэтакай скацінай,
Чалавек раз знаўся
З лепшаю звярынай!
Зморшчыўся і плюнуў
Знехаця Завала:
Непрывычны біць ён
Што бы ні папала!
І стаў зноў чакаць ён...
Сонца паднялося...
Выстраліць сягоння
Дзеду не прыйшлося!
Але і спяшацца
Не было да кога:
Ў хаце не пакінуў
Нічога мілога...
І з дзюпла дзед вылез,
Лёг на сонцы грэцца,
Уздыхнуў, успомніў,
Як яму жывецца...
Слезіна па твары
Скацілася з вока,—
Ой, бо тыя думкі
Ляцелі далёка...
Вельмі, ох, любіў ён
Думачкі думаці,
Праўду ад няпраўды
Дзяліць, разбіраці...
Любіў з дзікай пушчай
Гэтым падзяліцца,—
Са сваймі, з людзямі,
Не мог неяк зжыцца.
. . . . . . . . . .

## АДАМ ГУРЫНОВІЧ (1869—1894)

**Лёс гэтага таленавітага чалавека трагічны. Ён не паспеў зрабіць і долі таго, што абяцаў яго талент. Нарадзіўся ў Вілейскім павеце Віленскай губерні ў 1869 годзе, а па-**

мёр 14 студзеня 1894 года, захварэўшы на чорную воспу. Як мала пражыў Адам Гурыновіч, і як ён апантана, нібыта прадчуваючы блізкі канец жыцця, служыў роднай культуры, якая намаганнямі яго аднагодкаў набірала вышыню. Гэта ён першы кінуў кліч «Што ты спіш, мужычок», гэта ён сярод першых хапіўся запісваць этнаграфічны матэрыял у Свянцянскім павеце. Ён любіў і ганарыўся сваім людам, збіраў у сваю бібліятэку рэдкія на той час кнігі фалькларыстаў Насовіча і Шэйна. Ён вучыўся на інжынера, але абраў лёс паэта. Быў грамадзянінам свайго нялёгкага часу, тонкім лірыкам. У 1893 г. за прыналежнасць да рэвалюцыйнага руху А. Гурыновіча арыштавалі. Сярод папер знайшлі беларускі верш, у якім ён заклікае беларускі люд прачнуцца і скінуць з сябе царскае ярмо. Прабыўшы год у Петрапаўлаўскай крэпасці, Гурыновіч моцна захварэў і быў выпушчаны пад нагляд паліцыі.

Лёс жорстка абышоўся з паэтам. Такія былі палітычныя абставіны на той час. Яго літаратурная творчасць змяшчала ў сабе столькі грамадскага і свядома-нацыянальнага духу, што і сёння выклікае і ў нас, яго нашчадкаў, зацікаўленне і падзяку. Як не любіць такога чалавека, які ў апошнія хвіліны свайго жыцця, пад прыгнётам хваробы будаваў планы будзіць люд і клікаць да жыцця мову і літаратуру беларускага народа.

* * *

Дзякуй табе, браце, Бурачок Мацею,
За тое, што ў сэрцы збудзіў ты надзею,
Што між братоў нашых знаходзяцца людзі
З кахаючым сэрцам і баляшчай грудзяй.
Дзякуй табе, браце, і за тыя словы,
Што ўспомнілі звукі нашай роднай мовы.
Бяры, браце, дудку, наладзь і жалейку,
Няхай песнь смутная ідзе у калейку
І будзіць у сэрцах мысль аб лепшай долі,
Якой мы не зналі дагэтуль ніколі.

## БОР

Ох ты, бор, мой бор,
Бор сасновенькі!
Ты з каторых пор
Шуміш, родненькі?

Мы з табой раслі,
Уздымаліся,
На адной зямлі
Гадаваліся.

Мы зжыліся з табой,
Бор наш родненькі,
Як з сваёй сумой
Жабрак голенькі.

А з табой у нас
Долі роўныя;
Мы з табой якраз
Браты родныя.

Ні ў нас долі нет,
Ні ў нас шчасцінька,
Апастыў нам свет,
Зямля-матынька.

У другіх людзей
Зямля лепшая,
Там і жыць лягчэй,
— Праца меншая

У пяску сваім
Мы купаемся,
Не ў прымер другім
Прабіваемся.

Па лясах другіх
Усё лепшае,
І ліства на іх
Ўсё страйнейшая.

У бару ж шумяць
Сосны-ёлачкі,
На сучках тарчаць
Ўсё іголачкі.

А ў нашых людзёх
Ўсё сярмяжачкі.
А ў іх кішанёх
— Ні бумажачкі.

А і будзем ждаць
Часу добрага,
Ды ну ж выглядаць —
Што ёсць новага

Ды не будзіць ж так
Векі вечныя,
А прыйдуць ніяк
Часы лепшыя.

## АЛЬБЕРТ ПАЎЛОВІЧ
## (1875—1951)

Сярод тых пісьменнікаў, якія актыўна і плённа працавалі ў беларускай літаратуры на пачатку XX стагоддзя, быў і паэт Альберт Паўловіч.

Альберт Францавіч Паўловіч нарадзіўся ў Мінску. Скончыў чатырохкласнае гарадское вучылішча (1894) і працаваў канторшчыкам, бухгалтарам у розных установах. У 1932 г. Альберт Паўловіч пераехаў у Маскву. Потым жыў на Урале і ў Курску.

Літаратурную дзейнасць А. Паўловіч пачаў у канцы XIX стагоддзя, але ў друку ўпершыню выступіў у 1907 г. Пачынаў А. Паўловіч са слёзнага плачу над сялянскай нядоляй, над гаротным лёсам роднай старонкі. У яго вершах не было ні рэвалюцыйнага пафасу, ні паказу прычын сацыяльнай няроўнасці. Большасць яго твораў не выходзіла сваёй тэматыкай за межы побыту беларускай вёскі, паэт аддаваў найбольшую ўвагу павучанням і агульнагуманістычным ідэалам.

Творчая спадчына А. Паўловіча дайшла да нас не ўся. У 1910 г. у Вільні выйшаў яго зборнік «Снапок», частка твораў раскідана ў беларускіх календарах і розных перыядычных выданнях («Наша ніва», «Маладая Беларусь», «Беларус», «Лучына» і інш.). Падрыхтаваны аўтарам зборнік гумару «Перавясла» так і не выйшаў. Яго пяру належыць драма «Васількі» (Вільня, 1919). У лірычных вершах А. Паўловіча адчуваецца сапраўднае майстэрства, вялікае эмацыянальнае пачуццё і глыбокі падтэкст.

А. Паўловіч шмат працаваў у галіне мастацкага перакладу (перакладаў творы А. Пушкіна, Т. Шаўчэнкі, У. Сыракомлі і іншых паэтаў).

У сваіх лепшых вершаваных апавяданнях і жартоўных сцэнках А. Паўловіч, умела выкарыстоўваючы багацці

беларускага фальклору, па-свойму паказваў праявы тагачаснага жыцця. Яго творы па-ранейшаму цікавыя і для сённяшняга чытача.

## РОДНЫЯ МАЛЮНКІ

Люблю глядзець, як конь паволі
З сахой баразнамі ідзе,
І чуць, як ціха, нудна ў полі
Араты песню завядзе.
    Люблю глядзець, як брат наш сее
    З малітвай шчырай на губах,
    Як з кожным зерняткам надзея
    Ў зямлю кладзецца у слязах
Люблю, абходзячы ток, гумны,
Спаткаць вясёлую зару,
Глядзець, як лёгкі, зважны, думны
Туман ўздымаецца ўгару.
    Люблю абшар лугоў прывольны
    І слухаць стуль жалейкі стогн,
    Калоссяў спелых шум павольны
    І песні жней і кос пазвон.
Люблю з ліповай лубкай святам
Усёй сям'ёй у лес сыпнуць,
Збіраць грыбы і там дзяўчатам
Ўдалую песню падцягнуць.
    Люблю мяжой абходзіць мора,
    Дзе грэчка скветчана, як снег;
    Дзе пчолкі, снуючы ў прасторы,
    Гудзяць, паўнюткія уцех.
Люблю я чуць, як песня льецца
Вясёлым рэхам на ўвесь гай,–
Вось спраўды толькі тут, здаецца
І ёсць такі жаданы рай...
    Люблю — як з поля ўсёй па пары
    Са збожжам цягнуцца вазы
    І чуць, як колы у цяжары
    Скрыпяць, мо ўзімку палазы.
Люблю я родныя прывабы:
Там лес, там шастае вятрак,
Тут буракі цярэбяць бабы
І у прыпол страсаюць мак;
    Там канапельку рвуць дзяўчаты,
    А хлопцы бульбу ў мех кладуць,

Тут дзед ледзь топчацца ля хаты,
У вуллях пчолачкі гудуць.
Там чуць далёка рык каровы,
Бляе авечка,— і пастух
На дудцы грае... Льюцца словы..
Наўкруг прыволле!.. Вольны дух!.

## МАЛАДАЯ ГАСПАДЫНЬКА

Зрання росна, ў поўдзень млосна,
А увечар камары,
І ніяк сабе да працы
Не магу дабраць пары.
Ўдосвіт спіцца, ў поўдзень мжыцца,
А увечар дрымата...
Пацягушкі дакучаюць,
Нападае зевата.
Ў хаце зрана не прыбрана:
Смецце, трэскі па кутам,
Лыжкі, міскі — ўсё пад лавай,
Качарга і тая там.
Венік змёўся, дзяркач звёўся,
Мётлы запрапалі,
Ні падмесці, ні прыбраці,
Слядоў натапталі.
Глядзіш сёння ўжо адрання,
З поўдня да вячэры,
Не звядзеш усё к парадку,—
А тут кавалеры:
Рыгор, Ваня, Кастусь, Саня,
Якаў з Міканорам...
І пайшла гульня і танцы,
Спевы усім хорам.
Вольга з Дашай, Каця з Машай,
Ганна падпявае,
Дзе тут думаць мне аб працы,
Так вось дзень сплывае.
Зрання росна, ў поўдзень млосна,
А увечар камары...
І ніяк сабе да працы
Не магу дабраць пары.

## ЛЕПШАЯ РАДА

### (У школе)

— Ну, матулька, роб што хочаш
Ты з сваім Лук'янам,—
Бачыш, во, лабук вялікі
Ровен з бацькам Янам,
Але што, калі лянівы,
Дурны, горш ад быдла —
Мне ўжо годзе з ім вадзіцца,
Ды ужо й абрыдла.
Галавой у школе ходзіць,
Стаў хлапец нягодны,
Дзе пабіта ці разліта —
Лук'ян там нязводны.
Да навукі ён няздатны,
Толькі да сваволі;
Мусіш браць яго са школы,
Хай ганяе ў полі.
З яго толку век не будзе,
Кепская з ім рада,—
Стаў спрачацца, не спаўняе
Майго, бач, загаду.
Ты сама ўжо з ім спраўляйся,
Давай часта лазню —
Гэта лепш за ўсё паможа
Кручанаму блазну!
— Мой панок, святую праўду
Кажаш мне у вочы,
А чаму ж ты сам той лазні
Спрабаваць не хочаш?
— Што-о... ці помніш, што ты кажаш?
Дурні вы абое!
— Мой панок, даруй, здаецца,
Я ж кажу аб тое,
Што пан ласне радзіш сыну,
Але добра б была,
Каб пан так зрабіў, паслухаў,
Як бы я прасіла...
— Як жа хочаш? Твайго сына
Не хачу чапаці!
Ты і бацька лепей самі
Спраўцеся у хаце.
— Не, панок, нашто?! Не трэба

З ім нам мардавацца.
Ён і так шмат памякчэе,
Будзе лепш старацца,
Калі б пан замест Лук'яна
Ды хлапца другога
Лазой зрэзаў, дык тады б мой
Прысмірэў бы многа.

## РАМАНС

Глыбее ноч. Мне сумна, я зываю:
Ні цёплых слоў, ні ласкі... Цішыня...
Не спіцца мне, мінутамі чакаю,
Калі замігаціць жаданы праблеск дня.

Глыбее ноч... Бяздумна раскладаю
Гняўлівыя з папрокамі лісты,
Чытаю іх і ясна прадстаўляю —
Суровы змест... Чаму так пішаш ты?

Не раз душу папрокі ўсхвалявалі,
І цяжкі ўздых мне грудзі уздымаў,
І слёзы незнарок мне вочы засланялі,
І жаль нямы душу маю сціскаў.

Ды ці ж змагу я мёртвымі славамі
Ўсю глыбіню душы і тайну расказаць:
Чым я жыву, аб чым я мару днямі,
Як ночкі цёмныя прыйшлося каратаць.

І так пішу! Больш сэрца не утое,
І ад душы кароткі ліст пашлю —
Адно слаўцо — праўдзівае, святое,
Бязмежна шчырае: «Люблю!»

## ЦЁТКА
## (1876—1916)

**Цётка — гэта адзін з псеўданімаў першай беларускай паэтэсы Алаізы Сцяпанаўны Пашкевіч. Нарадзілася яна ў вёсцы Пешчына, што непадалёк ад г. Ліды, у заможнай сялянскай сям'і. Маленькая Алаіза да 10 гадоў расла і выхоўвалася ў сваёй бабулі — слухала яе песні і казкі, памагала па гаспадарцы. А калі бабуля памерла, дзяў-**

чынка перабралася да сваякоў у вёску Высокі Двор. Вучоба ў вандроўных настаўнікаў — «дарактароў» не задавальняла дапытлівую натуру будучай пісьменніцы. І яна едзе ў Вільню, каб вучыцца ў гімназіі. Тут яна цяжка захварэла і вымушана была перапыніць вучобу, аднак застацца без адукацыі не магла. Алаіза скончыла Віленскую гімназію, вучылася на вышэйшых адукацыйных курсах у Пецярбургу, тут жа, у Пецярбургу, здала экстэрнам экзамены за поўны курс у Аляксандраўскай жаночай гімназіі, вучылася на філасофскім факультэце Львоўскага універсітэта, у Ягелонскім універсітэце (у Польшчы), вывучала беларускі народны тэатр і фальклор.

Цётка актыўна змагалася за нацыянальнае вызваленне беларускага народа, шмат сіл аддавала культурна-асветнай працы. Яна адкрывала нелегальныя беларускія школы, падрыхтавала падручнік «Першае чытанне для дзетак беларусаў», стварыла і выдавала «Лучынку» — часопіс для дзяцей і юнацтва.

Хворая на сухоты, пісьменніца лічыла сваім найпершым абавязкам самаадданае служэнне народу. Сваё галоўнае крэда яна выказала так:

Думаць усюды аб народзе,
Родны край усюды сніць.

Так яно і было ў жыцці. Нават у эміграцыі яна не забывала сваю бацькаўшчыну, свой народ, сваю культуру. За межамі Беларусі яна выдала зборнікі вершаў «Хрэст на свабоду» і «Скрыпка беларуская», пераклала з украінскай мовы кнігу «Гасцінец для малых дзяцей», падрыхтавала матэрыял пра батлейку — традыцыйны беларускі лялечны тэатр.

А калі Алаіза Сцяпанаўна прыехала на пахаванне бацькі, які памёр ад тыфу, то ўжо не магла пакінуць у бядзе сваіх землякоў, што пакутавалі і паміралі ад тыфу. Ратуючы людзей, яна сама захварэла і памерла. Пахавалі яе ў вёсцы, дзе яна вырасла, на высокім прыдарожным кургане.

* * *

Скора прыйдзе вясна,
Панясецца «ку-ку»
Праз лясы, праз палі,
Праз наш Нёман-раку;

Па Вілле па сястры
На плытах паплыве
Аж пад вокны да хат
І вясёла гукне:
«Дзецюкі, гу-гу-гу!!!
Ўжо вясна на дварэ!
Ўжо трава на лугу,
Ужо кветкі ў траве!
Гэй! Хутчэй за саху,
Ды араць, ды араць...
Ды усім у спяху
Засяваць, засяваць...
Ды глыбей, ўсё глыбей
Зерне сыпаць ў зямлю...
Ды хутчэй, ўсё хутчэй
Упраўляці раллю...
Каб драсны не цвілі,
Каб асот не тырчаў,
Каб ячмені зляглі,
Каб авёс аж драмаў;
Каб вам бульба была,
Як той яблык ў саду;
Каб капуста зрасла
Велізной з галаву!
Тады будзе крапчэй
З горам стаць да вайны
Ды скарэй і лягчэй
Рваць ланцуг цемнаты...»

## ЛЕС

Высокі лес, шумі-скрыпі,
Расу хавай,
Ў раку ўлівай;
Грыбы расці,
Не дай цвісці
Жалобным кветкам.

Нясі палеткам
Свой доўгі дзень,
Кладзі на пень
Ў гірлянды мох,—
Сцялі пасцель,
Каб кожны мог
Прылегчы спаць.

Высокі лес, ці чуеш гром,
Як ён злуе са ўсіх старон?
Як па дуплах дрыжаць зязюлі?
Як хмара з хмарай пайшла ў гулі?
Тарахнуў гром.
Маланка паліць
На вугаль чорны ўвесь гарэх.
А во і град па голлях смаліць,
А во на злосць, а во на смех
Пярун натрое дуб разбіў.

А во пяць елак зачапіў
Круцясты віхар,
Гне іх удвое,
А во ў гняздо якраз абое
Упалі буслы;
Пішчаць іх дзеці.
А во няма куды падзеці
Кустоў маліны перад бурай.
А во і зайчык дрыжыць скурай.
На кветках пчолак град пабіў.
Пазёмкі з купін дождж змыў
Усё хаваецца, дрыжыць,
Усенек лес цямненькім стаў
Па голлях шум;
У лесе штурм,
На землю сцелецца навал
Высокі лес, гусценькі лес,
Іскрыцца бела шата
Ў крышталях іва,
Бяроза сіва,
Ў мароз прыбрата,
Чакае свята.
Зялёна елка —
Быццам з пудэлка,
Стаіць у дрымоце
Дубок пры плоце.
Кусток каліны
Абпёр галіны
На трухлай тоўстай борці
Заціхлі песні
Ў лістох цярэсні.
У гнёздах пуста,
Дзе было густа
Птушак вясною

Дзятва лясная
Да нас злятае
З цёплага краю,
Аж з-за Дунаю.
Сойка зімуе,
Цецер такуе,
Дзяцел такоча,
Сава рагоча;
Верабей ля хаты,
Смецюшок чубаты,
Ды сястра-сінічка —
Нашы вечны госці.

## ВОСЕНЬ

(Урывак)

Восень гумны накладае,
Возіць снапы, рашчыняе
Хлеб галодным гаспадарам:
«Ешце, людцы, вы нядарам
Працавалі усё лета,
Закусіце хоць за гэта».
Бульбу з ніўкі верне ў мех
Ды барзджэнька прэ ў засек,
Тне капусту з качанамі,
Гусей гоніць з бацянамі
У далёкі край за горы,
За азёры ды за моры.
«Птушкі мілы, не кляніце,
А малітвы гаварыце,
Каб вас хвіля не забіла,
Каб акула не ўкусіла,
Каб вярнуцца клекатаці,
Пастушочкаў забаўляці».
Восень — міла гаспадыня:
Дзе ні глянеш — поўна скрыня
То арэхаў, то пшаніцы
Па куточках у святліцы.
Аб усім яна так дбае,
Нівы зябліць, засявае,
У папары руніць жыта,
Каб на весну было сыта.

## ЛЕТА

(Урывак)

Ніва шуміць каласамі
Жыта спелага, аўса;
Ўся прыбрана васількамі,
Як дзяўчына да вянца.
Вецярок па ёй гуляе,
Клоніць колас да зямлі,
Сонца зерне налівае,
Бусл клякоча на гумні.
Гаспадар бяжыць з касою
На зялёну сенажаць,
Спяшыць выкасіць з расою,
Смаглей*, гладчэй траву сцяць.
Бабы мыюць, хусты рубяць,
Ш'юць сарочкі, хвартухі.
Чутна — ў лесе недзе трубяць,
Сочаць гнёзды пастухі.
Дзеці ў пасецы збіраюць
Да кузёмак пазямкі,
А ў грыбах дзяўкі гукаюць:
«Сюды, хлопцы, дзяцюкі!»

# ГАЛЬЯШ ЛЕЎЧЫК
# (1880—1944)

Нарадзіўся паэт у Слоніме. Сапраўднае яго імя Ілья Міхайлавіч Ляўковіч. Скончыў гарадское вучылішча, служыў некаторы час пісарчуком у каморніка, потым у канцылярыі міравога суддзі.

З 1904 г. жыў у Варшаве, дзе ў будаўнічым аддзеле варшаўскага магістрата працаваў чарцёжнікам. Аднак увесь час Ляўковіча цягнула на Бацькаўшчыну. Кожнае лета паэт наведваўся ў родны Слонім. Менавіта тут яму найлепш думалася, найлепш працавалася. Любоў да Айчыны перадаецца ў яго вершах, якія носяць назвы яго родных мясцін — Слонім, Селявічы, Жыровічы... З 1907 г. Ілья Ляўковіч актыўна супрацоўнічаў з газетай «Наша ніва».

Паэт заўсёды выступаў супраць зла, якое гняце душу паднявольнага народа («Чаго ж я ў журбе», «Каб усе так слёзы нашага народу...», «Восень...»). Цяжка перажываў Г. Леўчык, калі чуў весткі аб тых, хто адракаецца ад род-

най мовы, гэта балюча адгукалася ў яго вершах: «Хто адрокся сваіх...», «Мая прадмова».

Уваходзячы ў плынь заходнебеларускага рамантызму, Г. Леўчык на пачатку 20-х гадоў бярэцца разам з Л. Родзевічам і І. Канчэўскім памнажаць патрыятычную легенду. Гэта выразна перадаюць такія яго вершы, як «Дзіка бура загудзела», «Цень беларускага лірніка», «На дзяды...». Сувязь паэта з вызваленчым рухам, які ў Заходняй Беларусі 20-х гадоў насіў форму партызанскай барацьбы, прыўнесла ў вершы Леўчыка баявы аптымізм («Годзе!», «Дружна, брацця!», «Ідзі і сей!»).

Г. Леўчык збіраў вусную народную творчасць, апрацоўваючы фальклор, публікаваў вершаваныя загадкі для дзяцей, народныя жарты і анекдоты.

Вайна абарвала жыццё паэта. Ён памёр у ахопленай голадам і агнём Варшаве, далёка ад сваіх землякоў.

## МАЯ ПРАДМОВА

Нічога не хочу... Нічога, нічога —
Ні грошай, ні славы, ні шчасця сляпога...
А толькі ўсё жду я, каб родная мова
Хутчэй дачакала свабоднага слова!
Пакуль не дачдуся багацця такога,—
Нічога не хочу... Нічога, нічога!

* * *

Не нам, беларусам, не нам
Паном ці чужынцам служыці!
Нам тутака трэба і там
Для Белае Русі жыці!
Не нам, беларусам, не нам
З сваімі людзьмі калаціцца
І польскім ці іншым панам
Ў батрацкую службу згадзіцца.
Не нам, беларусам, не нам
Для мэты чужое пот ліці,
Мяняці кажух на лахман —
Нам трэба Русь Белу любіці!
Пара беларусам, пара
Для роднага краю старацца,
Для долі, свабоды, дабра —
За шчасце, народ свой змагацца!

## ГОДЗЕ!

Годзе плакаць, наракаць —
Трэба падымацца;
Час нам гора адганяць
І за розум брацца!
Жальбай, слёзамі ніяк
Мы тут не паможам;
Загрызе жуда чарвяк
Нас на свеце божым.

* * *

*Прысвячаю Якубу Коласу*

Не бачыў цябе я ніколі.
Як «песні» твае прачытаў —
Здаецца, што ў горкай нядолі
Душой ты мне братняю стаў!
Нас гора адно прыціскае
У сумнай і цяжкай жальбе,
Няўмольна жаль горкі з'ядае
Абодвух — мяне і цябе...
Абодва мы — дзеці нядолі,
Век сумна, гаротна бяжыць.
І ў хаце, і ў лесе, і ў полі
Нам жальба на сэрцы ляжыць...

## МЫ ЖЫВЁМ НАДЗЕЯЙ...

Хай марозны вецер завывае жудка,
Хай старонку родну снегам занясе,—
Мы жывём надзеяй! Хутка ці не хутка —
Радасныя весткі час нам прынясе!

Хай імгла зямельку ў путы спавівае,
Хай цямнее сонца з бураносных хмар,—
Мы надзею маем: край наш прычакае —
Лепшу долю дасць нам Бог і гаспадар!

Хай пануе ліха, цяжкія пакусы,
Хай бяда прыцісне, чмуцяць махляры,—
Ў нас жыве надзея! Будуць беларусы
Бедаваць, цярпець ўжо толькі да пары!

## ЖАЛЬБАЙ ЗНОЎ СПАТЫКАЮ ВЯСНУ...

Вось і птушкі пяюць, вось і кветкі цвітуць –
    Прыляцела вясна!
Ратай ў полі гарэ, весяло на дварэ,
    Зелянее трава...
А ў мяне у грудзях стогне сэрца ў слязах –
    Журба мучыць душу...
Ах, чаму ж гэта мне жыццё сумна плыве,
    Жальбай зноў спатыкаю вясну?!

## НІХТО МАІХ НЕ ЗНАЕ СЛЁЗ...

Ніхто маіх не знае слёз,
Што ў сэрцы схованы глыбока,
Проч роднай хаты там — далёка,
Дзе я радзіўся, бегаў, рос;
Дзе йшоў касцоў праз горы, долы
    Зык-звон вясёлы.

Ніхто маіх не знае слёз,
Ніхто маёй не знае долі,
Апроч крыніцы той — у полі,
І вербаў сумных, і бяроз,
Старэнькай грушы у садочку,
    Старых кляночкаў

Ніхто маіх не бачыў слёз,
Ніхто не знаў мяне ў нядолі,
Апроч той пасекі пры полі,
Апроч ракі, плытоў, і лоз,
І той дарожкі, што пры рэчцы
    Шнурком пляцецца.

Ніхто не знае... проч магіл,
Што траўкай-мохам зарастаюць,
Што столькі сумных дум хаваюць,
Нязбытых дум, прапаўшых сіл...
Дзе жджэ мяне дзярна ўзгор чысты
    На сон вячысты...

## ЧАГО Ж Я Ў ЖУРБЕ...

Чаго ж я ў журбе апусціў галаву?..
Чаго ж мне так цяжка, так цяжка ў грудзях?

Усюды боль ходзе па бедных людзях,—
І ці ж я няшчасны адзін так жыву?..

Ці ўжо я адзін тут так горка жыву?
Дзе шчасце і доля? Дзе гора няма?..
Усюды у сэрцах пануе зіма...
Чаго ж я ў журбе апусціў галаву?..

## ШКОЛЬНЫ ЗВАНОК

Які ж гэта голас гарой залятае,
Так зычны, прыгожы, вясёлы?
Вось гэта званочак, дзяцей прыклікае:
«Да школы, дзеткі, да школы!»
Бо школа, як маці, усім памагае
Навукай — багаты ці голы.
Дый лепшу дарогу жыцця адкрывае —
«Да школы, дзеткі, да школы!»
Бо школа любіці дабро навучае
Ляпей, чым царквы дый касцёлы,
Навукай высока людзеў паднімае —
«Да школы, дзеткі, да школы!»
Звані жа, званочку, хай Бог памагае!
Звон-зык твой так мілы, вясёлы!
Бо шмат чаго ў школе ўсякі пазнае —
«Да школы, дзеткі, да школы!»

* * *

Хто адрокся сваіх,
Хто стыдацца нас стаў
І прыліп да чужых,—
Каб ён свету не знаў!

Мову родную хто
Пазабыў, асмяяў,
Загубіў за нішто,—
Каб ён свету не знаў!

Сваю родну зямлю
Хто чужынцу прадаў,
Скрыўдзіў вёску сваю,—
Каб ён свету не знаў!

Хто з народам не жыў
І карысці не даў,
Хто сваіх не любіў,—
Каб ён свету не знаў!

## ЯНКА ЖУРБА
## (1881—1964)

Янка Журба (сапраўднае імя Іван Якаўлевіч Івашын) нарадзіўся ў вёсцы Купніна, што на Віцебшчыне, у сялянскай сям'і. Нягледзячы на беднасць, бацька ўсяляк падтрымліваў жаданне сына атрымаць адукацыю. Закончыўшы пачатковае, а потым двухкласнае вучылішча, Янка ў 1898 г. з вялікімі цяжкасцямі паступае ў Полацкую настаўніцкую семінарыю. Пасля паспяховага заканчэння яе ў 1902 г. ён настаўнічае ў вясковых школах на Віцебшчыне. Аднак малады настаўнік не лічыць сябе дастаткова адукаваным чалавекам, таму праз чатыры гады паступае ў Глухаўскі (на Украіне) настаўніцкі інстытут, дзе вучыцца да 1909 г. Працаваў настаўнікам спачатку на Палтаўшчыне, затым на роднай Віцебшчыне. Прага да ведаў па-ранейшаму вялікая, яго вабіць універсітэт. Але ж селяніну-бедняку дарога туды закрыта. І Я. Журба два гады вывучае гісторыю, тэорыю права і іншыя навукі на Вышэйшых камерцыйных курсах. Ды дзе браць грошы маладому паэту? І ён пакідае вучобу і зноў прымаецца за асветніцкую працу.

Да 50-годдзя з дня смерці М. В. Гогаля ён выступае з вершам, але сапраўднае творчае жыццё пачалося пазней. У газеце «Наша ніва» быў апублікаваны яго першы верш на беларускай мове «На берагах Дзвіны». Гэты верш вельмі спадабаўся Янку Купалу, і ён просіць маладога паэта прысланы звесткі пра сябе і новыя вершы.

Знайсці дарогу ў літаратуру вельмі дапамагла Янку Журбе падтрымка Янкі Купалы, з якім яны сустрэліся ў рэдакцыі газеты «Наша ніва». З гэтага часу пачынае ён друкавацца ў «Нашай ніве», а таксама ў часопісах «Маладая Беларусь» і «Лучынка».

У час імперыялістычнай вайны паэт эвакуіруецца ў Сімбірскую губерню.

У 1921 г. паэт вярнуўся на радзіму. Працаваў у навукова-педагагічнай камісіі Наркамасветы БССР, быў настаўнікам, інспектарам сацыяльнага выхавання, навуковым супрацоўнікам Інстытута мовы АН БССР.

**У 1934 г. Я. Журба па стану здароўя пакідае педагагічную працу. У гэты час ён жыў недалёка ад Полацка, у вёсцы Ніжняя Баравая і ў меру сіл займаўся літаратурнай працай.**

**Творы, напісаныя ў дарэвалюцыйны час, увайшлі ў зборнік вершаў «Заранкі», які быў выдадзены ў 1924 г.**

**Перад вайной Я. Журба падрыхтаваў да друку два зборнікі вершаў «Раніца» і «Шляхі перамогі». Але, на вялікі жаль, рукапісы не захаваліся. У пасляваенныя гады выйшлі зборнікі: «Выбраныя творы», «Ясныя шляхі», «Светлыя дні», «Вершы», кніжкі для дзяцей «Ластаўкі» і «Сонечная раніца».**

## ПЕРАД СВЯТАМ

Зімовы дзень пагасаў. Сцюдзёнае сонца хавалася за борам. Прашчальныя касыя прамені яго гарэлі крывавым агнём на засыпаных снегам стрэхах будынкаў, на белым дашчатым пералазе і, пралязаючы праз дзверы адчыненай клеці, адліваліся мядзяна-чырвонымі плямамі на бярвеннай сцяне.

Марознае паветра было сухое і спакойнае. Зверху, з лёгкіх пушыстых хмарак, сыпаліся рэдкія крупінкі падобнай да манны шэрашы.

— То як жа, дзядзька!.. Ужо ты павінен даць веры, што, каб не нуда, не пайшоў бы да цябе прасіць,— казаў Андрэй, малады русавалосы селянін.— Сапраўды не пайшоў бы, але схарчаваліся мы вельмі. Ужо аб нас з бабай няма што гаварыць, але дзеткі скігляць не еўшы, вось што...

Сямён, валасны старшына, таўсты, сярэдняга росту чалавек, усыпаўшы з мяшка ў дзежку мукі, струсіў яго, павесіў на засек і ўзяўся ў бокі.

— Я гэта, братка, і без цябе ведаю, без нуды да мяне не ходзяць, асабліва радня,— насмешліва згадзіўся ён.— Толькі быццам я такі багатыр, каб раздаваць сваё дабро ўсялякаму, хто спаткаецца? Ты думаеш, у мяне нат ведама якія скарбы. Не, братка,— толькі тое, што бачыш: больш нічога няма.

Андрэй пры гэтых словах зірнуў на поўныя збожжа засекі, апусціў галаву і цяжка ўздыхнуў.

— Дзякаваць Богу маеш,— ціха азваўся ён.— Сям'я твая невялікая: ты ды цётка Аўдоцця — не лішне шмат губ, не тое, што мая сям'я: сам дзесят!.. А вось каб ты мне

памог, век памятаваў бы на тваё дабро. Прыйдзе час, упраўлюся ўлетку і ўсё аддам з гарой. Свята ж цяпер прыйшло.

— Ну, гэта, хлопча, мы чувалі. Святы не я, бач зрабіў,— нахмурыўся Сямён.— Я ў святах не прычасны. Гэта божая справа,— няхай Бог і падае.

— Калі ты дасі, усё адно як ад Бога прыму...— пачаў ізноў пляменнік, але не скончыў: жаль здушыў яго сэрца: дзядзька не хацеў зважаць на яго нуду.

Андрэй адвярнуўся і зірнуў на запарошаны снегам падворак.

Сонца ўжо закацілася; але заходны край неба плыў, як водбліск далёкага бяздымнага пажару. Ад бору па палёх пацягнуўся доўгі шэры цень.

Старшына яшчэ троху пакапаўся ў кутку клеці, шукаючы чагось, крэкнуў і пайшоў да дзвярэй.

— Пара, хлопец, дахаты. Скора ўжо і зорку спатыкаць,— прамовіў ён.

Дзядзька з пляменнікам выйшлі з клеці.

— Дзядзенька, хоць бы крошку жытца! — паспрабаваў яшчэ прасіць Андрэй.— У кожнага хрышчонага штосьці ладзяць к святу; хоць і позна, але як-небудзь зладзіла б і мая гаспадыня. Памажы, дзядзенька, дзеля Бога!

— Ну ты, хлопец, з Богам да мяне не лезь! — сярдзіта крыкнуў старшына.— Калі ў мяне просіш, дык вось я сказаў табе, што не дам; а калі ў Бога просіш, дык на вось, сабяры ды вары,— жыта будзе важнае.— Пры гэтым старшына паказаў рукой на крупінкі падаючай з неба шэрашы.

Павярнуўшы злосна ключ у замку, Сямён пайшоў дахаты, не зважаючы на стаяўшага без шапкі Андрэя. Апошнія балючыя словы разанулі яго па сэрцы. Ён доўга не мог апамятацца. Твар яго быў скрыўлены горам і беднасцю. Ён усё яшчэ стаяў на адным месцы. Шэраш гусцела; на русавую галаву Андрэя садзіліся адна за адной і таялі дзіўнай формы сняжынкі.

Андрэй нічога не адказаў на апошнія словы старшыны, глынуў слязу, апусціў галаву і ціха пацягнуўся дамоў

Дома яго ждала галодная сям'я.

— Гарчыка жыта не даў... Што ж мы будзем рабіць цяпер? — пачаў жаліцца Андрэй сваёй жонцы.— У кожнага хрышчонага будуць з зоркай вячэраць, а мы і ў свята галадаць будзем. Вось табе і Каляды!..

Галодныя абдзёртыя дзеці плакалі на печы. Хліпала

матка, апёршыся аб печ, каля стала сядзеў, апусціўшы нізка галаву, Андрэй.

Гэтак спатыкалі галодныя людзі нараджэнне Хрыстова.

## ДА РОДНАЙ КРАІНЫ

Я цвёрда, шчыра веру,
Я веру ўсёй душой.
Што ўстанеш ты з няволі,
Край родны, мілы мой.

Табе, мой краю родны,
Жыццё ўсё аддаю,
Свае і песні-думы,
І ўсю любоў маю.

Ў табе мая уцеха,
Жыццё маё з табой,
Мая надзея й радасць,
Край родны, любы мой.

Я веру ўсёй душою,
Што вечна будзеш жыць,
Што ворагі ўсе згінуць,—
Нам сонца заблішчыць!

## УСХОД СОНЦА

Ужо золак заззяў,
Святло льецца ў прастор.
І ачнуўся ад сну —
Ціха шэпчацца бор.

Як кудзеля, туман
Яшчэ вісне ў палях,
І струменіць-плыве
Ад лугоў свежы пах.

Загарэўся агнём
Край усходні нябёс,
І ляцяць на зямлю
Іскры сонечных кос.

І здаецца — ўвесь свет
Шчырым сонцам сагрэт.

Сонцу рада зямля —
Шле усмешку-прывет.

Прашумеў вецярок
Па кустах лазняка —
І іскрыцца-гарыць
Залатая рака.

А ўгары — небасхіл
І пяе і звініць...
Узніміся, душа!
Ў даль твой спеў хай ляціць.

## АДРАДЗІЛАСЯ ПРЫРОДА

Адрадзілася прырода;
Зноў надзеі агарнулі,
І мае калішні жальбы
Дзесь далёка патанулі.

Адрадзілася прырода,
Запяялі ў небе птушкі.
І з душы маёй ізноўку
Льюцца песні-весялушкі.

Луг шырокі каля рэчкі
Ўсё пышнее, зелянее;
З траўкі ўжо зірнулі кветкі
Лес шумлівы ўсё цямнее.

Сёння з сошкаю араты
На палеткі каля гаю
З песняй выехаў на працу
І вясну-красу вітае.

Адрадзілася прырода...
Хай і край мой ачуняе,
Ќ жыццю новаму васкрэсне,
Здзекаў, глуму хай не знае.

Веру, родная краіна:
Возьмеш верх над цемрай злою,
Ворагі твае ўсе згінуць,
Сонца ўзыдзе над табою!

## ЗА АЙЧЫНУ

З вялікай журбою і з болем сардэчным
Хачу сваю скаргу спісаць
З душы, што ў сумоце і ў цяжкай пакуце,
Каб люты пажар з яе зняць.

Чаму мяне сціснулі смутныя думы,
Чаму яны сэрца шчымяць? —
У нашай старонцы нам шкодныя злыдні,
Бы тыя вужакі, сіпяць.

Як жалкі і брыдкі, ўсе ворагі злыя,
Вы роднаму люду майму!
Усіх вас заядлых я ведаю добра,
Збурыліся знаю чаму.

Вам шкодзяць свабодныя нашы парывы;
Вы хочаце сціснуць людзей...
Але не здушыць вам, гадзюкам, ніколі
Нязломных працоўных грудзей!

Ліюцца ўжо промні світання-збавення,
І хутка загіне цямрадзь.
Не зломіце вольнае наша імкненне;
Мы будзем аб волі спяваць!

## У КУПАЛЬСКУЮ НОЧ

Гэй, паліце агні —
Час ў дарогу ўжо нам!
Пойдзем мы па таемныя кветкі.
Захаванае шчасце
Здабудзем мы там;
Нас праславяць удзячныя дзеткі.
Дык жа пойдзем хутчэй
Грамадою у бор!
Скарб жаданы мы там адшукаем
Нам дарога ясней,
Бо блішчыць святло зор;
Перашкоды мы ўсе там зламаем.
Запылала здалёк
Нам зарніцай святло,
Больш не ўбачым мы цяжкага здзеку

Мы жадаем, каб шчасце
Хутчэй к нам прыйшло,
Бо мы ў цемры марнеем адвеку.
З цвёрдай верай ідзём
Агняцветы ірваць,
Хоць у пушчы вужакі і гады.
Перашкоды наўкол
Нам тут ладзіць іх раць...
Гэй, смялей! не баімся мы здрады!
Вунь, як зоркі, ўжо кветкі
Блішчаць у кустах,
І праменні ляцяць залатыя...
Бляск магутнага сонца
Разліўся ў палях
Нашы сілы жывіць маладыя!

## ЯК ЛЮБЛЮ Я ЦЯБЕ, БЕЛАРУСЬ!

Як люблю я цябе,
Беларусь ты мая,
І як дорага мне
Ўся прыгожасць твая!

Вось я полем іду
Летняй цёплай парой.
Я любуюся тут
Нашай роднай красой.

Ў небе скрозь яснота,
Няма воблачка ў ім.
Вабіць душу маю
Даль блакітам сваім.

Палымнее усход —
Нібы ўспыхнуў пажар.
Сонцу гімны звіняць;
Колькі ў гімнах тых чар!

Я у пушчу прыйшоў,
Эх, які ж тут прастор!
Як далёка кругом
Лес шацёр распасцёр!

Тут бярозкі стаяць
Беласнежнай сям'ёй;

Упрыгожаны дол
Аксамітам-травой.

А за лесам ізноў —
Сенажаці, палі.
Тут чакаюць зярна
Скібы свежай раллі.

Ужо вечар прыйшоў
З цішынёю сваёй —
І заснуў ціхім сном
Лес вячэрняй парой.

У абдымках смугі
Задрамалі кусты;
На зялёным галлі
Ўжо не шэпчуць лісты.

Вунь дыміцца рака,
Сціхлі скрозь галасы,
І упалі ў траву
Дыямэнты расы.

Усю прыгожасць тваю,
Беларусь ты мая,
І тваю яснату,
Эх, люблю ж моцна я!

Я вітаю цябе,
Край радзімы ты мой:
Ты ўжо скінуў навек
Гнёт нядолі ліхой.

Як жа радасна мне
Твой прастор аглядаць,
Шчырым сэрцам цябе
З жыццём новым вітаць.

## УЛАДЗІСЛАЎ ГАЛУБОК
## (1882—1937)

**Нарадзіўся Уладзіслаў Іосіфавіч Галубок (сапраўднае прозвішча Голуб) на станцыі Лясная пад Баранавічамі ў сям'і рабочага-чыгуначніка. Неўзабаве сям'я будучага**

драматурга перабралася на сталае жыхарства ў Мінск. Тут Галубок пачынае вучобу ў царкоўнапрыходскай школе. Працягвае сваю адукацыю Уладзіслаў у гарадскім вучылішчы. Аднак з-за трагічнай смерці бацькі скончыць вучобу хлопчыку не давялося, і ён ідзе працаваць. Увесь гэты час яго не пакідала надзея атрымаць адукацыю. Юнак настойліва рыхтуецца і экстэрнам здае экзамены за поўны курс гарадскога вучылішча. Акрамя гэтага, Галубок імкнецца далучыцца яшчэ і да мастацкай вучобы. Кола жыццёвых інтарэсаў маладога Галубка было надзвычай шырокім. Таму цяжка сказаць, куды б выкіравалася жыццёвая дарога Галубка, калі б ён не далучыўся да беларускага нацыянальнага культурна-асветніцкага руху. Вядомы беларускі пісьменнік Альберт Паўловіч увёў яго ў культурна-творчы асяродак, які склаўся вакол газеты «Наша ніва». Тут Уладзіслаў Галубок знаёміцца з Янкам Купалам, Якубам Коласам, Максімам Багдановічам, Змітраком Бядулем і іншымі пісьменнікамі. Галубок становіцца актыўным аўтарам «Нашай нівы». Пачынаючы з 1908 г., у газеце пастаянна з'яўляюцца яго апавяданні, вершы, допісы.

Неўзабаве прыйшло прызнанне: напачатку стагоддзя Галубок ужо лічыўся адным з самых здольных і плённых беларускіх празаікаў. Яго апавяданні рэгулярна з'яўляліся ў «Нашай ніве», «Маладой Беларусі», «Беларусі».

Маладога пісьменніка з неадольнай сілай прыцягваў тэатр. Сцэнічнае мастацтва выклікала ў яго душы ні з чым не параўнальныя адчуванні. Разам з Ф. Ждановічам Галубок марыць аб стварэнні стабільнага калектыву беларускіх артыстаў. У маі 1918 г. мастацкім кіраўніком «Таварыства беларускай драмы і камедыі» Ф. Ждановічам была пастаўлена новая п'еса Галубка «Бязвінная кроў». З вялікім энтузіязмам удзельнічаў Галубок у рэарганізацыі «Таварыства», якое стала працаваць пад назвай «Беларускі савецкі тэатр».

Цікава, што ў аснове сюжэта большасці твораў Галубка ляжаць паданні, вусныя гісторыі, якія запалі яму ў памяць. Спектаклі па камедыях Галубка гледачы сустракалі вельмі цёпла. Яму першаму ў рэспубліцы прысвоена ганаровае званне народнага артыста.

Загінуў Уладзіслаў Іосіфавіч Галубок у сталінскіх лагерах.

# ВЯСКОВЫЯ АСТРАНОМЫ

Доктар з астраномам, шукаючы спачынку душам сваім ад гарачых праменняў сонца, наважыліся на які дзень-два пакінуць горад і сцерці час у вёсцы.

Ведама, чаго шукалі, тое знайшлі. Дзве гадзіны дарогі,— і вёска Халадцы як вырасла перад імі. Ідучы вуліцай між старых хат, яны бачылі, як аглядалі іх праз вокны цікавыя бабы і як маленькія мурзатыя дзеткі, шэпчучыся адзін з адным, перабягалі праз вуліцу і прыглядаліся ім у вочы.

Як там што ні было, але панам усё падабалася, бо яны гэта блізка што ўпершыню бачылі. Доктар, выгадаваўшыся ў багатых бацькоў, праўда, чуў пра гора мужыкоў, але, не пазнаёміўшыся з іх жыццём бліжэй, мала ведаў аб іх. Гэтак сама і астраном. Давучыўшыся да сівых валасоў, а после дабіваючыся, як і калі будзе зацьменне, дзе якія планеты, не меў часу зірнуць у вёску і, каб не шчыры яго прыяцель доктар, пэўне, што адзін не паткнуўся б туды.

Вось нашы вучоныя, агледзеўшы збольшага лес, поле,— вярнуліся ізноў у вёску і зайшлі да селяніна Гапцуля папалуднаваць. Тое-сёе, глядзіш — заварушылася гаспадынька, затрашчалі на прыпечку трэсачкі, і смачная яечня ў момант апынулася на стале.

Тыц-мыц,— глядзіш — троху зверху пазбіралі дый пакінулі. Яшчэ астраном — туды-сюды, а доктар, як відаць, і рад бы з'есці, але быццам нешта шкодзіла.

Тым часам у хату ўвайшоў сам гаспадар. Скінуўшы з сябе армяк і адгладзіўшы бараду, цішком сеў за стол, адваліў лусту хлеба, ушчаміў у таўстых пальцах ды пачаў сёрбаць капусту. Доктар, паказеліўшы вочы, глядзеў і дзівіўся, як Гапцуль маўчком спарожніў адну міску капусты, другую, ды і за трэцюю ўзяўся. Пачаў тут наш доктар шаптацца з астраномам, шырока разводзячы рукамі. А Гапцуль тым часам, толькі яшчэ пачуўшы самы смак, спаражніў яшчэ чатыры міскі крупніку.

— Гатоў аб заклад ісці,— мармытаў свайму прыяцелю доктар,— што гэты чалавек не далей, як сягоння ўначы, Богу душу аддасць,— не вытрымае!

І вось, як будзе, то будзе, а доктар даў слова не ісці з хаты і чакаць бяды, каб у час памагчы чалавеку. Гапцуль, на астатку глынуўшы мерку квасу, адгладзіў бараду і як паважна садзіўся, так паважна ўстаў ды, не раўнуючы, як пан, разлёгся на ложку.

Не агледзеліся, як надышоў вечар. Гапцуль, унёсшы свежага сена, прымасціў гасцям пасцель і кажа:

— Спаць то добра будзе, але мухі на раніцы пытлююць трохі.

Але астраном на тое адказвае:

— Добра то добра, няма што; але мы лепш у садку выспімся,— бачыш, які вечар прыгожы.

— Ну, як сабе знаеце, але, па-мойму, дождж павінен быць.

Астраном ухмыльнуўся, падмігнуў на доктара, і паважна пасунуліся ў садок пад яблыню. У самай поўначы ні адсюль ні адтуль узняўся вецер ды калі ўрэзаў дождж, калі шматанула маланка, дык нашы начлежнікі, як мага, кінуліся ў хату і з радасцю паляглі на прыгатаваным звечара месцы.

Астраном аніяк не мог дадумацца, як мог пазнаць просты мужык, што будзе дождж, калі ён, вучоны, і то не пазнаў гэтага. Толькі настаў дзень, доктар зірк, ці жыў селянін? А той і не лыс: спіць сабе, задзёршы галаву і падхрапваючы на ўсе лады, як у жалейку! Вось толькі прачнуўся Гапцуль, доктар і пытаецца:

— Скажы, браце, як выдыхнуў ты ўчарашнюю ежу, няўжо нічога?

— А не! гэта мой звычай, паночку: ем датуль, пакуль брухам стол не адсуну, а як ужо стол кранецца, тады годзе!

— А скажы,— перапыніў астраном,— адкуль ты ведаў, што дождж будзе ўночы?

— Есць у мяне рабенькі бычок, і калі толькі ён пачынае хвост лупіць, то так і спадзявайся дажджу. На тым тыдні таксама ўвечары быў дождж, то мой бычок яшчэ досвіткам хвост пачаў лупіць.

— Слаўны бычок! слаўны! — цадзіў скрозь зубы астраном,— прадай мне яго; добра было б, калі часамі маё вока не спраўдзіць, то бык да толку давёў бы...

## АДУКАВАНАЯ КАБЫЛА

Раз Гаўрылу здарылася на кірмашы сходна купіць вельмі прыгожую і непамерна вялікую сівую кабылу.

Радаваўся Гаўрыла, гледзячы на канягу, хвалілі і суседзі, кажучы, што яна палкавая кабыла.

Дзень, другі патрымаў яе Гаўрыла на добрых харчах, а пасля, як ні хацеў, а прыйшлося ўпрэгчы ў саху.

Нясkладна хадзіла з сахою яна, відаць было, што незнаёма з раллёй.

Замаркоцілася кабыла, як папрацавала ўзапар колькі дзён ад сонца да сонца.

Вяртаючыся з поля ўвечар на адпачынак, яна нудна глядзела ў той бок, адкуль яе прыгнаў новы гаспадар, і прыпаміналa, як добра жылося раней, і як дрэнна цяпер Бывала — аўса ўволю, дагляд, працы ніякай, гарцуй сабе пад музыку, а тут мерай з канца ў канец даўгі шнур на полі.

— І за што гэткі здзек учынілі? — горка жалілася яна сама сабе.

Вось неяк у свята Гаўрыла выбраўся з'ездзіць у горад палюдскаваць трохі ды кабылу перагнаць. Толькі ўехаў у шырокую вуліцу, як на спатканне, ідзе пад трэск барабана цьма салдатаў з музыкай уперадзе.

Гаўрыла з'ехаў набок з дарогі і супыніў кабылу.

Тут музыка грымнула марш.

Не паспеў Гаўрыла адвесці дух, як яго кабыла з сілай ірванулася ўперад, выкуліла панарад у канаву і з выдзертымі аглоблямі панеслася ўздагонку за музыкай, падкідаючы зад угару.

Гаўрыла, рэзнуўшыся галавой аб ліхтарны слуп, не бачыў, што было далей, толькі, калі апамятаваўся, убачыў, як кабылу яго вёў за аброць дзесяцкі.

— Ты што гэта, на танцы яе прывёў, людзей пужаць? — грозна спытаў ён.

— Шатан яе ведаў, што яна танцуе,— адказаў Гаўрыла.

Кабылу адправілі на пажарны двор, а Гаўрылу паклікалі ў часць.

Толькі назаўтра ўбачыліся Гаўрыла з кабылай. Яна заржала і ветліва зірнула на яго.

Па ўпаўшых баках было відаць, што яна ноч прастаяла галоднай.

Глянуў Гаўрыла на яе і ўсміхнуўся. Злосць адразу адпала ад яго.

— Ну як жа ж танцы? — жартаваў ён.— Не выйшлі? Я так і знаў, што не пападзеш у тахту, я вось чалавек, і розум не кабылячы і то не патыкаюся, а то яна — вымкнулася... людзей папужала, ліхтары паварочала... Паедзем дамоў, у гасцях — гэта не дома, пэўне тут і каліва сена ў губу не далі, а мяне, прызнаюся табе, добра пачаставалі...

## СЛЯДЫ СТАРЫНЫ

З высокай гары, як красачка з зеляніны, паважна глядзіць на аколіцу старынны замак, абведзены высокімі пасівеўшымі сценамі.

Калісь у даўнія часы, як ля гэтых сцен гарцавалі ворагі, жадаючы лёгкай пажывы і крыві, з байніц грымелі гарматы, шлючы шалёныя кулі ў непрыяцельскі стан.

Цяпер блізка веку тут ціха і спакойна, замак вясёла пазірае ў неба, мяняючы час ад часу свой выгляд пад рукамі чалавека.

Не гудзяць і не кратаюць старыны кулі, не гінуць ад іх без ліку людзі; жыццё плыве, як вада ідзе...

Высокі акамянелы вал, зарослы высмаленай ад сонца травой і месцамі вышчарблены мінамі непрыяцеля, як даўней, так і цяпер, горда трымае на сваіх магутных плячах старыну. З высокіх байніц, быццам лютыя звяры, нема глядзяць у туманную даль гарлачы загрышпаленых* гармат, адкуль з адважных рук выляталі з шалёнай сілай кулі, нішчачы ўсё, што спатыкалася на дарозе.

З высокай вежы ззяе і пераліваецца ўсялякімі калёрамі на сонцы крыжык, а там званы, што калісь сваім працяжным рэхам ззывалі ў невялічкую каплічку людзей.

Маліліся тут шчыра, з вялікай верай, пад гром гармат, маліліся і ў часе спакою.

Адсюль ішлі на валы, а адтуль ужо каго куды накіроўваў лёс.

Прайшлі вякі, а пра гэтае арлінае гняздо і тых ваякаў, што змагаліся тут да апошняга ўздыху, баронячы сваё права,— не забылі.

Вялікія абшарныя пакоі са старасвецкімі мэблямі і партрэтамі знатных ваякаў сведчаць памятнікам старыны. Глянуўшы на маленькі партрэт, вочы не зразу адарвеш, жадаецца ўгледзецца, узгадаць іх жыццё, добрыя і блізкія справы і час смерці, каторая, не зважаючы ні на багацце, ні на славу, рабіла сваё.

Перад вачыма ў пекнай аправе, як жывы, малюнак вядомага гетмана, каторы калісь-то, дбаючы толькі аб дачэснай карысці, аддаўся ў рукі ворагу і ўпоруч з ім праліваў братнюю кроў...

Побач з гэтым партрэтам вісіць малюнак адважнага рыцара, каторы, накрыж трымаючы ў руках знамя і меч, клянецца перад народам, што будзе змагацца да апошняй каплі крыві. А далей партрэт яшчэ маладога, але ўжо досыць вядомага і шчырага ваякі, што вядзе войска су-

праць ворага, і, здаецца, у вачах яго гарыць іскра, каторая распальвае адвагу і, як промень, асвятляе надзею ў змагаючыхся за свае правы і дарагую бацькаўшчыну.

Між малюнкаў скрозь па сценах вісяць іх жалезныя латы, мячы, каторыя мелі пры сабе тыя бяссмертныя багатыры.

Нічога не загінула, усё іхняе тут і з вялікай пашанай сцеражэцца маладым пакаленнем. Адвага і смеласць іх відаць не толькі на партрэтах, а з большай праўдзівасцю ўсе іх пастулкі апісаны ў гісторыі, гдзе на вякі адбіліся, як у крыштальнай вадзе.

Вечка дамавіны прыкрыла толькі іх цела. Малюнкі ж партрэтаў адбілі выразы твараў, а гісторыя, як люстра, праўдзіва паказала, хто чаго варт.

Там відаць, хто да чаго быў здацен, хто змагаўся з ворагам за родную краіну, а хто прадаваў за золата і дыяменты роднага брата і родную старонку.

## ЧУЖОЕ СМАЧНЕЙ

У вёсцы Неманец жыў стары Ігнат, аўдавелы гадоў з дзесятак таму назад.

Дзед быў з характарам старасвецкіх людзей. Яго доўгая, сівая барада, чырвоны, прыветны твар мелі шмат павагі, і кожнаму, хто раз убачыў дзеда, у вачах малявалася пекная хвігура старога. Гаспадарку меў не дужа вялікую, але, працуючы ад ранняга да цёмнага, хлеба меў аж надта.

Трэба было толькі трапіць к Ігнату, а галодзен не будзеш; накорміць, напоіць, а падарожнаму і з сабою дасць.

Памятаю, як сягоння: зайшоў я раз святым днём к дзеду пагаманіць. Дзед палуднаваў. Зараз туды-сюды сабраў, якія меў, прысмакі, усадзіў мяне на кут і трактуе. Слова за слова, разгаманіліся пра гаспадарку. Вось дзед і кажа:

— Усё, дзякаваць Богу, урадзіла: і зерняткі ёсь, і агуркі ёсь, а бульба, браце, як вырасце, жаднага смаку не мае, хоць вон выкінь. Вазьмі вось, спрабуй!

Закаштаваў колькі бульбін, хоць, можа, і грэх, але я памысліў, што Ігнат ад старасці смак згубіў. Але, не хочучы дзеду гумар псаваць, згадзіўся з ім і кажу: «Праўда, бацька, праўда: смаку няма, гэта ўжо не бульба, калі ядлоўцам аддае. Вось трэба, каб маей закаштаваў, то пэўне і на насенне ўзяў бы!» І, далёка не адкладаючы,

прашу дзеда к сабе, а сам пры гэтым мыслю, трэба старому выкінуць шутку і накарміць яго ж уласнай бульбай.

Якраз перад тым, калі дзед меўся быць, я папрасіў у яго жонкі свежанакапанай бульбы, абчысціў яе і зварыў.

Прысунуўся дзед. Селі за стол. Звараную бульбу з гарачым парам, у вялізнай місцы, са скваркамі ўставілі перад намі на стол. Чарку дзед, чарку я, і ну, за бульбу. Дзед яшчэ і не пробаваў, а ўжо кажа:

— Зразу чуваць, што бульба не раўня маёй, глянуць, душа радуецца, а здаецца, зямля адна, праца тая самая, а хвальш такі ёсь.

І не паспелі добра агледзецца, як бульбы анізвання не асталося ў місцы.

Як толькі сабраўся дзед адыходзіць і пачаў дзякаваць за частунак, я і кажу:

— Не варта, дзядзька, за сваё добрае дзякаваць, гэта каб еў маю бульбу, ну, то тады ўжо так, а як хватыгаваўся над сваёй, толькі ў маёй хаце, то не варта.

Дзед з дзіву вылупіў вочы.

І як я ні тлумачыў, а ўсё ж ткі веры не даваў. Але, нарэшце, адходзячы дамоў, паківаў галавой і засмяяўся, кажучы:

— Праўда, суседзе, чужое заўсягды здаецца смачней за сваё.

## СМЕРЦЬ СТАРЦА

Прыгнуўшы худую спіну і апіраючыся на плячо правадыра, крок за крокам ішоў каля яго стары, абвешаны накрыж торбамі.

Адна нага, абутая ў непамерна вялікі дзіравы бот, лянíва пасоўвалася за дзераўлянай клюкай. Даўгая сівая барада, як у таго спагаднага дзеда, аб каторым шмат гамоняць дзеці ў часе Калядаў, была асаблівай прыкрасай яго прыгожага твару. Няведама, чым былі даўней багаты вочы, на месцы каторых засталіся цяпер толькі дзве ўваліўшыеся ямкі.

Ніхто не ведаў, адкуль і кім быў гэты дзядок, і некаму гэтым было цікавіцца: даў лусту хлеба, і мінай, дзед, далей. Праўда, спыталіся, скуль ён і дзе так акалечыўся, але стары, паказаўшы на згрышпанелы крыжык, што вісеў на сярмяжцы, махнуў толькі рукой.

Маленькі жвавы правадыр ні на крок не адступаў ад дзеда і штохвіліны спаглядаў на яго збялеўшы твар, як бы жадаючы згадаць наперад кожную думку старца.

Ведучы дарогай, абмінаў карчы і каляінкі, а як прыходзілася заходзіць у хату, то пільна аглядаўся на парогі і вушакі, каб дзе часам не зачапіўся дзядуля. Мусіць-то, вельмі дораг быў унуку гэты старац, калі так шчыра даглядаў яго.

Вось неяк у зімовы дзень дзед з хлопцам з самага рання хадзілі па хатах жабраваць. Мінуўшы апошнюю хатку і атрымаўшы ад старца-бабыля кавалак хлеба, выйшлі з вёскі, пацягнуліся дарогай удаль і скрыліся за крутым паваротам.

Поле бялела ад снегу; лес сінеў удалі, зліваючыся вярхамі сваімі з колерам неба. Увокал было ціха, толькі знекуль чутно было выццё сабакі.

Дзед моўчкі кратаўся, закідаў наперад доўгі кій, а за ім ледзь падцягваў цяжка абутую нагу правадыр, дробна ступаючы, квапна ўглядаўся на лес, быццам жадаў прабіць цемру, каб бардзей угледзець вёску. Ведаў добра, што не сілы дзеда цягацца па хатах, але што зробіш — не лезці ж жывым у яму.

Увайшлі ў лес. Векавыя сосны ў белым убранні прыглядаліся з вышыні на гэтых мізэрных людзей. Вялікія вываратні, як засланкі, распусціўшы на дарогу карэнні, чапляліся за ногі.

— Мусіць-то, вялікі лес? — спытаўся старац.

— А не саўсім — вунь прагалінка відаць,— адказаў хлопец.

— Ну дык пойдзем, дзіцятка, бо чую, што ногі надта прыстаюць.

Хлопчык заварушыўся. Ідучы між тоўстых сосен, ён лічыў дрэвы ў той думцы, што яны хутчэй кончацца, а за імі будзе відаць вёска. Лес парадзеў. Дарога наперадзе накрыж разыходзілася.

— Крыжовая дарога,— адазваўся хлопец.

— А то добра, дзеткі: крыху спачнем ды памалюся, бо нейкі цяжар на сэрцы чую,— сказаў дзед.

Хлопчык ведаў, як маліўся дзед. Зараз дастаў кантычку* з торбы і пачаў голасна вымаўляць слова за словам, пазіраючы то на крыж, то на дзеда: дзед, апёршыся пасінеўшымі пальцамі на плячо правадыра, сціх. Шаптаў сляпы малітву.

— Пойдзем ужо, дзеткі, здаецца, снег цярушыць,— сказаў урэшце дзед.

За лесам у лагчыне, як плямінка, ледзь-ледзь адзначалася вёска. Снег сыпаў штораз гусцей. Неба крыху засінелася спярша, а пасля зразу зацягнула нібы цёмным

туманам. Вецер завыў, зашумеў бор, вёска і дарога раптам счэзлі. Снег, быццам вырваўшыся з няволі, гнаўся, як шалёны, па полі, збіваючы з ног і старца, і правадыра.

— Ой, дужа дрэннае надвор'е, і сам не ведаю, куды кінуцца,— адазваўся дрыжачым голасам хлопчык.

— Нічагуткі,— прашамкаў дзед, атрасаючы з барады снег,— зараз супакоіцца; вёска ж — сам казаў — недалёчка. Шкада, што з лесу выйшлі, але што ж зробіш, тут пэўне і хвойкі нідзе не ўгледзіш.

— Нічога не відаць, толькі пень перад намі,— адказаў хлопец і заплакаў.

— Не плач, сынку, не плач, я сяду пры пні,— супакойваў дзед хлопца і, нашчупаўшы кіем пень, прысеў.

— Дзядулёк, я чую, сабакі брэшуць, можа, скранёмся? — прасіў хлопчык.

— Не, родненькі, не, не змагу: ногі мае саўсім акасцянелі,— хіба крыху пачакаўшы.

— Ну, то я хоць адзін пабягу, мо каго напаткаю: прывяду — памогуць, выратуюць,— прынадзейваў хлопчык.

— Бяжы, дзеткі, бяжы, толькі не заблудзіся, бо дарогі пэўна ані слядзінкі,— перадасцерагаў старац.

Хлапец рвануўся ўбок і што маючы сілы пусціўся па зацярушанай снегам дарозе. Бегучы і валяючыся ад сілы ветру, ён штораз аглядаўся, дзе пакінуў дзеда, то зноў зварочваўся к вёсцы, каторая ўжо сумна паказвалася з-пад вялікіх сувеяў. Сілы яго, здавалася, не толькі не ўбывалі, а яшчэ прыбывалі. Але вось урэшце і вёска. Уляцеўшы ў першую хату, ён толькі дух перавёў і з усёй сілы закрычаў: «Ратуйце!!! Дзядулёк у полі змёрзне!»

— Што ты, хлопча! Дзе? Дзе? Які дзядулёк? — пасыпаліся пытанні перапужаных хатніх.

— Там! Там! За вёскай... У лагчынцы... пры пні,— чуць зміняючы дух, растлумачваў хлопец.

Заварушыліся, загудзелі ў хаце, як у вуллі: хто кінуўся каня запрагаць, хто апранацца, хто яшчэ дапытваў хлопца.

Ускорасці ёмкі буланы конік прымчаў двух мужчын і хлопца ў лагчынку.

Там пры пні, паўзавеяны снегам, сядзеў, стуліўшыся, дзядуля. Мужчыны кінуліся разгортваць снег, а хлопчык, прытуліўшыся да старога, хукаў яму ў твар і то крычаў, то быццам прасіў:

— Дзядулёк! Ачніся! Ачніся, мой даражэнькі! Дзяду-

ля! Гэта я, твой Васілёк, ачніся, залаценькі мой! — І, кінуўшыся перад ім на калені, заплакаў.

Ледзь-ледзь заварушыліся пасінеўшыя вусны старога дзеда, цяжка паднялася дрыжачая рука яго і апошні раз пагладзіла галоўку малога Васілька...

## ЯНКА КУПАЛА
### (1882—1942)

Іван Дамінікавіч Луцэвіч — такое сапраўднае імя народнага песняра — нарадзіўся ў фальварку (на хутары) Вязынка, што на Маладзечаншчыне. Яго бацька, беззямельны шляхціч, вымушаны быў арандаваць зямлю ў памешчыкаў. Так і пераязджалі Луцэвічы з аднаго месца на другое ў пошуках арэнды і лепшага жыцця. Аднак пошукі гэтыя былі марныя: сям'я ледзь зводзіла канцы з канцамі. Янка быў старэйшым сынам, і яму найбольш прыходзілася памагаць бацьку па гаспадарцы. А яго вабілі кніжкі, ён хацеў вучыцца. За адну зіму скончыў Бяларуцкае двухкласнае вучылішча. Але тут адна за адной на сям'ю пасыпаліся беды: памёр бацька, затым брат і адначасова дзве сястры. Тут ужо было не да вучобы. Працаваў Янка вандроўным настаўнікам, перапісчыкам у следчага, чорнарабочым, памочнікам вінакура на броварах. Такая работа не магла задаволіць паэтычную натуру юнака, які ўжо складаў вершы. І тут яму пашчасціла ўладкавацца ў рэдакцыю «Нашай нівы», затым ён паступіў на агульнаадукацыйныя курсы ў Пецярбургу.

Першы яго верш «Мужык» пад псеўданімам Я. Купала быў надрукаваны ў 1905 г., а праз тры гады выйшаў зборнік паэзіі «Жалейка», куды ўвайшлі лірычныя вершы і паэма «Адплата кахання». Аўтарскі эпіграф вызначае лейтматыў усяго зборніка:

Грай, мая жалейка,
Пей, як салавейка!
Апявай нядолю,
Апявай няволю,
І грымі свабодна,
Што жыве край родны!

Дый не толькі ў гэтым зборніку паэт «апяваў» нядолю і няволю беларускага селяніна. З болем расказвае ён пра бяспраўнае і гаротнае жыццё простага чалавека і ў пазнейшых творах. Аднак купалаўскі герой не толькі скар-

дзіцца на свой няшчасны лёс, ён стараецца здабыць лепшую долю, ганарыцца сваёй сілай і здольнасцю:

Затрымаю ваду,
Цёмны бор павалю,
А як з сошкай пайду —
Увесь свет накармлю!

Многія вершы Я. Купалы прасякнуты глыбокім патрыятызмам («Ворагам беларушчыны», «Родная мова», «Маладая Беларусь»). Ён імкнецца абудзіць нацыянальную свядомасць працоўнага люду, заклікае да барацьбы за незалежнасць, сцвярджае яго права «людзьмі звацца». Паэт услаўляе чалавека-змагара, нязломнага абаронцу свайго народа. Так, з вялікай любоўю малюе ён вобразы Бандароўны з аднайменнай паэмы і гусляра з паэмы «Курган».

Шырока выкарыстоўваючы фальклор у сваёй творчасці, Я. Купала заклікае шанаваць багатую і самабытную беларускую народную культуру, якую стагоддзямі не прызнаюць, топчуць і ганьбуюць. Вось, да прыкладу, радкі з верша «Забытая скрыпка»:

Я пакажу ўсе вам чары —
Чары ўсе неба, зямлі,—
Шчасця другога пажары,
Дзе б вы сагрэцца маглі!

І далей музыка заклікае:

Гэй жа, за мною, са мною!
К сонейку шлях пакажу!..

Любоўю да сваёй старонкі напоўнена яго багатая пейзажная лірыка, дзе паэт раскрывае магутную сілу і прыгажосць роднай прыроды.

Творы нашага геніяльнага паэта, драматурга і публіцыста, класіка беларускай літаратуры любяць чытаць і завучваюць на памяць не толькі ў нашай краіне, але і ва ўсім свеце. Многія яго паэтычныя творы пакладзены на музыку, драматычныя не сходзяць са сцэн тэатраў, паводле многіх зняты мастацкія і дакументальныя фільмы, пастаўлены тэлеспектаклі, шмат якія яго творы інсцэніраваны і часта гучаць па радыё.

Усю творчую спадчыну Я. Купалы можна назваць летапісам жыцця беларускага народа.

Чытайма ж гэты летапіс!

## ЗА СВАБОДУ СВАЮ...

За свабоду сваю
Ўсёй душой пастаю;
У агонь, у ваду
Я за ёю пайду.

Лепей сам сябе дам
Пахаваці людзям,
Як свабоду хаваць,
Злыбядзе аддаваць.

Ў сэрцы, ў думках сваіх
З самых лет маладых
Я яе ўзгадаваў
І сваёю назваў...

Гэй ты, гэй, вецер, пей
А свабодзе маей!
Гэй ты, гэй, бор, шумі,
А свабодзе грымі!

Гэй ты, сонца, гары
Ад зары да зары,
Ланцугі распалі
Па ўсёй чыста зямлі!..

* * *

Хоць ты, сэрца, лопні, трэсні,
Хоць ты выгані, пан, з хаты,—
Буду пець я свае песні
Ці то ў будні, ці то ў святы!

Думкі, оды пець я буду,
Қаб усякі весяліўся,
Қаб для гэтага тут люду
Свет інакшы адчыніўся!

Қаб на полі ці на лузе,
Ці працуючы ля дому,
Ці у лесе, ці пры плузе
Пеў ён песні па-сваёму!

Қаб ніколі не чураўся
Сваёй родненькае мовы,

У якой узгадаваўся,
Хоць забыўся дзеля новай.

Дык пець буду табе, людзе,
Каб працёр ты свае вочы! —
А шмат лепей табе будзе,
Як адрозніш дзень ад ночы.

Бо ты ж надта цёмны, браце,
Як тытун у табакерцы,—
Хоць не воўк — жывеш у хаце,
Хоць ты маеш душу, сэрца.

О, я знаю: сэрца маеш,
Бо па свінцы нават плачаш,—
А што мовай пагарджаеш,
Дык ты гэтага не бачыш.

Гэй, прасніся, беларусе!
Усе людцы паўставалі.
Гэй, прасніся, беларусе!
Усе праўдачку пазналі.

## СЯРОД РАЗ'ЮШАНЫХ САТРАПАЎ...

Сярод раз'юшаных сатрапаў,
Паганы зладзіўшы хаўрус,
Свае таргуюць і чужыя
Табой, няшчасны беларус.

Дыхнуць свабоднымі грудзямі
Й зірнуць арліна не дадуць,—
На ўзлёты дум кладуць аковы,
Як на рабоў сляпых кладуць.

Здушылі, збэсцілі ўсё чыста
У чорнай яве, ў зводных снах.
Што ад прыроды шлях свой мела,
Што к сонцу мела вольны шлях.

На здзек прадажныя прарокі
І на гніццё у царстве цьмы
Вядуць аплучаныя тоўпы
Пад стогны вечныя турмы.

Над пакаленнем неакрэпшым,
Над бедным краем-сіратой
Груган з начніцаю сляпою
Банкет спраўляюць чорны свой.

Таўкуцца душы скамянелы.
Крывавы пот цячэ са шчок.
А ўслед над імі і за імі
Імчацца гібелі наўскок.

Нідзе ні ладу, ані праўды,
Званы хаўтурныя звіняць...
О Божа! ты хоць заступіся
Й не дай да рэшты нам сканаць!

## ТАМ

Там кроў ліецца, там за волю
Барцы на вісельні ідуць,
А вы, вы мучаны найболей,
Спіцё, хоць вас даўно там ждуць.

Скажыце мне, а за каго йны
Пайшлі на смерць, пайшлі вайной?
Хто ёсць на свеце так дастойны,
Што трэ' ахвяры аж такой?

Га, з вас ніхто таго й не знае,
Што йдуць за тых на бітваў жар,
Хто труд свой потам аблівае,
Над кім стаіць з нагайкай цар.

Што йдуць за тых на катні здзек,
Хто сваёй працай горкай, цяжкай
Свет корміць,— сам галодны век,
Адзеты лапцямі, сярмяжкай.

Што йдуць, каб бедным і галодным
Дзянькі сыцейшы зацвілі,
Зрабіць нявольніка свабодным,
Даць беззямельнаму зямлі.

Дык вось на смерць ісці іх змусіў
Найнешчасліўшы чалавек.

А вы, адродкі Белай Русі,
Спіцё, як быццам кат засек!

До спаць! Паўстаньце грамадою
І йдзіце ім там памагаць,
Паўстаньце крэпасцю такою,
Каб вораг вас не мог зламаць.

Паўстаньце, покуль цар звыродны
Крыві ўсяёй не выссаў з вас!
Паўстаньце! Край ваш стогне родны,
Заве збаўляць, як зваў не раз.

Паўстаньце, гляньце, Божа мілы,
Свабоды сонца вас заве!
Крыху адвагі й дружнай сілы,
А шчасце вечна зацвіце.

Зганіце сон, аслепны сон,
Збудзіце дух прыбіты свой,
І ўдарце ў згоды гучны звон,
І сабярыцесь грамадой!

І йдзіце, йдзіце вы туды,
Дзе ўжо даўно кроў льюць за вас,
Нясіце веліч слёз, бяды,
Нясіце крыўды напаказ!

Хай кроў пальецца дзень, другі
Варожым трупам на падсціл,
Хай у няволі ланцугі
Спадуць ад грому вашых сіл!

## ВЫЙДЗІ...

Ўстань ты, старонка, родная маці!
Годзе зімовага рабскага сну,
Годзе табе ўжо слёзна ўздыхаці,—
Выйдзі на поле, на сенажаці,
Выйдзі спаткаці вясну!
Скінь лахманы, што доўгія векі
Ты валачыла з кастры, з палыну;
Выйдзі з-пад дзікай зімняй апекі,
Што над табою строіла здзекі,—
Выйдзі спаткаці вясну!

Вырылі сцюжы віхрамі, снегам
Яму глыбоку табе не адну;
Снежныя наспы мела начлегам...
Глянь, снягі таюць, рэчкі йдуць бегам...
Выйдзі спаткаці вясну!
З поўначы сівер кідаў табою,
Як абадрану з лісткоў галіну;
З захаду зверы йшлі чарадою
Рваць твае грудзі... Выйшла жывою,—
Выйдзі ж спаткаці вясну!
Дзетак тваіх скрозь крыўдай сляпілі,
Мучылі, гналі без часу ў труну,
Казак вучылі, што ты ў магіле,
Толькі ж бліск сонца здраду асіліў...
Выйдзі спаткаці вясну!
Ясна, святочна ў красы ўбярыся,
Птушкай свабоднай сягні ў вышыну,
З сонцам злучыся, зорамі йскрыся,
Песняй распейся, славай акрыйся,
Выйдзі спаткаці вясну!
Сплецену з церняў маеш карону,
Хорам твой — неба і нівы краса,
Царства ў чатыры дрэмле староны,
Слугі — мазольных рук міліёны...
Выйдзі... Чакае вясна!..

## ЯНА І Я

### 1. Стрэча

На крыжавых пуцінах з ёй сустрэўся —
Куды ісці, не ведала яна,
І я не ведаў — ў полі я ці ў лесе,
І мне ляжала сцежка не адна.

Як путнікі, заблуканыя ўночы,
Стаялі мы пад труднай ношкай дум;
Адно другому пазіралі ў вочы
І слухам клікалі найменшы шум.

Стаялі мы. Нявіданыя дзівы
Нас абымалі крыллямі сваймі,
Шапталі мне: вазьмі яе, шчаслівы!
Шапталі ёй: сабе яго вазьмі!

І рукі злучывалі нам навекі,
Багаслаўленне далі нам сваё
Ісці у свет праз горы, долы, рэкі,
Ісці супольна праз усё жыццё.

Вясельны гімн, як плачкі, нам запелі
І заракалі крыллямі зарок —
Над ёй, заручанай, у шлюбнай белі,
І нада мной, ахутаным у мрок.

А каб вас злыя не змаглі заломы!
А каб не зналі душы вашы ран!
А каб вас не кранулі буры, громы!
А каб к сабе не звабіў вас курган!

Такія клалі дзівы нам зарокі
Мядовых асалод, квятчаных крас
І расплыліся, як сон ветру лёгкі,
Нас кінуўшы ў благі ці ў добры час.

І мы пайшлі, як тыя цені-мары,
Няспынна ад расы і да расы;
Запаланелі нам бліскучыя пажары,
Закуранелі чорныя лясы.

## 2. У хаце

У хаце ўжо маёй будзь гаспадыняй,—
Няма ў мяне нікога, проч цябе;
Сядзь на пачэсны кут, мая багіня,
І будзем думы думаць аб сабе.

Палац мой, бачыш, хоць і не багаты,
Але я сам яго узбудаваў,
Сам сцены вывеў, клаў на кроквы латы
І сам падстрых саломай пакрываў.

Не выбіты атласам сцены, лавы,
Падлога не заслана дываном
Турэцкім, што сваёй красой іскравай
Гарыць, зіяе, як той жар, агнём.

Над печкай, што стаіць каля парога,
Не працавалі мудры разбяры,

Сам з гліны збіў яе й з пяску сырога
Ды вапнай пабяліў разы са тры.

Вось ложак зроблены маёй рукою,
З смалістай сосны дошкі выслаў ў ім;
Пасцель пуховую пасцелем мы з табою,
Каб мякка спаць было нам абаім.

У ночнай цішы, ў любым упаенні,
У патаенні ад жыцця, людзей,
Агонь душу і сэрца распрамене,
Агонь гарачых, злучаных грудзей.

І мнагацветныя акружаць нас вясёлкі,
Маланкі залатыя замігцяць,
А думкі нашы, верныя саколкі,
Да неба з добрай весткай паляцяць.

Так мілаванне к шчасцю след адчыне,
А мілаванне — над царамі цар,—
І будзеш век маёй ты гаспадыняй,
А я твой вечна буду гаспадар.

### 3. Праталіны

Ўжо на зямлю ляглі праталіны,
Снягоў спаўзае зімавая бель,
Узгоркі свецяць — як апалены,
Вада ў лагчынах жаліцца, як чмель.

Дзе-нідзе глянула нясмелая
Пралеска вочкамі на божы двор,—
Людскіх слёз кветка сіня-белая
Шукае сонца днём, а ночкай — зор.

Крылатыя стварэнні з выраю
Па млечнаму пуці плывуць, як шнур.
І, творачы малітву шчырую,
Сваіх шукаюць кінутых пячур.

Спагаднае святло нябеснае
На колькі вёрст звялічыла свой шлях.
Па нівах промені пачэсныя,
Як лён той, сцелюцца ў жывых агнях.

І ў хатку заглядаюць промені,—
Дармо, што нізкія аконцы ў ёй,—
Гуляюць радасна па коміне
Бліскучай і вясёлаю сям'ёй.

Па ложку, па пасцелі ласяцца,
Цалуючы яе і мой гарачы твар,
Як тыя ветрыкі на пасецы,
Гуляючы ў пякучы летні скварр.

Устань, галубачка бяскрылая,
Заспаны зоры-вочанькі пратры,
Збяромся з думкамі і з сілаю
Жыцця парадак валачы стары!

Праталіна лягла на гонейках,
Збудзілася пралесачка ад сна...
Устань, устань, маё ты сонейка!
Залатаструнна йграе ўжо вясна.

### 4. За кроснамі

За кросны ненаглядная сесці трэ' было
    Ядваб-кужэль сівенькі ткаць,
Але да гэтага прыладаў не было,—
    Прылады стаў я майстраваць.

З бярозы вычасаў ставы ёй новыя,
    Набіліцы кляновыя зрабіў,
А панажы выстругаваў кляновыя,
    Навой, як трэба, зарубіў.

Узяўшы дзічку-яблыню крамнястую,
    Стругаў чаўнок гладзей ад шкла.
Купіў на рынку бёрда густа-частае.
    Ніты сама яна спляла.

Садзіцца маё сэрца-ткаля ў кросенькі,
    Набіліцамі громка б'е,
Кладуцца ўтоку гусценька палосанькі,
    Сучу я цэўкі для яе.

Так шчыра з ёю ўзяліся дарэчы мы;
    Яна ўсё тчэ, а я сучу,

І ўкрадкаю любуюсь яе плечамі,
За белымі грудзьмі сачу.

Тчы, мая ткаля! Кроў твая ўзыгралася;
Маланкай гойсае чаўнок.
О, каб хаця аснова ўжо не рвалася!
Каб моцны й спорны быў уток!

Няхай ад бёрда часта ўток калоціцца,
Кладзе шырокі гладкі сцяг,
А доўгі — як рака, што ў мора коціцца,
Як між прысад гасцінец-шлях.

Каб сцежка, коцячыся, палатняная,
Дзе парастае дзівасіл,
Дайшла ў старонку знаную-нязнаную,
Туды, да бацькаўскіх магіл.

## 5. Выган у поле жывёлы

Спаўзлі з загонаў зімнія снягі
І ў мора паплылі ракой-вадзіцай,
Запелі жаўранкі. І чорныя лугі
Ўсміхацца сталі першаю травіцай.

У поле статак выганяць пара.
Кароўку маем мы — завецца Аўтарыняй,—
Багацце кожнага гаспадара,
Скарб і пацеха кожнай гаспадыні.

«Мая» не выгнала яе за край
Платоў, на пашу, дзе яна хадзіла,
Пакуль таго, што вучыць абычай,
Над ёй сваёй рукою не ўчыніла.

Свянцоным хлебам, соллю і вадой
Абнесла навакол яе тры разы,
Паставіла да сонца галавой
І загавор чыніла ад заразы.

Ў крыніцы тры разы кусочак шкла
Скупала, і перад вачмі кароўкі
Трымаючы, шаптала, як змала,
Такія мудры заклінання слоўкі:

«Ты, ясна сонца, месяц, ясен свет,
І вы, на небе часценькія зоры,
Вы ўсе, што кропіце расою цвет,
І асвятляеце сушу і моры —

Зямлю агрэйце, вырасцце траву,
Не пашкадуйце есць і піць жывінам,
Шаўковую сцяліце мураву,
Абгарадзіце жалязяным тынам.

Вартуйце, сцеражыце ад цара
Ляснога, палявога, вадзяного,
Ад царанят яго, ад упыра,
І ад людскога вока нелюдскога!»

### 6. Агляд поля

Вялікі свет! Не згледзець тых абшараў,
Што прадзеды пакінулі і нам:
Дзе лес, дзе лозы, дзе ляжаць папары,
Дзе рунь абходзіць ўжо на хлеб людзям.

Сягоння, мілая, быць хочу я з табою,—
Дык ручку на плячо мне палажы,
Я стан твой атулю рукою
І ў поле пойдзем, пойдзем пад крыжы.

Як дзеці, пазабытыя тым светам,
Свае палеткі будзем аглядаць
І, пад загонам седзячы сагрэтым,
Пачнем аб жніве будучым гадаць.

Багата мы з табою маем гоняў,
Ўпару абсеяць, зжаці толькі б іх,
Ды ў добры час злажыць у застаронне
Сям'ю снапкоў паспелых, залатых.

Так станам песцячысь яе прыгожым,
Ідзём, ідзём з загона на загон,
Дзе перш араць, дзе сеяць перш — варожым —
З надзеяй дачакаць нядзельных дзён.

Абняўшыся, пад крыжам адным селі,
З бакоў стаяў другі і трэці крыж,

З крыжамі мы, як здані, ў свет глядзелі,
І душы нашы ўзносіліся ўзвыш.

Мы благаслaвілі неба воблік сіні,
Што нашы думкі ўзносіў да сябе,
І ў думках кланяліся той часіне,
Што нас злучала ў шчасці і ў жальбе.

Жыццё, зямлю і сонца блаславілі,
Старыя грушы, вербы на мяжы,
А праклiналі толькі скону хвілі
І тыя вечныя па нас крыжы.

### 7. Радаўніца

На радаўніцу мы на могілкі пайшлі,
Свянцонага з сабой астаткі ўзяўшы,
Як гэта з давен-даўна на нашай зямлі
Дзяды і прадзеды рабілі нашы.

Маніліся нябожчыкаў адведаць мы.
На могілкі народу шмат сышлося,
І людзі сноўдаліся між крыжоў, як цьмы,
Хістаючысь, як ветрам гнутае калоссе.

На плітах каменных парос зялёны мох,
Бярозы, хвойкі плакалі над імі,
А пасярод капліца жудка, як астрог,
На свет глядзела вокнамі сляпымі.

Ля насыпу мы з мілай селі ў старане,—
Пад насыпам тым спала яе матка,—
І прашаптала мілая, схіліўшыся ка мне:
«Адзін, адзін цяпер ты ў мяне, братка!»

Як боб, буйныя слёзанькі з яе вачэй
Пасыпаліся на магілку градам,
Здалося мне — заплакала і неба з ёй
Над гэтым здушаным зямлёю садам.

Штось сэрца сціснула, зірнула ў дно,
І паплыла сляза ўслед за слязою,
А думаў, што ўжо ўсе іх выліў я даўно,
Што ў свет гляджу ўжо зрэнкаю сухою.

Ў магілках дрэмле бацька мой і два браты,
Сясцёр малых зямелька абымае.
А я жыву на свеце доляй сіраты,
Мяне зямля за нейкі грэх трымае.

Пусціўшы гэтак сумным думам павады,
Бязмежны жаль паплыў ў душу крыніцай.
І я таксама, як яна тады, шаптаў:
«Адна на свеце ты ў мяне, сястрыца!»

## 8. Ворка

Саха мая зусім ужо гатова,—
Зрабіў к ёй новенькую плаху,
Нарогі павывострываў нанова,
Даў на паліцу тоўсту бляху.

Вось толькі коніка ў яе упрэгчы,
Махнуці пугаю нягрозна,
Ў загоне на рагач крывы налегчы,—
Барозна пойдзе за барознай.

Сняданне з'елі з ёю удваёчку,—
Каб сыта — трудна пахваліцца;
Хлеб падзялілі разам па кусочку,
Сцюдзёнай запілі вадзіцай.

Пайшоў з сахой, пусціў нарогі ў гоні.
Нагамі толькі конік мой цярэбе,
І сцелецца загончык пры загоне,
Аж сонца цешыцца на небе.

Вам, людзі, што сваёй рукою белай
Зямлі не кратаеце сэрца,
Не дагадацца цераз век свой цэлы,
Як сэрца чалавека б'ецца.

Таго, які увосень ці вясною
Зямлі сахой чапае грудзі
Або зярно хавае бараною,
Каб вырасла для вас жа, людзі.

У важны час заворкаў ці засеўкаў
Імша абходзіцца святая,

Душа сяўца лунаецца, як дрэўка,
Якому вецер ліст зрывае.

Арыце, сейце, людзі, хто што можа,
Старым ці новым абычаем!
А вашу працу доля упрыгожа
Шчаслівым, буйным ураджаем.

### 9. Беліць палатно

Чачоткавы зрабіў ёй пранік ёмкі,
З аздобамі і ручкай гладкай,
І палатно панёс з ёй да пагонкі,
Дзе сажалка была і кладка.

Усю трубу укінулі ў вадзіцу;
Яна, свой скінуўшы каптанік,
Кашулю падкасаўшы і спадніцу,
Ўзышла на кладку, ўзяўшы пранік.

І пярыць стала мокра палаценца,
Складаючы на кладцы ў складкі,
На ножкі пырснула і на каленцы
Вадзіца, як раса на градкі.

Распырсківаліся, як іскры, пыркі,
Мігцелі ўсюды мнагацветна.
На гладзі воднай рысавалі крыскі
І ніклі ў гладзі непрыметна.

Бліскучыя агністыя прамені,
Купаючыся ў сажалчыным версе,
К маёй галубцы ў мёдным уміленні
Туліліся і грэлі персі.

Так палаценца мілая бяліла
Вадзіцай, пранікам на кладцы,
Пасля сабе на плечы узваліла
І слаць нясла на сенажатцы.

Нясла. Вада па ёй цурком сцякала.
І на аселіцы ля плота
Тканіну мыту распускала.
Цяперка сонца ўжо работа!

Бяліся, наша палатно, бяліся,
Як дзень, як месяц бледны, бела,
Як бела малако ў глінянай місе,
Як та саломінка паспела!

## 10. Сяўба

Ралля падсохла, мяккай стала воўнай,
Ўжо час узяцца за сявалку,
Ў зямлю зярнят насыпаць жменяй поўнай,
Як ад бацькоў навучыўся змалку.

Ад той, што ад зімы засталась, часткі,
Штось кінуўшы на час нязбыты,
Адмерылі мы з ёй са дзве шаснасткі
У мех, рукой яе пашыты.

І выйшаў сеяць я. Яна стаяла
Непадалёк мяне, на ўзмежку;
У высях сонца золатам зіяла,
Ўнізу плыў вецер сваёй сцежкай.

Пасыпаліся дробныя зярняты
Ў раллю, як пацеркі янтарны,
На наш загон, сахою узараны,
На мой шнурок — палетак ярны.

Яна, як ніцая бярозка тая,
Стаяла, за сяўбой сліздзіла,
І як бы багародзіца святая —
Здавалася мне — блаславіла.

Лажыцеся ў раллю, зярняткі, спаткі,
Накрыйцеся пасцілкай-скібкай,
Пасля збудзіцесь, выгляньце з краваткі,
Як воўна — густа, як дзень — шыбка!

Расціце высака, расціце буйна,
Як гэта пушча за дарогай!
Маліцеся да бела Бога чуйна
І чорнага не гнеўце Бога!

Каб не паспалівалі вас спякоты,
Дажджы каб вас не пазмывалі,

Каб не пабілі грады і грымоты,
Каб вам заломаў не ламалі!

### 11. Поліць агародніну

Я выган плотам гарадзіў, яна палола грады;
Благое зелле вырывала, кідала у пасцілку,
Дзе каліў не было,— дасаджывала там расады,
Там прарывала, дзе ўзышло загуста праз памылку.

Чырыкалі над ёю верабейкі на чарэсні,
Нязгледна час ад часу вецер пралятаў крылаты.
І адазвалася мая палея сумнай песняй,
Такой, якую ў нас пяюць вясеннім днём дзяўчаты.

#### Вяснянка

Ой, брала вясна у сонца ключы,
Адчыняла сырую зямельку,
Пускала на свет траву-мураву,
Адзявала у лісце бярозы.

Дзе толькі ні йшла яна,— з прыпала
Густа сеяла, сеяла кветкі,
На край свету гнала рэчкі яна,
Птушкам волю і голас давала.

Ой, выйду я, выйду на сенажаць,
Буду віць, завіваць вяночак,
Пяяць з салавейкам буду у тахт,
Сэрцу песняй вясну выклікаці.

Прыйдзі ты ка мне, сагрэй ты мяне,
Абымі ты мяне, як друг мілы,
Пасей на душы мне долейкі мак,
А на сэрцы — пшанічку кахання!

Каб доля, як мак цвіце, зацвіла,
Каб каханне расло, як пшанічка,
Каб мілы мяне мой верна любіў
І галубіў ў святліцы, як шчасце.

Звінела песня і злівалась з музыкаю птушак,
Бярозавыя на гасцінцы плакалі прысады,
Заводзіў вецер, б'ючысь аб асінавы асушак...
Я выган плотам гарадзіў, яна палола грады.

## 12. Яблыні цвітуць

Яблыні цвітуць, так хораша цвітуць,
Як белым высыпаны пухам,
Пчолкі на цвяткі па мёд сабе лятуць,
З вулля ў вулей нясуцца духам.

Селі з ёю мы пад яблыню ўдваіх
На траўцы святачнай нядзеляй;
Сонца разлілося ў променях сваіх,
Лісткі на яблынях зардзелі.

Вецер плыў лісткамі, песціў, калыхаў,
Галінкамі трос, як крапілам,
Птушак жвавых шчэбет хвілі не сціхаў,
Кружыўся з белым кветак пылам.

Раем на зямлі выглядываў нам сад,
Я ў ім — Адам, яна ў ім — Ева;
Ў раі гэтым вецер быў нам бог і сват,
Вяцьвямі шлюб давала дрэва.

Птушкі ў мільён струн вяселле гралі нам,
Пасажнай маткай была пчолка,
Сонца несла ўцехі думкам і грудзям,
Пасцелю слала нам вясёлка.

Капаў нам на вочы яблыневы цвет,
На нас валіўся, як снег белы,
Мыслі нашы беглі сіняй далі ўслед
І свет сабой тулілі цэлы.

Мілая! О, колькі радасці даеш
Майму ты сэрцу маладому!
Нават ты сама таго не спазнаеш,
Які ты скарб у маім дому!

Мілая, сагрэй мяне сваймі грудзьмі!
К маім грудзям прыліпні шчыра;
Богамі хай станем мы паміж людзьмі,
Нябеснага князямі міру!

## 13. На сенажаці

Выйшлі з ёй, дзе сенажатная краса
Зіхцела, як вясёлкі мнагацветны ўзор,

Вострая яшчэ дзе не забразгала каса,
Дзе ў кветках луг ірдзеў, як неба ўноч ад зор.

Выйшлі, як душы дзве злучаны навек
Выходзяць, кінуўшы магільную жарству,
Светы аглядаць, якія ўзводзіць чалавек...
Прыйшлі мы й дзівімся такому хараству!

Краскамі ўсміхаецца ўся сенажаць,
Гараць урочнікі, румянкі і званкі,
Жоўтыя званцы зялёны луг жаўцяць,
На кветку з кветкі шыбка скачуць матылькі.

Рэчка бурбаліць па каменнях між вольх,
Вадзіца бліскатна лялее ў бегацьбе,
Сціха штосьці шэпча, шалясціць трыснёг,
А сонца сочыць у вадзе само сябе.

Кветкі з ёю рвём, вянок сабе пляце —
Карону ясна-цвет з нявысненай красы;
Хараша, да твару йдзе ён сіраце,
А з-пад вянка плывуць па плечах валасы.

Шчасна так, абняўшыся, ў траве плывём,
Купаюцца у кветках ногі да калень,
Шчокі, грудзі нам гараць, гараць агнём,
Іскрацца вочы, цела просіцца пад цень.

Сонца штораз больш у жылах кроў агніць,
Калені штораз больш ласкоча нам трава,
Блогасна аб сэрцы сэрца ў жары сніць,
Жаданнем забыцця п'янее галава.

Ногі падкасіліся і мне, і ей,
Зліліся вусны з вуснамі самі сабой,
Полымем прыпалі грудзі да грудзей,
Змяшаліся мы з сонцам, з кветкамі, з травой.

### 14. Краса свету

Вясна, вясна! О, колькі ў табе шчасця!
О, колькі радасці прыносіш ты з сабой!
Умееш ты ў душы агонь раскласці
І грудзі распаліць агністай барацьбой.

Святлом свет цэлы заліла гарачым,
Раскінула з зялёнасці жывы шацёр,
На ўсім зямлі абшары доўгаспячым
На сваіх кроснах выткала чароўны ўзор.

О, цешся з гэтага сама, вясна ты!
Ўжо славу бласлаўляць цяпер усе тваю —
Зямля і неба, і вецер крылаты,
І я красе тваёй сваю дань аддаю.

Гэй, ажыло зямлі старое папялішча!
Зайгралі рэчкі, плечы выраўнаваў бор,
Спраўляе птушак жвавы рой ігрышча
І падлятае з радасцю чуць не да зор.

І думка ўвысь ляціць на вольных крыллях,
Як бы самому Богу мела расказаць
Аб тых нягаданага свята хвілях,
Якім вясна яе умела счараваць.

Ляці, імчыся, думка, вышай, далей,
Як вокам стрэліць можна у блакітну даль!
Схапі стуль песню з перуновай сталі
І прынясі мне волю сільную, як сталь!

Я песняй мілую сваю праслаўлю
Паміж народамі сваіх, чужых зямель,
Каб не загінула, як кветка, у бяспраўю,—
Жыла й тады, як ляжа ў вечную пасцель.

А воля мне жалезная патрэбна
За крыўды маёй мілай помстай заплаціць,
Што гаравала так яна бясхлебна,
Што ланцугамі мусіла шмат лет званіць.

## НА КУЦЦЮ

I

На небе зоры ўжо мігцяць,
На полі срэбны снег іскрыцца;
На бел-свет дзівы выпраўляць
Пляцецца ночка-чараўніца.

Глуш абнялася з цішынай
І спавівае ўсё у чары,

Паўзуць і сеюць шорах свой
Старым парадкам цені-мары.

Вылазе з цемры бледны звод,
Глядзіць сліўнём на долы, горы,
І тут і там пускае ў ход
Свае нямыя загаворы.

І тут і тамка свой прыгон
Распасцірае царства ночы;
Салодкі сон, магільны сон
Смяецца свету ўсяму ў вочы.

II

Заныла ўсё, замёрла ўсё,—
Не спіць адвечнае замчышча:
Там пачынаецца жыццё
Ў агнёх старога папялішча.

Іскрыстым, бліскатным святлом
Заліты княжскія святліцы,
Дружына вольная кругом
Сталоў дубовых варушыцца.

Залататканы абрусы
З сталоў звісаюць дыванамі,
На абрусах чысцей расы
Віно красуецца каўшамі.

Духі мінуўшчыны куццю
На старасвецкі лад спраўляюць.
Даўно бываламу жыццю
Дары належныя складаюць.

III

На беласнежны на пасад
Усходзе князь, усходзе княжна,
За імі слуг пачэсны рад
Стаіць задумліва, суважна.

Агні брыльянтаў, як зарніц,
Зіяюць з княжацкай кароны,—
Краса б'е з князеўных зраніц,
Як бліск маланак развуглёны.

Звярнулі вочы ўсе ў іх бок,
Прымоўклі гоманы дружыны;
Ўсіх званых зблізку і здалёк
Саколім вокам князь акінуў.

Бярэ коўш соладка віна,
П'е за дружыну маладую,
І княжна з князем п'е да дна;
Князь гутарку павёў такую.

IV

«Адзін, адзін раз толькі ў год
Збірацца можам з ласкі року,
Каб год іржавы карагод
Зганяць з мінуўшчыны далёкай.

Нас не кранулі косы змен:
Царым мы ў дум жывых гэйнале,
Хоць на падмурах гэтых сцен
Другія наш пасад занялі.

Багі другія верх бяруць,
Суды вядуць над нашым краем,
Свяцільні ж нашы не замруць,
Што ў сэрцах вольных рассвятляем.

Прашу паклікаці ганцоў
І месца даці ім па чэсці:
Ад нашых стоптаных капцоў
Якія нам прыносяць весці?..»

V

Закончыў князь, махнуў рукой;
Уходзяць тры ганцы ў святліцу,
Ідуць суважнаю ступой
І князю й княжне пакланіцца.

А першы гэткі светлы быў,
Як небам сланыя праменні:
Ў руцэ меў светач, што на здзіў
Усе усюды зводзіў цені.

А быў другі і з ног і з рук,
Як гром з жывымі перунамі:

Ў руцэ меў стрэл жалезных пук,
І лук стальны меў за плячамі.

А трэці быў і раб і цар,
І слаб і дуж ва ўсякім дзеле,
Як вечнасць, молад быў і стар;
Меў гуслі — на грудзях віселі.

VI

І першы князю гэткі сказ
І княжне скажа міласцівай:
«Я абышоў іх тройчы раз
І відзеў, што яшчэ ўсе жывы.

А толькі ўсё той самы лад:
З вачэй не зняты йшчэ павязкі,
Ці йдуць уперад ці назад,
Відны сляды цямрычнай ласкі.

А як ішоў між іх з святлом,
Яны пачулі, ах, пачулі:
Сляпым замораныя сном,
Худыя рукі ўвысь цягнулі.

За мною ўсцяж, і тут і там,
Іх вусны бледныя шапталі:
Аддайце сонца наша нам!
Нашто схавалі-расхапалі?»

VII

Другі за першым князю сказ
І княжне скажа міласцівай:
«Я абышоў іх тройчы раз
І відзеў, што яны ўсе жывы.

А топчуць толькі ўсё той след,
Валочаць ёрмы за сабою;
Ці ўбачаць корч, ці ўбачаць цвет,
Адною жаляцца слязою.

А як чапнуў стралой аб лук,
Яны скрануліся ў прасонні,
І столькі, столькі крэпкіх рук
К маёй паціснулася броні.

За мною ўсцяж, і тут і там,
Іх вусны бледныя шапталі:
«Аддайце славу нашу нам!
Нашто схавалі-расхапалі?»

VIII

І трэці князю гэткі сказ
І княжне скажа міласцівай:
«Я абышоў іх тройчы раз
І відзеў, што яны ўсе жывы.

А толькі торг усё ідзе
Над іх душою патаптанай;
Яны, як цені, ў грамадзе
Маўчаць і йдуць на пір паганы.

А як я ўдарыў па струне,
Замітусіліся, як пчолы,
І на гарэ і нізіне
Мне падавалі голас кволы.

За мною ўсцяж, і тут і там,
Іх вусны бледныя шапталі:
«Аддайце песню нашу нам!
Нашто схавалі-расхапалі?»

IX

Сказаўшы так, маўчаць ганцы,
Маўчыць і князь крыху часіны,
І дасць адказ такі ў канцы
Ганцам на іхнія навіны:

«Не ўмруць, не ўмруць ужо яны,
Раз хочуць сонца, славы, песні;
Заб'юць ім зычныя званы
Прабудным звонам напрадвесні.

Сваёй забранай старане,
Скаванай мучаніцы-княжне,
Ўзнясуць пасад на кургане
На панаванне недасяжне.

На дзеле — кожны йшчэ слугой,
У думках — вольныя ўжо людзі;

Над сэрцам іх, над іх душой
Наш дух лунаці вечна будзе.

X

Вы, другі верныя, ганцы,
Як летась, сёлета, налета,
Ўсе пагранічныя капцы
Абходзьце зноў з маім прыветам.

Гуслямі, лукам і святлом
Будзіце, клічце і свяціце,
І так спануйце іхнім сном,
Каб сон іх шчэз і ўсталі жыцці.

А покуль поўнач не прыйшла,
Вясці бяседу будзем далей;
Засядзьце ўсе кругом стала,
Хай зазвініць віно ў крышталі.

А чарку першую ўзнясём
За цень мінуўшчыны у сеці,
Другой к цяпершчыне прап'ём,
Праславім будучыну трэцяй».

XI

Садзіцца княжна, князь, кругом
Садзіцца вольная дружына;
Шуміць бяседа за сталом,
Плыве часіна за часінай.

І разгараецца ясней
Паходня радасці забытай,
І светазарнасцю сваей
Вясёлкі сее самавіты.

Ямчэй нацягваецца лук,
Цэль рассякаюць агнястрэлы,
Дрыжыць паўчына і павук,
Дрыжыць прыблудак ачарнелы.

Рахкочуць гуслі звон у звон,
На бел-свет розгалас нясецца,
Як бел-свет, коціцца разгон
І ў думцы казкай раздаецца.

XII

Плыве шумліва, як рака,
Бяседа вольная такая,
А ўжо нявідзіма рука
На небе поўнач адзначае.

Залопаў крыллямі пятух,—
І ціхне-ціхне ўсё ў замчышчы;
Замоўк разгул, агонь патух,
Старое згасла папялішча.

На пустку ўзбрыўшы, воўк завыў,
Пуціну заяц перамерыў...
А быў тут хто або не быў,—
І так і гэтак мала веры.

І так і гэтак свой прыгон
Распасцірае царства ночы:
Салодкі сон, магільны сон
Смяецца свету ўсяму ў вочы.

## ЯКУБ КОЛАС
### (1882—1956)

**Паэтам трэба нарадзіцца, але ж гэтага мала, калі не здолееш выхаваць у сваім сэрцы любоў да свайго народа, прыроды, радзімы. У 1882 г. у засценку Акінчыцы Стаўбцоўскага павета ў сям'і лесніка нарадзіўся сын Канстанцін.**

**Сумленны, працавіты (сям'я паэта рана засталася без бацькі) праўдашукальнік не мог застацца ўбаку, калі рэвалюцыйныя падзеі ў Расійскай імперыі на пачатку стагоддзя ўскалыхнулі свет. Трэба было нешта рабіць, трэба было ўладам неадкладна праводзіць рэформы, якія б зменшылі розніцу паміж багатымі і беднымі. Учытайцеся ў вершы паэта і вы зразумееце, як пакутаваў наш працавіты люд. Будучы паэт яшчэ ў юнацкія гады быў на баку слабых, бедных і знядоленых сялян. Пасля заканчэння Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі Канстанцін Міхайлавіч працуе настаўнікам у вёсцы Люсіна, затым пераязджае ў Пінкавічы (на Палессі), адтуль едзе (не па свайму жаданню) аж пад Смалявічы, нарэшце вяртаецца ў родную Мікалаеўшчыну, дзе ён калісь браў першыя**

ўрокі ў хатняга настаўніка. Зімой 1906—1907 гг. жыве ў брата ў Смалярні, вучыць дзяцей. Тады ж у 1907 г. няўрымслівы настаўнік Міцкевіч едзе ў Вільню (цэнтр беларускасці), у рэдакцыю «Нашай нівы». Некаторыя ў Вільні ведалі, што малады настаўнік спрабуе свае творчыя сілы ў паэзіі. Дастаткова было прачытаць у газеце «Наша доля» верш «Наш родны край» (падпісаны псеўданімам Я. Колас), каб зразумець — у паэзію ідзе самабытны лірык, чые вершы абуджаюць багата пачуццяў і, што нечакана,— яны, вершы, вельмі лёгка запамінаюцца, яны простыя і вельмі эмацыянальныя. Здавалася, такому таленту будучыня будзе і лёгкай, і светлай. Толькі працуй.

Аднак жыццё распарадзілася інакш. У пачатку восені 1908 г. Я. Коласа як удзельніка нелегальнага настаўніцкага з'езда арыштавалі і прыгаварылі да трох гадоў турэмнага зняволення. Адбываў паэт тэрмін у мінскім астрозе. У камерах сядзелі разам і крымінальнікі, і палітычныя, але і тут паэт не кінуў пісаць вершы. Больш таго, там, на волі, у 1910 г. выходзіць першы зборнік вершаў «Песні жальбы». Праўда жыцця, журботная інтанацыя, сумныя мелодыі з'яў прыроды, празрыстае пачуццё любові да ўсяго жывога — гэта моцна ўзрушыла (і ўзрушае зараз) душы чытачоў.

Паэт заявіў пра сябе на ўвесь голас і адразу стаў зоркаю на паэтычным небасхіле побач з Я. Купалам, Цёткаю, М. Багдановічам. Коласаўскія песні працы і нядолі, жальбы і пратэсту заклікалі беларусаў да годнасці, да вышынь духоўнасці, будзілі маладыя сілы, клікалі не згаджацца з панаваннем зла, хлусні, несправядлівасці.

Пасля турмы Я. Колас зноў едзе на любае сэрцу Палессе, зноў працуе настаўнікам у вёсцы Купяцічы, а пасля ў Пінскім прыходскім вучылішчы.

Вільня, аднак, не забывала свайго паэта, менавіта там выходзяць новыя зборнікі прозы і паэзіі. Пазней паэт прызнаваўся, што і ў прозе ён нічога не прыдумваў, заставаўся верны праўдзе жыцця. Многае з напісанага ўзята з біяграфіі.

Толькі ў 1921 г. паэт пераязджае ў Мінск. Першым паслярэвалюцыйным выданнем Я. Коласа былі «Казкі жыцця», у якіх вызначылася мудрае, народнае бачанне, разуменне сэнсу жыцця чалавека. Паэт актыўна працуе ў розных жанрах прозы, драматургіі, паэзіі.

Не ўсё зробленае ім за апошнія трыццаць гадоў жыцця можна аднесці да шэдэўраў, і ўсё ж «Новая зямля», «Сымон-музыка», «Казкі жыцця», вершы можна

**па праву назваць энцыклапедыяй жыцця беларусаў. З такіх шэдэўраў складаецца скарбніца духоўных набыткаў чалавецтва. Акадэмік, віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук рэспублікі Я. Колас не мог быць убаку ад супярэчлівых падзей, якія адбываліся ў трыццатыя гады. Ён, як і многія інтэлігенты, паддаўся спакусе ілюзорных каштоўнасцей, аднак глыбінная народнасць, грамадзянскасць не дазволілі ягонаму талентуператварыцца ў рупар чужых ідэй.**

**У гады Вялікай Айчыннай вайны паэт жыў у Ташкенце. Нямала і ён зведаў гора, перажыў разам з народам, якому аддана служыў. Народнага песняра ведалі ва ўсіх кутках Беларусі і за яе межамі.**

**Працаваў паэт да апошніх дзён свайго жыцця, якое абарвалася раптоўна 13 жніўня 1956 г.**

## ЗАЛАТЫ ПРАМЕНЬ

У кожны момант і на кожнай мясцінцы зямлі адбываюцца найцікавейшыя рэчы і складаюцца самыя дзівосныя казкі, падобныя іншы раз да праўды, і нараджаецца праўда, яшчэ болей цікавая часамі, чым сама казка. Але скрыжалі зямлі, дзе запісваюцца казка-праўда і праўда-казка, такія разнастайныя і такія багатыя, што людзі вечна будуць іх чытаць і ўсяго не перачытаюць. І трэба вельмі ўважна прыглядацца, каб і на самым малюсенькім куточку гэтых скрыжаляў расчытаць гісторыю аб вялікіх падзеях.

Вось і тут, у гэтым лесе, здарылася нешта падобнае. Раскажу, толькі зараней прашу памятаць, што гэта — казка.

На горцы лясок стаяў, і лясок гэты быў не так вялікі. Каля горкі сям-там прабіваліся крынічкі, і рэчачка вывівалася збоку. Было нават і азярко і балотца,— ну, словам, усё было. Для адных істот, якія жылі ў гэтым лесе, тыя маленькія крынічкі паказваліся непраходнымі вялікімі рэчкамі, а азярко — бясконцым акіянам, а ўсё гэта разам здавалася ім цэлым сусветам. Другія ж глядзелі на гэта іначай...

Адным словам, сярод ляснога грамадства не было пагоджанасці ў поглядах на разуменне «вялікае» і «малое». Але гэта так сабе, між іншым. Важна было вось што, і гэта трэба адзначыць: усе сходзіліся на думцы, што той лад, якому падпарадкавалася лясное грамадства, ёсць адвечны закон, устаноўлены з самага ўтварэння свету, як выяўленне пэўнай гармоніі дабра і хараства. І лічы-

лася вялікім блюзнерствам не толькі пратэставаць, а нават і думаць, што гэты лад патрабуе некаторых змен і папраўак. А патрэба ў такіх зменах была, бо калі да гэтага ладу падысці з меркаю нават звычайнай крытыкі, дык у ім няцяжка знайсці заганы і нават, калі на тое пайшло, і несправядлівасць. І гэта можна давесці фактамі. Напрыклад: ці справядліва, што на кволенькія былінкі нападае тля і высмоктвае іх мядовы сок? Ці справядліва, што на горачку, дзе так слаўна грэе сонца, не дапускаюцца брусніцы, чорныя ягады, ну і хоць бы сабе дзераза? Чаму горкія асіны маюць права лапатаць на ўвесь лес, а нізенькі верас змушан туліцца да зямлі і маўчаць? Чаму адным — сонца, а другім — цень? І наогул, чаму адны павінны прыносіць ахвяры, каб на іх трупах будавалі свой дабрабыт другія?

Усе такія факты — а колькасць іх можна было б і значна павялічыць — ці не знаходзяцца ў супярэчнасці з гармоніяй дабра і хараства? А калі гэта так, дык чаму ж не змагацца супраць несправядлівасці? І яшчэ адно важнае пытанне: як магло стацца, што ляснoе грамадства лічыла гэты лад за выяўленне пэўнай гармоніі дабра і хараства.

Каб адказ на такое пытанне стаў ясным, трэба паглядзець, што рабілася тут уночы. Але наўперад трэба зазначыць яшчэ вось што (для мае казкі яно таксама мае значэнне). Нягледзячы на гэтую гармонію дабра і хараства, лясное грамадства адчувала, што яму чагосьці нестае, што над ім ёсць нешта такое, што не дае паўнаты жыцця. Разумеецца, на гэта была свая прычына, але аб ёй лепш падумайце самі, бо я баюся, каб мая казка вам не надакучыла. Дык буду казаць далей.

Прыгоства чараў, павабнасць таемнасці, страх цемры, велізарнасць нябесных прастораў і жах перад бясконцасцю і бязмежнасцю сусвету паказвалі тут цёмныя маўклівыя ночы. І асабліва павабна было тут тады, калі вандроўніцы-хмаркі пасплываюць з неба, а само яно расквеціцца незлічонымі агеньчыкамі-зорачкамі і выйдзе ў дарогу бліскучы кружок месячыка. І вельмі прыгожыя былі гэтыя зоркі. Іх было так многа і так яны часамі размяркоўваліся ў бяздонных глыбінях неба, што ўяўлялі сабою самыя вычварныя постаці і фігуры, вабячы хараством і недасяжнасцю. Далеч утварала гэтыя прыгожыя злучэнні зорак: такая ўжо ўласцівасць яе, бо далеч, як ніякі ў свеце мастак, умее паказваць рэчы ў найпрыгажэйшым выглядзе. Ад рухлівых пераліваў бляску зорных агнёў разлі-

валася ва ўсе канцы свету нейкая таемная сіла і так ці інакш кратала ўсе істоты і змушала іх тым ці іншым спосабам адгукацца ёй.

І тады ў лесе пачыналася нешта надзвычайна цікавае. З лясных гушчароў выходзіў лясун і пляскаў у далоні. Гэта ён падаваў знак, што пачынаецца ноч. Мяккае пляскание калматых рук падхоплівалі бліжэйшыя дрэвы і разносілі па ўсім лесе. З дуплястых асін вылятаці совы, вітаючы лесуна крыкамі «ківі! ківі!». На іх мове гэта значыла «жыві! жыві!». З нетраў выпаўзалі павукі, бязгучна, як цені, з-пад кары вылазілі светлякі і запальвалі свае зялёныя ліхтарыкі, каб пасвяціць павукам, бо павукі павінны былі развешваць на дрэвах танкаструнныя арфы. А прызначэнне іх было дваякае: як струмент для музыкі і як спосаб да жыцця саміх музыкантаў. Тонкія, зялёныя іголачкі на хвоях і лісце на іншых дрэвах пачыналі свяціцца такім жудасным і маркотным бляскам, што ў лесе рабілася страшна. А туман, уздымаючыся з нізін і з-пад гнілых пнёў, дурманіў лес і дадаваў нізінам і іх насельніцтву яшчэ болей цемры і таемнасці.

Калі такім парадкам усё было падрыхтавана, лясун надзяваў на сябе адзежу, сатканую з лісця і з танюсенькіх нітак, што пралі русалкі з кудзелі-моху, а на галаву ўскладаў карону, перавітую гірляндамі дзеразы з бluклівымі агеньчыкамі, і выходзіў на горку. У руках яго была бліскучая палка, зробленая невядомымі майстрамі з гнілушак, і гэтаю палкаю ён праводзіў па струнах арфаў, што развешвалі павукі ад дрэва да дрэва. Струны дрыгацелі і поўнілі ўвесь лес акордамі музыкі, нячутнай для чалавечага вуха. Музыка гучэла доўга, аж покі месяц не зрушваў з сярэдзіны неба. Гэтая музыка чаравала лес і ўсе істоты. Пакорна і нерухліва стаяў лес і ўсё, што было ў лесе. Тады лясун выступаў з прамоваю. І звінелі, як звон, яго словы па лесе:

«Слухайце, слухайце, высокія дрэвы, нізкарослыя кусты, пахучыя краскі і дробная трава! Слухайце і вы, пташкі, жукі, мушкі, і ўсе слухайце голас надзорных глыбінь! Я выклікаў вас да жыцця і даў вам сілу і рукі і ўсялякія здольнасці, каб чэрпаць асалоду. Я палажыў карункі на вашы голавы, умыў іх буйнымі росамі, убраў брыльянтамі і запаліў дыяменты, сабраныя з зорак, з месяца і з бліскучых znічак, каб ведалі вы моц і вялікасць таго, хто шчодра асыпаў вас дарамі і вызначыў вам лёсы. Праведзены граніцы кожнаму з вас, каб у сваіх граніцах выконвалі вы маю волю. Не пераступайце гэтых граніц,

не зайздросьце малыя вялікім, слабыя крэпкім, бо гэтым парушаеце волю маю. Уздыміце вочы вашы ўгару: ёсць там зоры вялікія і зоры малыя. Калі ж малая зорка захоча стаць вялікаю, я палю яе пякучым агнём, а бліскучы след ад яе, што бліснe на адзін толькі міг, ёсць знак мае кары. А калі вы будзеце пакорныя і не пераступіце закону майго, я ўзнясу вас вышэй зорак, і вечна вы будзеце піць асалоду. Дык слухайце і бойцеся парушыць волю маю!»

Гаварыў лясун, і словы яго закалыхвалі лес і ўсё, што было ў лесе. А месяц, спусціўшы свае бледныя, тонкія ніці, ціхусенька дакранаўся да яго і навейваў яму адпаведныя сны, што яшчэ болей замацоўвала той светапогляд і тую філасофію, што злажылася ў лесе.

Так праходзілі цэлыя гады і вякі.

Але кожная з'ява і кожная рэч на свеце знаходзіцца пад уплывам розных чыннікаў, і чыннікі гэтыя часта бываюць зусім процілежных катэгорый. І бывае такі момант, калі сілы чыннікаў розных уплываў стыкаюцца, як у полі крыжавыя дарогі, перасякаюцца ў якім-небудзь месцы, каб падпарадкаваць сабе гэтую з'яву ці гэтую рэч, каб панесці яе па сваёй пуціне.

Так было і тут.

Паслала сонца свае праменні на зямлю, каб сагрэць яе, развеяць туман і прынесці ёй радасць і шчасце. Адзін прамень сонца,— а яму было прызначана зараніць у сэрцы стварэнням на зямлі новыя мыслі аб новай праўдзе і справядлівасці на свеце,— праходзячы неасяжныя прасторы, згубіў дарогу на зямлю і заблудзіўся ў глухой цемрадзі сусвету. Даўгія вякі блукаў ён у міжпланетных прасторах сярод халодных пустэляў, шукаючы зямлі, і не знаходзіў яе. Схадзіў ён з канца ў канец увесь Млечны Шлях, агледзеў усе плямы туманнасцей, заходзіў на ўсе вядомыя і не вядомыя людзям планеты, насіўся па-над зорнымі краямі, зазіраў і ў іншыя краіны гэтага, страшнага ў сваёй бязмежнасці, сусвету, а дарогі на зямлю не знаходзіў. І толькі часамі свяціўся ён ружовым ззяннем у бяздоннях неба, і такою лагоднаю ўсмешкаю калыхаўся яго бляск вечарамі ў пустых багнах неба. І тады весялей рабілася на зямлі. Снегавыя вяршыні гор адбівалі гэтае ззянне і самі запальваліся ружовым або залатым бляскам. І тады шырэй рассоўвалі свае граніцы прасторы зямлі, лагадней пазірала поле, а вада ў рэчках, азёрах і ў морах калыхалася ружовымі хвалямі, як распушчанае ў агні золата. Гэтая радасць снавалася і ў танкарунных хмарках, бо адно толькі адбіццё залатога праменя

ператварала іх валокны ў ружовыя шаўкі. Весялела паветра, станавілася лёгкім і празрыстым, спавіваючы зямлю цеплынёй і радаснымі летуценнямі аб чымся бясконца светлым і добрым. І гэтае няяснае прадчуванне новага жыцця калыхалася тады ўсюды. А сам залаты прамень ні на момант не спыняўся ў сваіх шуканнях дарогі на зямлю і ніколі не траціў надзеі знайсці яе, каб выпаўніць сваё прызначэнне, хоць і многа было яму перашкод у гэтым блуканні. Яму засланялі дарогу прамені іншых планет. Варожа сустракалі яго маўклівыя пустэлі. Змрокам, туманам і хмарамі закрывалася зямля.

Ноч, цёмная ноч ляжала над лесам. Месяц зрушыў з сярэдзіны неба, і зноў правіў лясун сваё літанне і казаў свае прамовы. Як звон, звінелі яго словы па лесе, і чуўся ў іх надзвычайны пафас. І здзівіўся раптам лясун, прыпыніў сваю прамову на самым цікавым месцы, абвёў лес зялёнымі вачыма. Нічога падобнага не бачыў ён раней: на тонкіх іголачках хвой і на лісці іншых дрэў пагас пусты, халодны зялёны бляск, а замест яго іскрыліся жывыя, рухлівыя ружовыя агеньчыкі, а лес і ўсё, што было ў лесе, высока паднялі галавы і весела пасмейваліся.

Задрыжэла рука ў лесунка, бліскучая палка, зробленая з гнілушак, выпала з яго рук і разбурылася. Шугнулі совы ў дуплястыя асіны, і кінуліся хавацца па цёмных кутках павукі.

Тут і канчаецца адно звяно казкі. А калі б хто запытаўся, што ж тут здарылася, то гэтым ён паказаў бы, што няўважна слухаў байку, чым моцна пакрыўдзіў бы баечніка.

## СТАРЫ ЛЕС

Гэта быў старасвецкі лес. І былі ў ім такія пушчы і нетры, аб якіх не ведаў ніхто на свеце. Поўны месячык раз у чатыры квадры ўсплываў на сярэдзіну неба і адтуль рыхтаваўся пацікаваць, што дзеецца пад паветкаю густога вецця. Але яму лягчэй было б разглядзець, што робіцца пад страхою ў хаце чалавека, чым прабіцца праз галіны адвечных гушчароў. І сумаваў тады круглы блішчасты месячык і хаваў свой твар у светлых хмарках. Само яснае сонейка ледзь-ледзь прапускала залатыя косы і то толькі да палавіны; на самым нізе заўсёды панаваў цянёк і прахладзь. Звяры і птушкі не мелі адвагі забірацца ў нетры лесу. Там жыла адна тая Таёмнасць, што запаўняла гэтыя нетры страхам і нікому не вядомымі дзеямі.

Праз гушчары, пад павеццю зялёных голек, прабівалася бліскучая стужка халоднай вады і дзяліла пушчу на дзве часткі. Абодва берагі рэчкі былі густа заросшы старымі дрэвамі, яны прасціралі сваё галлё над рэчкаю і лучыліся адны з другімі. І лес па адзін бок рэчкі, і лес па другі яе бок, такім парадкам, быў адным лесам, і тое, што рабілася на адным беразе ракі, было таксама справаю лесу другога берага,— адным словам, у лесе быў адзін супольны клопат, адно жыццё.

Рэчка была невялікая: у лесе яна пачыналася, у лесе і канчалася,— канчалася пышным і прыгожым возерам; вакол возера, як вежы, стаялі мудрыя дрэвы — дубы. У тым ланцугу вельмі важных прычын і з'яў, праз якія выніклі яшчэ важнейшыя дзеі ў гэтай пушчы, рэчка займала не апошняе месца, хоць справядлівасць вымагае сказаць, што яна і не думала займаць такога месца. І яшчэ трэба дадаць, што месцы бываюць дваякія: на адны мы самі рымсцімся, а на другія нас цягнуць, узяўшы за вушы. На гэта апошняе месца ўсцягнулі і рэчку.

Але сіла не ў гэтым. На свеце часта бывае так, што самая простая справа, самая ясная праўда пазнаецца цаной вялікай пакуты — надта цяжкая дарога прыводзіць да такога пазнання.

Доўгія-доўгія годы, цэлыя вякі, жыла пушча згодна і шчасліва, жыла поўным, багатым жыццём. Але ўсяму на свеце ёсць канец.

На пагорку, недалёка ад рачулкі, стаялі купчастыя ліпы, сярод іх пракідаліся ярка-зялёныя клёны і высокія вязы. Летам на іх выспявала насенне. Пад восень, прылятаючы сюды, вецер падхопліваў яго на свае вольныя крыллі і разносіў па свеце. Панёс раз вецер насенне старой, усімі паважанай ліпы на другі бок рэчкі; прынёс і кінуў на мяккі зялёны мох па суседству з асінай. Асіна прымеціла месцечка, дзе ўпала ліпавае семя, і сумыслу скінула на яго свой даволі таўсты сухі сук. Сук упаў на насенне і крэпка яго прыціснуў. А назаўтра поруч з насеннем ліпы асіна кінула сваё семечка. Пакуль ліпавае насенне выраблялася з-пад асінавага сука, асіна ўзышла і заглушыла ліпку.

Уся гэтая справа рабілася на вачах у дзятла, які дзёўб тут засохшы верх старой хвоі. Дзяцел пераляцеў рэчку, сеў на старую, усімі паважаную ліпу і расказаў усё, што было з яе насеннем.

— Гэта ўжо не першы раз робіцца так на тым баку рэчкі,— пацвердзіў высокі вяз, пакланіўшыся ліпе.

— Чорт ведае што! — ускіпеў крэпкі граб.— Зусім не па-дзеравяцку! Ці не ўсё роўна лес? Насенне з таго берага пералятае сюды, і дрэўцы растуць сярод нас. Унь, гляньце: там стаіць бярэзінка, клёны, арэшнік — усё гэта націснулася сюды з-за рэчкі!

Глуха зашумела пушча зялёнымі верхавінкамі. Шум перакінуўся за рэчку, у другую частку лесу. Злосна зашумеў лес па другі бок рэчкі.

— Нам самім няма тут месца! — бушавала старая асіна, высока ўзняўшы круглы верх.— А яны яшчэ сваё племя сюды перапраўляюць.

— Што казаць! — уторыла вербалозіна.

— Гані іх адгэтуль! — зашумеў ясень.— Там столькі прастору, а ім яшчэ мала. Дзе самі мы падзенемся?

Доўга шумеў стары лес, падзяліўшыся на дзве часткі, доўга гаманілі дрэвы; вялікае нездаваленне і гнеў чуліся ў гэтым гомане.

Каля самых берагоў рэчкі, з аднаго і другога боку, стаялі чародамі алешыны. Напрадвесні, калі ў лесе яшчэ ляжаў тоўсты пласт снегу, а рэчка была пад лёдам, кідалі алешыны свае цёмныя зернеткі на лёд, каб вясною вада з лёдам панесла іх і пасеяла на сваіх берагах на краі лесу, дзе было многа прастору.

Разложыстая, высокая алешына не раз бачыла, як алешына з другога берага кідала сваё насенне проста ёй пад ногі і закрывала зернеткамі яе дзетак.

— Хіба ў цябе няма свайго месца, што ты засыпаеш маё насенне? — са злосцю пытала першая алешына.

— А чыё гэта племя ўтрамбавала наш бераг? Чыё? Сама б увесь свет заняла, а другому і лапінкі шкада, пагібелі на вас няма! — І пайшлі вярнуць, і пайшлі вярнуць адна на другую.

У іх лаянку ўткнулі языкі і іншыя жыхары лесу, і такая пайшла спрэчка, што птушкі пазляталі са сваіх гнёздаў і звяры павыскаквалі з лаговішчаў. Падняўся такі кірмаш, такі гармідар, што не дай ты божа! За доўгія вякі згоднага жыцця назбіралася столькі нянавісці, столькі гневу, крыўды, зайздрасці, зневажання, што лес грымеў, хадзіў, як кіпень у гаршку, тросся, калаціўся, дрыжаў ад злосці.

Да голасу лесу прылучаўся піск, гвалт птушак, выццё звяроў: звяры і птушкі таксама ўзялі руку сваіх берагоў.

Ад шуму, гвалту, ляманту затрэслася паветра, закурыўся пухам снег, магутная пушча раскатурхалася, раз-

гайдалася, расшумелася, як сялянскі сход, і ўжо ніякая сіла не магла супакоіць яе.

Страшная бура завыла над цёмнаю пушчай. Заскрыпелі, застагналі таўшчэразныя гладкакамлёвыя хвоі, густа і жалабна зашумелі кашлатыя яліны, неміласэрна б'ючыся лапамі; завылі асіны, ліпы, бярозы, клёны і вербы; загулі магутныя дубы, і громам грымелі іх чорныя жэралы; зарыгацелі сукаватыя вязы і грабы... Усе дрэвы бушавалі сваімі галасамі, і ў агуле выйшла такая страшэнная музыка, што здавалася, злыя духі пазрываліся з ланцугоў і спраўлялі тут сваё ігрышча.

І вось, сярод гэтага гулу пачуўся трэск — не ўтрымаліся крохкія асіны і пасыпаліся, як соль; за імі, як каноплі, разам з карэннямі і з грудамі мёрзлай зямлі, пачалі падаць яліны, цягнучы за сабою і слабейшыя дрэвы. Яны гнуліся, шчапаліся, крышыліся, і толькі камлі іх, як свечкі, тырчалі высока ў паветры, сярод вываратаў і зломаных верхавін, што ўжо трупамі ляжалі ў снягу. А пушча не сунімалася, стагнала, гула, бушавала, плакала злосным плачам, выла гневам і нянавісцю. Вось сашчапіліся два адвечныя асілкі: магутны, прысадзісты, гузаваты, звязісты дуб з таўшчэразным і высачэзным вязам. Доўгія гады стаялі яны на розных берагах нешырокай рэчкі, як добрыя суседзі, і крэпкая дружба, узгадаваная часам, была заўсёды паміж імі. І яны цяпер — смяртэльныя ворагі! Страшна было глядзець на гэтых асілкаў. Іх крэпкія таўстыя сукі разгойдваліся, біліся адны аб другіх, ламаліся. Размахнуўся таўсты, высокі вяз і з ўсёй сілы грукнуўся аб дуб.

Упёрся моцна прысадзісты дуб і ўсім крэпкім целам сваім рынуўся насустрач вязу. Пышны верх старога вяза з громам абламаўся, на момант звіс, затрымаўся ў дубовых суках і ціха спусціўся на халодны лёд рэчкі, цяжарам сваім угнуў яго, праламаў. Клубок жывой вады вырваўся на волю — заплакала рэчка над трупам старога вяза.

— Помста за смерць нашага бацькі вяза! — зашумеў той бераг рэчкі.

Грозна паціснулі дрэвы на стары дуб.

— Гэй, сюды! — гукнуў другі бераг рэчкі.— Не дамо ў крыўду нашага абаронцу.

Замітусіўся лес, і два грозныя вагары, дзве сцяны дрэў рынуліся адна на другую. Падняўся віхор. Дрэвы звіліся ў адзін клубок, скруціліся і пасыпаліся на зямлю.

Глуха застагнала зямля, задрыжалі ўзгоркі, лёд патрэскаўся на возеры і ў рэчцы...

Цэлы дзень і ўсю ноч білася пушча, і месца пабоішча ўяўляла сабой грозны і жудасны малюнак разбурэння і смерці.

Прыйшла вясна, растаяў снег, павеяла цяплом, і зноў пачало абуджацца жыццё. Толькі пушча выглядала яшчэ нудней. Усюды ляжалі камлі, верхавіны, вывараты, тырчалі высокія пні. Толькі дзе-нідзе, на пагорках, засталіся рэдзенькія купкі дубоў, невялічкія кудзеркі старых хвояў. Прыляталі з выраю птушкі і не знаходзілі сваіх гнездаванняў.

Плакалі сіраты дрэвы, стоячы над трупамі сваіх родных, сваякоў і знаёмых. А яснае сонейка грэла так прыветна і цёпла.

— І нашто была нам гэтая трасяніна? — казала рэшта пушчы.— Ці нам не хапіла б месца пад ясным сонейкам? Дзе наша сіла? Дзе краса наша?

— Каб не рэчка, каб яна не падзяліла нас на дзвеársткі, гэтага не здарылася б,— казалі хвоі.

— Праўда, праўда,— падхапіла ліпа,— з-за яе знішчылася пушча.

— Ну і ўцешцеся, калі знайшлі вінаватага! — адказала сярдзітая сойка.

## БАЛОТНЫ АГОНЬ

Гэтая бярозка толькі нядаўна асталявалася тут. Кароткае жыццё выдарылася ёй, і незайздросная доля гадавала яе. Закрытая, заціснутая з усіх бакоў старымі дзеравякамі, не бачыла яна сонца, рэдка калі патыхаў на яе свежы ветрык. А як яна не бачыла іншага свету і жыцця, дык і не наракала ніколі на сваё сірочае існаванне. Яна няясна пачувала волю, прастор, сонца і, стоячы тут, сярод гэтых дрэў, як чужаніца, ні з кім не гаварыла пра свае думкі і лятункі.

Адна толькі ўцеха падтрымлівала яе. Уночы, калі заціхалі вакол птушкі і пераставалі гусці і звінець мошкі і толькі адны зоркі свяціліся ў небе ды часамі месяц сумным вокам азіраў зямлю,— гарэў дзесьці агонь, бледны, неразгаданы і прыемны. І блішчаў той агонь з-пад нізу, з нейкіх невядомых абшараў зямлі.

Балота, на якім прыгожа раскінуўся астравок, дзе расла разам з другімі дрэвамі і гэтая маладая бярэзінка, здавалася, не мела канца-краю. Найстарэйшы між усіх

тут дуб, стоячы на самым высокім месцы вострава, не бачыў канца балота. Спрадвеку гадаваліся на астраўку розныя дрэвы. Па краях цягнуліся маладыя і старыя алешыны, пусціўшы глыбока карэнні. Далей цягнуўся цёмна-зялёны пояс елак. Яшчэ крыху вышэй бялелі стройныя камлі прыгожых бярэзін, сярод якіх пракідаліся ліпа, граб, ясень, вяз. На самай сярэдзіне астраўка стаялі магутныя дубы.

Наша маладая бярэзінка расла па суседству з вязам. Была поўнач на зыходзе лета. Неба было цёмнае, укрытае хмарамі. Яно дрыгацела час ад часу, асвятляючыся бліскавіцамі ад далёкага магутнага грому. На балоце прыветна мігцеў той самы агонь.

Маладая бярозка радасна дрыжала, гледзячы на яго. Абуджаны раскацістым гулам грому вяз папытаўся ў бярозкі:

— Чаму ты не спіш, дзеткі?

Бярэзінка здрыганулася знячэўку і прыкінулася, што нічога не чуе і спіць.

— Чаго ж саромеешся? — прыветна прамовіў вяз.— Ох, блазнота! Ты ўглядаешся на балота, цябе цягне агонь?

Вяз памаўчаў, а потым, махнуўшы галінаю, сказаў:

— Гэта не агонь.

Маладая бярэзінка аж задрыжала ўся ад гэтых слоў.

— Як, гэта не агонь? Гэта не праўдзівы агонь? — тужліва спытала яна і пачула, што перад ёю як бы адчынілася нейкая бяздонная пустэля.

— Гэта гнілякі на балоце свецяцца,— зноў прамовіў вяз,— плюнь на іх: у дрэва павінна быць дзве дарогі — адна ў зямлю, другая ўгару да сонца.

Доўга яшчэ гаварыў вяз. А бярэзінка маўчала і не чула яго слоў. «Дык гэта быў зман! А я думала, што гэта — сапраўдны агонь, і ў гэтым была мая радасць і ўцеха, у гэтым забывала я аб сваёй нядолі». І стала сумаваць і тужыць бедная бярозка. Цяпер ніякай радасці не было ў яе жыцці.

А калі гэты выпадак стаў вядомы паміж дрэў, то яны доўга шумелі і ніяк не маглі прыйсці да згоды: ці добра зрабіў вяз, развеяўшы гэты туман, гэты прыгожы туман зменнага шчасця беднай бярэзінкі?

І да гэтага часу вядуць дрэвы спрэчку.

## ПОКЛІЧ

Гэй, чулыя сэрцам! Гэй, душы жывыя!
Ідзіце вы долю каваць!
У вас жа ёсць сілы яшчэ маладыя,
У вас жа ёсць крыллі лятаць!

Але сцеражыся: балотная бросня*
Іх кожную хвілю сачыць,
А гніллю зацягне — душа не ўваскросне,
Ўгару над зямлёй не ўзляціць.

Вы чуеце хваляў жывых набяганне?
Прыгледзьцеся: новыя дні
На нас пазіраюць у іскрах світання,
І свецяць другія агні.

Спяшайцеся, брацці, расою халоднай
Ваш твар выразлівы абмыць
І дух той гаючы палёў, нівы роднай
У грудзі чым больш захапіць.

Але памятайце — на вашым сумленні
Не сплачаны доўг векавы:
То доўг прад народам, то доўг разумення,
Якое зачэрпалі вы.

З народнага скарбу душы самабытнай
І скарбу яго мазалёў:
То ён, працавік наш, то ён, старажытны,
На гору вас моўчкі узвёў.

Гадуе вас поле, што золатам ззяе
Пяскоў, неўраджайных пяскоў,
Вас корміць сярмяга, што долі не знае,
Не ведае ласкі братоў.

Ідзіце ж к народу, як добрыя дзеці,
Ідзіце, злучайце яго
І горкую праўду у вочы скажэце,
Чаго ён гаруе, чаго?

## ПОЛЕ

Зараслі вы, межы, ў полі
Дзікім зеллем, палыном!
Гаспадар на вас паволі
Раніцай не йдзе з канём...

Не хапіла сіл жаночых
Глыбей землю заараць,
На загончыках сірочых
Травы сталі красаваць.

Вось і трэцяе ўжо лета,
А няма гаспадароў,
Не чутно цяпер да свету,
Як даўней, іх галасоў.

Дзе ж вы, дзе, браты-сяляне,
Што нідзе вас не чуваць?
Ды баяцца на пытанне
Межы свой адказ даваць.

Сіратою глядзіць поле,
Сумна ўдаль бягуць шнуры.
Хто ж адкажа, што за доля
І дзе іх гаспадары?

І трывожна шэпчуць гоні,
На пытанне шэпчуць мне:
«Ці пабіты, ці ў палоне,
Ці скалечаны ў вайне».

## ТРЫ ЖАДАННІ

Хочам мы зямлі і хлеба,
Цяжка торбу нам насіць,
Не дае яго нам неба,
Слоў няма нам больш прасіць.

Хочам сонца мы і свету,
Цяжка нам хадзіць сляпым,
Цяжка жыць нам без прывету,
Як бы праклятым якім.

Хочам мы жыцця і волі,
Цяжка нам насіць ярмо,—
Не спадзе яно ніколі,
Не спадзе яно само.

## НА ПОЛІ ВЯСНОЮ

Люблю я прыволле
Шырокіх палёў,
Зялёнае мора
Ржаных каласоў

І вузкія стужкі
Сялянскіх палос —
Люблю цябе, поле,
Люблю я твой плёс!

Ігрушы старыя,
Што ў жыце шумяць,
Зялёныя межы,
Далёкую гладзь.

Люблю я дарогі,
Што леглі між гор,
Ўнізе пад гарою
Ручча разгавор.

Люблю я узгоркі,
І насып-курган,
І сіняй далечы
Празрысты туман...

Люблю пазіраць я
На поле вясной,
Як ветрык жартліва
Плыве збажыной.

Калышацца жыта,
Радамі бяжыць,
А хваля паветра
Дрыжыць і дрыжыць...

Люблю я прыволле
Шырокіх палёў,
Зялёнае мора
Буйных каласоў.

## НА АДЗІНОЦЕ

Між глыбокіх снягоў,
Дзе лес глуха шуміць,
Ціхі дом леснікоў
Адзінока стаіць.

Воўчым вокам акно
Ў цемры ночы блішчыць,
Дзеці леглі даўно,
Толькі маці не спіць.

Смыча нітку яна,
Ўсё кудзельку прадзе.
Глухата, цішыня,
Толькі вецер гудзе,

Завывае, бы звер.
Стогне вяз над страхой.
Страшна ў лесе цяпер,
Сцішна ў хаце адной.

Ды прывыкла яна
Да паўночы сядзець
І скрозь шыбы акна
Ночцы ў вочы глядзець.

А ў тым коміне зноў
Вецер песню пачаў,
Вось ён глуха завёў,
Застагнаў, забурчаў...

— Мама! Страшна мне тут,
Я баюся адзін:
Унь варушыцца жмут
На ашэстку аўчын.—

Сын малы, Васілёк,
Кліча матку к сабе.
— Бог з табою, сынок,
То здалося табе!

Не пужайся, дурны,
То аўчынкі вісяць.
Нежывыя яны
І не могуць чапаць.

— Мама! Сядзь ідзі тут...
Што так страшна гудзе? —
Ставіць прасніцу ў кут,
К сыну матка ідзе.

— Мама! Чуеш — во-во!
Хтось па даху пабег!
Гэта злодзей ці хто?
— Не, сынок,— гэта снег!

— А што трэба яму?
Чаго ўзлез ён на дах?
Ці ён грозіць каму,
Ці спужаў яго страх?

— Ой, блазнота мая,
Ну ж з цябе і смяляк!
Чаго думка твая
Устрывожана так?

Гэта ж вецер, сынок.
— Ён жывы ці які?
— Ды не, мой галубок!
Гэта — подых такі.

— А што робіць ён?
— Хто?
— Ну, той подых!.. Скажы!
— Немаведама што
Ты гаворыш!.. Ляжы.

Васілёк замаўчаў,
Нерухома ляжыць,
Мусіць, думаць пачаў,
Чаго вецер шуміць.

А ён, нібы той звер,
Плача, вые, гудзе.
— А дзе тата цяпер?
Чаму доўга не йдзе?

Не баіцца адзін
Ён паночы хадзіць!
— Тата дужы, мой сын!
За плячыма вісіць

Стрэльба, нож пры баку...
Дык баяцца чаго?
Кепска будзе ваўку,
Калі чэпіць яго!..

— Мама! Праўда ці лгуць,
Што маленькіх дзяток
Жабракам аддаюць
Замест хлеба ў мяшок?

— Не, няпраўда, сынок!
Гэта байку сплялі,
Проста страшаць дзяток,
Каб паслушны былі.

Зноў заціх Васілёк
І пытаць перастаў,
Зноў яго разумок
Варушыцца пачаў.

Ціха ў хатцы малой,
Смутна лямпа гарыць.
Бор стары за сцяной
Ўсё шуміць ды шуміць.

## ВАЦЛАЎ ЛАСТОЎСКІ

**(1883—1938)**

Власт, Ласт, Уласт... і яшчэ шмат імён, пад якімі можна сустракаць творы Вацлава Ластоўскага, чалавека з вялікім талентам, з магутнай творчай энергіяй, які шчыра любіў сваю Бацькаўшчыну і зрабіў вялікі ўклад для яе адраджэння. Усё сваё жыццё ён быў аддany свайму народу.

Нарадзіўся Вацлаў Юстынавіч Ластоўскі ў фальварку Калеснікі Дзісненскага павета Віленскай губерні. Як і Янка Купала, быў самавукам. Афіцыйна скончыў толькі народную школу, для далейшай вучобы ў бацькоў не было сродкаў, але цяга да ведаў ніколі не пакідала Ластоўскага. Ён шмат чытае. У Пецярбургу «зайцам» наведвае лекцыі ва універсітэце, цікавіцца беларускай гісторыяй і культурай.

В. Ластоўскі адыграў вялікую ролю ў выпуску газеты «Наша ніва», дзе з 1909 па 1914 год працаваў на пасадзе

сакратара рэдакцыі. Дзякуючы яму ў Вільні існавалі газеты «Гоман», «Крывічанін» і часопіс «Крывіч».

У Вільні ў 1910 г. Ластоўскі выдае «Кароткую гісторыю Беларусі». Гэта была свайго роду сенсацыя ў беларускім адраджэнні. Да гэтага часу падобнай працы на беларускай мове не было.

В. Ластоўскі прымаў актыўны ўдзел і ў грамадскім жыцці. Са снежня 1919 г. узначальваў раду міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі. Пасля прыходу да ўлады бальшавікоў падаўся ў эміграцыю. Але ніколі не пераставаў сачыць за падзеямі на радзіме.

У 1926 г. Ластоўскі пераязджае з Летувы ў Мінск і працуе вучоным сакратаром Інстытута беларускай культуры, які пазней быў ператвораны ў Беларускую Акадэмію навук.

Нядоўгі час заставаўся пісьменнік на радзіме. У 1929—1930 гг. пачалося масавае праследаванне і арышты дзеячаў беларускай нацыянальнай культуры. Ластоўскі быў адным з першых арыштаваны і высланы, а ў 1938 г. яго не стала: ён стаў ахвярай таталітарнага рэжыму.

Толькі ў апошні час у нас з'явілася магчымасць пазнаёміцца з яго літаратурнай спадчынай («Расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік» і «Гісторыя крыўскай кнігі»). У чэрвені 1988 г. была спынена крымінальная справа Вацлава Ластоўскага. Ён быў рэабілітаваны адным з апошніх сярод дзеячаў беларускай культуры.

* * *

Творы В. Ластоўскага, змешчаныя ў гэтай кнізе, падаюцца так, як яны былі надрукаваны раней.

## ВЯСКОВЫЯ АРХЭОЛЁГІ

Вёска Буды выцягнулася шнуром дрэўляных хат над возерам і заснула заваружаная, загледжаная згары ў дно возера. А там, на дне, стрэхамі ўніз, стаяла другая такая ж самая вёска з усімі падробнасьцямі: з цёткай Агатай, убрыўшай па калені ў сцюдзёную ваду і заўзята паласкаўшай хусьцё*, з дзедам Апанасам, які выпоўз на заваліньку пагрэць на сонцы старыя косьці, з буславым гняздом на клёне, каля хаты быўшага героя турэцкага паходу, сухарукага Мігуна.

Калі цётка Агата клала на камень хусьцё і пачынала

выбіваць яго пральнікам,— з лазень, над возерам, перадражнівалі яе карштатыя рудавалосыя Лазьнікі: — лоп! лоп! лоп!

Замерла вёска, прыціснулася да ліпкай, гразкай зямлі не з боязьні зрынуцца з гары ў возера, а з гора, з бядноты. Жыхары яе, згодна філёзофічнай сыстэме вялікага Фіхтэ, з пакаленьня ў пакаленьне сыцяць дух свой здаровым аптымізмам, надзеяй, што прыйдзе ўрэшце такі раджайны год, у які з умалоту хопіць хлеба ад жніва да жніва. Захопленыя гэтым оптымізмам, з году ў год варушаць зямлю, не шкадуючы мазалёў і поту, засяваюць. Але пасьля абмалоту выясьняецца, што хлеба стане толькі да Каляд. Калі ж дацягнуць яго да Мясаеда, то трэба дамешываць да мукі палавіну мякіны. Вялікі ж пост пасьціць, так і так, Бог вялеў... А вясной... Ласьне ў гэту пару была вясна ў Будах. Адбываўся выган скацежы ў поле.

У панадворках сялянскіх сяліб тупалі мужчыны і кабеты. Падымалі запасьціўшыхся, па хрысьціянскаму абычаю, разам з людзьмі, каровак. Гэта былі, закачаныя ў навозе, двурогія шкілеты, якіх гаспадар з гаспадыняй падымалі за хвост і рогі, каб паставіць іх нагамі на зямлю, а дзеці панукалі жывёлу, паганяючы дубцом. Сумнымі, закачываючыміся ў падлобьбя вачыма маўкліва тлумачылася каравёшка, што ад яе вымагаюць немагчымае. Змогшыся, змардаваўшыся, гаспадары рашылі папаіць яе цёплай вадой з сольлю. Гэта памагло: пры помачы гаспадароў карова ўстала і здрантвеўшымі нагамі, сланяючыся, выпаўзла ў поле.

За каровай пагналі насторшаныя шкілеты сьвіньней, якія ўсё прадвесьне, за нястачай пошыру, жылі сваім промыслам.

За статкам высыпалі ў поле пастухі; дзеці ад 7 да 12 гадоў, босыя, хоць па рытвінах ляжаў яшчэ сьнег, а на дне канаваў лёд. Дзеці ў полі, трасуючыся і пазваняючы зубамі, зьбіралі трэскі і хвораст з блізкай амшарыны. Запылала вогнішча. Разагрэліся. Але з цяплом і пад уплывам руху на сьвежым паветры, голад балюча смактаў пад грудзьмі і вочы, ад поўзімы ашклеўшыя, асалавелі. Моўча ўсе сядзелі кругом вогнішча.

З гары ў даліну, да амшарыны, што была за выганам, цягнуўся шнур валатовак*, паросшых верасам і гіґялямі*. Каровы жвалі леташнюю траву і верас, сьвіньні выкапывалі лычамі глыбокія ямы, шукаючы зямных арэхаў.

— «Пойдзем, хлопцы, паглядзім, што гэта сьвіньні выкапваюць»,— сказаў зызавокі Лявук.

Хлопцы безразрозьліва паглядзелі моўчкі на Лявука, ніхто не адазваўся.

Лявук устаў і, падышоўшы да Сымонавай худой цешкі*, якая да палавіны закапалася ў зямлю, уважна ўзіраўся, што яна робіць. Відаць, цешка натрапіла на багатае арэхамі месца; гэтым толькі і можна было вытлумачыць яе парыў да працавітасці. І праўды, цешка выкапала лычом чорны арэх і ўжо хацела яго загарнуць у зубы, але Лявук спрытна падхапіў яго рукой. Сьвіньня, заступаючыся за працавіта дабытую сваю ўласнасьць, рынулася на Лявука, але той пусьціўся наўцёкі. Адбегшыся, хлапец абцёр чорны клубік аб світку і палажыў арэх на зубы. Калі раскусіў, арэх здаўся яму незвычайна смачным. Палавіну на мейсцы зьеў, другую панёс да вогнішча; ўсе падзяліліся і ўсе не маглі нахваліцца смачнасьцю арэха.

За некалькі хвілін хлапцы рассыпаліся каля сьвіньней, пілнуючы моманту, калі пакажацца арэх з зямлі. Пачалася бязжаласная эксплёатацыя чужой працы, абарона эксплёатаваных і адкрыты бунт супроць сваіх гаспадароў. У выніку цэладзеннай вайны быў цяжка пакусаны Грыгась удавы Пятрунэлі, на якога наваліўся Асташоў кнур.

На другі дзень, ідучы на паставу, хлапцы ўзброіліся капагамі*. Яны за папярэдні дзень добра дасьледавалі, як пазнаць, дзе растуць арэхі; што ў мейсцы, дзе арэхі растуць, ёсьць зверху бледны расточак чорнагаловага гігяля, які першы пасьпяшыў з пад сьнегу, на поклік сонца, выглянуць на сьвет. Далей, пад зямлёй, ішоў чорны, вузлаваты, доўгі карэнь, які адкапываючы, можна дакапацца, на глыбіне аднэй — дзьвех пядзяў, да чорнага арэшка.

Ад самай раніцы на валатоўках закіпела згодная і дружная праца галодных: людзей і жывёлаў.

Многа ў той дзень было парушана прашчурных касьцей, даўно забуцьвеўшых ў прысок*. Многа цікавых аздоб, закапаных разам з імі, выкінута ў старану, ў ямы і па-за ямы, як рэчаў да нічога непрыдатных.

Дзень быў пагодны, вясёлы, радасны.

Гасьцінцам, што ішоў ўздоўж валатовак, борзка імкнула павозка, запрэжаная паркай коні.

Гэта пан пасрэднік ехаў ў далёкую, сваёй кругаколіцы,

воласьць, гадзіць сялян з памешчыкам, якія судзіліся за сэрвітуты.

Н-скі пасрэднік выдзяляўся з паміж чыноўніцтва сваёй рангі шырокай гістарычнай ведай. Яго кватэра ў паветовым горадзе перапоўнена была старасьветнымі асаблівасьцямі і выкапкамі з курганаў. Ён знаўся на старыне і любіў яе. Нічога дзіўнага, што, ўбачыўшы, як хлапцы капагамі рыюцца ў валатоўках, ўвесь ён спалыхнуў з гневу. Парывіста загадаў спыніць коні і, вылезшы з павозкі, клікнуў да хлапцоў:

— «Што вы тут робіце?!»

Хлопцы перасталі капацца і моўчкі глядзелі на «пана».

— «Я вас пытаю, што вы тут робіце?!!» — крыкнуў ён ямчэй.

Маўчаньне.

— «Хадзі сюды!» — кіўнуў ён пальцам на большага хлапца, Пятрука.

Той, убачыўшы, што «пан» зьвяртаецца да яго, кінуўся наўцекі ў імшару. За ім, пакідаўшы капагі, пагналі другія хлапцы. Зьбегшы на імшару, хлапцы натрапілі на пляцок, дзе чырванелі прошлагодныя журавіны па белым моху. Кінуліся сквапна зьбіраць іх і забылі аб толькі што перапужыўшым іх здарэньні.

Астаўшыся пераможцам на пакінутым хлапцамі пляцу, пасрэднік прайшоўся па валатоўках, падняў мядзяны абручок і схаваў яго ў кішэнь, пасьля пазбіраў капагі і, палажыўшы іх у павозку, паехаў у вёску.

У вёсцы быў скліканы гвалтоўны, уздоймны сход. Пасрэднік доўга тлумачыў сялянам значэньне валатовак і патрэбу іх аберагаць, пагразіў штрафам на ўсю вёску за самавольную раскопку іх і, ўрэшце, запрапанаваў не штрафаваць вёскі, калі сяляне дабравольна самі, тут жа пры ім, пакараюць сваіх дзяцей.

Сяляне ахвотна згодзіліся на гэткую замену. За паўгадзіны былі дастаўлены бледныя ад прадвесьня, пасінеўшыя і дрыжачыя ад сьцюжы, голаду і страху дзеці. Адбылася экзэкуцыя, якая зацягнулася да падвячорку.

Пасрэднік, сказаўшы яшчэ вучоную расправу аб валатоўках, ветла разьвітаўся з сялянамі і паехаў.

Знаёмы ўжо нам Лявук, аціраючы сьлёзы, жаліўся туліўшай яго маці:

— Чаму ж ня секлі Сымонавай цешкі, яна ў трая больш за мяне арэхаў накапала...

Ноччу прайшла вяснавая улева*, абмыла ямы на валатоўках, і, на другі дзень, хлапцы ўжо не капалі арэхаў,

а толькі абгрызалі ліповыя пучкі ды зьбіралі журавіны на амшарыне. Пасьля ж зьбіралі масяжовыя*, «цацкі» па пяску і імі забаўляліся.

## ТРОЦКІ ЗАМАК

Стуга блакітнавокага возера; горка; ізноў возера; ізноў горка. І так ўвесь час чарадуецца зелень з блакітам. А вось, сярод блакіту, круглы зялёны шмарагд — востраў. Там другі, трэці,— меншыя. На галоўным востраве разваліны замку. Крушні каменьня, цэглы, кавалак сьцяны; і зноў крушні каменьня. Ўвесь востраў засыпалі разваліны і выгналі на заўсёды згэтуль жывое жыцьцё. Востраў дрэмле пануранны ў сваю мінуўшчыну ды пасьміхаецца ў неба пакрышанымі старчымі зубамі сваіх развалін. Нешта таёмнае прытаілася, прымоўкла, можа ізноў стрэпянецца, захвалюецца, загучыць, затопае, загалёкае, ажыве... Па крушнях, з пасьмешкі пакрышаных зубоў, стырчачых ў неба, відаць, што касьцістая рука сьмерці не змарозіла, а толькі прымарыла тут мінуўшчыну.

Ударыў віхор, і, са сьцен, з шэлестам, пакаціліся акрышкі цэглы... Старыя, друзлыя сьцены трасуцца ад ветру, хібаюцца, і, час ад часу, кархаюць абломкамі, мацуюцца з навалай. Многа гэтых навал, з усіх старон, год за годам і сталецьце за сталецьцем, пробуюць сьцены, а яны ўсё яшчэ перамагаюць буры і навальніцы. У старых мурох мацуецца геній старадаўнасьці з маладымі павевамі. З абодвых старон ёсьць страты...

Вуглавая круглая башта*, а ў ей круглыя вокны-стральніцы. Вецер дзьме ў круглае вакно, як у флейту, а башта — гугнівым голасам — на старасьвецкую вайсковую нотку — бубніць вызаў камусьці ў прасторы:

Дай ў двубой, мы с табой
Сілай зьмерымся...

Пугач высунуў вушатую галаву з рашчэліны муру, павёў кругом чырвоным вокам і заліўся пакоцістым сьмехам: — Гу-гу-гу-га-а!

Нехта са старога замку на беразе клікнуў яму ў адпаведзь: — Га-а-а!

Насупілася неба, і секануў, бытцам тысячамі доўгіх, бліскучых дубцоў, крывы дождж.

Я схаваўся пад засьцень старых мураў і пачаў азірацца. На змочаным дажджом, шэрым ад часу, тынку

ўнутраннай сьцяны готыцкага стылю замку праступілі стараветныя сьценныя малятуры*. Абрысаваліся контуры кастырных візантыцкіх сьвятых і іх строгія, глыбокія ў містычнай задуме вочы, ўпіліся ў мяне. Я стаяў абварожаны дзіўным зьявішчам, загадкаю мінуўшчыны, разгадку якой прашчуры назаўсёды забралі з сабой у магілу. Готыцкі дах захаду крыў у сваіх нетрах генія ўсходу...

І блізкімі, і роднымі здаліся мне насяляўшыя калісьці гэты замак пакаленьні.

Яны, як і мы, жылі і мучыліся на ўзьмежжы двох светаў, двох культур, двох процілеглых сабе сьветаглядаў, ўяўленьняў. Яны не маглі прыклеіцца да ўсходу, ані прымірыцца з захадам. І ў сьвядомасьці прамігнула моднае ад нейкага часу слова «Еўразія».

Мысьль стропнулася як спалошаны птах і стала біцца аб страніцы пажоўклых, забытых, нікому не патрэбных ў клуме рэальнасці, краёвых летапісаў, шукаючы разгадкі.

І перад вачыма душы маей доўгім сьцягам паплылі волаты мінуўшчыны. Вялічэзныя абразы роспачнага змаганьня з хіжацкім духам заходу, які прыходзіў сюды прыкрыты белым бурносам*, аздобленым эмблемай крыжа, сеяць морд і зьнішчэньне. Адкінутыя дзікім усходам пляцоўкі крыўскага і украінскага славянства туліліся да гэтых муроў, нясучы свае сьцягі з шасьціканечнымі крыжамі, а разам з імі — магутнасьць.

— Га-га-га — гу-у! Загагатаў пугач з круглае нарожнае вежы.

— Гу-га-га — га-а! Азваўся яму ў адповедзь другі ў мяне над галавою.

Ямчэй ударыў віхор, і друзлы старац сапнуў і крэкнуў. Ту-ж, каля ног маіх, зваліліся два някшталтных абломкі старой будоўлі, а за імі скаціўся знекуль камень і прыціснуў іх да зямлі.— Га-га-га — га-а! Заліваўся пугач ў башце.

А перада мной праплыў на хмары св. Мэркуры на белым кані з паднятым мячом. І па сьцяне прасунуліся цені...

Гедымін... Гедыманік... Дачка бортніка... Легенды, казкі, апавітыя хомарам вякоў. Пры іх летапісец Міхалён, патрыот, патрыот-романтык, які блудзіў у лабірынтах басень.

Віхор закружыўся, засклочыўся ў закамарках руінаў і, як вядром, пялёхнуў на другую сьцяну, з якой, амыты вадой, вынырнуў чорны чатырохканечны крыж,

намаляваны паверх св. Мікалая, біскупа Мірлікійскага.

І агністымі знакамі запырхалі перада мной супярэчлівыя ацэны летапісцаў:

«...Жыгімонт-же Кестутевіч уподоблен бысть Антіоху сірійскому і Іроду Ерусалімскому»... граміць караючы голас летапісца.

«...А Жыгмонта першого, солодкая памяць его»... пярэчыць другі, паясьняючы: «бо ён Ляхоў як собак не любіў, Літву ж і Русь нашу любіцельна мілаваў»...

А першы, паясьняючы сваё упадобленьне Жыгімонта да Антіоха і Ірада, дадае: «бо ён хацеў вынішчыці рожай шляхэцкі, а паднясьці рожай хлопскі, псю кроў».

За гэты імкненьні падняць рожай хлопскі тут, ў гэтым замку, атрымаў Зыгмунт Кестутавіч разплату з рук шляхты.

І з праразьлівай выразітасьцю ўявілася народная показка аб утопленым князю ў гэтым возеры, які пасьля сваей сьмерці ў падводных скляпох сабраў дружыну, павесіў звон і што год на Вербніцу, у гадаўшчыну сваёй сьмерці, ўдарае адзін раз у звон, даючы знаць, што ён не закінуў сваіх думак. Бедныя людзі чуюць гэты звон. Трыкротны ўдар у звон і ігра ў вайсковую трубу апавесьцяць яго выхад на сьвет. Гэты выхад паложыць канец самаволі, голаду і холаду ў хацінках з лапінкай няўжытку, з якога гаротнаму селяніну трэба ўтрымаць, накарміць, абуць і адзець ўвесь чужацкі дзяржаўны будынак, дом няволі.

Знача памяць народная не пазабыла свайго абаронцу.

Зыгмунт Кестутавіч — сялянскі герой на княжым пасадзе. Задушаны быў у Вербную нядзелю 1440 году, тут, у гэтым замку.

Пазёмы вецер кінуў на бераг водны вал, і, шорхнуўшыся аб каменьні, ён пакаціўся ў іх, пенячыся і шэмручы.

Дождж падаў... Валы вады качаліся са стогнам па беразе. І ў гэтым глухім стогне здавалася чуваць быў надлом прабалеўшай да нетраў душы. Так плакаў стары Адам, калі ў яго за падаткі забралі апошнюю каравёшку. І як вывялі яе за вароты. Адам паў на зямлю стогнучы і называў яе, карову, маткаю. Гэта зразумее толькі той, у каго раз у тыдзень бывае на стале хлеб, а штодзень ў запечку блішчаць чатыры пары галодных дзіцячых вочак...

На паліхай вербе, над возерам, сеў крумкач і крыкнуў на ўвесь голас: «грай! грай! грай!..»

— Гу-гу-гу-гаа! Захахатаў пугач.

## ПРЫВІД

Ігнат ляжаў на печы і думаў аб сваёй паганай долі. У хаце было цёмна, жонка і дзеці спалі. Думаў Ігнат аб людзкіх дастатках і ўсей душой пажадаў іх сабе. Аж тут раптам расступіліся сьцены й сьвятло заліло хату. Ігнат пачаў аглядацца, асё-ж здалёку, на белай хмарцы плыве да яго нейкая паня. Ігнату ўсё гэта дужа дзіўным здалося, і ён занямеў. А тымчасам зданьне прыпала да самага чэрэна* й станула. Цяпер Ігнат зблізка акуратна разгледзіў, што гэта грэцкая багіня, якую нядаўна бачыў нарысаваную ў нейкай кнізе, толькі чыста забыўся, як завуць яе. На галаве багіня мела залаты вяночак, аднэй рукой прыдзержывала багатую сваю вопратку, зусім непадобную да нашай, а ў другой мела грамадны рог, поўны грошы, дарагіх каменьняў і ўсялякага багацьця. Ігнату зрабілася страшна, але маўчаў і ждаў, што далей будзе.

Багіня ласкава ўсьміхнулася да Ігната і прывітала яго гэткімі славамі:

— Вітай, Ігнат, на зямлі прадзедаў тваіх! Ты думаў аба мне, і я вось прыходжу, каб надзяліць цябе ўсялякім багацьцем. Хачу зрабіць гэта праз памяць на тваіх прадзедаў, каторых некалісь-то я знала. Даўно было гэта... Бачу, у вас цяпер тут край голы, а калі я тут бывала з сваімі людзьмі, многа ўжо сот лет таму назад, бары тут, лясы шумелі. Нашы людзі прыяжджалі да вас на караблёх і лодках па дарагі бурштын, бабровыя, кунічныя і саболія скуры; на замен яны прывозілі вам бронзавае аружжа і літыя прыкрасы, маляваныя урны і рэзаныя фігуркі, каторыя вашы людзі стараліся падрабляць; няскладна ішло ім, але перараблялі ўсё на свой спосаб. Здольны народ быў, прадзеды вашы. Іх работа сьпярша была грубая, але мела ў сабе зачаткі арыгінальнай красы. Вы цяпер недзе папярэдзілі сваіх вучыцялёў; вашы майстры недзе даўно ўжо вытварылі сваю штуку? Цяпер можа ўжо вашы купцы возяць іншым народам свае вырабы, каб прамяняць іх на залаты пясок... Ці так? — усьміхаючыся спытала багіня.

Ігнат маўчаў, нічога не разумеючы з гэтай гутаркі. Багіня, не даждаўшыся адказу, далей цягнула:

— Даўныя часы гэта, ах, даўныя... Тады ў вас тут дзіч была, нашы людзі прымусілі перайсьці з каменнага да бронзавага веку. Праўда, рабілі яны гэта ня дзеля вас, але каб самім разбагацець на дарагіх вашых таварах,

каб на старасьць жыць у багацтве, піць віно з залатых кружак на ложах з слановай косьці, за сярэбранымі сталамі, сярод панадных дзяўчат, пры тонах гарфы... Дзяўчаты вашы славіліся красой; дорага плацілі за іх у Афрыцы. Дык нашы людзі кралі дзяўчат вашых. Яны заманівалі іх на берагі рэк, раскладаючы ўздоўж берагу розныя ўборы і дарагія саматканы, і калі дзяўчаты вашы прыходзілі паўзірацца на дзівы гэтыя, самі адны, без мужчын, то нашыя людзі хапалі іх і, не зважаючы на крыкі, вязалі і хавалі на дно лодак, лічучы ў думках, колькі залатых колец возьмуць за іх у Эгіпце.

Посьле вашы старшыны і мужы перанялі збыткоўнае жыцьцё ад Скіфаў і нашы людзі пачалі дастаўляць вам збыткоўныя тавары: міра і ладан, дарагія каменьні і бісер, чорнае дрэва і слановую косць. А ўжо і ў народзе пачала будзіцца душа. Вашы дзяўчаты і хлопцы танцавалі дзіўныя, рытмічныя танцы на ігрышчах, каторыя ўстраівалі сабе пад голым небам, над ракой ці возерам; вашы сьляпцы-лірнікі складалі багатырскія песьні і расьпявалі іх на трызнах і ваенных банкетах. Але гэта быў зачатак. На цяперашніх ігрышчах пэўна дзяўчаты вашы пяюць і танцуюць, як музы, а вашыя лірнікі сваімі казкамі багоў абваражыць могуць? — пытала багіня.

Ігнат, шырока раскрыўшы вочы, маўчаў і... не разумеў нічога. А багіня далей казала:

— О, помню гэты сьветлавалосы народ: мужы, як дубы ўсе, высокія, стройныя, а гордасьці сколькі было ў сьветлых вачох іхніх. Благі тавар зь іх быў на нявольнікаў: запраданыя ў няволю, уміралі моўча, бо ня важыліся пахіліць галоў сваіх перад чужой воляй... Вашы прадзеды волю любілі, уміралі пазбаўленыя волі зь іменем народу свайго і зямлі сваей на вуснах... Нешта зь бесьсьмяртэльных багоў было ў паставе і вачох прадзедаў вашых...

Багіня задумалася, а посьле, быстра зірнуўшы на Ігната, ужо іншым тонам пытала:

— Але чаму-ж гэта, ваша, патупляеш свае вочы?

Ігнат разумеў, што тут выпадае нешта сказаць, але ня мог дабраць слова. Зь перапалоху ляскаў зубамі і таптаўся на месцы.

Багіня змоўкла, зь няверай аглядаючыся на Ігната. Той чухаўся ў патыліцы і ўсё яшчэ сіліўся на адказ.

— Дзіўнае стварэньне!.. Але патурбуйся, ваша, зь печы зьлезьці! — крыкнула багіня, знаць, зазлаваўшыся.

Ігнат паслушна ссунуўся зь печы і, згорблены, памк-

нуўся да багіні, каб пацалаваць у руку ей. Але багіня, як апараная, адскочыла ў бок, і зьдзіваваная й злосная, крычала на ўвесь голас:

— Хто гэта?! Што гэта?! Хто ты? О чалавеча, хто ты такі?!..

Ігнат чыста зьбіўся з панталыку. Маўчаў.

— Ды хто ты такі, чалавеча, як род і племя твае завуцца?

— Хто ты?!

— Я, я...— стагнаў Ігнат,— тутэйшы...

Багіня зь дзіва ажно анямела. А посьле, зьмяркаваўшы, пачала на ўвесь голас сьмяяцца.

— Ня ведае, бедны, як назваць сябе... Абыватаць ня знае племені — роду свайго; ня знае назовы зямлі роднай, каторая ўзрасьціла яго, у каторай зложаны косьці бацькоў і дзядоў... Ха... ха...

— А... А-ткі гэта патомак тых поўбагоў, поўгэркулесаў... Такі сам вус бялавы, такія самыя вочы; толькі ў вачох ня гордасьць, але рабства, нявольніцтва празірае, не адвага і сьмеласьць, а страх у гэтай усей хвігуры, гатовай заўсёды да паклону... Божа мой, колькі рабства!..

Не, чалавеча, лішне многа ў табе рабскага... Нягрыцянскі нявольнік больш захаваў у сабе гордасьці, чым у цябе, чалавеча, асталося... Бачу, як праз доўгія вякі пагляд твой плюгавіўся пакорай, галава паклонамі, вусны лізаньнем рук нячыстых... Няволя затуманіла памяць тваю; забыўся ты людзкой назовы сваей і гэтым сьцёр ты зь ліца свайго знамя людзкое... Не, чалавеча, скарбы мае рассыплю перад табой толькі тады, як ты прыпомніш імя людзкое сваё, калі прабудзіцца ў табе адвага і гордасьць... А цяпер, бывай здароў!

І багіня, сеўшы на хмарку, аддалілася, а ў той час у хаце сышліся сьцены і зрабілася цёмна. Ігнат, пастаяўшы крыху, паскрабаў з аднэй і з другой стараны галаву, сплюнуў і, узьлезшы на печ, ізноў заснуў.

## МІХАЙЛА ГРАМЫКА

**(1885—1969)**

**Міхаіл Аляксандравіч Грамыка нарадзіўся ў вёсцы Чорнае, што на Гомельшчыне, у сям'і разначынца. Шматлікія продкі-родзічы пісьменніка з прычыны малазямелля**

актыўна папаўнялі шэрагі дробных чыноўнікаў, прыказчыкаў, чыгуначнікаў.

Маленства і юнацтва Міхайлы Грамыкі былі багаты на ўражанні, падзеі, набыткі і страты. Калі яму споўнілася тры гады, памерла маці, бацька ажаніўся другі раз, і сям'я пераехала ў Гомель.

У 1905 г. Міхайла Грамыка становіцца студэнтам медыцынскага факультэта Маскоўскага універсітэта. У 1911 г. скончыў яго, але ўжо на фізіка-матэматычным факультэце па спецыяльнасці геалогія. Пасля заканчэння універсітэта Міхайлу не давялося вярнуцца ў родныя мясціны, і ён настаўнічаў у Адэсе ў прыватным камерцыйным вучылішчы і жаночай гімназіі.

Летам 1921 г. Грамыка пераязджае на сталае жыхарства ў Мінск. З гэтага моманту, як успамінае пісьменнік, пачалося самае шчаслівае дзесяцігоддзе. Працуючы ў Інбелкульце, Міхайла Грамыка напісаў на беларускай мове падручнікі па геалогіі для агульнаадукацыйнай школы і для вышэйшых навучальных устаноў.

Яшчэ раней, у 1907—1908 гг., Грамыка пачаў публікаваць свае вершы і допісы ў часопісах «Самообразование», «Белый камень» і «Пробуждение». А ў 1927 г. выйшлі яго зборнікі вершаў ужо на беларускай мове: «Плынь» і «Дзве паэмы».

Адметны, значны след пакінуў Міхайла Грамыка і ў развіцці беларускай драматургіі. Яго пяру належаць такія п'есы, як «Змітрок з Высокай Буды», «Каля тэрасы», «Скарынін сын з Полацка», «Над Нёманам», «Воўк» і інш. Міхаіл Аляксандравіч добра вядомы і як вучоны, які напісаў шэраг навуковых кніг.

## БЕЛАРУСЬ

Любы край мой, родны край,
Лес, пясок, суглінкі,
На палосках, так і знай,
Вецер гне былінкі.

Ўсё знаёмае датла,
Ельнік ды асіны,
На балоце, ля жытла,
Спеюць журавіны.

Мілы сэрцу ты майму,
Родны край убогі...

Сам не ведаю чаму
Я люблю дарогі.

Ўздоўж дарог пайшлі шляхі
Аж да павароту.
Скрозь лясы, лугі, імхі,
Дываны-балоты.

Вунь алея стромкіх ліп,
А далей — таполя.
Чуцен колаў нудны скрып,
Жыта звозяць з поля.

Пэўна, скончылі жніво,
Вунь ідуць дзяўчаты.
З песняй ціхай і жывой
Цягнуцца да хаты.

## АПОШНЯЕ ДАРУЙ

Само сябе што і не чуеш, мора!
Ці прывітаю я твае хвіліны зноў?
Бязбераажжа твае абшарнае прасторы
Ці дасць калі прытул выгнанніку гадоў?
Ад гэтых сініх вод павінен я далёка
Падацца, аж туды, дзе шапацяць лясы,
Дзе шэпчацца з лазой над возерам асока
Ды па шнурах калышуцца аўсы.
Мой родны край мяне гукнуў да працы,
Як шмат каго з раскіданых сыноў,
Каб з крыўдаю старой ды цемраю змагацца,
Каб край ажыў, расквецiўся заноў.
Вось я гатоў! Ўжо кайстра* за плячыма,
Ужо ў руцэ мой падарожны кій;
Але... ты зіхаціш прад слёзнымі вачыма,
І ногі мне сякуць пад пенай круглякі!
Ты ззяеш золатам. Твае нясуцца спевы,
Гаворка дзіўная, адвечны гук вякоў;
І у душу маю сумлівыя навевы
Ідуць чаргой, як цені аблакоў...
Усё цікавіць зрок: пахілыя хібаркі,
Чаўны, што заляглі на брэзе адпачыць,
Як самавітыя, бязмоўныя таваркі,
Ды і рыбалка сам, што ў неба тварам спіць.

Дзяўчынка на бягу адкінула сарочку,
А шыйка чорная ўжо пырскі мора п'е;
Браток яе гуляецца ў пясочку,
Далонькай кволаю хвіліну мора б'е.
Няведама яму, што гэта цацка-хваля
Прыйшла здалёк, з паўднёвых берагоў...
Мо пачалася там, з турэцкага партала,
А мо бяжыць з Казбекавых снягоў!
Дзіцятку роўна ўсё: вялікае, малое,
Ці сіні акіян, ці дажджавы струмок —
На ўсё аднолькава б'е сэрца залатое,
На ўсё звініць, як срэбра, галасок!
О мора вольнае! Дай моцы мне душэўнай
Зрабіцца дзіцянём, каб роўна прывітаць
І сініх вод тваіх разгулак песнапеўны,
І тых, з кім прыйдзецца па свеце вандраваць!
Яшчэ наўчы любіць бязберажжа свабоды
Глыбокіх дум, бяздонных, як і ты,
Закаты гэных дум ды новыя усходы —
Нясцішна гаманіць у часе цемнаты!
Вось, я гатоў! Ўжо кайстра за плячыма,
Ужо ў руцэ мой падарожны кій!
Жыві, шумі прад слёзнымі вачыма,
Нясі, глытай каменне-круглякі!
Даруй! Іду у край далёкі, родны,
Бо кліча ён да працы ўсіх сыноў...
Каб толькі мне пачуць і там твой спеў лагодны,
Твой вольны спеў — у гомане лясоў!

## ЯНКУ КУПАЛУ

Бывае так, што ў поўдзень мая
За красаваннем і ліствой
Мы сонца мала прымячаем,
Ў садах бадзяючысь з братвой...

Сачаць галіны, пахнуць кветкі,
Ў палях ласкае вока рунь,
І мы, няўдумчывыя дзеткі,
Бяжым па сцежках працы ўгрунь*!

Часамі нават ў цень заходзім,
Каб ад праменняў супачыць.
Нам цёпла ў маі,— карагодзім;
Чаму не пець, чаму не жыць!

А толькі думка адпачыне,
Нам ясна стане ў гэты дзень,
Што зелень ўся без Сонца згіне,
Што толькі з Сонцам дораг цень!

## ЛІПЕНЬ

Поле маё каласіста-кудзёрае,
Сінія ў золаце ў ім васількі!
Ўсё вы залечыце, самае хворае,
Што узрашчаюць ў душы бедакі.

Добра, прывабна сцяжынкай нястрогаю
Сунуцца ў хвалі даспелых збажын,
Ўспомніць дзяцінства і многае... многае,
Што засталося за праслам маршчын.

Хутка, о хутка сцяблы каласістыя
Лягуць, як войска, ў дажынкавы пыл.
Птушкі з гняздоўяў злятуць галасістыя,
З фронтаў гаёвых ў паўднёвісты тыл...

І застануцца палеткі абдзёрыя,
Хмаркі над імі, нябёс бедакі...
Спей жа, маё каласіста-кудзёрае,
Смейцеся мне, васількі, васількі!

# ЗМІТРОК БЯДУЛЯ
## (1886—1941)

Самуіл Яфімавіч Плаўнік (Змітрок Бядуля — псеўданім у прозе, Ясакар — у паэзіі) нарадзіўся ў мястэчку Пасадзец Віленскага павета. Сям'я Плаўнікаў была вялікая і жыла бедна. Доўгі час не было нават сваёй хаты. Бацька добра іграў на скрыпцы і хацеў, каб яго дар пераняў і Самуіл. Купіў яму новую скрыпку. Але Самуіл не асабліва захапляўся ёю. У сем гадоў хлопчык пачаў вучыцца ў хедары (яўрэйскай пачатковай школе), скончыў і паступіў у ешыбот — яўрэйскую духоўную семінарыю. Ешыбот ён не скончыў, пакінуў яго.

Самуіл вельмі любіў маляваць. Маляваў ён прыроду, звяроў і птушак. Пісаў вершы. Спачатку на яўрэйскай мове, потым на рускай, пасылаў іх у розныя часопісы.

З маленства Бядуля знаходзіўся сярод беларусаў.

Ведаў іх побыт і мову. І калі ў Даўгінаве сустрэў чалавека, які распаўсюджваў беларускую газету «Наша ніва», пачаў пісаць свае творы на беларускай мове і пасылаць іх у гэтую газету. Хутка і сам пачаў у ёй працаваць сакратаром рэдакцыі. Жыў некаторы час у Вільні, а пасля пераехаў у Мінск.

У фарміраванні эстэтычных поглядаў Бядулі вялікую ролю адыграў беларускі фальклор. З першых крокаў у літаратуры малады пісьменнік стаў прапагандыстам народнай творчасці. Так, беларускія народныя казкі далі сюжэтную канву для такіх апавяданняў, як «Сон Анупрэя» і «Дудар».

Асаблівасцю яго творчай манеры было спалучэнне рэальнага з фантастычным, трагічнага з камічным.

З. Бядуля вельмі любіў дзяцей, часта выступаў перад імі. І значнае месца ў яго спадчыне займаюць дзіцячыя творы. Аб гэтым сведчыць і тое, што першым апавяданнем яго было «Малітва малога Габрусіка», а апошнім творам — аповесць «У дрымучых лясах». І абодва творы — пра дзяцей.

Дзіцячую літаратуру пісьменнік ніколі не разумеў вузка. Яго творы аднолькава цікавыя і дзецям, і дарослым. Асобнае месца ў яго творчасці займаюць такія творы для дзяцей, як «Салавей», «Мурашка Палашка» і «Сярэбраная табакерка».

У першыя дні вайны згарэла ў Мінску кватэра, а разам і бібліятэка пісьменніка. Бядуля, як і іншыя беларускія пісьменнікі, паехаў у Алма-Ату, аднак не даехаў туды. Па дарозе яго напаткала смерць. Пахаваны беларускі пісьменнік у г. Уральску.

## ДЗЕНЬ ДОБРЫ!

Над сажалкай сіняй зара начавала,
Было там і зорак нямала.

У сажалку зоркі праменні кідалі,
Свяціліся блізі і далі.

І грала зара сваім крыллем агнёвым,
Адсвеццем на лісцях дубовых.

— Няма нада мною,— сказала зарніца,—
Святлейшай на свеце сястрыцы.

— Няма тут над намі,— сказалі і зоркі,—
Ярчэйшай палянкі, узгорка.

Спяваў у арэшніку шэры салоўка,
Хваліў іх і спрытна і лоўка.

Тут ветрык прачнуўся на яснае ранне,
Пачаў між лістоў сваё гранне.

І сонца з-за гаю зірнула харобра:
— Дзень добры! дзень добры! дзень добры!

І зоркі патухлі, патухла зарніца,
І змоўк салавей на галінцы.

## МАРЫ ПАЭТА

З хаціны курнай выйду. Над зямліцай
Наладжу арфу я з зарніцы.

Нацягну струны я з праменняў сонца,
З яго агністых валаконцаў.

У зоркі-ноты я ўглядацца буду.
Паймкнецца з сэрца спеў да люду.

І на пажар рубінавага ўсходу
Пра лепшы лёс спяю народу.

Мне будзе месяц медна-гучнай глебай,
Я апрану блакіты неба.

А пада мною хмары стануць полем,
Я буду гімны пець аб волі.

Я сэрца вырву, запалю паходняй —
І запануе дзень удодні.

Я вызаву маланкі з навальніцай,
Віхор зайграе на зямліцы.

## ЗІМОВАЯ КАЗКА

Вісіць снежная ноч, вісіць лютая ноч
Сівай футрай над пушчай кашлатаю.

Белым пер'ем снягі, белым сырам снягі,
Долы-горы пад снежнымі шатамі.

Ў адзічэлым бары, непрабудным бары
Жывуць людзі маўклівыя, злосныя.
У хароме шкляным, на пасцелі шкляной
Дрэмле дзеўчына сонцавалосая.

Вы завіце яе, вы будзіце яе —
І закрэхча хваіна высокая,
І заплача віхор, і застогне віхор,
Загалосіць зіма белавокая.

І ад страху зіма, ад спалоху зіма
У шаленстве марозным замеліцца.
Некілзаным канём, сіва-белым агнём
Пойдзе дуба сляпая мяцеліца.

І дзяўчына ўздыхне, цяжкі сон перарве,
Пальцам бровы ачысціць ад шэрані.
І зірне навакол, непрытульна вакол,
Выюць сумна ў бары ваўкі шэрыя.

Вы будзіце яе — і надыдзе вясна,
Засвяткуюць жаўронкі над нівамі.
Крыкне люд на рацэ, пойдуць крыгі ракой,
Зіму змыюць паводкі гуллівыя.

* * *

Ад плачу птушкі невядомай
Я прачнуўся раніцой...
Гушчар драмаў на мшалай горцы
Пад туманістай імглой.

Вятрак пісаў крылом па небе
Сонцаграйны сказ вясны;
Сляпілі неба руні хмарак,
Нібы спозненыя сны.

Спяваў асвір* над старай студняй
Роем з'юшаных пчалін,
Бярозка шастала ў аконца
Сотняй пальцаў рук-галін.

Жабрачкай дрэва выстаўляла
Чорны сук на стары плот.
Здаецца, во скранецца з месца
На жабрачы свой абход.

А птушка плача, на абшары
Кліча сонечны прамень.
Стаіць цяплынь, і пахне мёдам
Новы, ціхі, вешні дзень.

* * *

Думкі апоўначы — кветкі расістыя —
Сэрца смяротнага спевы вячыстыя,

Птушкамі ціхімі ймчаліся ў вырai,
Ў неба халоднае біліся крыллямі.

Пчолкі маўклівыя — зораньki пільныя
Іх сустракалі там цішай магільнаю.

Месяц палохаў іх сном-таямніцаю,
Путаў іх, блутаў іх срэбнай расіцаю.

Хмаркі кудзельныя, лёгкія, зграбныя
Цьмой-павуцінаю клікалі-вабілі.

Далі трывожылі сінімі дахамі,
Хвойнымі процьмамі, шызымі страхамі.

Думкі апоўначы — ягадкі спелыя —
З неба вярнуліся асірацелыя.

Думкі, да месяца не ўзнімайцеся.
Лепш вы зямеліцы блізкай трымайцеся.

## ВЯСНОЙ

То не снег — то чаромха цвіце:
Падарунак вясны-дабрадзейкі,
То не снег — то бярозка расце,
То не снег — матылёчкаў сямейка.

То не шоўк — гэта рунь пад гарой,
То вясны маладой арнаменты,

То не скарб дарагі над зямлёй —
То праменняў блішчаць дыяменты.

То не водгукі струн залатых,—
То жаўронак чарує ратаяў;
Ён у спевах вясновых у тых
Хараство ніў-палёў усхваляе.

І, здаецца, не ў першы разок
Гэта шчасце вясна прынасіла.
Але вабіць вясновы дзянёк,
І насыціцца вока не ў сіле...

Мая радасць імчыць да нябёс,
Да бязмежных у далі паветак,
І раблюся я братам бяроз,
Ручаёў, матылькоў, кволых кветак.

Запалонен я песняй зямлі,
Загубіўся ў ёй, як пясчынка.
Не магу ад яе адысці,
Як ад дуба малая галінка.

## КВЕТКА

Апусцілася вясна на зямельку, сонейка падагрэла грудзі зямельчыны, і за выганам на мяжы кветка радзілася. Ноччу чыстая раса купала яе ды няньчыла; з блізкай вярбіны салоўка ёй алелуя пяяў; удзень праменні сонейка фарбавалі яе ды грэлі. Зрабілася кветка нейкай дзіўнай цацачкай сваімі разнаколернымі ляпёсткамі (пялёсткамі).

Нагнаўся араты быкамі сваімі, затуманіў люльку сваю і зараз бруднымі атопкамі гыц на кволую кветку, на дзіцянё блакітнага неба...

І быццам не было яе на мяжы ля выгана...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Чалавеча! На манер песні здатнее мне гаварыць з табою. Ці дагадаўся ты, што гэта толькі малюнак паўночных думак тваіх?.. сон душы тваёй?.. калі твая душа пасля гуку мінуўшага дня заплавала ў хвалях яснага супакою, калі зажадала яна нешта таемнага, незвычайнага, і, быццам кветка, быццам голуб белы, над ёй святочнасць запанавала, ты зямной бруднай карыснасцю сва-

ёй затаптаў, знішчыў тыя кволыя расліны неба, і быццам не радзілася кветка ў душы тваёй...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Чалавеча! Шкада мне цябе...

## ШАПТАЎ ЧАРОТ

Шаптаў чарот пад высокім дубам у шырокай затоцы ракі.

Дзікая качка кружылася над дубам.

Месяца не было, але была відная ноч...

І стары рыбак паехаў па абшырнай глыбокай плёсе, на чоўне-душагубцы, венцер паставіць.

Быццам маліўся высокі цёмны бор, і сумна было на дзікім балоце.

Развёў я вялікае вогнішча на самым беразе ракі...

Як залатыя пчолы, як песні маладосці, падняліся, лунаючы ўвысь, іскры... і гаслі адна за другой разам з маімі ўспамінамі светлай, шчаслівай маладосці.

Сумна было на дзікім балоце — і захацелася мне пець вясёлую песню, вольную песню. Але з таго часу, як мілая мая дзяўчына лягла ў халодную магілу, я перастаў пець... І захацелася мне плакаць — але нешта каменем станула ў маім горле... Нейкім агнём пакрыліся мае вочы, і слёзы не пацяклі...

І шаптаў чарот нямым галасам сваім, нямы голас магілы абхапіў мяне, і я задрыжэў...

Месяца не было, але была відная ноч.

І сумна было на дзікім балоце, пад абшарам нямога блакітнага неба...

# АЛЕСЬ ГАРУН

## (1887—1920)

**Алесь Гарун (сапраўднае імя Прушынскі Аляксандр Уладзіміравіч) нарадзіўся ў Мінску, у сям'і рамесніка. Любоў да кнігі з'явілася ў Алеся вельмі рана. У пяць гадоў хлопчык ужо ўмеў чытаць па-руску і па-польску. Скончыў 3-е Мінскае гарадское прыходскае вучылішча, потым — дрэваапрацоўчае аддзяленне трохгадовага рамесніцкага вучылішча, а з 1902 г. працаваў сталяром.**

**У 1904 г. Алесь Гарун зблізіўся з членамі арганізацыі эсэраў-максімалістаў і за актыўную агітацыю суп-**

раць грамадска-палітычнага ладу 4 сакавіка 1907 г. быў арыштаваны і сасланы ў Сібір. Сібір не зламала волі пісьменніка, хаця і не магла не адбіцца на яго здароўі і маральным стане. Цэлае дзесяцігоддзе пісьменнік быў адарваны ад роднага краю, які ён так самааддана любіў. І там, на чужыне, і вярнуўшыся на радзіму, ён марыў аб «вольнай, незалежнай народнай Беларусі», якая не будзе падпарадкоўвацца ні Маскве, ні Варшаве, а сапраўдным гаспадаром зямлі беларускай будзе селянін, які спрадвеку апрацоўвае яе. За такія выказванні творы Алеся Гаруна не вывучалі ў школе і нават не друкавалі.

Першыя друкаваныя вершы з'явіліся, калі Гарун яшчэ сядзеў у астрозе. З найбольш ранніх яго твораў нам вядома паэма «Мае коляды». Яна была напісана ў пачатку 1905 г., але выйшла ў свет толькі праз 19 гадоў пад псеўданімам А. Сумны. А. Гарун з часам падрыхтаваў цэлы зборнік «маркотных песняў-дум», які называецца «Матчын дар».

Алесь Гарун пакінуў пасля сябе разнастайную творчую спадчыну: вершы, апавяданні, п'есы, публіцыстычныя артыкулы.

П'есы А. Гарун пачаў пісаць яшчэ ў 1912 г., аднак зборнік «Жывыя казкі» выйшаў толькі ў 1920 г.— незадоўга да смерці пісьменніка. Гэта былі п'есы для дзіцячага тэатра («Хлопчык у лесе», «Шчаслівы чырвонец» і «Дзіўны лапаць, або Не ўсё тое порах, што ў пораху ляжыць»). Усе яны вучаць дабрыні, справядлівасці, спагадлівасці, выхоўваюць непрымірымасць да падману і зла.

Толькі 33 гады пражыў таленавіты беларускі пісьменнік, і толькі праз 70 гадоў пасля яго смерці мы пачынаем знаёміцца з яго творамі — цікавымі, разнастайнымі і нетрадыцыйнымі.

## МАЕ ДУМКІ

Па-на горах снягі паляглі,
І даліны убраліся ў белі.
Мае ж думкі, як толькі маглі,
Хутка з ветрам удаль паляцелі.
　　Паляцелі удаль, дзе няма
　　Гэтых гор — вартаўнічых няволі,
　　Дзе не гэтак сурова зіма,
　　Дзе прыняў я і жыцце і долю.

Паляцелі спытаць, паглядзець —
Як жывецца на роднай старонцы?
Як той брат-беларус мой жывець?
Ці высока узнялося сонца?
Там жа ўсё, як раней, як было:
Беднасць, ціша кругом і цямнота.
Дзе там шчасце! Жыццё зацвіло,
Як наверсе якое балота.
Сонца нізка — не грэе саўсім
І саўсім жа не свеце без мала;
Раз блісне дзе-нідзе — і паўсім,
І зноў свой твар захавала.
Колькі ж будзеш ты спаць? Не пара
Табе часам, мой браце, праспацца,
Каля бацькаўскіх ніў і двара
Працаваці зноў шчыра узяцца?
І ўсё, што утраціў сплючы,
Пазбіраці да роднае хаты?
Годзе спаць! І не будзе начы,
Будзеш вольны, разумны, багаты!
І высокае слонца тагды
Будзе працу тваю аглядаці,
І пазбудзешся крыўд і нуды,—
Будуць людзі цябе шанаваці.

## ШЧАСЦЕ МАЦЕЯ

(Старадаўняя казка)

Жыў сабе ў сяле Мацей,
Меў шасцёра ён дзяцей,
Сядзеў, бедны, без работы,
Бо не меў к таму ахвоты.
Красці ён высцерагаўся,
Знаць, астрога крат баяўся,
А шасцёрка дзетак плача,
Трэба хлеба ім, аднача.
Вось ад гэтае нядолі,
Каб не чуці стогнаў болей,
Рушыў раз Мацей ў дарогу
Проста ў рай, к Самому Богу.
Уздумаў праўды дапытацца,
Што рабіць, за што узяцца?
Брыў ці многа ён, ці мала,
Ў лес густы яго прыгнала.

Паўдня, мусіць, йшоў па лесе
Ды зблудзіўся, нос павесіў,
Сеў пад дрэвам і чакае,
Можа пройдзе хто. Гукае.
Толькі ўчуў ён: нехта едзе;
Лес трашчыць, як ад мядзведзя,
Конь капытам так грукоча...
Уцячы Мацейка хоча,
Хоча ўстаць — ніяк не можа...
— Вось бяда дзе, моцны Божа!
Зліўся потам ўвесь, трасецца...
Бачыць — свет к яму нясецца:
Бяжыць ясны, пекны конь,
Ўвесь гарыць, маўляў агонь,
Збруя белая раменна,
Ўбрана ў золаце адменна;
На кані, узяўшысь ў бокі,
Чалавек сядзіць высокі,
Пекна надта прыадзеты,
Але быццам з таго свету.
Вось уз'ехаў на паляну,
Дзе сядзеў Мацей зляканы,
Конь спыніўся, стаў, чакае,
З воч яго агонь шугае.
«Што сядзіш тут, маладзец? —
Так спытаўся той яздзец.—
Куды брыў, на што сабраўся?»
Мацей духу тут набраўся,
Зірнуў проста на яздца:
«Ў імя Сына і Айца!!!
Святы Юр'я, пэўне, гэта:
Такі з твару, так адзеты,
Як я бачыў на абразу!»
Пасмялеў Мацей адразу
Дый прамовіў да святога:
«Я — Мацей з Бару Крутога,
Шмат дзяцей, паночку, маю,
А карміць іх чым — не знаю.
Працаваў бы — не здалецi,
Бо гультай я ў гэтым свеце!
Красці? — краў бы, дык баюся,
Бо, крый Божа, пападуся
Да пачцівых як людзей,
Так паходзяць ля грудзей,
Што жыць стане неахвота!

Вось такія мне клапоты.
Я і думаў, як мне быць,
Дзе спакой сабе здабыць?
Не дайшоў сам да нічога,
А надумаўся — да Бога
Я пайду і запытаю,
Што рабіць на свеце маю?
Ды у лесе во зблукаўся,
Начаваць у ім сабраўся...
Вы ж, паночак, быць павінна,
Ў неба едзеце ў гасціны?
Дык мне ласку там зрабіце,
Аба мне ўсё раскажыце
І аб дзетках маіх разам;
Што там скажуць? З пераказам
Сюды едзьце проста ў лес».
«Добра, добра, я увесь
Для цябе гатоў служыць!
Як мне толькі не забыць
Тое ўсё, што ты казаў?
Я б паяс распеnecazaў
На ўспамін,— дык меч спадзе,
Што параіш у бядзе?»
«Эт, панок! Я спосаб знаю,—
Простым розумам параю:
Каб вам мець перасцярогу,
Не забыцца б ў Пана Бога,—
Адно стрэмя залатое
Вы пакіньце мне на тое,
Помніць будзеце ўвесь час,
Што я тут чакаю вас».
«Добра, розуму бярэмя
Маеш, чалавеча! Стрэмя
На, вазьмі маё; сядзі
Ды чакай мяне, глядзі!»
І, Мацею стрэмя даўшы,
Сам паехаў, паскакаўшы
Зноў па лесе на каню...
Бляск ідзе, маўляў, з агню,
Ззяе стрэмя залатое.
«Вот бы мне яшчэ другое! —
Гэтак думае Мацей.—
Было б хлеба для дзяцей».
(Узрос Мацей і жыў без цноты*,
Не было бацьком турботы,—

Дык не дзіва, што лазаты,
Бэльзэбула сын рагаты,
З гэткай думкай падступіў,
А Мацей яе ўхапіў.)
Потым стрэмя закапаў,
Палажыўся і праспаў,
Аж да заўтра, да паўдня...
Пралупіўшы толькі вочы,
Чуе: конь ізноў грукоча.
Святы Юр'я то нясецца,
Мацей ў вус сабе смяецца.
Многа часу не чакаў,
Хутка Юры прыскакаў:
Конь пад ім гуляе, скача.
«Ну, ты слухай, небарача:
Аб табе з тваёю справай
Я ў абедзе за расправай
Богу ўсё як ёсць сказаў;
Пастараўся, як звязаў,
І як ты жывеш, гаруеш
І з дзяцьмі сваймі бядуеш;
Як галаву сваю ламаеш
І які ты розум маеш!
Так казаў, што ледзь-не ледзь
Сам не плакаў. Адпаведзь
Бог такую табе даць
Меў мне міласць прыказаць:
Красці — гэта грэх! Глядзі,
Ты ніколі не крадзі!
Калі ж будзеш ты што браць
У людзей, то, каб аддаць,
Надта рупіцца не трэба,
От і будзеш меці хлеба.
А то часам і саўсім
Не аддай нічога ім:
Я не ведаю, не браў...
Калі ж будуць набівацца,
Ты не бойся адпірацца,
Шчасце знойдзеш так сваё.
А цяперака маё
Стрэмя зноў ты мне звярні».
«Стрэмя?! Я яго не браў!
Хіба ж пан мне аддаваў?!» —
«Ану, як жа,— можа, не?» —
«Не давалі, панок, мне!

Мо ў дарозе дзе згубілі,
Мо саўсім без стрэмя былі?..»
«Не кажы, Мацей, пустога,
Свайго стрэмя залатога
Я ніколі не губіў;
Я пакінуў, як тут быў,
Ды ад'язджаць ужо збіраўся».
А Мацейка не спужаўся:
«Ясны пане, мяне маці
Не вучыла, каб ілгаці,
І калі я вам сказаў,
Стрэмя вашага не браў,—
Значыць, так яно і ёсць,
Дайце веры, ваша мосць».
Так Мацей выпрысягаўся.
Святы Юры паспрачаўся,
Потым бачыць, што дарма
Тут стаяці, што няма
Ўжо ніякае надзеі
Вярнуць стрэмя ад Мацея,
Уздыхнуў дый кажа ціха:
«Ну, не жычу табе ліха,
Бог з табою... Спажывай!
Дробных дзетак паднімай,
Хоць... Папраўдзе... Каб я знаў,
Стрэмя б мо табе не даў».
І, сказаўшы так, святы
Паскакаў у лес густы.
Мацей стрэмя адкапаў
Дый за пазуху схаваў
І пайшоў сабе дахаты
І вясёлы, і багаты.
Як ён сцежачку знайшоў,
Як дадому ён прыйшоў,
Як далей ён сабе жыў,
З кім сварыўся, з кім дружыў,
Які у жыццю меў ён цэль,—
Я не ведаю. «Круцель!» —
На яго казалі людзі.
Хай і гэтак сабе будзе!
Мне ж, калі так ваша ласка,
За маю за гэту казку
Чару мёду паднясіце
Ды закускаю дарыце.

## СПРЭЧКА

Дзядзька Тодар, два Пранцішкі,
Сват Гілерык, кум Тамаш
Раз ў мястэчку Зацвілішкі
Насмяшылі ўвесь кірмаш.
    Што было прадаць — прадалі,
    Кум Тамаш змяніў каня,
    Покі ўсё панакуплялі,
    Зірк — ай-ей: каля паўдня!
— Праўда, справіліся ёмка,
Але ж хай ты... во, абед...
— Ну дык што! Хадзем ў карчомку! —
На суседзяў так сусед.
    Ўзялі кварту. На закуску
    Пару ўзялі тараноў.
    Што ж ім кварта? На затруску!
    Ўзялі квартачку ізноў...
Больш пілі дзядзькі, чым елі:
Квас, гарэлку, піва, мёд.
Быццам чмелі, загудзелі,
Як і ўвесь ля іх народ.

    Хоць там словы ледзьве вяжуць,—
    Тэй бяды! А што ж маўчаць?
    Той штосьскажа, той заўважыць,
    Кіне чарку наліваць.

Так ад цэнаў, бульбы, меры,
Што на рынку хвальш дае,
Зачапілі справы веры
Дый... счапілісь за яе!
Гэтта слоў ім не хапіла,—
Знана вёска: словаў брак!
Потым, слова — хіба ж сіла?
Хіба ж зробіць, як кулак?
    От і пляснуў Тодар ў вуха
    Па-суседску Тамашу,
    І паўстала завіруха
    У карчме на кірмашу.

Кум Гілерык, сват, Пранцішкі,
Тодар,— звіліся ў клубок...
Ўсё мястэчка Зацвілішкі
Раптам збеглася ў шынок...
    Праз гадзіну дзед Ігнацы
    Ўсіх бусайлаў* тых мірыў:

— Ці ж не сорам гэтак, братцы? —
Дзед паважна гаварыў: —
Ну, на ліха вам сварыцца?
З розных вераў вы — адны
Дзеці гэтае зямліцы,
Краю гэтага сыны.
Вера з жыццем ўсім даецца,
Хто іх даў — яму іх знаць!
Дурань той, хто спадзяецца
Веры сілай паяднаць.
Мы і так, браткі, знявагі
Досыць мелі ад чужых,
Каб спрачацца без развагі,
Ці не цешым толькі іх?
Глузу хіба ж вы не мелі?
Біў чужы вас лёгка смех?
Эх вы, шэршні! Эх вы, чмелі!
Ну, не сорам вам?.. Не грэх?..

## ХАТКА

Там, дзе сумна з краю бора
Ў тры ваконцы свеціць хатка,
І з лясной травой гавора
Буракоў і бульбы градка;
Дзе жаўцеюць тры загоны,
А на кожным па дубочку,
Ціха шэпча бор зялёны
І глядзіцца ў ручаёчку;
Дзе чутно, як сонца грае
На праменнях свету горда
І ніколі не змірае
Зык шчаслівага акорда,—
У тэй хатцы, пры тым боры,
Асяліліс аж тры горы:
Сын даўно пайшоў ў жаўнерку,
Хоць, здаецца, меў ён льготы...
Ах, згубілі Казімерку
У жаўнерцы тэй сухоты!
Доню мелі... Божжа воля!
Выйшла замуж, ён п'яніца...
Што падзееш? Мусіць доля!..
І памерла белаліца.
Мелі мейсца. Хлеб трымаўся,
Быў рызман, хаця і зрэбны,

Пан ляснічы штосьць ўзлаваўся:
«Вы мне, кажа, непатрэбны»...
Аж тры жалі, аж тры горы,
Там у хатцы, там пры боры!

**ПЕСНЯ**

На чужой старонаццэ
Заняпаў душой
І згубіў здаровейка,
І згубіў спакой.
Не глядзелі б вочанькі
На нялюбы свет,
Маладое радасці
Прападае след.
На чужой старонаццэ
Не цвітуць сады,
Не спяваюць птушачкі,—
Не лятуць сюды.
І чужое лецейка
Для мяне — зіма,
І чужога сонейка
Для мяне няма.
На чужой старонаццэ
Не шумяць лясы
І няма прыгожасці
Ў палявой красы.
Замірае душачка
На чужой зямлі,
А дамоў вярнуціся
Не ў маёй валі.
Дзе ж вы, ніўкі родныя
І дубовы шум?
Заспявайце голасна,
Каб пазнаў, пачуў.
Ўскаланіце песняю
Векавечных сноў,
Ўскаланіце душачку,
Ўскаланіце кроў.

# ЦІШКА ГАРТНЫ
## (1887—1937)

Сапраўднае імя пісьменніка — Зміцер Хведаравіч Жылуновіч. Нарадзіўся ён у мястэчку Капыль у сям'і беззямельнага селяніна. Бацька асушаў балоты на Палессі, а маці ткала палатно ці займалася падзённай працай у местачковых багацеяў.

Калі ў 1908 г. Цішка Гартны даведаўся пра выданне ў Вільні беларускай газеты «Наша ніва», то адразу зацікавіўся ёю, пачаў чытаць, а аднойчы паслаў туды і свае вершы. У 1909 г. убачыў свет першы верш Цішкі Гартнага «Бяздольны», прысвечаны Янку Купалу.

У дванаццаць гадоў Зміцер развітаўся з бесклапотным дзяцінствам: летам пасвіў кароў, а зімой вучыўся — спачатку ў хатніх настаўнікаў, а пасля ў народным двухкласным вучылішчы. У 1905 г. зрабіў першае падарожжа «ў людзі», дзе меркаваў знайсці працу і надрукавацца ў «Киевских откликах». Але ні адно, ні другое не атрымалася. Вярнуўся дадому і паступіў у майстэрню гарбаром. Спрабаваў паступіць у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, але яго не прынялі. У пошуках работы Зміцер доўгі час вандраваў па Беларусі, Літве, Латвіі і Украіне.

Раннія творы маладога пісьменніка былі напісаны пад уражаннем паэзіі Някрасава. Першы зборнік вершаў «Песні» выйшаў у 1913 г. Герой яго твораў — прыгнечаны чалавек, якому цяжка жыць. Цішка Гартны заклаў асновы беларускай рабочай паэзіі.

Значны ўклад зрабіў Зміцер Хведаравіч і ў беларускую прозу. Лепшыя яго апавяданні, якія ўваходзяць у зборнікі «Трэскі на хвалях» (1924) і «Прысады» (1927), вызначаюцца багаццем жыццёвага матэрыялу.

Важным здабыткам на шляху станаўлення беларускай эпічнай прозы быў раман Цішкі Гартнага «Сокі цаліны».

Увесь час Ц. Гартны актыўна выступаў у перыядычным друку з падарожнымі нарысамі, крытычнымі артыкуламі і рэцэнзіямі, успамінамі пра рускіх і беларускіх пісьменнікаў, а таксама па пытаннях мовазнаўства, тэатральнага майстэрства і музыкі.

Трэба адзначыць і тое, што Ц. Гартны ўпершыню ў беларускай прозе выступіў з апавяданнямі на антыфашысцкую тэму «Смерць Германа Васермана» (1931), «Краскі ў палынах» (1932).

Пісьменнік працаваў рэдактарам газеты «Савецкая

Беларусь», часопіса «Полымя», узначальваў Дзяржаўнае выдавецтва БССР, быў намеснікам наркома асветы рэспублікі.

Памёр Ц. Гартны ў турме.

## КЛЯНІНКА

Бачыў я, як вецер ў полі павяваў,
Бачыў, як клянінку бедную хістаў:
З болю яе ралкі тонкія гулі
І хінулісь нізка да сырой зямлі.

А сіберны вецер з сілай набягаў,
Пекныя лісточкі з ралак атрахаў.
І здавалась, раптам ён мацней шугне,
Бы нажом ля корня бедную сатне.

Ўміг, ў адну хвіліну ў маладым жыцці
Перастане дрэўца рэзвае расці...
Але моцы ветру стала не хапаць —
Ён не мог клянінкі ўзвеем даканаць.

Закіпеўшы помстай ветру насустрэч,
Лісцем прашаптала смела яму рэч:
«Захацеў, сіберны, ты мяне скасіць,
Захацеў разрэзаць майго жыцця ніць...

Не, не дамся, вораг, сіле я тваёй —
Выйду з усёй моцай стрэціцца з табой,
І хоць тваіх звеяў мо й не адапру —
Толькі і пакорнай смерцю не памру».

## ДА НАДЗЕІ

Не пакінь ты, надзея, мяне,
На адну не пакінь ты хвіліну,
Дай глыбокаю вераю мне
У васкросшую верыць краіну.

Напаі маю душу віном
Нестрыманай яскравай свабоды
І кажы мне галосна аб том,
Што заззяе яна для народа,

Які сілай панурлівых дней
З непрыветнаю доляй звянчаны...
Пей жа песні, надзея, мне, пей
Аб васкросшай краіне каханай!

* * *

Мець бы жыццё бессмяротнае мне,
Мець бы вечныя, свежыя сілы,
Я аддаў бы усё старане,
Старане сваёй роднай і мілай!

На кускі, на крупінкі, як пыл,
З кожным днём я б па ёй
разлятаўся
І часціны нязмераных сіл
Ў кожным месцы дадаць бы
стараўся.

А дзе трэба было б заплаціць
Дзеля шчасця народу сабою,
Я хутчэй пастараўся б там быць
І сваёй адкупіцца душою...

І так з году у год, да тых дзён
Па кусочку б ў ахвяру я клаўся,
Пакуль цяжкае долі праклён
З стараною маёю расстаўся.

Каб мець жыццё бессмяротнае мне,
Каб мець вечную, свежую сілу,
Я аддаў бы усё старане,
Старане сваёй роднай і мілай!

## СЫМОНКА-ІНЖЫНЕР

### I

Сымонку Кеплю было дзесяць гадоў ад роду; ён быў старшым дзіцем у сваіх бедных бацькоў, гарбара Андрэя і Луцэі Кепляў. Апроч Сымонкі яны мелі яшчэ дзвюх дзяўчатак: Параску — старшую і Марыльку — малодшую. Як першука Сымонку любілі і бацька, і маці дужа шчыра і крэпка, ды было завошта яго любіць. Сымонка быў хлопчык рэзвы, дасціпны, заўсёды вясёлы і, галоўнае, паслухмяны да сваіх бацькоў. Ніколі ён не адказваўся

выпаўніць бацькава ці матчына даручэнне і ні словам не пярэчыў іх прыказанням. Ці пашлюць Сымонку ў краму купіць што, ці да суседзяў — што-колечы пазычыць, ці прыкажуць вартаваць хату, пайшоўшы самі ў заработкі,— Сымонка да дробязі выпаўняў наложаную на яго павіннасць.

Да ўсіх іншых якасцей меў ён і розум ды здольнасць не па гадах.

За гэта Сымонку бацькі ставілі ў прыклад, калі заходзіла ў іх гутарка аб дзецях. «Наш Сымонка, будзь ён здароў, удаўся хлапчук»,— казалі яны.

А між сабой у вольны час разважалі Андрэй і Луцэя Кеплі так:

— Ведаеш, Луцэя, мы свайго Сымонку вучыцьмем і вучыцьмем. Аж пакуль сілы нашае хопіць. Скончыць ніжэйшую школу, аддамо вышэй, а там яшчэ вышэй і да канца...

— Вядома, што так было б вельмі добра, каб выстарчыла нашых сіл. Але тое блага, што гатова стацца нам не пад сілу. Заработкі нашы невялікія — толькі што пражыць сяк-так хапае. Ды то, бачыш во, на зняпад ідзе тваё рамяство. Умяшалася гэта рэвалюцыя і як ёсць, усё ўверх дном паставіла. Чакалася аднаго, а напаткала другое. Тым часам сілы твае пакрысе растаюць... Няведама, Андрэй, як яно выйдзе.

Луцэя судзіла па-свойму, як і заўсёды, а ў нутры сваім думала: «Будзем старацца з усіх сіл».

— Кінь ты, дурная, сваю няверу,— перабіваў Луцэю Андрэй,— ну, хай пакуль і цяжэй чуецца, але гэта часова так... Гэтая цяжкасць мінецца, пяройдзе, і нашаму брату-рамесніку куды лягчэй зажывецца. Мала што бывае... Паглядзі, колькі ўсякіх труднасцей прыйшлося спаткаць рэвалюцыі на сваім шляху: тут і немцы, тут і палякі... Апошнія ўжо болей паўгода, як топчуцца і дратуюць нашу зямлю. А прагонім іх — інача пойдзе. Будзе навука нашай — і сродкаў не так шмат патрабуецца на Сымонку, каб яго вучыць... Навучым, за інжынера навучым...

Калі так казалася пры Сымонку, то ён пільна слухаў бацькоў, здавальняюча ўсміхаўся і падрастаў на некалькі каргоў. «Буду інжынерам! Буду інжынерам!» — пераказваў ён па некалькі разоў сам да сябе, а бацькам хваліўся:

— Мяне, татачка, мяне, мамачка, вельмі любіў настаўнік: заўсёды казаў, што я старанны і здольны яго вучань, паслухмяны хлопчык, што з мяне могуць выйсці людзі.

— Ай, ды ты мой разумнік,— гладзіў Андрэй па галоўцы свайго сынка,— выйдуць, выйдуць з цябе людзі! — і цалаваў.

А Луцэя дадавала ўслед:

— Трэба, Сымонка, быць чалавекам, трэба. Выйдзеш сам у людзі і сваіх сястрыц выведзеш.

Параска і Марылька згодна і рашуча заключалі бацькоўскія гутаркі па свайму разуменню і напаміналі бацькам:

— Як Сымонка паедзе вучыцца за інжынера, хай нам лялек прышле.

## II

Мястэчка Ступа, у якім жыў Сымонка з бацькамі і сёстрамі, стаяла пры рэчцы Плаўні. Пачынаючы з пятнаццатага года, яно ўвайшло ў вадакрут вайны і не пазбаўлялася яе ажно да прыходу на Беларусь бальшавікоў. Праз чатыры гады ўсякія страхі абымалі Ступу і ступаўцаў жалезным колам страляніны, чырвоным полагам пажараў. Забываліся падлічыць, колькі разоў пераходзіла мястэчка з рук у рукі: адны прыходзілі — бралі, выдавалі свае законы, пасля аднекуль з'яўляліся другія — адбіралі ад першых, адмянялі іх законы і парадкі. І кожны раз у гэткіх выпадках ішла страляніна, валяліся па вуліцах раненыя і забітыя людзі, стаяў шум, траскатня. Міжвольна ступаўцы прымірыліся да гэткай сваёй долі. Найбліжэй зрадніліся з неспакоем дзеці. Іх цікаваму задзёру хапала досыць яды, а на дзіцячую чулую душу было чаму ўплысці.

Захапіла ваеннае паветра і Сымонку. Ён часта-густа станавіўся правадніком у дзіцячых гульнях у вайну. Гэта да таго падабалася Сымонку, што ён і слухаць не хацеў бацькоўскай гутаркі аб інжынерстве. «Зрабіце з мяне лепш афіцэра, і я буду з палякамі ваяваць»,— адказваў бацькам Сымонка. Тым болей яго падбівала вайсковасць, калі бацькі, гутарачы аб забраўшых Ступы і ваколіцы палякaх, праклiналі іх і чакалі скорага збаўлення.

Сымонкаў бацька больш сямі месяцаў пры палякaх не меў работы і два разы быў заарыштаваны за лаянку польскіх парадкаў. З вялікімі труднасцямі прыйшлося ўсадзіць Сымонку ў школу. «Кепля — бальшавік»,— казалі палякі і рабілі яму ўсякія злачынствы. За гэта Сымонкавы бацькі і клялі, і лаялі палякаў. Ды не адны бацькі! Сымонка бегаў да таварышаў і чуў, што тавары-

шавы бацькі таксама точаць зубы на «паноў-захопнікаў». Запала і ў яго чулую дзіцячую душу гарачае пачуццё крыўды і помсты да агульнага ворага. І з гэтага часу ў сваіх гульнях з дзецьмі Сымонка перамяніў характар і выразнасць дзеяў, ахрысціўшы немцаў — палякамі, а расійцаў — чырвонаармейцамі. Кожны раз ішла бойка ў іх між двума гэтымі станамі. Сымонка заўсёды быў начальнікам чырвонаармейцаў. Ён чуў, як бацька цішком паведваў мацеры аб хуткім іх прыходзе ў Ступы і сам з нецярплівасцю чакаў. Абы раніца — выходзіў з хаты на вуліцу, узлазіў на шула і глядзеў на ўсход, за рэчку, ці не ідуць чырвонаармейцы. Сымонка чакаў, што яны прынясуць яго бацьку работу, а дзеля ўсіх вызваленне — штосьці вялікае і каштоўнае, бо вельмі ўсімі пажаданае.

— Татачка, ці ж скора прыйдуць чырвонаармейцы? — часта пытаўся Сымонка ў бацькі.

— Скора, скора, сынок. Ты толькі маўчы, нябож, не плявузгай, дзе не трэба,— перасцерагаў бацька.

Сымонка слухаў бацькі — баяўся каму-кольвечы казаць пачутае ад яго. Але затое сам-насам ні на хвілю не мог звольніцца ад думкі аб чырвонаармейцах; яны здаваліся яму на кожным кроку. А далей сталі сніцца. Абы лёг на пасцель, заплюшчыў вочы і сумеўся, як адразу цэлыя грамады людзей перад ім з песнямі, са сцягамі, з падарункамі для ступаўцаў. Уваходзяць у Ступы, праганяюць палякаў, надзяляюць імі яго бацькоў, бацькоў Якава, Грышкі і Мікіты і ўсіх-усіх.

Раніца ў раніцу прачынаўся Сымонка вясёлы і здаволены, падбягаў да бацькоў і пераказваў ім свае сны; а скончыўшы расказваць, дадаваў:

— Хай толькі сапраўды прыйдуць чырвонаармейцы ў Ступы, дык я разам з імі пайду біць паноў.

Андрэй усміхаўся, гладзіў Сымонку па галаве і казаў:

— Ваяка мой залаты, рэвалюцыянер мой адважны!

— А вы пойдзеце? — пытаўся Сымонка ў бацькі.

## III

Адной раніцай, якраз у сяродку лета, разбудзіў Сымонку гучны стук гармат. Ён сумеўся ад страху і выгукнуў на хату:

— Тата! Мама! Што гэта?

Але ў хаце нікога, апроч сястрыц, не было. Тады Сымонка хутка начапіў на сябе порткі і кашульку і пабег з хаты. Выбег у двор і жахнуўся: была поўна вуліца

войска. Ішлі, ехалі вярхом на конях і на вазах. А дзесь за местам, ля могілак, на адгоне двух-трох вярстоў ад іх хаты, ішла частая страляніна. Па мястэчку стаяў шолам, як у лесе, як у дні вялікіх кірмашоў. Усё гэта ўз'юшыла Сымонку, прыдало яму бадзёрасці, імпэту, пацягнула з двара на вуліцу.

— Сымонка-а, куды-ы ты прэшся? — супыніла хлапчука маці, запрымеціўшы, куды той бяжыць,— ці ты ашалеў, ці якое ліха? Бачыш, страляніна гэткая, што не давядзі госпад...

— А дзе наш тата? — запытаў Сымонка ў мацеры.

— Тата? Не глядзі на тату... Ён пайшоў з цёмнага, дык і цяпер няма. Можа, таксама дзе-кольвечы кулю атрымаў...

Пачуўшы гэта ад мацеры, Сымонка больш нічога не сказаў, а як уюн порстка шмыгануў з двара і захаваўся ў гушчы чырвонаармейцаў, падводаў.

— Куды-і ты, абармоціна-а! Сто-ой,— выгукнула ўслед Луцэя і кінулася к весніцам, каб супыніць хлапчука. Але, выбегшы на вуліцу і акінуўшы ўзрокам шэрагі чырвонаармейцаў, якія неперарыўнаю чарадою выходзілі з аднаго канца вуліцы і накіроўваліся ў другі, яна не ўгледзела Сымонкі. Маладзіца ажно садрыгнулася ад пярэпалаху, але не ведала, што зрабіць, і ў нерашучасці прастаяла хвілін з дзесяць на адным месцы, а пасля вярнулася зноў у двор.

Сымонка ж апукаю каціўся ўздоўж вуліцы к рынку. Яму ўвайшло ў голаў, што яго бацька павінен быць там, дзе адбываецца бойка з палякамі. Ён успомніў бацькавы словы, якія бліснулі яму чырвонымі іскрамі. Дзіцячае нутро, запаленае ад іх помстаю да паноў, да праціўных паноў, якія праз цэлы год так ліхамысна здзекаваліся з яго бацькоў, свідравала Сымонку, пхала яго бегчы на тое месца, дзе чынілася ім адплата.

— Куды ты, пастралёнак? — перапынялі Сымонку чырвонаармейцы, хапаючы яго за руку.— Там цябе застрэляць, варочайся.

Сымонка вырываўся і праныраў далей ды далей. Ужо каля рынка ён спыніўся. Страляніна падалася ўлева, за касцелішча. Каб бегчы да яе, трэба было звярнуць з вуліцы, пакіраваць на гароды, а далей — у луг к могілкам. Сымонка задумаўся, памеркаваў і раптам марскануў у бліжэйшы двор. Не азірнуўся ні разу на чырвонаармейцаў.

## IV

Праз некалькі хвілін ён ужо быў у лагу, у густой мяккай траве, на адгоне вёрст паўтары ад могілак.

Між кустоў і ўзгоркаў, дзе хаваліся крыжы, не сціхалі раздавацца то частыя, то аднаразовыя стрэлы. Паміж імі чуліся людскія выгукі. Сымонку памарылася, што ў агульным голасе «ўра» адмецен голас яго бацькі. Ён узорыўся ў адну прагаліну між нізкага густога куста арэшніку і стромага покату ўзгрудку. Прытуліўшыся шчыльна да зямлі, ляжаў там чалавек і мерыўся з стрэльбы наўскасяк. Палкае ваабражэнне Сымонкі стварыла з чалавека яго бацьку: рудаватая шапка на галаве, кароткі чорны курцік — акурат. Хлапчук нязмігутна ўзіраўся і ўсё паўней і выразней адзначаў бацькавы рысы. Сэрца трапятала вострым жаданнем хутчэй апынуцца каля яго, каб хоць раз стрэліць у пана. Жаданне гнала Сымонку ўбежкі. Адно мігцелі белыя ножкі ў высокай мятліцы, путаючыся ў дзяцельніку і свірэпе. Сагнуўшы ручкі на востры вугал і падняўшы іх роўна з плячыма, ён рытмічна, як на гімнастыцы, пасоўваў іх то ўзад, то ўперад. Часта сапучы, Сымонка ціха шаптаў адны і тыя словы: «Хутчэй бы дабегчы! хутчэй бы дабегчы!»

Праз паўгадзіны ён ужо быў на грудку, за якім ляжалі могілкі. У вочкі кінуліся крыжы, жоўты пясок на могілках, бегатня людзей.

— Тата-а! тата, дзе ты? — гукнуў Сымонка.

Зусім недалечка, як бы над самым яго вухам, раздаўся гулкі залп: аглушыў Сымонку, ажно збіў з ног. Хлапчук упаў, але раптам падняўся і кінуўся ўбок. Знаёмая прагалінка нібы вынікла з зямлі перад яго вачыма і нявызнанаю сілаю пацягнула Сымонку да сябе.

— Та-та-а! — выгукнуў ён, бегучы, і з радасці разняў рукі. Той жа чалавек, якога ён бачыў здалі ў прагаліне і які выдаваўся Сымонку за бацьку, глядзеў яму насустрач, выставіўшы вінтоўку.

— Тата-а! — пераказаў выгук Сымонка, прабегшы яшчэ некалькі крокаў. І не паспеў адсапнуцца, як штосьці грукнула і адначасова моцна стукнула яму ў пах, паваліўшы яго ніцма на зялёную мураўку. У вушах зазвінелі кусочкі раструшчанага шкла, а па ўсяму целу расплылася цеплыня і санлівая ўтома. У паясніцы да таго моцна закалола, што Сымонка хапіўся рукою, думаючы, нібы яго хто рэжа. Вочы заплюшчыліся самі, і як ні тужыўся ён адчыніць іх — не мог. У вушах стаяў працяжны бразг...

## V

Праз нейкі час Сымонка пачуў над сабою чыйсьці голас, які пытаў:

— Хто ты, малы?

— Я... я Андрэеў...

— Чаго ты сюды папаў?

— Тут бацька мой...

Пяцёра чалавек з вінтоўкамі — два паўстанцы з мястэчка Ступы, а тры чырвонаармейцы — стаялі над хлапчуком, які ад болю шоргаўся па зямлі, і з бацькоўскаю спагадаю суцяшалі яго. Але Сымонка ўжо не чуў іх слоў — памяць пакідала яго.

Не маючы адказу на свае словы, двое стаяўшых каля яго паўстанцаў паднялі Сымонку на рукі і пайшлі з ім да бліжэйшых кусцікаў, дзе асцярожна палажылі яго на зялёную мураўку.

— Ты пабудзь з ім, Сідар, а я пабягу к курганам, пазаву Андрэя, павінен быць з левага фланга,— сказаў адзін паўстанец да другога.

Сідар згодліва кіўнуў галавою, узяў на плячо вінтоўку і паціху затупаў каля Сымонкі, другі хутка, бягом кінуўся праз могілкі да курганоў. Сідар чуў, як ён, адбегшыся мо на гоні, гукнуў: «Андрэ-эй! Андрэй!» — і пахіліўся да хлопчыка, каб зазірнуць яму ў вочы.

Сымонка спакойна ляжаў, як бы без дыху, пабляднеўшы, схудаўшы. Чырвоная, запечаная кроў малюнкавым нарысам засушаных пацёкаў пярэсціла радняныя замурзаныя порткі. Правая рука, зложаная ў жменю, як бы не пускала скатвацца на траву новым каплям крыві.

— Дарма хлапчук прапаў! — парашыў сам з сабою Сідар.— Каб карысць якую зрабіў?! Бацькам гора набыў...

Ён адвярнуўся ўбок курганоў і пільна паглядзеў, зрабіўшы пальцамі казырок над вачыма.

— Не відаць нікога! Дзе ён дзеўся? Пакінуў тут аднаго...

Сідар зрабіў некалькі крокаў узад і ўперад, адцягнуўшыся ў думках зусім на другія рэчы і выпусціўшы з галавы Сымонку.

— Сідар, га, Сідар! — раптам перабіў яго роздум нечы вокліч.

Сідар азірнуўся — то аклікаў яго таварыш.

— Няма, брат, і Андрэя! — матнуў той рукою з нейкім азлабленнем.— Ляжыць вунь пад курганом. Кінуўся, кажуць, пярэднім на польскі раз'езд і адразу ж атрымаў

кулю. Толькі-толькі я паспеў дабегчы. Можа, чуў, як стралялі?

— Ды ўвесь час страляюць... Вось скажы, што з малым рабіць?

— Давай панясем да бацькі! — парадзіў Сідар.

Пачапіушы вінтоўкі цераз плечы, паўстанцы схіліліся над Сымонкам і асцярожна ўзялі яго на рукі.

— А мо ён яшчэ не дайшоў?

Сідар крануў рукою Сымонкавага лба, пасля прылажыў вуха да грудзей.

— Ды ўжо па ўсім. Вечны пакой... Удваіх ляглі за святую справу... Хадзем, брат Сымонка, да бацькі...

Паўстанцы спешна панеслі нежывога Сымонку к курганам.

## ДОЙДЗЕМ, СЫНОК

Паабапал гасцінца, вузкага, заросшага зялёнай мяккаю мураўкай, ляжала неагляднае поле залацістага жыта. Высокія тоўстыя дубцы яго згіналіся да нізу пад цяжарам ядраных важкіх каласоў.

Вузкія высокія межы, густа адзетыя застарэлым дзяцельнікам, засохшым рамонкам і павяўшым цюльпанам ды падушачкамі, разрэзвалі на доўгія стужкі, здавалася збоку, суцэльную непадзельную роўнядзь.

Далёка ад гасцінца, на цэлыя вёрсты вакол, прабягаў узрок людскі, губляючы зялёныя ніткі межаў у гушчы нахіленых каласоў жыта.

У сінім, празрыстым, як шкло, паветры, у нерухомай і спакойнай цішы паўднёвай пары насіліся пад палатном ніў, неўгамонна пеючы, рэзвыя жаўранкі. З гушчару жыта ім адклікаліся крыклівыя перапёлкі ды рэдкія палахлівыя драчы.

Дзесьці там, далёка, у правым канцы гасцінца, чулася пяянне жней. Знаёмыя меладыйныя гукі песень жніва выкікалі з пахучых каласоў жыта, гойдаліся над золатам ніў і, нарэшце напіўшыся паху, змаўкалі ў чыстым паветры, у праменнях сонца.

Іх змянялі новыя, яшчэ болей пявучыя, яшчэ болей звонкія ды радасныя.

Цэлых дзве гадзіны ўжо прайшла паміж сценаў жыта роўным выхілястым гасцінцам Маланка Груд з шасцігадовым сваім сынком Міхалкам.

Яна была стомлена часткаю ад хады, часткаю ад таго гора, якое гнала яе гэтым гасцінцам у чужую краіну,

далёкую ад роднага месца, знаёмых людзей, да няведамае справы, да няяснага жыцця.

За плячыма яе вісеў зашчытнага колеру невялічкі ворачак, напоўнены сякімі-такімі рэчамі; у адной руцэ яна трымала сукаваты аблузаны яловы кій, другою ж вяла за руку свайго сынка Міхалку. Хлопчык стараўся трухаць побач з маткаю, але адставаў, зрываючы між жыта розныя кветачкі. Маланка яго падцягала, азіраючыся разпораз на сынка; Міхалка ўвесь час не сціхаў лепятаць, закідаючы мацеру living рознымі пытаннямі.

Маланка неахвотна адказвала сынку, а толькі час ад часу пытала ад сябе:

— А можа, ты есці хочаш, Міхалка?

Але Міхалка пра яду нібы забыў, а гаварыў зусім аб другім.

— Стаміўся, пэўна, нябожа мой?

І, сказаўшы, спогадна азіралася на сваё дзіця, шэпчучы сабе: «Ці дойдзем мы да якое мэты?»

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

— Адпачынем, сынок,— праказала Маланка да сынка, параўняўшыся з невялічкай, густа заросшай паплавінкай, якая ўдавалася шырокім паўкругам у густое жыта.

Хлопчык нічога не адказаў, як бы не чуючы мацерынага запытання.

Тады Маланка моўчкі звярнула з гасцінца, узышла на паплавінку і прысела. Міхалка спакойна спыніўся каля яе. Маланка зняла з плеч ворак, расцягнула зашмаргу, дастала акрайчык хлеба і два кусочкі сыру, разлажыла гэта на траве і абярнулася да хлопчыка:

— На, еш, Міхалка!

Міхалка прагна прыняўся есці. Маланка ела марудна, раздумваючы: «Колькі хлеба! Які ўраджай у гэтым годзе! Нівы і нівы — бясконца! Спакойнае, стомленае ад цяжару, жыта міла ўсміхаецца тваім вачам. А там ужо, глядзі, і жніво пачалося... Жнуць і пяюць... А вечарам пойдуць дахаты, шчаслівыя, задаволеныя ўраджаем... А я? Што ж я буду ў гэты год жаць?»

Маланка спынілася есці; на яе вачах заблішчэлі слёзы.

«Нашу палоску сажнуць праклятыя паны... Сажнуць, або выпаляць, або вытапчуць... Ды не толькі палоску зглумяць, а і дом увесь зруйнуюць, спаляць ды, чаго добрага, над бацькамі насмяюцца. Эх, паганцы, чаго ім трэба ад нашага краю, ад нас?»

Апошнія думкі Маланка выказала ўчуткі.

Міхалка, дасюль заняты ядою, хутка павярнуўся да мацеры і запытаў:

— Мама, што ты кажаш?

— Наша поле, сынку, вось з гэткім самым пекным жытам сажнуць польскія паны; сажнуць і забяруць сабе на хлеб. Ужо не будзеш ты, каханы, хадзіць з бацькам на малацьбу.

Маланка праслязілася.

— А дзе ж, бок, наш татка, мама?

— У Чырвонай Арміі, сынку.

— Што ён там робіць?

— Ваюе з панамі, сынок. Праганяе іх, разбойнікаў, з нашае старонкі, не пускае іх сюды за намі гнацца.

— А можа, ужо ён дома?

— Не, мілы, ён не вернецца дамоў, пакуль не прагоніць паноў. Паны загарадзілі нам дарогу дадому — трэба зламаць іх загарадзь.

— А куды ж мы ідзём?

— Мы ў чужыну ідзём, сынок, ідзём шукаць сабе часовага скутку.

Міхалка, пэўна, здаволіўся адказам мацеры, бо супакоіўся і адвярнуўся да кветак, якія тут жа збоку паглядалі яму ў вочы.

Змоўкла і Маланка; змоўкла і, забыўшыся аб хлебе ў руках і аб голадзе, які вымусіў дастаць гэты хлеб з ворка, зноў адышла ў думкі і ў нарысы тых абразоў, якія так глыбока адбіліся на яе істоце. Цугам, звязна ўсталі перад ёю: падход палякаў к мястэчку, трэск стрэлаў, грукат гармат, промень пажараў, агульны пярэпалах; далей — уцёкі камуністаў і злыбедна-здавальняючая радасць багацеяў-гаспадароў... Выразна, нібы ўяў, устаў перад Маланкаю гэткі вобраз: насоўваецца цёмная дажджлівая ноч; гудзе па-за вокнамі сярдзіты вецер; свішчуць плакучыя бярозы. Яна, Маланка, сядзіць у хаце, сядзіць пры стале і, аддаўшыся ўсёю ўвагаю, піша ліст да мілага мужа, Нічыпара, які ваюе на фронце з панамі. Старыя бацькі яе спяць, спіць і Міхалка. Сціша ў хаце. Пёрка выводзіць на паперы няроўныя радкі. Словы ліюцца, ліюцца, ліюцца — няма ім канца, няма стрыму. Яе абурае палкае, маладое натхненьне, якое салодкім туманам абдымае Маланчыну істоту... Маланка забываецца, цішэй водзіць асадкаю, адцягае ўвагу ад паперы і накіроўвае прагны ўзрок крыху ўправа, наўкос, дзе спатыкае мілы твар Нічыпара... Нават чуе цёплы подых яго вуснаў... Маланка ўся дрыжыць, але, быццам заварожаная, не

можа паварушыць ніводным суставам... Некалькі доўгіх хвілін яна знаходзіцца ў салодкай напрузе. Далей — не ўтрымлівае і, сабраўшы сілу, хоча падняцца, як раптам яе аглушае страшэнны гук. Маланка ўздрыгвае, як асінавы ліст у дзікі парыў ветру... Звіняць у вокнах шыбы... Разам устаюць усе страхі панскіх гвалтаў, аб якіх ёй пісаў Нічыпар. Енкі, плач мацярок, кроў... Яна ўзіраецца ў акно і бачыць агромністы промень, усё неба ў агні. «Не, я не застануся дома, не! Не дамся на глум панам. Уцяку, уцяку з мілым Міхалкам. Уцяку! Мне нездабраваць, як прыйдуць паны...» Яна паведамляе бацькам сваё рашэнне і следам хапаецца за дзіця. Бацькі пачынаюць угаварваць яе, плакаць, самі не даючы сабе адліку, што пагражае іх Маланцы ад паноў.— Астанься, дачушка,— моліць маці.— Куды ты ў свет з дзіцем? — упікае бацька. Але яна не слухае, паспешна будзіць Міхалку, адзяе яго і, захапіўшы ворачак, прыпасены на ўсякі выпадак, кідаецца з хаты ў цемру ночы. На вуліцы яе падхапляе агульная хваля ўцекачоў і, як трэску, нясе з сабою... Куды? Дзе прыпынак?

— Мама, ідзём далей, ужо супачылі,— катурхнуў мацеру Міхалка.

Маланка ўсхапілася, як са сну, парваўшы нітку думак, і агледзелася вакол: пасля, адчуўшы ў руцэ хлеб, са смакам укусіла яго.

— Хадзем! — настаяў Міхалка, першым выбегшы на гасцінец.

Маланка паднялася, закінула за плечы ворак і пайшла за сынам.

Жоўтыя сцены жыта зноў абнялі іх з бакоў. Таксама стаяла гарачыня; таксама спявалі жаўранкі ды перапёлкі; не заціхалі песні жнеек.

— Ці далёка нам яшчэ ісці, мама? — запытаў Міхалка, адышоўшыся крыху.

— Не так ужо далёка, даражэнькі. Дойдзем, сынок, крапіся крыху,— адказала Маланка, кінуўшы погляд усцяж гасцінца.

## ВІНЦУК АДВАЖНЫ
## (1890—1978)

**Сапраўднае імя Вінцука Адважнага — Язэп Германовіч. Нарадзіўся ён у Гальшанах. Яшчэ ў дзяцінстве ён прачытаў словы Ф. Багушэвіча: «Не пакідайце ж мовы нашай**

беларускай, каб не ўмёрлі!»,— і ўсё сваё жыццё прысвяціў гэтай ідэі.

Скончыўшы ў 1913 г. Віленскую духоўную семінарыю, Я. Германовіч прамовіў па-беларуску з касцельнай казаніцы, а пасля, блаславёны Максімам Гарэцкім на нялёгкае жыццё пісьменніка, выступаў на старонках рэлігійных часопісаў і іншых выданняў. Усё гэта, як і створаная ім у прыходзе беларуская школа, не падабалася польскім уладам. І ксёндз Германовіч вымушаны быў шукаць прытулку ў айцоў-марыянаў. Разам з законам божым і лацінскай мовай Я. Германовіч падаваў дзецям простага люду і сіротам прыклад пашаны да роднага слова. Але ж і айцоў-марыянаў пачалі травіць за беларускую мову, і яны вымушаны былі выехаць ажно ў Харбін. Там Вінцук Адважны выкладаў у гімназіі, быў яе дырэктарам. Туга па радзіме прывяла яго ў Вільню, але праз некалькі гадоў немалады ўжо ксёндз вымушаны быў вяртацца ў Кітай. А неўзабаве, у 1948 г., Вінцук Адважны быў арыштаваны кітайскай міліцыяй і перададзены савецкім уладам. Атрымаў пакаранне на 25 гадоў прымусовых работ у папраўча-працоўных лагерах. У 1955 г. яму дазваляюць выехаць у Польшчу. Адтуль Я. Германовіч праз чатыры гады перабраўся ў Рым, дзе рэдагаваў часопіс «Божым шляхам».

Яшчэ ў 20-я гады Вінцук Адважны стаў вядомым аўтарам у Заходняй Беларусі. Яго гумарыстычныя творы і пацешныя вершы для дзяцей друкаваліся ў тагачасных часопісах, выходзілі асобнымі кнігамі: «Як Казюка сабраўся да споведзі» (1928), «Казюкава жанімства» (1929), «Як Ганула збіралася ў Аргентыну» (1936), «Адам і Анэлька» (1931) і інш. Вядомы былі і яго пераклады казак на беларускую мову («Канёк-Гарбунок» П. Яршова і «Казка пра рыбака і рыбку» А. Пушкіна).

Памёр Вінцук Адважны далёка ад сваёй роднай Беларусі.

## СПРЭЧКА ПАД КАСЬЦЁЛАМ[1]

Сымон. — Скуль вы, паночку?
Пан Яцэнты. — Я — аж з Велькей Околіцы
Дзесенць вёрст од Луконіцы
Я Плавскі з Плавскіх,
Сын Плавскего. А ты скондыць?
Сымон. — Я, паночку,
жыву недалёчку —
Тут у Луконіцы.

[1] Друкуецца ў дарэформеннай (1933 г.) арфаграфіі.

Яцэнты. — *(Да сябе.)* Ага, хлоп! То трудна рада.
*(Да Сымона.)* Цо ту чуваць? Нех пан гада.

Сымон. — Жывём, пане мой, спакойна,
Працавіта, багабойна.
Касьцёл блізка, дык вясёла:
Ходзім часта да касьцёла.
А даўней ня так бывала —
З гакам трыццаць вёрст — бязмала:
Пакуль у Слонім даскрабешся,
Дык начыста падаб'ешся.
Ды ня толькі за дарогу —
За ксяндза тож дзякуй Богу!
І даступны і вясёлы,
І ў касьцеле, і да школы
Прыбягае, дзетак вучыць —
Аж залішне часам мучыць.

Яцэнты. — Хоць вы хлопы, ды палякі,
А тэн ксёндз тут... нейкі, такі,
Цо он гэта... проста мова
Навет хамске ў ёй слова
Зачол мувіць на амбоні.
А няхай нас Пан Буг броні.

Сымон. — Ах, мой міленькі паночку!
Што ж ты валіш як у бочку?!
То ж вы тут не за гарамі:
Мы вас добра знаем самі —
Ні парускu, ці францускu,
Вы ж папросту, беларускu —
Тож гаворыце усюды
*(да сябе)* Не люблю цярпець аблуды!

Яцэнты. — А ты сконд веш, пане?
Хто так муві, кламе!
Мувім тылько в дому
Часэм покрыёму,
До паробка, дзевкі.
Але нашы дзеткі,
Хлопцы маладыя
І мы ўсе старыя
Далікатну мову —
Польскую размову
Так мы палюбілі,
Што, каб нас забілі,
Яе не пакінем!
Хіба перш мы згінем.

Сымон. — Ніхто вас не забівае,
Кожны гэта добра знае,
Што наш край для нас як маці:
Мы жывём у сваёй хаце.
Беларуска наша мова,
Хоць і просты ў ёй словы,
Але родныя і мілы:
Ад калыскі да магілы
Гэтай мовай мы гаворым,
Ці жартуем, пяём, спорым;
На вясельлі ці ў патрэбе...

Яцэнты. — Бракавала яшчэ ў небе!
Ксёндз з навукай выязджае,
Хамску мову ўсюды пхае
І ў касьцеле... то ж адвага!
Гэта ж брыдка, стыд, зьнявага!
І ня бачыць, што-якое —
Гэта ж месца там сьвятое!
Дачакаем яшчэ скора —
Ксёндз да Бога прагавора,
Як той кажа: проста з мосту!
Так, пахамску, ці папросту!

Сымон. — А бадай вам было гола!
Ня ўкусіць ксёндз касьцёла:
А ў небе, мой ты браце,
Мейсца досыць: хваце, хваце!
Знаю я чаго вам трэба:
Тут палітыка — ня неба!

Яцэнты. — Як ты хлоп, то сваё хваліш:
Толькі гэтага ня знаеш,—
Што польска мова далікатна:
Яна ёсьць пекна і прыятна:
Вось як-бы зьеў хлеба са шмальцам!

Сымон. — Ды гэты хлеб для нас з закальцам;
Нам проста мова наймілейша,
У кожнай справе найпярвейша:
Гаворыць ёю кожна матка
Да свайго роднага дзіцятка.

Яцэнты. — Ды ваша мова найпрасьцейша,
А польска дужа шляхетнейша!

Сымон. — Э, што да шляхты — лепш ня рухай,
А калі хочаш, дык паслухай;
Вось вам гісторыя пакажа,
Якраз памоему дакажа:

Што наша мова слова-ў-слова
Была шляхоцка і князёва.
У ёй гаварылі Радзівілы,
І князь Сапега, і вяльможы,
І шляхта ўся, і народ Божы.

Яцэнты. — То мусіць нашай ня ўмелі?

Сымон. — І ня ўмелі й не хацелі!
Ды што таіць! скажу тут сьмела,
Што князь літоўскі, сам Ягела,
Хоць каралём каранаваўся,
Іначай тож не адзываўся,
Як беларускай нашай мовай.
І ў палаце тож замковай
Пабеларуску ўсе пісакі
Лісты складалі там усякі,
Пісалі акты, дакумэнты —
Ці чуеш, васпан, пан Яцэнты?

Яцэнты. — Адкуль ты ведаеш ўсё гэта?

Сымон. — Ў мяне ёсьць кніжкі, ёсьць газэта;
І досыць многа я чытаю,
А як ня ведаю, пытаю.
Ня думай дрэнна пра Сымона:
Я не такі, як... хто — варона!

Яцэнты. — І я тэж ксёнжэк мам досьць веле:
Газэты не мам вось тыкеле.

Сымон. — Каб пан больш думаў і чытаў-бы,
Скарэй-бы праўды дапытаў-бы;
Пазнаў-бы пан, як-то калісьці
Ці для тытулу, ці карысьці
Тут наша шляхта і вяльможы
Стапталі ўсе законы Божы:
Зраклісь ўсяго свайго дашчэнту.
Пайшло вяліка разарваньне,
А ў нас — чужынцаў панаваньне.
Паны згубілі нашу волю,
А мы папалі ў няволю.
Цяпер нас цягнуць за сабою,
Таей дарогаю крывою:
Калечаць нас і мучаць вечна —
Работа гэта небяспечна.
Народ жывы, жывога-ж зьвесьці...
У вас далёка розум гдзесьці!
Дык вось наш ксёндз ў даступнай мове,
У нашым простым, родным слове,

Стаў Бога ўсім людзям тлумачыць:
Што кожна праўда веры значыць,
І як нам жыць, талкуе многа,
І шмат тож іншага такога.
Цяпер мы сталі разьбірацца:
Цаніць сябе і мову родну,
І справу нашую народну.
Кідаем сваркі і лямэнты...
Што-ж ты на гэта, пан Яцэнты?

Яцэнты. — Я тут нічога... То ест — многа
Тут нарабіў ксёндз гэты злога,
Бо народ просты ён бунтуе
І нас вось, шляхту, не шануе.

Сымон. — А што зрабіў ён вам такое?

Яцэнты. — Ну, нібы гэта, нібы тое...

Сымон. — Эх, годзі нам з табой спрачацца;
І мусіць лепей разьвітацца?

Яцэнты. — Мы тэму ксендзу не даруем;
Вось толькі мы яго шкадуем;
А то мы зара да дзекана,
Мы да біскупа, мы да пана
Старосты пойдзем, як захочам.
Мы хоць куды, як трэба, скочым.

Сымон. — Так, так, вы добры! Пажалелі...
Бадай вы тое сама зьелі!

Яцэнты. — Што, можа мы малыя дзеці?
Мы будзем так сабе сядзеці —
А тут тымчасам важна справа!
Якое ксёндз тут мае права,
Каб мову простую, паганску,
Ў касьцёл уносіць? ды пахамску
Каб нас вучыць? а мы ня хлопы!

Сымон. — Та, так — разумны! з Эўропы
Вы самы, самы наймудрэйшы!

Яцэнты. — Хто-о?

Сымон. — Вы, шляхцюры ўсе тутэйшы!
Толькі-ж вы крышачку лянівы,
Як той жыдоўскі конь фальшывы:
Падскочыць ўгору і асядзе,
Хоць кол ламі яму на задзе.

Яцэнты. — Мы на ксяндза, хоць шкадавалі,
А ўсё-ж, гдзе трэба, напісалі.

Сымон. — Але-ж ён шляхты не баіцца!

Яцэнты. — Ды мы гатовы хоць пабіцца!

Сымон. — Як-та — з ксяндзом? і гдзе — ў касьцеле?

Яцэнты. — А нам ўсё роўна: вось тыкеле,
Каб на сваім ўсё-ж паставіць —
І, як захочам, дзела справіць.
Мы яму зробім яшчэ штукі:
Якраз падловім ў час навукі —
Ў запас людзей з сабою клікнем,
Як запяём, а посьле крыкнем...

Сымон. — Ну, а як гэта не паможа?

Яцэнты. — Э, кожны штось ў кішэнь паложа...

Сымон. — То ж ты казаў — касьцёл шануеш?..

Яцэнты. — Цяпер кажу, ці добра чуеш?
Табе сказаў я пад сакрэтам,
Дык данясі ксяндзу аб гэтым:
І спаць у шапку мы ня будзем!
Што падпісалі, то здабудзем!

Сымон. — О, знаю, так — паны вы важны!
Вы пры бутэльцы тож адважны,
Як памагчы, дык вы тагды калекі.
А як захочаце пашкодзіць,
Ці ашукаць каго, сазводзіць —
Тагды вы першы.

Яцэнты. — Што ты кажаш?

Сымон. — А што на гэта мне адкажаш?

Яцэнты. — Мужык ты, хлоп ты, дурань, хаме!
Няма больш дружбы паміж намі.
Ты што язык свой распускаеш?
Я шляхціц, хлопе ты, ня знаеш?
О, мне юж дзісяй досыць тэго —
Я Плавскі з Плавскіх — сын Плавскего!
*(Выходзіць.)*

## II

Сымон. *(Паківаў галавой у старану Яцэнтага, кажа ў старану публікі):*
— Гавары з кабылай пацеры!..
Што тут памогуць аргумэнты,
Калі дурны сам пан Яцэнты!
*(Задумаўшыся, ходзіць па сцэне.)*
— Але-ж, мой моцны, добры Божа!

Чаго-ж людзкая злосьць ня можа?
А мы з святою справай нашай,
Як тыя скваркі — зьесьці з кашай
Даёмся, навет і ня спорым —
Вось толькі часам пагаворым,
Ці паклянём, ці пабядуем,
Або і так, як-бы ня чуем...
А кругом нас ўзяліcь за рукі
І сталі нам даваць навукі,
І б'юць па носе, колькі ўлезе,
Як той каваль ды па жалезе.
Ўсе праціў нас, а гдзе прычына?..
Ты, Беларусь — мая Айчына!
*(На адным калене; правая рука ўгару, да публікі.)*
— Цябе, цябе ў сэрцы маю,
Табе я вернасьць прысягаю!
Ня марны толькі дам я словы,
Але жыцьцё аддаць гатовы!
Ты — Беларусь, Айчына, Маці,
Прымі прысягу ад дзіцяці!
*(Устае. Адмахвае рукой.)*
— Далоў, далоў усе спакусы!
Мы людзі тож, мы Беларусы.
Ня будзем-жа ўсьцяж баяцца:
Пара, пара за дзела брацца!
*(Аглядаецца.)*
— Ага, вось нехта йдзе сюды.

III

Сымон. — А вы, паночку мой, куды?
І з нейкай доўгаю паперай,
Так позна — а гадзіне шэрай?
Валенты. — Ах, міленькі браток, Сымоне!
Патрэба, бачыш, мяне гоне.
Інтэрас гэты вельмі пільны —
Мы пасылаем аж да Вільні,
Каб згэтуль ўзяць ксяндза такога,
А нам прыслаць скарэй другога.
Да эксцэленцыі біскупа...
Сымон. — Эх, доўбні вы, а васпан — ступа!
І чым ксяндзок наш вінаваты?
Запрацаваны і заняты:
Усё, як трэба адпраўляе,

Касьцёл, будынкі папраўляе,
І сам ахвярны, небагаты;
Заходзіць проста к нам у хаты...

Валенты. — Якраз вось гэта непатрэбна!
Бо мова хамская — ганебна.
А тут сам ксёндз у ёй гавора.
Так мне казалі шляхты ўчора.
Вазьмі, браточак, падпішыся.

Сымон. — Ці я здурнеў? лепш адчапіся.
Тут наша мілая Айчына.

Валенты. — Скажы, каторая гадзіна?
Бо, відзіш, вельмі я сьпяшаю:
Яшчэ аблётаць многа маю.

Сымон. *(Да сябе.)* Каб ты лятаў наперад задам!
Вось гаварэце з такім гадам!

Вінцэнты. — Пан нешта кажаш, мне здаецца?

Сымон. — Я віджу — наша згода рвецца.
Але-ж падумай, будзі ласкавы!

Вінцэнты. — Але-ж я думаць не цікавы!
Як не падпішаш, тагды годзе —
Па нашай дружбе і па згодзе!

Сымон. — Таксама плачу я праз гэта,
Як па тым сьнезе серад лета.
Калі, пан, розум яшчэ маеш,
Паслухай. Што-ж ты мне мяшаеш?
Дапраўды, стыдна вам чапіцца:
За што гразіць, за што тут біцца?
Мы тут жывём ў адным народзе:
Дык можам жыць у мілай згодзе.
Вы — шляхта, добра — няхай будзе.
Але-ж і шляхта так-жа людзі.
Мы людзі прosты, што-ж за дзіва?
Мы любім «проста», а вы — «крыва».
Я тож разумных шляхтаў знаю,
Жывуць між вамі, ў гэтым краі,
Што любяць родную Айчыну.
Знаў я такога малайчыну:
Быў ён праўдзівы патрыёта.
Ды ёсць, сказаць-бы так — балота.
Што вось — крычаць, пісаць ці юдзіць,
Ці справу чыстую забрудзіць —
Усюды першыя даскочаць.
І тут згубіць ксяндза нам хочуць,
Пабачце, што натура кажа,

Што зьвер, што птушка нам пакажа:
Усе, як ёсьць, свой голас маюць
І згодна між сабой гукаюць;
І так вучымося з прыроды
Любові добрай, так-жа згоды!
Што маеце да нас, скажыце,
Нам наша права ўступіце,
Тагды зьбяромся, разам сядзем
І пагаворым і парадзім —
І створым так адну сямейку,
Бяду прагонім ліхадзейку...

Валенты. — Гадоў за тысяч будзе,
Як мы жывём у Прудзе.
Ніколі-ж мы ня сьнілі,
Аж да апошняй хвілі,
Каб ксёндз наш каталіцкі —
Наш пробашч Луконіцкі —
Пакінуў мову польску!
Каб навет паяпонску
Ён стаў казаць навуку,
Дык я на гэту штуку
Сапраўды менш дзівіўся-б;
А так я з толку зьбіўся.

Сымон. — Ня трэба таго баяцца,
А лепш за розум ўзяцца;
Бо справа вельмі ясна:
Старонка тут няшчасна —
Былі тут бітвы, войны —
Народ ціхі, спакойны,
Ён сам сябе баяўся;
Усіх кругом стыдаўся.
І мы вось разарваны:
Вы — важны «мосьці паны»,
Мы страцілі, што мелі —
Схлапелі, апрасьцелі.
Аднак згадзіцца можна.

Валенты. — Эй, браце, асьцярожна!

Сымон. — Пара нам спрэчкі кінуць.

Валенты. — Яна павінна згінуць!

Сымон. — Хто?

Валенты. — Гэта мова проста.

Сымон. — Чаму-ж?

Валенты. — Казаў староста,
Што ксёндз ня мае права.

Сымон. — То ўжо пачата справа?

Валенты. — Я толькі з інтарэсам —
Прасіў на хату лесу.
Ён клікнуў мяне ў хату,
Прынёс на стол гарбату:
Сам служыць, вельмі просіць.
Я піў, аж покуль досыць.

Сымон. — Ну, гэта нам ня дзіва,
Што сьляпы ходзіць крыва:
А воўк ягнё як сьвісьне,
Дык бедна ані пісьне...
Аднак вось наша мова —
Нам ясна кожна слова.
А ксёндз, так як дзіцяці,
Талкуе, так як маці.
Гаворыць нам аб Богу
І простую дарогу
Да неба нам пакажа.
Ніхто так не дакажа!

Валенты. — Эй, не кажы мне болей!
Як ня было ніколі,
Так і цяпер ня будзе,
Пакуль жывём у Прудзе!

Сымон. — Чаму-ж пан так праціўны?

Валенты. — Парадак гэты дзіўны,
Што ксёндз завёў ў касьцеле,
Для нас як горка зельле,
Ніяк прыстаць ня можа.
Ратуй нас, Пане Божа!

Сымон. — Пан розуму ня маеш:
Ў касьцеле не бываеш,
Дык мы дарэмна спорым.
Мы посьле пагаворым,
Як васпан сам пачуеш,
А так дарэмна злуеш.

Валенты. — О, я да касьцёла скоры,
Ды быў я ўчора хворы.

Сымон. — Як-то, учора,— кажаш?
Ты праўду з фальшам вяжаш —
Ты-ж быў учора п'яны!

Валенты. — Я быў у сьведкі званы...
Ды досыць, адчапіся!
Вось лепей падпішыся.

Сымон. — Дык пакажы-ж мне бліжай!
Сюды дай! крышку ніжай...
Цяпер вось добра будзе...
*(Хватае паперу і рве.)*

Валенты. — Што робіш? гвалту, людзі!
Сымон. — Вон, прападзі ты, Юда!
Ты фарызэуш, ты паскуда...
*(Выпіхае са сцэны.)*

IV

Іначай тут ня можна
Тлумачыў яму розна;
Аднак тут справа ясна —
Бліжэйша скура ўласна...
Айчына дарагая!
Ты для мяне сьвятая:
І наша мова родна
І справа тож народна.

## ПЕРАПІСЬ У ВЁСЦЫ ЛУКОНІЦЫ 1921 г.

Хоць пішы бясконца
Ў нашае старонцы,
Беларусь святая —
Сэрцу дарагая!
Ранняю вясною
Вольнаю парою,
Зноў спісак рабілі,
Ў палякі хрысцілі.
Панок нейкі старшы,
З сабой дзеўку ўзяўшы
І папераў многа,
Выбраліcь ў дарогу.
Вось той пан на Прудзе
Крышку больш марудзе —
«Луконіца Велька»,
Пані «вучыцелька»
Чуць не абамлела:
Есці захацела:
«Трэба нам старацца —
Да ксяндза дабрацца!»
Чаму мала маюць,
Скоранька пытаюць:
Кожны з нас баіцца,
Каб не памыліцца.
Перш ад парасяці
Сталі пачынаці,

Пісáлі цяляты,
Потым маму й тату.
У гэтакім паспеху
Шмат было і смеху;
Бабы, як авечкі,
Пачалі тут спрэчкі.
«Што мне твая вера!»
«Ты маўчы, халера!»
«Мая вера руска!»
«Твая ніўка вузка!»
Вось жа дзеўка тая
Сто разоў пытае,
Піша вельмі скора,
Дробненька гавора:
«Нехай кужны слуха,
Нех наставі уха:
Я вам муве пшеце,
А вы ніц не веце...»
Пан той хоць цярплівы,
Што аж людзям дзіва,
Ды тут не стрымаўся —
Ўзяў ды раскрычаўся.
Рылка і Махначы
Пісаў кожны іначай;
Латось — беларусам,
Як бы пад прымусам.

Шылка водзіў-модзіў,
Другу рэч заводзіў,
Ў вёсцы наймудрэйшы,
А пісаў — «тутэйшы».
«Пан Чуйкевіч які?
Ці то у палякі,
Ці у беларусы
Пісаць пана мусім?»

«Пішы, пан, як знаеш —
Болей панімаеш!»
Той, як гэта слыша,
У палякі піша.

«Ну, а пан Кудзелька,—
Кажа «вучыцелька»,
З якога заводу,
З языка, народу?»
«Відзіш, проша пані,
Мы не знаем самі:

Гэта лепш чым тое?
Мусіць, дрэнь абое?!»
«Як, пан, смеш абражаць!
Трэба лепш уважаць,
Бо тут кужнэ слова
Естесь ужэндовэ».
Янка тут вялікі,
Той, што «без'языкі»,
Кажа: «Проша пана,
Можа, заўтра зрана?..
Бо я, так прызнацца,
Вельмі стаў баяцца:
Нашто пішаш статкі —
Можа, на падаткі?»
Янка тут варожа
І згадаць не можа:
Ці скацінку збольшыць,
Ці зямельку зменшыць?..
Як прыйшло да рэчы,
Крычыць жонка з печы:
«Будзь паляк, як людзі,
Інакш — дрэнна будзе!»
Янка стаў круціцца —
Сам сябе баіцца:
Лжэ ён, аж канае
І канцы хавае.
А вось «паляк» новы —
Парабак Драздовы!
Пpыламаўся ў войску
Гаварыць па-польску.
Тут прыгода нова:
Цялё Петрукова
Неяк памяшалі —
Ў палякі пісалі.
Ксёндз наш не замяўся —
«Беларус» пісаўся,
Ён не памыліўся,
Бо такім радзіўся.
Напісаўшы сыта,
Паскладалі квіты;
Рушылі ў дарогу,
Дзякуючы Богу.
Шчыра падлічалі
Тых, што запісалі,
Палякоў — ці трусаў —

Больш, як беларусаў.
Праўда ці трафунак*,
Заўтра быў рахунак:
«Луконіца — вёска»
Праз ноч стала «польска»!
Вось жа, моцны Божа!
Хто нам тут паможа?
Бо мы бачым самі —
Бараны часамі...

## КАЗІМІР СВАЯК
## (1890—1926)

Казімір Сваяк (сапраўднае прозвішча Кастусь Стаповіч) нарадзіўся ў вёсцы Барані Свянцянскага павета ў сям'і сялян-паўвалочнікаў.

У 1900 г. Казімір паступіў у гарадскую школу ў Свянцянах, якую скончыў у 1905 г. Пасля гэтага К. Сваяк прыбывае ў Вільню і рыхтуецца ў духоўную семінарыю. Тут упершыню пазнаецца ён з беларускім адраджэнцкім рухам, супрацоўнічае з «Нашай нівай».

У 1912 г. К. Сваяк піша свой першы верш па-беларуску — «На імяніны майго пробашча». Затым з'яўляюцца і іншыя яго вершы на роднай мове. Адначасна з вершамі часопіс «Беларус» друкуе рэлігійныя артыкулы Казіміра Сваяка, а таксама публіцыстычныя артыкулы на грамадскія тэмы.

З маленства ён палюбіў родную мову, а пазней стаў актыўным яе прапагандыстам. У сваім дзённіку Казімір Сваяк піша: «Буду пісаць па-беларуску. Мова беларуская ёсць гладкай і зручнай: можа служыць і да паэзіі...» У 1915 г. ён спрабуе беларускую мову заводзіць і ў казаннях у касцёле. На каляды ў 1915 г. пад кіраўніцтвам Сваяка былі арганізаваны беларускія настаўніцкія курсы, а праз год адкрылася сем беларускіх школ. У тым жа годзе Казімір Сваяк заснаваў арганізацыю беларускай моладзі пад назвай «Хаўрус Сваякоў» (CHS). Праца ў гэтай арганізацыі, у якую ўваходзілі касцёльны хор і сцэнічна-драматычная група, была для яго вельмі дарагой справай.

Усё сваё свядомае жыццё Казімір Сваяк працаваў на ніве беларускай літаратуры і пакінуў даволі значную літаратурную спадчыну. Яго паэзія разнастайная і багатая.

**Галоўныя матывы і мэта творчасці К. Сваяка — пошукі ў паэзіі сэнсу жыцця.**

**У красавіку 1926 г. пісьменнік захварэў на сухоты, а праз месяц памёр.**

## БРАТУ НАСТАЎНІКУ

Ці ў долі, ці ў нядолі
Не гаруй, брат, аніколі.
Даў Бог хлеба, дасць і неба,
Дасць усенька чаго трэба.

Не сумуй, хоць льюцца слёзы,
Будзь і смелы, і цвярозы:
Вер, што Беларусь устане,
Згіне хітрых панаванне.

Духам глянь кругом — наўкола:
Закрасуе наша школа.
Роднай мовай, родным чынам
Аджывець наш бедачына.

## НЕ ЧАРУЙ

Не чаруй мяне ты зорам,
Не чаруй красой.
Не чаруй сваім ты горам,
Не чаруй слязой.
    Не чаруй ядвабнай коскай,
    Ні вуснаў агнём.
    Не чаруй усмешкай боскай,
    Ні святым жыццём.
Не чаруй дзявочым станам,
Не чаруй грудзьмі.
Каб не быў я пакараным
Богам і людзьмі.

## ЗАГЛЯНЕ СОНЦА...

Загляне сонца ў наша аконца,
Хатку асвеціць праменьмі —
На цёмнай ночы ажывіць вочы
Боскім да працы натхненнем.

Позна мы ўсталі і шмат праспалі,
Гойдалі злыдні нам долю —
Пяялі песні нат напрадвесні,
Радасці песню ў няволі.

Захад смяяўся, каб ён дачакаўся
У лапцёх, што з труду мы спалі,—
Усход нас лучыў цяжка-балюча,
Хацеў, каб з душой мы прапалі.

Абы балоты, будзе ліхота,
Дзёрлі нас нянькі-начніцы —
Аж да жывога — мо з волі Бога
Кроў аж зрасціла зямліцу.

Аж застагнала зямля ў падвалах,
Неба пакрыў бляск агнёвы —
З болю зямліцы, з крыві крыніцы
Брат наш збудзіўся русьняны.

Асвеціць сонца яго аконца,
Злуду мар сонных развее —
І выйдзе з плугам ён саматугам,
Родненьку ніву засее.

Груган з Усходу, а крук з Заходу
Дарма там жыру шукае —
Бо зрэе спорна, у волю прасторна,
Хутка пад неба ўзрастае.

## ШЧАСЦЕ

Птушынцы да шчасця — вольнасці трэба,
Да шчасця краскі — яснага неба;
Дзіця шчасліва — на руках маткі,
Бяздольны рвецца — да цёплай хаткі.

Мудрага шчасце — веры шуканне,
Шчасце паэта — шчыра каханне,
Струджаным думкам — трэба спачынку,
Сэрцу збалеламу — вясны ўспамінку.

Для ўсіх жа людцаў, дзе ёсць іх колькі,
Аднаго трэба на свеце толькі —
Без чаго свет наш — блудна дарога:
Усім да шчасця патрэба Бога.

# СЯРГЕЙ ПАЛУЯН
# (1890—1910)

Сяргей Палуян нарадзіўся ў Брагіне, у мнагадзетнай сялянскай сям'і. Маленства будучага пісьменніка прайшло ў Крычышчах. Тут ён назаўсёды палюбіў родную прыроду, мову, на якой размаўлялі бацькі, просты працоўны люд.

Адукацыя Сяргея Палуяна пачынаецца з Мазырскай шасцікласнай гімназіі. Неўзабаве бацька забірае яго з Мазыра і адвозіць у Прыбалтыку, у Мітаву, дзе працуюць гімназічнымі выкладчыкамі два дзядзькі Сяргея.

З пачатку рэвалюцыі 1905 г. Епіфан Іванавіч Палуян зноў забірае сына дадому. Тут паміж сынам і бацькам усё часцей адбываюцца сваркі з-за супрацьлегласці ў палітычных поглядах. Сяргей пакідае сям'ю, пакідае Крычышчы.

Ён едзе ў Кіеў. Пачынаючы з восені 1908 г. Сяргей спрабуе свае сілы ў літаратуры, адразу ж дасягаючы значнага творчага плёну.

Аднак хутка пачынаецца паласа рэакцыі. Да таго ж стала здаваць здароўе. Тады ён вырашае паехаць у Вільню — туды, дзе выдаецца беларуская газета, дзе жыве Янка Купала.

Працуючы ў «Нашай ніве», Сяргей сышоўся з Янкам Купалам і стаў яму блізкім сябрам. Газета змяшчае яго артыкулы. Увосень 1909 г. у Вільню прыязджае Цішка Гартны, з якім Сяргей Палуян таксама пасябраваў.

З-за дрэнных адносін з «вярхушкай» рэдакцыі «Нашай нівы» пісьменнік зноў апынуўся ў духоўнай адзіноце. Грамадская атмасфера, рэдакцыйныя звады забіралі апошняе здароўе, якое так падточвала матэрыяльная нястача. З рослага, здаровага хлапчука Сяргей ператварыўся ў худатварага, з глыбока ўпалымі вачыма юнака. У пачатку 1910 г. ён зноў выехаў у Кіеў і там у ноч з 7 на 8 сакавіка таго ж года пакончыў жыццё самагубствам.

Горкім смуткам адазвалася смерць Сяргея Палуяна ў сэрцах тых, хто яго блізка ведаў.

## ВЁСКА

Вырублены лес з адной стараны, балотныя сенажаці з другой. Пасярэдзіне маленькі шматок поля. Сярод поля прытулілася вёска. Праз вёску дарожка — трусіць карэннем у лесе і калдобінамі грэблі на балоце. Грэбля старая,

ужо распаўзаецца на бакі, засыпае канавы. Канавы загніліся, як кілімам пакрыліся зялёнай макрыцай. Жабы крэкчуць вечарамі ў загніўшай вадзе.

Дарога ў лес, дарога ў балота. Вясёла перабягае зялёную ярыну і пажоўклае жыта невялічкага поля. Курыцца пылам у вёсцы і ізноў адным канцом у лес, другім у балота. Моцнай пятой зацiснула вёску паміж лесам і балотам.

Лес і балота. Невялічкі шматок поля. Вёска, як сірата, прытулілася сярод пясчанага поля. Ні ярына, ні жыта не красяць яе.

Выпаўзла на ўзгорак і грэецца ў гарачым сонечным свеце. То той, то другі бок падстаўляе яркім праменням. А бакі чорныя, струхлеўшыя. Парахня сыплецца са сцен, мох паўсыхаў на стрэхах. Гніе вёска ў гразі і брудзе, а хоча яшчэ аджыць на сонцы.

Здаецца, не аджыве, бо ўжо гнілым трупам вее ад яе. Смерць захавалася ў струхнелай капліцы на могілках іківае на яе пальцам. Ад пальца бяжыць цень доўгай хмаркай па сінім небе. Вось набегла на сонца і саўсім закрыла яго. Відаць, трэба памерці вёсцы. Яшчэ больш счарнеўшай выглядае яна без сонечнага свету поруч з жаўцізной жыта ды зелянінай ярыны.

Канец прыйшоў вёсцы, а няма каму абараніць яе. Усё жывое парасходзілася па палях ды па сенажацях, па лесе. На сонечны свет, на вольнае паветра. Вёска адна засталася канаць у сваім брудзе.

Вочы яе ўжо даўно патухлі. Але яна яшчэ міргае імі, хоча ўгледзець сонечнае святло. Можа, тое святло аджывіць яе. Шмат у якіх шыбах няма шкла, яны пазатыканыя анучамі. Але тымі, што яшчэ засталіся цэлыя, яна паварьтаецца да сонца. Сонечнае святло бледна адбіваецца на іх, мутным бляскам адсвечваецца. Вочы вёскі ўжо загніліся, зацвілі плесняй. Міргае яна імі, нічога не бачачы. Але смерць адчувае. Баіцца яе. А ў старое сэрца сцішна прабіраецца слабая надзея. Вёска марыць і марамі хоча адагнаць ад сябе здань смерці.

— Скора міне лета, адыдзе і мокрая слізкая восень. Прыйдзе зіма. У яркую белую апратку прыбяруцца палі, і балоты, і лес. І я разам з усімі ў яе ўбяруся. Захаваю пад белым снегам свой бруд, буду выглядаць такой чыстай, пекнай, памаладзеўшай. Для мяне навозяць з лесу свежых бярвенняў, ажывяць мяне. І на вясну я буду выглядаць такой белай, так буду адрозніваццa ад цёмнага лесу і ад іржавага балота. І сонца тады не будзе хавацца

ад мяне. Будзе грэць мяне, лашчыцца, як да маладой прыгожай дзяўчыны.

Марыць вёска, а смерць калышацца ад смеху ў старэнькай каплічцы. Шчэрыць зубы ды ізноў сухім пальцам ківае на вёску.

Новая хмарка паплыла па небе. Вецер узняўся ад ківу сухога пальца і пабег дарогай. Спаткаў вёску на сваім бегу, абняў яе і закружыўся ў дзікім танцы. Смерць глядзела на ўсё гэта з капліčкі і калыхалася ад смеху.

Вёска з усіх сіл выбівалася з абоймаў смяротнага ветру, але не мела сілы выбіцца. Вецер круціўся вакол яе, круціў і яе разам з сабой. Танец рабіўся ўсё больш страшным.

Ад танца ўзняўся пыл і калыхаўся ў паветры. То вецер у танцы махаў кадзілам. Дым ад ладану хвалямі плаваў над вёскай, абкурываў яе скананне.

Смерць стаяла ў струхлеўшай капліčцы і ківала пальцам.

Новыя і новыя хмары паўзлі па небе, ветры беглі і беглі на вёску з старой капліčкі. Пыл круціўся на вуліцы.

Смерць ківала пальцам, і хмары абляглі ўсё неба. Пыл укрыў вёску. Халодныя каплі падалі з неба. Мяшаліся з пылам і бруднымі пацёкамі аблівалі вёску. То смерць халоднымі слязамі плакала ад смеху. Нівы зелянелі, а лес пахмурнеў. Хістаў галавой і нешта шаптаў. Ціхім шумам жаліўся некаму аб смерці вёскі.

Яму было шкода старой суседкі. Ён ведаў, што чарада прыйдзе і да яго. Панаходзяць чужынцы і зніштожаць і лішкі былой красы. Адны пні ды нізкі хмызняк будуць успамінкам аб вялікім лесе.

Халодны подых дайшоў да яго. Ён азірнуўся. З капліčкі глядзела на яго смерць і ціха смяялася.

Лес перастаў шумець пад яе поглядам і схінуў галаву. Лісці пачалі кружыцца ў паветры і ўсцілаць зямлю.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Канаюць вёскі і лясы забранага краю.

## ХРЫСТОС УВАСКРОС!

...Хрыстос уваскрос!

З вялікім святам адвечнага аджыўлення віншую цябе, Вялікі Беларускі Народ!

Гэтай вялікай ночы страсі з сябе ўсю пагарду, увесь бруд, каторым аблепліваюць цябе ад вякоў. Чыста вымыйся, прыбярыся ў найлепшую апратку, каб хоць на

адзін дзень стаў ты роўным з усімі. Ідзі туды, дзе пачуеш гэтыя вялікія словы:

— Хрыстос уваскрос!

Услухайся ў іх. Якая вялікая сіла, які ўсёажыўляючы змест захованы ў іх. Ці не чуеш, як радасцю надзеі, радасцю скорага ўваскрэсення вее на цябе ад гэтых слоў:

— Хрыстос уваскрос!

Радуйся, мой родны край. Надзея, як жывучая вада, ліецца ў тваю душу. Скора і ты ўваскрэснеш ад доўгага мёртвага сну. Вясна прыйшла і да цябе.

— Хрыстос уваскрос!

Над ім здзекаваліся. Яго білі па твары, сцябалі бізуном. Плявалі на яго. Кпілі з яго. У канцы распялі і распятага не пераставалі мучыць. Спечаныя смагай вусны звільжывалі воцатам і жоўцю. Ён памёр на крыжы паміж двух разбойнікаў. Але ўсё ж ткі:

— Хрыстос уваскрос!

Уваскрос Хрыстос, і крыж, раней знак пагарды і сораму, зрабіўся святыняй усяго свету. Мукі Хрыстовы змылі ўсё з яго. І штогоду вялікай вясенняй ночы тысячы цэркваў і касцёлаў свеціцца агнямі свечак, ліецца радасны пераклік званоў, крыж падымаецца над мільёнамі схінёных галоў і ў паветры носіцца радасны шэпт:

— Хрыстос уваскрос!

Што гавораць табе званы, Беларускі Народ? Ці не віншуюць яны цябе і з тваім уласным вялікім святам? Скора ж і ты ўваскрэснеш!

Ад вякоў пагарджалі табой, тваёй мовай; ад вякоў мелі за быдла, годнае толькі на цяжкую, надсільную работу. Не давалі табе расці і развівацца. Воцатам чужой культуры звільжалі твае спячоныя смагай свету вусны. Лепшых тваіх сыноў адрывалі ад цябе, прымушалі іх зрабіцца здраднікамі. А цяпер пышаюцца імі, называюць іх сваімі. І яны так іхнія.

А хіба ж яны не любілі цябе? Хіба лепшы жар свайго сэрца афяравалі яны не табе? А гдзе яны?

Іх няма з табой. З самага малку адарвалі ад роднай глебы, атруцілі здрадай. І іх, тваіх дзяцей, маюць за зброю проці цябе.

Цябе катавалі. Ты цярпеў мукі, але не ўмёр. Глыбока, глыбока ты захаваў сваю душу.

Хрыстос быў з табой у тваіх муках; і ён разам з табой цярпеў іх. Колькі разоў распіналі яго разам з табой! Больш разоў, чым ёсць пясчынак на дне мора! Але кожнага году па ўсёй Беларускай зямлі разносіцца кліч:

— Хрыстос уваскрос!

...І ты ўваскрэснеш, мой родны край! Скінеш з шыі ярмо адвечнага гора і нуды.

Дагэтуль мы плачам, дагэтуль мы стогнем,
Адвечных не можам пазбыціся слёз...

Ты ўжо перастаеш плакаць. Ты падняў свой твар, з надзеяй ловіш зыкі званоў:

«Бом! бом!.. Прачынайся ад сну, Беларусь! Годзе стагнаць ды жаліцца, жальба нічога не дасць табе. Уставай! Ідзі будаваць зруйнаваную бацькаўшчыну!»

Наперад па шчасце! Хай злое ўсё дрогне!
Вясна ўжо на свеце — Хрыстос уваскрос!

Я бачу, як святлее твой твар, мой родны краю. І, поўны сілы і веры, я крычу ва ўсю моц тваім нівам, лясам і балотам, тваім панурым вёскам, тваім пакрыўджаным сынам:

— З вялікім святам віншую! З вялікім святам, Вялікі Беларускі Народ!

— Хрыстос уваскрос!

## КАЛІ ДРУКАВАЛАСЯ ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ «БІБЛІЯ»?

Першай друкаванай кнігай была «Біблія» Гутэнберга — гэты ж самы Гутэнберг першы і выдумаў друк, а да яго кнігі былі пісаныя рукой. Выдрукаваў ён гэту першую кнігу ў 1455 г. у горадзе Нюрэнбергу.

У беларускай мове пачалі друкавацца кнігі ўжо на 28 гаду пасля Гутэнбергавай «Бібліі», спярша глаголіцай, а праз 10 гадоў і славянскімі літарамі (кірыліцай).

У заходняй (белай) Русі асвета, як на тыя часы, стаяла вельмі высока; патрэба друкаванага слова была такой вялікай, што заходнерускія лепшыя людзі, каб здаволіць духоўныя патрэбы свайго краю, залажылі друкарню. Першая беларуская друкарня была заложана ў Кракаве. І ў 1483 г. выйшла з гэтай друкарні першая беларуская кніга «Триодь цветная», а ў 1491 г. друкавалася ў Кракаве ўжо другая беларуская кніга «Октоих».

Першая польская друкарня была заложана такжа ў Кракаве ў 1505 г., як бачым, праз 22 гады пасля надрукавання першай беларускай кнігі.

З славянскіх народаў першыя друкавалі «Біблію» чэхі ў 1488 г.; другая з чарады «Біблія» беларуская друкава-

лася ў 1517 г. у Празе, трэцяя — украінская — у 1555 г., а чацвёртая — польская «Біблія» — друкавалася ў 1561 г. у Кракаве; літоўская «Біблія» друкавалася ў 1590 г. у гор. Кенігсбергу, латышская ў 1587 г. у Рызе.

Першая беларуская «Біблія» ператтлумачана была з лацінскай мовы на беларускую Францішкам Скарынай з Полацка. Францішак Скарына маладым хлапцом прыбыў з Полацка ў Вільню, каб прыдбаць сабе навукі. Праз сваю здольнасць звярнуў увагу людзей багатых, каторыя і заапекаваліся ім; больш за ўсіх цікавіўся Скарынай бургамістр (галава) віленскі Якуб Бабіч.

Калі Францішак Скарына скончыў навукі ў Вільні, Бабіч сваім коштам паслаў яго вучыцца вышэйшых навук у Кракаўскую Акадэмію. У Кракаве Скарына атрымаў ступень доктара медыцыны і штук пекных. Высокія навукі Скарыны і абшырнае веданне звярнулі ўвагу беларускіх вяльмож, каторыя шукалі тады чалавека, знаючага вышэйшыя навукі, каторы падняўся б перакласці «Біблію». Скарына згадзіўся на гэтую вялікую працу і праз колькі гадоў даканаў яе. Відаць, тагачасная Кракаўская беларуская друкарня была замалая для друкавання «Бібліі», дзеля таго Скарына паехаў друкаваць яе ажно ў Чэскую Прагу, дзе і пачаў друк у 1517 г., а працаваў там да 1520 г. Тым часам у Вільні стараннем таго ж Бабіча заложана была вялікая друкарня. Тады Скарына вярнуўся ў Вільню і тут ужо дакончыў друк «Бібліі» ў 1525 г.

Апроч «Бібліі», Скарына выдаў колькі другіх яшчэ кніжак: «Канонік», «Псалтыр» і інш.

## МАКСІМ БАГДАНОВІЧ
## (1891—1917)

**Максім Адамавіч Багдановіч нарадзіўся ў Мінску. Калі яму споўнілася пяць гадоў, яго бацька — вядомы беларускі этнограф, фалькларыст і мовазнавец, пераехаў з сям'ёй у Ніжні Ноўгарад, затым у Яраслаўль. Там Максім вучыўся ў гімназіі, скончыў ліцэй. Родную мову вывучаў па беларускіх народных казках, легендах і паданнях, што расказвала маці. А крыху пазней — па кнігах з бацькавай бібліятэкі, якая была надзвычай багатая і разнастайная. Самастойна вывучаў замежныя мовы, філасофію, славеснасць. Добра ведаў нямецкую і французскую паэзію, чытаў старажытнагрэчаскіх і лацінскіх паэтаў, а затым перакладаў іх на беларускую мову.**

Шмат што цікавіла Максіма Багдановіча, але, бадай, найбольш — родная Беларусь. Удалечыні ад Радзімы ён пранікся любоўю да свайго працавітага народа, яго гісторыі, да хараства беларускай прыроды.

І вось семнаццацігадовы юнак гэтыя цёплыя і светлыя пачуцці пачынае выказваць у вершах.

Паэзія Максіма Багдановіча цесна знітавана з вуснай народнай творчасцю, з міфамі, песнямі, фальклорнымі вобразамі і сюжэтамі («Вадзянік», «Лясун», «Змяіны цар», «Максім і Магдалена», «Страцім-лебедзь», «Лявоніха»).

А якія пяшчотныя словы знаходзіць паэт, каб перадаць прыгажосць беларускай прыроды («Перад паводкай», «Зімой», «Па-над белым пухам вішняў», «Зімовая дарога»), як захапляецца рупнасцю і талентам простага народа («Летапісец», «Перапісчык», «Слуцкія ткачыхі»)! У тыя змрочныя для беларусаў часы Максім Багдановіч бясконца верыў у будучае, у «залацісты ясны дзень».

Далікатна, з вялікай пашанай і павагай малюе М. Багдановіч вобраз жанчыны («Вераніка», «У вёсцы», «Максім і Магдалена»). Многія яго вершы пакладзены на музыку і сталі надзвычай мілагучнымі песнямі. Успомнім хаця б некаторыя — «Зорка Венера», «Ізноў пабачыў я сялібы...», «Слуцкія ткачыхі». І зусім новая — «Пагоня».

Вершы Максіма Багдановіча любім не толькі мы, беларусы. Яны перакладзены на многія мовы свету. Бяда толькі, што век яго быў вельмі кароткі. Ён не пражыў 26 гадоў. І пры жыцці паэта выйшла толькі адна кніжка вершаў, якую ён назваў вясновым словам — «Вянок». Вершы М. Багдановіча сталі беларускай класікай, гонарам нашай літаратуры.

Памёр М. Багдановіч ад сухотаў, пахаваны ў Ялце.

## МАКСІМ І МАГДАЛЕНА

Гэй, пайду ж я па вуліцы
Ў тое поле за аколіцу.
Ля аколіцы і плот і гарод,
Завіваецца хмялінушка.
Ды чаму ж цябе, зялёную,
Градам-дожджыкам не выбіла?
Ты, хмялінушка вясёлая,
Раскудравая хмялінушка,
Загубіла буйну голаву,
Буйну голаву Максімаву.

Максім у карчомцы гуляе,
Ён гуляе — крыж прапівае,
Да таварышаў сваіх выгукае:
«Піва-мёд у карцы налівай,
Каб лілося аж за край, аж за край,
Песню гучную ямчэе завадзі
Ды цымбаламі падыгрывай!»

Гэй, як скрыпнуць, як утнуць гапака,—
Толькі сцены захадзілі у шынка.
Струны звонка вымаўляюць з-пад рукі,
Ёмкім дробам выбіваюць хадакі.
Іх сталёвыя падкоўкі звіняць;
Ля парога людзі добрыя стаяць,
Падпяваюць, прыгаварываюць
Ды Максіма ўсё пахваліваюць.
Ён сядзіць — не памалу п'е,
Пад цымбалы у далоні б'е,
І хмяльна жа яго галава,
Мова дзіўная так-такава:

«Магда, Магдачка,
Мая кветачка-пралесачка!
Не кахацца мне, хлопу, з табою,
Ваяводы старога дачкою.
Сёння з войтам цябе заручаюць,
Рушнікі вынімаюць,
Русу косу тваю прапіваюць.
То не траўка-павіліка расплятаецца,—
Наша вернае каханніца канчаецца.
Ўжо не будзеш гуляць, як бывала,
Цалаваць, як раней цалавала,
Выхадзіць у сад апаўночы,
Глядзець ненагляднаму ў вочы.
Ты марцовага снегу бялей,
Броўкі — долі сіроцкай чарней;
Не забыць іх сэрцу ніколі,
Не бачыць да веку патолі.
Лійся, піва, цячы, як вада,
Бо пала на сэрца нуда!»

У хмялю Максім гавора, не чакае гора,
Ды пачула тыя словы шынкароўна Сора.
Ўзяла Сора да палацу шпарка пабяжала,
Ваяводзе а прыгодзе ўсё пераказала.

Гэй, як грымне ваявода у памост нагою:
«Налажы ж ты, ледацюга, буйнай галавою!»
Толькі ўчулі тое слугі — зараз паспяшалі,
Ланцугамі хлопу ногі закавалі,
Павялі на пляц кірмашовы,
На памост высокі сасновы.
Людзі добрыя ўкруг стаяць.
Ён ідзе-не-ідзе, супыняецца;
Белы ручанькі па баках вісяць,
Ногі борздыя вагаюцца.
Ды не жаліцца да людзей Максім,
Толькі кажа ён аб цымбалы ім,
Хоча зноў пачуць тое гранніца
У астатні раз,
У смяротны час,
На апошняе са светам развітанніца
Вокам кінуць — цымбалы дасталі,
На памост на высокі паклалі.
Устрахнуў Максім кудрамі — годзе плакаць, годзе.
Цяжка-важка, сумнёсенька ён заводзе:
«Не вятрыска са поўначы павявае —
Ціха сон у камору ўступае,
Вочы мне стуляе, ацьмянжае.
То не птушка ў гняздзечку ўстрапянулася —
Маё сэрца улякнулася.
Снілась мне — я ўзмежкам іду,
Поруч збожжа калыхаецца,
Поруч збожжа калыхаецца,
Буйнай срэбнай расой асыпаецца.
Сёння споўніўся той нядобры сон,
Сёння споўніўся цераз дзевяць дзён:
Праз цябе, дзявоцкая краса,
Слёзы коцяцца, як буйная раса».
Ціха ўсё — толькі струны звіняць,
Толькі песня разліваецца.
Людзі добрыя навакол стаяць,—
З болю сэрца разрываецца.
Гэй, было б табе, Максім, не кахацца,
На вяльможную дачку не заляцацца.
Устрахнуў Максім кудрамі — годзе плакаць, годзе.
Цяжка-важка, сумнёсенька ён заводзе:
«Магда, Магдачка,
Мая зоранька ясная,
Маё сонейка прэкраснае!
Ой, ад сонейка

Па зямлі цвяты расцвітаюць,
Ад яго ж яны й пасыхаюць.
А ты, сонца, свеціш,
Залатое, святое,
І не ведаеш тое».

Ціха ўсё — толькі струны звіняць,
Толькі песня разліваецца.
Людзі добрыя навакол стаяць,—
З болю сэрца разрываецца.
Гэй, было б табе, Максіме, не кахацца,
На вяльможную дачку не заляцацца.
Устрахнуў Максім кудрамі — годзе плакаць, годзе.
Цяжка-важка, сумнёсенька ён заводзе:
«Мае дзетачкі, мае дробныя,
Вы наплачацесь, нагалосіцесь,
Бо не стане у вас татачкі!
Хто вас будзе гадаваці, адзяваці?
І ад цёмнай ночы укрываці?
Станеце вы, дзеткі, жабракамі,
Пойдзеце барамі-лугамі,
Ды гасцінцамі-дарогамі.
А дарогі тыя без канца ляжаць,—
Без канца вам, дзеткі, гора горкае цярпець».
Ціха ўсё — толькі струны звіняць,
Толькі песня разліваецца.
Людзі добрыя навакол стаяць,—
З болю сэрца разрываецца.

А як смерцю Максіма скаралі,—
Рукі белыя да брамы прыбівалі,
Рукі белыя да брамы мястовай,
Галаву — да вежы вартовай,
Каб дажджы яму кудры мачылі,
А вятры бы сушылі,
Каб крукі прылятали — вочы дзюбалі,
Ўсе бы людзі пазіралі — ды не забывалі.

## У ВЁСЦЫ

Lumen coeli sancta rosa![1]
*А. Пушкін*

Хвалююць сэрца нам дзявочыя пастаці,
І душы мацярэй нас могуць чараваці;

[1] Светач мыслі, святая ружа! *(фр.)*

Вышэйшая краса — ў іх злітнасці жывой!
Артысты-маляры схіляліся прад ёй,
Жадаючы з'явіць цераз свае халсціны
Пачуцці мацеры у вобліку дзяўчыны.
Красы тэй сімвалам, Маць-Дзева, стала ты,—
І глянулі твае з-пад пэндзаляў чэрты.
З таёмным трэпетам на іх я пазіраю,
А сэрца ўсё імкне да бацькаўскага краю.
Мінулае сваё прыпамінаю я!
Між цёмных абразкоў прайшоўшага жыцця
Шукаю сквапна штось трывожнаю душою,
І здаранне адно ўстае перада мною.

---

Калісьці летняю рабочаю парой
Праз вёску я ішоў. Панураю чаргой
З абох бакоў крывой і вузкай вулкі хаты
Стаялі — шэрыя, струхлеўшыя; як латы,
Віднеліся ў сцянах сляпыя вокны іх,
І аж счарнелася салома стрэх гнілых.
Ўсё руйнавалася, старэла, адмірала,
І мала што вакол хоць трохі аздабляла
Вясковую нуду: мак яркія цвяткі,
Рознакалёрныя, як тыя матылькі,
У градах высыпаў і цешыў імі душу,
Ды можна йшчэ было там-сям пабачыць грушу,
Крывую, старую... вось толькі і ўсяго.
І да таго ж людзей не відна нікаго,—
Яны на полі ўсе; не мільканець спадніца,
Не пройдзе з вёдрамі па воду маладзіца,
Не ўгледзіш белую магерку мужыка,
Ў паветры не памкне іржанне жарабка,
І песня сумная не паліецца звонка...
Што ж дзіўнага, калі, раптоўна крык дзіцёнка
Пачуўшы, дрогнуў я і аглядзеўся. Ах!
Я спудзіў хлопчыка; на руках і нагах
Ён, бедненькі, папоўз па траўцы ля сцяжынкі,
Да нянькі траплячы — так год васьмі дзяўчынкі.
І вось, дабраўшыся, ў падолак разам к ей
З трывожным голасам уткнуўся ён хутчэй;
І, як схіляецца ад ветру верх бярозкі,
Дзяўчынка к хлопчыку нагнулася і, слёзкі
Сціраючы яму, штось пачала казаць,
Каб заспакоіць плач — зусім як быццам маць,
І саліваліся ў жывы абраз ядыны
Той выгляд мацеры ды з воблікам дзяўчыны,

Дзіцячым, цененькім; і ў гэты час яна,
Здавалася, была аж да краёў паўна
Якойсь шырокаю, радзімаю красою,
І, помню, я на міг пахарашэў душою.
А можа не краса была ў дзяўчынцы той,—
Дзяўчынцы ўпэцканай і хілай, і худой,—
А штось вышэйшае, што Рафаэль вялікі
Стараўся выявіць праз маці божай лікі.

---

Страніца лепшая ў штодзённіку жыцця!
Зноў з ціхай радасцю цябе чытаю я,
Хай шмат чаго (ўжо) з тых гадоў крыніца змыла
У памяці маёй, хай тэй дзяўчынкі мілай
Ўжо воблік губіцца у цёмнай глыбіне,
Я веру, ў цяжкі час ён гляне на мяне.

## ВОЗЕРА

Стаяў калісь тут бор стары,
І жыў лясун у тым бары.
Зрубалі бор — лясун загінуў,
Во след яго ад той пары:
Сваё люстэрка ён пакінуў.

Як у нязнаны свет акно,
Ляжыць, халоднае, яно,
Жыццё сабою адбівае
І ўсё, што згінула даўно,
У цёмнай глыбіні хавае.

## НА ЧУЖЫНЕ

Вакол мяне кветкі прыгожа красуюць.
Маркотна між іх я хаджу адзінок,
Аж бачу — мне сіняй галоўкай ківае
Наш родны, забыты ў цяні васілёк.
«Здароў будзь, зямляча!» Чуць бачны ў даліне,
Панура, нявесела шэпча ён мне:
«Ўспамянем, мой дружа, ў багатай чужыне
Аб беднай, далёкай сваёй старане».

## ВАРОНА І ЧЫЖ

(Байка)

Прыгода гэтая не так даўно была.
К чыжу (а сілы ён, як ведама, не мае)
Варона прыступае:
«Скажы, ці я падобна да арла?»
І бачыць чыж — з варонаю не жарты,
А ўласны хахалок чаго-небудзь ды варты.
«Зусім арол»,— адказывае чыж
Вароне клятай з клёна.
«Ну, то ж бо то! Глядзі ж!» —
З ласкаваю гразьбой пракаркала варона
І паляцела стуль далей.
Ўсё тое бачачы, здзівіўся верабей:
«Браток! Ці жа вачэй не маеш —
Арлом варону называеш?»
Засараміўшыся, чыж так пачаў казаць:
«Я гэтым не зрабіў благога.
Дай бог арла воронай не назваць;
Варону жа арлом — нічога».

## АЛЕСЬ ГУРЛО
## (1892—1938)

Аляксандр Кандратавіч Гурло нарадзіўся ў мястэчку Капыль на Случчыне ў беднай сялянскай сям'і. З малых гадоў ён пазнаў шмат бяды. Дастатку ў сям'і было небагата, і Алесь, скончыўшы чатырохкласнае вучылішча, у пошуках кавалка хлеба вымушаны быў пакінуць вучобу. Працаваў пастухом, парабкам, а затым — рабочым на петраградскім заводзе «Вулкан». У 1913 г. Алесь Гурло прызываецца ў армію і накіроўваецца ў Балтыйскі флот. Тут ён спачатку плавае на крэйсеры «Багатыр», а пасля на мінаносцы «Забіяка», на якім і застае яго імперыялістычная вайна. Таксама Алесь Гурло прымаў удзел у грамадзянскай вайне, дзе быў пакалечаны.

Першыя вершы Алеся Гурло ўбачылі свет на старонках «Нашай нівы» ў 1909 г. Юнак захапляўся паэзіяй Я. Купалы і Я. Коласа. Таму, зразумела, яго творчасць фарміравалася пад уплывам любімых паэтаў.

З маленства адчуўшы на ўласным вопыце гаротнае жыццё селяніна, Алесь Гурло першыя свае вершы прысвячае нешчаслівай долі беларускага мужыка, дзе выраз-

**на гучаць свабодалюбівыя матывы, вера ў чалавека («Полудзень пры жніве...», «Нядоля», «Сяўцу»).**

**У пакінутай нам спадчыне паэта захавалася шмат вершаў, напісаных за час службы ў царскім флоце («На моры», «Над морам», «Мора» і інш.), дзе ён паэтызуе вобразы смелых, дужых матросаў.**

**Аднак самае істотнае і цікавае ў паэзіі Алеся Гурло — яго лірычныя творы, пачуцці і роздум чалавека, які многа перажыў і многа пабачыў. Гэта — «Праплыў я шмат», «Часта мне гаварыць», «Каўказ», «Мая Мекка» і інш.**

**Многія вершы А. Гурло 20—30-х гадоў друкаваліся ў часопісах і сабраны ў зборніках «Барвінак» (1924), «Спатканне» (1925), «Сузор'е» (1926), «Зорнасць» (1927) і «Межы» (1929). Гэта сведчыць пра яго працавітасць і шчодры талент. Але цяжкасці жыцця, якія выпалі на долю паэта, сухоты і калецтва канчаткова падарвалі яго здароўе.**

## АХВЯРА

Прычапілася да Янкавай жонкі нейкая паганая хвароба. Спалохаўся Янка, каб не памёрла яго Анэля, дый пачаў маліцца, а нават ахвяраваўся прадаць сваю кабылу і грошы, што возьме за яе, аддаць у цэркаў. Прайшло крыху часу, жонка ачуняла, але Янка (скупы быў гад!) неяк забыўся на сваю ахвяру. Жонка, праўда, часта ўспамінала аб ёй мужыку, але той, паказваючы пальцам у неба, адказваў: «Ты думаеш, калі іх, то і ашукаць няможна?»

Але нядоўга прыйшлося цешыцца Янку, бо ўскорасці жонка за першы раз горш асунулася, і — чым далей — усё больш слабела і слабела.

Кепска прыйшлося Янку; не ў галаве ўжо яму выкруткі перад богам; давай ён шчыра маліцца і прыракаць, што калі толькі хворая і цяпер ачуняе, дык ужо пэўне прадасць кабылу і грошы, што возьме за яе, аддасць у цэркаў.

Прайшло ізноў трохі часу,— жонка паздаравела. Янка баючыся, каб ізноў не занядужала Анэля,— узяў кабылу, курыцу дый пайшоў на торг.

— Прадаеш кабылу? — пытаюць яго.

— Прадаю,— адказвае той.

— А колькі просіш?

— Два злоты,— кажа Янка.

Глядзяць людзі, як на шалёнага. Ажно нарваўся нейкі чалавек дый суліць яму трыццатку.

— Адна кабыла,— кажа Янка,— не прадаецца, а з курыцай разам.

— А што за курыцу? — пытае яго.

— Сто рублёў.

Бачыць купец, што мае справу з нейкім прыдуркаватым, як яму здалося, чалавекам, а што кабыла была важная і гэтых грошай вартая,— выняў сотку, далажыў двузлотку і аддаў Янку.

«Вясёлку» за курыцу Янка схаваў у капшук; а за двузлотку, што ўзяў за кабылу, цяжка ўздыхнуўшы, паставіў у царкве свечку.

## ПАДНЯВОЛЬНАЯ ВЯСНА

Увабраўся садок мой прыгожа:
Цвет бялее ад яблынь і йгруш,
Толькі душу маю боль трывожа,
Толькі сэрцам сваім я нядуж...

На дварэ ўсюды пахне вясною,
Ўсе сады зацвілі, нібы рай,
Я ж марнею без сну, без спакою,
А так міла вясна, месяц май!

Так, здаецца, рвануўся б да свету,
Каб нацешыцца пахам садоў,
Але лёс пасудзіў мне не гэта:
Ён судзіў слухаць звон кайданоў...

Надта прыкра і горка да болю...
Ўсё цвіце, весяліцца усё...
Адно сэрца марнее ў няволі,—
Гэта сэрца — нявольнік — маё...

## КОЛЬКІ МУКІ...

Колькі мукі душы, колькі слёз пралілось
Пры ўспамінку аб роднай краіне;
Спазнаць гора, нуды многа мне давялось
Ў гэтай сумнай, далёкай чужыне!

Там прыгожа так сонца зіяе
Над радзімай маёю хацінай;
Ўсякі думку маю там згадае,
Руку помачы даць не праміне.

Ў цяжкі час без пагарды і здзеку
Абмяняецца ласкавым словам;
Як крышталь, там душа чалавека
І так блізкая сэрцу там мова...

## МАЯ ПЕСНЯ

Сяду я на ўзгорачку, на віду
І зайграю голасна у дуду;
Я зайграю, заспяваю,
Што на сэрцы сваім маю:

Каб прайшоў прыгон і здзек,
Каб жыў вольна чалавек,
А хто спіць — таму пабудку
Я сыграю сваёй дудкай,

А хто ў працы анямог,
З таго цень згаthrow трывог,
Апяю я песняй поле,
Лугу шыр, яго раздолле,

Лес зялёны, цёмны бор,
Сініх рэчак бег, прастор,
Зоры з вечнымі агнямі,
Што зіяюць над начамі,

Сонца яснага прамень,
Што нас грэе цэлы дзень;
Буду пець сваю я песню
Ўзіму, ўлетку, напрадвесні.

Ёй зганю я ночы сон,—
Яна ліры маёй звон!
Буду пець, не буду нýдзіць,
Шчасце клікаць сабе, людзям.

## МОРА

То ціха яно... чуць дыша, чуць б’ецца,
І сонца праменні цалуюць яго;
То, ўзняўшыся валам, нясецца, нясецца,
І белая пена блішчыць, як агонь.

Ракоча і стогне удар за ударам,
І лезе на хвалю хваль новых града...
Прастор у тумане, а неба у хмарах —
Ніяк не пранікнуць у цёмную даль.

А вецер ўсё свішча разбойнікам лютым
І ўсё падганяе валоў дзікі бег;
Шугае на роўні, павернецца крута,
Нібыта ваяка ў ліхой барацьбе.

І вецер, і хвалі — браты па раздоллю:
Іх шпаркага бегу нічым не суняць.
О, мора, люблю я тваё сваяволле,
Люблю тваю буру і ціхую гладзь!..

## ЗАМКАВАЯ ГАРА

Ты стаіш, як ўладар...
Дзесяцінны абшар
    Твой на версе убран муравою,
    Як відно, апавіта была ты вадою.
Табе многа вякоў —
Таму сведкаю роў
    Ды ручай са сцюдзёнай вадою,
    Што ўдаль хваляў бяжыць чарадою.
Хто цябе збудаваў,
Над зямлёю падняў
    Для чаго, для патрэбы якое,—
    Для красы ці для мэты ліхое?
Тут будынак, відаць,
Мусіў колісь стаяць,
    Пацяшаўшысь акругаў красою,
    Можа славай хваліўся якою?
І ў яго мо сцянах
На варожы на страх
    Кінжалы і кальчугі звінелі,
    Можа гімны пабедныя пелі?
Можа тут з-за княжны
Настраліcь ражны,
    Можа віны ліліся ракою?
    Адвячаў можа хто галавою?
Можа граў тут гусляр
Альбо пеў мо пясняр,
    І па свету галосна і звонка
    Разнасіў можа славу старонкі?

Ці ішоў у паход
За свабоду народ,
        Прад табою схіліўшы знамёны,
        Можа праўды пісалі законы?
Ты стаіш сіратой,
І навокал спакой;
        Не красуюцца сцены і вежы,
        Не вартуюць простор твае межы...
Гоніш ціхі ручай,—
Мо каб шум з края ў край
        Аб мінуўшым будзіў успаміны,
        А мо шчасце прарочыш краіне?..

## ЗОСЬКА ВЕРАС
## (1892—1991)

Зоська Верас — гэта псеўданім Людвікі Антонаўны Сівіцкай-Войцік. Нарадзілася яна ў мястэчку Мяджыбат, што на Украіне, дзе яе бацька служыў афіцэрам у рускай арміі. У 1912 г. дзяўчынка скончыла прыватную жаночую гімназію ў Гродне, а праз два гады — агародніцка-пчалярскія курсы ў Варшаве.

На хвалі ўздыму нацыянальнага руху юная Людвіка Сівіцкая ўключылася ў грамадскую дзейнасць. Яшчэ ў гімназіі яна ўвайшла ў склад кіраўніцтва гродзенскага гуртка беларускай моладзі, які займаўся асветніцкай дзейнасцю. Людвіка спявала ў хоры, іграла ў струнным аркестры, прымала ўдзел у спектаклях. Потым падтрымлівала сувязь з беларускай кнігарняй у Вільні, з выдавецкай суполкай «Загляне сонца і ў наша ваконца», з беларускім студэнцкім гуртком у Пецярбургу.

У час першай сусветнай вайны паэтэса з Беласточчыны, дзе яна жыла ў фальварку свайго дзеда, пераязджае ў Мінск. Тут разам з Максімам Багдановічам у 1916—1917 гг. яна працавала ў Беларускім таварыстве помачы ахвярам вайны, наладжвала прытулкі для дзяцей-сірот. У гэты ж час Людвіка актыўна супрацоўнічала і з тымі, хто быў арганізатарамі беларускай дзяржаўнасці.

Друкавацца Л. Сівіцкая пачала ў 1907 г. А з 1911 г. на старонках «Нашай нівы» з'яўляюцца яе вершы і апавяданні пад псеўданімам Мірко, Мама і інш. Пад псеўданімам Зоська Верас Людвіка Сівіцкая пачала друкавацца ў газеце «Вольная Беларусь» з 1917 г.

З 1923 г. і ўсё астатняе жыццё Зоська Верас жыла і

**працавала ў Вільні. Яна была стваральніцай і рэдактарам першага нацыянальнага дзіцячага часопіса «Заранка», першы нумар якога выйшаў у 1927 г. У гэтым часопісе Зоська Верас знаёміла дзяцей з творамі вядомых тады паэтаў: Гальяша Леўчыка, Міхася Машары, Канстанцыі Буйло і інш. Дэбютавалі там і маладыя аўтары. Праіснаваў часопіс толькі да 1928 г. і з-за матэрыяльных цяжкасцей вымушаны быў спыніць сваю дзейнасць. Але гэта быў каштоўны вопыт узаемасувязі з юным чытачом, выкарыстаны потым заходнебеларускім часопісам «Пралеска».**

**Далейшы лёс Зоські Верас склаўся не вельмі ўдала. Ваенныя нягоды, жыццёвая неўладкаванасць — усё гэта мала спрыяла творчым узлётам. Аднак Зоська Верас праз усё жыццё засталася вернай сваёй справе.**

## ДЛЯ НАШЫХ ПРЫЯЦЕЛЯЎ

Штораз цішэй і пусцей робіцца ў лясах, зараслях і агародах. Частка птушак адляцела ўжо ў вырай, а тыя, што зімуюць у нас, не пяюць ужо так весела, як вясной і летам. Наступаюць зімовыя халады, і сціскаюцца маленькія птушыныя сэрцы і б'юцца ў трывозе: што будзе? Што будзе, як снег укрые зямлю, схавае ўсе зярняткі ды ягадкі? Чакае голад, страшны голад, які часта канчаецца смерцю. Холад таксама вельмі птушкам дакучае, а вялікія маразы губяць іх без ліку. Але ад холаду можна знайсці ратунак, хаваючыся ў дуплы дрэў, у пустыя гнёзды, у густыя галіны елак. Сядзяць там птушкі, наставіўшы пёркі, падобныя да маленечкіх пуховых клубочкаў. А як ратавацца ад голаду? Дзе шукаць сабе спажывы, асабліва ў снежную зіму, калі тоўсты і шчыльны дыван ляжа на зямлю і нават пакрые галіны дрэў?

Тады вось маленькім бязрадным птушкам павінны памагчы людзі, павінны памагчы, каб аддзячыць тую велізарную працу, якую птушкі выконваюць на працягу вясны і лета, ачышчаючы нашы сады ад шкодных казюлек, вусеняў і мошак.

Леснікі ў вялікіх лясах дбаюць пра тое, каб птушкі не гінулі з голаду, і кормяць іх зімой прыдбанымі загадзя запасамі.

І кожны, хто мае садок, таксама павінен аб птушках парупіцца. Зразумела, дарослыя не маюць на гэта часу, але маленькія гаспадарыкі і гаспадынькі, якія так смакуюць яблыкі, грушы ды слівы, павінны помніць аб тых сваіх прыяцельках, якія памагаюць бараніць дрэвы

ў садку ад розных маленечкіх, але страшных шкоднікаў.

Хочучы памагчы птушкам пражыць цяжкую халодную зіму, трэба загадзя прыгатаваць для іх адпаведныя запасы. Усе тыя птушкі, што зімуюць у нас, кормяцца пераважна, асабліва зімой, рознымі ягадамі і зярнятамі. І вось мы павінны назбіраць цяпер як найбольш гэтай ежы. З зярнят нам трэба мець: мак-відук, зярняты дзікай або сеўнай вікі, розных дзікіх гарошкаў, насенне розных траў, цэлыя галоўкі асоту (найлепш яго любяць шчыглікі); добра прыдбаць, калі можна, пару жменяк канаплянага зерня ды адну-другую жменьку зярнят сонешнікаў. Калі пачнуцца прымаразкі і ягады рабіны перамерзнуць, тады назбіраем іх як найбольш, толькі не трэба зрываць усіх з дрэва, бо як няма вялікага снегу, то і на дрэве птушкі іх знойдуць. З іншых ягад добра назбіраць і насушыць ягад белага бэзу (бузіны), а таксама зрабіць запас ягад ядлоўцу.

Ягады трэба высушыць на печы, бо інакш згніюць, і пассыпаць у торбачкі таксама, як і розныя зярняты.

Збіранне і прыгатаўленне запасаў каштуе крыху часу і працы, але затое якая радасць нас чакае, калі ў нашым садку, дзе паставім ці павесім кармушкі, збярэцца цэлая грамадка галодных птушак і, смачна заядаючы, зачырыкае нам мілае «дзякуй».

## Я НЕ БАЮСЯ...

Я не баюся жыццёвай буры,
Хоць добра знаю яе шум пануры,
І змрочнага не баюся ценю
Без ласкі цёплай сонка праменю,
І не баюся працаў мазольных
Для рук бяздольных...
Але ж баюся я ўтраты веры,
Траты энергіі баюся без меры,
Баюся жыці без ідэалу,
Бо ў чорнай пустцы сэрца б сканала...
Больш чым цялеснай баюся смерці —
Душой памерці...

* * *

Беларусь! Ты краю родны!
Краю смутку, слёзнай песні,
Глянь!.. Ўстаюць ўжо твае дзеці
З-пад налёту шэрай плесні...

Глянь! Ідуць яны гурбою...
Ўжо страсаюць цемры путы
І тых клічуць за сабою,
Хто заклятым сном акуты.

Беларусь мая тужліва,
Як дзявоча летуценне,
Як па шчасце, што прапала,
Безгранічнае цярпенне.

Твае дзеці з сілай велькай,
Бо з кахання агнём ў сэрцы,
Паразгоняць чорны хмары,
Не дадуць жыць ў паняверцы.

Разыдуцца чорны хмары,
Паразвеюцца туманы,
І на твае шэры полі
Сыдзе шчасця блеск святляны.

## МАКСІМ ГАРЭЦКІ
## (1893—1938)

Максім Гарэцкі нарадзіўся ў вёсцы Малая Багацькаўка Шамаўскай воласці, што на Мсціслаўшчыне (Магілёўская вобласць). Ад прыроды Максім меў вялікія здольнасці — выключную памяць, багацце эмоцый, музычнасць. Яны дапамаглі яму прайсці праз цяжкасці на шляху да беларускага Парнаса.

Максім вучыўся на «выдатна» ў Горацкім каморніцка-агранамічным вучылішчы. Але праца каморніка-агранома не падабалася яму. Пасля заканчэння вучылішча юнак жыве ў Вільні, працуе каморнікам, друкуецца ў «Нашай ніве». Калі пачалася вайна з Германіяй, у 1914 г., Максім Гарэцкі ідзе ў салдаты. У адным з баёў ён быў цяжка паранены і доўга лячыўся. Гэтая рана дала сябе адчуць у 1917 г., калі пісьменнік цяжка захварэў і лячыўся ў Арле, у Маскве, у Жалезнаводску. Аднак, нягледзячы на гэта, Гарэцкі шмат піша, друкуецца ў «Вольнай Беларусі», «Дзянніцы», працуе ў газеце «Звязда». Пасля акупацыі Вільні белапалякамі Максім Гарэцкі працуе выкладчыкам беларускіх настаўніцкіх курсаў і адначасова ў Віленскай гімназіі. У ліпені 1919 г. ён ажаніўся з Леанілай Усцінаўнай Чарняўскай, у 1921 г. нарадзілася дачка Галіна, у

1922 г.— сын Леанід. У гэты час Гарэцкі шмат піша; працуе над «Гісторыяй беларускае літаратуры». М. Гарэцкі з'яўляецца аўтарам «Хрэстаматыі беларускае літаратуры. XI век — 1905 г.», ён склаў некалькі руска-беларускіх слоўнікаў. У ноч з 19 на 20 студзеня 1922 г. пісьменнік быў арыштаваны і высланы ў Коўню. Пасля гэтага Гарэцкі часта мяняе месцажыхарства.

У кастрычніку 1923 г. ён пераязджае з сям'ёй з Вільні ў Мінск, працуе на рабфаку БДУ. Затым выкладае беларускую мову і літаратуру ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках, працуе ў Інбелкульце, у 1931—1935 гг.— жыве і працуе ў Вятцы, потым пераязджае ў гарадскі пасёлак Пясочня, дзе настаўнічае.

Як і многіх іншых дзеячаў культуры таго часу, М. Гарэцкага напаткаў трагічны лёс. Пісьменнік быў беспадстаўна абвінавачаны і арыштаваны, яго жыццё заўчасна абарвалася.

## МАЛАЦЬБА

(Урывак)

Зіма, досвіткі, на двары сцюжа і шугае вецер, а ў хаце троху цёпла, гарыць сумная лучына, сядзіць бацька і маці — даўно ўжо ўсталі і працуюць.

Прачнуўся і Лявонька, але маўчыць, нібыта і спіць, і добра ляжаць яму на палу пад цёплаю дзяругаю і кажушком. Цёпленька... На печы, ля дзеда, было б яшчэ цяплей. Паміж комінам і дзедам. І трэба ж паглядзець там тую дошчачку, што сушыцца на траме і што будзе з яе скрыпка... Толькі ж дужа не хочацца ўставаць і бегчы з полу на печ,— пакуль дабяжыш, дык і пазябнеш...

Варочаецца дзед на печы, побач з лучынаю, што паклалі там, каб сохла. Варочаецца на пасцеленым жупанку, грэе старое зябкае цела. Бядуе, што жыве так доўга, не ўмірае. Шэпча:

— Калі ж ты ўжо прыйдзеш па мяне, мая ты смертухна? Вось і яшчэ аднаго дня прыждаў, яшчэ адну ночку пражыў...

Слухае Лявонька, як шугае вецер за сцяною, і дзівуе дзеду: навошта ён так хоча паміраць? На могілках жа цяпер дужа-дужа глыбокі снег, цёмна там і страшна, мароз і вецер, бегаюць ваўкі і выюць...

«Ай, любы дзедзя! Не ўмірай ты! Жыві і жыві...»— падумаў і раптам — хоп! Усхапіўся і забарабаніў па палу на печ, да дзеда.

— Ціш-ш! Куд-ды ц-цябе так рана падняло! — жартуе бацька.

А ён ужо зрабіў свае лататы і ўзгробся на печ, перакуліўся цераз дзеда і прытуліўся там, між ім і комінам.

Патурбаваны кот падняўся, сагнуў дугою хрыбцінку, пастаяў у задуме, закруціўшы хвост, прымаючы пастанову, і скокнуў на комін, на бацькавы валенцы.

Маўчыць Лявонька, і прыемна яму чуць пад сабою цёплую печ, ды згары — халаднавата без дзяругі. І сляпы дзедзя, як бы тое ведаў, замацаў упоцемку ўнукаву галоўку і гладзіць яго ад вуха да калена.

Добры ён, гэты дзед. Ён любіць свайго маленькага Лявоньку. І хлопчыку хочацца жалець дзеда — ду-у-жа, ду-у-жа жалець! Хай бы сабе жыў дзед, думае Лявонька, хай бы жыў, пакуль трэба калыхаць каго-небудзь у калысцы. І навошта ён усё просіць сабе смертухны?

— Дзед! Гані яго ад сябе! Чаму не спіць малы? Заўсёды ўскруціцца без пары,— жартуе бацька, паглядаючы на печ.

— Дык я ж выспаўся...

— А выспаўся, дык ідзі ў пограб па бульбу, капусты гаршчок прынясі,— кажа маці.

— Дык я ж баюся...

— А ты не бойся, ваўкоў там няма.

— А калі ж я баюся, што цёмна. Мама, скажы ты мне казку.

— Прасі бацьку,— адмаўляецца маці.

— Не, ты скажы. Ты ж умееш,— хоча ён, каб казала маці, а не бацька.

Бацька наогул не казачнік, а калі што і раскажа, дык надта проста, так, як усё дзеецца наўкола, дзе халодна, снег, параная бульба, чад, свінні скігочуць і дзеці плачуць. А маці ўмее заляцець думкаю ў залатую старонку, дзе ўсе дарожкі абсаджаны салодкімі яблынькамі ў два рады, а на тых яблыньках пяюць птушачкі залатапёрыя свае песенькі вясёлыя...

І пачынае маці плясці свае доўгія і цікавыя пляткі. Бясконцу цягнуцца яны пад безупыннае трынканне верацяна, трэск і сіпенне лучыніны ды шыбанне аб сцену зімовае завірухі. Супакой і нерухомасць распаўзаюцца па хаце. Ой, выйдзе з хлопчыка нерухомы летучонік, што будзе толькі ў думках сваіх сніць залатую старонку, і пражыве ён жыццё сваё нерухома, як курэц опіуму... Ой, будзе так!

Ужо хлопчык троху змораны доўгім слуханнем, хочац-

ца яму нечага іншага. Але тая нерухомасць маркотная ахапіла яго і не пускае яго з месца ўстаць.

Ды матка сама раптам ірве залатыя нітачкі:

— Ну, до мне казаць, а табе слухаць. Ідзі-тка мыйся, а ў суднічку ў паўміску мяса ад учорашняе вячэры стаіць.

Мяса тое — хлопчыку надта ўсмак. Сцюдзёненькае, цвёрдзенькае. Але ж трэба абуцца спярша... Э, што там! — паспеецца! І ён басаногі бяжыць мыцца каля лаўкі ў парозе.

Матка зняла яму з загнету* чыгун з цёплаю вадою. А то ён быў ужо занепакоіўся, што прыйдзецца мыцца сцюдзёнаю з сянец. І пялешчацца хлопчык у цёплай вадзіцы, каб пасля баяцца ў жыцці ўсякага холаду,— доўга пялешчацца. Матка баіцца, што ён босы прастудзіцца.

— Ці не до табе пялёскацца, Лявонька? — казала яна.

— Сарокі знясуць, калі доўга будзем мыцца,— падсабляе матцы бацька.

Толькі ён таго не чуе, ён задумаўся.

— Дзед! — пытаецца ён у старэйшага за ўсіх у хаце.— Дзед, а хто лес насадзіў, скажы ты мне, а?

— Сам вырас, маё дзетка,— ласкава адказвае дзед.

— Дык як жа гэта? Чаго ж гэта ён вырас?

— А вось пасеялася насеннейка, дык ён узяў дый вырас.

— Чаго ж яно пасеялася?

— Ат, прычапіўся як смала,— мяшаецца ў размову бацька і кажа маці: — Гані ты яго ад вады, дакуль ён будзе там пялёскацца.

Лявонька мігам абціраецца, узлязае за стол на лаву і сашчэплівае рукі, каб хутчэй адбыць гэтую дзіцячую пакуту: маленне Богу. Моліць яго бацька ці матка. Матка моліць прыгажэй і цікавей, але даўжэй за бацьку. А маленне наогул выходзіць даволі маруднае і да прыкрасці даўгое, бо два разы паўтараецца кожнае слова.

— Выйміцца...— кажа маці, што мае азначаць: ва імя аца.

— Выйміцца! — голасна адгукаецца Лявонька, а пакуль маці зрыхтуецца казаць далей, ён сам сабе ціханька шэпча: «Выйміцца, акацілася аўца...» І, скоса паглядаючы на хату, усміхаецца.

— Маліся добранька, не галузуй! — сурова заўважае бацька, напранаецца і выходзіць з хаты, бо ўжо світае і пара выйсці паглядзець, што там дзеецца на падворку, у хляўку і ва ўсёй гаспадарцы.

Без бацькі можна маліцца весялей,— не так будзе нудна...

І пакуль дабіраюцца да «Верую», Лявонька то пераступае з ножкі на ножку, то крычыць словы на ўсю хату, то гаворыць ледзь чутна, то сашчэплівае рукі на ўсю сілу, то зусім расшчэплівае іх. Забаўляецца — колькі можна ў рамках чалавека, пастаўленага весці гамонку з самім Богам. Матка занята ўжо справамі ля печы, і ён, спачатку здзіўлены яе няўвагаю на яго дурэнне, потым, каб скарыстаць выпадак, пачынае, молячыся, гоцаць так, што аж лава гутаецца пад ім... А ўрэшце заглядаецца на абраз, на сівога чалавека з нейкім вялікім гарбузом у адной руцэ і з кіем у другой. Думкі рояцца ў галаве: чаму гэты, падобны з твару да іхнага дзеда, але неласкавы сівы дзед, чаму ён — Бог?

Ад акна ж, абсыпанага на балонках і ў шчылінах снегам, цягне сцюжаю, і патроху ды ўсё болей святлее — пачынаецца невясёлы зімовы дзень.

Як тое ўсё даўно-даўно мінулася! Памёр дзядуля, пастарэлі бацька і маці, павырасталі дзеці...

## КНЯЗЁЎНА

Чутна князёўне маладой, ажно з высокае святліцы чутно, як безустання плешча і б'ецца аб кручы, і стогне, і вые неўгамонны Дняпро.

Чутна князёўне-адзіноце ў ціхім пакоі, аж праз тоўстыя мураваныя замкавыя сцены чутно, як вецер над борам грыміць безупынна, гудам-гудзяць і шумяць векавыя сосны.

І нудна князёўне, і здаецца ёй, што такі дождж на двары, мутненькі, дробненькі, пракурыцца беспераcтання цалютку ноч, а дужэючы, ён бясконца будзе бубнець аб рознакалёрныя балоны акенныя, наводзячы невясёлыя думы...

Буль-бом-бом... Буль-бом-бом...

Дрыжыць-мітусіцца чырвоны агонь у лампадцы перад суровымі, стродкімі лікамі святых на старых абразах у цёмным куце. Святлеецца кут ад лампадкі. А дарагія, бліскучыя шаты ўва ўсе бакі іскаркамі сыплюць і маркоту цягуча наганяюць.

Нялёгка на сэрцы ў князёўны Ганны, нялёгка — дый дужа...

Ціха ў пакоі. Як заўсёды, безгалоса пазіраюць райскія

птушкі і сіне-блакітныя васількі з багатых тканін, што сцены імі паўвешаны ад столі да нізу.

І апошняя балона пісанай кнігі як ляжыць дык ляжыць на чырвоным аксаміце; а не дапісана, бо ў апошнія часы не ўдаюцца князёўне хітрасплеценыя застаўкі і канцоўкі і красныя літары. Не ўдаюцца... калі ж сумна на сэрцы ад думак дзявочых.

І не даплецены фарботы прыгожыя. Мусіць, не плятуцца чагосьці яны. Забыты, закінуты на ўзорным стале...

І не спіцца князёўне — адзінотка ж яна.

Непрыхільна сэрцу ў ціхамірным ды пустым пакоі.

Абхінула князёўна кунічаю футраю белыя плечкі і ўздзела мяккапушыстыя палуботкі на свае ножкі дробныя; па святліцы прайшлася, маркотна на пярыны свае ўзірнула, прысела, зусім жа слабкая, на аббіты скуркамі з мякенькаю поўсцю зэдлічак і галоўку на грудзі схіліла пакутна.

Апала тонкая, беленькая з кволенькімі пальчыкамі, князёўніна ручка на калені і з кален, а валасы, як багатая кудзеля кужэльная, рассыпаліся па плечыках і на футру; з пацямнелых ад смутку вочак закапалі-закапалі гарачыя слёзы — як светлая раса слёзы...

Плача князёўна маладая, прыгожая Ганначка.

Нашто біліся вы, хвалі, аб кручу? Ці на тое, каб тут ніцая лаза парасла?

Нашто грымелі вы над борам безупынна, вятры? Ці на тое, каб тут дзікі лес усю прастору аблёг?

Нашто курыўся ты, мутненькі, дробненькі дождж? Ці на тое, каб тут вечным балотам уся зямля заплыла?

Нашто плакала ты, прыгожая князёўна Ганначка? Ці на тое, каб заплаканымі вочкамі свету ніколі не бачыць табе?

## ПАЯСОК

### Удава

Быўшы ў пасёлку Міхайлаўскім, вёрст 9 ад станцыі Балотнай, я пытаўся ў тутэйшых перасяленцаў-беларусаў, ці няма ў іх беларускіх паяскоў.

Ні ў кога не знаходзілася: вывезеныя з бацькаўшчыны паяскі пазнасілі, а новых тут не плятуць.

Нарэшце мне параілі схадзіць да цёткі Надзеі-ўдавы і паказалі, як да яе трапіць.

А трапіць было нялёгка. Гэта быў не двор, а ўбогая

хатка на курыных ножках за нечыім чужым дваром.

Тут і жыла цётка Надзея з сынам-хлопчыкам, пастушком.

Калі я прыйшоў да іх, маці карміла сына. Ён прыгнаў пасялковае быдла на паранкі і цяпер сілкаваўся. Еў ён параную бульбу з сухім чорным хлебам. Маці сядзела пры ім і ласкава гаманіла.

Гэта была старэнькая, дробненькая, худая, зморшчаная жанчына.

У хаце — страшэннае ўбоства. Зямля, бруд, чарнота.

Хлопчык босы, у кашулі і штанах з грубага палатна.

Скот ганяе... Выганіць як свет. І на ранкі, і на дзёнкі прыгоніць, два разы.

Яна спярша здзівілася, потым ласкава запрасіла мяне. У яе ёсць паясок. Але не адразу ж яго несці.

Мы разгаварыліся.

Яны перасяліліся з в. Сялец Радомскае вол. Чавускага павета.

Муж кінуў яе. Нядаўна пісаў. Цяпер у Кіеве. Горкі жаль на мужа. І пры сыну.

Паясок была прадала, а потым дагнала і назад узяла: «Памяць аб вяселлі».

## У ЧЫМ ЯГО КРЫЎДА?

### Да яе

*12 студзеня 1910 г.*

Ці здарова ты, мая даражэнькая, мая прыгожанькая, мая любенькая Ганначка?

Каб ты ведала, як многа-многа чаго маю напісаць табе! Аж не знаю, з чаго й пачаць...

Усе нашы вучні з'ехаліся і хваляцца каляднымі навінамі, як хто адсвяткаваў. Пансіён увечары гудзе і грыміць; той на балалайцы брынчыць, той скрыпку наводзіць, той пяе, іншы галопае — мазурку вучыцца скакаць, іншы, грэючыся каля грубкі, гаворыць, як у двары на ігрышчы хадзіў (укруг яго груд хлапцоў, і ўсе рагочуць, аж столь у зале дрыжыць, і агонь у лямпе мітусіцца), іншы ў сталовай кілбаскі ўбірае ды пампушачкі розныя смакуе, успамінаючы калядкі — святыя вечаркі, а каторы, схаваўшыся ў куток дзе-небудзь, пісьмы піша, піша.

Хаджу я, хаджу, як непрытульны, з вугла ў вугал, па ўсім пансіёне хаджу ці ў акно пажуруся, як там так рана невясёла цямнее, а снег сыпкі бялеецца, зверху кру-

цяцца ўсё сняжынкі, дзьме замятуха касякамі па дарозе ад паркана, і нудна ж, нудна мне...

Тут, сярод гэтага тлуму і гоману, куды б я ні пайшоў, у вачах стаіш ты, Ганулька! Не п'ецца мне тут і не есца мне тут. Я дайжа драчоны і пірагі, і ўсё, што мама напякла і нарыхтавала мне сюды, прыехаўшы, аддаў таварышам, каторыя на сняткі ўдвору не ездзілі. Сам толькі паядаў — дзеля гадзіся. Усё думаю і думаю аб табе, калі то ўвіджу?.. Доўга як ждаці.

І ці ведаеш, сёння на ўроку хіміі так залетуціўся, што і не чуў, як вучыцель, паглядзеўшы, што я не слухаю,— торк! зняцеўку да мяне, аж сэрца маё закалацілася: «Повторите, господин Зарембо, как, следовательно, получается эта кислая фосфорно-кислая соль?» Я пачырванеў ускочыў і пачаў лупаць, вытрашчыўшы вочы. «Не слушаете?» — сказаў ён і ткі адстаў.

А ўрокі такія доўгія, цягнуцца-цягнуцца, званка жджэш не дажджэшся.

Пасля гэтага ўрока таварышы жартавалі і прыставалі ка мне: «Не слушаеце? А-а, улюбіўся, панічок! Замаркоціўся, коця-варкоця! Так, так, хлопча... Ну, а якая ж яна? Чарнявенькая? Як зоркі, вочкі, крамяны шчочкі... Вучыцца дзе? Ай ды Касцюк!» Як слова, ведалі, якая ты сапраўды. А што ты не ўчылася, то няма нічога, друкаванае ж ты разбіраеш, толькі пішаш не дужа ладна. Не думай, што ў грамаце ўсё шчасце. Ат, каб можна было вучыцца, дык бы вучылася, праўда?

І цяпер-цька, каб напісаць табе гэту пісульку, я залез у парожні клас, абгарадзіўся партамі і пільную, каб хто часам не падгледзеў. Лямпачка перада мною ціха і змрочна свеціць жаўтавата, у коміне вецер паціхеньку свішча, унізе, у першым паверсе, на гітары іграюць, і тужлівыя, прыгожыя, густыя гукі так і лезуць з нейкай ціхай пакутай і ў вушы і ў сэрца, лезуць і жмуць пад грудзьмі...

Божа мой, божа мой! Чаму я гэткі шчаслівы, што спазнаўся з табою, Ганнуся мая, і нешчаслівы, што жыву далёка-далёка? Здаецца, каб нейкая лятучая машына, ці кавёр-самалёт, як гаворыцца ў казках, дык бы выўчыў урокі, сеў і паляцеў бы да Ганначкі, хоць бы на адну-адну мінутачку. Ах! Ні разу не забудуся я на тое ігрышча.

Як то жывеш ты цяпер? Ці здаровенька? А ці бываюць вечарынкі? Ці прыязджалі к нашым дзеўкам сваты? А можа, хлопец каторы наш дзеравенскі высватаўся? І як, ці такі бярэ Міхалка Аўгінню, ці ўсё няма шчэ ладу? А к Банадысёвым у супрадкі ты, божа крый, не хадзі: іхны батрак,

як усе кажуць, прыкры хлопец, мне ён надта не спадабаўся, такі буян. Мала за чым не пабіўся на заручынах у дзядзькі з бельскімі хлапцамі. Што яму вадзіла, што яны прыйшлі пагуляць? А гарэлкі ж наглытаўся! І мяне дзівіць, што ты з ім так любіш скакаць польку... Ці мала лепшых мальцаў ёсць? Адылі, ты не падумай чаго-якога, гэта я толькі так, к таму, што ён чалавек не то што «не рахманы», як ты гаварыла, а дрэнны, скрыўдзіць як, і што ты яму, такому?

Прыпішы мне, што кажуць людзі аб дзядзькавым вяселлі. Як жывуць нашы: тата, мама? Як маладая дзядзіна?

Марку я табе пасылаю ў гэтым заказным пісьме; паперы возьмеш у Мэндаля, у яго ж і напішы пісьмо сама, адрас напіша табе Мэндалеўна Этка; павестку табе перадасць таксама яна, а дзеўкам нічога не кажы... І майго пісьма Этцы чытаць не давай, а чытай сама, я пішу табе чытэльна.

Ну, а затым і бывай здаровенькая, мая красачка, мая журавіначка! Не нудзіся, прашу цябе,— што сказаў, таго не забуду, дай бог толькі скончыць школу, ужо не доўга!..

А людзі, калі смяюцца, няхай смяюцца, ці каму-то закажаш? І аб жыдаўчынцы, з каторай, быццам, відзеў мяне слабадскі Піліп у гарадскім саду, як ездзіў у Багумільск,— брахня, і не давай ты веры, можа, катораму злосніку зайздросна.

Ты ў мяне адна, Ганя, мая першая і апошняя. Лепей за цябе не знайдзецца мне ў свеце.

Цалую цябе, Ганя, на ўсю сілу... Абшчапіўшы за шыйку, жалею-мілую на ўсю сілу...

Званок на вячэрнюю малітву... Дабранач, Анюта, Ганя!

На векі-вечны твой<br>Касцючок Зарэмба.

R.S. (Пасля пісана.) Пішу пасля малітвы. Прысылай пісульку скоранька па адрасе: горад Багумільск, Магіслаўскай губ., пансіён такога-та вучылішча, такому-та. Мне вучыцель за каляднае сачыненне па псіхалогіі (такая навука) «Чуўства сімпацііі» паставіў чатыры з палавінаю. Дабранач!..

Твой Касцючок.

Цалую цябе! Люблю...

## Таварышу

*13 студзеня 1910 г.*

Насмешлівы Андрэю!

Віншаваць з Новым годам у гэтым пісьме не буду, бо я табе паслаў сваю картачку якраз 28 снежня (здаровіў цябе), ці дайшла яна, ай не?

Як адсвяткаваў я ўдвары, пісаць не хочацца — сам добра ведаеш, як я жыву ў дзярэўні, калі прыязджаю з вучылішча.

Ведаеш... Не, браце насмешлівы Андрэю, не дагадаешся, што стала з тваім Кастусём: ён цяпер саўсім другі чалавек!

Я цяпер і сам дзіўлюся, як гэта мог я раней, у тыя гады, прасядзець у сваёй хаце цэлыя каляды, не паказваючы нікуды носа? Помніш, бывала: у цэркаў не езджу (хоць і тошна тым крыўдзіць бацькоў), бо «сучасная вера — ашуканства»; к радні не езджу, бо радня мая — з хамскімі поглядамі, бачыць ува мне «кандыдата ў немалыя паны» і прыкра тым выстаўляецца; на ігрышчы не хаджу, бо «што я там знайду? Тупых дзевак, буянаў-хлапцоў, мацершчыну і ўсякую брыдоту, карты, гідкае скалазубства, насмешку над маімі словамі аб лепшым людскім жыцці», і так далей, і так далей, і так далей. Валяюся сабе тыдні тры ў хаце за кніжкаю ў гордай адзіноце і душу маладыя здаровыя кірункі свае горкімі думамі: «Такая доля мужыцкага сына з дзярэўні, што пайшоў вучыцца».

Кніжкі, кніжкі й кніжкі. Увечары хіба прайдуся да лесу па дарозе, занесенай снегам, з маленькім брацішкам дый зноў у хату.

Матка пачне: «Сыночак! Трэба ж ткі табе сядзець у хаце цалюткі дзень!.. Прайдзіся ты хоць к дзядзькавым, калі не любіш сядзець на вечарынках з дзеўкамі, прачытаў бы што дзядзіне, як, бывала, маленькі, яна ж дужа любіць слухаць цябе. І дзеўкі гукалі — кажуць, што гэта з ім, з вашым Касцюком, зрабілася — людзей баіцца». А я маме па-кніжнаму і так надуўшыся: «Што я там, на вечарынках, знайду?» А дрэнна было на душы, а цяпер успомню — чырванею.

А бацька: «Не любіш дзеравенскай гульні — к настаўніцам бы ездзіў... Ты ж вучышся... і ім бы весялей...»

А я тату: «Ага, паеду... Як слова, я ў іх лепшае шчасце знайду, чымся на ігрышчах... Яны з панянятамі круцяцца, звяжыся я — скажуць нашы: і Касцючок, наўчыўся на са-

бачы нюх — запанеў, да мужыкоў ані блізка, пан... Знаю я».

Змоўчыць бацька, а кіпіць, бо не на яго выходзіць.

Так, бывала, і пакутую «горкую долю сялянскага хлопца, што вучыцца». Сквяруся сам у сабе, не бачачы следу...

Вось была філасофія!

Чырванею цяпер: госпадзі, які я дурус быў.

І адна злая ўцеха ў мяне: «Ці я адзін такі задаўся? Многа ў нас такіх дурусаў. І ты, насмешлівы Андрэйка, і ты... помніш? Цяпер, жывучы ў горадзе, забыўся хіба на тое? А цікава ведаць, якія ў цябе думкі цяпер на гэтыя пытанні. Напішы хоць трошку, а хацеў бы ўбачыць цябе. Ці зразумееш мяне — здольны дэмакратычны працаўнічa? Не ведаю... За сваімі шырокімі грамадзянскімі поглядамі маіх маленькіх, вузенькіх, беларуска-сялянскіх не ўбачыш. Многа маю пагаманіць з табою.

Я адрадзіўся! У мяне **новая платформа**... Толькі, Андрэйчык, не смейся, што я яшчэ вучань. Як ты сам, помніш, кідаўся ў розныя бакі і сварыўся з дзядзькамі, прыязджаючы ў вёску на вакацыю.

Я адрадзіўся!

А з чаго пайшло? Адзін раз, у святы вечар, к нам у нашу хату прыйшлі і хлопцы, і дзеўкі, і старыя, і дзяцьвішча — гуляць. Набухталася поўная хата.

Тата скрывіўся на іх, быццам-то, бо я меў дзікі від.

А потым, потым... Разышоўся я, і ўся мая старая філасофія к чорту!

А ўсё знаеш хто? Ганулька Леваноўначка... Толькі ты не смейся: ну, я, здаецца, улюбіўся... і ўсё.

Бліжэй, бліжэй — пасядзеў я з ёю, пагаманіў — якая слаўная дзяўчынка. Як я раней таго не відзеў? Затлуміў галаву кніжкамі сам сабе, праз тое хіба.

А цяпер... (кніжкі то чытаю, не бойся)... на ігрышчы хаджу, у цэркву езджу, к свату ў госці колькі разоў бегаў і з хлапцамі ў дровы ездзіў. Вясёла! Мама рада. Толькі тата трохі не разумее мяне...

У гэтым уся паэзія нашага народа! Толькі мы гадуемся на чужым грунце і забываемся добра разумець свой грунт. Не смейся, што я — вучань... Як пазнаўся я з Гануелькай, я многа ўцяміў. Каб нам, ведаеш, свой беларускі прарок, каторы б прамыў нам вочы, у чым наша істота, паэзія жыцця, прыгажосць жыцця. А то што: тое лепшае чалавецка-беларускае, што ўзгадавала ва мне сям'я (не ўся сям'я наша, а мама, дзядзіна, цётка, дзед, дзядзька і

яшчэ той-гэты), тое выкараняла доўгі час школа. І мой вучыцель першы быў — беларус! Які сляпы! Мала адукаваны, мала асвячоны... Ці наўчыла нас, слухай, наша школа любіць сваё беларускае, шанаваць прыгажосць роднай прыроды, пранікнуцца гармоніяй родных з'яў? Чаму нас вучылі!

Во й вісі паміж двух магнітаў. Ці выкараняй роднае карэнне і адракайся роднай хаты, ці ўцякай ад панскай апраткі і цягайся за прымітыўнаю дзедаўскаю сахою... хвароба на...

А як я з Ганулькаю? Ды што табе... Я ж скрытны беларус! Толькі ж ты мне блізкі, Андрэй, ты мяне зразумееш і не прасмяеш.

Божа мой! До пісаць. Заўтра ў мяне рэпетыцыя па тэхналогіі, трэба зубрыць.

А шчэ граюць у вушах скамарохі, шчэ пяюць дзяўчаткі родныя песні, прад вачамі так і мітусяцца хлопцы і дзеўкі ў скоках. А той міг! Сяджу я ў вугольчыку на судніку з ёю. Заступілі нас спінамі гулянніκі, дзівячыся на танцораў, гамонім мы... Не горш нашы дзевачкі, з каторымі мы выраслі, за перашпіленых ненатуральных гарадскіх паненак. Ай што я... і там ёсць слаўныя дзяўчынкі... Дык вось... Сажмала мне ў адказ маю руку Ганулька і на пытанне маё хлапецкае змуцілася, схіліла галоўку: «Ага... ты ж бачыш...» — кажа. Зашчымела, зашчымела маё сэрца!

Я і скакаць навучыўся, з ёю польку скакаў; танцы ўжо не такі грэх...

Толькі табе хвалюся, даражэнькі Андрэй: люблю я Ганульку, і яна мяне любіць. Ніхто не ведае.

Праз два гады паскачаш, дружа, на вяселлі, бо Ганне ў наскім быце няможна доўга ждаць. Калі я і ў высшае пайду — нічога, рукі ёсць, спецыяльнасць будзе, абы здароўе, пражывём.

Працаваць і вучыцца! Так, браце. Што там хавацца, будзем самі сабою, будзем самі здабываць сваё жыццё і долю. Працаваць і вучыцца. Не хачу я хлусіць; калі я палюбіў і даў слова, яна мая перад Богам і перад людзьмі. І што ты пішаш, як цяпер у вялікім горадзе ў вас: сышоўся, звёў, канцы схаваў, хоць бы і проціў старой праўды, і кінуў яе, калі абставы і варункі жыцця сучаснага замінаюць,— брыда гэта, і гідасць, і подласць. Ваша гарадская моладзь сама творыць жыццё, дык сорам ёй звальваць віну на ненармальнасць сучаснага сацыяльна-грамадзянскага жыцця.

Сорам ім, сорам. Ты выйшаў з народа і разумееш, дык будзь чалавекам, разбірайся ў ісцінна паступовым. Праўда? Ай, каб я з табою ўвідзеўся, а то на паперы выходзіць не тое.

О, трудна, брат Андрэй, нам, мужыцкім сынам. Мы выпаўзаем са сваіх хат і папраўдзе (толькі не смейся!) маем жа нейкую зямельную сілу ў сабе, гэта не мая навіна, але хаваемся са сваімі ідэаламі, нясмела азіраемся на новай дарозе, шукаем вачыма прыпынку і, не патрапіўшы і не даўміўшыся з'яднацца і пайсці сваім шляхам, расплываемся патроху ў гнілым балоце згрызеных моллю чорных світак...

Выўчыліся! Выйшлі «ў людзі»! Сталі панамі...

Я не хачу так!

Няўжо ж табе не прыходзіла ў галаву думка на панскім балі: «Вось я, пан, гуляю тут, забыўшыся на колішнія жаданні, а не магу прывесці сюды свайго бацьку — селяніна (лёкая, рабочага, дворніка), матку — вясковую кабецінку (прачку, кухарку, швачку), братоў, сястрычак і другіх, бо яны — простыя»?

Ведаеш, тут у нас у клубе на вечарынцы за буфетам падавала гімназістачка, дачка буфетчыка; яе папрасіў на вальс адзін студэнт. І што ж! Падышоў сярод залы старшына клуба і папрасіў дзяўчынку выйсці з залы альбо не працаваць за буфетам. Што ты на гэта думаеш?

А ў нашым вучылішчы 80 % сялянскіх дзяцей...

Дык дзе ж дзверы да жыццёвай праўды, як жа жыць?

Не ведаю... Не ведаю... А толькі я так не хачу!

А як будзе, як то будзе?

Ну, аб жыцці нашым вясковым пісаць многа не буду. Ведаеш, сам жыў... Таксама ўсё чыста, як раней. Толькі троху быццам то варушацца: хутары, кааперацыя, земства... Але мала разумець, мала знаць — ой, патрэбна праца!

У вучылішчы ў нас жыццё старое, грэшнае. Вучымся, вучымся... Многа часу лабараторыя адбірае. Вучыцелі на ўроках спяць, хоць і каляды нядаўна былі. Вучні, брат, на шкоду многія, на прыватных кватэрах асабліва, п'юць гарэлку, гуляюць у карты. Не дужа даўно аднаго ўволілі за п'янства, у другога адабралі стыпендыю за карты, сам дырэктар аб 11-й гадзіне паехаў і застаў. Нядобра, ведаеш, што гэтыя гаротныя гулякі — хто? Сялянскія дзеці; адзін з Міншчыны з-пад Ігуменя, другі з Магілёўшчыны з Горацкага павета. Як яны будуць цяпер? Той, што адабралі ў яго стыпендыю, атрымлівае ад бацькі рублёў 5

у месяц, а рублёў 5—7 прысылае яму брат, вучыцель. А што, калі нам забараняюць рабіць вечарынкі, агульныя чытанні і інш.; цяпер і самі хлопцы, праўда, ужо не дужа цікавяцца... Эх, жыццё!

Ну, бывай здароў. Во распісаўся я. На 2 сямікапеечныя маркі... Пісьмо гэта, напісаўшы, прачытаваць не буду, бо баюся, што, прачытаўшы, не адважуся паслаць табе яго, па скрытнасці сваёй беларускай... Толькі ты не смейся, Андрэйчык! Не смейся, напішы незабавам адказ, будзь здаровенек і не забывайся на твайго смешнага

Косцю Зарэмбу.

## АНДРЭЙ МРЫЙ
## (1893—1943)

**Сапраўднае імя Андрэя Мрыя — Андрэй Антонавіч Шашалевіч. Ён нарадзіўся ў вёсцы Палуж Краснапольскага павета ў сям'і валаснога пісара. У 1902 г. памёр бацька, і маці засталася з пяццю дзецьмі. Яна зрабіла ўсё магчымае, каб вывучыць дзяцей.**

**Спачатку Андрэй вучыўся ў духоўным вучылішчы, а пасля ў семінарыі. У гады першай сусветнай вайны быў прапаршчыкам і ў 1918 г. уступіў у Чырвоную Армію. Але неўзабаве цяжка захварэў, таму вымушаны быў пакінуць армію. З 1921 па 1926 г. працаваў настаўнікам у Краснапольскай школе, выкладаў гісторыю і французскую мову.**

**Уся сям'я Шашалевічаў была вельмі таленавітая. Яны стварылі першы ў раёне народны тэатр, у школе арганізавалі драматычны і літаратурны гурткі, выдавалі рукапісны часопіс «Пралеска», сатырычны раздзел у якім вёў Андрэй. Праз нейкі час з'яўляюцца яго выступленні ў друку. Пачынаў ён як селькор, з газетных нататкаў, прысвечаных розным падзеям і здарэнням з вясковага жыцця. Праз некаторы час ён пасылае свае допісы ў газету «Савецкая Беларусь». Актыўна ўключаецца ў краязнаўчую працу і супрацоўнічае з часопісам «Наш край».**

**У 1926 г. Андрэй Шашалевіч пераязджае ў Мінск і працуе інструктарам цэнтральнага бюро краязнаўства. Потым працаваў у рэдакцыі газеты «Звязда». А ў 1929 г. у часопісе «Узвышша» быў надрукаваны яго сатырычны раман «Запіскі Самсона Самасуя». У гэтым жа часопісе публікаваліся і гумарыстычныя апавяданні пісьменніка.**

**У 1934 г. А. Мрый быў арыштаваны і заключаны ў лагер. Быў выпушчаны, але зноў арыштоўваўся ў 1937**

**і ў 1940 гг. Зняволенне адбываў у Карагандзе, Валагодскай, Мурманскай абласцях; працаваў у леспрамгасе і ў рыбным кааператыве, выкладаў літаратуру ў школе. І ў гэтыя цяжкія гады ён не пакідаў пісьменніцкай працы. Але ж усё створанае ў ссылцы — раман «Жывы дом», аповесці, навелы — былі канфіскаваны ў час ссылкі, і іх лёс да сённяшняга дня невядомы.**

**Памёр А. Мрый у лагеры на поўначы.**

* * *

**Творы А. Мрыя, змешчаныя ў гэтай кнізе, падаюцца так, як яны былі надрукаваны раней.**

## НЯПРОСТЫ ЧАЛАВЕК

Піліп завярнуў кабылу, падладзіў трохі сядзеньне, падсадзіў на калёсы фінагэнта Сапрона Цяліцу, цмокнуў на кабылу, і калёсы ціха затарахцелі па мяккай зямлі.

Была вясна. Дарогі пачыналі прасыхаць, хоць у паветры павіснуў мяккі, павясноваму сыры туман.

За мястэчкам цягнулася вёска. Агэнт бачыў, як пастух першы раз выганяў кароў у поле. Яны млява расьцягвалі сваё змарнелае з падцягнутымі бакамі цела, нюхалі паветра, ваду ў каўдобінках, нюхалі адна другую. Сьвіней яшчэ ня гналі ў поле, і яны з мэланхолічнай сур'ёзнасьцю плюхалі па вуліцы, яшчэ гразнай і непавабнай для гарадзкога вока.

Цяліца ўвесь час жыў у горадзе і цяпер зацікаўлена пазіраў на праявы вясковага жыцьця.

Вунь стаіць зусім нярухома віхрастая сьвіньня. Заплюшчыла вочы, сьпіць, а на хрыбце паважна расхаджвае сарока. Чагосьці шукае сваёй дзюбай.

— Ах, каб цябе нячыстая ўзяла! — зварочвае ўвагу агэнт.— Вось табе і сымбіоз! Шкада, што ня ўзяў свайго Алёшкі. Вось узрадаваўся-б.

— Сынок ваш?

— Так, 7 гадоў!

Цяліца прыпамятаваў сваё маленства на вёсцы, калі ён жыў у бацькі і быў так шчыльна зьвязан з гэтым жыцьцём. А цяпер ужо гадоў 15 дык і не заглянуў туды. Забыўся. Адарваўся. Накшталт перадавога чалавека стаў. Нават у душы сьмяецца з гэтае мізэрнасьці і галоты. На словах — не! Няможна!

Пагана ехаць на гэтай Піліпавай падводзе. Усе вантробы выкалачвае. У мястэчку на базарнай плошчы шмат

было падвод. Усё сытыя, здаровыя коні. А колькі было яўрэйскіх фурманоў! Кагалам абступілі агэнта. Кожны цягне на свой воз. А Цяліца ўзяў гэтага Піліпа з яго «лахудрай» — кабылкай. А чаму? Агэнт беражэ кожную капейку. У яго апрача «ляпёхі»-жонкі (як ён яе дражніць пад злосную руку) ёсьць яшчэ трое шкілетаў-дзяцей. Невядома, па якой прычыне дзеткі не атрымалі ў спадчыну здароўя бацькоў, якому трэба толькі пазайздросьціць. Іх трэба гадаваць смашнюткамі, ды яшчэ да дактароў паказваць. На гэта патрэбны грошы, грошы і яшчэ раз грошы. Ну, а Піліп дужа танна згаварыўся.

Яго кабыла ледзьве цягне. І ня дзіва. Цяліца важыць пудоў 7 ды Піліп на малае пудоў 5. Каняка часта спыняецца, як быццам па сваёй патрэбе, і тады Піліп пачынае аккомпанаваць ёй, насьвістваючы нейкую спэцыяльную для гэтай справы мэлёдыю. А пастаяўшы ды перавёўшы дух, яна зусім нечакана дзёргае калёсы, і агэнт запракідваецца, лаячы і кабылу, і дарогу, і Піліпа, які ня досыць добра адукаваў кабылу.

Праўда, настрой агэнта быў вясёлы. Усе гэтыя штукі толькі сьмяшылі гарадзкога чалавека. Ня менш цікавым здаваўся яму і гаспадар кабылы — Піліп. Нейкае новае стварэньне. Такіх раней ня бачыў на вёсцы.

Піліп — здаровы мужчына гадоў пад 30. Увесь ружовы. Твар, як булка. Кроў проста такі пырскае. Абголены, толькі пакінуты на ангельскі манер два кусткі рудаватых вусоў. Шэра-блакітныя вочы з нейкім хітра-салодкім бляскам. Шырокая сьпіна, выпуклістыя грудзі, а рукі, як лапы мядзьведзя. На плячох матляецца нейкі лахман, увесь у лапіках. Нагавіцы ў абліпачку, і таксама залаплены ў шмат мясцох. Усё цела так і выпірае з вопраткі. Быццам гаворыць: «дзяржы мяне, а то вырвуся!»

Выехалі ў поле. Піліп, не сьпяшаючыся, разьвязаў торбачку і дастаў сотку гарэлкі, кавалак белага хлеба і тоўсты, шызы ад сала, селядзец. Наладзіўся палуднаваць.

Агэнту да сьмерці захацелася гэтага селядца.

Але як сказаць? Жонка наклала яму ўсяго на дарогу, нават не забылася забясьпечыць падарожніка падсалоджанай гарэлкай і пузаценькай бутэлечкай рому для закрасы ў гарбату... Але гэта ня тое. Селядзец так смачна пахне на сьвежым паветры — можа з розуму зьвясьці.

Цяліца хціва глядзіць на Піліпавы махінацыі з селядцом. Сам пачынае выкладваць сваю пажыву і нібы роўнадушна кажа Піліпу:

– Бяры, калі хочаш, маю ежу, а мне дай селядца!

— Можа і гарэлкі пакаштуеце?

— Што-ж? Пі маю, а я тваёй сьвежай паспрабую.

Елі моўчкі: Піліп, гледзячы на хвост кабылы, які рытмічна махаўся каля самых калёс, а Цяліца глядзеў на магутную сьпіну і бычынную шыю свайго возьніка.

Агэнт пачаў сваю звычайную гутарку, якую заводзіў, калі здаралася гаварыць з сялянамі.

— Як жывецца? Палепшала троху? Як відаць, яшчэ не наладзіў гаспадарку?

— Не яшчэ! — павярнуўся тварам Піліп з выразным намерам выкласьці ўсё. Тут магчыма праяўляла сябе гарэлка, а можа і нейкі мяккі ўкрадлівы голас седака.— Ды праўду сказаць, жыву я тут нядаўна! А яшчэ сказаць, дык я ня зусім просты чалавек!

— Ну? А хто-ж ты? З паноў ці як?

— Я гарадзкі чалавек. А тут зрабіўся індустрыяльным чалавекам, а зямлёю мала займаюся.

— Я і падумаў так! Кабылка твая ледзьве цягне. Мусіць, не даглядаеш яе, як трэба... А чым ты займаешся?

— Вырабляю самапрадкі... Дык завёз на рынак, прадаў, ды еду цяпер дамоў.

— Што-ж, добрая справа! — сказаў Цяліца, каб толькі што-небудзь сказаць.

Піліп пачаў выкладваць:

— Раней я ў горадзе быў, а тут жыву толькі гадоў 5, ня болей. Як пайшоў я туды з 16 гадоў, дык толькі цяпер зноў сюды заявіўся, няхай яно прападзе!

— Што, зноў хочацца ў горад?

— Цягне мяне туды, як магнэсам! Ці-ж там такое жыцьцё? Чыста ўсё, анцілігентна. Разумныя людзі жывуць, і гэта самая індустрыялізацыя. Ці зіма, ці лета, а ўсё шуміць, гудзіць... А тутака як пачнецца восень ці вясна, дык адна утопія, па пуза ў гразі плывеш!

— Затое ў вёсцы спакайней, а летам дык нідзе няма лепш. Вось я сам да 15 гадоў жыў у бацькі на вёсцы, а цяпер зноў хочацца туды.

Піліп скэптычна зірнуў на Цяліцу і, расьцягваючы, махаючы пугай на кабылу, заўважыў:

— Вось як! Што вы скажаце? А я дык ніколі-б не хацеў з гораду. Чаго сюды лезьці, калі там табе ёсьць месца... Мой бацька яшчэ жыў. А ў яго сыноў было, як бобу. Трох на вайне забілі — двох на царскай ды аднаго на нашай вайне. А яшчэ двое нас братоў засталося. Ды

яшчэ, праўда, тры дзеўкі цэлы, ну ды іх што-ж? Іх ніхто не пазабівае, ня ходкі, значыцца, тавар. Вось яшчэ перад вайной, як мне было 16 гадоў, бацька і паслаў мяне на заработкі ў горад. А там быў адзін наш чалавек, ён і ўпіхнуў мяне на работу.

— На заводзе быў?

— Не, ня прышлося! Мясіў ды пёк абаранкі, булкі, ды ўсялякія крэндзелі-мэндзелі. А быў я, прызнацца вам, дужа спрытны хлапец. Проста вулканізацыя, а не хлапец, як сказаў адзін праежджы на мяне. Ну мне хутка далі яшчэ павышэньне!

— Чын? Які?

— У цукерню перацягнулі. Ну, вядома, тут мне ўжо лепш стала. Грошы завяліся. Апрануўся пагарадзкому, хаджу, пасьвістваю, як вольную гадзіну ўлучу... Пачаў папяросы пыхкаць, партабак сабе завёў.

Цяліца засьмяяўся. Прыпамятаваў, як ён сам пачынаў сваю кар'еру ў горадзе і рабіў таксама, як і Піліп.

— А здароў я быў, дык нічога мне ня шкодзіла! Усе дзівіліся. Цэльны дзень працую, а ўтомы няма. А к таму яшчэ быў я правільным чалавекам, чужога ня браў. Для гаспадара я, вядома, знаходка, залатыя рукі, ногі і галава. Куды ні пашлюць мяне, што ні загадаюць — усё агнём гарыць, смалой смыліць. А за дзеўкамі ні-ні! Ні божа барані!..

— За дзеўкамі ні-ні?!

— Ну слава пра мяне пайшла. Зэлік (мой гаспадар) не нахваліцца мною. Выслаўляе мяне, а я яшчэ больш выціскаюся. Вядома, дурань быў, ня думаў, на чыё пуза працаваў.

Піліп смачна плюнуў: «Пра сябе дык і ня думаў!»

— Зразумела, на Зэліка працаваў! Пэўна, цяпер не пайшоў-бы да яго?

— Цяпер плюхнуў-бы ў морду, каб пабачыў. Кажуць, зьехаў у Маскву і ўжо сядзеў у турме за нейкія гешэфты... Вось цяпер адны транты* нашу, ды сам сабе цар. А тады працаваў на гэту самую капітаклізму. Вы ведаеце Савойю?

— Савойю? Як жа? Некалькі разоў заяжджаў! Можа і цябе бачыў там!

— Можа і бачылі. Ды пэўне-ж, бачылі, калі заяжджалі.

— Ну?

— Часта я хадзіў туды па справах ад Зэліка.

А гаспадар «Савойі» і заўважыў мяне. Дужа я ўмсу

яму падладзіць. Іншы раз і сунець гасьцінца ў руку. Ну і звоніць ён мне раз па тэлефону: «Піліп,— кажа так у тэлефоне, а я чую, ды на вус матаю,— зайдзі, кажа, да мяне, справа ёсьць!» Зэлік-жа ня пушчае. Здагадваецца, у чым тут справа і якая тут загвраздка! Кажа мне: «Ня йдзі да яго! Мішугенэ будзеш, калі пойдзеш! Ён цябе зьесьць і пэтрахаў не застанецца... Уй, гэта-ж абдзірала, абскубала! Заставайся ў мяне, я табе накіну яшчэ пяцёрку. Дзе маё ні прападала?!»

— А ты пайшоў?

— А я ўлучыў хвіліну ды пайшоў у «Савойю». Хочацца мне ведаць, якая там справа. А там кажуць мне: «Заставайся за нумарнога, а на Зэліка плюнь ды растапчы. Вось табе трыццаць рублёў на ўсім на гатовым, ды яшчэ гасьцінцаў будзеш мець ад прыежджых». Угаварылі мяне.

А Зэлік ні блізка, і нагамі і рукамі махае перад самым носам. Захапіў мае манаткі, пад замок іх, ды яшчэ, падла, судом грозіць, што я па дагавору не дабыў і ў страты яго ўвёў. Тут я як разышоўся, як грыману на яго: «Не хачу больш вазёкацца з тваімі лахардзікамі*! Давай плату!» А ён: «Я табе нічога не заплачу, ні капейкі гарэлай!» А я: «Калі не заплаціш, судом выцягну, ці задаўлю, на бісхаім маліцца пашлю ды яшчэ ўсім раскажу, што ты кладзеш у лахардзікі свае».

— А што ён клаў?

— Ат! Самую тухляціну возьмуць, падсмаляць, падсалодзяць, а паны ядуць ды васлаўляюць. Ну як запалохаў я Зэліка, той і збавіў крык. Перайшоў я ў «Савойю». Вось дзе жыцьцё пайшло, дык і ў сьне ня бачыў. Днём і ноччу ўсё круціцца. Тут ужо распуста пачалася, ды шалёныя грошы. Тут ужо перастаў правільным быць. Прыедзе які-небудзь купчык з галоўныя Масквы, тут яму, як мартыха, дагаджай: пастаў, прыбяры, схадзі туды-сюды, а часам скажа ўзяць фурмана ды прывязьці паненку...

— І гэтым займаліся?

— А то як-жа? Ды яшчэ накажа, каб v капелюшы была, пад зонтай хадзіла, ды каб маладая, каб вочы гарэлі, каб было і тут і там. (Піліп рукой ілюстраваў свае словы.) Ну, нацалуецца, намілуецца купчык, дзесятку якую суне ў зубы, ды кацісь каўбасой. Адводзіш яе да прыстані, дзе жыве, а перад гэтым яшчэ да сябе зацягнеш, ды каб ведала маё дабро, сам з ёю ўцешышся.

— Эйш, брат! Лоўка ты выдумаў!

— А што-ж? Навука нядоўгая. Яны ведалі, што абы-

якую ня возьмеш, з вуліцы не прывядзеш, ну, адным словам, ад мяне залежыць.

— Весела табе жылося,— сказаў Цяліца. Яму ня прышлося паспытаць вясёлага кабацкага жыцьця. Папаў у чынадралы, ды яшчэ рана ажаніўся. Нават ня ведаў, што такое іншыя жанчыны.

— Ня дужа весела! Працы шмат было, асабліва калі мяне неўзабаве паставілі за старшага над нумарнымі. Тут я зусім зьвіхнуўся. Працую, працую, бегаю, бегаю, а як толькі вольны дзень, дык нямаведама, што раблю. На цэлы дзень забяруся куды-небудзь з мілашкамі, п'ём, усяго пробуем, а к раньню грошай як і ня было. Дзеўкі апаланілі мяне, ня вырвацца мне з гэтага пекла. Ды самі лезьлі, як на ражон які.

— А можа за грошы?

— Можа і за грошы. А грошы вадзіліся. Бацьку дык дужа рэдка пасылаў. Так якую траячку на старэцтва спасылаеш. Распуста ўсе грошы забірала. А распусты было, дык і ня ведаю, ці ёсьць цяпер такая ці не?

— Ёсьць і цяпер, толькі менш. Закон карае.

— А рабочага сазнаньня ня было! Ай дзе яму быць, падумайце самі! Пакруцішся каля паноў, пасмакуеш іх паскудства, ды і сам засьмярдзіш, сам пачынаеш на сваіх зьверху глядзець.

— Ну, цяпер ня так!

— Ня ведаю, толькі вось нядаўна я быў у горадзе, бачыў сваіх старых фіцыянтаў, дык яны і цяпер ня горш жывуць, а яшчэ і вальней. А на мяне і зірнуць ня хочуць. Што я? Лапатнік! А падачкі, як і раней, бяруць, як уюны круцяцца. Праўду кажуць, што наша лёкайская група да соцыялізму тупа.

— Дык цябе туды ня ўзялі?

— Я і не прасіўся. Неяк брыдка зноў пачынаць. А тут ужо гаспадарку, жонку завёў, дзяцей нарадзіў. А праўду сказаць — зямля ўцягнула... А тады... тады маладым быў, гарачым. Як у рыбы, было малачайніку. Ну і збываў сваё здароўе, каму трэба, каму не.

— Цяпер угаманіўся?

— І цяпер яшчэ на баб не магу спакойна пазіраць. А тады быў першы змусьціцель. Паверыце ці не...

Піліп засароміўся і шэптам даказаў. Цяліца пачаў круціцца на калёсах. Любіў ён такія п'яныя размовы, хоць і здавалася яму, што хлусіць Піліп. Запытаўся ў яго:

— А сам нарваўся калі?

Піліп не зразумеў пытаньня.

— І мне часам пападала! За адну халеру ледзьве ў турму не запетавалі. Зьвязаўся я з ёю, дзеўка так сабе была, можна сказаць,— дужа прыгожая была. А вясёлая, значыць,— не прывядзі божа, ратуй. А грошы яшчэ больш кахала, чым мяне. Ну і падвярнуўся да яе купчык...

— З галоўныя Масквы?

— Не, з Клінцоў!

— Гуляшчая была?

— Не! Толькі яшчэ пачынала сваё мадонства. Прывёз яе адзін раз да купца... Пачаў перамальваць ён яе, каб у Клінцы пераехала. Мяне злосьць бярэ.

— А табе што? Жаніцца думаў, ці што?

— Не! Ды як-жа. Можна сказаць, у людзі яе вывеў, абагаціў...

— Затое-ж і з дарогі зьвёў.

— Ну, як было, дык было! Пасьля мяне яна круцілася. Мне што: круціся сабе, як вятрак. А тут папярок горла стаў буржуаз гэты. Дыхаць не магу, як падумаю, што яна зьнюхалася з ім і думае яшчэ замуж за яго.

— Ня ўзяў?

— А вось падумайце! Узяў! Пасьля рэволюцыі ўжо, і цяпер з ёю нэпам заварачвае. А па праўдзе сказаць, агонь была! Без яе цяжка жыць, калі зьвязаўся.

— Гэтым усё і скончылася?

— Не! Як падкаціла мне пад сэрца злаба, як варваўся я да яе. Захапіў іх на самым, як кажуць, саботажы. Ён мяне выпіхваць, кулакамі пагражаць. А я ня тут то быў: схапіў за шкірку буржуя, трасу яго ды крычу, як шалёны: «З кім ты бярэшся, гад? Я-ж цябе расьцягну, як мышу якую!» Ну і расьцягнуў. Адну нагу выкруціў, ды да морды пячатку прыклаў. А сам ходу. Адлежыўся ў больніцы, ды бах у суд на мяне... А тут вайна, мобілізацыя, так і замаглявалася* усё. Савойя неяк замасьліла. Толькі штраф заплаціў.

— На вайне ня быў?

— Быў, ну нядоўга! Паранілі. Вось сюды прахапіла наскрозь. Месяцы два ляжаў бяз ніякае жывасьці. У сваім-жа горадзе ў шпіталі быў. Савойя і тут мяне абараніла. Дужа я патрэбным быў. Далі мне белую. Дахтары мяне ведалі. А з вайной што тут рабілася?!. Афіцар'ё ды генэралы панаехалі. Бабы нейкія новыя намазаныя наляцелі. Шмат было працы. Як перад пагібельлю шалелі. Савойя рэсторан яшчэ адчыніла. На маю долю рублёў 200 у месяц прыпадала.

— Усё прахам пайшло?

— Як ішло ўсё махам, дык і пайшло прахам. Самі задавіліся і мяне прыдушылі.

— Цікава ты гаворыш! Давай яшчэ вып'ем троху. У мяне ёсьць.

Цяліца выцягнуў бутэльку, глынуў нагбом і перадаў Піліпу. Той прагна дапіў. Гэта была ўжо не гарэлка, а нешта цягнучае, салодкае, смачнае, чаго ўжо даўно ён не каштаваў і пра смак якога забыўся.

Кабыла ішла пад гару. Напружвала ўсю моц, каб усьцягнуць воз, але седакі не зьвярталі ўвагу на кабыліны мукі. Гаманілі.

— Як ты з гораду сюды папаў?

— А як пачалася разруха, ды яшчэ другая вайна, жыць у горадзе цяжка стала. Мяне, праўда, на вайну не забралі, як у мяне белая ды яшчэ раненьне. На гэта і наварочваў. А есьці нечага. Паны некуды зьніклі, як памялом вымелі бальшавікі. У галаве маёй нейкая разруха. Новы рэжым — на мітынгі бяжым. Слухаю ўсё, а пра бульбу ды хлеб думаю. Думаю, як-бы да бацькі дабрацца. Спачатку ў сталоўку зачасаўся. А што там? Елі такое, што і сабакам лепш жылося. Ды яшчэ гэта півальвацыя зрывала курс. Нічога нідзе сьцягнуць немагчыма. Кожны над кавалкам дрыжыць. Армія і тая падыхае, ня толькі я. А яшчэ хутка мяне скарацілі, як даведаліся, дзе і як я раней працаваў... Стаў я голы і босы, як апостал. Прыпала так, што збыў сваё дабро, ці, як кажуць, прадметы экіпіроўкі. А работы ніякай. Усе лічаць мяне прымазанікам буржуазіі. Ну, я і паехаў да бацькі.

— Тады толькі на вёсцы можна было сяк-так жыць.

— І я-ж так мысьліў. А як прыехаў — не па сэрцу мне. Гразь, утопія, жывых людзей няма. Усё думаю пра горад. Там прыйду на кватэру, на белую ложу лягу,— хоць голадна, ды чыста. А ў бацькі сьвіньні, цяля ў хаце. Ды яшчэ гоніць мяне вон.

— За што?

— Кажа: чаго прыехаў, шалыган*? Што ты прывёз мне? А я яму нічога ня прывёз. Ня столькі бацька злуецца, як брат. Яго бацька перад гэтым ажаніў, дык ён думае, што я яго долю адбіраю. А мне зайздросна. Падходзяць гады, што і самаму трэба племя мець. Тут і вышла аблігацыя.

— Ну?

— Брат мой не фукульцяпісты, а жонку караваху ўзяў, мерцьвяка і таго ўзьніме. Жонка — як яешня, а брат — шкілет, ды яшчэ палусьвет — на адно толькі вока бачыць. Хоць і праўду кажуць, што мужык гладунцом ня бывае,

а я яшчэ ня дужа згаладаўся. Кроў клёвала во як! Ну і вышла падпольная сытуацыя!

— Не разумею!

— А тое, што падкаціўся я да братавай жонкі. З гэтага ўсё загарэлася. Прагнаў бацька мяне. Не хацеў я з ім судзіцца... Гора маё такое было, хоць мату прадайся.

— Бацька табе нічога не даў?

— Яго худобы я і ня ўзяў бы. У яго нічога няма, а мяне яшчэ ўзялі ды прысудзілі алімэнты аднэй дзеўцы.

— Ну, брат, і зух ты! Такіх я ня бачыў.

— Быў грэх! Ці бяз гэтага абойдзешся? Была адна дзеўка. А звалі яе Суклета Самец...

— Так і звалі?

— Калі ня верыце, я вам і двор яе пакажу. Якраз мы пад'яжджаем... Ну, грэшным чынам, было ў нас з гэтым Самцом. Толькі не адзін я быў, а былі і другія. Ну, і наявіўся ў яе плод любові няшчаснай. Бацькі яе на мяне ў суд. А я ня дурань. Бах заяву, што радзіцелі (так і пішу) азначанай дзявіцы Самец наводзяць на мяне паніку і даюць мне моральную аплявуху. І пішу яшчэ, што зачыншчыкам і застрэльшчыкам у гэтай справе я ня быў.

— Вышла што-небудзь?

— Не, нічога. Прысудзілі мне. А толькі дзіцё скора памерла, і я ні ў прычыне застаўся. Што мне было рабіць: бацька прагнаў, усе касавура глядзяць... Быў тут адзін самапраднік, я да яго, пачаў пасабляць і хутка навучыўся рабіць гэта бабскае прычэльле. А пасьля кампаньёнам стаў. Скалаціў троху грошы ды купіў у Саўхозе сьвіран за 120 р. Ну выйграў на гэтым — пакуль перавёз яго да сябе, дык 200 руб. яшчэ ўзяў за адну цэглу. Хату будую на 2 паловы. Ну, ажаніўся. Вось і ўся мая валакіта.

Здалёк, з-за прыгорку, высунулася царква.

— Гэта і ёсьць нашыя Праскуркі,— заўважыў Піліп.

— А! дык у вас і царква ёсьць. А ты ходзіш у царкву, прызнаеш Бога?

— Няма калі ў царкву хадзіць, а да папа іншы раз заходжу. Ён праз вуліцу жыве, на самым канцы сяла. Ну і хітры чалавек, скажу я вам. Чыста жыве, хоць і ў хату затурылі. Умее жыць на чужым гарбу. Ды і то сказаць — заработкі лёгкія. Адшалдакаў, адбалдакаў ды гарні грошы ці хлеб.

— А ў царкву народ ходзіць?

— Царква ня пустуе, а поп наш перадавы, дужа ўмее падыйсьці. Дужа ціха жыве, нават сялянам заявы піша і нічога за гэта не бярэ, а за тое на другім, па сваёй спэ-

цыяльнасьці, зьдзярэ, як трэба. Мяне цікавіць, што ён рабіў бы, каб царква запуставала. А то, як пост — народ такі-сякі валіць, праўда, усё старыя. Шмат гэтых самых гавеньнікаў.

— Ну, а ты гавеў?

— Ды не! Мне нялоўка. Я-ж усё-ткі гарадзкі чалавек!

Пад'яжджалі да вёскі. Направа і налева яе, амаль што каля самага шляху, былі сады і паркі, як відаць, былых паноў. Піліп, паказваючы пугай, тлумачыў:

— Тут быў маёнтак Бэкэндоршы. Вунь у тым пакоі, дзе вокны вялізныя, панская лажніца была, а цяпер ячэйка. А тут быў другі маёнтак. Панок жыў, а сын быў неўдалюга, ну а на баб дужа войстры.

— Як і ты?

— Цяпер у турме сядзіць.

— За што?

— У яго хацелі адцягаць зямлю ды дом, а ўсё выкручваўся. А вось ужо гады два як выселілі яго. Ну, яму ня ў нос, помсты хочацца. Падгаварыў дурылу аднаго, той і падпаліў яго былы дом. А тут была дзеўка, з якой ён абшархаўся, а як наявіўся дзіцёнак, дык і не захацеў жаніцца. Кажа ёй: «Мне з табой ня жыць. Хто ты? Я цябе ня ведаю». Ды ажаніўся з другой. А першая і абвясьціла ўсё. Яго, галубка, і забэхалі ў турму. А ўсё з-за таго, што ў моду ўлезла гэта самае мнагажонства, ці палітэізм, як кажа наш поп.

Кабыла, пабачыўшы вёску, паняслася трухам і падвязла Цяліцу да новай, яшчэ не адбудаванай хаты. Насустрэчу вышла маладая прыгожая кабета з высокімі пружыністымі грудзямі. Пачала адпрагаць кабылу, а гасьця запрасіла дахаты.

Хата была чыста ўбрана, але вельмі бедна ўсё выглядала. Адзінай аздобай хаты быў добры дубовы ложак, які быў засланы расьпісною коўдрай і завалены гарой падушак, ды яшчэ варштат, на якім Піліп рабіў «бабскае прычэльле».

Піліп увайшоў у хату.

— Бачыце, якая аказэя. Хата гэта нам бокам вылазіць. Прашыкаліся на яе, што нечага есьці. Людзі скарамяціну ядуць, а мы адну бульбу, нечым і пачаставаць вас. А тут яшчэ карова, няхай яе агні высмаляць, цялілася, цяля прадалі, а даіцца не дае. Хоць вый! Пасварыўся з жонкай! — уздумала шаптуху да каровы запрасіць!

— Нічога. Глупства! — сказаў Цяліца.— Вось грошы,

прыдбай дзе-небудзь яец ды малака, ды яшчэ што ёсьць. Разам і папалуднуем.

Піліп узяў грошы і вышаў.

У хаце было трое дзяцей. Старэйшаму хлопчыку было гадоў 7, а двое былі зусім маленькімі.

«Набрахаў Піліп, а я і вушы разьвесіў. Казаў, што жаніўся гадоў 5, ня больш, а дзіцёнак гадоў 8»,— падумаў Цяліца.

Праз хвіліну яешня праглася на патэльні, а Піліп прынёс яшчэ піва. Цяліца запытаўся:

— Ты мне казаў, што жывеш тут усяго 5 гадоў, а ў цябе трое дзяцей. Нешта дужа спрытны ты!

— Большы хлопчык — ня мой, гэта яе,— паказаў ён на жонку, якая зараз-жа вышла з хаты.

Піліп наблізіўся да Цяліцы і, як лепшаму прыяцелю, прызнаўся:

— З дзіцем я яе ўзяў. Казалі мне ўсе — не бяры яе, яна круцёлка. А мне спадабалася, нешта ўсё роўна, як тая гарадзкая. Ну і што-ж? Я жонку ня зьвіняю. З нізавымі органамі нічога не паробіш. А яна была маладая, прыгожая.

— Ого, яна і цяпер маліна!

— Тут падвярнуўся адзін гад, дык і вышла гэта прыключэньне.

Рукой Піліп паказаў на хлопчыка.

— Дзе ён цяпер?

— У сьвеце недзе. Быў агэнт з прадкому. Мадаміст быў. Кажуць, цяпер там на Каўказе жанілася гэта пералётная птушка. А жонку я люблю і ня памятаю. А за што люблю, што яна майстрыца гатаваць стравы. Мой гарнізон дужа пераборлівы, а яна ўмее здобнічкі пячы, каб толькі было з чаго!

У хату ўвайшла старая кабета з шапарлівым хітрым голасам. Зрабіла нейкія мігі і разам з гаспадыняй вышла на панадворак.

— Гэта шаптуха Аўдоцьця, пра якую я вам казаў,— дадаў Піліп.

— Карову загаварваць будзе!

— Жонка кажа, што няхай паспрабуе, а то малако перагарыць... Пра Аўдоцьцю слава на ўсю ваколіцу. Кажуць, яна ўмее нават лячыць ад няправільнага жывата.

Цяліца з Піліпам вышлі зірнуць на карову.

Піліпава жонка трымала за рогі карову, якая зьдзіка глядзела, упіралася.

Шаптуха касавура зірнула на новага чалавека.

Піліп супакоіў яе:

— Ня бойся, гэта свой чалавек. Я ў горадзе з ім жыў.

Аўдоцьця пачала мацаць вымя, ногі, пахі і пуза каровы. Шаптала нейкую малітву. Прыежджы разабраў толькі частку яе, і гэта засела ў галаве, як вынік усяго дня:

Ня дай ёй, госпадзі, красульцы
Ні нажнога ляганьня,
Ні хвастовага маханьня,
Ні раговага баданьня!

## КОЛЕКТЫЎ ЯЎМЕНА

### I

Дарагія госьці прыехалі да ўдавы Домны Лямцюговай — дачка Адарка і зяць Хвёдар! Дачку яна ня бачыла дужа даўно, здавалася ёй, ці ня з таго часу, як заварылася гэтая каша, як народ на народ пайшоў, як паноў пачалі рэзаць ды вяскоўцам волю далі! Тады і пачалося гэта новае жыцьцё! Домна кінула вёску ды пачала з сынам Яўменам жыць на гэтым пасёлку, які людзі празвалі «комунай Яўмена». А як аддала замуж сваю ядыную дачку Адарку ў чужую, дальнюю вёску, вярстоў за 50, дык зусім адна стала жыць на гэтым, туды яму дарога! колектыве. Ня любіла Домна гэты колектыў і колектыўшчыкаў, ой як ня любіла. Хоць і жыла з сынам, у якога была жонка Матруна і маленькі сынок, але ўсімі думкамі рвалася ў старую вёску, у якой жыцьцё амаль што не зьмянілася! А тут, на пасёлку, Домна часта шкадавала сябе, адчуваючы поўнае адзіноцтва: жыву, як колас у полі, адрэзана ад Бога і людзей! «Колектыўшчыкі» — паводле яе думак — гэта ня людзі, а д'яблы, якіх Бог калі-небудзь ды пакарае!

Домна частавала сваіх гасцей, чым было. Госьці елі са смакам, бо праехаліся, а яна скардзілася на сваё жыцьцё.

Зяць Хвёдар сядзеў на лаўцы каля вакна, еў мала, а больш пыхкаў піпкай ды аглядаў хату.

Хата была новая, на дзьве палавіны. Дзьверы ў другую палавіну былі адчынены — там брыкала цялё, пад печчу скігатала парасё, па хаце спацыравалі дзьве чубаткі і певень. Вокны былі вялікія, сьветлыя, падлога роўная, чыстая.

А Домна скардзілася:

— Што толькі ў нас дзеецца, дык вы й веры не дасьцё! Яўмен перавярнуў усё дагары нагамі. Мазгі мае — як не

мае! Сама ня ведаю, ці я жыву, ці мяне ліхаманка калоціць. Усё па-новаму, па-новаму...

Адарка заўважыла:

— У Нямеччыне як быў, нагледзеўся, а пасьля ў Чырвонай Арміі шышкай быў, дык цяпер і сам ня ведае, хто ён.

— Быў сын, як сын. Хоць бедна, ды ціха, супакойна жылі. Ты служыла ў пані, так-сяк патроху жылі. А цяпер на панскую зямлю селі, дык чыста адурэлі, як калясо, усё круціцца...

— Не, пра паноў кіньце! — загаварыла Адарка. Мала яны наштурхалі нас? Мала я ад пані гора бачыла? Восем пудоў важыла: прыбяры, перавярні гэта жлукта з боку на бок, ды яшчэ пасадзі ў фаятон, сама не магла ўзьлезьці. Адзін раз стала на падножку, дык і ўсю біньдзюгу перакуліла.

А ўсё ў Бога сьмерці прасіла. Бывала, прыду я да пані, як ужо цара скінулі, а яна ляжыць ды стогне, ды Бога просіць, каб хутчэй памерці, ды ня бачыць, як дабро яе расьцягваць будуць. А ведала яна, што гэта будзе, разумная паня была.

— У самую бальшавіцкую рэвалюцыю выпруцілася*, як быццам ведала, што канец панству прышоў!

Хвёдар сказаў:

— Што й гаварыць! Каб паноў ня выгналі, дык Яўмен не адбудаваў бы такой хаты!

Было відаць, што Хвёдар зайздросьціў Яўмену.

Домна заўважыла гэта і сказала нездаволена:

— Адбудаваў, адбудаваў, хоць ваўкоў ганяй! Стадола*, а ня хата. Нават супакойна заснуць нельга... Усё здаецца, што нехта ў вокны глядзіць.

Хвёдар зарагатаў і запытаўся:

— На што Яўмену вокны такія вялікія?

— Вярзе такое, што і ў галаву не палезе: кажа, што трэба, каб паветра ды сонца было больш! Я яму колькі разоў казала ды лаяла. Халера на цябе, кажу яму, сваімі вокнамі толькі косьці мае старыя прастудзіш. Трэба, каб дух быў у хаце!

— А што Яўмен кажа? — зацікавіўся Хвёдар.

— А Яўмен усё трубіць: трэба па-новаму, па рэвалюцыі, жыць. Трэба, каб у хаце нейкая кубатура была!

— Кубатура? — разам перапыталіся і Адарка, і Хвёдар.

— Але-ж! Кубатура! Я і ня ведаю, што гэта. Яўмен цяпер шмат балбатні ўсякай гародзіць, усё нейкія модныя,

перакручаныя словы вярзе ды ўсё палец уверх узьнімае. Вось глядзі, Адарка!

Домна паспрабавала перадражніць свайго сына Яўмена, але нічога ня выйшла. Троху памаўчаўшы, прыбіраючы са стала, сказала:

— Сягоньня відаць вернецца Яўмен. Пашоў на перавыбары, а Матруна да суседкі пашла, ды яшчэ дагэтуль няма. У нас жа хата ад хаты на вярсту.

Хвёдар усьміхаўся і глядзеў на чыстую падлогу. Яму хацелася плюнуць, але нейкае нязвычнае пачуцьцё чыстаты стрымлівала яго. Нялоўка адчуваў сябе ў гэтай хоць мужыцкай, але чыстай хаце. Урэшце падняўся, выйшаў у другую хату. Вярнуўшыся, сказаў, зірнуўшы на кут:

— І праўда, у вас усё па-новаму. Вунь і багоў няма. Разбазырылі. Ці ня комуністам зрабіўся Яўмен?

— Блізка што так! Ужо больш году, як вынес усіх багоў! Цяпер жывём, як паганцы!

Адарка ўстрапянулася:

— Як жа так? А ты нічога? Куды-ж ён іх?

— Хто-ж яго ведае,— супакойна адказала Домна. Адзін абраз я схавала, забараніла, можа, і ўспомніць калі-небудзь Бога, можа, і прыгадзіцца на ўсякі грэх. А толькі, Адарачка, адступіўся ён ад нас. І маліцца ня моліцца нейк! Як атруціў нехта! Пабягу іншы раз да Гапкі, у яе хата абстаўлена ўся абразамі. Бягу, думаю: памалюся там ды паплачу, а прыбягу туды, як лёд паклаў хто ў сэрца. А яшчэ як прыслухаюся, што вярзе на Бога Яўмен, сынок мой, дык і ахвота маліцца прападзе! Як паганцы ў граху жывём.

Хвёдар засьмяяўся:

— А мы дык няшчасныя людзі! Няма ў нас ніякае кубатуры!

Хвёдару вельмі спадабалася гэтае слова, і ён некалькі разоў са сьмехам пераказаў яго.

— Табе сьмех, а мне гора,— зьвярнулася да яго Домна. Хаджу як голая ў гэтай кубатуры. Куточка цёплага няма ў хаце. Пустэльня! Усё сьніцца старая хатка: за печ залезем, пагрэемся, а тутака і печы такой няма... Усё па-новаму ў нас...

Адарка запыталася пра жонку Яўмена Матруну. Толькі раз і бачыла яе, як Яўмен прывёз з «віроў». Тады Матруна ня вельмі спадабалася ўсім — фарсістая баба была! Домна адказала, што ўсё было-б добра, але ў дудку Яўмена дзьме і на матку вокам ня зірне.

— Два месяцы ўжо, як радзіла сына! — дадала яна.

Адарка на цыпках падышла да калыскі, асьцярожна рассунула полаг, зірнула і шчыра сказала: вялікі расьці! вялікі расьці! вялікі расьці! Адышоўшы, заўважыла:

— Нічога сабе пузанок! А ружовы які?! Як-жа завуць?

Домна неяк дзіўна ўсьміхнулася і шэптам загаварыла:

— Лепш ня пытайце! Ня ведаю як і сказаць вам, любенькія! Дзіцёначка-ж ня ксьцілі. Як ні прасіла я — нічога не памагло... Яўмен даў сваё імя!

— Ой, ну? Якое-ж?

— Проста грэх. Зусім не чалавецкае імя. Акіянам назваў. Спачатку брыдка было, а цяпер нічога, як быццам другое імя і не падыходзіць.

Адарка аж рукамі пляснула ды галавой заматала.

— Акіянчык! Божа-ж мой! Нейкае ліха ўсьсела на чалавека!

— Яго дурны поп ксьціў,— рэзюмаваў Хвёдар, падымаючыся з лавы.

Ён пачаў разглядаць лёзунгі, плякаты і малюнкі, якія былі разьвешаны па сьценах. Хвёдар ня бачыў сэнсу ў гэтым, дый чытаць амаль што ня ўмеў. Але ўважліва разглядаў пана, кулака і цара, крытыкаваў іх разбухлыя выкручаныя ногі, тоўстыя гумаляставыя зады, хцівыя, заграбастыя рукі і разяўленыя воўчыя зяпы. Гэта ўсё было яму зразумела і бяз подпісаў, гэта, паводле яго думкі, «лоўкая была крытыка». За тое другіх плякатаў ён зусім не разумеў і доўга думаў над імі, аж галава засьвярбела. Асаблівую ўвагу ён зьвярнуў на нейкі даўжэнны ланцужок то вялікіх, то зусім дробненькіх чалавечкаў, якія трымалі ў руках чырвоныя сьцягі. Нічога не зразумеўшы, Хвёдар адышоў убок і, паказваючы на чалавекаў, тры разы смачна плюнуў.

Домна засьмяялася.

— Яўмен кажа, што нельга харкаць на падлогу. Муштруе нас, як чорт які. Ня так стаў, ня так сеў. Трэба ўсё рабіць па канстытуцыі, як ён кажа.

— Твой Яўмен захварэў на панства! Хоць гол пакуль што, дык затое хванабэрыі шмат.

Домна нічога не адказала Хвёдару, толькі пальцам тыцнула ў бок дзьвярэй. Там стаяла зграбна зробленая скрыначка з пяском.

Хвёдар вытрашчыў вочы:

— А-а! Пля-валь-ні-ца!

Домна рэзанёрна перадражніла Яўмена:

— Ня плюй на падлогу, хвароба прыліпне!

Хвёдар падняў на сьмех Яўмена.

Адарцы раптам захацелася ўступіцца за Яўменку. Ёй няпрыемна зрабілася, што яго на сьмех падымаюць. Іншая справа, каб ён сам тут быў, тады, можа-б, яна яго яшчэ б з большым запалам лаяла, а цяпер Адарка прыпамятала, што і настаўніца ім пра гэта трубіла... Набраўшыся духу, яна перабіла Хвёдара:

— А я чула, што харкавіньне высыхае, а там ёсьць нейкія казюлькі, яны лётаюць у паветры і пралязаюць у чалавека...

— І Яўмен слова ў слова кажа,— кіўнула Домна.

Хвёдар падскочыў. Яму дужа не даспадобы было, калі яго жонка Адарка пачынала мудрагеліць ды вырашаць супранатуральныя пытаньні.

— Скуль ты чула лухту гэту? — накінуўся ён на жонку.

— Настаўніца казала!

— Схавайся ты са сваёю настаўніцаю! Торба сьвятая! Казюлькі пралазяць у чалавека? А хто іх бачыў гэтыя казюлькі?.. Чаму мухі, камарня ды машкарня не пралазяць?

Адарка ня ўнімалася.

— Многа ты ведаеш? Цёмны, як гарбуз! Тамака такія казюлькі, што вокам ня ўбачыш!

— Разумная знайшлася! Нехта падпарыў цябе! Калі ня ўбачыш вокам, дык і няма!

Хвёдар не хацеў больш гаварыць на гэту тэму. З практыкі ведаў, што калі ўлезе д'ябал у яго жонку, дык ніякім вожыгам ня выганіш яго адтуль, а толькі наслухаешся розных ня вельмі прыемных для мужчын мянушак. Лепш справіцца з ею дома. Тады ён дасьць Адарцы дыхту!

Адарка падсела да маткі і слухала яе. А матка гаварыла:

— Цяпер уся праца наша па гадзінах вядзецца. Як проклятыя працуем. Вунь, зірні!

— Павесіў плюгавы гадзіньнік, ды мне здаецца, што ўсяродку ў мяне сядзіць, ды тыхае, тыхае!

## II

Дзьверы адчыніліся. Увайшла прыгожая маладзіца. Гэта была Матруна. Дала дзеньдобры, зірнула на гадзіньнік, падышла да калыскі. Дзіцёнак яшчэ спаў. Яна схапіла вядро і вышла з хаты. Домна кінула ёй усьлед:

— Падой спачатку Анпяратрыцу, а тады ўжо Антанту!
Хвёдар заёрзаў на лаўцы ад сьмеху:
— Хвароба на ўсіх вас! На выстаўку трэба Яўмена!
Домна тлумачыла:
— Дзьве кароўкі ў нас, ды кабыла. Нядаўна прывяла дужа добрага жарабочка. Дык Дзянікіным празваў. Спаклалі ўжо Дзянікінага гэтага самага...
Хвёдар памаўчаў троху, а потым пачаў усьміхацца. Як відаць, надзвычайна ўдалая думка прышла яму ў галаву, і ён пасьпяшыў выказаць гэту думку. Лавіў толькі момант.
Домна жалілася, што сын ні ў чым яе ня слухае: прасіла ў Яўмена на хустку, дык ня даў, сказаў, што заробіць у лясьніцтве — тады купіць, а цяпер газэту трэба выпісаць. На газэту ёсьць, а матцы няма!
Домне ўсё, што ні рабіў яе сын Яўмен, здавалася дзікунствам. Каля сьцяны стаялі тры тапчаны, засланыя саматканымі коўдрамі. Домна сказала: Вунь, зірні! Упокат ужо ня сьпім, як у старой хаце. Нарабіў тапчанаў, набіў сенам. Адным словам, як у заежджым двары. Хоць падарожных пускай.
Хвёдар, хітра сьмяючыся, запытаўся:
— Мамка, я чуў, ці праўда толькі гэта, што ты свайго Яўмена ня менш як 8 дзён раджала?
Домна аўтаматычна кіўнула галавой.
Вярнулася Матруна з вядром малака. Радасна сказала:
— Зірні, маці! Анпяратрыца сёньня яшчэ больш дала! Шклянак 30 будзе.
Адарка не паверыла:
— Ня можа гэтага быць! Я-ж ведаю гэтую Анпяратрыцу! Гэта Красулька?
— Не Красулька, а Панедзя!
— Дык Панедзя яшчэ менш давала! Што-ж вы ёй даеце? Нашу-ж Пяцёну, каб яе агні высмалілі, цыркаеш, цыркаеш, усё жыльлё павыцягнеш, а ўсяго таго малака з дзьвюх каровак — крупеню забяліць, ды дзіцёнку.
Матруна пачала падрабязна тлумачыць пра Яўменавы «фокусы» з каровамі, пра турнэпс, бульбу ды буракі, што прыбаўляюць малака.
Домна зірнула ў вакно і заўважыла Яўмена.
Шапарнула Матруне: выгань цялё ды парася, а не — лаяцца будзе.
— Не пасьпееш ужо! Убачыць, дык яшчэ сьмяшней будзе.

Яўмен ужо ўваходзіў у хату. Гэта быў чалавек гадоў 30, абголены, з шырокім тварам, высокім лобам і шапкай белых, як кужаль, валасоў. Высокі рост, шэрыя жывыя вочы, магутныя плечы і выпуклістыя грудзі — усё гэта рабіла Яўмена безумоўна прыгожым чалавекам.

Яўмен быў ня менш рады гасьцям, чым матка.

— Вось добра, што вы завярнулі! Даўно ня бачыліся! Як жа вы жывеце?

Хвёдар глядзеў на Яўмена і ня верыў вачом сваім. Няўжо гэта Яўмен? Сталасьць, самаўпэўненасьць, задаволенасьць! Адказаў усьміхаючыся:

— А што мы? Чапаемся патроху! А вось у вас дык усё дагары нагамі!

Яўмен раней добра ведаў Хвёдара, нават супольна быў з ім яшчэ ў старой арміі.

— Больш,— сказаў ён: — па-старому нельга жыць — затруць. Ды і самому хочацца жыць вальней, чысьцей, хоць троху пачалавецку. Вось на два дні адлучыўся, дык ужо сьвінушнік з хаты зрабілі — цялё ды парасё ўвалаклі!

Матка распалілася:

— Табе праціўна ўсё, што матка зробіць! У цябе няма Бога ў сэрцы! На дварэ-ж мароз, а цялё яшчэ дзіцёнак, няхай хоць пагрэецца!

— Ат! Звыкліся ў гразі жыць! Смрод ды нечысьць! Ёсьць жа цёплая пуня!

Хвёдар усё ўглядаўся ў Яўмена:

— Да цябе цяпер і на кані не пад'едзеш! Усё хочаш жыць на шырокую нагу! Двор вялікі, нават тратувары паклаў...

— Ня сьмейся, Хвёдар! На новым месцы трэба па-новаму і жыць. Я цяпер ніколі не зьвярнуўся-б на старое месца, у вёску. Як падумаю, у якой цясноце ды крыўдзе жывеце вы, дык шкода мне вас!

— Ня вёска, а пекла! Вулачкі, закавулачкі, праваліцца ім. Хата адна на другую лезе! Пажар, дык усё скіпіць! Ні кусточка, ні гаечка. Гола ўсё, як калена. Дрэваў ня любяць...

Дзіцё ў калысцы прачнулася і моцна заявіла аб сваіх правох. Матруна падышла да калыскі. Яўмен запытаўся ціха: а рукі ня мыла?

Матруна адказала: забылася! і пашла да мыцельніка. Яўмен узяў на рукі Акіянчыка.

Дзіцёнак лыпаў вочкамі, плюшчыўся ад зімовага сонца! Адарка ўмяшалася:

— Адкуль ты чысьцёхай такой стаў? Божаволіш! Рукі

пагнаў жонку мыць! А калі нам часта некалі ня толькі памыць, а нават зьесьці, як чалавеку.

— Што другое, а гэта трэба! А то сьвіньням мяшала, з гаршкамі вазёкалася, а потым да дзіцёнка!

На дварэ зьявілася нейкая кучмастая галава і закрычала ў вакно:

— Яўмен вярнуўся ці яшчэ няма?

— Вярнуўся Яўмен — адказаў ён сам: — Заходзь, Зьмітрок! Увайшоў ня дужа стары гаспадар і, даўшы дзеньдобры, адразу перайшоў да справы:

— З раёну прышлі па нашай заяве білеты на выйгрыш. Тады мы ўсе ўзялі ўскладчыну. Па два рублі з двара. Дык ці ёсьць у цябе?

— Ёсьць, ёсьць!

Хвёдар недаверліва паматаў галавою:

— Эйш ты! Ня тое, дык другое, а ўсё вернуць на старое! На што гэта глупства — выйгрышы?

— Выйграеш чорта лысага.

Домна пачала бубнець Адарцы:

— Як на хусту прасіла, дык няма, а чорту ў зубы дык ёсьць.

Яўмен супакоіў:

— Будзе табе хуста, ня зьвер, у лес не ўцячэ, а дзяржаве чаму не дапамагчы! Наша-ж!

— Багата яна табе дала?

— А ці-ж мала? Ці жылі-б мы тут, каб не яна?

Адарка нічога не разумела, на што гэтыя білеты.

— А як ня выйграеш, дык у вагонь кінеш?!

Хвёдар аўторытэтна заявіў:

— Канешне, выйграе чорта лысага!

— Хоць ня выйграем, страта невялікая! А грошы не прапалі, па білетах процанты даюць!

Перайшлі да сваіх сялянскіх спраў. Перабралі ўсё жыцьцё па костачках: колькі падатку наклалі, колькі ўжо сплацілі, колькі жыта намалацілі, які прыплод жывёла дала! А бабы пра лён, пра воўну казалі, пра суседзяў, пра забойствы, пра новых камандзёраў, пра камсамольцаў ды піянэраў, якія ўжо паўсюды расплодзіліся і гнуць сваю лінію! Шмат аб чым ёсьць гаварыць, калі больш як 5 гадоў ня бачыліся!

Госьці начавалі, а як на другі дзень яшчэ ў досьвітку зьяжджалі яны з двара, Яўмен прасіў радню:

— Вясною прыяжджайце. Тады будзе добра ў нас!

— Прыедзем, прыедзем! На твае фокусы, Яўмен, толькі й паглядзець! Здаецца, і сам заварыў бы кашу, зірнуўшы, як у вас усё як у гаршку кіпіць!

## III

Вясною Хвёдар і Адарка зноў наведаліся на Яўменаў колектыў. Па ўсім раёне толькі і гаварылі што пра гэты пасёлак! Як ували̇ліся госьці ў хату, Хвёдар пачаў крытыкаваць:

— Усё нутро адбілі, покуль праехалі па вуліцы. Як у горадзе, брукам выслалі. І тратувары, як у павятовым горадзе. Нават двор і той забрукаваў!

Хацелася яму завесьці доўгія спрэчкі, ды цёшча пасадзіла за стол і пачала частаваць.

Хвёдар захапіў з сабою гарэлку. Тлум падняўся. Зяць разышоўся і пашоў атакай на Яўмена.

— Ты кажаш, што трэба жыць па пляну, дружна, грамадой! Глупства! Грамадой не разбагацееш! Вунь двор брукам выслаў, што з гэтага?! А што далей, што далей будзе? Што будзе з твайго пасёлку? Чуў я, што ты яшчэ нешта замышляеш?

— Што далей будзе? Лепш будзе, чым цяпер!

— Комунію будзеце заводзіць?

— А што-ж? Мы не такія ўжо цёмныя! Наш пасёлак будзе, як у Нямеччыне! Галоўнае ў тым, што ўсё робім дружна, грамадой, па пляну. Цяпер будзе ў нас школа, хата-чытальня. Ніхто нам не дапамагае. Самі!

— На якога радзімца? — не ўнімаецца Хвёдар. На шыю сабе лішні цяжар. Багацеі знайшліся!

— Я ведаю, што з вас ніхто б гэтага ня ўзьлюбіў. У вас заікніся — дык заплююць.

— Скажу табе па праўдзе,— хітра кажа Хвёдар,— я першы забіў бы цябе, каб ты ў нас гэта пачаў...

— Чаму?

— Не даеш супакойна жыць!

— Не даю ў гразі калупацца! Так! Дык у турму сеў бы!

— Што-ж там такое? Гады два адсядзеў бы! За тое радзімца зжыў бы!

Яўмен сьмяецца.

— Слухай, што мы яшчэ надумалі! Цяпер будзем у вольны час гліну вазіць. Абмажам хаты ўсяродку і знадворку. Як у хахлоў будзе: і цёпла і чыста!

Хвёдар робіць сур'ёзны твар, хітра сьмяецца і просіць Яўмена:

— Скажы мне на міласьць, ці ня зьбіраецеся вы свае фіназоміі вымазаць як усяродку, так і знадворку?

Матруна, Адарка, Домна, і нават маленькі Акіянчык, зарагаталі.

Яўмен весела сказаў:

— Сьмяешся ты з зайздрасьці! Бачыш, што ў нас людзі ўзяліся за розум! Доўга спалі, цяпер перасталі быць дурнымі!

Домна стала за Хведара:

— Спалі, а цяпер дык зусім ня сьпім! Апантаная нейкая ўсьсела. Вы толькі паслухайце! Яўмен кажа, што з будучага году будуць разам, кучаю, засяваць зямлю!

Хвёдар нічога не сказаў на гэта, ён пачухаў калена, тады пад пахай, перайшоў потым на сьпіну і, як нейкую таемнасьць, паведаміў Яўмена:

— А ўсё-такі, хоць і культурны ты чалавек, блох у цябе ліха ведае колькі! Ці не гадуеш ты іх на сельскагаспадарчую выстаўку? Дык беражыся, калі кожная з іх ад вальготнага жыцьця будзе па 10 пудоў. Як скокне на ляшку, дык задавіць і цябе і тваю культуру.

— Ну й лухту панёс! — спыніла яго Адарка. Кінь ужо! Насусьліўся! Дагаворышся чорт ведама да чаго!

Вылезьлі з-за стала. Яўмен прапанаваў Хвёдару адпачыць, а сам сабраўся ісьці да суседа, каб забраць у яго газэты.

— І я з табою пайду! — заявіў Хвёдар. Палаюся яшчэ з тваім суседам.

Мужчыны выйшлі з хаты.

Праз некалькі хвілін у хату ўвалілася цэлая куча людзей на чале з Яўменам. Ззаду ўсіх плёўся Хвёдар. Усе былі ў незразумелым хваляваньні. Яўмен прыбег без шапкі.

Бабы ўспалашыліся.

— Што? Што там? Гавары!

Яўмен махаў газэтай і ва ўсю глотку, жадаючы перакрычаць усіх і самога сябе, як на трыбуне, гулка адчаканіў:

— Наш пасёлак выйграў! Гурра!

— Што выйграў, каб табе праваліцца! — сказала матка.

— 5.000 выйграў.

Усе аслупянелі. Ніхто не паверыў гэтаму.

А Яўмен, супакоіўшыся троху, не зьвяртаючы ўвагі на страшэнны тлум, які ўзьняўся ў хаце, гаварыў свайму суседу Зьмітраку:

— Цяпер у нас усё будзе! Трактар, клюб, школа, электрычнасьць...

А матка заўважыла Адарцы:

— Цяпер у мяне хуста напэўне будзе!

# ІГНАТ ДВАРЧАНІН
# (1895—1937)

Ігнат Сымонавіч Дварчанін нарадзіўся на Дзятлаўшчыне ў вёсцы Погіры. Першапачатковую адукацыю атрымаў у мясцовай школе. Працаваў нейкі час настаўнікам. У 1915 г. яго мабілізуюць у войска. У 1919—1920 гг. працуе ў Дзятлаўскім павеце і вядзе культурна-асветніцкую работу, за што быў зняволены ўладамі Польшчы ў Беластоцкі канцлагер. Пасля турмы І. Дварчанін едзе ў Даўгаўпілс, дзе арганізоўвае беларускія настаўніцкія курсы, стварае беларускі тэатральны калектыў і хор. З 1926 г. выкладае беларускую літаратуру ў беларускай гімназіі ў Вільні. Скончыў Пражскі універсітэт са ступенню доктара філасофіі.

І. Дварчанін быў адным з арганізатараў і намеснікам старшыні рэвалюцыйна-дэмакратычнай і нацыянальна-вызваленчай арганізацыі «Змаганне» (1928—1930). За рэвалюцыйную дзейнасць быў неаднаразова зняволены, а ў 1930 г.— засуджаны на восем гадоў турмы. Але праз два гады, у выніку абмену палітвязнямі, ён прыехаў у Мінск, каб прысвяціць сябе культурна-асветніцкай дзейнасці на карысць роднага народа. На жаль, паэта не абмінула рэпрэсія.

У 1933 г. І. Дварчанін, як і іншыя дзеячы асветы і культуры, быў абвінавачаны ў сувязях з нацдэмаўскім «цэнтрам», які нібыта дзейнічаў на карысць буржуазнай Польшчы. У снежні 1937 г. жыццё яго трагічна абарвалася.

У сваіх вершах І. Дварчанін разважае пра нягоды і страты свайго народа, у многіх гучыць рамантычная вера ў светлы дзень, часам балючы драматызм, іншы раз — сцішаная споведзь. Паэт плённа працуе і на ніве асветы. У 1927 г. ён выдаў у Вільні «Хрэстаматыю новай беларускай літаратуры (ад 1905 г.)», якая адыграла вялікую ролю ў школьным навучанні. Напісаў таксама доктарскую дысертацыю пра Ф. Скарыну, рукапіс якой захоўваецца ў Пражскім універсітэце.

## ДЗВІНА

Цячэ Дзвіна шырокая
Да сіняга да мора...
І думкамі далёка я
Лячу ў старыя поры.

Дзвіна, Дзвіна! Ты бачыла
І роскавіт наш і славу,
Ты песціла і лашчыла
Чаўноў крывіцкіх лаву.
І песні з іх магутныя
Прымала ты на хвалі —
Шумелі воды мутныя,
Бы згоду балявалі.
Цяпер — ах, песні йнакшыя
Чутны тут навакола,
Тут людзі ўсе абракшыя
І хмурны й невясёлы.
Не чуцен, рэчка бурная,
На берагох шум веча —
Цяпер тут хаты курныя,
Тут страшная галеча.
Скажы ж, рака удалая,
Вякоў ты вартаўніца,
Як слава падупалая —
Ці хутка быць маніцца?..
Зара ўзышла. Ўжо свет настаў...
І хвалі ўжо яснеюць...
Вітай, сястра! Прамень упаў...
Другія ветры веюць!
Ўжо клікі йдуць гарачыя,
Ні слова больш аб горы —
Нясі гады мярцвячыя,
Хавай углыб, у мора.

## «ТОЛЬКІ ПРОЗА»

У век «рэальны», «век свабоды»
Стала проза ўсім да моды.
Як жа ёй не быць у модзе?
«Проза ўсё ў жыцці — ды годзе!»
Ах! Ганулька дарагая,
Сэрца ўжо тваё не знае,
Што пражытае табою
Той вясноваю парою —
Не паэзія, а проза —
Ўсё: й бярозанька-бяроза,
Што нас скрыпамі прымала
І галоўкаю вітала,
Лісцямі-шалестунамі
Як бы гаманіла з намі.

I за садам тая рэчка,
Што, здаецца, недалечка
Па каменнях булькатала,
Да сябе нас заклікала:
Падысці і падзівіцца,
Як усё цвіце, іскрыцца.
Навакола як прыгожа!
Пахне як жасмін і ружа,
Плотка з вокунем танцуе,
Ясень з вольхаю жартуе.
І той месяц, што з-за хмаркаў
Насустрэч да нас бег шпарка,
Каб, як мы сябе убачым,
Светам нас абліць дрыжачым.
Ах! І песня салавейкі,
Што так голасам жалейкі
Свішча, б'е, перабівае,
Што аж дух у нас займае:
І дзянніцы уставанне,
Нашы мукі расставання,
Ўсё у век рэальнай дозы —
Толькі проза, толькі проза.

## ЛЕАПОЛЬД РОДЗЕВІЧ
## (1895—1938)

**Нарадзіўся Леапольд Родзевіч у фальварку Кур'янаўшчына Вілейскага павета. Сям'я жыла вельмі сціпла, але бацька рабіў усё, каб даць хоць невялікую адукацыю дзецям, а іх было восем. І ўсё ж сродкаў не хапала. Калі Леапольду мінула 14 гадоў, ён з сястрой Ядвігай пайшоў з дому «на свой хлеб».**

**У Вільні пазнаёміўся з дзеячамі «Нашай нівы» і пад псеўданімам Мікула Грымот надрукаваў некалькі вершаў і невялічкіх апавяданняў.**

**У 1912 г. семнаццацігадовы юнак напісаў многаактовую драму «Блуднікі». Як ні стараўся Л. Родзевіч выдаць і паставіць на сцэне гэту п'есу, так нічога і не атрымалася. П'еса была забаронена.**

**У гады першай сусветнай вайны Л. Родзевіч апынуўся ў акупіраванай немцамі Вільні. Вершы гэтай пары былі прасякнуты тэмай барацьбы супраць эксплуатататараў.**

**Увесь час Родзевіч прымае актыўны ўдзел у палітычнай барацьбе. Яго творчая праца над мастацкай літара-**

турай была нібы дадаткам да палітычнай і публіцыстычнай дзейнасці. І гэты дадатак быў не такі ўжо і малы. Усяго ён выдаў шэсць невялічкіх кніжак з драматычнымі творамі і вершамі. Многае, на вялікі жаль, зусім не трапіла ў друк.

Здарылася так, што літаратурныя творы, якія і сёння з цікавасцю чытаюцца, амаль невядомыя нашым чытачам. Л. Родзевіч, як і шмат палітычных дзеячаў таго часу, жыў пад рознымі імёнамі. Зусім нядаўна сталі вядомыя некаторыя яго псеўданімы: Антось, Антон, Ігнат, Антось Замежны, Замежны, Лявон, Жыцень і яшчэ шмат іншых. Больш значныя творы ён падпісваў псеўданімам А. Сталевіч.

У 1934 г. Родзевіч быў арыштаваны і стаў ахвярай таталітарнага рэжыму. Ён не толькі не паспеў сабраць сваіх твораў, раскіданых па часопісах, але нават не пакінуў ключа да разгадкі шматлікіх сваіх псеўданімаў. І не засталося сярод жывых тых, хто б ведаў, калі і як называў сябе пісьменнік.

Лепшымі сваімі творамі, верным служэннем роднаму народу Л. Родзевіч заслужыў добры ўспамін пра сябе.

## ЗАКЛІК

Брат мой мілы! Ты хмарней хмары, чарней зямлі. Вочы, поўныя слёз, няпэўна, трывожна перабягаюць даль. Ты блудзіш!

— Брат мой мілы! Падарожны нашых непраходных пушч. Грозныя буры цябе аглушылі. Халодная цемра асляпіла. Знемагла цябе галодная бяда...

Спыніся, брат мой, прысядзь на прызбе маёй хаты вясковай, пахілай і дай пачуць сваё новае слова аб мудрай задуме засеянага поля, аб прарочым гомане векавечнага бору, аб нашым блізкім, родным... Распелянай душу сваю ад залатых кос сонейка і сінявы нябеснай. Хай здаровая нагата яе будзе ўміленнем у сумную часіну.

Калі ж ты шукаеш Бога, каб напоўніць, сагрэць і асвяціць душу сваю, дык увайдзі, брат мой, у маю хату вясковую, пахілую. Там ты без малітвы і слоў, усёй істотай сваёй пачуеш, уразумееш Бога. І будзеш радасны.

Калі ты, безнадзейны, няўсцешны, нічога не шукаеш, бо дагэтуль знаходзіў толькі церні і роспач, калі цень смерці заступіла красу і ўцеху жыцця, а небыццё вабіць у бяздонную цемру, дык схамяніся, брат мой, і ўвайдзі ў маю хату вясковую, пахілую, дзе багуе каханне і гаспада-

рыць праца-весялуха. Там на стале, адліваючы срэбрам, красуе даматканы абрус, на ім ляжыць пахучы хлеб, соль у бяроставай ступачцы, а ў паліваным жбанку сыта-сытная. Адтуль відаць, як рожавеець бела-ліловы золак. Там на Вялікдзень абразы на покуце ахарошваюцца дзеразой, а на Сёмуху пахне яірам пасыпаным. Там скаголенне злой, снежнай мяцеліцы разбіваецца аб паважны супакой дабрадзейкі печы, якая змярканнем затуляе ў цёплую драмату. Там, брат мой мілы, аддыхнеш душой, падужэеш целам і праславіш музыку жыцця.

Дык увайдзі, брат мой мілы, у маю хату вясковую, пахілую, а будзеш дарагім гасцём і ўзрадуеш мяне, засмучонага ад жудаснай сучаснасці.

Увайдзі!

## МІНУЎШЧЫНА

Быў калісь слаўны час, калі звон вечавы
Зычны покліч свой слаў за замчышча равы,
Слаў да княскіх харом, да ўбогіх хацін,
Ён на веча склікаў сярод грозных хвілін.
І люд вольны ішоў. І ждаў Полацк гасцей,
Князь ждаў гнеў ці хвалу. Дудар граў
весялей.
Не гулі віхры, гром, не шумеў зелян-бор,
То судзіла суды і давала прастор
Вольным думкам сваім веча верных сыноў
Крывічанскай зямлі, веча шчасных гадоў.
— Князя-злыдня прагнаць. Між дружыны
ёсць муж,
Слаўны добрай душой, і на мудрасць ён дуж.
— Гаспадарыць яму! Князем выбраць яго!
Такі сказ край пачуў, пачуў з веча таго.
Полацк знаў, што рабіў, бо калі жмудзь з лясоў
Запалоніла край, што быў згінуць гатоў,
Вось тады не мячом Полацк край ратаваў,—
Моцай веды сваёй Вільню ён пакагаў,
З дзікіх, цёмных лясоў вывеў ворага ён
Ў рукі светач ім даў, даў ім правы закон.

* * *

Беларусь мая мужыцкая,
шматпакутная, непачатая,
зварухніся, моц крывіцкая,—
слава наша ты крылатая.

Беларусь мая юнацкая,
шалам дзікая, ўся бунтарская,
парві пута Ты чужацкае,
будзь дзяржаўная, гаспадарская.

Беларусь мая несмяротная,
кветка белая, маці родная,
ўсёй істотай сваёй Табе шчасця хачу,
аб ім сню-летучу,
на дне бур, між віхроў ўсё шукаю...
Не найду. Не прычакаю.
Я згару ў барацьбе...
О, зайздросць маёй судзьбе!

## БЕЛАРУСКАЯ КАЗКА

Я быў яшчэ падшпаркам, а ўжо тады мне гэту казку баяў такі, як я цяпер, бел-бялюсенькі, як пераспеўшая ніва, дзядок.

О, гэта казка векапомная!

За далямі, за гарамі, аж за морам-акіянам, была сабе старонка-край.

А сказ свой старонка тая пачынае вось з якога часу. Калі ўзгнеўлены Бог прыказаў Архангелу сагнаць з неба анёлаў-здраднікаў, хаўруснікаў злога, калі паслухмяны Архангел просьбай-пагрозай пачаў ачышчаць абшары пакояў Бога і калі адзін з злыдняў зачапіў сваім савіным габдзюром* нягрэшнае цела Архангела, то тады капнула нявінная кроў жыхара неба, капнула, папала на зямлю і лягла на зямлі крывавай плямай.

І вось гэта пляма ёсць тая беспатольная старонка, і з гэтага часу яна пачынае сваё жыццё-стогн.

Паплылі тады па старонцы рэкі слёз, пасеўнае поле, ураджайны грунт сталі багата фарбавацца крывёй бязвіннай, людской, братэрскай крывёй; сялібы, вёскі, гарады дымам узняліся і засланілі сонейка.

А ненаедная, прагавітая крыўда векавечна гнала ворагаў-жывадзёраў, а вораг...

— Ох!.. Але чаго я замаўчаў? Гэта толькі казка, толькі казка.

І вось моладзь адважная, юнакі-асілкі, старцы-думаннікі ўсталі як адзін, цясней спаяліся ў згуртаваную, адналітую, адважную моц, узнялі свае белыя, чыстыя, як сумленне малалетак, вопраткі з чырвонымі ад нявіннай

крыві пасамі-шляхамі, узнялі ўвыш на павеў ветру, на паказ сонцу, на пагібель ліхадзеям.

І так пад сцягам пайшлі...

Схамянуліся, захацелі, змаглі!

Вораг кінуўся на ўцёк-бег. Дык барзджэй на коней гарачых, быстрых як птахі, і хутчэй у пагоню, паслаць пагоню!

Ускочылі на сёдлы і памчалі стралой. Пагоня дагоне, даканае і адаб'е ім ахвоту памыкацца, пакарае па заслугах і вернецца са славай і здабычай...

О, супакойся, не радуйся, сэрца, не грымі прароча, голас, бо гэта толькі казка, толькі казка...

І вось асталіся жыхары без сваіх абаронцаў-збаўцаў

А бяда не ў лесе жыццё мае, а між людзьмі гадуецца, сябруе.

А ліхадзеі на зямлі рэдка сеюцца, але густа ўраджайна ўзрастаюць, і дзіўна, як іх зямелька носіць, бо нават гадзіна ядавітая, укусіўшы, гіне ад іх крыві.

Дык зноў знядужаную старонку агарнулі, запаланілі, пазганялі ў цёмныя астрогі ўдоў, сірот, калек, замучаных, схварэлых і паставілі вартаваць бяду-бядачку, боль балючую, гора горкае.

І моляць, чакаюць людзі пагоні.

Страшнай помсты жадае іх сэрца, свету — іх душа, лекаў — іх раны, хлеба — іх цела.

А пагоні як няма, дык няма.

Дні, вякі панырнулі ў вечнасці...

Ажно ўрэшце там, дзе сходзіцца зямля з небам...

Пагонь! Пагонь!

Здрыгануўся, уціхаміраўся, прытаіўся вораг.

А дрэвы, вітаючы радасна, зашумацелі, заківаліся; рэкі весела заіскрыліся, а неба яшчэ раз узбагацела ўсмешкай сонца-бога.

А вораг-крыўдзіцель натапырыўся аружжам, прызапасіў моц магучую, зашыпеў, як гад падкалодны.

І вось пагонь тут, тут...

Гура, пагонь! Бі! Ратуй! Вызваляй! Гура!

Але дзіва: пагонь ідзе вольным крокам і мае выгляд, быццам сейбіт вясной у полі, быццам святы, згледзеўшы божы цуд, быццам мудрэц, адкрыўшы праўду светлую, вялікую.

І замест грознага покліча кажа да ворагаў гэтакія словы-гімн:

О людцы! Мы да вас ідзём
З мірам і дабром.

Было-сплыло жыццё-быццё.
Крыўды болей быць не будзе.
Мы ўсе людзі!
Мы ўсе брацця!
Дык раскрыем жа абняцці
І палюбім усіх, усё
Так, як любіць Бог.
Свет, свет ідзе,
Волю вядзе
Па нашых слядах!

Але вораг-крывапійца не сказаў «аман»! А размахнуўся цяжкім смертаносным аружжам ды зноў пачаў ліць кроў, бязвінную, людскую, братэрскую кроў...

Ах, выбачайце! Я забыўся, што гэта казка... Вось як у казцы: «...І палюбім усіх, як любіць Бог!»

І вораг-звер стаў сябрам, чалавекам: раскрыў братэрскія абняцці, заплакаў слязьмі анёла.

І была вялікая радасць на зямлі і на небе...

І я там быў, кроў, пот свой ліў...

— Выбачайце...

Дзед заплакаў, не дакончыўшы.

## О МУДРАСЦЬ!

О мудрасць людская,
стой, не ідзі!
Глядзі:
тваю сцежку пропасць глытае
чорным смехам сваім...
Ты — збаўленне людзей.
Схамяніся ж барзджэй!
Нясі кару ўсім тым,
хто зямельку атрутай абліў,
хто яе зневажаў і глуміў
і зняволіў цябе і маной абкруціў!..
Годзе стогнаў, жальбы,
безуцешнай мальбы.
Мудрасць — воля табе!
Настаў час твой цяпер —
вер у моц сваю, вер.
Схамяніся ж барзджэй,
будзь зямельцы усей
ўладаром і богам красы, чыстаты.
Мудрай праўды сваёй

цемру збі з высаты,
распылі назаўжды ты парадак стары!
І знішчай і твары!
Ты — збаўленне людзей,
ты змагайся ўсей
сваёй сілай, агнём —
ноччу і днём!
Бо змаганне — збаўленне тваё!
Йдзі з жыццём — за жыццё!
Сонцам, пломенем ясным
забагуй
між сонц чорных сучасных...
О мудрасць людская, ратуй!

* * *

Хто душой і шчырым сэрцам,
Хто так родны край кахае?
Пекным чынам, цёплым словам
Хто ў бядзе нас суцяшае?

Хто нас вучыць мовы, песень,
Долі моліць са слязамі,
Беражэ пры першых кроках
І душой заўсёды з намі?

Хто ж, як пчолка, любіць працу,
Чыстату душы і цела?
Хто парадкам дыванамі
Хату здобіць так умела?

Хто прыпевак стварыў столькі?
Хто ёсць гэткі слаўны геній —
Так балесна адчуць жаласць
Пры хаўтурах ў галашэнні.

А хто церпіць столькі ліха
Ад бурлівых падзей веку,
Ад таго, што Край забраны
Гіне сярод цемры, здзеку?

Хто надзея, гордасць наша,
Праўды нашай каляіна?
Хто натхніў стварыць верш гэты?
Беларуская жанчына.

# КАНДРАТ КРАПІВА
# (1896—1991)

22 лютага 1896 г. у Кандрата Міхайлавіча Атраховіча, які меў зямельны надзел у шэсць дзесяцін, нарадзіўся сын, якога, як і бацьку, назвалі Кандратам. З васьмярых братоў і сясцёр, што нарадзіліся раней за яго, жывыя засталіся толькі дзве сястры. У сем гадоў хлопчыка аддалі ў царкоўнапрыходскую школу, а пасля яе заканчэння — у чатырохкласнае гарадское вучылішча ў мястэчку Стоўбцы, якое ён скончыў у 1913 г. Цяга да творчасці прачнулася ў ім рана, хоць працавіты хлапчук умеў і касіць, і хадзіць за плугам. Ездзіў з бацькамі ў заробкі, працаваў на цагельні, не цураўся ніколі цяжкай работы, зарабляў свой хлеб, але ж і не пакідаў ніколі кнігу, цягнуўся да ведаў.

У час імперыялістычнай вайны ў 1915 г. «пастаяў за веру, цара і айчыну», ваяваў у Румыніі, а пасля рэвалюцыі вярнуўся ў родныя мясціны, дзе настаўнічаў у пачатковай школе вёскі Каменка. Пачаў пісаць простыя газетныя карэспандэнцыі, пасля больш складаны жанр — фельетоны на бытавыя тэмы, эпіграмы, жарты. Атрымаўшы першы ганарар, будучы знакаміты сатырык вяртаецца з жонкаю і сынам назад на Уздзеншчыну і вырашае збудаваць дом.

У Мінску ўтварылася пісьменніцкая арганізацыя «Маладняк», і сатырык вяртаецца ў сталіцу, дзе бурліць, вірue жыццё, дзе прызналі ўжо і яго талент. Скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. З 1932 па 1936 г. працуе загадчыкам аддзела ў рэдакцыі часопіса «Полымя рэвалюцыі». Бадай, не было на вёсцы і ў горадзе чалавека, хто ў тыя часы не ведаў знакамітых твораў Кандрата Крапівы. Уся Беларусь чакала газеты з ягонымі байкамі, фельетонамі, вершамі. Добра, вельмі добра ведаў жыццё і характары беларусаў пісьменнік.

Творы станавіліся хрэстаматыйнымі. У той час многія пісьменнікі займаліся драматургіяй, ведаючы, якую вялікую ролю адыгрывае тэатр. З-пад пяра К. Крапівы выходзяць сацыяльна-псіхалагічныя і народна-гераічныя драмы, сатырычныя камедыі. Яны і дагэтуль ідуць на сцэнах нашых тэатраў — «Партызаны», «Людзі і д'яблы», «Проба агнём», «З народам», «Хто смяецца апошнім». Яго п'есы ўзнімалі надзённыя праблемы, былі досыць сцэнічныя і сюжэтна цікавыя, з добрай усмешкай, высокім пафасам. Яшчэ ў 1940 г. К. Крапіва быў выбраны членам-карэс-

пандэнтам Акадэміі навук, у якой працаваў доўгі час.

У час вайны сваімі творамі кляйміў ворага на старонках газет «За Савецкую Беларусь», «Раздавім фашысцкую гадзіну» і часопіса «Вожык». Пад рэдакцыяй К. Крапівы выйшаў грунтоўны «Беларуска-рускі слоўнік».

Народны пісьменнік, акадэмік К. Крапіва багата зрабіў для праслаўлення нашай літаратуры, выхоўваў маладых драматургаў.

Памёр пісьменнік ад цяжкай працяглай хваробы, пахаваны на Маскоўскіх могілках у Мінску.

## ЗАЯВА

(Байка)

Другі, бывае, дабрадзей,
Пашану страціўшы ў людзей,
На тым часамі спаганяе,
Што прозвішча мяняе.
Не помню месяца і дня,
Нядаўна нек адна свіння
Свайму там старшыні ці «заву»
Так накрамзоліла заяву:
«Ад грамадзянкі вёскі Свінюхі,
Хляўцоўскае акругі,
Што перанесла здзекі пугі,
Як панаваў пастух Трахім,
Ад аблавухае Свінні Каравай

Заява

Я, прылажыўшы ніжэй капыты,
Заяўляю аб тым,
Што з усёю сваёю раднёю
Не хачу болей звацца Свіннёю,
Бо «свіння» і за лаянку часта ўжываецца,
А мне гэта не падабаецца.
Вось і прашу даць імя мне новае,
Падмацаваўшы яго пастановаю,
Каб не кожны хам
Калоў вочы нам:
І каб спагнаць заўсёды мела права я,
Калі асмеліцца абразіць хто».
І распісалася пярэднім правым капытом:
«Свіння Каравая».

А старшыня той розум меў:
— Завіся,— кажа,— ты хоць леў,
Аднак жа, як свінню ні кліч,
Яе заўсёды выдасць лыч!

## ВОЛ І АВАДЗЕНЬ

(Байка)

Гарачым летнім днём
Вол з ворыва вяртаўся.
Напрацаваўся, аж хістаўся.
За ім жа куча аваднёў
Ляцела роем.

Вядома тут, з якім настроем
Ісці мог Вол:
Глядзеў сярдзіта навакол,
Махаў хвастом, круціў рагамі
І біў па чэраве нагамі.

— А, сябар!..
Добры дзень! —
Сказаў лісліва Авадзень,
Усеўшыся Валу на спіну: —
Як я цябе люблю! Які ты мілы!
Цябе я, сябар, да магілы
Ніколі не пакіну.
Я ўсюды за цябе пайду —
Ў агонь, і ў нетру, і ў ваду.
Цяпер жа вось да стойла давяду.
Але чаму такі ты злосны?

— Адстань, пракляты крывапівец!
І без цябе мне млосна,
Цябе ж я ведаю, паршывец! —
Сказаў сярдзіта Вол ў адказ.
Патом
Хвастом
Па спіне — раз! —
Зваліўся той, як сноп, далоў...

---

Нямала ёсць павадыроў,
Якія любяць люд працоўны
За тое толькі, безумоўна,
Што любяць яго кроў.

Прамоў тых здрадніцкі-ўрачыстых
Даволі чулі мы і ад фашыстаў.
Але яны даждуцца дня —
Змахнуць і іх, як Авадня.

## СТАРЫ І МАЛАДЫ
(Байка)

Не так даўно ў гаспадара
Жарэбчык быў і Конь Стары.
Яны задраліся нек раз,
І вось з тае пары
Пайшлі між коней нелады,
Аднойчы ў плузе на раллі
Жывёлы спрэчку завялі.
Гарачы, порсткі Малады
Тут не на жарт
Напаў на сталага Каня:
— Куды ты, падла, варт!
Калі паўзеш, дык парахня
Вунь пасыпае сцежку ўслед,
І толькі ты паскудзіш свет,
Глядзіць у землю морда кісла
І ніжняя губа адвісла.
На чорта ўжо цябе й трымаць!
Даўно пара да каналупа,
Бо сорам весці на кірмаш...
Ад слоў такіх Стары стаў слупам:
— Ах ты, шчаня!
Так бэсціць сталага Каня!
Ты не глядзі, што я стары,
Што быццам сыплецца з мяне
На капыты,
Але ж да гэтай вось пары
Ні разу ў баране
Не стаў, як ты.
Разумны ты ды малайчына
Да той пары, пакуль ляйчына
Не пападзе табе пад хвост,
Ну, а тады — панёс
Ці з плугам будзеш ты, ці з возам,—
І дзе твой дзенецца ўвесь розум!
Няхай, па-твойму, я слабы.
А хто ж цябе вось прыдабыў?

Хто дастаўляў табе авёс
І сена, на якім ты рос?
Ты здольны толькі да яды,
А ў працы гэтых маладых
Я так прыцісну, што аж сок...
— Пакуль з нас сок, дык з вас пясок...

---

Вось так за словам слова,
Нарэшце мала ім і звадкі —
Ужо намерваюць азадкі,
І... выйшла б дзела ў іх канёва,
Каб не Араты йшоў за плугам.
— Но-но! А то вось я зраблю падлік заслугам.—
Пачаў ён іх мірыць —
Сябры па працы вы, а проста як звяры.
Той ганарыцца, што стары,
А той — што малады.
Ды хіба ж для працоўных розніца — гады?
Паверце, што найбольшая з заслуг —
Цягнуць цяпер у згодзе гэты плуг.

## ДАВЯЛОСЯ СВІННІ НА НЕБА ГЛЯДЗЕЦЬ...

(Байка)

Жыла-была адна Свіння.
Паслушная сваёй прыродзе,
Яна ў гнаі капалася штодня
Ды рылася ў гародзе.
Часамі нават на лугу альбо на полі
Бываць прыходзілася ёй,
Але што ў небе ёсць, над галавой,
Свіння не бачыла ніколі.
Яна хоць чула нейкія гаворкі
Пра сонца, месяц і пра зоркі,
Ды гэта ўсё нічога ёй не гаварыла,
З-пад лапушных сваіх вушэй
Яна і глянуць не магла вышэй
Свайго свінога рыла.
Аж неяк раз Свіння хацела ўлезці
У моркаву суседскую ў гарод,
Узбілася дубка на плот
Пярэднімі нагамі ды грудзьмі
І... неба ўбачыла як мае быць, нарэшце,
— Дык вось яно, хвалёнае людзьмі! —

Захрукала расчаравана.—
Ні лужыны, ні яміны, ні калдабана,
Ніводнай нават кучы гною!
Выхваляюць жа — прастор ды прыгажосць!
Аж проста разбірае злосць,
Што кормяць нас такой маною!
Ну, шырыня, раўніна, гладзь...
Ну дык і што ж? За што іх выхваляць?
Якая мне карысць ад гэтай сіні?
Што неба роўнае — няма чаго дзівіцца:
Каб там было чым пажывіцца,
Яго б даўно парылі свінні,
А сонца ж вунь! Пра хараство яго
Нямала людзі языкамі клепюць,
А тут і хараства ўсяго,
Што вочы толькі слепіць.
Ну вось, пабачыла... Цяпер я з небам квіта,
Няхай туды імкнуцца праз вякі
Энтузіясты-дзівакі,
А мне мілей маё карыта.

## МІХАСЬ ЧАРОТ
## (1896—1938)

У яго былі прыветлівыя, вясёлыя вочы, адкрыты твар, няўрымслівы характар і добрае сэрца. І сам ён пра сябе казаў, што ўлюбёны ў жыццё і аптыміст. Міхась мог стаць цудоўным артыстам, адзін час нават выступаў з трупай знакамітага У. Галубка, але ж выбраў літаратуру, паэзію і апантана пачаў служыць ёй.

Сапраўднае прозвішча Міхася Чарота Міхась Сямёнавіч Кудзелька. Народжаны ў сям'і селяніна-бедняка, ён любіў усё, што звязана з прыродаю, з вёскаю. Вытокі гэтай любові, мажліва, ішлі ад першай яго «прафесіі» — пастушка. Міхась пісаў: «Падабалася ездзіць на начлег і цэлую ноч праводзіць з хлопцамі каля вогнішча і слухаць казкі ды апавяданні».

У 1914 г. юнак паступае ў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю. Заканчвае яе акурат напярэдадні падзей 1917 г., якія ўскалыхнулі жыццё кожнага беларуса. Акрыленыя бурлівымі і энергічнымі зменамі ў грамадстве, маладыя таленавітыя пісьменнікі ўтварылі сваё аб'яднанне «Маладняк». Ужо ў 1922 г. М. Чарот дэбютуе зборнікам вершаў «Завіруха». Стары свет адыходзіў у

нябыт, новы з цяжкасцямі і памылкамі нараджаўся вельмі хутка. Усё змянялася на вачах.

М. Чарот не стараўся апярэдзіць імклівы час, ён пісаў душою, сваёю маладосцю, усім тэмпераментам, больш успрымаючы рэчаіснасць праз пачуцці. Чарот шмат вандраваў па Беларусі і быў чалавекам неспакойнай душы. Ён піша нарысы, п'есы (шырока вядомая п'еса «Мікітаў лапаць»), паэмы, апавяданні, а найбольш вершы. На яго талент ускладаліся вялікія надзеі, і шмат якія маладзейшыя паэты вучыліся ў яго. М. Чарот услаўляў усё добрае, справядлівае, што прынесла рэвалюцыя. Ён мог памыляцца, але ж ніколі не заклікаў у сваіх творах да жорсткасці, нянавісці да чалавека. На жаль, не ўсё з задуманага ўдалося здзейсніць. Міхась Чарот, як і большасць яго сяброў, загінуў у сталінскіх лагерах.

Вось радкі апошняга верша М. Чарота, які быў надрапаны на сцяне мінскай турмы ў 1937 г.

...Прадажных здрайцаў ліхвяры
Мяне зацяснулі за краты.
Я прысягаю вам, сябры,
Мае палі,
Мае бары,
Кажу вам: я не вінаваты.
Паверце: я не вінаваты.

## ЗВОН

Зазвані моцна, звон, загудзі,
Каб пачулі цябе на ўвесь край,
Беларуса хутчэй разбудзі,
Хоць цяпер яму спаць ты не дай!

Прыйшоў час, калі сорамна спаць;
Ўсе так шчыра за працу ўзялісь,
Ўсе жыццё пачалі будаваць,
А ты спіш... Хоць ад звону праснісь!

Паглядзі, як сусед пачаў жыць,
Што нядаўна нявольнікам быў.
Ён не спаў,— і цяпер ён не спіць,
Усім кажа, што ён яшчэ жыў.

А чаго, беларус, ты маўчыш?!
І табе годзе, братку, драмаць:

Калі можна гучаць — ты маўчыш,
Каб пасля не прыйшлось шкадаваць...

Кінь саромецца мовы сваёй,
Звацць сябе беларусам пачні,
Папрацуй над сялібай сваёй,
А пасля з ціхатой адпачні!..

Дык звані моцна, звон, і гудзі,
Сваім гукам глушы увесь край!
Хто шчэ спіць — ты таго разбудзі,
Хто не спіць — тых да працы збірай!

* * *

Я пясняр лясоў, балота
І загонаў каласістых...
Мае песні — шум чарота
Па-над рэчкаю імглістай.

Мае песні — песні долі,
Шопат зор у паднябессі...
Хай ляціць, жыве на волі
Гучны вокліч маёй песні.

Мае песні — песні буры,
Гоман лесу ў непагоду,
Страшны посвіст злой віхуры,
Смелы кліч майго народу.

Мае песні — песні волі,
Гімн паўстаўшых напрадвесні...
Хай нясецца, хай ніколі
Не загіне вокліч песні!

## БОСЫЯ НА ВОГНІШЧЫ

1

Вайна і пажар...
На вогнішчы людзі
Жывуць босымі.
— Няўжо ж гэтак і будзе?
Свой уласны дар
У чужых просім мы?

Працуй — на пана,
Працуй — на падпанка.
    Жыць стала пагана.
А тут яшчэ з самага ранку
Усякі чорт лезе ў балота.
    Ну і ёсьць жа людзям ахвота?
Крыжам бы іх — каля плота,
    Ды — трах!
    Які тут страх?!
    А ты маўчыш,
Цягнучы сам цяжкі крыж.
Крыжамі ўставілі поле,
Пад крыжамі — магілы.
Шлях класці да Волі
У людзей няма сілы.
    — Эх, жыві як папала...
    А для жыцця мала
    Аднаго толькі хлеба.
Пагуляць бы, душу адвясці!..
    Эх!.. пусці!!!
На ўсходзе зардзелася неба:
Нібы золата, падаюць косы...
На зямлі... агнявыя палосы,—
    Дзень новы, новыя ночы,
Век новы: агню, дыму, попелу...
Будзе шмат каму горача,
Нам толькі цёпла,
Дармо, што мы босыя!

2

— Пажар на Усходзе!
Таварышы, ур-р-ра!
    — Што вы, шалёныя, годзе!
Што, вам не шкода дабра?
Усё, што збіралі вякамі,
Сёння марнее ў агні...
— Маўчы! Мы цябе кулакамі,
Чуеш? Ні-ні!
Цэрквы, палацы, харомы —
Памяць мінулага — з дымам!
Што не запалім мы — зломім!
Знізу наверх ўсё падымем!
Страшна вам? страшна?
Пажару агонь ломіць вочы?
Затое нам відна ўночы...

Не ліце крыві — не пагасне.
Маліцеся, грэшныя, небу,
Рукі ўгору узняўшы,
Вас не паслухаюць хмары.
Таварышы!
Што нам трэба?
— Пажа-ары!

3

І пылае мур струхнелы,
Іскры скачуць па страсе.
Раптам вецер, вецер смелы,
Крыж Чырвоны нам нясе.
— Адным крыжам будзе болей,—
Шэпча змучаны народ...
На крыжы чытаюць «Воля».
— Братцы! Гляньце на Усход!

То ж агонь, агонь збавення
Нам нясе Чырвоны Крыж.
— Братцы, песню вызвалення!
Люд гаротны, што маўчыш?

Панясласе песня волі
Між лясоў густых, балот...
І аб лепшай вольнай долі
Стаў ля рэчкі пець чарот.

4

Крыжы... курганы на балоце...
Заросшыя дзёрнам магілы —
Ўсё ў вогненнай зноў пазалоце:
Бушуюць дзве страшныя сілы,—

Змагаюцца праца з багаццем:
Свет новы жыццё утварае.
Зышліся дзве моцныя раці,
І праўда няпраўду змагае.

Глядзяць, пацяшаюцца людзі,
Зюзюкаюць бабы пацiху:
— Цяпер мо і нам добра будзе?
Забудзем бяду ўсю і ліха!
Баіцца наш пан-непаседа,
Нябось яго кончыцца песня!

— Не будзем больш мецъ дармаеда,
Да працы сам пойдзе, аж трэсне!

5

— Стойце, хлопцы! будзь на месцы!
Не кідайце на бяду...
— А казаў паганы ў Брэсце,
Што вайною не пайду...
А цяпер — глядзі!.. Ну, дзіва?!
Пачакайце... як жа нас?
— К вам мы прыйдзем, прыйдзем жыва,
А цяпер мы: раз! — два!! — раз!!!

Пры запаленых будынках
Чуем плач мы беднаты...
— Дзе ж цяпер шукаць прыпынку?
Ці даваць мо ла-та-ты?

Пан з падпанкамі рагоча,
Гладзіць тоўсты свой жывот
І пад нос сабе бармоча:
— Йдзе Хвядот, але не тот!..

6

Над палямі Белай Русі
  Стогне віхар-бура...
— Зноў прыйшлі дзянькі прымусу,—
  Шэпча люд пануры.

Арол чорны ўецца ў высі,
  Крыллямі махае.
Над пахілымі крыжамі
  Песню напявае;

Чуе пах сваёй ахвяры,
  Когці распраўляе,
Ўніз спусціцца — там пажары,
  Дымам павявае.

І змагацца стаў угоры
  З бураю мяцежнай...
Рэжа крыллямі узоры
  Ў небе чарнаснежным.

7

А на зямлі — даждаліся раю:
Старыя лады і манеры,
У пагонах ідуць афіцэры...
— Упакой раба Мікалая...
— Аляксея на многія лета...
Босыя кажуць:
— Што гэта?
З кукардай, акуляры на нос,
Чыноўнік па скверы гуляе...
Ў кішэні няма папярос,—
Мусіць, шмат зарабляе?
На Захараўскай вуліцы
Дзень як уздзене чорны халат,
Толькі песня чуваць блудніцы:
— Палюбі ты хоць трошкі, камрад.
  А босыя ходзяць па попелу,
  На Ўсход пазіраюць з надзеяй:
— Покуль што нам яшчэ цёпла,
Але мы вам ўспомнім,
  Зладзеі!..

8

Бура страшная вырвала пер'я
  Арлу чорнаму ў высі...
— Зямля! ах, зямля, цяпер я
Ўніз паляту — сцеражыся!..
І рэха адклікнулася: «Ах!..»
Буржуі крычаць: «Які страх!
Вось цяпер нам будзе скок...»
Дружна, роўна, крок у крок
Ідуць чырвоныя палкі,
І чуваць напеў стары:
— Эх, сякі-такі,
Чорт вас пабяры!..
  Босыя спаткалі іх:
  Гоман, жарты, крык...
— Туды бег, назад прыехаў,
Бач ты, бальшавік!

9

Босым дарогу!
Поп, памаліўшыся Богу,
    З царквы ідзе па завулку:
    — «О времена ныне...»
А ў разбітай вітрыне
Спекулянт шукае булку.
Чыноўнік казённай палаты
Скінуў парадны сурдут...
Бурчыць пад нос: «Праклятыя!
    Зноў яны тут!»
Паны за граніцу
    Давай Бог ногі...
Гром... навальніца...
Б-о-с-ы-м д-а-р-о-г-у!..
Паўцякалі? Ну, так што ж!
На вогнішчы, басанож,
Пагуляем... Эх, глядзі!
Бедната ўся, выхадзі!
Учора там — а сёння тут...
    Буржуазіі капут!
Зноў гуляем на балоце!
У войска, братцы,— па ахвоце...
Ухапіўшы сваю частку,
Расчынілі людзі пастку:
— Вой, вой, вой!
    Будзе бой!..

10

Чырвоным завешаны вуліцы,
Вокны, балконы і плот,
Белы дом толькі журыцца:
Не йдуць туды на сход...
Чытаюць адны пацеры,—
У Бога пытаюць, як быць?..
А босыя на сабранні
Пасылаюць к... мацеры...
Пану даволі служыць —
    Вось наша заданне!
— А як жа?
Кім будзем звацца?
Як жа будзе вось гэта ды тое?
— Давайце ўсе разам змагацца,

Пакуль не знішчым старое!..
Замоўклі яны,— ні слова.
Чакаюць другога адказу...
Толькі шэпчуць, стуліўшы галовы:
— Паслаў Бог бальшавіцкую заразу.
Зноў мы безгалосыя,
І цярпі, як сабака шалёны:
Ўласць усю забралі босыя,
А іх тут — мільёны!

11

Не ціхне бура. Стогне лес...
На ўсе лады віхура свішча!..
Лясун стары к русалкам злез
Спраўляць над возерам ігрышча.
Чырвоны колер ціхіх хваль...
У іх відаць адбітак неба,
І з тых краёў, дзе смерць і баль,
Руччы крывавыя шле глеба.
Русалкі скачуць з лесуном.
Музыка грае — «бух ды бразь!»
І вось, хто спаў адвечным сном,—
Усплыў над возерам — «сам князь!»

Не далі спаць. Вайна, агонь
Руйнуе ўсю яго краіну.
Пад ім стаяць не хоча конь.
І кліча князь сваю дружыну...

Русалак рогат. Ночы ціш...
Пужаюць князя над вадою...
Адказ чуваць: «Чаго крычыш?
Твая дружына там, з табою».

— А дзе паслухны мой народ?
Ён за мяне у бойцы ляжа!..
І чуе шум крывавых вод:
— Цяпер ён сам сабою княжыць!

І злосна князь рвануў каня,
Падняў уверх пярэдні ногі,—
На ўсход зірнуў, дзе золак дня,
Дзе кроўю змочаны дарогі...

Вось чуе раптам — «бух ды бразь!»
У саму поўнач ціхай ночы...
І зноў паплыў на дно наш князь,
Закрыўшы шлемам твар і вочы.

Блакітна-белы князя цень
Заслаў ўсё возера туманам,
І ходзяць хвалі ноч і дзень,
Шумяць і вечарам і рана.

Лясун, русалкі там рагочуць,
К сабе ўсіх маняць, кажуць: «Глянь!»
Ў вадзе чырвонай шмат хто хоча
Уночы бачыць князя здань.

12

На вогнішчы стала пячы.
На вуліцы вецер... бура...
— Трэба ўцячы,
Каб была цэлая скура.
— А мы, босыя, адступаем...
Не дадзім ахвотаю
Новай зямлі!
Таварышы, страляем!
Ротаю!..
Плі!..
Разлягаецца грук...
Чорны жук
І павук
Сядзяць у падвале, слухаюць,
Баяцца выткнуць жывот,
Дзеці сабачыя!
Босыя патыліцы чухаюць,
Пазіраюць праз плот,
У кулак плачуць:
— Бач, нашы паўцякалі,
Куды дзявацца нам?
Зноў служыць панам
Мы прычакалі?..
Людзей мала на вуліцы.
Ноч прыйшла, горад — пустка,
Толькі новы крык чуецца:
«Пшэ-пу-устка»!!!

13

Застагналі вёскі і сёлы...
Брычка стаіць ля святлічкі.
А народ схаваўся ў касцёлы:
Моліцца, чытае кантычкі...
«Бэндзь, люд спанялы...»
На шапку «ожал бялы»,—
Блішчаць гузікі,—
Чыноўнік зноў на скверы
Лушчыць гарбузікі,
Думае, якой ён веры?
— Ах, халеры!
Каб дастаць работу,
Пытаюць, хто ты?
А босым — холадна...
Абутым — голадна...
Жыць не ахвота.

14

Над балотамі дыміцца —
Згас агонь.
А па вогнішчы імчыцца
Белы конь.
Скача ўлева, скача ўправа —
Не стрымаць.
Захацеў улан на славу
Пагуляць.
Расступіся, свет, дарога —
Аднаму!
«За айчызну і за Бога».
Што яму?!
Яго сіла, яго права,
Ёсць бізун...
Скача ўлева, скача ўправа
Конь-скакун.
Гэй, ляці, але дзяржыся,
Злы яздок,
Без пары не праваліся
У масток.
На вадзе ляжыць мост новы,
На агні.
Не праедзеш ты дубровы —
Пагані?!
Усхадзіўся лес шумлівы,—
Вые воўк.

Конь спаткнуўся палахлівы.
Стой, яздок!
На балоце і на полі
Зноў агні.
Не гуляць табе тут болей —
Павярні!

15

Вёскі і гарады
Дымам спавіты
Днём.
Уночы глянеш куды —
Неба абліта
Агнём.
Слёзы... кроў на траве...
Як у магіле
Спіш.
— Бач, чырвоны плыве
Па небасхілу
Крыж.
Цёпла, і груганы
Ўсе на чужыне...
Эх!
Чуеш гоман? Яны!
Леташні гіне
Снег.
Нам не шкода: бяры
Стужы зімовай
Цень.
Крыж! Ты стань на гары:
Радзі нам новы
Дзень!

16

На вогнішчы басанож,
У руках вінтоўка, нож...

Здабываць галодным славу:
«Даёш Варшаву?!»

— Нам не трэба гарады:
Волі сцяг нясём туды,

Іскры гонім мы пажару,
Смялей ударым!

«Нам дарогу — уцякай!»
Чуваць крыкі: а-я-яй!..

Бач, улан астатні едзе:
«Ах, цо то бэндзе?..»

А чырвоныя ідуць,
Песні волі зноў пяюць,

Адусюль бягуць к ім людзі:
— Нам цёпла будзе!

17

Замоўклі песні грознай сілы...
Адкуль прыйшлі? хто яны?
Што рвуць няволі кайданы
І сыплюць свежыя магілы?..

Яны — байцы вялікай раці.
Іх хата там, дзе ёсць прастор.
Няволя, крыўда — вось іх маці!
Ідуць яны да сонца й зор.

За імі йдзе, хто голы, босы,
Ў пакуце жыў хто цэлы век...
Дарогу чорны снег заносіць —
Загінуць можа чалавек.

— Загінуць? Што ж! На той магіле,
Якая зможа прыгарнуць,
Вясною ранняй урадлівай
Прыгожа кветкі зацвітуць.

Прывабіць колер іх чырвоны
Схіліць калені над пяском
Таго, хто шле цяпер праклёны
І вострыць меч на нас тайком.

— Браты, за намі! Кінь маленне,
Хто праўдай жыць не даў зарок...

Смялей!.. Нас будуць біць каменнем
Мы — нашых вольных дней Прарок.

18

Босыя ходзяць па вуліцы.
Тыдзень не елі стравы...
— Жыць будзем — нічога!
Буржуй за вугал туліцца,
Шэпча: «Дрэнныя іх справы...
   Дзякуй Богу!»
Хмары, дзе заход,
   Падняліся...
— Што? зноў непагода?
— Вецер! — крычыць народ,
— Вецер, уздыміся!..
Вецер адказвае: «Згода!»
Хто слабы — дзяржыся.
      ...Хто рэжа,
      Таму не балюча.
Балюча — каго рэжуць.
— Цяжка жыць ваюючы.
      Зрабілі межы...
А вецер свішча, гудзе...
      Сціхнуць не хоча.
— Гэй, хто там ідзе?
      Сцягам белым махае?
      Рагоча?!
Вецер, плюнь яму ў вочы!
      — Пачакаю!..

19

Мы — дзеці краіны,
      Дзе бура бушуе...
Мы на прадвечных руінах
      Працы палац пабудуем,
      Не любяць нас — босых,
      Хто век быў абуты...
      На нас узіраецца скоса,
Хто, як і мы, быў закуты...
І вы, хто гімны пеў гаротным,
Хто ў цемру слаў жыцця праменні,—
Ў руках трымаеце каменні
І нас пабілі бы ахвотна.
      А можа, Чырвань Сонца Волі
Вам асляпіла раптам вочы...

А помніце, як вы кляліся
Братам, сялянам і рабочым,
Што вы не здрадзіце — ніколі?!
Пявун не прапяяў тры краты,
Вы — адракліся...

Супастаты!!!

Без вас раць наша узрастае,
Рады шчыльнеюць, крэпне дух!
Вы чуйце! Песня не сціхае:
«Паўстань, хто з голаду век пух!..»

20

Бягуць яны... Іх рукі, ногі
Ў крыві... пякуцца на агні...
Куды бягуць яны дарогай,
Дзе страшна ехаць на кані?
Яны баяцца спатыкнуцца,—
Не ўсякі будзе верны конь...
Хутчэй каня яны нясуцца
З агню ў агонь і праз агонь...
Пакуты крыж чырвоным крыжам
Яны наважылі змагчы...
Што шаг — пабеда бліжай, бліжай,
Іграйце песню, трубачы!
Тру-ру-ру, тра-та-та!
Гэй, за намі, бедната!
На дарозе макрата...
Тру-ру-ру, тра-та-та!
Тухне вогнішча ў крыві,—
Песню іграйце: «дзін-дзі-ві!»
Каго зловіш — разарві,
Хто не наш — таго даві...
Босы хто — за намі ўслед,
Хто ўбогі, хто раздзет...
Гэй, за намі — ў новы свет!..
Цёпла там і там прастор,
Небасхіл там повен зор...
Сонца тчэ жыцця узор!..
Там спачынеш, бедната...
Тру-ру-ру, тра-та-та!
Бягуць яны... Іх ловяць вочы
Золата сонечны прамень,
Які і родзіць з цемры ночы

Вялікай будучыні дзень...
Што шаг — пабеда бліжай, бліжай...
Штандар чырвоны на плячы...
Чым крыж цягнуць — лепш спаць пад
крыжам...
Іграйце песню, трубачы!!!

## КАНСТАНЦЫЯ БУЙЛО
## (1893—1986)

Канстанцыя Буйло нарадзілася ў беднай сям'і панскага аб'ездчыка. Месца яе нараджэння на Ашмяншчыне. І таму першае свядомае ўражанне паэтэсы аб тым, што яе акружала, што запомнілася, звязана з Ашмяншчынай.

Цяжкую працу і несправядлівасць Канстанцыя спазнала ўжо ў маленстве. Яе бацька, бунтар па натуры, цяжка ўжываўся з гаспадарамі, і сям'я часта пераязджала з вёскі ў вёску.

У шэсць гадоў Канстанцыя ўжо магла чытаць, рана пазнаёмілася з творамі вядомых аўтараў (Ф. Багушэвіча, М. Лермантава, Я. Купалы, Я. Коласа і інш.). Асноўную адукацыю будучая паэтэса атрымала дома ў хатніх настаўнікаў і толькі некаторы час хадзіла ў сельскую школу.

Першы надрукаваны верш быў «Лес». Канстанцыя мела ўсяго дзесяць гадоў, калі яго памясцілі на старонках «Нашай нівы».

Пачатак творчасці Буйло быў шчаслівы. Яе часта друкавалі, вершы падабаліся чытачам. Пад апекай Янкі Купалы, які ацаніў талент маладой паэтэсы, быў выдадзены першы зборнік Канстанцыі Буйло «Курганная кветка» (1914).

Узлёт таленту паэтэсы спыніла першая сусветная вайна. Закрылася «Наша ніва» — не стала газеты, дзе можна было друкавацца на беларускай мове. Канстанцыя выходзіць замуж і пераязджае ў Маскву. Цяжкія падзеі таго часу і адрыў ад радзімы і сяброў-пісьменнікаў не спрыялі творчасці паэткі.

Ёй зноў дапамагае Янка Купала, ён прапаноўвае выдаць новы зборнік Канстанцыі, але і тут усё сапсавала ўжо наступная вайна. Рукапіс згарэў у доме Я. Купалы ў першыя ж дні вайны.

Пасляваенная творчасць Канстанцыі Буйло больш шчаслівая. Увесь час яна плённа працуе. Гэты перыяд жыцця паэткі адзначаецца як «сапраўдны песенны дождж». Многія яе вершы сталі народнымі песнямі. Выйшлі збор-

нікі паэзіі «Світанне» (1950), «На адноўленай зямлі» (1961), «Май» (1965), зборнік вершаў для дзяцей «Юрачка» (1957), «У бляску зор» (1968).

Памерла Канстанцыя Антонаўна ў Маскве.

## ТО НЕ ПЕСНЯ...

То не песня мая так далёка ляціць,
Як хаўтурны той звон, гулкім сумам гудзіць —
То не песня мая,
Не пяю гэтак я...
Гэта вырваўся стогн з набалелай душы
І расплыўся кудысь сярод сумнай цішы,
І паплыў ён удаль,
І таіўся ў ім жаль,
Тонам ціхім паплыў
Між калосістых ніў...
То не песня мая —
Не пяю гэтак я...
Сваім болем глухім з дна душы ён людской
Зварушыў, разбудзіў розных думачак рой,
З імі ўшыр паляцеў,
Рэхам гулкім гудзеў,
Разліваўся ўдалі між дрыгвы і балот,
То пад неба шыбаў, то кідаўся пад спод,
Аж расплыўся і сціх,
Як пражыты той міг,
Што мільгнуў у жыцці
І прапаў ў забыцці...
То не песня мая —
Не пяю гэтак я!..

* * *

Ціхім гоманам гордых вяршынь,
Шапаценнем зялёных галін
Лес адвечную казку казаў.
Казкі той зразумець не маглі
Птушкі, што ў ім гнёзды вілі,
Ані вецер, што там пралятаў...

Казку тую адчуў чалавек:
Баіў лес пра мінулы ўжо век,
Ён гісторыю пеў старыны,
Што было таму сотні гадоў,

Аб жыцці-быцці нашых дзядоў,
Як і дзе векавалі яны.

Ён аб войнах крывавых казаў,
З кім і дзе наш народ ваяваў,
Пеў аб долі-нядолі яго;
Ён аб славе яго гаварыў,
Як ён дружбу з сябрамі вадзіў
І за ворага меў ён каго.

Ціхім гоманам гордых вяршынь,
Шапаценнем зялёных галін
Баіў лес пра мінулы ўжо век.
Казкі той разумець не маглі
Птушкі, што ў ім гнёзды вілі,
Яе ўсю зразумеў чалавек.

## ЛЕБЯДЗІНАЯ ПЕСНЯ

Плыла яна, лілась, як громы, так магуча
З прапоўненых грудзей, з прапоўненай душы;
Як ветры, лёгкая, як буры, так кіпуча
Прамчалася кудысь у пустыннае цішы.

Мільёны тонаў там, у песні тэй спляліся:
Любоў, нянавісць, гром, агонь і бура ўраз.
Той, з чыіх грудзей такія зыкі паліліся,
Раз першы ў жыцці пяяў, ды ўжо ў апошні раз?

І змерлі тоны дзесь ў пустыннай сумнай далі,
Без рэха расплылісь у невядомым краю
І горны вецер там высока ўскалыхнулі...
А лебедзь?.. Ён памёр, спяяўшы песнь сваю...

## КУРГАН

Там, дзе быстраю хваляю рэчка плыве,
У даліне між цёмнага лесу,
Прытаіўся высокі зялёны курган
Пад плакучых бярозак завесай.

Руж здзічэлых кустамі зарос ён увесь,
Хто садзіў іх — ніхто тут не знае,
Між руж камень стаіць; пазалоту з яго
Сцёрла часу рука векавая.

А на камені надпіс: «Пад тым курганом
Ляжаць двое — хлапец і дзяўчына:
Пад бярозкай зялёнай схаваны Янук,
Пад кустом ружы дзікай — Галіна».

Хто іх тут пахаваў і былі кім яны —
Надпіс гэты не кажа нічога.
Аб усім давялося даведацца мне
Ад вандроўнага дзеда старога.

— Шмат гадоў працякло, як было гэта ўсё,—
Пачаў дзед.— На гары над далінай
Двор вялікі стаяў. У двары тым жыў пан
Нейкі з дочкай прыгожай, Галінай.

Тут, бывала, штоноч цэлы двор у агнях;
Шмат паноў адусюль наязджае,
Цэлу ноч п'юць, пяюць і гуляюць яны;
Без устанку музыка іграе,

А чуць свет раз'язджаюцца ўсе, хто куды;
Спаць кладуцца і пан і дружына.
Як замрэ цэлы двор... Адна толькі не спіць
У двары маладая Галіна.

Яна хутка ўстае, бо пад дубам ужо
Янка ціха на дудцы іграе,
Тут, бывала, штодзень статак белых авец
Ён на пашу у лес прыганяе.

І прыгожы ж быў Янка: хлапец, хоць глядзі!
Твар, як кроў з малаком памяшана;
А яго валасы чорны й цёмны, як ноч,
У стручочкі былі пазвіваны.

Там, бывала, пад дубам пасядуць яны,
Ціха-ціха на дудцы ён грае,—
Стада белых авечак паляжа укруг,
А Галіна вяночкі сплятае.

Але трэба ж бяды. Адзін пан малады
Прысылае сватоў да Галіны.
Бацька рад, на вяселле склікае гасцей,
Хоць не хоча йсці замуж дзяўчына.

У двары зноў банкет: п'юць, гуляюць, пяюць,
Рой дзяўчат маладую ўбірае:
Яна ж, вочы самкнуўшы, на крэсле сядзіць,
Толькі белыя рукі ламае...

Потым ўстала, памалу ідзе да дзвярэй...
— Пачакайце, вярнуся! — сказала.
На дварэ чакаў Янка — на рукі яго,
Абамлеўшы, Галіна упала.

Час ляцеў — маладая назад не ішла...
Пралятаді мінуты, гадзіны...
Над ракой нейкі крык... скаланулась вада...
Ў ёй прапалі Янук і Галіна...

Тут, пад тым курганом, бацька іх пахаваў...
Скончыў дзед і закрыў твар рукою;
Па сівой барадзе ўперагонку з сабой
Плылі ціха сляза за слязою.

— А скажы мне, стары, адкуль ведаеш ты
Ўсю гісторыю Янкі й Галіны?..
Тут стары памаўчаў і, абцёршы слязу,
Мне сказаў: — Янук быў маім сынам...

* * *

Дзе Вілья у Нёман ліе свае хвалі,
Я ў сумнай задуме стаю;
Купаецца месяц ў вод чыстым крыштале,
Яны ж з ціхім шумам плывуць ўсё далей,
Душу к сабе цягнуць маю.

Здаецца, штось шэпча у цёмнай глыбіне,
Здаецца, штось маніць, заве:
— Хадзі,— ў нашай глыбі ціхой адпачынеш,
Журба ўжо ліхая навекі загіне,—
Тут толькі ўцячэш ад яе.

— Хадзі,— мы у нашы сярэбраны хвалі
Спаўём, як дзіцятка, цябе,
І рыбак адгонім, каб сну не зганялі,
І скажам, каб вербы шумелі, пяялі —
Сны-байкі шапталі табе!..

## КУРГАННАЯ КВЕТКА

На сухім, сухім кургане,
Дзе ад спёкі траўка звяла,
Сярод лому, на бур'яне
Мая кветка красавала.
Калыхаў яе не ветрык,
Палівала не вадзіца,
А гарачых слёз расіца,
А уздыхі з глыбі нетры.
Не дзівіся ж, што балесна
Лепясткі яе шапочуць.
Ціхай скаргай, сумнай песняй,
Быццам ласкі просяць, хочуць,
Быццам моляць аб спагадзе
Болем цяжкім, непраможным...
А ты... ціха, асцярожна
Палі кветку ў смерці садзе...
Акрапі жывой вадою
Веры ў шчасце і надзеі,
І другою мо красою
Сэрца-кветка зарунее,—
І мо кіне на бур'яне
Да зямелькі прыпадаці,
Слёзы-росы праліваці,
На магіле, на кургане...
І мо зробіш, што красою
Яна новай заяснее,
Пахам шчасця і надзеі
Узнясецца над зямлёю.
І мо зробіш, што высока
Яна ўзнімецца угору
І засвеціць бляскам зораў
На палёў прасцяг шырокі...
Бо не плачкай ёй радзіцца,
Ценем смерці не ўзрастаці,
А жывой красой ірдзіцца,
К сонцу, к шчасцю заклікаці.

## АРКАДЗЬ МОРКАЎКА
## (1900—1957)

**Аркадзь Андрэевіч Моркаўка нарадзіўся ў в. Зазер'е, што на Міншчыне, у сям'і чыгуначніка. Працоўнае жыццё пачаў у 1916 г. у якасці тэлеграфіста на станцыі Мінск.**

Скончыўшы Віцебскі электрамеханічны тэхнікум, а затым Беларускі політэхнічны інстытут, працаваў электрыкам на прадпрыемствах Мінска, інжынерам у палаце мер і вагі.

У час Вялікай Айчыннай вайны паэт прымаў удзел у партызанскім руху.

Літаратурную дзейнасць Аркадзь Моркаўка пачаў у 1922 г. Яго вершы друкаваліся ў рэспубліканскіх газетах і часопісах. У 1928 г. убачыў свет першы зборнік паэта «Дым жыцця». У паэтычнай дзейнасці А. Моркаўкі былі частыя і працяглыя перапынкі.

Паэзія А. Моркаўкі вызначаецца лірычнасцю, пэўнай паэтычнай культурай.

Зборнік «Гады, як ветразі», падрыхтаваны незадоўга да смерці, знаёміць з лепшай часткай творчай спадчыны А. Моркаўкі.

## Я ЖЫЎ...

Мільёны год таму назад я жыў...
Яшчэ зямля, ад сонца адарваўшыся,
У згоду лёсу астывала,
Як след на попеле мой вырысы лажыў,
І зорка ў сэрцы начавала...

Вуголлі, помню, тлелі каля кучы
Камення вострага.
Я падышоў да іх,
У попел ногі палажыў
І крыкнуў першы раз у вышу гучна:
— Жыў! —
І рукі грэў,
І ў першы раз з грудзей памкнуўся спеў,
Мой спеў!..

А дні ішлі звычайнай чарадою,
Я вартаваў іх.
Я быў першы,
Хто здзіўлена сачыў за грамадою
Хмар свінцовых.

Тады ж і вершы
Зароіліся ў сэрцы, сэрцы новым...
Калі ж мільёны зор выходзілі на пашу
І мігаценнем роўным вабілі углыб;

Калі зямлю цяперашнюю нашу
Маланкі секлі, быццам дровы;

Калі зара ружовіла абшары,—
Я пазіраў, як стылі хмары,
Я дзівіўся,
І — стромы чулі мае словы —
Я — маліўся...

Вякі плылі, бы ціхая вада.
Я сёння — ўнук. Я заўтра — дзед.
Я — грамада...
Пясок Егіпту мой хавае след,
Дзе я пастроіў піраміды,
Я — раб... Мае балелі рукі,
Мяне тапілі акіяны мукі,—
Я ж абышоў зямныя кругавіды,
Стварыў мільёны дзіў.
І — сам дзіўлюся...
Я — жыў...
Але нікому не малюся.

## СТУКНІ Ў ДЗВЕРЫ

*Я. М-чу*

Стукні ў дзверы, ціха стукні ў дзверы,
І табе, як сонцу, буду рад,
Бо з маленства ў шчырасць сэрца верыў,
Мой таварыш, брат.

Бо гарэць святлом заўсёды можна
І згарэць — цяпло душы спаліць
На шляху, дзе радасна й трывожна,
На шляху — зямлі.

Шлях вядзе... і горкіх красак столькі
Зацвіло, збуяла пад нагой!
Мо таму, што важаць шчасце й болькі
Не аднэй вагой.

Шлях вядзе... Няўжо не хопіць веры,
Дай руку сюды, таварыш, брат!
Стукні ў дзверы, ціха стукні ў дзверы —
Буду сонцу рад.

## ЗОЛАК

Дзесьці далёка за лесам, за полем
Пеўні наклікалі золак —
Чуюць, падходзіць паволі, паволі
Раніца поступам кволым.
Раніца поступам кволым
Зараз пачне дзень вясёлы.
Зараз прачнецца памытае лісце
Сонца спаткаць, не праспаць.
Вецер «дабрыдзень»
між хатамі свісне.
— Поўнага коласа вам і снапа!
Поўнага коласа вам і снапа!
Радасна выйдуць сяляне ў поле,—
Новыя зложацца песні.
Глебу сталёвыя дзіды паколюць —
Гэтак зямлю
Трэба песціць.
Край наш жыве,
Край не загінуў!
Дзень будзе сёння прыгожы...
Хто ж не кахае маці-краіну?
Рукі хто зложыць?
Рукі хто зложыць?

# УЛАДЗІМІР ЖЫЛКА
# (1900—1933)

Уладзімір Адамавіч Жылка нарадзіўся ў вёсцы Макашы, паміж Нясвіжам і Мірам. Бацька паэта быў прадаўцом. Уладзімір скончыў гарадское вучылішча ў Міры, вучыўся ў Багародзіцкім сельскагаспадарчым вучылішчы Тульскай губерні. Навука дала будучаму паэту не толькі веды па аграноміі. Менавіта там Уладзімір пазнаёміўся з сусветнай літаратурай, захапляўся творамі Ібсена, Шэлі, Бадлера, Міцкевіча, Лермантава, Цютчава, Блока.

У 1918 г. У. Жылка працуе аграномам у дзяржаўным маёнтку пад Мінскам, якім загадваў Міхась Чарот. У гэты час паэт знаёміцца з Янкам Купалам, З. Бядулем, Л. Родзевічам, наведвае клуб-тэатр «Беларуская хатка». У 1920 г. Уладзімір Жылка захварэў на сухоты і выехаў з галоднага Мінска на Нясвіжчыну. Так ён апынуўся ў Заходняй Беларусі. Крыху акрыяўшы, Жылка едзе ў Вільню, дзе працуе

ў культурна-асветных арганізацыях, друкуецца ў газеце «Наша думка», у альманаху «Беларускія ведамасці», рэдактарам якіх быў М. Гарэцкі. У 1923 г. У. Жылка быў накіраваны заходнебеларускай грамадскасцю на вучобу ў Прагу — паэт паступае там ва універсітэт на гісторыка-філалагічны факультэт. У Чэхаславакіі Жылка друкуецца ў многіх часопісах як перакладчык, крытык, паэт, узначальвае там студэнцкі літаратурны гурток. Разам з Ігнатам Дварчанінам арганізаваў Асацыяцыю беларускіх прагрэсіўных студэнтаў, быў рэдактарам часопіса «Наш прамень».

У 1926 г. паэт прыехаў у Мінск на навуковую канферэнцыю па рэформе правапісу і застаўся тут. Працаваў літсупрацоўнікам у газеце «Звязда», дапамагаў паэтам-пачаткоўцам, уваходзіў у літаратурныя аб'яднанні «Маладняк» і «Узвышша». Друкаваўся ў газетах і часопісах з 1920 г. У Вільні выйшлі дзве кніжкі паэзіі — паэма «Уяўленне» (1922) і зборнік вершаў «На ростані» (1924). У 1927 г. выходзіць зборнік «З палёў Заходняй Беларусі». У той час, калі У. Жылка рыхтаваў да друку чарговы зборнік вершаў, ён, як і многія іншыя пісьменнікі, быў прыгавораны да высылкі.

Хворага паэта вывезлі ў г. Уржум Вяцкай губерні, дзе нейкі час ён працаваў выкладчыкам замежнай літаратуры ў медтэхнікуме. Перажыванні, перамена клімату, расстанне з Бацькаўшчынай — усё гэта прывяло да хранічнай хваробы. 1 сакавіка 1933 г. паэта не стала.

Перыяд творчасці Уладзіміра Жылкі доўжыўся крыху больш як дзесяцігоддзе, прычым увесь гэты час паэт цяжка хварэў. Невылечная тады хвароба пэўным чынам уплывала на настраёвасць вершаў: у многіх з іх — смутак і прадвызначанасць лёсу. Многія крытыкі адзначаюць сугучнасць паэзіі У. Жылкі і М. Багдановіча.

Уладзімір Жылка, выкарыстоўваючы багаты вопыт заходнееўрапейскай і славянскай літаратуры, імкнуўся ўзбагаціць беларускую літаратуру новымі формамі, ідэямі і вобразамі.

Вялікую работу па вывучэнні творчасці У. Жылкі правёў беларускі літаратуразнавец і крытык У. Калеснік. Дзякуючы яму адроджана значная частка літаратурнай спадчыны паэта, адкрыліся раней невядомыя факты яго біяграфіі.

## БЕЛАРУСЬ

Беларусь, Беларусь — гэты зык
Паліць душу маю, як агнём.
Я не ведаю, чым ён вялік,
Але думак не змог я аб ём.
Як пачую яго, задрыжыць
Маё сэрца, заные ў грудзях,
І балюча так робіцца жыць,
І шукаеш чагосьці ў людзях.

Беларусь, Беларусь... гэтых слоў
Пойме музыку, хто ўсёй душой
І магутны, тужлівы іх зоў
Зловіць думкай сваёю жывой,—
Затрапеча, бы ранены, ён,
Задрыжыць пад навалаю дум:
Гэткі страшна-пакутны іх стогн
І аб волі бязмерны іх сум.

Беларусь, Беларусь — гэта дзей
І разумных, і слаўных прыклад;
Край вялікіх і дум, і людзей,
І бяздольна схіліўшыхся хат,
Дзе нядоля і гора спрадвек
І бяднота сярмяжных жывуць,
Крыўда дзе, паняверка і здзек
Краскай макавай ярка цвітуць.

Беларусь, Беларусь —
Край замчышч, курганоў,
Дзе таяцца страхоцці і звод,
Дзе русалкі выходзяць з віроў,
І начніцы вядуць карагод,
Дзе пад шум каласоў ведзьмары
На палетках заломы кладуць
І ў купальскую ноч у бары
Забабоны ў пацёмках снуюць.

## ДЗЕД

Патухшымі вачыма
Глядзіць на божы свет
Стары, у крук сагнуты,
Як голуб, белы дзед.

Пражыў на свеце многа:
Без нечага сто год;
За век пабачыў гора,
Нямала вынес слот.

Калісьці, да паўстання,
Рабіў, цярпеў прыгон...
К нямцом не раз віціны*
Ганяў па Нёмне ён.

Меў сілу непамерну,
Здаровы быў, як мур.
Таму так жыва з песняй
Гарэ сын родны шнур;

Таму так — шчыра ў працы —
Свой край будуе ўнук,
Адважны і бясстрашны,
Не пакладае рук.

А дзед жыве мінулым,
Таемным і глухім,
Гаворыць — бае казкі
Аб даўнім і сівым;

Пра войны, панства, войтаў,
Русалак і начніц,—
І хараством чаруе
Няхітры склад быліц.

Ды часта паглядае
За вёску ён... туды,
Дзе між бяроз пад крыжам
Спачыне ад бяды.

Ды хоць стары, а думку
Гадуе ўсё адну:
Хоць перад смерцю ўбачыць
Свабоднай старану!

* * *

Толькі той, чый вольны дух
Застаецца ў бойках квол,

Толькі той, хто творыць рух
Беларускіх мест і сёл,

Толькі той, хто вера ў цуд —
Лепшу долю курных хат,
Толькі той, хто любіць люд,
Толькі той — мой любы брат.

Брат — бо думкі ў нас адны
І адзін злучае лёс,
Бо для роднай стараны
Долі хочама без слёз.

Мы мацнеем што ні раз,
Чуюць моц чужы і свой.
Жджэм: надыдзе грозны час —
Будзе радасць, будзе бой.

Пагалоска здзівіць свет,
Заварожыць песняў тахт —
Бо значон дзядоўскі след
І вядзе у далі шлях.

А мо спыніць які кат?
Мо спужаемся чагось?
Калі трэба, ўмерці нат
Нам не страх, а шчасце ёсць.

## МАЁЙ МАЦІ

### I

Выпраўляла маці сына
На чужую старану,
Бласлаўляла ладам-чынам,
Каб шчасліва павярнуў.

Ды наказвала хлапчыне:
«Доля прыйдзе ці міне —
Помні, сыне, на чужыне
Аб краіне, аба мне!

Не запамятай ніколі,
Будзеш бедны ці багат,
Нашай долі і нядолі,
Нашых пожняў, нашых хат».

«Ой, матуля, ой, кахана,
Не забыцца думкам, не!
Ці то позна, ці то рана
Люты смутак душу тне.

А ўспамянеш, бы ў тумане,
Бацькаўшчыну і цябе,
Сэрца звяне, сіл не стане
Біцца ў смутку і жальбе».

II

Ты чакаеш сына, ведаю,
З гора, ведаю, з тугі
Ўпалі вочы, губы бледныя,
Старыць, сівіць лёс благі.

І нястрымнае, і лютае
Не пазбудзешся нуды;
І клапотамі, пакутаю
Гнуць суровыя гады.

Як бярозка тонкім веццейкам,
Ў сум прыбралася сама,
Бачыць сонца ясным лецейкам,
Што табе пацех няма.

І падслухае пшанічанька,
Як на постаці адна
Ты ўздыхаеш, і крынічанька
Жалю ўскіпвае са дна.

А зімою ноч паглядае
Доўга, сцішна пад акном,
Як прадзеш, прадзеш, нярадая,
Не пазбудзеш думак сном.

Як праз ветру спеў з трывогаю
Ловіш з снегавых далін,
Ці не едзе хто дарогаю,
Ці не стукне ў дзверы сын...

Маё сэрца поўна любасці
Да радзімае мае,

Паміж тлумам у загубнасці
Песні помняцца твае.

А калі лучыць нягодная
Доля згінуць ў чужыне,
Не ўздыхне душа ніводная,
Не ўспамяне пра мяне.

Толькі ты згаворыш пацеры
Над нядоляю маёй,
Толькі вочы мае мацеры
Затуманяцца слязой.

* * *

Месячыку-месяц,
Срэбранькія рожкі!
З-за хмарынкі, месяц,
Выгляні хоць трошкі.

Бедная галоўка,
Што не мае долі:
Дажынаць свякроўка
Кінула на полі.

Супраць ночы цёмнай
Ледзь дамоў вяртаю,
Цішынёй таёмнай
Цемната пужае.

Мгліца ў вочы лезець,
Не відаць дарожкі,
Месячыку-месяц,
Срэбранькія рожкі.

## УЛАДЗІМІР ДУБОЎКА
## (1900—1976)

У багатай вялікімі і самабытнымі талентамі беларускай літаратуры Уладзіміру Дубоўку належыць пачэсная месца. Свой першы верш ён надрукаваў у 1921 г., а верш апошні — за некалькі месяцаў да смерці. Гэта быў высокаадукаваны чалавек, знаўца сусветнай паэзіі, таленавіты

перакладчык твораў Шэкспіра, Байрана, Ду Фу, Славацкага.

Уладзімір Мікалаевіч Дубоўка нарадзіўся ў вёсцы Агароднікі Вілейскага павета Віленскай губерні ў небагатай сялянскай сям'і. З ранняга дзяцінства бацькі прывівалі сыну любоў і пашану да працы. Маці адкрыла яму мудрасць і прыгажосць народных казак, красу і чароўнасць песень. Яна добра ведала беларускую мову, і нават тады, калі воляю лёсу сям'я апынулася ў Маскве, дык і там маці размаўляла толькі па-беларуску. «Я,— пісаў паэт,— ніколі не вучыўся ў беларускіх школах, усё маё веданне беларускай мовы — ад маці і з вёскі. Вось чаму маю пэўную падставу называць беларускую мову — матчынай мовай».

Пачатковую грамату Уладзімір атрымаў у Манькавіцкай школе, пасля два гады вучыўся ў Мядзельскім двухкласным вучылішчы. Восенню 1914 г. У. Дубоўка паступае ў Нова-Вілейскую настаўніцкую семінарыю. Аднак першая сусветная вайна перайначыла ўсе планы: бацькі назаўсёды пакінулі родныя мясціны. У 1918 г. У. Дубоўка паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта, але вучыцца там не давялося. Ён едзе настаўнічаць у Навасельскі павет Тульскай губерні. Праз два гады Дубоўку прызвалі ў Чырвоную Армію, а пасля дэмабілізацыі ён працаваў інспектарам Наркамата асветы РСФСР і займаўся на творчым аддзяленні Вышэйшага літаратурна-мастацкага інстытута.

Як бачым, будучы паэт усё жыццё цягнуўся да ведаў, ніколі не пераставаў займацца самаадукацыяй. Працуючы ў Маскве, Дубоўка прымаў дзейны ўдзел у грамадскім, навуковым і літаратурным жыцці Беларусі. Ён быў арганізатарам і першым рэдактарам дзіцячага часопіса «Беларускі піянер», затым адказным сакратаром консульства Беларусі пры ўрадзе. Паэт актыўна ўдзельнічаў і ў літаратурным жыцці Беларусі. Спачатку Дубоўка ўваходзіў у літаратурнае аб'яднанне «Маладняк», а ў 1926 г. быў адным з ініцыятараў стварэння аб'яднання «Узвышша». У 1931—1957 гг. У. Дубоўку давялося жыць далёка ад роднай Беларусі — у Кіраўскай вобласці, Чувашыі, Грузіі, Краснаярскім краі. З 1958 г. Уладзімір Мікалаевіч жыў у Маскве і плённа працаваў у паэзіі, прозе, драматургіі, крытыцы. Першыя кніжкі паэта ўбачылі свет у далёкія дваццатыя: зборнік «Страла» (1923), «Трысцё» (1925), «Там, дзе кіпарысы» (1925). Ужо тады Дубоўка пачынае

настойліва працаваць у галіне буйнога эпічнага жанру, стварае паэмы на матэрыяле сучаснасці.

Памёр паэт у Маскве.

Уладзімір Дубоўка ўзбагаціў беларускую літаратуру высокамастацкімі творамі, узняў культуру беларускага вершаскладання, пашырыў жанравыя магчымасці нацыянальнай паэзіі і прозы. Юны чытач любіць і будзе любіць аповесці «Жоўтая акацыя», «Як Алік у тайзе заблудзіўся», «Ганна Алелька». Паэт быў лаўрэатам літаратурнай прэміі імя Я. Купалы.

## ЛІСІЦА, ЛЕЎ І ВОЎК

Лісіца, Леў і Воўк
пайшлі на паляванне.
Прастор увесь замоўк
ад страху і чакання.
Ідуць паляўнікі,
здабычу ловяць,
давяць.
Здабытак быў такі:
каза,
алень
і заяц.
Леў кажа да Ваўка:
— Дзялі на ўсіх здабычу!
Дзялі папраўдзе,
так,
як вучыць даўні звычай.
Воўк атрымаў загад,
не траціць часу марна.
Ідзе дзяльба на лад.
— Каза —
табе, ўладар наш.
Лісіцы —
зайца дам.
Аленя —
з'ем я сам...
Угневаўся наш Леў,
што Воўк яго зняславіў.
З Ваўка і скуру здзеў
і ад жыцця пазбавіў.
— Падзеліш ты цяпер,—
Лісіцы кажа ветла,—
чакаю ад цябе

я праўды самай светлай...
Лісіца па зямлі
хвастом матнула доўгім.
— Каб вы, ўладар, жылі
заўсёды без трывогі...
Я так і падзялю,
як вучыць звычай даўні:
казу тваю даю
табе я —
на сняданне.
А зайца —
на абед.
Аленя —
на вячэру...
— Ну, дзякую табе!
Тваёй дзяльбе я веру!
Скажы ты мне цяпер,
хто навучыў цябе
разумна падзяліць так?!
— О ўладар вялікі!
Вось гэты самы Воўк,
навекі што замоўк...

## ВЯЛЬМОЖНЫ ПЫХ

Калісьці, ў старадаўні час,
жыў ганарысты пан у нас.

Хоць ганарыстымі яны
былі тады усе паны,

але вось гэты — над усіх.
Яго празвалі — Васпан Пых.

Ён выхваляўся, што з людзей
ніхто, ніколі, анідзе

не зможа ашукаць яго.
А у дадатак да ўсяго

ён абвясціў людзям усім:
хто ўсё ж ткі возьме верх над ім,

таму ён без ніякіх слоў
дасць падарунак — сто рублёў.

Ну, без абвестак знalі ўсе,
што ім няўдача прынясе:

дадуць на стайні бізуноў,
каб не раўняўся да паноў.

А быў у нас хлапец адзін —
звычайны, сціплы селянін.

Ён, як і многія з сялян,
быў разумней, чым важны пан.

Яго ўсе знали навакол.
Але да пана ён не йшоў,

не квапіўся на грошы.
«Ат!
Я з працы ўласнае багат!»

Сказалі пану:
— Ёсць хлапец.
Хоць малады, але мудрэц.

Калі б да пана ён прыйшоў,
напэўна ўзяў бы сто рублёў.

Пан аж падскочыў:
— Так, так, так!
Чаму ж не йдзе па іх, дзівак?!

Ану, паклічце да мяне!
Пабачым, хто з нас разумней!

У пана лёкай не адзін.
І вось праз некалькі хвілін

вядуць хлапца таго ў палац.
Ля пана госці ўсе стаяць.

Цікава ўсім дазнацца ім,
што будзе ў паядынку тым.

У хлопца торбачка ў руках
і дзве смяшыначкі ў вачах.

— Паночку!
Мне цяпер не час.
Я прыбягу пазней да вас.

На бераг рыба ўся ідзе,
аж возера шуміць-гудзе.

Вазамі возяць там яе.
Мне хопіць торбы аднае...

Сказаў —
і з торбачкай бягом.
Падняўся тут і шум і гром.

— Як так,—
грыміць вяльможны Пых,—
я рыбу гадаваў для іх?!

Вазамі мой цягаюць скарб,
гібее мой срабрысты карп?!

Я пакажу ім!
Гэй!
Каня!
За мной!
Усе вазы спыняць!

Паселі.
Капыты — цок, цок!
З-пад капытоў ляціць пясок.

Застаўся вецер ззаду дзесь,
як хмара, следам пыл ідзе.

На бераг выскачылі ўсе.
Там хвалі возера нясе.

Спакой, зацішша пры вадзе.
Вазоў ніякіх анідзе.

Адзін той хлопец ля вады.
Ён толькі што прыбег сюды.

У хлопца торбачка ў руках
і дзве смяшыначкі ў вачах.

— Дзе тая рыба?
Дзе вазы?
Я з іх вазьму у два разы!..

А хлопец пану ў гэты час:
— Дазвольце супакоіць вас,

паночку, рыба ўся ў вадзе!
А пан няхай мне пакладзе

у гэту торбу сто рублёў,
бо пана я сюды прывёў...

Аж спалатнеў вяльможны Пых.
А сто рублёў даў, залатых!

## ДОЖДЖ У МАЗЫРЫ́

Павольна, ціха над зямлёй,
нібы валы, бліжэюць хмары.
Дзе — чарадой, дзе — грамадой,
дзе — падабраныя да пары.

На небе месяц, як пастыр,
на плечы ўскінуўшы сярмягу,
зганяе хмары ўсе ў Мазыр,
каб паратунак даць на смагу.

Магчыма, там грыміць пярун?
Ці дзе варочаюцца жорны?
Ці, можа, ляскае бізун
за даляглядам цьмяна-чорным?

Туды і месяц наш нырнуў,
сярмягай да вушэй закрыты.
А цераз цемру-цемніну
паліўся дождж, як цераз сіта.

Не спіць ніхто у Мазыры.
Глядзяць усе праз вокны, дзверы,
як неба шле людзям дары
без ліку, без ніякай меры.

Знікае смага тая скрозь,
што панавала тут праз лета.

А дождж, як наймілейшы госць,—
вясёлы госць! — ідзе над светам...

З высокіх дрэў знікае пыл,
знікае з вуліц брукаваных.
У Прыпяць пыл увесь паплыў
завулкамі, як рукавамі.

Калі спыніўся дождж зусім,
а ён спыніўся каля золку,
ў праменні ясным, залатым
устала сонца над узгоркам.

Тады Мазыр ва ўсёй красе
раскінуўся перад вачыма.
Тады пазналі мы усе:
быць прыгажэйшым — немагчыма!

## ЯНА ПАСЫПАЛА НА ДОШЧАЧКУ ЗЯРНЯТАК

Яна пасыпала на дошчачку зярнятак
і, стаўшы крыху збоку, паглядае,
як прыназемілася
птушачак грамадка...
Хвіліна урачыстая якая!

## ВЯЛІКІ КОШЫК ПАДНЯЛА МАТУЛЯ

Вялікі кошык падняла матуля,
а сын маленькай ручкай памагае.
Матулю дапамогай
ён расчуліў...
Хвіліна урачыстая якая!

# СЫМОН БАРАНАВЫХ
# (1900—1942)

**Яшчэ адзін наш таленавіты пісьменнік, сялянскі сын Сымон Баранавых, памёр у самым росквіце сіл далёка ад роднай Беларусі, пражыўшы на свеце ўсяго сорак два гады. Дзякуючы сваім апавяданням, аповесцям, раманам ён пакінуў значны след у нашай літаратуры першай паловы XX стагоддзя.**

Што адрознівала яго прозу? Востры канфлікт, дасціпны гумар, дынамічнасць і пачуццё трывожнага аптымістычнага часу. Апавяданні яго простыя, нібы замалёўкі, але ўсе праўдзівыя, рэалістычныя, жывыя накіды сялянскага побыту.

Сымон Баранавых (Баранаў) нарадзіўся ў вёсцы Рудкава Ігуменскага павета Мінскай губерні. Бацькі яго былі малазямельныя сяляне. З дзяцінства Сымон зведаў увесь цяжар сялянскай працы, палюбіў вёску, яе люд і паверыў у неабходнасць рэвалюцыйных змен.

У Чырвонай Арміі Сымон праслужыў тры гады кулямётчыкам. У 1924 г. працаваў старшынёй сельсавета, цягнуўся да вучобы і паступіў у Беларускі дзяржаўны універсітэт. Вось тут і праявіўся ягоны талент добрага артыста, здольнага журналіста, які пачаў з допісаў у газеты, з фельетонаў. Знаёміцца і сябруе з Чаротам, Купалам, Чорным. У 1931 г. Баранавых працаваў на беларускім радыё. У 1933 г. была створана арганізацыя сялянскіх пісьменнікаў, якая пачала выдаваць часопіс «Беларусь калгасная». Сымон Баранавых, можна сказаць, трымаў часопіс уласным талентам і арганізацыйнымі здольнасцямі. Ён радаваўся жыццю, пісаў добрыя творы, але ў 1936 г. быў беспадстаўна арыштаваны і высланы ў Новасібірскую вобласць, а затым на Калыму, адкуль не суджана было вярнуцца. Засталіся яго творы: аповесці «Пастка», «Межы», «Новая дарога», раман «Калі ўзыходзіла сонца» і шэраг апавяданняў.

Гістарычна пісьменнік быў праўдзівы, у сваіх творах быў шчыры, як і ў жыцці. Беларуская літаратура набірала пастунова вышыню з дапамогай некаторых твораў Сымона Баранавых, і за гэта яму будуць яшчэ доўга ўдзячны чытачы і маладыя пісьменнікі.

## ХЛОПЧЫК ПЕТРУЧОК

— Уставай, мой сынок, уставай, Петручок. Умыешся, дык і сон пройдзе. Я табе паснедаць дам, і ў торбачку возьмеш... Уставай, маё дзіцятка, ды сходзіш...

І Петручок, дзесяцігадовы хлопчык, падняўся і сеў на ложку. Ён пачухаў каля вуха, потым пад пахаю, а калі Хрысціна, яго маці, трымала над цабэркам конаўку халоднай вады, саскочыў з ложка ды пачаў умывацца.

Вялікае гора было ў Хрысціны: яе сямігадовая дзяўчынка Настуля ляжала пры смерці.

— Вось нічога ані ў рот, акрамя калі жыжачкі з круп-

ніку паспрабуе, ды і тую вырве, вытузае зразу ж,— плакала Хрысціна, жалілася суседцы Макрыне, якая прыходзіла даведацца яе дзіцяці.

— Спалохана. Пярэпалахі трэба выкачаць,— вырашыла тая.

Але Хрысціна казала, што яна ўжо заклікала Паладзю, два разы нават, дык горай яшчэ: паліць пачало.

— Ну, дык не сядзець жа злажыўшы рукі,— бедавала Макрына далей,— а трэба шукаць якога-небудзь ратунку,— казала яна.— Да Воўка трэба наведацца, вады прынесці: і калі на смерць — памрэ зразу: кавэнчыцца не будзе, а не — папраўляцца пачне.

Хрысціна і сама ведала гэта, але што значыла для яе матчынага пачуцця «кавэнчыцца не будзе, памрэ зразу». І яна, тоячы ў сваім сэрцы вялікі жаль, адкладвала страшэнную думку на заўтра.

— Хоць хворая пабудзе ў маім позірку,— разважала Хрысціна,— бо гэты смутны, маўклівы, вечна без смеху, стары дзед абавязкова вырашыць лёс маёй дачушкі.

Але цяпер у такі цяжкі час, калі зусім была малая надзея на дзяўчынку, Хрысціна канчаткова вырашыла паслаць Петручка за вадою. Вось за гэтым і ўспарола яна яго так рана.

— На ж табе рубель грошай,— казала Хрысціна, калі Петручок надзяваў шапку,— а калі будзе мала — скажаш, аддадзім... Бутэльку я разам з хлебам у торбачку ўлажыла,— дадала яна, і Петручок выйшаў з хаты.

Сонца толькі што паднялося. Раніца была маўклівая, росная. І толькі пастухі парушалі гэтую маўклівасць, бо кожны хацеў паказаць сваю здольнасць іграць у трубу. А Петручок ішоў са сваімі дзіцячымі развагамі, ішоў за тым, за чым паслала матка.

Ён ужо мінуў поле, выйшаў на луг і пайшоў нацянькі, каля рэчкі.

Дарога яму добра была вядома: лугам каля рэчкі, цераз лес, а за лесам дзевяць вёрст да Амшарнікаў, дзе і жыў Воўк, вядомы на ўсю ваколіцу знахар.

— Хто ж сходзіць?.. Трэба схадзіць...— разважаў Петручок ідучы.— А яна, бедненькая, так стогне... Усю ноч я не спаў. Цяжка стагнала... Мне нават хацелася плакаць... Я думаў, што яна канае. Бедненькая... Хто ж сходзіць?..

І Петручок ад цяжкіх разваг пераходзіў з сваімі думкамі да шклавіднае люстранае рэчкі.

Ён ішоў, углядаўся ў празрыстую ваду, якую злёгку карбаваў маленькі, нячутны для твару ветрык. А то і кружочкамі разбягалася вада, і тады была думка ў Петручка: «Ваду, мусіць, п'е рыбка».

Ён агібаў адзін за другім крывыя павароты рэчкі.

Бацькі ў Петручка не было: ён не вярнуўся з расчыненага жорала вайны, якая праглынула яго, як глытае полымя камара, што кружыцца ў цёплым дыме запаленага дому.

— Без вестак прапаў,— плакала часта Хрысціна і гэтак жыла, гадавала дзяцей, ускладала на іх свае надзеі.— Вырастуць — да смерці дахаваюць, прыгорнуць костачкі,— цешыла сябе думкаю...

Сонца ўжо сходзіла з паўдня, як Петручок збіраўся пакінуць рэчку. Яно цяпер прыпякала ў яго загарэлую шыю і трамаціла яго зірк. Паветра было застылае, густое.

— Сяду,— вырашыла дзіцянё,— адпачну.

І ён сеў на сакавітую, мяккую траву каля ракітавага куста.

Навакол шалясцела лісце ракіты ды беленькі матылёк непадалёку рабіў кругі — лукаціў паветра, а потым сеў на лісток.

Петручок дастаў свой полудзень.

За кустом ціха булькала рэчка, нібы іграла яна нейкую песню.

Петручок папалуднаваў, напіўся з рэчкі і прылёг — на хвіліну прылёг. Ён ляжаў дагары як пласт, глядзеў у блакітнае неба. Доўга ў адзін пункт глядзеў.

Але вось пункт ператварыўся ў шэрую пляму, вочы гублялі яго, знаходзілі і зноў гублялі...

Па целе распаўзалася прыемная асалода, якая абхінала яго спакойнымі марамі.

Было прыемна, хораша, мякка і ціха.

Яшчэ і яшчэ паказалася ўваччу шэрая пляма і потым замітусілася і знікла.

Ён заснуў і спаў моцным дзіцячым сном, падлажыўшы пад галаву ручку, локаць якой прасвечваўся праз прадраную зрэбную кашулю.

Ён спаў, а дома маці чакала вады — чароўнай сілы чакала, якая павінна адратаваць яе дарагое сэрцу дзіця. Але хіба ён вінаваты ў гэтым? Хіба ён не імкнуўся выратаваць маладое жыццё?..

І ён спаў, а сонца не чакала — плыло да невядомага кругавіду.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

— Прачніся... Устань...— бубнілі ў вуха невядомыя шэпты.

— Ты ж старэйшы... Ніхто ж не паможа... Устань...— зноў не адставалі абрыдлыя шэпты, і ён адкрыў вочы.

— Што я скажу дома! — вырваўся дзіцячы плач, калі Петручок глянуў на сонца.— Яна памірае. Яна мо памерла... Што я зрабіў...— застагнаў ён ізноў.

А сонца павісала над лесам. Астатняя пазалота хутка збіралася пагаснуць. І тады кінуўся бегчы, каб да поўнага змроку да дому дабегчы.

— Што?.. Што?.. Што я скажу? — бег Петручок з гнятучаю думкаю.— Дома не было,— скажу, мільганула ў яго галаве, і ён зажмурыў вочы.— Ой, не,— застагнаў Петручок.— Ой, не. Гэты стары дзед — Воўк — ніколі не вылазіць з сваёй пакрыўленай набок хаты. Колькі хадзіў, заўсёды заставаў... З мамкаю хадзіў да Воўка, як мне балела горла... Адзін хадзіў мамцы вады, як спалохалася пры адступленні... Колькі хадзіў, заставаў.— А Воўк усё ж не памог матцы... Памерла б, каб дзядзька Цімох не прывёз таго чалавека ў акулярах... Пастукаў нейкаю трубкаю, паслухаў праз худыя грудзі ды даў у гэтакай маленькай бутэльцы нейкай горкай вады... Не гэтулькі, як Воўк... А памагло...— А як моцна спужалася тады!.. У ногі цалавала тоўстаму паляку з рыжымі вусамі, каб не запальваў нашай хаты... А ён нібы дурны: думаў, што ў нас ёсць конь... Дзядзька ж Цімох засяваў нам поле. Цяпер дык вось купілі... Бедная матка, як яна спужалася... Добры быў чалавек у акулярах.

Ён бег, разважаў, ставіў пытанні і не знаходзіў выйсця з свайго слёзнага становішча.

Сонца ўжо зайшло. Яго празрыстая ружавізна густа асядала на вострыя верхавіны лесу. Ад рэчкі ўсплываў туман, які пластам распаўзаўся па-над маўкліваю, вечна задумёнаю вадою. І тады яго дробныя капелькі асядалі на траву, рабілі яе больш сакавітаю, крохкаю.

А вось і зорачка вынырнула з бяздоння густога блакіту ды пачала моргаць сваімі рожкамі. Жукі прарэзвалі паветра. А там недзе пасярод лугу квактуха закумкала. Яе падхапіла другая, трэцяя... і безупынныя песні жыхароў балота рассыпаліся па ваколічных абшарах.

І тады музыка прыроды глушыла дзяціную журбу, якая вылівалася буйнымі, як боб, слязьмі.

— Што я скажу?.. Што... Што...

І Петручок супыніўся — пайшоў крокам. Да дому заставалася вярсты паўтары. Ён цяпер увайшоў у добра

знаёмыя месцы, ад чаго баязлівасць з надыходам ночы знікла.

Ён ішоў каля рэчкі, тою самаю сцежкаю, і глядзеў, як цягнецца туман, адчуваў, як сціскаецца, б'ецца сэрца.

— Набяру...— мімавольна, незразумела для яго нават, ці можа ён выказаць гэтае слова, прамчалася думка ў дзіцячым розуме.

— Набяры...— нібы шапнуў на вуха нейчы голас, і ён астанавіўся — дастаў бутэльку.

— Буль-буль-буль...— бегла вада праз вузкае рыла, і ён набраў. Адліў трошкі назад — гэтулькі набраў, колькі даваў стары Воўк.

А тады... ашчупаўшы за пазухаю грошы, пайшоў памаленьку з сталаю адвагаю дахаты.

Сырызна, праз якую хварэла Хрысцініна дзяўчынка Настуля, амаль не давяла яе да смерці. Дзяўчынка хварэла халярынаю.

Пасля крызісу Настуля хутка пачала папраўляцца. Цераз тыдзень, у адну з раніц, Настуля нават сама ўстала з ложка ды папрасіла есці.

І тады:

— Вялікі чалавек!..

— Усемагутная сіла!..

А Макрына з гуртка сабраўшыхся ў Хрысціны баб нават крыкнула:

— Мёртвых васкрашае...

І ўся гэтая хвала старому Воўку, нібы на хвалях шырокавяшчальнае радыёстанцыі, разляталася па абшарах.

А Петручок?

А Петручок слухаў тады сваім маладым дзіцячым розумам бабскі гоман.

Слухаў ды ўсміхаўся...

## РАНІЦАЮ

Раніца. Росна. Ярка.

Вёска толькі што прачнулася.

Вёску сваім галёканнем абудзілі пастухі, якія каля кожнага акна цягнуць сваё абрыдлае і непакойнае для гультаяватых баб: «Вы-га-ня-й!»

Гэтыя бабы вельмі ўжо не любяць гэтага «выганяй», бо ў такую раніцу так соладка спіцца!

Агапа, больш рухавая жанчына, устае заўсёды раней. Яна ніколі не чакае, пакуль будзе будзіць пастух. Яна і

сёння ўстала рана і, падаіўшы загадзя кароў, пачакала і выгнала іх да пастуха.

Цяпер паветра ў вёсцы зразу напоўнілася шумам, крыкам. Там рыкалі каровы, бляялі авечкі, а там яшчэ стары Пракоп цягнуў сваё «выганяй» — і ўсё гэта, прабіўшыся на прасторныя абшары поля, за вёску, рассыпалася на гэтых абшарах, і далёка, аж у алехавым гаі, адбівалася густым рэхам і прападала.

Агапіны дзеці ўжо паўставалі і гулялі цяпер на вуліцы. Лаўрэн, яе мужык, пайшоў на поле араць папар, бо днём за аваднямі ды мухамі і носа нават нельга выткнуць: да таго ўжо вельмі стаіць гарачыня. І цяпер, астаўшыся адна дома, Агапа падпаліла ў печы, і пакуль угараліся дровы, узяла вёдры і пайшла за вадою.

— А мая ты сястрыца!.. А мая ты міленькая! — сыпала нібы шротам Іваніха, спатыкнуўшыся з Агапаю каля студні.— Ды гэта ж на людскі смех, ды гэта ж каб на мяне, дык я яе з хаты вон бы, каб і нага яе не была!.. Гэткая валацуга,— казала яна, размахваючы рукамі ва ўсе бакі,— гэта ж трэба! А ён цярпіць, а ён слухае, як дурань, ды яшчэ і не абзавіся, маўчы, а то, дальбо, у морду нават хлыснуць не баіцца — вось што!

Апошняе яна сказала так цвёрда, што Агапа аж паставіла вёдры, у якія яна ўжо набрала вады, ды хацела адыходзіць.

— Ды што ты кажаш, мая Іваніха? Няўжо такі ў морду? — зацікаўлена паківала галавою Агапа.

— У Мікалаіхі запытайся, яна бачыла, дальбо, бачыла! Вось каб мне з месца не сысці, каб мне тут правaліцца, што бачыла,— зноў, яшчэ шпарчэй, засыпала Іваніха. Але на гэтую гутарку з-за плота якраз выйшла і сама Мікалаіха. Іваніха, убачыўшы Мікалаіху, яшчэ лепш пачала бажыцца і клясціся, каб даказаць аб тым, што яна аб усіх і аб усім ведае, як ніхто.

— Што ў вас тут за спрэчкі? — запыталася, падышоўшы з вёдрамі, Мікалаіха.

— А мая ты кумка, а мая ты залаценькая! — не сутрымлівалася Іваніха.— Аб сцерве аб гэтай, аб Марылі, гутарым. Я кажу, што гэтага яшчэ нідзе не чуваць. Ён, Антось, яе мужык, гэтак працуе, глядзіць, каб быў хлеб і да хлеба, а яна круціцца з гэтым Сцёпкам. А бадай табе галава скруцілася з карку! Вось брыда...— і Іваніха плюнула, нібы яна гэтым узяла свой верх і замацавала сваё «я», хоць ніхто супярэчыць ёй і не збіраўся.

— А я, каб была яе мужыком, дык за валасы ды вон

сцерву з хаты: ідзі, каб і чнару твайго не было. Ідзі, валацуга, з сваімі кавалерамі, дзе горкі перац расце. А то нюня, горай, як якая баба, а не мужчына,— гэты самы Антось.

Не менш Іваніхі, у сваю чаргу, разышлася Мікалаіха, але больш паважна, вытрымана.

Іваніха з Мікалаіхаю ў вёсцы Язвішча бабы першыя, якіх ніхто ніколі не можа ні ўгаварыць, ні абгаварыць. Ніхто не можа раней іх дачуцца аб той ці іншай навіне; ніхто першы не выдумае і не пусціць па ўсёй вёсцы тое, што яшчэ і на свет не паспела нарадзіцца.

Часамі возьме ды ўзбрыдзе ў галаву Мікалаісе альбо Іванісе думка, што Пятрусь, мужык Тэклі, якому каля шасцідзесяці гадоў, ходзіць да ўдавы Ганны. І яны будуць клясціся і бажыцца кожнаму, каго толькі не спаткаюць, што гэта праўда. І будуць клясціся датуль, аж пакуль не пасвараць старых людзей, якія дажываюць спакойна свой век і ўжо пагадавалі дзяцей.

Іваніха пабожыцца, што яна нават бачыла, як ён, Пятрусь, калі пачынала сутоньвацца, ішоў агародамі. І ішоў аглядаючыся, каб ніхто не бачыў. А дайшоўшы да Ганнінага прыгумення, пералез цераз засоўкі і пастукаў ёй у шыбу.

Мікалаіха ў сваю чаргу падхопіць, што яна бачыла, як Пятрусь ішоў, калі чуць пачынала развідняць, тады яна ішла даіць кароў і таксама бачыла, як ён аглядаўся.

І пайшло, і пайшло...

Цяпер яны ўдзвюх, у абедзве лапаткі, даказвалі Агапе, што Сцяпан, Юзікаў хлопец, ходзіць да Марылі, Антосевай жонкі. І што яна нават не то не баіцца свайго Антося, але б'е яго ў морду.

Да студні падышлі якраз яшчэ Хадора з Зосяю. Хадора таксама ўмее калі-небудзь выпусціць «слоўца». Але яна больш бярэ з «палітычнага» боку.

— Ці ведаеце вы, сястрыцы, што я вам за навіну скажу? — сказала Хадора, перапыняючы гутарку Мікалаіхі.

— Што? Кажы!..— запыталіся ўсе ў адзін голас.

— Вайна пачалася, вось што,— коратка адрэзала тая.

— Ды як жа гэта?

— Што ты кажаш?

— А вось тое, што вы чуеце: пачалася!

— Адкуль гэта ты даведалася,— падскочылі Іваніха з Мікалаіхаю. А Агапа, якая хацела адыходзіць, ізноў паставіла вёдры і абаперлася на каромысла.

— Ды ці хіба ж вы не бачыце, не чуеце: і солі ўжо нідзе і за дзесяць рублёў пуда не дастанеш, і газы нідзе таксама няма; коні, вунь пішуць, калёсы,— усё, каб забіраць... А з горада дык усе салдаты выязджаюць, вось што,— скончыла Хадора і ўзялася рукамі ў бокі.

— Ды гэта, можа, у лагеры выязджаюць,— умяшалася Агапа.— Бо мой сын, Васіль, прыслаў пісьмо, дык піша...

Але не паспела Агапа дагаварыць, як разам нешта бухнула, нібы і сапраўды пачалася вайна і разарвалася першая бомба.

Бабы пераглянуліся, а потым раптам неяк адчулі: стала горача і душна...

Гэта ўгарэліся ў печы Агапіны дровы, якія былі накладзены блізка каля цялешнікаў...

Агапа цяпер аб іх успомніла, але... але ўжо было позна, бо агонь сваімі меднымі языкамі лізаў усю страху Агапінай хаты.

Яна першая падняла свой позірк, і ў яе замітусілася ўваччу.

Агонь хутка перакінуўся на стрэхі Іванішынай, а потым Мікалаішынай хаты, бо яны былі побач, нібы зросшыся ў адзінае цэлае.

Цераз некалькі хвілін вёска напоўнілася другім шумам і крыкам. Яна цяпер напоўнілася тым крыкам, які раздзірае чалавечае нутро, ад якога станавілася жудасна і страшна.

Раніца з расою зразу знікла. У паветры закруціліся чорныя клубы дыму. Дым слупамі каціўся па-над вясковымі палоскамі і нік там, дзе прападала ранішняе рэха.

Людзі страцілі ўсялякую свядомасць.

І толькі сонца з кожным разам паднімалася ўсё вышэй ды вышэй. Яно нібы нарочна сілілася падняцца, каб накінуцца зверху, каб прыдаць больш моцы ліслівым медзяным языкам, якія з кожным разам, нібы з нейкім агідным смакам, шпарчэй ды шпарчэй лізалі стрэхі...

Цяпер раніца ператварылася ў нешта найстрашэннае, жудаснае...

І было зусім горача і душна...

# МІХАСЬ ЗАРЭЦКІ
# (1901—1937)

У сяле Высокі Гарадзец на Віцебшчыне ў сям'і вясковага дзяка Яўхіма Ануфрыевіча і яго жонкі Пелагеі Лявонцьеўны нарадзіўся будучы пісьменнік Міхась Зарэцкі (Міхаіл Касянкоў). Вялікую ролю ў фарміраванні эстэтычных густаў Міхася адыграў яго бацька. Ён любіў музыку і спевы, кіраваў царкоўным хорам. У дзесяць гадоў хлопчыка аддалі ў Аршанскае духоўнае вучылішча, а праз чатыры гады — у Магілёўскую духоўную семінарыю. Семінарыю ён не скончыў, спачатку працаваў перапісчыкам, потым у роднай вёсцы быў царкоўным вартаўнікам, а з 1919 г.— настаўнікам у пачатковай школе.

Літаратурная дзейнасць М. Зарэцкага пачалася ў 1921 г. Першыя яго творы былі надрукаваны ў газеце «Савецкая Беларусь». Неўзабаве адзін за адным пачалі выходзіць зборнікі апавяданняў: «У віры жыцця» (1925), «Пела вясна» (1925), «Пад сонцам» (1926), «42 дакументы і Двое Жвіроўскіх» (1926). Пісаў М. Зарэцкі і раманы — «Сцежкі-дарожкі» (1927), «Вязьмо» (1932), а таксама п'есы — «Віхор на балоце» (1928), «Белыя ружы» (1929), «Сымон Карызна» (1935), «Ная» (1936).

Міхась Зарэцкі быў членам літаратурных аб'яднанняў «Маладняк» і «Полымя».

У 1936 г. М. Зарэцкі быў арыштаваны па ілжывым даносе, а ў 1937 г. расстраляны. Рэпрэсіі не абмінулі і астатніх членаў сям'і. Яго жонка і брат неўзабаве таксама былі рэпрэсіраваны. Толькі ў 1956 г. ярлык «вораг народа» знялі са светлага імя пісьменніка.

## ЧАПЛЮК

Дружна жыла наша камуна. І весела. Бывала, ці добра, ці дрэнна, ці ёсць чым пазатыкаць назойлівыя жываты, ці няма,— усё роўна смех, песні, жарты нязводна панавалі ў нашай хацёнцы.

Стаяла нас у аднаго селяніна роўна пяць чалавек. Цесна было. Вядома ўжо, якія раскошныя пакоі ў нашага селяніна, ды к таму яшчэ незаможнага. І ў сэнсе «прадуктыўнасці» — таксама кепска... Паёк... А каб ад гаспадара што — не. Ды куды ж там: пакармі гэткую плойму раздругі, дык і сам без хлеба астанешся.

Але ў нас быў надта добры звычай: ніколі не траціць

прысутнасці духу. І жыццёвыя нягоды толькі давалі нам багаты матэрыял да бесканцовых гутарак, жартаў. Як прыйдзе, бывала, ноч, паляжам упокат на падлозе — усю хату засцелем — і давай гарэзаваць. Ужо пеўні недзе ратунку пракрычаць, ужо гаспадар разоў дваццаць пераверненцца, лежачы на печы і, пэўна, на ўсе чатыры бакі лаючы ў думках сваіх кватарантаў,— а мы ўсё сваё...

Адно, другое, трэцяе — тэмы мяняюцца, пралятаюць, як матылькі ўлетку... І ўсё смешнае, усё вострае, ёмкае, усё такое, што наскрозь працінае.

Весела было... І калі на дзела станавіліся, таксама не тужылі. Умелі з работы пацеху рабіць.

Быў у нас Чаплюк... З аблічча нічога цікавага: маленькі, хударлявы, непрыгожы, нос непамерна вялікі, губы тоўстыя... А дзіўны быў хлопец!

У нашай часці ён быў самым старым чырвонаармейцам. Ад самага фарміравання часці ён як трапіў у яе, дык увесь час безадлучна і служыў у ёй. На яго памяці колькі камандзіраў, камісараў перабыло, склад чырвонаармейцаў зусім змяніўся, а ён нязменна заставаўся на сваім месцы.

Быў ён сакратаром ячэйкі. І трудна было адзначыць: ці добры ён сакратар, ці благі? Абавязкі свае спаўняў шчыра, нават залішне шчыра. Бывала, як прыйдзе час справаздачы, як надыдзе дзела да ўсякіх «формаў» ды «бланкаў» — бяда! Ад кампаніі адаб'ецца, забудзецца аба ўсім чыста на свеце і сядзіць. Строчыць. Колькі ён, бывала, паперы перапсуе, колькі чарніла паразлівае! А сам запэцкаецца ўвесь, ускалмачыцца — зірнуць страшна.

У гэткую пару звычайна ўся камуна наша неяк цішэла. Спачатку, бывала, пасмяёмся трохі над нашым «пісарам», пажартуем, а потым кінем яго, займемся кожны ў адзіночку сваім дзелам — няхай працуе! Зналі, што йначай не можа наш Чаплюк.

А цяжка-ткі давалася Чаплюку пісарская справа. Яно й не дзіва: бадай, толькі ў арміі ён і пісаць добра навучыўся. Проста ад станка з завода пайшоў ён бараніць Саветы.

Ну, затое ж і аджывала наша камуна, як вялізным пакетам скідаўся з Чаплюка цяжар месяцовай адчотнасці! Тады Чаплюк — не пазнаць — мяняўся. Трудна было даць веры, што гэта той самы пісака, што толькі што з натугай выседжваў за сталом страшэнныя, вялізныя «формы».

Дый наогул Чаплюк неяк дужа ўмеў мяняцца. У яго

было два аблічча: адно, калі можна так назваць,— «афіцыйнае», а другое — «сяброўскае». Першае з'яўлялася тады, калі Чаплюк быў заняты сур'ёзнай справай або як саромеўся. А саромеўся ён часта. Досыць было з'явіцца ў нашай камуне якому-небудзь новаму чалавеку, як Чаплюк, што смоўж, убіраўся ў сваю шкарлупу і выстаўляў напаказ толькі свае наіўна-сур'ёзныя вочы ды важна напружаны выраз цьмянага твару.

Затое, калі аставаўся ён сярод сваіх блізкіх сябрукоў (а гэткімі былі ўся вайсковая часць і блізка ўсе мясцовыя сяляне), ён ураз вылазіў з свае шкарлупы і разліваўся на ўсе бакі ўсёй сваёй істотай.

Чаго толькі ён не вытвараў! Чаго не выгадваў! Бывала, да таго давядзе, што духу не хапае смяяцца. Ён табе і тэатр, і балет, і опера, калі хочаш. А то проста скорчыць такую міну, што ўсе аж кладуцца. І мастак жа ён быў міны корчыць! Ды не проста, абы-як, а ўсё з закідам у чый-небудзь бок.

Больш за ўсё армейцы любілі, як ён «Антанту» паказваў. Заўсёды, бывала, так і крычаць:

— Антанту! Антанту!

А паказваў ён яе якраз так, як у чытальні на афішы яна была намалёвана, ды так удала — проста дзіва!

Здольны быў хлопец. Хто толькі ні знаў яго, усе ў адзін голас казалі:

— Талент. На сцэну трэба, у студыю, вучыцца.

І ўсе вешчавалі яму слаўную будучыню.

А ён, калі чуў гэта, не карожыўся, як іншыя, не аднекваўся, а сур'ёзным, шчырым тонам гаварыў:

— Мне каб павучыцца. Каб апрацавалі мяне добра, адшліфавалі. Толькі — дзе там...

Колькі раз прабавалі зацягнуць Чаплюка на сваю армейскую сцэну, але з гэтага нічога не выходзіла. На рэпетыцыях яшчэ нішто, а як прыйдзе справа да спектакля — быццам нешта зробіцца з ім. Палохаўся, мусіць, ці што. Ужо за колькі гадзін да пачатку засмуціцца неяк, убярэцца ў сваю шкарлупу, і хоць ты што хочаш рабі — не разварушыш яго, не абудзіш у ім таго Чаплюка, які патрэбны. Гэтак і выйдзе на сцэну і пачне гаварыць нейкім глухім, замагільным голасам.

Так і не ўдалося прыцягнуць яго да сцэны. Прыйшлося махнуць на яго рукой, пакінуць у спакоі.

Любілі Чаплюка ўсе чыста: і армейцы, і сяляне. Нават старыя і тыя ахвотна з ім час марнавалі, не гледзячы на тое, што і камуніст. І не злаваліся дужа, калі ён над імі

часамі жарт які выкіне. Былі ў яго і асаблівыя прыхільнікі сярод сялян, з якімі ён вёў самую заўзятую дружбу. Цікава было бачыць, як калі-небудзь спатыкаўся ён з каторым ад гэтых сваіх сябрукоў. Яшчэ здалёк крычаць абодва ва ўсё горла:

— Чаплюк!

— Дзядзька Змітрок!

— Дзень добры!

— Добры дзень!

— Куды?

— Адкуль?

Сыдуцца — і пачалося. Толькі:

— Га-га-га-га! Го-го-го-го! — рагоча на ўсю вёску барадаты селянін...

А што свая братва — армейцы, дык тыя без Чаплюка жыць не маглі. Ён неяк умеў злучаць усіх — і простых армейцаў і камандзіраў у адну дружную, сяброўскую сям'ю. Чуць калі вольная часіна, збяруцца, бывала, усе ў чытальню, балалайка, гітара аднекуль з'явяцца — і пойдзе вясёласць! Іграюць, пяюць, а больш Чаплюка слухаюць. А той адчувае сябе на сваім месцы і «працуе» ад усяго сэрца. Канчалася ўсё гэта звычайна на тым, што, замарыўшыся ад смеху і спеваў, армейцы сядуць разам з сваімі камандзірамі ў гурток і пачнуць доўгую сяброўскую гутарку, і кожны тады адчувае сябе сябрам адзінай, моцнай і дружнай пралетарскай сям'і.

Траплялiся ў армейскім жыцці гадзіны, калі цяжка прыходзілася хлопцам. І тады Чаплюк быў незамянімы. У яго была нейкая дзіўная здольнасць ніколі не адчайвацца. Як бы дрэнна ні было яму, ён усягды быў вясёлы, бязрупатны, і сваёю бязрупатнасцю ён захапляў усіх.

Помню, нешта аднаго разу нашай часці прыйшлося пільна перабрацца з аднаго месца на другое. У тры дні трэ было зрабіць пераход блізка ў паўтараста вёрст. Надоўга застаўся ва ўсіх у памяці гэты пераход.

Была зіма. Жорсткая, сцюдзёная зіма. Завея і завея. Дарогі няма. Па калена вязнуць ногі ў сыпкім, глыбокім снезе. Куды ні зірнеш — белае мора, смутнае, бяскрайнае... Нідзе канца не відаць. Цяжка і нудна. Ног не чуваць, а ў галаве быццам туман нейкі — зыбкі, цягучы... Неяк міжвольна роспач бярэ, неахвота. Не хочацца йсці. Лёг бы, здаецца, у мяккі, пульхны снег і спачыў у салодкай нерухомасці.

Але зірнеш убок: воддаль у снезе калупаецца маленькі, недалужны. Рукамі махае, рупіцца, каб не астацца.

Зірнеш на яго, а ён міну скорчыць табе насустрач ды пракрычыць што смяхотнае. І, змораны, зняможаны, не ўтрымаешся, каб не зарагатаць.

І не прыкмеціш, як сілы прыбавіцца. Смялей і адважней засігаеш у бела-туманную даль.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Неяк улетку, у самы разгар сенакосу, у той час як армейцы дружна працавалі на сялянскіх пожнях, далучаючы да сялянскага поту кроплі свайго чырвонаармейскага, у часці атрымалі загад аб звальненні ў двор старых гадоў.

Заварушыліся, загаманілі армейцы. Адны радаваліся, як шалёныя, другія адкрыта зайздросцілі. Звальнялася адразу колькі гадоў; блізка што палавіна ўсяе часці рыхтавалася ехаць.

Адразу змяніўся настрой ва ўсіх. Усе інтарэсы сучаснага жыцця адышлі ўбок, і некаторы час блізка ўсе чырвонаармейцы жылі салодкімі, ап'яняючымі настроямі сваіх родных вёсак, сваіх родных краін. Заціхлі спевы, гульні; замярцвела вясёла-ёмкая праца ў палях. Замест гэтага сям-там гурткамі па двое, па трое збяруцца, зякаюць жвава, узрушана. Адны радуюцца, другія сумуюць.

А ў штабе пісалі дакументы...

Чаплюк таксама падлягаў дэмабілізацыі. Яго год яшчэ раней звольнены быў, а ён затрыманы як партыйны. А цяпер і яго чарод прыйшоў...

Чаплюк адразу, як пачуў новую вестку, узрадаваўся нейкай дзіцячай шаленай радасцю. Ён пачаў скакаць, кідацца к усім, лямантаваць так, як сілы хапала... Кінуў работу і пайшоў падымаць гвалт па вёсцы.

Толькі нядоўга цягнулася яго шалёнасць. Увечары таго самага дня я, увайшоўшы ў гаспадарскі сад, убачыў, як ён у глыбокай развазе сядзеў пануры ў куточку на бервяне. Я падышоў да яго.

— Ну, што... едзеш, значыцца?..

— А што там!.. Дакуль служыць?.. Час дахаты... Эх, знаеш, брат... цяпер я... Скрыдлы развязаны... вольная птушка!..

— Куды ж ты думаеш падацца: на Урал ці на Украіну?

— А ўсё роўна. Я яшчэ не надумаў. Ды мне што! На Урал паеду, там на завод з'яўлюся. Брат ты мой! Усе свае хлопцы. Эх, зажывём! А то на Украіну. Брат усё піша, каб прыязджаў. Зямлю буду араць на валах...

Адразу відаць было, што ўсё гэта Чаплюк гавора не ад

сэрца, што ўся гэта яго бадзёрасць, рызыка падробленая, што ён проста не хоча выгляду даць, а на сэрцы ў яго зусім іншае. Я зразумеў гэта, і мне неяк шкода-шкода стала гэтага маленькага чалавечка.

У Чаплюка не было свайго двара. Ён быў, як кажуць, чалавек без роду і племені. Яшчэ змалку ён пазбыўся бацькоў і пайшоў вандраваць па свеце. У апошні час жыў дзесь на Урале, на заводзе працаваў; адтуль і ў войска пайшоў. Быў у яго брат: той недзе на Украіне на гаспадарку ўзбіўся, жыў нішто, заможна. Да яго і меўся паехаць Чаплюк або на Урал, на знаёмы завод...

Я знаў, што не надта ўсміхалася Чаплюку будучыня, хоць ён і хваліўся. На Урале голад: пасунься туды, дык здохнеш, пакуль заробіш што-колечы. А к брату — таксама мала прыемнага... Мала што піша, а там запяе што другое... ды і на зямлі не прывык працаваць Чаплюк — цяжка.

І відаць было, што ён і сам цяпер не ведае, што рабіць; страшна яму зрывацца з пэўнага, бяспечнага месца і ехаць у невядомую даль. Мусіць, надта цяжкім бярэмем ляжалі на яго душы ўспаміны аб мінулых бадзяннях.

А паказваў выгляд, быццам сапраўды давольны, што з войска звальняюць.

У наступныя дні Чаплюк трымаў сябе вельмі дзіўна. Калі дзе на людзях — смяецца, весяліцца, жартуе, а адзін застанецца — адразу засмуціцца, задумаецца, убярэцца ў сябе... Сядзіць, глядзіць у адну кропку. Колькі раз заставалі мы яго ў гэтым стане. Як падыдзеш, усхамянецца, быццам засароміцца, і пачне гаварыць-гаварыць усё адно, аб адным: як ён рад, што паедзе. Неяк цяжка, балюча было яго слухаць, і мы кожны раз стараліся пакідаць яго ў адзіноце...

Чым бліжэй надыходзіў дзень ад'езду, тым дзіўней быў Чаплюк і тым цяжэй і неяк напружней станавілася ў нашай камуне. Мы ўсе разумелі, што дзеецца з нашым Чаплюком, усе наскрозь бачылі яго пачуцці, яго сумлеўкі. І, апрача таго, што нас усіх надта цяжарыла, маркоціла блізкасць разлукі з сваім лепшым сябруком, нам было непамерна цяжка глядзець на яго пакуту. Ясна было, што Чаплюк зусім не хоча, баіцца ехаць, а паедзе... Паедзе, можа, на гора, бядоту толькі затым, што яму пасля выказанай радасці неяк сорамна ўжо заставацца.

І мы ўсе думалі, радзіліся, як памагчы справе, як выручыць сябрука. І, урэшце, надумаліся.

На другі дзень камісар заявіў Чаплюку, што, згодна

толькі што атрыманага распараджэння, усе сакратары ячэек на нявызначаны час затрымліваюцца ў войску і што яму, Чаплюку, таксама прыйдзецца астацца.

Невядома, ці дагадаўся Чаплюк, што гэта яму наўмысля гэткую штуку падлáдзілі, ці не. Пасля ўжо, як прайшло нямала часу і мы раскрылі яму свой сакрэт, ён запэўніваў, што і ў думках у яго не было нічога падобнага. Як там ні было, але наш Чаплюк, дзеля прыліку палаяўшы некага за тое, што яго «сілком трымаюць, копцяць тут у войску», астаўся служыць... І адразу супакоіўся...

Праз колькі дзён мы праводзілі ад'язджаючых таварышаў, і Чаплюк, як і раней, пацяшаў усіх сваімі вострымі жартамі, выкладаючы ад'язджаючым самыя недарэчныя пажаданні.

Каго-каго, а Чаплюка мы будзем доўга помніць!..

## У САЎКАХ

### 1

У Саўках чорная, густая, што дзёгаць, ноч распаўзлася па хмызняку. Заляпіла ўсе шчылінкі, усё ў адну цемру зліла. Равы патуліліся, схаваліся ў воўне арэшніку. Нешта ў сабе затаілі — таемнае, страшнае і ждуцьпадсцерагаюць, гатовыя праглынуць у сваё чорна-аксамітавае нутро. Маўчаць... Ды і ўсё навакол маўчыць у нейкім чакаючым напружанні. Быццам во-во нешта здарыцца — дзікае, страшэннае...

Далёка-далёка, на колькі вёрст, цягнуцца бяздонныя прорвы-равы. Папарэзалі яны туды і сюды шырокае ўзгор'е. Быццам волат-асілак праехаў з сахой велізарнай і глыбокія раны парабіў у целе зямлі. Раны зараслі хмызняком-поўсцю, але такімі ж глыбокімі засталіся...

Страшна ноччу ў Саўках. Узгоркі, абрывы жывымі становяцца, сочаць вачыма чорнымі... Быццам з пагрозай гавораць: «А ну-ка, увайдзі!..» І мала хто адважыцца ў нетры пайсці, як цяжка заляжа ў равы хмурная ноч...

Ціха ў Саўках... Але зыкі чуваць... Ціхія зыкі-шэпты. Саўкі шэпчуць скрыдламі птушак-начніц, цікуючым хрустам сухіх ветак пад лапамі дзікіх звяроў...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

У самай глушы, там, куды вока людское не загляне ніколі, сумна-дрыготны бляск прашчупвае цёмныя веткі. Вогнішча... Людзі навакол... На тварах іх вогнішча грае дрыжачымі плямамі. Воддаль, афарбаваныя ў жоўта-чыр-

вонае, галіны схілілі галоўкі і слухаюць... А за імі — цемра-жудасць...

Іх пяцёра... Адцятых ад усяго свету. Уцяклі, вырваліся з кіпучага мора жыцця. Ад іх адраклося жыццё,— і яны ад яго адракліся. У Саўках знайшлі сабе схову.

Дзеці зямлі. Ад свае вёскі таксама адарваліся. Перш была сувязь: хлопцы прыходзілі, нават дзяўчаты часамі заблуджвалі. Апавядалі, што дзеецца там. Есці насілі даволі. Саломы на будку, таго-сяго.

А потым усё слабей ды слабей сувязь трымалася. Нешта расло паміж тымі і гэтымі... Нейкая сцяна. Асабліва, як маладыя пайшлі. Тыя сюды схавацца не адважыліся, пайшлі ваяваць. І цяпер — як адвярнула ўсю вёску...

Ужо з тыдзень, як не было нікагутка. Два дні ўжо, як есці няма чаго. Пяклі грыбы, ягады збіралі, але ўсё ў жываце нешта ссе, нешта цягне...

Цяпер — хто ляжыць, хто сядзіць вакол вогнішча, і кожны думае сваю думку асобную. Маўчаць, а ў кожнага з вачэй глядзіць пытанне, рашуча паўстаўшае:

— Што далей?..

Грышка маўчанку парушыў...

— Ну што, хлопцы, прызаўнылі? Га?.. Дрэнна, кажаце? Што, Смоўж, нос павесіў?..

Смоўж, або Змітра Кандратаў, павярнуў ад свету ў цень свой твар. Не сказаў нічога.

— Во што, хлопцы! Трэба думаць. Ці тое, ці другое. Не здыхаць жа...

Сцёпка ўзняў галаву...

— Жраць хочацца. Здаецца, вала б з'еў... Вунь Смоўж, халера на яго, яўляцца ўжо надумаў... Га, Смоўж?..

Невядома, хто з іх падумаў аб гэтым: ці Сцёпка, ці Смоўж. Мусіць, у абодвух думка гэта лунала.

Смоўж і не зварухнуўся — быццам і не да яго казалася. А Грышка-завадатай пачуў хістанне сярод сябрукоў. Каб зніштожыць яго, гукнуў бадзёра-пагрозна:

— Я яго гэтак уяўлюся, што не пазнае!

Аднак усе маўчалі. Грышка змяніў тон...

— Аб тым, што яўляцца, і гаварыць не варта. Нашто б тады і ўцякаць было! Не, ужо, як на мяне, дык калі зрабіў што — не вярні назад. Ды што там? Бачыш ты: не паелі дзень, гора якое... А там што, пірагамі б цябе кармілі? Чулі, якось жыццё там...

— Ды гэта глупства... Яўляцца, яўляцца... Хто гэта

захочa яўляцца? Турмы не бачылі? Вось жраць няма чаго. З вёскі не нясуць, баяцца, мусіць.

— Не баяцца, а што ім за ахвота дармаедаў карміць? Пайшлі во маладыя, думаюць — і гэтыя могуць служыць, нечага лайдачыць.

— Ну, дык ідзі, чаго ты...

— Ды я не аб тое...

Грышка рашуча прамовіў:

— Во што, братцы! Бацькі карміць не хочуць — пражывём і без іх. На работу станем!

— На якую?

— На якую?.. А на такую, на якой за раз можна зарабіць столькі, колькі на іншай за год не заробіш...

Зразумелі хлопцы... Быццам засаромеліся, пахілілі галовы. Адзін на аднаго не глядзелі...

— Што замаўчалі? Спалохаліся? Страшна?

Зноў маўчалі... Потым азваўся адзін:

— Чорт яго... Каб было з чым... Голымі рукамі...

— Чаго? Адна ёсць стрэльба... Сцёпка да сваіх дабярэцца, двухстволку возьме.

Грышка з чаканнем углядаўся ў твары хлапцоў. Сцёпка ўдарыў Смаўжа па спіне.

— Як, Смоўж, га? Пойдзем на паляванне?

— Усё роўна...

Сказаў, а ў самога нутро халадзела. Бегчы адсюль, уцячы захацелася. Нялюбай, страшэннай здалася кампанія хлапцоў. Жудасць душу ахінула. Эх, і нашто ён прыйшоў сюды? Нашто паддаўся спакусе?

А хлопцы памалу разварушыліся. Іх захапілі новыя планы. Вочы жвава блішчэлі, як гаварылі, згаворваліся... Пасталі вакол вогнішча, асветленыя чырвоным дрыжачым бляскам. Як здані якія... Доўга яны гаманілі, доўга парушалі глыбокую ціш, панаваўшую ў Саўках...

І згаварыліся...

## 2

Праз Саўкі прабягала дарога. Кулялася ў равы, узбягала на ўзгоркі... То тулялася па хмызняку, то вясёла, адкрыта ўсміхалася жоўтаю пакручастаю стужкаю.

Было адно месца, дзе дарога шпарка збягала па крутому скелзу. З аднаго боку — гара, абросшая густым хмызняком, з другога — глыбокая прорва. Небяспечнае месца. Дарога вузенькая — толькі калёсам праехаць. Уга-

ру яшчэ нішто, а во ўніз — глядзі ды глядзі. Добра, калі конь стрымае, не пабяжыць, а то — беражыся! Троху-троху — і пакоцішся.

У гэтым месцы хлопцы заселі. Праслухалі, што з горада валасны будзе ехаць з грашыма. Рашылі пераняць тут.

Смоўж, што мышанёнак, прытуліўся ў кустах ля дарогі. Яго абавязак не трудны: як будзе спускацца, знецікі выскачыць, спудзіць каня, каб убок ірвануўся. Дарога вузенькая — напэўна пакоціцца ўніз. А там ужо хлопцы чакаюць — канчаць.

Доўга ўжо ждуць. Сонца хіліцца пачало к захаду. Цені пацягнуліся даўгія, даўгія... На кусты, на траву пачала класціся пазалота...

А яго ўсё няма...

Смоўж ляжыць дагары на зямлі. Скрозь галіны алешніку глядзіць у далёкае неба блакітнае і думае шчырую думу. Яму ўспамінаецца ўсё, што перажыў ён у апошні час. Як яго бралі ў жаўнеры, як не хацелася яму разлучацца з роднай вёскай, з роднымі людзьмі, як ён аж плакаў, ад'язджаючы ў войска. А там — жыццё цяжкае, жорсткае... Колькі ён слёз папаліў, колькі ночак не спаў — усё думаў аб роднай краіне. З Сцёпкам сышоўся. Бывала, чуць вольная часінка — усё гаварылі, успаміналі... Той і пабегчы яго падбухторыў.

Ой, як хацелася дахаты! Смоўж і не думаў тады, ці добра, ці дрэнна ён робіць; не думаў аб тым, што можа быць у канцы. Толькі б дахаты...

Вось і прыбеглі. Нядоўга дома жыць прыйшлося. Небяспечна было заставацца ў вёсцы. У Саўкі пайшлі. З Грышкам злучыліся, яшчэ два хлопцы прысталі. Сперш нішто было. Нічога не рабілі, гулялі, дурэлі, апавядалі адзін аднаму пра свае вандроўкі. Хлопцы прыходзілі з вёскі — яшчэ весялей было.

А потым іначай пайшло. Адзін аднаму надакучылі, жыць па-воўчаму ў лесе абрыдла. Дый без работы мутарна неяк. Так захацелася жыць, як усе, акунуцца ў жыццё з галавой.

З вёскі пайшлі маладыя. Некаму стала й прыходзіць. Зусім забылася на іх вёска. Голад пачаўся. І ўсё цяжэй на душы рабілася. Чуў Смоўж, што не вытрывае.

І вось... урэшце...

Не, не чакаў гэтага Смоўж. Не хацеў, баяўся. Натура яго не згаджалася з гэтым. Але штось прымушала згаджацца і рабіць. Хто яго ведае? Ці сябрукоў ён баяўся,

ці слабасці сваёй саромеўся. Але вось ляжаў і чакаў, гатовы на страшэннае дзела.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Здалёк затарабаніла каламажка... Сэрца ў Смаўжа закалацілася моцна, балюча. Быццам яго хто цісную́, трымаў, а яно вырывалася... Думкі змяшаліся, як віхор, закруціліся... Міганулі сябрукі — далёкімі, чужымі здаліся... Двор праляцеў, і чагось асабліва выразна прадставілася сястрыца Ганулся...

Бліжэй, усё бліжэй... Вось угары і конь паказаўся... За ім каламажка, у ёй нейкі ў чорным... Ён!..

Ці злезе, ці не?.. Калі злезе — не трэба тады: усё роўна нічога не выйдзе... О, каб ды злез!..

Не... Толькі накруціў лейцы на рукі... Едзе, спускаецца... Яшчэ хвілінка адна...

Міжвольна Смоўж зірнуў на каня. Конік напружыўся, трымае як мага... У вачах гэткая шчырасць, стараннасць, апаска... Смоўж успомніў свайго Палавога... Шкада да болю стала канька... Ужо наязджае... Яшчэ колькі крокаў...

Смоўж кіпцямі ўпіўся ў глебу...

Вось ужо тут... ужо трэба... ужо час...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Не... Не здолеў...

Конік, праехаўшы самую строму, смела пабег. Весела заляскатала каламажка... Усё далей і далей...

Смоўж схамянуўся... Што гэта? Як гэта так? Што цяпер будзе? Ці гэта добра, ці блага? Хлопцы... Яны што... Біць будуць, пэўна... Прагоняць...

Блізка пачуліся галасы. Смоўж як непрытомны кінуўся ў хмызняк, убіўся ў самы вялізны і густы куст і прытуліўся да зямлі, што зайчык. Усё яго цела траслося, як у ліхаманцы. У галаве білася адна думка: каб скарэй, каб скарэй... І ўся істота яго ў гэты момант была працята адным жаданнем: каб скарэй пайшлі хлопцы!

А хлопцы гукалі, шукалі, лаяліся, пагражалі. Урэшце Грышка сказаў:

— Уцёк, трасца яго матары. Ну, добра; трапіць ён калі-небудзь нам у рукі... Пойдзем, хлопцы!

Чароўнай музыкай празычэлі ў вушах Смаўжа крокі прайшоўшых. Счакаўшы колькі хвілін, ён асцярожна вылез з куста і пачаў прабірацца па хмызняку. Шпарка, паспешна.

Дух занімала, сэрца зрывалася, а ў галаве, як кляўцом, біла:

— У горад... у войска... Няхай будзе што будзе. Турма дык турма. Абы да людзей, абы жыць так, як людзі, а не туляцца, што воўк, па лясах...

А над Саўкамі ноч свае скрыдлы ўжо раскідала, усё ахінала ў таемную цемру...

## ЯЗЭП ПУШЧА
## (1902—1964)

Язэп Пушча (Іосіф Паўлавіч Плашчынскі) нарадзіўся ў вёсцы Каралішчавічы, што на Міншчыне. Бацькі яго, нягледзячы на беднасць, стараліся вучыць сына, які прагнуў навукі. Іосіф Паўлавіч, скончыўшы Мінскае рэальнае вучылішча, настаўнічаў у Каралішчавіцкай пачатковай школе. У 1922 г. пасля курсаў беларусазнаўства ў Мінску працаваў павятовым інспектарам народнай асветы, выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў Мінскім музычным тэхнікуме. У 1923 г. Я. Пушча актыўна ўдзельнічае ў стварэнні літаратурнага аб'яднання «Маладняк». Скончыўшы Ленінградскі універсітэт, працаваў рэдактарам у Беларускім дзяржаўным выдавецтве.

На жаль, Язэп Пушча ў 1930 г., як і многія яго сябры па пяру, вымушаны быў расстацца з роднымі мясцінамі. Чатыры гады (1931—1935) працаваў на Урале, потым жыў у Анапе і доўгі час быў дырэктарам Чаадаеўскай школы Уладзімірскай вобласці (1937—1958). І толькі ў 1958 г. паэт вяртаецца ў Мінск.

Першыя вершы надрукаваны ў 1922 г. Творчы перыяд Я. Пушчы да высылак быў вельмі плённы — адзін за другім выходзяць з друку паэтычныя зборнікі: «Раніца рыкае» (1925), «Vita» (1926), «Дні вясны» (1927), «Песні на руінах» (1929), а таксама паэмы «Песня вайны» і «Цень Консула», прасякнутыя ўражаннямі аб першай сусветнай вайне. Раннія вершы Язэпа Пушчы, хоць часам і недасканалыя, кранаюць сваёю шчырасцю, непасрэднасцю, захапленнем. Яго творы былі вельмі папулярныя сярод моладзі — яны адпавядалі настраёвасці маладых людзей.

Своеасаблівы адбітак на творчасць Язэпа Пушчы зрабіла расстанне з радзімай, а потым — вайна. Усю сваю горыч ён выказвае ў вершах ваеннай пары.

Пасля прыезду ў Мінск Язэп Пушча, натхнёны вяртаннем, плённа працуе. У друку з'яўляюцца не толькі яго новыя вершы, але і паэмы, казкі. У 1960 г. выйшла яго кніга «Вершы і паэмы», у 1963 — зборнік «Пачатак легенды».

## СНЕЖАНЬСКАЯ СВЕЖАСЦЬ

Дываны ў палях пасланы,
Еду ў госці да радні.
На развалках саламяных
Абмінаю смутку дні.

Ўрасцяжную па выбоях
Мчыць мяне мой вараны.
Белы віхар па-над полем
Намятае курганы.

Сыпкай замяці іскрыстасць
Мітульжыцца у вачах.
Сэрца хочацца расхрыстаць,
Плыць у далі на чаўнах.

Палазы сумёты рэжуць
І бягуць на ўскрай зары.
Ў гэту снежаньскую свежасць
Веюць песнямі бары.

Я хачу душой паслухаць
Роднай песні зорны ўзлёт.
Не засее замяць скрухай
Нашых сонечных яснот.

Сэрцу роднае так блізка,
Колькі ў ім ласкавых слоў!
Аганёк здалёк заблíскаў,
Вось і дома я ізноў.

Тут шумела песняй лісце,
Зноў іх шум мяне сустрэў.
На чало маё зваліўся
Колас з саламяных стрэх.

## ЛІСТ ДА ПАЭТАЎ

Не змогуць завесціся ў словах мікробы:
Патручаны ўсе сулемою і воцтам.
Паэты Заходняй, Усходняй Еўропы,
Вам ліст пасылаю сакрэтнаю поштай.

Вялікую страту дзяржавам учыніць:
Не возьмуць з яго ні цэнзурных, ні мытных.
Паэты, хто дзверы з вас першы адчыніць?
Хто хоча пачуць беларускія рытмы?

Іх шчодраю жменяй пасеяў Купала,
Яны яго сэрцам гарачым сагрэты.
У нашай краіне пад гукі цымбалаў
Уцешныя песні спяваюць паэты.

У пушчы шумлівай, дуброве зялёнай
Мы любім і ловім таемнае штосьці;
Там нашы эстрады, там нашы салоны,
К нам вецер увосень заходзіць у госці.

Яго мы частуем рабінавым сокам,
Каб ведалі толькі, якая ў нас восень!
Ліст кожны ўзвіваецца ў неба высока,
І ветры між яснымі зорамі носяць.

У нашых прасторах шмат казачных шумаў,
Ці быў хто калі з вас на нашым Палессі?
Ці бачыў, як сінія хвалі шумуюць,
А людзі спяваюць спрадвечныя песні?

У гэтым сягоння і наша ўцеха,
Ад гэтых вось песень і вучымся ладу.
Паэты у нас не разбіты на цэхі,
Ніхто не складае дакучных баладаў.

Ў нас новыя творацца песні і жанры,—
Мы толькі не любім кляймо на іх ставіць,
Паслухайце раніцай, вечарам раннім,
Як ветры старонкі кніг нашых гартаюць.

Мы блізкія сёння людзям і прыродзе,—
Ў нас пульсы крывёю гарачаю б'юцца.
Ці чулі што-небудзь аб нашым народзе?
Ці чулі, як рэчкі крынічныя льюцца?

Ліст гэты пішу я да вас з Беларусі,
Дзе зоры вачэй аніколі не плюшчаць.
Вітанне з паклонам зрываецца з вуснаў:
Бывайце, бывайце... Вітае вас
Пушча.

## ЧАМУ ТАК СЭРЦА ЛЮБІЦЬ?

Чаму так сэрца любіць
Вясны зялёны шум?
Для Беларусі любай
Я радасць дзён нашу.

Люблю, нашто хавацца,
Як васільку у жыце.
У светлай, новай хаце
Шчасліва ўсе жывіце!

Не трэба песню клікаць,
Яна спявае ў сэрцах.
Зайгралі гімн музыкі —
Струна струне смяецца.

Яны на лад нязнаны
Цымбалы завялі:
Жыве хай песня з намі
На бацькаўскай зямлі!

## ДАЖЫНКАВАЕ

Ой, у полі бялявая зорка
Ды ключамі бліскучымі звоніць,
А жнейка маладая за ўзгоркам
Дажынае апошнія гоні.

Дажынае і песню заводзіць:
«Ой, каціўся вяночак ды з поля...».
Ясны месяц над лесам ўзыходзіць,
Ў росах срэбных красуня-тапол.

Пракацілася песня дубровай,
Пракацілася песня лагчынай,
І ўжо вечар, юнак чарнабровы
Не галубіць у мэндлях дзяўчыны.

Яна зараз з сярпом і вяночкам
Уваходзіць у хату-святліцу.
Усміхаецца зорамі ночка...
Пот па твары не будзе больш ліцца.

Праліла яго многа у полі
Беларусі жняя-маладзіца,

Праліла, ужо хопіць, даволі,
Песня новая мусіць радзіцца.

### Я РАНІЦЫ КЛАНЯЎСЯ Ў ПОЯС

Туляўся ў выбоінах грэблі
Заплаканы променя вырыс,
Апрануты латаным зрэб'ем,
У хаце сялянскай я вырас.

Падслухаў там родныя песні,
Як пелі дажынкамі жнеі,
Сахою я гонейкі песціў,
Кілзаючы сонца у шлеі.

Туман, ацярушаны пытлем,
Цадзіў белаватую боязь.
Падпаскам ганяючы быдла,
Я раніцы кланяўся ў пояс.

Кудлата-зялёныя хвалі
Чупрынаю кудзер кудзеліў,
І ветры мяне калыхалі
У ядрана-жытняй пасцелі.

Зразаў я лазінкі на прывязь,—
А зоры мне сыпалі срэбра,
У хаце сялянскай я вырас,
Апрануты латаным зрэб'ем.

## МІХАСЬ МАШАРА
## (1902—1976)

Міхась Антонавіч Машара нарадзіўся на хутары Падсосна, што на Пастаўшчыне. Пасля заканчэння вучылішча ў Глыбокім васемнаццацігадовы юнак ідзе добраахвотна ў Чырвоную Армію. Пры Польшчы працаваў на гаспадарцы ў в. Таболы, удзельнічаў у нацыянальна-вызваленчым руху ў Заходняй Беларусі. У 1927 г. рэдагаваў газету «Наша воля».

Польскі ўрад негатыўна ставіўся да беларусаў, якія вялі палітычную барацьбу за аўтаномію, за аб'яднанне. І М. Машара быў зняволены ў віленскую турму на

Лукішках. Паэт пазней перанясе пražытае ў свае раманы «Крэсы змагаюцца» і «Сонца за кратамі».

У час Вялікай Айчыннай вайны М. Машара працаваў на радыё, потым у часопісе «Полымя», у «Настаўніцкай газеце». Друкавацца пачаў у 1927 г. Праз год выйшаў першы зборнік «Малюнкі». Плённа працаваў у розных паэтычных жанрах. Добрую славу мелі яго паэмы «Вяселле», «Смерць Кастуся Каліноўскага», вершаваныя казкі «Зязюльчыны слёзы», «Зелянушка і Кракатушка».

У Вільні выйшлі зборнікі вершаў «На сонечны бераг!» (1934), «Напрадвесні» (1935), «З-пад стрэх саламяных» (1937).

Асноўныя тэмы вершаў — маральны максімалізм, пратэст супраць галечы, вера ў свабодалюбівыя сілы народа.

Творы ваеннага і пасляваеннага перыяду змешчаны ў зборніках «Беларусі» (1944), «Праз навальніцы» (1948), «Урачыстасць» (1952). Апошнія гады жыцця і творчасці пісьменнік прысвяціў напісанню аўтабіяграфічных раманаў — «Крэсы змагаюцца» (1966), «Сонца за кратамі» (1968), «Лукішкі» (1970), «Ішоў дваццаты год» (1973), «І прыйдзе час...» (1975).

## РОДНАЕ ПОЛЕ

Белае,
снежнае
роднае поле
сніць каласяна-прыгожыя сны.
Сэрца, ты хочаш так шчасця і волі,
сэрца, ты просіш ізноўку вясны?
Я ўжо даўно не прашуся, не плачу,
крыўду прымаю без крыку і слёз,
роднай краіне
прарочу удачу,
песні складаю пра будучы лёс.
Знаю я моц тваю,
роднае поле,
сілу жывую карэння люблю.
— Будзь жа і ты, маё сэрца, такое.
Сэрца!..
Карэнні глыбей у зямлю.

## ЖНІВА

Высахлі каплі расы на узмежках,
з неба ласкавае сонца глядзіць.
Сцелецца шоўкам трыпутнік па сцежках,
спуджаны коршак над полем вісіць.

Белымі птушкамі ў жыце галовы,
шастаюць жнеі, звіняць галасы,
вецер па межах гуляе у сховы,
гнуцца і ціха шумяць каласы.

Зелень узмежкаў, струны-разоры,
ў роўных радах залатыя снапы —
сам разгарнуўся настольнік узорны,
ткуць яго, ззяючы срэбрам, сярпы.

Дзе толькі глянеш — навокал далёка
беліцца жоўтая гладзь каласоў.
Працай расквечана, полем шырокім
лета праходзіць, як песня без слоў.

## КЛЁН

Поле маё, поле,
поле над ракой,
мне душу да болю
мучыць твой спакой.

Брыліянты-вочкі
зорак увышшы
рассявае ночка,
полем ідучы.

Ціха над абрывам
спіць альховы гай.
Толькі белым нівам
сніцца, можа, май...

Далей там Таболы —
плямай на снягу,
гэтым словам полым
сэрца скалыхнуў.

Бачу бацькі хату
з клёнам пад акном.

І здалёк, як брату,
ён мне б'е паклон.

Клён ты мой вяковы,
раскажы мне, клён,
доўга йшчэ над полем
будзе гэты сон?

Быў я там далёка,
да людзей хадзіў,
варажыў у змроку,
пад муром тужыў.

З сумам ў дружбе цеснай,
пад віхуры свіст,
раскідаў я песні,
як ты медны ліст.

Ды ў мястовым моры,
пад рытмічны шум,
не раскідаў гора,
не пазбыўся дум.

Часта сніцца вёска
плямай нежывой
і над ёю ночкі
мёртвы непакой.

Клён мой прыдарожны,
поля вартаўнік,
што ж і ты трывожна
галавой панік?

## ВЁСЦЫ

Чым ты ўстрывожана, вёска мая?
Сны, можа, сняцца благія?
Глянь, як прыгожа пакрыла зіма
сцежкі і стрэхі сівыя.

Змораны вецер на дрэвах заснуў,
ледзьве калыша бярозы;
я наша гора тапіць панясу,
беды павешу на лозы.

Цёмнаю ночкай, як згасне зара,
стану на варце ля хатаў.
Сэрцам маім і душой песняра
сум твой вялікі засватаў.

Бура надыдзе,— я поплеч з табой
рады спаткаць навальніцу.
Хутка жыццё будзе ў нас барацьбой,
сёння трывога хай сніцца.

Пройдзена многа вандроўных дарог,
пройдзена з торбай жабрачай;
каб не было ўжо ні мук, ні знямог,
сёння пачаць трэ іначай.

## ЗВАНАР

Звані, званар,
звані трывогу!..
У самы большы звон удар!
Заві на бой, на перамогу,
на радасць новую, званар!

Навокал ноч...
І блудзяць людзі,
Шукаюць шлях даўно яны,
а хутка, хутка бура будзе...
Званар, хутчэй звані, звані!

Паўзуць па небе страхі-хмары
І цені-дзівы па зямлі,
ўстае далёка лунь пажару,
крыжы хістацца пачалі...

Ты чуеш рэха бур удалі
і ціхі векавы праклён?
Гані хутчэй трывогі хвалі,
удар у самы большы звон!

Будзі людзей з сваёй званіцы,
а то яшчэ праблудзяць век,
заві — няхай праз навальніцы
ідзе да шчасця чалавек!

Звані, каб выйшлі на дарогу
яны дні новыя спаткаць.
Звані, званар!
Звані трывогу,
каб зноў вясну ім не праспаць.

## МІХАСЬ ЯВАР
## (1903—1933)

Міхаіл Андрэевіч Явар (сапраўднае прозвішча Карась) нарадзіўся ў вёсцы Мінявічы на Мастоўшчыне. З дзяцінства яго захаплялі краявіды роднай прыроды, рамантычныя мары падарожжаў. Працаваў рыбаком. Друкавацца пачаў у «Беларускай газеце» і ў часопісе «Шлях моладзі». Актыўны ўдзельнік нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, Міхась Явар адлюстроўвае ў сваіх вершах не толькі рамантычнае ўспрыманне жыцця. Многія вершы яго прасякнуты грамадзянскім пафасам, адчуваннем сацыяльнай і нацыянальнай несправядлівасці. Міхась Явар шырока выкарыстоўваў народна-песенныя паўторы ў сваёй творчасці, характэрныя фальклорныя традыцыі. Вершы вызначаюцца таксама глыбокім гуманістычным спачуваннем народнаму гору, драматычна-журботнымі матывамі.

### ПАКЛОН ЧАЛАВЕЧАМУ СТРАДАННЮ

Не перад бажніцамі, дзе светлыя праменні
Агнёў нязлічаных гараць і зіхацяць,
Не там, браты, о не! — я кленчу на калені,
Не там, дзе алтары у золаце блішчаць.

Не там, дзе бляск багацця вабіць многіх вока,
Не там, дзе золата і срэбра чуцен звон,—
Я чалавечаму ўсяму страданню, мукам,
Крывавым слёзам іх сягоння шлю паклон!

Туды, да хаткаў тых,
                    і шэранькіх, і цёмных,
Туды, адкуль ляціць і крык, і плач, і стогн;
Жабрацтва дзе й нуда,
                              да тых вякамі бедных,
Да тых, пакрыўджаных, я шлю гэты паклон!

Да тых, што зямлю-матку паліваюць,
Што кормяць хлебам свет
ўжо шмат мільёнаў дзён,
А самі часта так без хлеба галадаюць,
З якіх смяюцца ўсе,— да тых я шлю паклон!

Да тых, што пры станках,
да чорных рук мазольных,
Багацце што куюць, ўсе цуды новых дзён,
Да твараў жоўтых тых,
да вуснаў іх бяскроўных,
Сям'і вялікай той — я сёння шлю паклон!

Да ўсіх, якія век працуюць і страдаюць,
Якім нясе спакой магільны вечны сон...
Якія без пары свет белы пакідаюць,—
Да мучанікаў тых я шлю гэты паклон!

Я мучанікам тым, каму ў страданнях вечных
За волю мілую пяе кайданаў звон...
Я скатаваным ўсім... я ценям іх — магілам,
Касцям струхнеўшым іх — я шлю гэты паклон!!!

## ТОДАР КЛЯШТОРНЫ
## (1903—1938)

Тодар Тодаравіч Кляшторны нарадзіўся на Лепельшчыне ў вёсцы Парэчча. З маленства рабіў усё, што даводзілася рабіць вясковым дзецям. Вучыўся на Аршанскім рабфаку. У 1925 г. у альманаху «Аршанскі маладняк» з'явіліся яго першыя вершы. У 1926 г. паступіў у Беларускі дзяржаўны універсітэт і з гэтага часу пачаў друкавацца ў перыядычных выданнях. У 1927 г. выйшаў першы зборнік вершаў маладога паэта — «Кляновыя завеі». У гэтыя ж гады трапіў у палон песімістычных настрояў, пачатак пераадолення якіх засведчыла яго паэма «Калі асядае муць» (1927—1928). Як і многія маладыя паэты тае пары, Т. Кляшторны пэўны час знаходзіўся пад уплывам паэзіі Сяргея Ясеніна. Але ён настойліва шукаў свой адметны голас, свой стыль, сваю галоўную тэму. Адным з першых сярод маладых паэтаў Т. Кляшторны пачаў асвойваць апавядальны сюжэтны верш.

Нягледзячы на кароткае жыццё, творчая спадчына Т. Кляшторнага вельмі багатая. За дзесяць гадоў ён

**выдаў дзесяць кніжак сваёй паэзіі. Гэта «Светацені» (1929), «Ветразі» (1929), казка для дзяцей «Пра зайца, ваўка і мядзведзя» (1935) і інш. На беларускую мову пераклаў раман Ф. Панфёрава «Брускі», а таксама асобныя творы У. Маякоўскага, М. Асеева, А. Безыменскага і інш.**

**У самым росквіце таленту і творчага станаўлення жыццё Тодара Кляшторнага трагічна абарвалася, а яго імя і творы на многія гады былі выкрэслены і забыты.**

* * *

Завечарылася бярозавая просінь,
У далях вечар дым пераліваў.
А Млечны Шлях
    На сіняватых плёсах
Заранкамі дарогу вышываў.

Мне марыцца:
    Нібыта той дарогай
З адвечнасці вярнуліся гады...
Я не паэт,
    А хлопчык басаногі,—
За рубяжамі свет і гарады.

Нібы з туманаў выплыла паданне
Пра гэта возера,
    Як сведку дзіва-дзей;
Я ўспамінаю першае каханне
І першы хмель разбураных надзей.

З тае пары я шмат пераменіўся
(Цвітуць да часу ў жыце васількі),
О вечар, вечар,
    Што завечарыўся,
Куды сплылі ружовыя вянкі?!

## УСПАМІН

Вячэрнія сцені апалі...
Над рэчкаю дрэмле сасна,
А там,
У бярозавых далях,
Блакіт асыпае вясна.
Я першую песню калісьці

Складаў а такой жа пары...
Шапталася соннае лісце
Ў вячэрніх агарках зары.
Дрыжалі зыбучыя хвалі,
Каціліся ў сінь туманоў...
Гуслярылі звонкія далі
На струнах лясных салаўёў...
Мінаюць і дні, і нядзелі
(Мінулага зноў не сустрэць),
Агаркі зары дагаралі,
А песні ў душы не згарэць...
Я першую песню калісьці
Чароўнай вясне падарыў,
Тады залацістае лісце
Цвіло ў пералівах зары,
Вячэрнія сцені апалі,
Над рэчкай драмала сасна.
А там,
У бярозавых далях,
Блакіт асыпала вясна.

* * *

Аб чым шумяць над возерам бярозы?
Аб чым гамоняць хвалі між трысця?
Ці гэта ноч і месяц пад гіпнозам?
Ці я пад хмелем мудрасці жыцця?

Як разгадаць?!
А ўрэшце і не варта
Канцоў прычын няведамых шукаць.
О, не філосаф я... і не на зорнай варце,
Каб таямніцы свету вартаваць.

Мне не дала прырода тонкіх грацый,
І я не зяць уласніка, не кум.
Мне не належаць скарбы і багацце,
Хоць я і сам багацця не вазьму.

Дзе за капейку галаву хілілі,
Там я ішоў пагардаю зарэць.
Маё багацце — песня любай ліры,
Мне наканована у песні дагарэць.

Я кожнай хвойкі гоман адчуваю,
Я чую крокі нават туманоў,

Таму і злосць і крыўду прабачаю
У лёгкім тлуме творчых аганькоў.

Таму і ноч і месяц пад гіпнозам,
А я пад хмелем музыкі жыцця —
Мне шэпчуць вершы белыя бярозы,
Мне шэпчуць казкі хвалі між трысця.

## ПЛАТОН ГАЛАВАЧ
## (1903—1937)

Платон Галавач нарадзіўся на Бабруйшчыне ў вёсцы Пабокавічы. Бацька яго, бедны малазямельны селянін, марыў даць сыну добрую адукацыю. У сем гадоў Платон ідзе ў двухкласнае царкоўнапрыходскае вучылішча. Ён быў старанным вучнем. Пасля заняткаў увесь час праседжваў за падручнікамі.

З беларускай літаратурай П. Галавач пазнаёміўся вельмі рана. Вялікае ўражанне зрабіла на яго паэма Я. Купалы «Сон на кургане».

Пасля заканчэння вучылішча Платон вучыўся ў Гарбацэвіцкай школе. І як заўсёды побач з ім былі кнігі. З дзіцячых гадоў П. Галавач цягнуўся да мастацкіх сродкаў адлюстравання жыцця. Спачатку гэта былі малюнкі. Яму нават прарочылі будучыню мастака. Але ён стаў пісьменнікам. Яшчэ ў школе настаўнікі адзначалі яго сачыненні, часта чыталі іх перад усім класам.

Будучы пісьменнік пачаў друкаваць свае першыя заметкі, замалёўкі, невялічкія карэспандэнцыі ў Бабруйскай газеце «Камуніст». Акрамя публіцыстычных твораў, П. Галавач пачынае спрабаваць свае сілы і ў мастацкай літаратуры: піша фельетоны і нарысы, якія друкаваліся ў мясцовых газетах і часопісах. Неўзабаве з'яўляюцца першыя апавяданні.

Сталая літаратурная дзейнасць П. Галавача пачынаецца ў 1925 г., калі ў газеце «Савецкая Беларусь» было надрукавана яго апавяданне «Загубленае жыццё».

Платон Галавач быў адным з першых беларускіх крытыкаў. Журналістыка, якой ён займаўся побач з літаратурнай дзейнасцю, цесна збліжала яго з жыццём. Часта на аснове падзей, адлюстраваных у нарысах і артыкулах, пісьменнік пісаў мастацкія творы («Рубанаўскі вузел», «Спалох на загонах»). Адно за адным выходзяць яго апавяданні на разнастайную тэматыку. Гэта і апавядан-

**не пра жыццёвы шлях рабочых «Перад канцом», і апавяданне «Дзве сцежкі», якое ўзнімае пытанне ўзаемаадносін бацькоў і дзяцей. Самым значным у творчасці П. Галавача з'яўляецца яго раман «Праз гады».**

**Хоць жыццё П. Галавача абарвалася вельмі рана, яго творы трывала ўвайшлі ў гісторыю беларускай літаратуры.**

## НЕ ТАК

Была вясна.

Моцна пахла зямлёю.

Сузон ляжаў у акопах і часта-часта ўспамінаў далёка кінутую хату, дзядзінец, пустуючыя гоні. І чым больш успамінаў аб іх, тым больш ныла сэрца, нязносна падоўгу балела, і ўсё яскравей паўставалі ў памяці вобразы далёкіх няўзораных гоней і змучанай голадам і працай жонкі.

Пахне зямля. Акурат, як у час, калі ідзеш за плугам і яна мяккімі дробнымі кавалачкамі абсыпае ногі. Пах гэты казыча нос, прабіраецца ў самае сэрца і балюча раніць яго. Варочаецца тады Сузон, седзячы ў акопе, плюшчыць вочы і бачыць неўзараныя гоні, раскрыты хлеў, худую жывёлу, і ўсё гэта просіць яго гаспадарскай рукі. Сузон скрыгае зубамі, кладзецца тварам да зямлі і стогне. А зямля пахне ўсё мацней і мацней, кліча да сябе.

І не сцярпеў.

Ноччу выпаўз з акопаў, нібы за патрэбай, адышоў у кусты і потайкам, паціхеньку пайшоў у тыл. За ноч адышоў вёрст пятнаццаць, а далей, прабіраючыся ад вёскі да вёскі, напаткаў па дарозе часць нейкую, даў пісару ротнаму тры рублі, а той выпісаў Сузону пасведчанне на пабыўку без тэрміну. І тады, ужо не баючыся, ехаў у таварным вагоне аж да свайго павятовага горада.

У вагоне прасторна было, ніхто не перашкаджаў думкам. З вагона відаць было поле, убранае рунню, і аратыя за плугам. Над полем слалася ціхае неба светлае, плылі далёкія хмары кавалкамі, рассыпаліся песні жаўранкаў.

І душа поўнілася спакоем і ўпэўненасцю: прыеду, за зямельку вазьмуся, падпраўлю гаспадарку...

Дадому ад станцыі гасцінцам дванаццаць вёрст. Прыйшоў, як сцямнела. У цемры будынкі двара здаліся прыгожымі, цэлымі, форма іх не была парушана; цемра згладзіла дзіркі ў стрэхах, абломы ў кутах згніўшых. Нават хата старая, ад таго, што гарэла на камінку

смоль і ад таго, што з радаснай усмешкай стаяла ля стала жонка, не адрываючы ад яго вачэй, і ад таго, што аб калены церліся галоўкамі дзеці, здалася прытульнай, цёплай.

Ноччу сніў акопы і страляніну і цывільнага ў фрэнчы, які ўгаворваў салдат змагацца з немцамі да перамогі, за Часовы ўрад і абяцаў зямлі і волі.

Назаўтра і яшчэ дзён некалькі хадзіў па суседзях, гасцяваў, апавядаў пра фронт і не прыглядаўся асабліва да двара, да гаспадаркі.

А потым бліжэй падышоў да гаспадаркі, прыгледзеўся, абмацаў усе куты. Хата з дзіравай страхой, са згніўшымі шуфлядамі ў вокнах, падлогай, хлявы разбураныя, параскрываныя і пустыя гумно, клець і стопка; паросшы муравой, адзічэўшы дзядзінец і поле заросшае — аблог,— усё гэта неяк сабралася разам, абступіла Сузона, пытала: «Ну, што, як?» — і чакала адказу.

Глыбока, у самым нутры, ціха заныла... Пачалі знікаць мэты, надуманыя ў вагоне.

Спадзяваўся перасіліць гэта.

Дранкай заляпіў страху на хаце; накраў у лесе жэрдак і трохі падправіў гумно; пазычыў у суседзяў каня і ўзняў тупым сашнікам аблог; пазычыў жыта на хлеб і адрабляў за яго. А ўсё па-ранейшаму стаяла наўкола яго, падыходзіла ўсё бліжэй і бліжэй і пытала: «Ну, а ўсё ж такі?»

Мучыла, не давала спакою.

Поле патроху ўзараў, пару гоней засеяў, а на больш не хапіла насення. Там, дзе меркаваў ячменем сеяць, кінуў пад грэчку. Пайшоў пазычаць насення — не пазычылі, і поле зноў пачало зарастаць.

Ужо думалася: «Нічога не выйдзе, не падняцца аднаму на ногі, не так трэба рабіць, не так, па-іншаму». А вечарамі ў хаце, пад ціхія словы жонкі, зноў трохі бадзёрыўся і зноў з'яўлялася жаданне нешта рабіць неадкладна, зараз жа.

Раніцою выганяў з хлява карову з цялём,— худую, замызганую; ногі худыя ў каровы, адна аб другую каленамі труць. Ідучы назад у хату, змеціў, што ў клеці згніла падруба і яна ўся пахілілася набок. Высек тоўсты дубовы кол, каб падперці клець. Упёр кол канцом адным у зямлю, а другім у шула, стаў абухом па калу біць, каб ямчэй падперці,— ажно шула гнілое, у нутро ўламалася, парахня парашком жоўтым паляцела, зачыхаў Сузон.

Стукнуў тады абухом па бервяне ў сцяне,— глуха адазвалася гніючым нутром бервяно.

Апанавала безнадзейнасць.

«Не так, не так трэба, аднаму не ўправіцца, гэтак усё жыццё тут пылам пойдзе, парахнёй».

А клець пахілая, хата са згніўшымі шуфлядамі і падлогай, крывыя хлявы з дзіравымі стрэхамі, пустыя гумно і стопка, худая жонка і замурзаныя плаксівыя дзеці, і на крывых нагах карова — усё гэта абступала Сузона ўсё шчыльней і шчыльней і, ні то насміхаючыся, ні то з жалем, пытала: «Ну, дык як жа?..»

Ад гэтага знікалі сілы, абвісалі вяла рукі.

У ліпені нядзельным раннем абвясціў Сузон жонцы, што пабыўка скончылася, і, сабраўшыся, азіраючыся, пакуль не знікла вёска, пайшоў назад у акопы.

«Трэба неяк інакш. Так нічога не выйдзе».

## НАВЕЛА БЕЗ НАЗВЫ

Чалавек у кепі павольна перастаўляў ногі і ў такт крокам ледзь-ледзь схіляў па чарзе за нагой тулава. Ногі мералі дакладна: семнаццаць крокаў да канца пляцоўкі і семнаццаць назад. І калі б чалавек у кепі з кожным разам, як ідзе ў канец пляцоўкі, не азіраўся назад, можна было б падумаць, што прыйшоў ён сюды трэніравацца ў рытмічнай хадзе і што ніякая рэч з навакольнага яго не цікавіць.

Аднак гэта было не так. Чалавека ў кепі зацікавіў шэры падношаны гарнітур, гаспадаром якога быў малады яшчэ, белабрысы хлапец, які даўно ўжо стаіць каля трамвайнага прыпынку і ўсё не едзе.

Чалавек у кепі, не прыпыняючы крокаў, выняў партсігар, дастаў папяроску і пайшоў у бок да шэрага гарнітура.

— Прабачце, пане, дазвольце прыкурыць.

— Калі ласка, калі ласка.

Шэры гарнітур страсануў з свае папяросы попел і падаў яе. А потым, пакуль чалавек у кепі, крыху сагнуўшыся над папяросай, закурваў, ён паспеў разгледзець лёгкае, табачнага колеру, кепі ў клетку, туга накрухмалены белы каўнер і пад каўняром, на шыі, цёмна-шэрую поўсць.

— Прабачце, пане,— сказаў ён,— сюдой ідзе нумар трынаццаты?

— Бясспрэчна, бясспрэчна, пане,— адказаў чалавек у

кепі і, выпрастаўшыся, падзякаваў за паслугу.— Дзякую, прабачце.

— Няма за што, пане. Прабачце, што не даў пану запалкі.

— О, то нічога не значыць, пане.

Чалавек у кепі кіўнуў галавою і адышоў убок.

На пляц з суседніх вуліц павольна падыходзілі трамваі. Яны скрыгацелі на заваротах, выходзячы з перакрыжаванняў вуліц, і густа званілі. Звонячы, прыцішалі ход і, уваходзячы ў людскі натоўп, спыняліся, а потым зноў званілі і павольна рушылі з месца, каб знікнуць за камяніцамі ў блізкай вуліцы.

Яшчэ праз пяць хвілін шэры гарнітур зайшоў у вагон. Сядаючы ў вагоне на лаўку, ён змеціў, як мільганула пад самым акном вагона лёгкае, табачнага колеру, кепі ў клетку. І тады, ні да кога не звяртаючыся, выказваючы задаволенасць тым, што дачакаўся трамвая, сказаў:

— Ну, вось мы і паехалі.

З бразгатам, злёгку гойдаючыся, ішоў трамвай ад аднаго прыпынку да другога, далей ад цэнтра, ад параднай часткі горада, ішоў і бесперапынна званіў, перасцерагаючы вузкія, шматлікія завулкі ўскраіны.

* * *

— Проша, проша.

Старэйшы адсунуўся і даў месца. Адась сеў.

— Ваш завод работае, пэўна, круглыя суткі? — запытаў ён.

— Круглыя суткі,— кажа старэйшы.— Мы работаем на войска. А табе што? — пытае ён у сваю чаргу і ўважліва аглядае Адася ўсяго адразу.— Праведаць што хочаш? — пытае і праз плячо пазірае на залаплены Адасёў рукаў.

Адась выняў папяросу, але не закурыў, прыпомніў, што ў вагоне курыць забаронена.

— Я шукаю работы,— сказаў ён.— Я трэці год хаджу без работы. Я цэлае лета гуляю.

— Цэлае лета, кажаш, гуляеш? Гм, дык чым жа табе нядобра? Дзівак чалавек... Хе-хе!

І стары крывіць рот ухмылкай.

— Гуляе чалавек — і нездаволены. Та-а-к...

— Цэлае лета гуляю,— зноў кажа Адась.— Зімой хоць калі-нікалі снег з вуліц прыбіраю, а ўлетку няма чаго рабіць.

— Нашаму брату, выходзіць, і мяцеліца на карысць,

а? — І стары зноў ухмыляецца.— Мерзнеш, ды рад ёй, бо, выходзіць, і яна кавалак хлеба дае. Та-а-к. А чаму ты наш завод выбраў? — пытае ён у Адася.

— Мне так параілі. Сказалі, што ў вас часта наймаюць і што на ваш лёгка наняцца.

— Ту-у! — Стары пацісnуў плячом і кіўнуў галавой у бок на маладога хлапца, што сядзеў насупроць.— У яго запытай. Лёгка наняцца! — ён прысвіснуў, а тады сказаў, косячыся ў бок да Адася.— Хоць... як каму, канечне. Каму і лёгка, каму і вельмі лёгка, а каму дык і ніяк не можна, гэта справа такая.

Змоўк, зірнуў яшчэ раз на Адасёў лаплены рукаў і, прыжмурыўшы вока, неўзаметку падміргнуў малодшаму.

— У нас,— умяшаўся ў гутарку малодшы,— трэба, каб паручацельства было ад двух чалавек, вядомых на заводзе, або ад дэфензівы.

— Чаму ад дэфензівы?

Стары зноў зірнуў паверх пляча на Адася і гэтак жа непрыкметна, хітравата падміргнуў малодшаму.

— Вот, як у нас,— сказаў ён.— І калі ў цябе, малойчык, ёсць там добрыя знаёмыя, тады ўраз паступіш на Шкодаўскі завод.

— А ты якой прафесіі? — запытаў малады.

— Я токар па металу.

— Токар? Токараў набіралі часта. Я сам токар,— сказаў і адвярнуўся да акна, а праз нейкі час зусім нечакана зноў загаварыў:

— Ім яшчэ нічога! — ён кіўнуў галавой на старога,— а такім, як я, вельмі цяжка. Да прыкладу: год я рабіў без ніводнай капейкі, а цяпер трэці год раблю — і раблю не горш за дарослых, а плоцяць мне разоў у восем менш.

Адась пазірае на свае крыху зашмальцаваныя калені і слухае, як бразгочуць пад вагонам колы.

— Значыць, ніякай надзеі няма,— кажа ён ні то сабе, ні то пытаючы кагось.— А мне нагаварылі, нараілі...

— А ведаеш што,— кажа малады,— пайдзі да стралецкай арганізацыі. На наш завод часам прымаюць па іхняму паручацельству. А я табе пасаблю паступіць у стралецкую арганізацыю.

— Пан, пэўне, даўно ў стральцах,— заўважыў стары.— Так ці не?

— Не. А яны пасобяць?

— Могуць пасобіць. У нас на заводзе амаль уся моладзь пайшла ў стралецкі саюз. Гэта значна спакайней. Больш на рабоце пратрымліваешся.

— Дык ты пасобіш мне ў гэтым? Я даўно хачу ў стралецкі саюз,— кажа Адась.

— Ладна, чаму ж.

— Ну і ладна. А я табе, можа, што зраблю. У нас часта збіраюцца вячоркі, весялосць. Калі хочаш, будзем сябраваць. Хочаш?

— Вельмі добра.

— Я жыву ў Прывіслінскім.

— А я на Касцёльнай, у дзевятнаццатым нумары. У нас сумна, прыяцеляў у мяне небагата, жывуць усе далёка вельмі.

— А ў нас часта бываюць вячоркі. Як будуць, я сустрэну цябе, і тады пойдзем. А цяпер я злезу.

Адась падаў малодшаму руку, а пасля прыўзняў шапку і кіўнуў галавою старэйшаму. Той ледзь кіўнуў у адказ і зноў хітравата падміргнуў.

* * *

Праз два дні Адась блукаў па Касцёльнай, шукаў дзевятнаццатага нумара. Ён павольна крочыў па тратуары ўздоўж усяе вуліцы, азіраўся на таблічкі каля дамоў і пачынаў нервавацца. Дзевятнаццатага нумара не было. А пайсці ў двор наўгад і пытаць ён не хацеў дый не ведаў, каго пытаць, ён не ведаў прозвішча свайго знаёмага. І акурат у гэты момант, калі ён разгублена прыпыніўся, мяркуючы, што рабіць, перад ім нечакана з'явіўся ягоны знаёмы.

— А я цябе здалёк пазнаў. Ну, што? Нідзе яшчэ не працуеш? — запытаў ён.

— Не, што ты, хіба гэта так лёгка? Ого! А я хацеў перадаць табе, што сёння ў нас вячорка.

— Сёння? — перапытаў знаёмы.— А скажы, багата вас збіраецца?

— Як калі. Сёння нас трое будзе і трое дзяўчат. Дзяўчаты свае, добрыя і прыгожыя. Любата.

Знаёмы Адася на хвіліну задумаўся.

— А ведаеш,— сказаў ён пасля кароткай паўзы.— Давай цяпер да мяне падойдзем, папалуднуем, пасядзім у мяне, а як звечарэе,— пойдзем туды.

— Гэта то добра, толькі ці зручна мне?

— А чаму ж? У мяне дома толькі старая маці.

— Давай так,— згадзіўся Адась.— Толькі дзе ты жывеш тут? Я ні за што не знайшоў бы. Вось тут жа недзе павінен быць дзевятнаццаты нумар, а яго няма.

— Фу ты! А я забыўся сказаць табе, што ў дварэ жыву. Во, тутака ж,— паказаў ён у двор.— Вунь у той камяніцы.

Дома знаёмы пакінуў яго ў пакоі аднаго, а сам пайшоў на кухню, дзе рыхтавала маці страву. Быў ён на кухні нядоўга і прыйшоў адтуль рагочучы. Рагатаў з парога і, адышоўшы ўбок, ківаў галавой у бок маці.

— А мама баіцца, што ты камсамолец,— сказаў ён.— Яна вельмі баіцца, каб я ў камсамол не пайшоў, баіцца майго арышту.

— Ну во, найшоў што казаць.— Маці засаромелася і вінаватым тонам, каб апраўдаць сябе перад сынавым госцем, сказала: — Баюся, як і ўсякі кожны баіцца.— А потым дадала: — А якая ж маці за сваіх дзяцей не баіцца? Песціш, гадуеш... Ды не дай бог што якое, дык як жа я тады зусім адна застануся? Што ж вы гэта?

Яна паставіла на стол страву, пастаяла перад сталом, азіраючы, ці ўсё патрэбнае падала да полудня, а тады, звяртаючыся да Вінцуся, сказала:

— Дык садзіцеся ж есці, садзі, Вінцусь, хлапца, чаго ж ты.

— Я сяду, цётачка, дзякую.

Маці выйшла. Вінцусь падсунуў да стала крэсла і сеў. За сталом захацелася нешта сказаць да Адася, але не знаходзілася слоў, і ён еў моўчкі. Еў і адчуваў сябе нязручна, што вось гаспадар ён і маўчыць. Але на дапамогу прыйшоў сам Адась. Ён адклаў убок відэлец, усміхнуўся і, звяртаючыся да Вінцуся, запытаўся:

— Тваё імя Вінцусь? Ведаеш, неяк смешна. Ходзім, сябруем і яшчэ адзін аднаго не ведаем. Неяк так яно ў нас абыходзілася.

— Ну так, праўда ж. Я Вінцусь Мальцэвіч.

— А я Адась Такарчук. Вось і знаёмства.

— А сапраўды ж смех,— згадзіўся Вінцусь.— Каб каму сказаў, дык не паверыў бы. Сустрэліся, пагутарылі троху і пасябравалі, і адзін аднаго не ведаем. Фу ты!..

Цяпер абое адчувалі сябе зручней, вальней. Адась еў хутка, а пад'еўшы, загледзеўся на картку, што вісела над канапай.

У чорнай касцяной рамцы мясцілася картка шыракаплечага паголенага мужчыны. Выглядаў мужчына дужым і нестарым яшчэ, і Адась падумаў, што, пэўне, гэта Вінцусёў бацька і што ён, пэўне, маладзей за маці. У маці багата глыбокіх зморшчын на твары і галава ў сівых

валасах. Ён узняўся з крэсла, падышоў да канапы і спыніўся, каб уважлівей агледзець картку.

— Твой бацька, відаць, вельмі дужы чалавек,— сказаў ён.

Тады Вінцусь стаў побач з ім і вытлумачыў:

— Бацьку летась забіла на заводзе. А быў дужы, ого!

З кухні прыйшла маці.

— Вось і вечар,— сказала яна, прыбіраючы посуд.— Дзень пакуль пратупаеш, дык і ногі і рукі баляць. І каб яшчэ хто ў хаце быў, а то ж адна,— паскардзілася яна.— Сядзіш і чакаеш вечара, калі ён прыйдзе.

Сын усміхнуўся. А Адась заўважыў, што разам са старой прыйшла ў пакой шэрасць восеньскага вечара. Яна знізіла столь у пакоі, адсунула ў бакі сцены і шчыльней саставіла па кутках хатнія рэчы. Так іх, зусім па-інакшаму, убачыў цяпер Адась. І яшчэ цяпер ён услухаўся ў вячэрнюю цішыню. Цішыня авалодвала ўсім. У цішыні асобныя гукі, як ніколі выразна, даходзілі ў пакой і ўрэзваліся ў памяць. Угары, над столлю, хадзіў нехта цяжкі, у ботах і раз-пораз глыбока ўздыхаў. Пад нагамі ў яго дзеці рассыпалі драўляныя вытачаныя цацкі. Цацкі падалі на падлогу і са стукатам каціліся па ёй у розныя куты пакоя, што быў угары.

Цяжкія чалавечыя крокі і ўздыхі параджалі ў Адася сум, і ён сказаў да Вінцуся:

— Давай пойдзем ужо, гэта далекавата.

— Ну давай, давай,— заспяшаўся Вінцусь.— Давай, а то я гатоў задрамаць, так ціха ў нас.

Праз хвіліну хлопцы былі на вуліцы.

* * *

Цёмна, ціха і пуста ў вуліцы. І крокі ў цішыні, у пустэчы, чоткія, далёка чуваць.

Насустрач ідзе пара, хлопец і дзяўчына. Яны абое косяць непрыкметна на Вінцуся погляды і, падаўшыся крышку ўбок, аглядаюць яго. Вінцусь ловіць іхнія погляды, пазірае проста ў твар ім і ветліва ўсміхаецца. У яго цяпер добры настрой, і ён хацеў бы сказаць гэтай пары нешта добрае. «Вось так, каб зайшоў наперад, паклаў ім на плечы рукі і сказаў...» Але тут жа ён дакарае сябе: «Ну і надумаўся, называецца, сказаў бы што, а тыя чорт ведае што падумалі б, яшчэ пакрыўдзіліся б, вылаялі б».

І ён ідзе далей, слухаючы свае крокі, адрозніваючы

іх ад чужых, тых, з кім размінуўся толькі што. Яшчэ чуваць, як шоргаюць па асфальце іхнія ногі, але гукі іхніх крокаў слабеюць, згладжваюцца і хутка перастаюць успрымацца. І тады ён слухае толькі свае крокі. Ногі ступаюць лёгка і ў кроках імкнуцца захаваць знаёмы ўжо рытм.

Ад вулічнага спакою прыйшло лёгкае забыццё. Вінцусь не адганяў гэтага забыцця, нават рад быў яму.

...Тая, якую звалі Марысяй, паклала шырока далонь на струны, і гітара замоўкла. Спынілі скокі. Сябра Адасёў апавядаў пра стачку на іхнім заводзе.

А потым зноў іграла Марыся. Іграла і спявала пад гітару. Песня была знаёмай Вінцусю, але ён адразу не мог прыпомніць яе слоў. Потым услухаўся ў мелодыю песні, пачаў прыпамінаць яе, чутую дзесьці раней некалі, а прыпомніўшы, заспяваў:

На барыкады, люду рабочы,
Чырвоны штандар до гуры ўзнесь!

А Марыся ветліва, шырока заўсміхалася насустрач яму і, выбіваючы такт песні нагой, непрыкметна адклала гітару, радасна замахала рукамі, кіруючы песняй, у якую ўплялося і яшчэ некалькі ціхіх галасоў. За Марысінымі рукамі, следам за рухамі іхнімі рос, дужэў Вінцусёў голас.

— Жар іскры той! — чуў свой голас Вінцусь і гэтак жа радасна і шырока ўсміхаўся да Марысі!..

Прайшла, пазіраючы на Вінцуся, яшчэ адна пара і яшчэ.

На скрыжаванні вуліц калыхнуўся ад лёгкага ветру ліхтар на слупе, павярнуўся ў твар да Вінцуся і дапытліва агледзеў яго. За ліхтаром цень Вінцусёў ажыў і захістаўся на тратуары. Цень рытмічна гойдаўся ў бакі, выцягваўся на ўсю даўжыню тратуара, вырастаў на сцяне камяніцы і галавой нік у цемры, ідучы наперадзе Вінцуся на сваіх даўгіх нагах.

Вінцусь усміхнуўся.

«Вось і добра,— сказаў ён сам сабе.— Вельмі добра, што так выйшла. Адась маладзец, што пазнаёміў мяне з імі».

Даганяючы цень свой, усміхаючыся, ён ішоў у цёмны канец Касцёльнай.

* * *

Далей было так.

Адась ад самай заводскай брамы ішоў у натоўпе рабочых, курыў і, паволі перастаўляючы ногі, час ад часу пазіраў на бакі, кагось шукаў поглядам і ўслухоўваўся ў гутаркі.

Непадалёк ад трамвая яго нагнаў Вінцусь. Ён непрыкметна кіўнуў галавою і пайшоў поруч. І адразу ж папрасіў закурыць.

Як закурвалі, крыху затрымаліся. Адась выняў з кішэні невялічкі папяровы скрутак і разам з папяросамі перадаў яго Вінцусю.

— Вось тут усё, што мы абяцалі, рэшта — справа вашая.

— Усё будзе як след. На заводзе вялікае нездавальненне рэдукцыяй. Лісткі сімпатыкі заўтра ж раскідаюць, і мітынг будзе толькі завяршэннем таго, што ёсць. Я даю слова, што першага жніўня мы будзем баставаць.

Вінцусь хваляваўся і не мог схаваць радаснай, ганарлівай усмешкі.

— Гэта вельмі добра,— сказаў шэптам Адась.— Новых дырэктыў ніякіх. Трэба абавязкова арганізаваць абарону ад шпіцляў і транспарант з лозунгам супроць рэдукцыі. Пакуль і ўсё. Я пайду наперад і паеду першым вагонам. Ты паедзеш наступным.

— Разумею. Будзь здароў.

У вагоне было цеснавата. Адась стаяў за плячыма высокага рабочага і з-пад пахі ў яго сачыў за тым, што рабілася.

Як садзіліся, адзін падняў з лаўкі згорнутыя ў пучок лісткі. Два лісткі ён перадаў суседзям, а адзін непрыкметна засунуў сабе ў кішэню. Адзін з тых, хто ўзяў лісток, адразу ж пусціў яго за акно. Папера мільганула за акном, пакружылася ў паветры і знікла за вагонам. А трэці лісток прачыталі. І як прачыталі, адзін з рабочых сказаў:

— Усё правільна, варта б арганізавана даць па рэдукцыі, толькі хто ў нас будзе рабіць гэта? Тут слова не так скажаш, і то ф'юць, а каб арганізоўваць, гэта ўжо сур'ёзней, чым адно слова...

І ён змоўк.

Вагон уздрыгваў, злёгку гойдаўся, бразгаў жалезам і густа звінеў, перасцерагаючы вуліцу і завулкі. І скрозь званкі і бразгат Адась яшчэ чуў абрыўкі гаворак у вагоне. Гаварылі пра знойдзены лісток. Але з тым, як набліжаўся трамвай да цэнтра, усё менш і менш заставалася ў

вагоне рабочых, і ў напалову апусцелым вагоне, седзячы непадалёк ад выхаду, Адась прыкмеціў на сабе ўважлівы погляд аднаго з пасажыраў.

З'явілася трывога. Разумеў, што трэба падрыхтавацца і непрыкметна знікнуць з вагона. Меркаваў, як бы зрабіць гэта, і, пазіраючы ў акно, сачыў за пасажырам.

Калі вагон наблізіўся да першага прыпынку, дзе ў вуліцы быў вялікі натоўп, пасажыр падаўся да задняй пляцоўкі, а Адась пайшоў наперад, каб першым выйсці з вагона.

А выходзячы з вагона, Адась пазнаў чалавека ў лёгкім, табачнага колеру, кепі ў клетку.

— А-а, мой стары знаёмы? — чалавек у кепі ўсміхнуўся і заківаў галавою.— Вельмі рад, вельмі рад такому спатканню,— сказаў ён.— Ну, якія ж поспехі ў пана?

— Я вас не ведаю,— здзівіўся Адась.— Пра што вы гаворыце, я не разумею вас, пане!

— О, гэта зусім не так важна, што пан мяне не ведае і не разумее. Гэта зусім не так важна. Важна, што я пана добра ведаю і разумею. І я прашу пана камсамольца пайсці за мной, вось сюды, зусім блізка адгэтуль...— Ён на хвіліну змоўк.

Цяпер Адась убачыў побач і пасажыра, які сачыў за ім у вагоне. Пасажыр стаяў, гатовы дапамагчы чалавеку ў кепі.

— Н-ну, проша, проша пайсці за мной,— паўтарыў чалавек у лёгкім, табачнага колеру, кепі ў клетку і ўзяў Адася за локаць.

Побач з імі пайшоў і той, што быў у вагоне.

## НАТАЛЛЯ АРСЕННЕВА
## (Нарадзілася ў 1903 г.)

**Наталля Арсеннева нарадзілася ў г. Баку ў сям'і служачага. Пасля яе нараджэння бацькі пераязджаюць у Вільню. Вучылася дзяўчынка спачатку дома, а пасля паступіла ў Віленскую гімназію. У гады першай сусветнай вайны сям'я Арсенневых эвакуіравалася ў Яраслаўль і ў Вільню вярнулася толькі ў 1920 г. У 1921 г. Наталля паступіла на гуманітарны факультэт Віленскага універсітэта, але вучобу не скончыла, вымушана была пераехаць у Польшчу, куды быў пераведзены яе муж. У 1939 г. Н. Арсеннева аказалася ў БССР, працавала ў віленскай абласной «Сялянскай газеце». Неўзабаве, як жонка польскага афіцэра, з двума**

сынамі была выслана ў Казахстан, а па хадайніцтву Саюза пісьменнікаў Беларусі праз год, у 1941 годзе, вернута на радзіму.

Друкавалася Н. Арсеннева на старонках заходнебеларускіх выданняў, у газеце «Літаратура і мастацтва». У 1927 г. быў выдадзены яе зборнік «Пад сінім небам».

У гады вайны паэтэса працавала ў «Менскай (Беларускай) газеце». У 1944 г. кіравала аддзелам літаратуры Беларускага культурнага згуртавання. У сувязі з наступленнем Савецкай Арміі была вымушана пакінуць радзіму. Некаторы час знаходзілася ў Германіі ў лагеры для перамешчаных асоб. З 1950 г. жыве і працуе ў ЗША. За гэты час апублікавала п'есу «Сваты» (1955), шэраг абразкоў. Пераклала на беларускую мову лібрэта да опер, такіх, як «Вяселле Фігара» В. Моцарта, «Кармэн» Ж. Бізэ, «Цыганскі барон» І. Штраўса і інш.

## ПРАЛЕСКІ

Мілыя, мілыя сінія кветкі,
светлай вясны ўлюблёныя дзеткі!
Кветак ёсць шмат, што за вас прыгажэй,
толькі, пралескі, вы сэрцу бліжэй...

Гляну я ў вашыя сінія вочкі —
і быццам бачу гайкі і лясочкі,
дзе з-пад снягоў пазіраеце вы,
мілыя дзеці вясны!

Толькі зірну я на вашыя краскі,
ўспомню вясновыя шчырыя ласкі,
ласкі і сонца й нябёс,
песні, што ветрык прынёс
з ясных палёў, дзе зямля абсыхае,
сонца дзе зрання да ночкі гуляе.

Вашыя вочкі ў сабе адбіваюць
сіняе неба і хмаркі, што таюць,
будзіце ціхі, родны мне сум,
нібы ў лесе вясняны той шум,
будзіце сілы, што ўзімку драмалі,
будзіце думкі, што скутыя спалі,
будзіце шэпты надзей,
што мне за ўсё саладзей...

Поўныя рожавай мглы пералескі
вас гадавалі, красуні-пралескі,
неба вас песціць, вам сонейка шле
золата кос, пацалункі нясе
ветрык вам весні... вас любіць вясна,
вас па лясох рассыпаець яна.

Вы ўсцілаеце сцежку вясне,
вы яе сымбаль, адзнака яе...
Мо вы таму мне за ўсё й саладзей,
дзеці вясняных надзей?

## ПЫТАННЕ

Даль, нябёсаў туманная даль
тае, гасне над ліпаў калонамі,
што усталі суценьмі зялёнымі
паміж доляй ды мною, на жаль,
і звіняць пад дажджом, як крышталь.

Цішыня... цішыня над старонкаю.
Ў срэбнай золкасці травы дрыжаць.
Нат жаўронак і з песняю звонкаю
ў гэткі дзень не ўзляціць сенажаць
срэбрам гукаў з нябёс бласлаўляць,
ані з зоркай рамонкавай тонкаю
летні вецер не прыйдзе гуляць...

Божа! Дні мае, хіба што шчасныя,
ціха сходзяць, сплываюць удаль,
па сабе пакідаючы жаль,
па мінулым — тугу перадчасную,
што звініць, быццам кропляў крышталь.

І пытаюся з болем міжвольным я:
што ж ты робіш з душою, з сабой,
як праходзіш жыцця пуцінай,
што ты робіш і з воляю вольнаю?
Бо мінуць — і не вернеш, на жаль.

## ВЯСЁЛКА

Лягла вясёлка мастом трымцівым,
Мастом, сатканым з калёраў кволых,

ад мокрых сцежак, ад росных ніваў
у бор сасонны, сівы й вясёлы.
Красою чыстай ты цешыш вочы,
красой нясталаю, як доля...
Чаго ж прыйшла ты, чаго ты хочаш,
чаго ўзрунела, вясёлка, ў полі?
Пацешыць хочаш нязвычнай казкай,
узняць з нізінаў у вышу вока?
Гарыць вясёлка нянаскай краскай,
мастом трымцівым лягла высока.
Мастом тым здані да нас зыходзяць
з паднебнай вышы, з нязнаных даляў,
вясняным чарам нас надзяць, зводзяць,
калышуць спеўным напевам хваляў...
З краіны дзіўнай маны й надзеі
і сны сплываюць па ім, няйначай.
Шчаслівы ж той, хто сніць умее,
шчаслівы той, хто іх пабачыць!

## ЛЕБЯДЗІНАЯ ПЕСНЯ

Дзень пусты і крыклівы прылёг цішынёю на межах.
Трэскі смольныя вечар у хмарах сівых запаліў.
І над жоўтым натоўпам асін у рызманнай асенняй адзежы
горкі дым смалякоў туманамі паплыў і паплыў.

Гэтак ціха й чароўна-прыгожа ўсё ў белых абыймах
туманаў...
Дзіўным, казачным морам пад ногі плыве сенажаць...
Скуль бяруць вечары гэткі змрок і густы й серабраны,
і ці можна у словах іх чар невыслоўны аддаць?

Але прыйдзе мой дзень, і знайду я патрэбныя словы,
тыя словы, якія цяпер не пачую ніколі й нідзе,
буду ўмець і чмялямі гусці ў раззалочаным цвеце
ліповым
і шаўковай шасцець асакой на зялёнай, зацвілай вадзе.

Ўсё папраўдзе скажу я тады, для сябе не пакіну нічога,
ўсе памылкі, ўсе ўзлёты злічу і расою рассыплю ў лагох.
Доўг жыццю заплачу, рэшту з добрага, рэшту з благога,
паспрабую аддаць яму, хай не злічу ці не ўспомню ўсяго.

Раскажу аб мяцеліцах ночных, няспаных да рання
гадзінах,

супакоі асенніх змяркання̆ у яснасці сплаканых зор...
А ўсе словы у песню злучу я прыпевам нязнаным, адзіным,
а ўсе песні — ў адзін, шчэ не чуты, магутны акорд!

Зашумяць, запяюць у акордзе мядзяныя хвалі калосся,
пахінуцца зялёнай сцяной, загалосяць вяршаліны дрэў,
туманамі заплача над жоўтымі пожнямі восень...
Лебядзінаю песняю людзі ахрысцяць мой спеў!

## У ГУШЧАРАХ

У гушчарах, затканых імглою,
шэрым змрокам, на золку, ў зару
ахвяруем Табе мы сабою
кожны дзень, кожны час, Беларусь.

І няма ў сэрцах жаху ні жалю,
мы адвагай змагарнай гарым:
не чужыя жануць нас у далеч,
але Ты нас вядзеш да зары.

І мы верым, яна разгарыцца,
ўстане зноў над краінаю дзень,
бо не стане змагар, не скарыцца,
прад нягодай ніколі, нідзе.

Хмараў дым над галовамі тае,
вецер дыхае мятай, быллём.
Беларусь, Беларусь залатая,
За Цябе, за Цябе мы ідзём!

## МАЛІТВА

Магутны Божа! Ўладар сусветаў,
вялізных сонцаў і сэрц малых,
над Беларусяй ціхой і ветлай
рассып праменне Свае хвалы.
Дай спор у працы будзённай, шэрай,
на хлеб штадзённы, на родны край.
Павагу, сілу і веліч веры
у нашу праўду, у прышласць — дай!
Дай урадлівасць жытнёвым нівам,
учынкам нашым пашлі ўмалот.
Зрабі свабоднай, зрабі шчаслівай
краіну нашу і наш народ!

# ПАЎЛЮК ТРУС
## (1904—1929)

Павел Адамавіч Трус нарадзіўся ў вёсцы Нізок, што на Уздзеншчыне, у беднай сялянскай сям'і. Першапачатковую адукацыю атрымаў у Нізаўскай чатырохкласнай школе. У 1923 г. паступіў у Мінскі педагагічны тэхнікум, потым вучыўся на педагагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 1923 год адметны ў творчасці П. Труса тым, што ў гэты час з'яўляюцца ў друку яго першыя творы, і тады ж паэт уступае ў аб'яднанне «Маладняк».

Пры жыцці паэта выйшлі зборнікі «Вершы» (1925) і «Ветры буйныя» (1927).

Паэзія Паўлюка Труса, асабліва ранняя, прасякнута рэвалюцыйнай рамантыкай, узнёслай настраёвасцю, светлымі фарбамі, радаснымі матывамі. Паэт выкарыстоўваў у сваёй творчасці паэтычныя традыцыі і багаты вопыт А. Пушкіна, М. Лермантава, Т. Шаўчэнкі, С. Ясеніна, М. Багдановіча, Я. Купалы. Паўлюк Трус — лірычны паэт па сваім светаўспрыманні. Менавіта лірычным ладам, глыбокім унутраным перажываннем вызначаюцца яго паэмы і вершы.

Творы П. Труса перакладзены на рускую, украінскую, польскую і іншыя мовы.

Памёр Паўлюк Трус ад тыфу.

### ЯК ПАЖОЎКНУЦЬ ЛІСТЫ

Як пажоўкнуць лісты,
Адцвітуць за акном,
Як пагаснуць халодныя зоры,—
Тады прыйдзе Яна,
Што пакляўся даўно,
І са мной ад душы пагаворыць.

Прыйдзе ўвечар адна,
Прыйдзе ў шэлесце сноў,
На парозе пастукае ў дзверы.
І барвовасць красы,
Дум цярновы вянок
Прынясе ў адзінокі мой церам.

Дзверы сам адчыню,
Месяц зойдзе ў пакой,—

Сустракацьмем далёкую госцю. .
...Ціха гасне свяча,
На душы супакой,—
Неяк радасна й сумна чагосьці.

Мы прыходзім у свет,
Каб уславіць яго,
Ўсё аддаць за жыццё і змаганне.
Зоры ў сэрцы маім
Зацяплілі агонь
І сагрэлі хвіліны маўчання.

Я стаю ля акна,
Клёны журацца ў сне,
Сцені рукі прасцерлі на плечы,
...Сёння прыйдзе Яна,
Завітае ка мне
Ў гэты ціхі зажураны вечар.

Будзе радасць цвісці
Каляровасцю руж,
Струны ўроняць маўклівыя ўсхліпы,
І ў апошні мо раз
Хтосьці скажа — «Даруй!..»
І заплачуць асеннія скрыпкі.

Гэны плач навальніц,
Гнеў глыбокай цішы —
Чары-казкі мелодый адвечных —
Я ў грудзях затаю,
Каб душой перажыць,—
А ці ўславіць сімфоніяй вечнасць?

Мы прыходзім у свет,
Каб уславіць яго,
Ўсё аддаць за жыццё і змаганне.
Зоры зноўку ў душы
Зацяплілі агонь,
Зноўку хвілі тугі і маўчання.

Ноч фіранку зняла
Беласнежнай рукой,
Дзесьці скрыпкі нямеюць у далях.
Не прыходзіць ніхто,—
Толькі думы са мной,
Быццам лебедзі ўвечар на хвалях.

Той жа ціхі пакой,
Я сяджу за сталом;
Прад вачыма разгорнуты Гётэ.
Я пазбыўся трывог,
На душы супакой,
І паволі знікае самотнасць.

Змрокі чэзнуць, як дым,
Сцені ўпалі ля ног,—
Іх развеяў плашчом Мефістофель.
...Сёння ж прыйдзе Яна...
. . . . . . . . . . . . . . .
Адчыняе акно,
Мне знаёмы ўсміхаецца профіль.

Клёны сыплюць на дол
Кроплі-пацеркі слёз,
Ноч губляе ў красе павалоку.
Хтосьці ціха ўзмахнуў
Белай пасмаю кос,
І замерлі нясмелыя крокі.

Хтосьці лёгкай хадой
Адышоў ад акна
І пастукаўся ў дзверы ізноўку.
Дзверы я адчыніў,
Уваходзіць Яна
Ў кволых строях чарнявага шоўку.

Вочы —
              ўсмешкі вясны,
Думы —
              гоман крыніц;
Льну палойкі —
                            бялявыя косы.
Зоры-знічкі ў душы,
Ў сэрцы іскры-агні
І такая чароўная постаць...

— Я прыйшла прывітаць
Гэты сённяшні дзень,
Залатыя шумлівыя нівы...
Я прынесла дары —
Кветкі светлых надзей,
Я развею тугу і маўклівасць...

Я —
    Мадонна красы,
Ты —
    Паэта-тварэц;
Я —
    Эмблема жыцця
Й прыгажосці...
Я прыйшла да цябе,
Каб душою гарэць,
Каб уславіць парыў маладосці.

О, як хочацца жыць,
Упівацца красой,
Ў моц краіны мне хочацца верыць.
...І бясшумнай хадой
Адышла й, нібы сон,
Прычыніла кляновыя дзверы.

Той жа ціхі пакой.
Я сяджу за сталом,
Прад вачыма разгорнуты Гётэ.
...Ноч губляе ключы,
Лебядзіным крылом
Адганяе тугу і самотнасць.

* * *

Зіма... І золкія завеі...
Дарогі снегам замяло.
Таполі ў наквецці сівеюць,—
І нікнуць боты за сялом.

Як здані, белыя бярозы
Да болю журацца ў прастор.
На іх сузорныя марозы
Чароўны выткалі узор.

Нямая бель... Гаі... Дубровы...
Маўчаць за возерам стагі,
Згубілі вербы каляровасць,
А там... снягі... снягі... снягі...

Які прастор... Ў прасторы іней...
Я сам не ведаю чаму,—

Люблю аснежныя раўніны
І беларускую зіму!

Зіма!.. Зіма!.. Ў палях туманы...
Нервова плачуць палазы.
Бялеюць сонныя паляны
Ў завеях дзікае красы.

Ў далінах ноч... Імчацца коні...
А бомы ўсхліпваюць да слёз.
Ў такім аснежаным разгоне
Не страшны замяці й мароз!..

Не спі, хурман!.. Спявай «Каліну»!..
(Там скора хутар за сялом.)
Я ўспомню любую дзяўчыну
І вочы чорныя без слоў!..

Ах вочы... вочы!.. Што за вочы!..
Такіх вачэй ты і не сніў.
Заглянеш раз... Заглянеш двойчы...
І погляд згасне ў глыбіні...

На дне, дзе слёзы снегавыя,
Як чыстай моладасці смех,
Як зоры смугла-залатыя,
Ў дакорах сыплюцца на снег.

Бо зоры гаснуць, дагараюць
Пад кволай наквеццю брывей...
Кармэн — цыганка маладая!..
Не знаў я гэтакіх вачэй!..

Ах, вочы!.. Вочы!.. Што за вочы!..
Пад смехам палкія ў іх сны.
Цыганскай гордасці дзявочай
Да краю поўныя яны!..

Ў іх знойдзеш сум... Ў іх знойдзеш думы...
Загубіш плач!.. Адчуеш смех!..
Я ў тых вачах глыбока-ўдумных
Кахання тайну зразумеў!

Я зразумеў... Таму й дзіўлюся,
Што ў снежнай наквеці душы

Ніколі сэрца не прымусіш
Красу і гордасць патушыць!..
. . . . . . . . . . . .
. . . . . . . . . . . . .
Ў далінах ноч... Імчацца коні...
А бомы ўсхліпваюць да слёз.
— Не спі, хурман... У такім разгоне
Не страшны замяці й мароз!..

## ТРЫЯЛЕТЫ

Як струны звонкія цымбалаў,
У сэрцы песня зазвінела
І змоўкла ў лузе анямелым,
Як струны звонкія цымбалаў.

Яна у думках зарунелых
Расою ранняй не апала...
Як струны звонкія цымбалаў,
У сэрцы песня зазвінела.

* * *

Чаго ты плачаш апаўночы?
Слязьмі, як росамі крыніц?
Яшчэ у красках твае дні,
Чаго ж ты плачаш апаўночы?

Лепш смутак песняй адгані,
Калі цвітуць зарою вочы...
Чаго ты плачаш апаўночы?
Слязьмі, як росамі крыніц?

## У НЯДЗЕЛЮ

У нядзелю рана,
Яшчэ сонца спала,
Маці выпраўляла:
— Ой, ідзі, сыночак,
Барані ты волю!
. . . . . . .
Плакалі у полі
Стромкія таполі,
Ды гаі драмалі
Ў вераснёвым смутку.

Стыне кроў у жылах,
Грудзі жалем скуты.

І з вачэй пахмурных
Падалі слязінкі,
А ў палях дарожкі,
Беглі пуцявінкі.

Беглі ды знікалі
У густым тумане.
Пад вярбою ў полі
Ўспомніла Мар'яна.

— Помню, як учора
З торбачкаю зрэбнай
Ты ганяў каровы
Раніцою срэбнай,

Раніцою роснай,
Ты ж і не журыўся,
Як на дол-пракосы
З твару пот сачыўся.

А цяпер — сягоння
Выпраўляю сына.
Гнецца над ракою
Тонкая каліна.
— Дык ідзі, сыночак,
Барані ты волю.
. . . . . . . . .
Плакалі у полі
Стромкія таполі.

* * *

То не гул завірухі мяцежнай
І не рокаты ўпартага мора,—
Гэта Нёман разліўся бязмежна
На грудзях Беларусі прасторнай.

Чую песні стыхіі-разводдзя,
Не стрымаць твае вольнае плыні!
Упусціла старое паводдзе,
Калі вір маладога нахлынуў.

І шумяць аграмадзіны-крыгі,
Разганяюцца ўдаль безупынна!..
Анямелі мінулага ўздрыгі
Ў хвалях жыцця магутна-няспынных.

О, бурліва-кіпучыя хвалі!..
Вам не страшны пажар навальніцы;
У прыгожа люстраныя далі
Разам з вамі і мне не спыніцца.

Адпіхнуўшы ад берага човен
І махаючы прысам кляновым,
Я плыву,— і надзеяю повен,
Што спаткаю сусвет вольна-новы!

* * *

Плакалі ветры ў дуброве параненай,
Плакалі ў лузе шаўковым.
Помніш ты першае наша спатканне?
Плакалі ветры ў дуброве.

Вольна кацілася песня вясновая,
Ёй у грудзях было цесна!..
Смела, свабодна да светлага, новага
Вольна кацілася песня!

Плакалі ветры, ў дуброве галосячы,
Плакаў і бор смуглабровы.
Помніш ты наша спатканне увосень?
Плакалі ветры ў дуброве...

## УЛАДЗІМІР ХАДЫКА
## (1905—1940)

Уладзімір Хадыка нарадзіўся ў вёсцы Цітва Пухавіцкага раёна. У 1923 г. ён скончыў агульнаадукацыйныя курсы ў Мінску і некаторы час працаваў настаўнікам. Быў членам аб'яднання «Маладняк». З 1929 г. паэт жыў і працаваў у Мінску.

Першы зборнік У. Хадыкі «Суніцы» выдадзены ў 1926 г., а найбольш важкае з напісанага паэтам прыпадае на пачатак і сярэдзіну трыццатых гадоў.

Паэт пражыў кароткае жыццё, аднак дзякуючы пры-

роднаму таленту ён нямала зрабіў для развіцця беларускай паэзіі. Увесь свой нялёгкі паэтычны шлях, які ён паспеў прайсці ад «маладняко́ўства» да адкрыцця ў сабе і ў жыцці ўласна-лірычнай тэмы, ён даверыў сваім вершам.

Пры жыцці паэта былі выдадзены яшчэ два зборнікі яго вершаў: «Выбраныя вершы» (1932) і «Радасны будзень» (1935), у якіх ён імкнуўся авалодаць грамадзянскай тэмай.

Значнае месца ў творчасці У. Хадыкі займалі пераклады на беларускую мову твораў вядомых аўтараў рускай літаратуры. Ім былі перакладзены творы М. Горкага — «Песня пра Буравесніка», п'есы «Мяшчане», «На дне», «Чалавек», «Дачнікі», «Дзеці сонца», «Варвары» і іншыя. Акрамя таго, у перакладзе У. Хадыкі загучалі на беларускай мове раман К. Гарбунова «Ледалом», кніга выбраных твораў У. Бахмеццева «Людзі і рэчы» і раман М. Шолахава «Ціхі Дон».

* * *

Дрыжыць, калоціцца дрыгва,
Грыміць у злосці лютай захад.
Застыла спуджана трава,
Не можа зрушыцца ад страху.

Ў лазе зялёная рака
Палошча белае вятрыла...
І хмара — думка ветрака —
На крыллі голаву схіліла.

З даліны вечар — хмуры дзед —
Нясе бярэма дробных хатак,
У прысак сонечны кладзе
Зара блакітавы аплатак.

Павіс над полем чорны дым,
Прастромлены агнём маланак,
Напорнай мклівасцю хады
Ўзыходжу я на зорны ганак.

На доле кінуўшы журбу,
Гару адтуль ў трывожным русе
Ад музыкі мяцежных бур
Над новым полем Беларусі!

* * *

Я доўга і ўпарта марыў
Скрух вечных разгадаць цыб'ё.
Пад шкло вучоных акуляраў
Жаданне трапіла маё.

Мой век, выразнасцю працяты,
Узяў з вялікай кнігі кніг
Перыяду свайго пачатак,
Трывогу будняў маладых.

Узброенага часу скутак
На атайбованых слядох...
Пад дзён сваіх іржавым путам
Не ведаў славы скамарох.

Знайшла на могілках паданняў
Знябытая туга свой кут.
Гадованы я новым дбаннем
Пра даль на маладым вяку.

І жарт мой, порахам пракуран,
Не можа смехам не згадаць
Натуру караля Батуры,
Калі смяяцца не шкада.

* * *

Абрысы старадаўняй пушчы,
Святую смагу баек там
Нутром на попел пературшчу,
Змяшаю з друзам папалам.

Ўскапаю дзедаўскі дрывотнік,
Па каліву перабяру...
І што не змог народ нямотны —
Я да канца дагавару.

Праз грані дум прайду у негаць
Прыгонных продкаў, курных хат...
За ўласным ценем мне не бегаць,
Не зводзіць вершамі дзяўчат.

Залёты, што былі дагэтуль,
Пазбаўлены свайго кутка...
Прыдумаць дру́жыну паэту
Цяжэй, як вобраз для радка.

Не схілены на ласку, сорам
Замрэ ў ладах натхнёных струн,—
Тады ніякім загаворам
Не збыць паэзіі каўтун.

Ды лепш змагацца з невядомым,
Ісці благому насустрэч.
Я сон знайду, я буду дома,
Як спыняць рух вужакі рэк.

Зляту на сухазем'е лістам —
Ўладар начэй і дзён ўладар.
Вятры на горле галасістым
Прагоняць вір крыві і хмар.

Тады сваіх здабыткаў кайстру —
Што не дабраў, што стойваў сам,—
Я перадам другому майстру,
Другому сэрцу перадам.

## МІХАСЬ ВАСІЛЁК
## (1905—1960)

**Васілёк — такі літаратурны псеўданім Міхася Восіпавіча Касцевіча. Нарадзіўся ён на Скідзельшчыне ў вёсцы Баброўня. Бацька служыў лесніком. Гады дзяцінства прайшлі ў роднай вёсцы. З набліжэннем імперыялістычнай вайны сям'я эвакуіравалася спачатку ў Казанскую, а пасля ў Саратаўскую губерню. Маці памерла ад сухотаў у першы год бежанства. Неўзабаве сям'я вяртаецца ў родную вёску. Вучыцца Міхасю давялося толькі ў эвакуацыі, дзе ён скончыў сярэднюю школу. Працаваў на гаспадарцы.**

**Друкавацца М. Васілёк пачаў з 1926 г. у прагрэсіўных заходне-беларускіх выданнях. Першы зборнік паэта, выдадзены ў 1929 г., быў канфіскаваны паліцыяй. Такі ж лёс чакаў і другую кнігу маладога паэта.**

У 30-я гг. паэт прымае ўдзел у рабоце Літаратурнага фронту рабоча-сялянскіх пісьменнікаў Заходняй Беларусі. А ўлетку 1939 г. ён быў мабілізаваны ў польскую армію, у гэты ж год трапіў у нямецкі палон, але ўцёк адтуль у жніўні 1941 г. У гады вайны быў сакратаром падпольнага камітэта антыфашыстаў, выступаў у друку пад псеўданімам Язэп Гром.

У пасляваенны час Міхась Васілёк стаў прафесійным пісьменнікам і да апошніх дзён свайго жыцця працаваў з моладдзю на пасадзе літаратурнага кансультанта ў газеце «Гродзенская праўда».

Выйшлі яго кнігі «Выбраныя творы» (1955), «Зоры над Нёманам» (1963), «Вершы» (1973).

Памёр Міхась Васілёк на Гродзеншчыне.

* * *

Што плачаш, песня?  
Дні нядолі  
Цябе стамілі і змаглі?  
Звіні бадзёра, слёз даволі —  
Сын мазаля я і раллі!

Пакінь ты з сумам і трывогай  
Глядзець нясмела навакол  
І ападаць жыццю пад ногі,  
Як пажаўцелы ліст на дол...

Не плач, ужо да шчасця мэту  
Даўно мы ўбачылі ўдалі...  
І для таго я стаў паэтам,  
Каб веру ў сэрцах распаліць!

Каб заклікаць на бітву смела  
За лёс, за светлую пару,  
Каб прыгажэла, багацела  
Радзіма — маці-Беларусь!

## ТАМ КРАІНА МАЯ

Там, дзе высяцца стромкія хвоі,  
Дзе бярозы лісцём шапацяць,  
Дзе знаходжу спачынак душою,  
Як вясной зацвіце сенажаць,—  
Там краіна мая.

Дзе ў бары маё сэрца вітае
Вольных птушак нямоўкнучы хор
І плыве ноччу з водарам мая
Салаўіная песня да зор,—
Там краіна мая.

Дзе у сонечных, шчодрых праменнях
Расцвітаюць бары і палі,
А вячэрнія, ціхія цені
Шэпчуць казкі між сонных галін,—
Там краіна мая.

Дзе на нівах, слязою палітых,
Горкім потам у спёку паўдня,
Да грудзей прытуляючы жыта,
Пяе песню нядолі жняя,—
Там краіна мая.

Дзе ад здзеку, бяды і няволі
Цяжка стогне матуля-зямля,
Дзе народ наш да лепшае долі
Пракладае упэўнена шлях,—
Там краіна мая.

## ЗА ПРАЦАЙ

Праца цяжкая...
На рукі мазольныя гляну свае —
І сіл прыбывае.
Ўзрадуйся, сэрца, сонца ўстае!
Сустрэнь яго чыстым вясновым блакітам,
Напеўныя струны насустрач крані ты.
О светлае сонца, о радасны май!
Вітаю цябе я, сын працы — ратай.

Гэй, коні!..
Прысталі?
Ну, што ж, супачыньце, а я запяю,
Паслухайце ж, далі,—
Душу я вам песняй адкрыю сваю...

І вольная песня мая палілася,
Ў бары адгукнулася, к небу ўзнялася!
Тварыў яе рання чароўны спакой,
Вясняныя краскі, бунтарны настрой.

А з-за высокага цёмнага бору,
Святлом заліваючы межы, разоры,
Спакойна ўставала магутнае сонца,
Свяціла надзеяй пакутнай старонцы.

## ВІХОР

Свішча вецер, глуха стогне,
Завывае ля дамоў,
То суцішыцца, прыглохне,
То ўсходзіцца ізноў.
Стогны роспачы чуваці,
Стогне вецер у бары,
Бы па сыну плача маці,
Пахаваўшы без пары.

Раздаецца рогат дзікі,
Жудасны, страшэнны смех —
Граюць д'яблавы музыкі,
Рве салому з бедных стрэх.

Вецер мчыцца у прасторы,
Узнімае снег сцяной,
Нібы пену хваль на моры
Неспакойнаю парой.

Гэй, віхор, віхор магутны,
Ты не траць дарэмна сіл,
Лепш астрожны мур пакутны
Здрузгачы і разнясі!

Там сядзяць браты-героі,
Што пачулі веснаход,
Там сядзяць арлы-героі
За свабоду, за народ!

## ОЙ, НЕ ВЕЧНА...

Эх, пакінь, жыццё, даволі!
Чым я вінен прад табой?
Можа, тым, што лепшай долі
Жду збалелаю душой?

Тым, што з гора праклінаю
Я, пакутнае, цябе
І часамі знемагаю
У няроўнай барацьбе?

Мо таму цярпець я мушу,
Што аддаць заўжды гатоў
Я няскораную душу
За зняволеных братоў?

Дык пакінь, жыццё, даволі!
Ці ж не хопіць гэтых мук,
Ран глыбокіх ад нядолі,
Крыўды горкай і дакук!

Ой, не вечна ж гэтым хмарам
Цемрай дыхаць — да пары!
Згоніць сонца цені з твараў,
Сэрца ласкай азарыць...

## СЯРГЕЙ НОВІК-ПЯЮН (1906—1994)

Сяргей Міхайлавіч Новік-Пяюн нарадзіўся на Нясвіжчыне ў вёсцы Лявонавічы. З дзяцінства цягнуўся да навукі, быў вельмі назіральным хлопчыкам, якога вабіла прырода. У 1924 г. скончыў Нясвіжскую гімназію, а праз два гады — беларускія настаўніцкія курсы ў Вільні. Пасля заканчэння настаўніцкіх курсаў працаваў у Лявонавічах, дзе арганізаваў вядомы Лявонавіцкі народны хор, беларускую школу.

Першы верш «Ой, званы» напісаны ў 1926 г. С. Новік-Пяюн пісаў п'есы для дзяцей, вершы. Яны змяшчаліся амаль у кожным нумары часопіса «Заранка», які рэдагавала Зоська Верас. Друкаваліся таксама і малюнкі Новіка-Пяюна пад псеўданімам Малады Дзядок. У канцы 20-х — пачатку 30-х гг. пад гэтым жа псеўданімам выйшлі дзіцячыя п'есы «Ёлка Дзеда Мароза», «Цудоўная ноч», «Пакой у наймы», «Прадка пад крыжам».

Паэта, на жаль, не мінула рэпрэсія. На высылках пісаў вершы, якія не меў магчымасці запісаць на паперы, таму запамінаў іх, каб пасля аднавіць на паперы. Складаў песні, якія прынеслі яму папулярнасць. Асабліва

любімаю стала песня «Зорачкі», якая спявалася не толькі вязнямі Сібіры, але была папулярная на радзіме і далёка за межамі Беларусі. Не забыта яна і ў наш час. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны паэт зведаў фашысцкую няволю: спачатку — слонімская турма, потым — калдычэўскі канцлагер, славуты сваёй жорсткасцю. У час акупацыі С. Новік-Пяюн напісаў вершы, у кожным з якіх — асабістыя ўражанні і перажыванні.

У 1934 г. выйшаў зборнік паэзіі «Заўсёды з песняй».

## ЗОРАЧКІ

Дні праходзяць, дні адходзяць, дні лятуць,
Быццам хвалі рэк бурлівых ўдаль бягуць,
Трэці год ўжо на выгнанні ў чужыне
Трэба мучыцца душой і сэрцам мне.

Навакол нідзе не ўгледзіш родных хат,
Не працягне рук зычлівы родны брат,
Не падзеліш нават думак ні з кім тут,
Не прыгорне ў адзіноцтве родны кут.

Ўночы зорачкі прыветліва мігцяць,
Быццам з неба на мяне яны глядзяць,
Што чуваць, скажыце, зорачкі, вы мне
Ў маёй роднай ды далёкай старане?

Ці татулька і матулька мае спяць?
Ці таксама на іх зорачкі глядзяць?
Мо й яны пытаюць зорак аба мне,
Што раблю цяпер ў далёкай чужыне?

Калі толькі мае родныя не спяць,
Калі йшчэ цяпер на зорачкі глядзяць,
Занясіце ім, пакуль не бліснуў свет,
Зоркі мілыя, сыноўскі мой прывет!

І скажыце, каб не плакаў ні адзін,
Што ў выгнанні мусіць мучыцца іх сын!
Прыйдзе, прыйдзе да нас хутка ясны май,
Прыляту тады, як птушка, ў родны край.

З новай верай, з новай сілай зажывём,
Беларускі гімн свой родны запяём,

Гэты гімн, як гром, памчыцца ў аблакі —
Ўсе пазнаюць, што ўжо вольны бедакі.

Сонца з неба будзе край наш саграваць,
Беларусаў ўсіх да працы прабуджаць,
Беларускай песні роднае пад тон
Заарэм мы і засеем свой загон.

Ўночы будзем мы на зоркі паглядаць,
Што, як сёння, ў небе будуць зіхатаць...
Занясіце ж вы, пакуль не бліснуў свет,
Зоркі мілыя, бацькам маім прывет!

## КАЗКА

У небе срэбнаю касой
Прарэзаў месяц хмуры-хмары,
І паліліся паласой
На дол загадкавыя чары.

Бліснула ў возеры вада,
Як шкло, пры месяцавым ззянні,
І салавейкаў чарада
Распачала свае пяянні.

Лясун заенчыў у бары,
У такт з ім — совіны чароды.
Да самай ранічнай зары
Русалкі водзяць карагоды.

Бо покі срэбнаю касой
Спрэс рэжа месяц цёмны хмары,
Ліюцца сіняй паласой
На дол загадкавыя чары.

## ЖЫЦЦЁ

Шкада мне дзён дзяцінных,
Юнацкіх жаль мне дзён,
Якія марна гінуць,
Як сон, як сон, як сон.

Калісь між косаў сонечных
Без думак і клапот

Шчасліва дні і месяцы
Плылі мае ўпярод.

Нішто не верне прошласці! –
За днямі дні бягуць,
Як хвалі мора бурныя,
Удаль плывуць, плывуць.

Ах, сумна, адзінока
Жыццё маё бяжыць,
Удзень, увечар, зрана
Кудысь спяшыць, спяшыць...

### ЗІМА

Зіма сярдзітая з марозам,
З завеяй белаю прыйшла,
Дыван прыгожанькі, сняжысты
Да нас з паўночы прынясла.

З-за хмарак выпаўз ціха месяц,
Збірае зоркі ў карагод,
І заблішчэлі, як брыльянты,
На дрэвах іней, снег і лёд.

Ці то ад іх, ці то ад зорак,
Ды відна стала, як удзень,
А шэранькія хаткі вёскі
На белым снезе, нібы цень.

## АЛЕСЬ САЛАГУБ
## (1906—1934)

**Алесь Салагуб — адзін з вядомых заходнебеларускіх паэтаў 20-х гг. Нарадзіўся ён у вёсцы Зарудзічы непадалёк ад Смаргоні. Улюбёны ў родны край, у яго паданні, легенды, народную паэзію, прагны да ведаў юнак з 1922 па 1927 г. вучыцца ў Віленскай беларускай гімназіі, бярэ актыўны ўдзел у барацьбе за свабоду беларускага народа. За рэвалюцыйную дзейнасць двойчы (у 1924 і ў 1927 гг.) быў зняволены ў віленскай турме Лукішкі. Створаныя за гэты час вершы Салагуба, якія ён пачаў пісаць у 1924 г., выйшлі асобнай кнігай у 1929 г. у Мінску пад агульнай назвай «Лукішкі». Пафас іх складае**

ўзнёслая мара пра светлую будучыню народа, загнанага Польшчай за «краты». Для стварэння ў вершах адпаведнага ідэйна-пачуццёвага настрою А. Салагуб, добры знаўца фальклору, часта карыстаецца выяўленчымі сродкамі вуснапаэтычнай творчасці. Акрамя вершаў, паэт піша апавяданні, п'есы. З празаічных твораў найбольшую вартасць мае «Лукішскі дзённік», які ён вёў у 1927 г. Тут яскрава адлюстраваны турэмны побыт, дадзены выразныя характары многіх вязняў, палымяных патрыётаў-беларусаў. Паэт пісаў і сатырычныя творы, якія падпісваў псеўданімам Лявон Чачотка.

З 1928 г. А. Салагуб жыве ў Савецкай Беларусі, вучыцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, які заканчвае ў 1931 г., пасля паступае ў аспірантуру пры Акадэміі навук. Адначасова займаецца літаратурнай працай. Як літаратуразнаўца і крытык, ён даследаваў заходнебеларускую літаратуру, надрукаваў некалькі грунтоўных артыкулаў. У зборніку «Сцягі і паходні» (1965) змешчана нізка вершаў паэта. Творчы шлях Алеся Салагуба быў перапынены арыштам і высылкай у 1934 г.

## ВОСЕНЬ У АСТРОЗЕ

Не свіргочуць ластаўкі над акном астрожным,
Пошчак салаўіны змоўк, прыціх, замёр...
Толькі ліст пажоўклы зашуміць трывожна,—
Дроту тэлеграфнага чуцен перабор...
Лета адкацілася дзесь удаль упрочкі,
Да вясны замкнулася вузкае акно.
Я адзін самотны буду цёмнай ночкай
Аб краіне роднай сніць чароўны сон.
Не забыць мне волю, сенажаць, пакосы,
Каласоў нашэпты, песні верацён...
Як забыць мне цяжка маці роднай слёзы,
Першае каханне маладняцкіх дзён.
Не свіргочуць ластаўкі над акном астрожным...
Лета ўлятнілася, адплыло ў нябыт.
Толькі сэрца б'ецца радасцю трывожнай.
Веру! Засмяецца мне вясной блакіт.
Нас не зломіць цемра, сіла капітала —
Мы гартуем волю на граніт і сталь,
Каб істота наша хараством зіяла,
Каб штодзень святлейшы быў наш ідэал.
У грудзях іскрацца, зіхацяць праменні
Веры і надзеі ў сонца і святло.

Веру, не змарозяць краты і камені
Сэрца, што так верыць у праўду і дабро.

* * *

Я не буду грудзьмі надрывацца,
Што юнацтва праводжу ў турме:
Яшчэ воля ўсміхнецца і мне,
Яшчэ гімн я злажу і вясне,
Яшчэ буду і жыць і змагацца —
Не ў турме, не ў турме!

Цяжкі сон Беларускай старонкі
Уцячэ на лясы і бары.
Разнясецца жалейкі тон звонкі,
Запяюць дудары-песняры.

Дзірваноў неараныя гоні
Будзе трактар жалезны лупіць,
Аўтабусамі зменяцца коні,
У раскошных жытах край патоне,—
Дык ці ж варта журыцца і ныць?

На падвалінах моцных граніту
Стане новага ладу харом.
Будзе поўна прастору-блакіту
Пралетарскім стварцом-дударом!

## А ХТО Ў ПОЛІ?..

А хто ў полі рана пагукае,
А хто поле рана абуджае?
Во ці лебедзі, во ці сокалы
Абудзілі прастор, даль шырокую?
Ці аўсы-жыты спелым коласам
Так гудуць-шумяць людскім голасам?
Ці бароў густых задуменны шум
На палі-плугі ды навеяў сум?

Ой, не лебедзі, ой, не сокалы,
Не бароў густых задуменны шум —
Абудзілі прастор, даль глыбокую
І навеялі на краіну сум.
За высокі мур, з цэглы складзены,
За жалезныя перакладзіны —

Павялі сыноў — льецца ціхі стогн —
Мчыцца ціхі стогн з па-за крат-акон.

Не шуміць там бор ды не шастае,
Не відаць з акон сонца яснага,
Не шуміць жытцо спелым коласам,
Не пяе жняя поўным голасам.
Не бадыль сухі к долу хіліцца,
Аб асфальт-сцяну б'е патыліцай.
Бы падрэзаны ды касой чарот,
Смягне там ратай малады з сухот...

Ой, не чуць яму слоў пяшчотлівых,
Ой, не сніці сноў бесклапотлівых.
Дзе глядзяць цяпер вочы ясныя?
Дзе падзелася доля шчасная?
Дзе гамоніць ноч ды з сасонкамі,
Дзе бурляць, не спяць хвалі Нёмана
Ў ночы летнія, ночы цёмныя?

## АЛЕСЬ ЗВОНАК
## (Нарадзіўся ў 1907 г.)

**Алесь (Пётр Барысавіч) Звонак нарадзіўся ў Мінску ў сям'і муляра. У сувязі з прызывам бацькі ў дзеючую армію ў першую сусветную вайну некалькі гадоў выхоўваўся ў дзіцячым доме, пасля батрачыў, працаваў падмайстрам на мулярцы, вучыўся. Жывучы ў змрочных падвалах на ўскраіне Мінска, ён змалку пазнаў цяжкую працу, каб здабыць свой кавалак хлеба. Алесь Звонак вучыўся спачатку ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, потым у Маскоўскім універсітэце, у аспірантуры Акадэміі мастацтвазнаўства ў Ленінградзе.**

**У 1925—1927 гг. Алесь Звонак працаваў адказным сакратаром газеты «Чырвоная Полаччына», узначальваў полацкую філію «Маладняка», пазней у рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва», на геалагічных аб'ектах поўначы.**

**З вершамі ў друку Алесь Звонак выступіў у 1925 г., а ў 1926 г. разам з Я. Бобрыкам і Я. Туміловічам выдаў зборнік «Пунсовае ранне». Неўзабаве з'яўляюцца новыя кнігі вершаў: «Буры ў граніце» (1929), «Каршун» (1930), «Загай» (1931), «На лінію агню!» (1932), «Мая Радзіма» (1935), «Табе адной» (1957), «Запаветнае» (1961), «Россып» (1967), «Прадчуванне» (1974), «Санеты» (1982).**

**Алесь Звонак актыўна выступае ў галіне крытыкі, драматургіі тэатра і кіно. Творчыя партрэты аб дзеячах сучаснай літаратуры і тэатра сабраны ім у кнізе «Неспакойныя сэрцы».**

**Высока ацэнена перакладчыцкая дзейнасць А. Звонака. Ён пераклаў на беларускую мову творы Ш. Руставелі, М. Някрасава, А. Чэхава, Р. Гамзатава і іншых.**

**Алесь Звонак — патрабавальны майстар мастацкага слова, паэт высокай культуры, якому падуладны і лірычны верш, і паэма, і санет. У сваіх творах ён імкнецца захаваць і развіваць лепшыя традыцыі беларускай паэзіі.**

## ЦЕНЬ ЕФРАСІННІ

Па руінах разбураных келляў,
Там, дзе зеўраюць з трэшчын вякі,
Я спускаўся ў твае падзямеллі,
І спалохана ў пальцах трымцелі
Свечак доўгія языкі...

Пачарнелыя глыбы скляпенняў,
Лабірынты бясконцых хадоў
Праглыналі дрыготкія цені...
Быў, як мудрасці сімвал нятленны,—
Сцёрты надпіс далёкіх гадоў.

Сустракалі нявётліва госця,
Не ўставалі з сатлелых грабніц
Мудрых продкаў пажоўклыя косці...
А жылі ж, праклiналі кагосьці,
Перш чым пасці закутымі ніц.

Пахла воскам у прыцемку сінім.
І здавалася, з дна тайнікоў
Свецяць вочы Вялікай Княгіні...
Гэта здань твая, Ефрасіння,
Мільганула з глыбінь вякоў!

* * *

Плывуць над полем журавы
У далеч сінюю без краю...
І водбліск дня яшчэ жывы
Зарой вячэрняй дагарае.

Плывуць... І след іх чарады
Знікае ў змроку чарнахмарным...

Вось так юнацкія гады
Сплылі, патрачаныя марна...

Мне сон ружовы ваш знаём
І абуджэння буйны галас...
Юнацтва светлае маё,
Цябе даўно чакае сталасць!..

Хоць і шкадую — дагарай,
Юнацтва ранак, светлавокі!
Мой родны край, зялёны край
Чакае дзей і спраў высокіх!

Хай жураўлінай чарадой
Гады плывуць між хмарак срэбных,
Праз пыл дарог, гушчар гадоў
Мы шлях у Заўтра працярэбім...

* * *

Асенні холад, стынь і бездарожжа.
Як не прыстаць?
Як не дрыжаць у вечар непагожы
Лістам?

Туман і дождж, і восеньскае слоты
Курыцца дым,
І сыплюць, сыплюць лісцяў пазалоту
Сады.

О вобраз восені! О вобраз адцвітання!
Крані і згінь!
Мне халадок бадзёрага світання
Пакінь.

Крані рукой сваёй усход праменны,
Ясноту дум!
Свой ясны шлях пад шум вятроў асенніх
Знайду!

Ускалані душу крыві прылівам,
Пачуццяў бунт,
Як навальніцы буйныя парывы
Вярбу!

Хай белы дзень адзене снегам чыстым
Зямлю маю.

Яе красу і поступ урачысты
Пяю.

Часы падзей нястрымнай чарадою
Ідуць, ідуць...
І ніці светлыя для срэбнага сувоя
Прадуць...

## ДЗВІНА

Дзвіна, Дзвіна!
Люблю ў імгле вячэрняй
Павольны ўсплёск
Тваіх гуллівых вод!
На берагах зялёнашумны чэрвень
З табой шапоча роснаю травой...

Дзвіна, Дзвіна!
Хадзілі плытагоны,
З журботнай песняй
Гналі ўдаль плыты,
Ты ратавала вольніцу з прыгону,
Была ім роднай мацеркаю ты!..

Дзвіна, Дзвіна!
Дажджы і непагоды
Хадзілі часта берагам тваім,
Грымелі ўвесну грозна крыгаходы,
Лясных пажараў слаўся горкі дым...

Дзвіна, Дзвіна!
З высокай стромкай кручы
Глядзіцца сонца ў жвірыстае дно,
А час імчыцца хваляю бягучай,
А свежы вецер дыхае вясной...

Дзвіна, Дзвіна!
Табой зачараваны,
Стаю і бачу,
Як вядуць чаўны
У доўгі шлях
Да сонечнага рання
Рукамі смелымі твае сыны...

Шуміць вада,
Сінее цёплы чэрвень,
Губляе золата ў раку заход...
Дзвіна, Дзвіна!
Люблю ў імгле вячэрняй
Прыветны ўсплёск
Тваіх празрыстых вод!

## ФРАНЦІШАК КАРАВАЦКІ
## (Нарадзіўся ў 1907 г.)

Францішак Казіміравіч Каравацкі нарадзіўся ў фальварку Каладзянка Свірскага павета Віленскай губерні, які належаў пану Скірмунту, у сям'і парабка. У 1923 г. сям'ю Каравацкіх пан прагнаў за непавагу да сябе. На працягу некалькіх гадоў ёй прыйшлося батрачыць у розных вёсках, каб зарабіць на жыццё.

Вось як піша пра гэта ў сваіх нататках Ф. Каравацкі: «Мы пачалі сям'ёй батрачыць на «запашках» як палавічнікі*, 1923—24 гады ў вёсцы Яневічы, 1925—27 — у фальварку Зоўчына Шаматоўскай гміны, 1927—29 — у фальварку Маліnaўка Кабыльніцкай гміны, 1929—31 — у засценку Балашы той жа гміны...»

У 1925 г. Ф. Каравацкі ўступіў у польскую Незалежную сялянскую партыю.

Першы верш на беларускай мове паэт склаў у пастаўскай турме. Гэта быў своеасаблівы заклік да барацьбы за вызваленне Заходняй Беларусі. У 1929 г. Каравацкага засудзілі на 9 гадоў па палітычных матывах. Пакаранне ён адбываў у віленскай турме на Лукішках. Але паэт не перастае складаць вершы. Піша ён на дзвюх мовах, аддаючы перавагу беларускай. Тут жа, у турме, Каравацкі стварыў шмат вершаў, на якія пазней была напісана музыка, і яны сталі папулярнымі песнямі. З-за рэвалюцыйнага зместу яго песні, як ананімныя творы, даводзілася запісваць Піліпу Пестраку і Рыгору Шырме.

Сакрэт даравання Каравацкага заключаецца ў тым, што ён востра адчуваў настрой працоўных людзей, умеў проста і непасрэдна выказваць іх пачуцці ў сваіх творах.

### ГОЛАС З ЛУКІШАК

Глыбокія лёхі*, высокі забор,
Збройная стража на вышках.

Начальнік-пілсудчык і кат-пракурор
Нас жмуць у турме на Лукішках.
    Крывавыя плямы на шэрых мурох
    Чырвонай зарой зіхацяцца.
    Гудзіць збунтаваны лукішскі астрог:
    «Мы будзем за волю змагацца!»
Калоцяць і мораць паганай ядой,
Пайкі раскрадаюць лоўка...
Часамі фунт чорнага хлеба з вадой,
Часамі саўсём галадоўка.
    Крывавыя плямы на шэрых мурох
    Чырвонай зарой зіхацяцца.
    Гудзіць збунтаваны лукішскі астрог:
    «Мы будзем за волю змагацца!»
Паляк, беларус, украінец і жыд
Злучыліся ў стойкай камуне.
Не сцерпім ніякіх зняваг, ні абід,
У морду фашыстам адплюнем!
    Крывавыя плямы на шэрых мурох
    Чырвонай зарой зіхацяцца.
    Гучыць збунтаваны лукішскі астрог:
    «Мы будзем за волю змагацца!»
Увесь палітзэкаў лукішскі атрад —
Галоў не сагнем у няволі.
Не станем пад сценкай «на бачнасць» у рад
Ніколі, ніколі, ніколі!
    Крывавыя плямы на шэрых мурох
    Чырвонай зарой зіхацяцца.
    Гудзіць збунтаваны лукішскі астрог:
    «Мы будзем за волю змагацца!»

## САДОЎШЧЫНА

Садоўшчына — мая радзіма,
Малы засценак з пяці хат.
Чаму назвалі так? Магчыма,
Цвіцеў там продкаў маіх сад?
    Не бачыў я яго ніколі,
    Не каштаваў яго пладоў,
    Толькі адна стаіць у полі
    Старая груша спрадвякоў.
Гэты засценак сэрцу мілы,
Там жыў мой бацька, дзед, прадзед,
Там на пагосце іх магілы,
На полі іхняй працы след.

Крушні каменняў іх рукамі
Насыпаныя на мяжы.
І асаблівы адзін камень
На іх паселішчы ляжыць:
Круглы валун, на верху чорны,
А у дзіры — зялёны мох.
Знаць, рыхтаваў яго на жорны
Мой дзед, ды выкапаць не змог.
Пры ім ляжыць кусочак скалы,
Дубовы скамянелы крук...
Гэта ж і ёсць той след трывалы,
След продкаў мазалістых рук.

## ЭДУАРД САМУЙЛЁНАК
## (1907—1939)

Эдуард Людвігавіч Самуйлёнак нарадзіўся ў Пецярбургу. Бацька яго быў родам з Полаччыны, але працаваў у той час у Пецярбургу. У 1918 г. Людвіг Сцяпанавіч быў мабілізаваны ў Чырвоную Армію, а жонка з дзецьмі вымушана была пераехаць на Віцебшчыну. Неўзабаве гэта мясцовасць была акупіравана белапалякамі. Пасля вызвалення Беларусі ў 1920 г. Людвіг Сцяпанавіч вярнуўся да сям'і. З гэтага часу ён працаваў пільшчыкам, а маленькі Эдуард яму дапамагаў. Ён разам з бацькам хадзіў на заработкі ў бліжэйшыя населеныя пункты.

Вучыўся Эдуард спачатку ў Пецярбургу. Там скончыў пачатковую школу польскай гімназіі. Потым вучыўся ў сямігодцы, але яе не скончыў. Эдуард Людвігавіч Самуйлёнак заўсёды імкнуўся да ведаў, займаўся адукацыяй самастойна.

Першай літаратурнай школай для Эдуарда была газета «Чырвоная Полаччына», дзе з 1928 г. ён працуе селькорам. У гэтай газеце і з'яўляюцца яго першыя творы: нарысы, артыкулы.

Вайсковую службу Эдуард адбываў радавым на аэрадроме ў Смаленску, але неўзабаве ў яго выявілі туберкулёз, і ён быў дэмабілізаваны. У 1930 г. ён зноў працуе ў газеце «Чырвоная Полаччына». Спачатку літаратурным работнікам, пасля загадчыкам аддзела, а з канца 1931 г.— адказным сакратаром рэдакцыі. На працягу ўсёй працы ў газеце Э. Самуйлёнак напісаў шмат апавяданняў і аповесцей. Гэта «Русалчыны сцежкі», «Цагліна казэмата», «Паляўнічае шчасце», «Тэорыя Каленбурн», «Пункт апо-

**ры» і «Герой нацыі». У 1934 г. Эдуард пераязджае ў Мінск, дзе цалкам прысвячае сябе літаратурнай дзейнасці.**

**Творчы кругагляд Эдуарда Самуйлёнка вельмі шырокі, ён шмат чым цікавіўся, і гэта пераходзіла ў яго творы.**

**У маі 1935 г. Э. Самуйлёнак з іншымі пісьменнікамі паехаў на тры месяцы ў Грузію па культурнаму абмену. У гэты час грузінскія пісьменнікі былі ў Беларусі. У выніку гэтай цікавай паездкі з'явіліся творы на грузінскай мове на беларускія тэмы, а ў Беларусі выйшаў раман Э. Самуйлёнка «Будучыня». Гэта быў яго першы і апошні раман. Будучы вельмі хворым, Э. Самуйлёнак скончыў першую кнігу рамана «Будучыня» ў 1938 г. і падрыхтаваў да друку зборнік апавяданняў «Дачка эскадрона». А адразу пасля гэтага напісаў драму «Пагібель ваўка», але яе прэм'еру ўбачыць на сцэне не давялося. Ён памёр, не рэалізаваўшы сваіх планаў і задум, у росквіце творчых сіл. Яму было тады ўсяго трыццаць два гады.**

## УРАЧЫСТАЯ МЕСА

Усё выйшла ад залішняе набожнасці генерала Лопеца, камандуючага калонай. Набожнасць была адной са шматлікіх генеральскіх цнот. Пад тугім, расшытым мундзірам генерал насіў медальён, у якім знаходзіўся талісман, сухая масліная ягадка з Віфліема, і перад тым, як падпісаць чарговы прыгавор, генерал заўсёды цалаваў крыж. Але ў даным выпадку з-за генеральскае благачэснасці здарылася бяда.

Ужо некалькі дзён на сектары генерала Лопеца ішлі ўпартыя баі. Рэспубліканцы націскалі так, што вымушаны былі адысці самыя надзейныя часці, і становішча пагражала катастрофай, нягледзячы на падмацаванні з чужаземнага легіёна. Рэспубліканцы занялі пазіцыі на спадах гор, выбіць іх адтуль не было ніякай магчымасці, бо ў генерала не было авіяцыі. Салдаты генерала Лопеца штодзённа ішлі ў атаку пад незмаўкаемыя громы артылерыйскае кананады з абодвух бакоў, і кожны раз генерал бачыў праз бінокль, як бравыя мараканцы, ахопленыя панікай, натоўпамі бягуць у даліну і шмат з іх застаецца на месцы. Фронт пасоўваўся ўсё бліжэй, грымотнае рэха рэспубліканскіх батарэй сатрасала сцены генеральскай штабкватэры. Рэспубліканцы імкнуліся абкружыць горад, і хаця ў іх таксама не было авіяцыі, поспех быў на іх баку. Прыслухоўваючыся да грознага рэха, што, набліжаючыся, грымела ў цяснінах гор, генерал адну за другой пасылаў

радыёграмы ў галоўны штаб. Генерала мучыла бяссонніца, і калі ўдавалася заснуць, ён бачыў у сне эскадрыллі самалётаў. Яны лёталі над гарамі, і генерал бачыў праз бінокль яркія зарніцы выбухаў па лініі рэспубліканскіх акопаў. Мараканцы ішлі ў атаку, рэспубліканскія байцы пакідалі пазіцыі і беглі натоўпамі, і, націскаючы іх, скрозь па спадах гор узрываліся бомбы, высока ўгару ўзнімаючы зямлю. Але сон, гэта толькі сон, і генерал абуджаўся ад першага ж залпу рэспубліканскай батарэі.

Нарэшце, галоўны штаб прыслаў радыёграму:

«Генералу, камандуючаму калонай. У Ваша распараджэнне высланы тры цяжкія бамбардзіроўшчыкі «Капроні».

Далей генерал не чытаў. Ён, спяшаючыся, расшпіліў мундзір, здабыў медальён і пацалаваў масліну. Дзень пачаўся шчасліва. Ад самае раніцы рэспубліканцы маўчалі. Генерал аддаў патрэбныя загады і разам з ад'ютантам выйшаў у сад.

Неўзабаве пачуўся цяжкі гул. Ён мацнеў з кожнай хвілінай, і хутка генерал убачыў тры вялізныя машыны, што плылі высока ў лазурным небе. Яны прайшлі над горадам, зрабілі разварот і з глухім рычаннем пачалі зніжацца. З-пад крыла вядучай машыны пырснула ракета. Гэта азначала, што камандзір карабля прыняў генеральскі загад аб пасадцы. Генерал загадаў ад'ютанту падаць аўтамабіль. Ён быў усхваляваны так, што не мог спакойна стаяць на месцы, і сам пайшоў следам за ад'ютантам.

На аэрадроме лётчыкі былі прадстаўлены генералу. Разам з імі генерал абышоў самалёты. Ён быў у захапленні. Вялізныя машыны стаялі ў рад, шырока распластаўшы магутныя крыллі. Гулка працавалі маторы, па крыллях гэтых грозных караблёў поўзалі механікі.

Генерал успомніў: некалькі месяцаў таму назад адзін такі «Капроні» на працягу некалькіх хвілін дашчэнту знішчыў шведскі шпіталь у Абісініі. Генерал глянуў на грэбні высокіх гор, дзе былі пазіцыі рэспубліканцаў, і ўсміхнуўся. Потым ён паглядзеў на «Капроні» і нечакана адчуў у сваёй рэлігійнай душы моцны наплыў экстазу. Ён адвярнуўся і аддаў ад'ютанту загад. Камандзір флагманскага карабля нездаволена пацiснуў плячыма. Ён крыху ведаў іспанскую мову, зразумеў, што сказаў генерал ад'ютанту, і лічыў, што генерал сказаў глупства. Камандзір флагмана адышоўся ў бок, зняў свае цяжкія рукавіцы і намацаў пад камбінезонам флягу. Зрэшты, яму добра плацяць, і калі ягоную машыну хочуць пакрапіць святой

вадою, матэрыяльная частка ад гэтага не папсуецца. Да вылету заставалася яшчэ пара гадзін, машыны былі ў парадку, і калі генералу прыспічыла памаліцца, калі ласка!

Генерал паехаў у штаб, ад'ютант званіў у загарадную рэзідэнцыю біскупа, а па астатніх тэлефонах супрацоўнікі штаба запрашалі найбольш паважаных грамадзян горада прыбыць на ўрачыстую месу, якая мела адбыцца на аэрадроме.

Тут патрэбна ўказаць на адну нязначную акалічнасць. Каб генерал ведаў, што рэспубліканцы за паўгадзіны да таго, як прыляцелі «Капроні», занялі загарадную рэзідэнцыю біскупа, зайшоўшы ў тыл яго войскам, яго не ахапіла б такая набожнасць, і «Капроні» даўно былі б у паветры. Але генерал аб гэтым не ведаў, бо сувязь у тылу была дрэнная, рэспубліканцы трымалі сябе пакуль што спакойна, і з гэтага ўсяго, нарэшце, выйшла шмат непрыемнасцяў.

— Патрабуюць рэзідэнцыю біскупа. З штаба калоны,— сказаў баец народнай міліцыі, які дзяжурыў на камутатары.

— Злучай,— адказаў другі і ўсміхнуўся. Ён усміхнуўся таму, што ў біскупскім палацы знаходзіўся штаб атрада.

— Яго эксцэленцыя? — спытаў ад'ютант генерала Лопеца.

— Я слухаю,— без запінкі адказаў начальнік рэспубліканскага атрада (яго эксцэленцыя на тую пару знаходзіцца ў каморы, разам з двума прэлатамі і вікарыем пад надзейнай вартай).— Я слухаю вас!

— Гаворыць ад'ютант генерала Лопеца, камандуючага калонай. Генерал просіць вас, ваша эксцэленцыя, прыбыць на аэрадром і асабіста служыць месу. Акрамя таго, генерал просіць аб цырымоніі хрышчэння бамбардзіроўшчыкаў, якія прыбылі сёння...

— Прызываю на вас бласлаўленне,— адказаў начальнік рэспубліканскага атрада.— Я буду маліць бога, каб ён умацаваў зброю вашу, сын мой... Але, на жаль вялікі, я сам прыехаць не магу... Перадайце генералу, сын мой, што я папрашу айца прэлата... Сын мой, пачакайце хвіліну.

Начальнік атрада паклаў трубку, глянуў на анямелых ад здзіўлення таварышаў, што сядзелі вакол манументальнага біскупскага стала, зрабіў ім знак, каб было ціха, і задумаўся. Ён быў начальнікам перадавога атрада. Яго заданне было трымаць заслону да тае пары, пакуль не па-

дыдзе суседні атрад і яны не злучацца такім чынам з правым і левым флангамі. Тады калона генерала Лопеца будзе акружана. Але начальнік атрада бачыў «Капроні» і ведаў, што гэта азначае. У яго адразу пасля першых жа слоў ад'ютанта ўзнік план. У яго не было магчымасці абсудзіць яго з таварышамі, бо ад'ютант чакаў. Ён вырашыў ісці на рызыку і ўзяць на сябе адказнасць.

— Сын мой! — сказаў начальнік атрада.— Айцец прэлат і два вікарыі прыбудуць на аэрадром, як таго жадае генерал. Хай з вамі будзе міласць боская. Амен.

Начальнік паклаў трубку і звярнуўся да сваіх здзіўленых таварышаў. Ён расказаў ім план. План быў настолькі зразумелым і настолькі смелым і простым, што ён быў прыняты без супярэчанняў. І адразу прыступілі да яго выканання.

— Па-мойму,— сказаў начальнік аднаму з камандзіраў,— ты можаш пайсці за вікарыя. Згодны?

— Згодны! — адказаў камандзір.

Хутка быў знойдзен і другі вікарый.

— Толькі лапы ў цябе занадта мазольныя,— сказаў начальнік.— Ты іх памый і вельмі з імі не вытыкайся.

Затрымка выйшла з прэлатам. Прэлат, па замыслах начальніка, павінен быць таўстым. Такога ён у сваім атрадзе не памятаў.

— Хуан! — раптам успомніў адзін з камандзіраў.— Повар Хуан! Ён служыў у рэстаране ў Мадрыдзе. У яго ёсць нешта падобнае да папоўскага бруха...

— Але ці ёсць у яго адвага? — спытаў начальнік.

— Я думаю,— адказаў камандзір.— Ён два дні карміў атрад пад агнём.

— Давайце сюды гэтага Хуана,— загадаў начальнік.

Хутка з'явіўся Хуан. Гэта быў высокі, немалады чалавек з шырокім нездаволеным тварам. Ён быў нездаволены тым, што яго не пушчаюць у акопы. Байцам падабаюцца яго-ныя абеды, якія ён гатуе з кансерваў і іншых няхітрых прысмакаў, і яго не бяруць у строй. Усе кажуць, што ён добры повар, але Хуан хоча быць страявым байцом. Разноска абедаў пад ураганным агнём у разлік не прымаецца. Ён усё-такі не баец, а повар. Хуан падышоў і стаў па правілах.

— Ты хочаш быць прэлатам? — спытаў начальнік.

— Досыць з мяне і повара! — панура адказаў Хуан. Але калі яму расказалі, у чым справа, Хуан ажывіўся.

— Я паеду! — сказаў ён.— Са здавальненнем паеду.

Толькі вось я не ўмею маліцца. Ніводнага слова не ведаю...

Усе засмяяліся.

— Гэта не важна,— сказаў начальнік.— Табе месы служыць не трэба. Ты будзеш махаць крапідлам. На ўсякі выпадак, пастарайся запомніць пару слоў... Паўтарай: Confiteor Deo omnipotenci... Bentae Maviae... Cemper et virgini...

— Confiteor Deo...— пакорна паўтарыў Хуан,— omnipotenci...

— А цяпер пойдзем у папоўскі гардэроб,— сказаў начальнік.

Праз некалькі часу прэлат і два вікарыі селі ў машыну, і шофер, зашпільваючы на хаду ліўрэю, заняў сваё месца. Шыкарная машына з біскупскімі гербамі выехала з двара рэзідэнцыі і памчала па дарозе ў горад. Рэспубліканскія пікеты яе не затрымоўвалі.

На аэрадроме ўсё было гатова. Супроць флагманскага карабля, пад самым яго агромным носам, быў пастаўлены паходны алтар. Экіпажы «Капроні» былі выстраены пад крылямі. Генерал Лопец стаяў акружаны світай, трымаючы пад руку жонку банкіра. Генерал быў хрэсным бацькам, банкірша — хрэснай маткай вядучага бамбардзіроўшчыка. За імі стаяў натоўп фракаў, цыліндраў і ўсяго астатняга, чым адрозніваюцца паважаныя грамадзяне горада ад іншых людзей. Чакалі ўжо некалькі хвілін. І вось на шасэ з'явілася чорная біскупская машына. Яна павярнула і знікла на завароце. Хутка машына імчала па аэрадрому, і ўсе бачылі біскупскія гербы. Ад'ютант генерала Лопеца падбег і адкрыў дзверку. З машыны выйшлі тры духоўныя асобы. Адзін з патэраў асцярожна нёс срэбнае вядро са святой вадою і крапідла.

— Confiteor Deo,— густым басам сказаў прэлат.— Omnipotenci...

І тады здарылася нечаканае. У першы момант публіка была шакіравана, бо ўсе тры духоўныя асобы пазакасвалі сутаны, і пад імі аказаліся даволі непрэзентабельныя штаны. У наступны момант публіку паралізаваў жах. Патэры, як па камандзе, размахнуліся і... страшэнны ўдар грому пакрыў аэрадром. Полымя ўспыхнула ў зашклёнай гандоле пярэдняга бамбардзіроўшчыка, у паветра паляцелі абломкі, рэха гор паўтарыла цяжкі гул, і не сціх ён яшчэ, як патэры дружна ўзмахнулі рукамі...

Наступныя тры гранаты трапілі ў самы цэнтр анямелага натоўпу. «Капроні» гарэлі яркім полымем. Вялізны слуп

агню ўзняўся ўгару, потым нахіліўся і лізнуў пажоўклую траву аэрадрома.

— Confiteor! — крыкнуў прэлат, кідаючыся да машыны.— Назад! Поўным ходам!

У паніцы і замяшанні ніхто не ўбачыў, куды падзелася аўто з біскупскімі гербамі.

Яе затрымалі толькі на шасэ. Шофер рэзка затармазіў.

— Нашы,— сказаў ён, адварачваючыся да патэраў.

— Нашы,— пацвердзіў Хуан.— Гэта, мусіць, першы батальён.

Па полі беглі рэспубліканскія байцы. Яны ўмомант акружылі машыну.

— Папы! — крычалі байцы.— Вылазьце, даўгаполыя!

Хуан вылез і пачаў знімаць сутану. Пад сутанай аказаўся «маўзер». Потым камандзір, які хадзіў за вікарыя, растлумачыў байцам, у чым справа. Праз момант аўто імчала да біскупскай рэзідэнцыі. Атрад, які ішоў на злучэнне, прыбыў. Горад быў акружаны, і фашысцкая калона сядзела ў мяшку.

Хутка загрымела артылерыя. Ланцугі рэспубліканцаў ішлі з гор проста на горад. Увечары ён быў узяты. Генерал Лопец не бачыў разгрому сваёй калоны. Ён быў забіты ў час урачыстай месы.

## ВАСІЛЬ КАВАЛЬ
## (1907—1937)

**Васіль Пятровіч нарадзіўся ў вёсцы Сава, што на Магілёўшчыне. Сапраўднае яго прозвішча — Кавалёў. Пачатковую адукацыю атрымаў на агульнаадукацыйных курсах у Горках. Вучыўся ў Магілёўскім педагагічным тэхнікуме, потым — на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педфакультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, але не скончыў яго і пайшоў працаваць.**

**Пачаў друкавацца з 1925 г. Уваходзіў у літаратурнае аб'яднанне «Маладняк». Васіль Каваль пачынаў свой творчы шлях з напісання вершаў і лірычных замалёвак. Пісаў таксама і апавяданні, іх характэрная рыса — рамантычна-ўзнёслая вобразнасць і эмацыянальнасць. Гэта можна заўважыць, чытаючы апавяданні «Ноч», «Ліпы», «Нянавісць», «Жніво», «Ілька» і інш. У больш позніх апавяданнях В. Каваль імкнецца да рэалістычнага асэнсавання з'яў жыцця і, што адметна, да паглыбленага псіхалагічнага аналізу**

**(апавяданні «Ноч на моры», «Мацней за смерць», «Шчасце Сілівея Зязюлі»).**

**Выйшлі зборнікі яго твораў — «Як вясну гукалі» (1927), «На загонах» (1928), «Крыніца» (1929), «Выбраныя творы» (1932), «Выбранае» (1959), аповесці для дзяцей «Санька-сігналіст» (1934) і «Следапыты» (1936, 1961).**

## МАЦНЕЙ ЗА СМЕРЦЬ

Сярод асляпляюча белых сцен, у бальніцы, ляжаў, прыкаваны да ложка, чалавек, які пражыў кіпучае, слаўнае жыццё. Яго некалі магутныя грудзі душыў кашаль. Ліпучымі згусткамі, павольна, ён выплёўваў кроў, і здавалася, што ён выплёўвае кавалкі свайго сэрца, некалі пранізанага агнявымі вятрамі чатырох старон Рэспублікі.

За акном у горадзе наступала пышная, радасная, надзвычайная вясна. Яго цягнула да акна, да сонца, але ў апошнія дні ён ужо не мог уставаць.

Па некалькі разоў у дзень да ложка хворага падыходзіў стары лысы вопытны доктар. Праціраючы акуляры і жмурачы блізарукія вочы, пытаў:

— Ну, Мартын Андрэевіч, як мы папраўляемся?

— Папраўляемся, доктар! Без гэтага няможна. Самі ведаеце — вясна! Чуеце, як на дрэвах покаюць пупышкі...— Трымаючыся за сэрца, прабаваў жартаваць Мартын Андрэевіч.

— М-да... Гм-м... Вясна... Пупышкі, кажаце...— гледзячы на тэрмометр, расцягваў доктар.— Вы, Мартын Андрэевіч, гэтае, папраўляецеся, як на дražджах.

— Інакш, доктар, не магу — у мяне старая закваска.

Доктар павольна ківаў лысай пукатай галавою, даваў парады і, мякка шлёпаючы падэшвамі, адыходзіў у кабінет.

Дні для Мартына Андрэевіча цягнуліся марудна: яны былі напоўнены цішынёю і найтанчэйшым пахам лекаў. Тое, чаго ён ніколі не адчуваў на працы — адзінокасці,— цяпер з неймавернай сілай гняло яго ў цяжкія хвіліны.

«Страшна паміраць, не даканчыўшы такое жыццё,— часамі ўначы думалася Мартыну Андрэевічу.— Калісьці смерць глядзела на нас тысячамі вачэй. Мы прайшлі праз агні і — перамаглі. І вось зараз наступае фізічнае разбурэнне тых каморак, у якіх ураганам бушавала кроў».

І Мартыну Андрэевічу думалася аб пройдзеных гадах,

аб сваёй маладосці, якую ён усю аддаў барацьбе, аб няскончанай рабоце...

Досыць часта прыходзілі ў бальніцу хто-небудзь з рабочых сталеліцейнага завода наведаць свайго майстра. Яму расказвалі пра завод, пра навіны, і тады ў Мартына Андрэевіча разгладжваліся каля вачэй маршчынкі і ў пасівелых вусах блукала цёплая ўсмешка. Побач былі блізкія таварышы, з якімі плячо ў плячо праходзіў фронт, не было ні адзінокасці, ні адчування асуджанасці...

Аднойчы дзяўчаты-камсамолкі прынеслі яму першых вясновых кветак, белых як снег і сініх як неба. Маладосць прынесла ў палату вясну. Кветкі напомнілі яму зялёны шум леса і птушыны шчэбет. Яму здалося нават, што ён адужаў...

Пасля гэтага бадай што кожны дзень яму стала прыносіць кветкі сястра-практыкантка Таня. Была яна вельмі маладая, невысокая, з светлымі вачыма і чорнымі кудзеркамі. Бадай што кожны дзень яна ставіла на столік пучок кветак у шклянцы вады і ветліва гаварыла:

— Мартын Андрэевіч, а я вам кветак прынесла...

— Дзякую, дзякую, даражэнькая! — адказваў Мартын Андрэевіч, і цёплыя іскры загараліся ў яго вачах пры поглядзе на гэтую дзяўчыну. Як нейкі даўно забыты вобраз, які пакутна цяжка ўспомніць, як напамінак, стаяла перад ім гэтая дзяўчына.

І калі Мартын Андрэевіч, пакутна наморшчыўчы лоб, асабліва пільна прыглядаўся да яе, Таня ўзрушана закрывала вочы густымі чорнымі расніцамі.

— Хочаце, Мартын Андрэевіч, я вам пачытаю,— гаварыла яна, сядала на крэсла побач і разгортвала недачытаную кніжку.

Таня чытала звонкім прыемным рэчытатывам і зрэдку пазірала на Мартына Андрэевіча, каб пазнаць, ці не надакучыла яму.

Мартын Андрэевіч уважна слухаў, але думаў аб сваім.

Таня не магла разгадаць гэтага яшчэ не старога чалавека, у якога ў чорных валасах быў іней суровай зімы. Яна адчувала, што ён многа перажыў. Яна вельмі ўважліва прыглядалася да яго і чамусьці ніяк не магла загаварыць з ім аб яго жыцці.

Аднойчы Таня спытала ў доктара:

— Скажыце, доктар, хто ён такі?

— М-да... гэтае...— сказаў доктар, выпісваючы нейкі рэцэпт.— Чалавек — гэта гучыць горда! Але прыходзіць

амартызацыя сэрца — і чалавек, гэтае, у «зямлю атыдзешы»... Гэты чалавек, дарагая мая, перанёс горы пакут — катаргу, грамадзянскую вайну, за геройства мае ордэн — і вось прыйшла амартызацыя...

— Скажыце,— перабіла яго Таня,— ён будзе жыў?

Доктар, углыбіўшыся ў мудрасць лацінскіх закаручак, відаць, не дачуў і нічога не адказаў. Таня асцярожна выйшла з кабінета.

Увечары Мартын Андрэевіч першы загаварыў з Таняй: ён стаў распытваць пра жыццё, пра яе, пра бацькоў. Лёгкая чырвань пакрыла шчокі ў Тані. Перабіраючы ў руках рог беласнежнага халата, закрыўшы вочы расніцамі, яна разгаварылася:

— Вы пытаеце пра маіх бацькоў?.. Ні маці, ні бацькі я не памятаю. Мне гаварылі, што бацька забіты на грамадзянскай вайне, каля Нёмана. Белыя расстралялі яго. Маці служыла з ім у адным палку — яна была сястрою ў лазарэце... Хутка пасля таго, як не стала бацькі, маці пераехала ў Сібір. Там і я нарадзілася ў адным маленькім гарадку. Мне яшчэ і года не было, як памерла маці ад тыфусу...

Мартын Андрэевіч моўчкі слухаў, не зводзячы вачэй з дзяўчыны. А яна была задаволена тым, што гэты чалавек так уважна слухае яе.

— Мяне аддалі ў дзіцячы дом,— гаварыла яна.— Там я і вырасла. Там я скончыла медыцынскі тэхнікум. Я зусім нядаўна прыехала сюды. Мне вельмі захацелася пажыць тут, на радзіме маіх бацькоў. Можа я знайду знаёмых, пачую што-небудзь пра іх. Вось і ўсё... Ад мамы засталася мне адна фатаграфічная картка... Што вы так пазіраеце на мяне?

Таня падняла вочы на Мартына Андрэевіча. Яго маршчыны каля брывей былі зведзены, нібы ён сіліўся нешта ўспомніць.

Не то здзіўленне, не то трывога былі на твары Мартына Андрэевіча. Ён глуха закашляўся і паваліўся на падушку. З незвычайнай шпаркасцю закружыліся ў галаве мыслі і гады — да болю шпарка, аж пацямнела ў вачах.

Нешта даўняе-даўняе, знаёмае было ў гэтай дзяўчыне. Яе рысы напаміналі ўсё тое, што было дзевятнаццаць год назад. Яго мучыла разгадка. Халодны пот выступіў на лбу. У непрытомнасці ён шаптаў імя жанчыны.

Але гэтага ніхто не мог разабраць.

Калі ён супакоіўся, Таня асцярожна, на цыпачках адышла ад ложка...

Усю ноч ён трызніў. Перад ім кружылі віхры грамадзянскай вайны, пераліваласяя сіняя рака Нёман... Ён — малады камандзір эскадрона... Сястра Ульяна Бельская! Ён у белым палоне, яго вядуць расстрэльваць. Вось ён, ранены, уцякае. Бяжыць лесам, пераплывае Нёман... Дзе ты, Ульяна Бельская? Няма на старым месцы лазарэта. Кругом эшалоны смерці. У прасторах краіны загубілася імя жонкі Ульяны Бельскай. Доўгія гады пошукаў па розных кутках краіны — і нідзе не чутна імя Ульяны Бельскай — баявога таварыша. Няўжо гэта была яна? І вось праходзяць доўгія гады — ух якія бурныя гады!

Наступнай раніцой Мартыну Андрэевічу стала лягчэй. Усё, што яму трызнілася, ён дрэнна памятаў...

Прыйшла Таня і прынесла кветкі, белыя як снег і сінія як неба. Мартын Андрэевіч прыветна кіўнуў ёй галавой. Яна села на крэсла побач і, як заўсёды, прапанавала:

— Хочаце, я вам пачытаю вершы.

Яна раскрыла томік і пачала чытаць. І пасля слоў:

Нас водила молодость
В сабельный поход.
Нас бросала молодость
На кронштадский лёд.
Боевые лошади
Уносили нас,
На широкой площади
Убивали нас...

— Досыць! — сказаў Мартын Андрэевіч. (Яго хваляванне заўважыла Таня.)

— Што з вамі, Мартын Андрэевіч? — занепакоена спытала яна.— Вам нельга хвалявацца. Вы менш думайце пра свой завод. Вы, напэўна, многа думаеце аб сваёй сям'і — таксама пакіньце...

Смутная, ледзьве ўлоўная ўсмешка прапаўзла па яго вуснах.

— Калісьці даўно... дзевятнаццаць год таму назад, у мяне была сям'я — жонка, дзіця павінна было нарадзіцца... Мая сям'я загубілася... Я многа гадоў шукаў — і не знайшоў. Напэўна, няма ў жывых...

— Значыць, вы зусім адзінокі?

— Як сказаць? У нашай краіне няма адзінокіх... У мяне ёсць завод, таварышы... Многа старых баявых таварышаў...

— Пасля нашай учарашняй гутаркі,— сказала Та-

ня,— я ўсю ноч думала аб сваіх бацьках. Я глядзела на маміну фатаграфію і думала: якой яна была мужнай і ласкавай!

— На грамадзянскай вайне многа было мужных жанчын. Твая маці, напэўна, была слаўнай жанчынай. Як яе звалі?

— Ульяна Бельская.

— Што? — горача прашаптаў Мартын Андрэевіч, раптам узняўшыся на локаць.

— Яе звалі Ульянай Бельскай,— паўтарыла Таня.

— Што? Ульяна Бельская? Твая маці? — нібы ў кашмарным сне, шаптаў Мартын Андрэевіч...

— Але,— пацвердзіла Таня.— Вось яе фатаграфія,— сказала яна, вымаючы фатаграфію.

Мартын Андрэевіч выхапіў з рук Тані старэнькі партрэт жанчыны, імя якой некалі было так знаёма.

Ён уважліва, вельмі ўважліва глядзеў. На здымку была стройная чарнавалосая жанчына ў белай касынцы...

Таня моўчкі наглядала за выразам твару Мартына Андрэевіча. Нешта нявыказанае тварылася ў ім. У яго, як у ліхаманцы, закалаціліся рукі, і па жорсткай упалай шчацэ павольна пацякла сляза. І дзіўна было бачыць яе на гэтым суровым твары. Нешта яркае, агністае засвяцілася ў яго вачах.

Раптам ён узняўся і сеў на ложку, схапіў Таніны рукі і загаварыў нібы заікаючыся:

— Мая... Ты — мая дачка... Мая слаўная Таня!

У першы момант Таня ад нечаканасці не ведала, што рабіць. Потым абняла за шыю і сваімі маладымі гарачымі вуснамі пацалавала яго ў скроні, кранутыя інеем суровай зімы.

— Ты — мой бацька! Ты жыў... жыў...— шаптала яна ў нявыказанай радасці.— Мой даражэнькі тата. Колькі мы думалі адзін пра аднаго. Цяпер мы будзем заўсёды разам... Ты будзеш здаровым... Мы паедзем лячыць цябе на поўдзень... Там многа сонца... Там сіняе мора... У нас будзе многа-многа радасці...

Таня абгарнула бацькавы плечы халатам, Мартын Андрэевіч раптам устаў на ногі.

— Мне добра! — гучна сказаў ён.— Мне да акна! Да сонца!

Абапіраючыся на плячо Тані, ён падышоў да шырокага, светлага акна. Ён стаў, узрушаны, шчаслівы, і глядзеў на мнагалюдную сонечную вуліцу. Свет быў такі цудоўны! Любоў, кіпучае жаданне жыць былі мацней за смерць.

За акном была ўжо сапраўдная дружная вясна. Па празрыстым, вымытым пасля навальніцы небе плылі сінія-сінія воблачкі. Цвілі сады ў белых пялёстках. Густа раслі травы і шчабяталі птушкі.

Жыццю былі адчынены насцеж дзверы. Яно бушавала ў жылах, яно біла жыватворчай крыніцай, яно ірвалася ў свет.

## ЯК ВЯСНУ ГУКАЛІ

А лесу, мой лесу, што ты не зялёны?
А як жа мне, лесу, зеляному быці.
Сколькі было птушак — усе паляцелі,
Толькі засталася шэрая зязюля,—
Й тая кукавала — к сялу прылятала...

*Вясновая песня.*

Па бруднай вясковай вуліцы гаварліва разбегліся паводкі. Снег на палёх растаў, толькі ў далінах застаўся ляжаць шэрым насцілам. Вуліца ў неўгамонным разводдзі раскідвае ў бяздонную сінь розныя зыкі — чыстыя, пасвойму зразумелыя ў тактах сэрцабою. Вуліца скажа табе роднае і ласкавае слова, абойме цябе сваім чуццём да вясны — і пабягуць думы па ўсіх дарогах, зарунеюць, як зелень збожжа ў полі...

Хаты ад сонца пачарнелі, зажурыліся і павесялелі. Узімку былі снегавыя сцюжы, вясною — цяплынь сонца.

Праз вясковыя праслы ідуць ачорненыя сцежкі да ракі. Яна цяпер пэўна шуміць крыгамі; грудзяцца крыгі адна на другую і гоняцца, як у вадаспадзе.

Над ракой, вышэй, яшчэ малады лес — жаўтаваты, не абдзёрты ад леташняга сівога моху і шышак — кудлатымі хвоямі звоніць праўдзівую казку пра вясну. У сінім моры, над лесам, носяцца чорныя птушкі, а малы вецер галузае з верхавінамі ялін. Тут праўда крыецца ў зелені, у жыватворчым росквіце маладых сіл.

У лесе белыя, прыгожыя, першыя кветкі — пралескі — зацвілі слаўным цветам...

Так вось хочацца думаць, а думы абвіваюцца зялёнай дзеразою і губяцца ў прасторы.

Пайшоў бы, здаецца, далёка па роўнаму шляху, а тады азеленымі сцежкамі пад ясным сонцам і сінім небам — ды ўсё б думаў, што было, што будзе, і тады б выявіліся пачуцці — як прастор шырокімі, як думы — вольнымі, як званы — гучнымі...

— Эх, жыццё!.. Эх, вясна!..

Неба, далёка-бяздоннае, сіне-бялёсае, зацягнулася смагай, а сонца квола грэе ў спіну і кудлачыць салому, растрасаючы яе па дварэ.

Сяджу на прызбе пад суседняй хатай. Гнілая салома валіцца са страхі, таму што гніе хата, вуглы абвальваюцца. Пры сонцы і вясне выглядае вясёлай, хоць вокны ў хаце плачуць, як у хворага старца вочы...

Сягоння першы раз будуць гукаць вясну.

А калі вясна і сонца, тады пяюцца журліва-вясёлыя песні аб вясне, тады нейкая маладая радасць, быццам поўніцца ў жыцці тое, што было важнага незапоўненым.

Упарта звоняць над вёскай мілагучныя вясновыя званы. Ціхі ды ласкавы рытм пра свята — вясну жыцця. І радасць, і сум... А можа, гэта ад таго, што і ў жыцці вялікая радасць заўжды мяжуецца з незразумела-ціхай, салодкаю журбой?

Над вокнамі шумяць бярозкі...

Апусціўшы лахматую галаву ўніз, прайшоў па вуліцы ўжо немалады хлапец Даніла, смутны ад нечага. З год як жаніўся ён. Была з жонкаю асабовая сямейная драма, і яны разышліся. Жыве адзін, дык забірае з душою чалавека гэта сумотнасць. Ды к таму бацька гоніць яго з сваёй хаты. І ходзіць чалавек з нязведанымі думамі, з адзнакай на твары мукі і пакоры перад жыццём... Вясна — не вясна, радасць — не радасць чалавеку, бо сэрца прасякнута перажыткам душэўна-нутраной драмы...

У канцы вёскі, дзе хаты гурбою неяк прытуліліся адна к другой, а вуліца зусім звузілася, грамада дзяўчат ішла па вуліцы ў другі канец вёскі ды пела прыпеўкі. У вясеннім разліве гэтыя прыпеўкі няможна было развязаць, толькі прыпеў вясёла гучаў, сярэбрана.

Цётка Марына выйшла з варот насустрач дзеўкам і глядзіць то на сонца, то на поле. Сіні андарак яе з белымі поперак палосамі блішчыць па-святочнаму. На плячах чырвоны кабат з нейкімі пазалочанымі абшыўкамі — гэта старамоднае, мусіць, засталося ад дзявоччыны яшчэ. Настроі ў яе вясёла-вясновыя, смяецца і крычыць дзяўчатам:

— Дзеўкі, а дзеўкі! Што гэта вы не йдзіцё вясну гукаць?..

— А ты, цётка Марына, чаго стаіш?

— А-ах, дзеўкі. А ці ж я вам пара? У такую пару, бывала, як была маладзейшаю, выйдзеш на загуменне, як запяеш вясновую з падругамі, аж паветра дрыжыць... А ці ж вам не сорамна?..

Цётка Марына склала на грудзях рукі, круглы твар яе кпіць над дзяўчатамі, а тыя пасталі ў беспарадку ды смяяліся над упартасцю цёткі. Толькі адна Пёкла, што жыла з Данілам, засмяецца ціха, неўпапад і перастане скора ізноў.

У знямозе зайграў, заліўся гармонік, ахоплены пачуццём,— гэта ішлі чарадою хлопцы і п'яны гарманіст нешта распяваў. Тады дзяўчаты ўрассыпку кінуліся на зялёны курган к рацэ. Расселіся там на ўзвышшы, на праслах — браць першыя пацалункі радаснай вясны, каб акунуцца ў вясновай песні.

Цётка Марына падышла да дзяўчат і з дакорам параіла:

— Давайце, дзеўкі, вось гэту песню... Гэта пра вас, пра маладых, каму надоечы замуж трэба выходзіць, а бацькаў двор шкода пакідаць... Добрая песня, забірае проста ў сэрца... Ну, пачынайце...

Сяло ж, маё ся-а-ло-о,
Што ты невясёла-а?..

Пачала сіплым, але моцным голасам, а вясёлая ды бойкая дзяўчына Малання падхапіла звонкім высокім голасам, як пералівы жалейкі на зары.

А як жа мне, сялу,
Вясёламу быці? —
Сколькі было дзевак —
Усе замуж выйшлі,
Толькі засталася
Молада Маланка-а...

І нейкі жаль праносіўся ў грудзі за ўсё тое, што ў песні. Заборыстыя ды маладыя дзявочыя галасы цягнулі прыпеў роўна, з пералівамі, калыхаліся неадрозненыя словы.

Песня апавядала пра долю-шчасце.

Молада Маланка
К татухну хадзіла,
Молада Маланка
Татухну прасіла:
«Аддай мяне, татка,
Аддай мяне, родны,
Недалёчка замуж —
Страха ды з страхою,
Мяжа ды з мяжою...
Э-эй... мяжа ды з мяжою!..»

Дзяўчаты маладыя, у разнаколерных хустках. Яшчэ амаль не было вясны, а твары іх ад прыпёку загарэлі і кажуць аб першых кветках вясны — пралесках.

А Пёкла стаіць у чарадзе дзяўчат і сумуе — гора яшчэ не зажыло. Даніла ходзіць па беразе ракі ды пільна глядзіць, як сплываюць з трэскам крыгі, знянацку пазіраючы на карагод дзяўчат...

Пелі яшчэ шмат песень.

Помню я іншыя песні. Пелі гэтую песню дзеўкі ў супрадках, пад грабянямі, і матыў яе быў такі журботна-вясельны, што і цяпер, калі чую песні вясны, застаўся ў памяці, пранік у істоту душы ды ўзварушыў успаміны...

...Ой ды карчо-о-мачка пры дарозе...
Ой, мілы мой, любы мой,
Куды едзе, куды йдзе-ець —
Карчо-о-мачкі не міне-э-ць...

Тады шэрань вісела кавалкамі на цёмных вокнах, а за акном ляжаў белы-белы снег. Усхліпваючы, гарэў аганёк лучыны... Спявалі шмат песень — і ўсе пра цьмянае жыццё вёскі, пра ціхія ласкі ды радасць жыцця.

І здаецца б, вечна слухаў іх.

Яны гавораць такое блізкае, такое роднае.

А то яшчэ — стаялі дні прыгожага лета. Белабрысае сонца рагатала ў небе і спускалася на зямлю жоўта-чырвонымі каснікамі. Запляталіся каснікі ў касу маладзіцы-восені. Калыхаліся соннай смагай кудраватыя бярозкі, разам з песняй жней гулі жніўныя песні. А песня дзіўна-чароўная, вясёлая, з таемным смуткам...

Калыхаў зорны вечар думкі.

А гэта было вясною. Можа і таму весялей здавалася песня?

Яны гукалі вясну ў жыцці — яшчэ лепшую, прыгажэйшую вясну... Адлець пелі песні — гукалі вясну. На просты лад-матыў хвалілі ды ганьбілі тое, што было хараством і нянавісцю. У старанепазбыўнай песні было і прыгнечанне, і ядраныя жаночыя слёзы, як журавіны, і праклядце ўсяму старому. Тады была перамога ў песні, як новая мелодыя асыпала ваколле прыгажэйшымі словамі.

Дзяўчаты гулялі ў карагоды, званчэй быў іх смех, забывалася, мусіць, нешта цяжкае, а верх брала чыстая радасць, як дзявочы смех. І сонца ж было такое ласкавае, і неба такое ж бялёсае.

— Эх, вясна!.. Эх, песні!..

Хочацца мне цяпер думаць думы шырокія, вольныя, ды бегчы ўдаль па бяскрайняй зямлі. На прыволлі слухаць вялікую, дзіўную музыку жыцця.

## ЮРКА ЛЯВОННЫ
## (1908—1937)

**Сапраўднае імя паэта — Леанід Мікалаевіч Юркевіч. Нарадзіўся Юрка Лявонны ў Чавусах Магілёўскай вобласці ў сям'і служачага. Вучыўся ў Магілёўскім педтэхнікуме, Вышэйшым педагагічным інстытуце імя М. Горкага, літаратурны факультэт якога скончыў у 1934 г. Працаваў у рэдакцыях газет «Магілёўскі селянін», «Звязда», у часопісе «Работніца і калгасніца Беларусі». Часта ездзіў па рэспубліцы. Восенню 1936 г. беспадстаўна арыштаваны, прыкладна праз год расстраляны. Пасля гэтага была арыштавана і жонка Яўгенія, артыстка Тэатра рабочай моладзі. Яе саслалі на 8 гадоў у лагер, разлучыўшы з маленькай дачкой.**

**Друкавацца Юрка Лявонны пачаў у 1924 г. Выйшлі яго зборнікі паэзіі: «Камсамольскія вершы» і «Штурм» (1930), «Жалезныя віхуры» і «Разбег» (1931), «Стала і мужна» (1932), «Выбранае» (1960).**

**Лявонны выступаў і як празаік. У 1931 г. выдаў зборнік нарысаў «Крок пяцігодкі». Разам з С. Грахоўскім Ю. Лявонны пераклаў раман Жуля Верна «80 000 кіламетраў пад вадой» (1937). На словы яго вершаў напісаны песні.**

### ЗІМОВАЯ РАДАСЦЬ

Ёсць настроі... А ў іх — пералівы.
Ёсць часіны — здаюцца сном.
Толькі той на свеце шчаслівы,
Хто узімку жыве, як вясной!
Я стаю адзінокі на полі,—
Ціха сыплецца золкаў пясок...
Распрануўся вецер — і голы —
Па раллі — ў карагодны скок!..
Дуб галлё пабялелае звесіў,
І не ведаю — можа ўва сне —
Паваліўся зялёны месік
На калені ў срэбны снег...
Вецер шэпча ліхія пагрозы—
Колькі злосці... Куды ж яе дзець?..
Прытулілі б мяне вы, марозы,

Да асмужаных беллю грудзей!..
Я раздумаў — не выллю слязамі,
За мяне — хай скрыгоча зіма...
Ой ты, замець — сівая замець,—
Прыгажэй за цябе — няма!..

### НЕ СХІЛЯЮСЯ

Не схіляюся, не плачу, не малю
Пад надрыўны стогн шкляной гітары;
Ведаю: прыходзяць на зямлю
З новай песняй — новыя удары.
Паўстае дзянніца з-за сяла,
Шлях асвеціць чырванню і бляскам.
І на словы, поўныя цяпла,
Ціха кіне промневую ласку.
І тады — ні ўзрыдаў тых, ні болю
Не адчуе сэрца аніколі.
Ўстане дзень — як волат-буравей!
Толькі ты не падай, не нямей:
Загуляла на зацвіўшым полі
Радасць нашых здзейсненых надзей!

## АЛЕСЬ МІЛЮЦЬ
## (1908—1944)

Аляксандр Макаравіч Мілюць — сын беднага селяніна з вёскі Скорычы Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. Скончыўшы два класы пачатковай школы і не маючы магчымасці вучыцца далей, займаўся самаадукацыяй і, дзякуючы сваёй настойлівасці, дасягнуў у гэтым немалых поспехаў.

Упершыню яго творы ўбачылі свет у 1928 г. на старонках заходнебеларускіх выданняў, а з 1939 г. яны з'яўляюцца найчасцей у стаўбцоўскай раённай газеце, у рэдакцыі якой Алесь Мілюць пачаў працаваць.

Шукаючы сябе ў паэзіі, Алесь Мілюць выпрабоўвае розныя вершаваныя формы і рытмічныя інтанацыі — фальклорную, апавядальную, публіцыстычную, нярэдка арыентуючыся на вядомыя ўжо літаратурныя ўзоры, створаныя папярэднікамі.

Алесь Мілюць шчыра і горача любіў сваю радзіму, хацеў бачыць яе шчаслівай.

Беларусам я радзіўся,
Беларусам буду жыць,

Беларускую зямельку
Буду шчыра я любіць...

Вершы паэта змешчаны ў калектыўных зборніках «Мы іх не забудзем» (1949), «Сцягі і паходні» (1965), «Крывёю сэрца» (1967), «Ростані волі» (1990).

Алесь Мілюць загінуў на фронце ў баі ва Усходняй Прусіі.

## ЯШЧЭ ЎЗЫДЗЕ СОНЦА

Яшчэ ўзыдзе сонца,
Ночкі змрок развее...
Яшчэ прыйдзе доля
З лепшаю надзеяй...

Песня салаўіна
Вольна разліецца,
Сэрца беларуса
Радасна заб'ецца...

Яшчэ ўзыдзе сонца —
Злая моц загіне...
Яшчэ край наш родны
Сваё гора скіне!

## ПОКЛІЧ

Мы ідзём па шчасце,
Мы па долю йдзём...
Усіх, хто шчэ ў няшчасці,
За сабой вядзём.

Хоць ўстаюць прад намі
Хмары з злым віхром,
Ўласнымі рукамі
Мы іх моц сатром...

І пакажам свету,
Што і мы народ...
Гэй, хутчэй да мэты,
Гэй, браты, ўпярод!

## З РОДНЫХ ПЕСЕНЬ

Беларусам я радзіўся,
Беларусам буду жыць,

Беларускую зямельку
Буду шчыра я любіць.

Бо радзімая старонка
Над усё мне прыгажэй,
Беларуская гаворка
Над усё мне даражэй.

Славу родную і волю
Я нікому не прадам,
За народ свой беларускі
Я жыццё сваё аддам.

Хай загіне наша гора,
Здзек, пагарда і прымус,
Хай жыве для славы вечнай
Край наш родны — Беларусь!

## БРАТУ

Ты будзь, брат, верны да канца
Сваёй зямлі, свайму Народу,
Што стогне з гора год ад году.
Ты будзь, брат, верны да канца.

Хоць мо спаткаем шмат нягодаў —
Май дух адважнага байца!
Ты будзь, брат, верны да канца
Сваёй зямлі, свайму Народу!

# МІКОЛА ЗАСІМ
# (1908—1957)

Вядомы ў былой Заходняй Беларусі паэт Мікола Засім нарадзіўся ў вёсцы Шэні каля Пружан. Зарабляў на жыццё сялянскай працай. З юначых гадоў змагаўся супраць нацыянальнага і сацыяльнага прыгнёту беларускага народа і падпольна, і легальна як актывіст Беларускай сялянска-рабочай грамады, Таварыства беларускай школы, Літаратурнага фронту, Народнага фронту. У 1925 г. быў арыштаваны і адсядзеў у Пружанскай турме тры месяцы. Пасля гэтага не аднойчы выклікаўся на допыты, быў пад пільным наглядам. Каб уратавацца ад паліцэйскіх рэпрэсій, паэт хаваўся пад рознымі псеўданімамі: Міз,

Агонь, Асот, Хлопец, Крывіцкі і іншымі, але гэта мала дапамагала.

Пачатак яго творчай дзейнасці прыпадае на час турэмнага зняволення. Пасля гэтага ён пастаянна друкуецца ў розных прагрэсіўных выданнях, але значна часцей выступае са сваімі вершамі перад сялянамі, якім падабаюцца яго творы, бо яны адлюстроўваюць тагачасную рэчаіснасць менавіта селяніна-працаўніка. Вершы таленавітага паэта маюць пераважна сатырычны характар, адметныя рысы яго паэзіі — сарказм, гумар, гіпербалізаванасць вобразаў, канкрэтнасць мыслення, афарыстычнасць, што імпанавала слухачам і чытачам.

У час Вялікай Айчыннай вайны Мікалай Арцёмавіч партызаніць на Брэстчыне, піша пранікнёныя, натхняючыя на барацьбу вершы. Яны складаюць яркую старонку ў беларускай літаратуры.

У 1946 г. Засім становіцца членам Саюза пісьменнікаў БССР, працуе ў рэдакцыі брэсцкай газеты «Заря», выбіраецца старшынёй абласнога літаратурнага аб'яднання. На яго паэзію звяртае ўвагу Аркадзь Куляшоў, лепшыя вершы перакладае і друкуе ў «Новом мире» А. Твардоўскі.

Выходзяць кнігі М. Засіма «Ад шчырага сэрца» (1947), «Вершы» (1954), а ўжо пасля смерці паэта — «Выбранае» (1960), «Вершы» (1973).

## ВЯСНА

О вясна, вясна-сястрыца,
Ты ізноў да нас прыйшла,
На цябе я надзівіцца
Не магу з свайго акна!

Ты магутнаю рукою
Родны кут прыбрала ў май.
А з тугою што маёю
Ты зрабіла — не пытай.

О вясна, вясна, чаму ты
Век між намі не жывеш
І нашто зіме ты лютай
Край на здзекі аддаеш?

## НА З'ЕЗД ЗАХОДНІХ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ У г. ВІЛЬНА Ў 1933 г.

Гэй, паэты вёскі й поля,
Я ваш сябра — Засім Коля,
З-пад Пружанаў, з вёскі Шэні,
І ў мяне, браты, у кішэні
Часта грошаў брак на марку,
Рэдка ў страве бачу скварку,
Бульбай ўсёнька пакрываю,
Гумы цяжкія цягаю.
Ды не падаю на дусе!
Для працоўных Беларусі
Цераблю я шлях дзярновы,
Ў верш ўплятаю з сталі словы
І аб радасці змагання
Пяяць буду да сканання.
Вас прашу, сябры-вяскоўцы,
Цешце вёску шчырым слоўцам,
Словам бойкім, шчырым словам,
Каб вясковы брат гатовы
Быў адпор даць паняверцы.
Ой, як цяжка мне на сэрцы,
Што быць з вамі не прыйдзецца.
Ды, сябры, няхай смяецца
З песняў нашых вораг люты —
Нашы песні з сталі скуты!
Перашкоды ўсе здрузгочуць!
Яны волі, волі хочуць!
Дык вітаю й дабра зычу,
На ўсе грудзі пяяць клічу!

## ЛІСТ З ТУРМЫ

— Ці здаровы мама, тата? —
Піша сын Сцяпан.—
Для мяне прыдбалі хату,
І жыву, як пан.

Маю я пакой асобны,
Гардэробы шмат:
Нары, столічак свабодны,
Проста як магнат!

Спаць паложаць, збудзяць рана,
Есці паднясуць

І на шпацыр пад ахранай,
Як туза, вядуць.

Ну, бацькі, пакуль, бывайце,
Шкода вас да слёз.
А панам там перадайце,
Што папомняць нас.

## СЯРГЕЙ ДАРОЖНЫ
## (1909—1943)

Нарадзіўся Сяргей Дарожны ў г. Слоніме Гродзенскай вобласці ў сям'і служачага. Сапраўднае імя паэта Сяргей Міхайлавіч Серада.

У час першай сусветнай вайны сям'я будучага паэта пакінула родныя мясціны і апынулася ў бежанстве ў Варонежы. Бацьку мабілізавалі ў армію. Неўзабаве ён загінуў, і хлопчык вымушаны быў выхоўвацца ў Мазырскім дзіцячым доме. У 1924 г. скончыў школу, вучыўся ў Мінскім педагагічным тэхнікуме. Затым паступіў у Беларускі дзяржаўны універсітэт на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта.

Першыя яго вершы з'явіліся ў друку ў 1925 г. Яны спадабаліся К. Чорнаму. Сталаму майстру ў іх убачылася свежасць і глыбіня здольнага маладога паэта. У 1926 г. выйшла ў свет першая кніга С. Дарожнага ў сааўтарстве з І. Плаўнікам «Звон вясны». Затым былі яго яшчэ дзве кнігі паэзіі: «Васільковы россып» (1929) і «Пракосы на памяць» (1932). У 1966 г. пасля смерці пісьменніка выйшлі «Выбраныя вершы».

С. Дарожны працаваў у рэдакцыях газет і часопісаў. Быў членам літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», «Узвышша». У 1936 г. незаконна рэпрэсіраваны, асуджаны да васьмі гадоў пазбаўлення волі. Адбываў пакаранне на Далёкім Усходзе, будаваў Камсамольск-на-Амуры. Там і загінуў у 1943 г., не дачакаўшыся вызвалення. Па хадайніцтву сястры ў 1957 г. быў рэабілітаваны.

### ПАД ВЫСОКІМ СОНЦАМ

Па квяцістай зямлі
Я даро́гай ступаю,
Лёгкі ветрык за мною бяжыць
Па траве.

Я іду
І вясёлую песню спяваю
Пра вясну, і дзяўчыну,
І стан на жніве.

Сонцам поўніцца сэрца маё
І спяванка,
І вятры нізавыя
Зямлі маладой,
Што расціла мяне
Непагодай і ранкам,
Што паіла мяне
Жыватворчай вадой.

Я прыгадваю гэта
І так запяваю,
Як пяюць касары
Над высокай травой,
Што красуе мой край
І сярпамі іграе
Над шчаслівай зямлёй
Залатое жніво.

## ВЕСНАВОЕ

Бязмежна рады я сягоння,
Здаюся ў песенны палон...
Кудысьці коні мчацца, коні
Вясенніх і ружовых дзён.

Мінулі золкія завеі,
І клён забыты ля акна,
Ў лятунках ранніх ружавее
Там, за фіранкаю, вясна.

Там, у вясновым шуме саду,
Зімовыя забыты сны,
Там кожны клён бязмерна рады,
Адчуўшы подыхі вясны.

Такая слаўная пагода,
Лятункаў мітусіцца рой...
Я паланён душы разводдзем,
Палескай роднаю вясной.
. . . . . . . . . . .

З такого цеснага пакоя
Душа ірвецца ўдалячынь,
Туды, дзе ў бэзавым спакоі
Бярозы ходзяць паначы.

І я схіляюся ў знямозе,
Бо гэта ж толькі сніцца мне:
Зіму апошнія марозы
Дарысавалі на акне.

* * *

Ніяк за імі не паспець —
Такія дні ў натоўпе гончым.
Ужо сады губляюць медзь
І клёны раздаюць чырвонцы.

Здаецца, позняя пара,
Сяджу, атулены у поцем,
А за акном гарыць зара
Агнём рабінавым на плоце.

І нездарма вароны дзесь
У сад зляцеліся на сходку:
Між дрэў паволі нечы цень
Блукае восеньскай паходкай.

І, можа б, так было дармо,
Каб я не жыў у гэтай хаце,
Дзе ходзіць вецер між дамоў
У адвячоркавым халаце.

Але ці згодзіш на адно
Усё, што стане па-за намі...
Стучыцца восень у акно
Заледзянелымі рукамі.

І я, аддаўшы ноч пяру,
Чакаю нечаканай стрэчы,
Каб заўтра ў гэткую ж пару
Камусьці горача пярэчыць.

А покуль думы цягнуць нас,
А покуль з рыфмаю няўвязка —
Нясе ля весніц жоўты вяз
Гадоў замуленую вязку.

Але я знаю, хопіць сіл,
Мяне вядзе мая стараннасць.
. . . . . . . . . . . . .
Вароны каркаюць з асін...
Напэўна ранак!

## ВАЛЕРЫ МАРАКОЎ
## (1909—1937)

Лёс гэтага чалавека трагічны, як і многіх майстроў слова 20—30-х гг. Нарадзіўся паэт непадалёку ад Мінска, у вёсцы Акалонія. З дзяцінства яго бацька, выдатны муляр, браў з сабою сына на работу. Памагаючы бацьку, Валера таксама стаў добрым майстрам. І неўзабаве слава пра спраўных печнікоў разышлася далёка па наваколлю.

Аднак хлопца больш цягнула да навукі, да кніг, да паэзіі. Ён палюбіў творы М. Багдановіча, Я. Купалы, М. Лермантава, С. Ясеніна. І сам рана пачаў пісаць вершы. Яму яшчэ не было семнаццаці гадоў, калі выйшаў яго зборнік з пяшчотнаю назваю «Пялёсткі» (1926). Праз год — новая кніжка «На залатым пакосе». Вершы В. Маракова напеўныя, лёгкія, добра запамінаюцца, таму ён адразу стаў папулярным паэтам.

В. Маракоў скончыў педтэхнікум, а затым у 1934 г. Мінскі педагагічны інстытут. Абаяльны, добразычлівы, кампанейскі, ён мае шмат сяброў — добрых паэтаў. Сярод іх — Алесь Звонак, Станіслаў Шушкевіч, Сяргей Грахоўскі, Юрка Лявонны, Тодар Кляшторны. Яго любіць і часта запрашае да сябе пагутарыць Янка Купала. У 1930 г. выходзіць яго новая кніжка «Вяршыня жаданняў», затым у 1933 г.— «Права на зброю». Пасля смерці выдадзены зборнік «Лірыка» (1959).

Займаўся В. Маракоў і перакладчыцкай дзейнасцю, быў актыўным членам літаратурнага аб'яднання «Маладняк». Ахвотна ездзіў па рэспубліцы з мэтай папулярызацыі беларускай літаратуры.

Малады, актыўны, таленавіты паэт быў знішчаны ў 1937 г.

* * *

Эх, прастор сінякудрых палёў,
Срэбралістая рэчка ў даліне,
А над рэчкай фальварак разлёг
І купаецца сонца у сіні.

І над рэчкай бярозавы смех
Віхраметнай праносіцца хваляй,
То ускочыць на золата стрэх,
То ў калоссях шнуроў закрышталіць.

Я схіліўся над белым пяньком,
Песні слухаў і думаў пра горад
Там, дзе вуліц шырокі пракос
Прада мною ляжаў вельмі горда.

Там, дзе молата звонкі удар
Мяне зваў на жыццёвыя хвалі,—
Я на хвалях тых сонца аддаў
За напевы віхрастыя сталі.

Ну дык што ж! Ў сэрцы буйным ізноў
Устае безумоўна жаданне,
Каб пачуць спевы гулкіх станкоў
І згубіцца ў сталёвым тумане.

* * *

Зялёны месяц над ракою
Ўстае ў крыштальных пералівах,
І ночка сінім васільком
Схіліла твар свой сіратлівы.
Ой, ночка!.. ночка!.. Над акном
Рабіна блішча пазалотай,
І устаюць жаданні зноў
Пайсці на рэчку, на балота.
Пайсці і песняй маладой
Зноў ажывіць жыццё дубровы,
Што голле нізка над вадой
Схіліла ў полымі сталёвым.
І, дзе вясны жыццё цвіло,
Дзе вецер песні кідаў срэбрам,
Яна разгонам шчырых слоў
Ізноў мо скажа: «Ты патрэбны...»
Ой, месяц!.. месяц над ракой
Ўстае, смяецца, б’е паклоны,
І ночка сінім васільком
Схіліла твар свой на загонах.

## ТАВАРЫШ НЮРЫН

(Урывак з паэмы.)

Ах, чаго так месяц хмарай
Прытуманены?
Што ж ты прызадумаўся, раскудравы мой?
Ці аб маладосці,
Крыўдамі параненай,
Ці аб вечнай тайне
Мудрасці людской?..
Не катуй без часу
Юных і бунтуючых
І не блытай сцежкі к светлым
Берагам...
Маладосць ахвярам і любві даруючы,
Будзь такім жа светлым і харошым
Сам...
На бунтоўным моры
Чалавечых мараў
Сёння твораць шчасце — новае зямлі,
Каб мільёны фабрык ад агню і пары
Да энергій сонца перайшлі...
І ў палях, абведзеных
Залатымі сцежкамі,
Каласіўся горда вечны ураджай.
І каб людзі сёння,
З залатымі ўсмешкамі,
Не былі братамі смерці ды крыжам.

# ПЯТРУСЬ ГРАНІТ
# (1909—1980)

**Іван Пятровіч Івашэвіч — сапраўднае імя Петруся Граніта. Нарадзіўся ён на Гродзеншчыне, у вёсцы Зачэпічы. Сям'я Івашэвічаў жыла вельмі бедна, гаспадаркай займалася толькі маці. Бацька ў пачатку імперыялістычнай вайны быў прызваны ў армію. Вярнуўся толькі ў 1922 г. цяжка хворы і неўзабаве памёр. Маленькаму Івану давялося памагаць маці, рабіць самую цяжкую, дарослую працу. Гаспадарчыя справы займалі шмат часу, таму ў школу хлопчык хадзіў вельмі рэдка.**

**У 20-я гг. П. Граніт далучаецца да вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Знаёміцца з беларускімі газетамі і кніжкамі, наведвае мітынгі. За рэвалюцыйную дзейнасць**

П. Граніт не раз арыштоўваўся ўладамі Польшчы. У 1933 г. прымае ўдзел у нелегальным з'ездзе беларускіх пісьменнікаў, які праходзіў у Вільні. У гэтым жа годзе П. Граніт упершыню выступіў у друку. Яго верш быў надрукаваны ў «Беларускай газеце». Праз некаторы час паэт падрыхтаваў да друку свой першы зборнік вершаў, які назваў «Над хвалямі Нёмана». Аднак зборнік так і не ўбачыў свет. Ён быў ужо ў наборы, але пачалася Вялікая Айчынная вайна...

Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР працаваў старшынёй Беліцкага сельскага Савета. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў сувязным партызанскай брыгады. Паэт друкаваў свае вершы пад псеўданімам Мацей Гвозд.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны П. Граніт скончыў Навагрудскае педагагічнае вучылішча і працаваў настаўнікам. Доўгі час быў загадчыкам пачатковай школы ў Зачэпічах. У 1978 г. выйшаў у свет яго зборнік паэзіі для дзяцей «Сцяжынка».

Пахаваны Пятрусь Граніт у роднай вёсцы Зачэпічы.

## ХІТРЫ АСАДНІК І МУЖЫК-ЗДАГАДНІК

У час касьбы, у час спякоты
Хлеба мала, а работы!..
Дык згадзіўся наш Мікіта
Дзень касіць за торбу жыта
У асадніка, у пана.
Ўстаў да ўсходу, выйшаў рана.
Касец коскаю махае,
Пан на пяты насядае,
Каб скасіў яму ўсю «лонку»
Да заходу яшчэ «слонка».
Але сонца ўжо заходзіць,
Неба месяц абыходзіць,
А касіць яшчэ кавалак —
Сенакосу самы ўзвалак...
Пан падходзіць да Мікіты:
— Ўзышоў месяц, паглядзі ты!
Гэта ж сонцаў брат, няйначай,—
Мне сягоннячы удача:
Свяціць хоча, пакуль скосім,
Мы яго за стол запросім!..

А касец не заікнуўся,
Ў вус ён толькі пасміхнуўся:
— От дакосімо, і квіта,
Атрымаць мне рупіць жыта...
— Скончана! Давай разлік,—
Весела сказаў мужык.
Мех да торбы ён прышыў,
Дзірку ў торбе пралупіў.
Ну, сып, паночку, торбу жыта!
— А мех навошта, адкажы ты?
— Які тут мех, пан слепават?
Гэта ж торба і торбін брат.

### ХАЧУ СПАТКАЦЬ ВЯСНУ

Хачу спаткаць вясну
Пад гукі вольных песень.
Пасля цяжкога сну
Угледзець свой прадвесень.

Хачу спаткаць вясну,
Вясну красы, усмеху,
І на цяжкім шляху
Паставіць шчасця веху.

## СЯРГЕЙ КРЫВЕЦ
## (1909—1945)

Лёс гэтага мужнага, адважнага і таленавітага паэта — яскравы прыклад для моладзі. Сяргей Міхайлавіч Крывец, які нарадзіўся ў вёсцы Дубна Гродзенскага раёна, сваім жыццём даказаў, на што здольны чалавек, які выхаваў сілу волі, мае мэту ў жыцці і не губляе духоўнай арыентацыі. Здавалася б, жыццёвыя абставіны, доля ў тагачаснай Заходняй Беларусі, непрадказальнасць падзей зрабілі ўсё, каб зламаць чалавека, пазбавіць яго жадання займацца літаратурай, але ж не... Сяргей насуперак перашкодам выстаяў і стаў добрым паэтам.

Сяргей Крывец нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Быў пастухом, цесляром. Спачатку ён займаецца самаадукацыяй, а потым вучыцца ў Беластоцкім педагагічным інстытуце (1940—1941). У 1930—1933 гг. жыве ў Гродна, з 1933 па 1944 гг.— у Беластоку, дзе ўдзельнічае ў рэвалюцыйным руху.

С. Крывец рана далучыўся да асветнай работы, узначаліў у 1928 г. мясцовы гурток Таварыства беларускай школы.

У час Вялікай Айчыннай вайны Сяргей Крывец быў на фронце. За тыдзень да заканчэння вайны ў час штурму Гдыні паэт загінуў.

Вершы С. Крыўца друкаваліся ў прагрэсіўных заходнебеларускіх выданнях. У часопісе «Заранка» ён выступаў пад псеўданімам Сярожа Пастушок. Пасля смерці творы С. Крыўца былі змешчаны ў калектыўных зборніках «Мы іх не забудзем» (1949), «Сцягі і паходні» (1965), «Крывёю сэрца» (1967). Славуты Р. Шырма склаў у 1972 г. кніжку вершаў С. Крыўца «Дубок».

Небагата напісаў Сяргей Крывец, але ж зробленае ім заслугоўвае ўвагі. Палову поспеху прынесла яму грунтоўная самаадукацыя. Дастаткова сказаць, што пісаў ён на беларускай, рускай, польскай і нямецкай мовах.

## ДУБОК

Дубок падцяты малады
Пры першай буры марна згіне.
Пры ім жыццю — такой бяды,
Ды з жалем ён яго пакіне.
Нядаўна жыў і красаваў
І быў таго ж жыцця аздобай,
Цяпер зялёны ліст завяў
Прадчасна скошаны хваробай.
Праходзіць ноч. Ўстае зарніца.
Дубок галінкамі дрыжыць.
Ён просіць сонца: — Дай мне
жыць!
Ён смерці холаду баіцца.
Злятае дзень, і звод нябёс,
Прыбраўшысь зорамі, іскрыцца.
Дубок раняе кроплі слёз...
Каго прасіць, каму маліцца?
І ўжо згубіў надзею ён.
Надарма ўсе яго старанні.
Праходзіць рад апошніх дзён,
Ён загаіць не можа раны.
І крыўды горкай пачуццё
Іржой лісткі яго з'ядае.
Наўкол дубка цвіце жыццё —
Дубок маўкліва памірае.

## ЧАМУ НЕ ЙДУ Ў ЛІТАРАТУРУ

Чаму не йду ў літаратуру
І я з адточаным пяром
Тварыць народную культуру,
Нясці яе на пералом?
Ці словам уладаць не ўмею?
Ці я звычайны вершаплёт?
Чаму бо выйсці я не смею
З пяром туды, дзе мой народ?
Ці ж я дрыжаў, калі касою
З другімі праганяў пракос?
Ці я чужою паласою
Снапоў замала перанёс?
Ці можа цэпам не удэрыў
Як след у часе малацьбы?
Ці можа болей я не веру
Ў законы нашай барацьбы?
Хваліцца мы не маем чым,
Маўчаць нам грэх перад народам,
Аднак упарта мы маўчым,
Як рэкі бурныя пад лёдам.
І што, браты, за шчасце ў нас?
І што за лёс такі ганебны?
Ці то на ўсё патрэбен час?
Ці можа лепшы гарт патрэбны?
Ды часу многа уплыло,
Што хваль на Нёмне — не
палічыш,
А гарту хіба не было?
І гарту мы яшчэ пазычым.
Чаму ж загналі нас ў тупік?
Чаму закрылі вокны, дзверы?
І што такое панскі шпік
Для рук ад плуга і сякеры?
Часіна злая, што й казаць,
Ў апошнім часе, трэ прызнацца,
Не можам думак павязаць,
А ўжо на подзвіг — і не ўзняцца.
Мы чахнем, сохнем без пары,
І нашы горныя палёты,
Як камень, коцяцца з гары
Ў зыбун мяшчанскага балота.
Як быць? Завошта учапіцца?
І дзе падзеўся пункт апору?

Як можна з гібеллю мірыцца,
Чаму пра гэта не гаворым?..
Я згодзен з тым, што можна гінуць
З спакойным сэрцам і сумленнем,
Калі ўдалося след пакінуць,
Засекчы ствол, зламаць галіну
На знак наступным пакаленням.
Туман і той расою сядзе,
Замкне ў прыродзе нейкі круг,
Найменша кропля ў вадападзе
І тая робіць нейкі рух.
А мы... а мы жывыя людзі!
Мы — фокус бачымых міроў,
У нас ёсць розум, ў нашых грудзях
Кіпіць збунтованая кроў,
Навошта ж мы тады марудзім?
Загінуць так, як тая свечка
Накрыта цёмным каўпаком,
На свет радзіцца батраком,
А кончыць подлым чалавекам,—
Хай трахне гром такую долю!
Тады зусім не варта жыць.
Падобным лёсам даражыць —
Мне сорамна свайго мазолю.
Няма закону быць рабамі.
Мы ведаем закон жыцця:
Ратуй жыццё сваё зубамі,
Калі не змог ужо рукамі,
За волю біся да канца.
За міг адзіны людскай волі
Аддай няволі сто гадоў,—
І ўжо ты жыў, з цябе даволі,
Ты апраўдаць сябе гатоў.
Калі б святыя намаганні
Ты дарма толькі пагасіў,
Прыняць адкрытае змаганне
Ў цябе яшчэ замала сіл,—
Зыдзі набок, зашыйся ў нору,
Чакай спрыяючай пары,
А час прыйшоў, ты выбраў пору,
За горла ворага бяры.
Жыцця не чэрпаюць на жмені,
Жыццё бяруць усё зараз.
Інакш людзей не будзе з нас,
Інакш з нас будуць толькі цені.

Не я спаборніцтва баюся
З касою, плугам, тапаром.
Надыдзе час і Беларусі
Паслужым мы яшчэ пяром.
Надыдзе час і на пракосы
Быллём парослай стараны
Спадуць адклёпаныя косы,
А ў нетрах гракнуць перуны
Раскатным рэхам тапароў,—
Тады скажу і я: «Гатоў!
З батрацкім стажам за плячыма
Патрэбны будзе авангард,
Ў той час і я сваёй айчыне
Аддам рукі працоўнай гарт.
Цяпер, пакуль на нашых весях
Тэрор крывавы пралятае,
Славянскім пасынкам на крэсах
Я дні ліхія каратаю,
І толькі часам, так, украдкай,
Калі ўсё навокал спіць,
Чыркнеш у схованых нататках:
Народ жыве!.. І будзе жыць,
Не змусіць нас панам служыць.

## МЫ ЖЫВЁМ

Наша песня недапета,
Грымнуць нам яе пара
З большым жарам і імпэтам
Па абломках алтара.

Ўецца полымя-стыхія
Беларускіх свежых сіл.
Ой, дарэмна бура вые,
Дыша холадам магіл;

Ой, дарэмна гоніць хвалі
Новых лютых навальніц —
Не заліць ўжо ёй пажару,
Не спыніць жывых крыніц.

З новай песняй на прасторы
Выйшаў новы маладняк.
З дымам пойдуць ўсе запоры,
Стане вольны к сонцу шлях.

Мы ідзём. Дык хай жа значыць
След наш чорныя крыжы,—
Нас ужо не апалячаць,
Мы жывём і будзем жыць!

* * *

Аплакаў долю я сваю
Яшчэ ад дзён сваіх дзіцячых,
Цяпер я слёз ужо не лью,
І хай па мне ніхто не плача.
Ў руках маіх сталь рэвальвера,
Праверапы ў баю кінжал.
З дарогі прэч! Я ўжо не веру
Ні ў гнеў багоў, ні ў людскі жаль.
Я — крык скатаванай ахвяры,
Я — енк распачы і адчаю.
Я — помсты меч.
Я — біч.
Я — кара,
Кідаю кліч:
з дарогі прэч!

## АДНОЙЧЫ

Ночкай цёмнаю аднойчы
Чую смелы стук.
Раптам брызгае мне ў вочы
Святла цэлы пук.
Грымнуў голас: — Стаць, ні кроку!..—
Пэўны і сухі.
Бачу, бачу, сярод змроку —
Ззаду, спераду і збоку
Зіхацяць штыкі.
Сон ці ява — вось пытанне —
Хто адкажа мне?
Ў хаце плач і нараканне,
Быццам дом ў агне.
Сталь кайданаў, чую, ўецца
Змейкай каля рук.
Нехта жудасна смяецца
З нашых горкіх мук.

## ЛУКАШ КАЛЮГА
## (1909—1937)

Канстанціну Пятровічу Вашыну — такое сапраўднае імя пісьменніка — быў наканаваны нядоўгі жыццёвы лёс. Нарадзіўся ён на Міншчыне, у вёсцы Скварцы.

Пісаць Лукаш Калюга пачаў рана, будучы яшчэ вучнем Станькаўскай сямігодкі. Яго першыя апавяданні былі надрукаваны ў «Чырвоным сейбіце» (1927).

У 1931 г. Лукаш Калюга скончыў Беларускі педагагічны тэхнікум. Працаваў у навукова-даследчым Інстытуце прамысловасці ВСНГ, на Беларускім радыё. Лукаш Калюга ўваходзіў у літаратурнае аб'яднанне «Узвышша». Але хутка яго напаткаў тыповы для свядомага беларускага інтэлігента лёс — арышт, турма, беспадстаўныя абвінавачанні ў нацыяналізме, прысуд, выгнанне ў далёкую Сібір і, як завяршэнне зямных пакут, гвалтоўная смерць у 1937 г.

Даволі своеасаблівы талент Лукаша Калюгі праявіўся ў гумарыстычных апавяданнях. Найбольш значная мастацкая праца Лукаша Калюгі — аповесць «Ні госць ні гаспадар» была надрукавана ў 1928 г. Праз тры гады з'явілася ў друку першая частка аповесці «Нядоля Заблоцкіх» — «Прыгоды і летуценні».

Пісьменнік не толькі сцвярджаў каштоўнасці традыцыйнай народнай маралі, але і адным з першых паспрабаваў разабрацца ў сутнасці новага грамадства, у тых маральных і ідэалагічных дэфармацыях, якія адбываліся ў ім. Лукаш Калюга — самабытны празаік, які ўмеў праз жывое і трапнае беларускае слова паказаць душу чалавека, душу свайго народа.

У 1974 г. выйшаў зборнік апавяданняў і аповесцей «Ні госць ні гаспадар».

### ТРАХІМ — ШТУЧНЫ ЧАЛАВЕК

Гэта й праўда, што штучны чалавек. Ці добра ён гаворыць, ці на глум, а ўсё здаецца, што штукуе. Людзям раіць, што як рабіць, а таго не толькі рабіць, але і слухаць няма чаго. Толькі ніхто з нашых людзей не бачыў, каб ён сам сабе добрую параду даў ды каб сам сябе й паслухаў — зрабіў так лёгка, як лёгка языком брахануць.

Усяго раз і было такое здарэнне, што Трахім пакваліўся на сабе практыку зняць, ці добра будзе тое, што людзям раіў.

Усё лаганіў*, па сяле ходзячы, што як работа робіц-

ца ў чалавека, дык і яда тады есца. Ці ты яму смачнага дай, ці не смачнага — не разбіраецца чалавек, калі добра напрацуецца. Яму тады абы міску вялікую пад нос паставіў, абы ў місцы было многа, каб было на што расчыняцца. Хоць камень дай працавітаму чалавеку. Калі, не агледзеўшыся, глынуў яго замест скваркі, дык і толькі таго. Стравіць і жывата не прыпсуе. Ён з'есць тое, што сабак трое. А адзін сабака паўздохлага цяляці можа асіліць.

Але ж у гэтай Трахімавай мове нічога новага. І без яго гэта ўсякі ведаў.

Ды не аднаго працавітага чалавека ведае Трахім. Гультай, што толькі каля вуглоў ціцюляе*, ці не дзядзькам яго прыходзіцца. Ведае ён, як і таму жывецца. Гэты, кажа, чалавек не жыве, а сохне. Ён, і за стол сеўшы, пераборлівы і не варушкі надта, з'есць тое, што адзін абскубены верабей. Гэтакія людзі й шукаюць сабе лёгкага хлеба. Тут і дзіва з іх няма. Хоць дарагі лёгкі хлеб, але колькі ім трэба. Гэта каб працавіты чалавек выстараўся сабе лёгкага смачнага хлеба, дык на адну кішку мала было й вунь якой пенсіі: гэта — не тое, што гаршчок картоплі ўвавіць* аднаму.

Чортведама што б з'еў працавіты вясковы чалавек, каб не была капейка патрэбна.

Трахім, як чалавек разумнейшы за іх абодвух, паглядзеў і на працавітага чалавека і на гультайскага. Падумаў, як ім жыць даводзіцца. Падумаў і дадумаўся, што работу рабіць няма ніякага сходу. Трахім так усё людзям напроціў гаварыў, а гэты раз сказаў, што іх прыказка да праўды ўходзіць. Людзі кажуць: работа дурня любіць, а дурань работу. Так яно й ёсць.

Ды не толькі да гэтага Трахім дадумаўся, што ўжо даўно ўсе людзі ведалі. Ён толькі сам праз сябе дазнаўся, як чалавеку на свеце жыць. Трэба работу ад першага дня кідаць рабіць і памаленьку патроху адвыкаць есці. Што ж чалавеку інакшае трэба, калі не яда й адзежа? Дзеля чаго чалавек працуе так цяжка, калі не для таго, каб кішку напхаць і сякую-такую рызу налажыць на сябе ад холаду і ад людзей? Есці, Трахім дазнаўся, што льга адвыкнуць. А калі работы не рабіць, нідзе не хадзіць, а толькі ў цёплым месцы ляжаць не варушачыся, калі ў два месяцы раз перакаціцца з аднаго боку на другі ды, гаворачы калі хто нагодзіцца, рукамі нічога не паказваць, дык і адзенне не будзе насіцца.

Раіў Трахім людзям гэта сваё перакананне ад шчырага

сэрца, а яны ўсё думалі, што штукуе. Што ж ты зробіш, калі такі штучны ён чалавек удаўся — няма ніякай паверкі. Дармо, што мядзведзя ўсе за разумнага звера прымаюць (соннага ды мёртвага не кране чалавека), дармо, што й ён так робіць, а потым баркаўчане Трахіму не паверылі, што чалавеку так жыць добра б было.

Немаверннікі нашы людзі.

Ды Трахім не раіць якраз гэтак рабіць, як мядзведзь. Мядзведзь на зіму кладзецца ў логава ды бярэ лапу ссаць. Трахім жа раіць, як толькі згоніць з поля снег і аж да вялікіх марозаў, класціся людзям у ложак. Тады самая работа, сама што адзежа носіцца. Ды тады не толькі ў ложку ляжаць льга будзе. Можна дзе ў халодную будыніну зайсці і там сабе добрае ціхае месца выбраць. Зімою ж мусіш устаць, як мароз прыцісне. Якое там чорта лежава, калі трэба коўдраю накрывацца, а па коўдры кажухом, ды шчэ папраўляць яго на сабе, як дзе крыху з'едзе. Ужо работа хоць невялікая робіцца, адзежа хоць непрыкметна, але дзярэцца — а зараз і есці гатова захацецца — от тады прапаў за адзін раз увесь шчыры пост. [...]

...Дзіва, што Трахім зіму пралежваць не раіць.Нямадзіва, і што ён дома ніколі не распратваецца.

Усё штукуе Трахім. А раз вымкнуўся ды і ўляцеў са сваімі жартамі. Якраз яго на тое і павяло, каб, што з таго выйдзе, паспрабаваць.

Быў раз надта з жонкаю пасварыўся.

Усё яна ўпікала, што людзі адной картопляй усю зіму абыходзяцца, а хлеб на вясну пакідаюць — як пойдуць на поле, дык трэба ж што смачнейшае, лепшае з'есці. А ў іх гэтай ашчаднасці няма: адзін хлеб цяпер жаруць, а на вясну нічога не застанецца — ні хлеба, ні картоплі: хлеб самі ўпатрэбяць, а картоплю свінням скормяць.

У такую вялікую спрэчку зайшлі былі, што траха ўзалабкі не спляліся.

Трахім ніколі ж нічога сваёй жонцы не хваліўся. Гадкі жаночы звычай яна мае. Калі верыць, што праўда будзе што-небудзь, дык знарок будзе гаварыць наперакор, каб яшчэ больш пачуць, што так яно й мае быць, каб самой яшчэ лепш паверыць. Трахіму, мужыку свайму, яна бывае што й верыць, а наперакор гаворыць.

— Ат! Што ты задумаў, стары?! Дзе гэта відана, каб так і было, як ты кажаш?!

Калі ж бывае і ўвалжэцца Трахім, дык і тады яму жонка злажыцца не дасць.

— А ідзі ты! — кажа.

Толькі ўсяго, што гэты раз не так ласкава ганіць яго мову, як той раз, калі міла слухаць было.

Ужо Трахім і пераканаўся, што немаверніца жонка. Дабра яна яму не мысліць. Ніводнага слова не перапусціць. Сам-насам яны ўдваіх ніколі ад шчырага сэрца не пагавораць. Ужо як бывае Трахіму драчыць язык, а слова да яе не прагаворыць, бо яму абы пачаць, а тады ўжо ўсё роўна ўгаворыцца — усё што ведае раскажа. Трахім адваротны чалавек: ён што далей жыве, дык таго не забываецца, што ўмеў, а што больш жыве, дык усё да лепшых (ці то горшых — хто яго разбярэ) баек дадумляецца.

Яму як прыпрэ ахвота з добрымі людзьмі пагаварыць, дык апранецца й пойдзе з хаты. От чаму ён і звык па сяле валачыцца; як з аднаго канца ў другі ідзе — дадому не заходзіць. Бяда чалавека прымусіла свае хаты цурацца. Нядоля навучыла па людзях хадзіць.

Цярпеў бывала. Лішняга слова баяўся да жонкі прагаварыць. А гэты раз пад злосць узяў і вымкнуўся:

— Чорт жа цябе й бяры, калі гэтак, калі табе шкада, што я час-часом скібачку хлеба зжую. Чорт твой хлеб будзе есці! Але ж — трасцу я табе буду і работу рабіць!

— Калі ж можна б было й прыдзержыцца. А калі ты на задзёр,— і не еш. Чорт ад цябе будзе й работы даходзіць.

— І на чорта мне твая яда. Пражыву й так.

— І жыві. Я табе, як добраму... А калі ты на задзёр — трасцу: не пападзеш жа ты ў мяне нічога.

Трахіміха ў сваёй хаце моцная пані. Яна дома ўсю работу робіць, яна й парадкуецца, яе й слухаюць. А Трахім — чалавек валачашчы. Яго й дзеці, як малыя былі, мала ведалі. Хто яго ведае, ці гэта тата іх, ці так які чужы чалавек ходзіць да мамы, як толькі есці пара, а як пад'есць, зноў за парог уцякае. Спаць, яны ні разу не бачылі, калі прыходзіў, і ні разу яго на ложку сплючы не засталі.

Трахіміхі дзеці лепей слухаюць, бо пры ёй гадаваліся. Яна, што сказала, тое й зрабіла. Усё са стала прыняла: і лыжкі, і міскі, й хлеб. У насценны шкапчык схавала, замкнула, а ключ сабе ў кішэню ў хвартух палажыла.

— Паглядзім: хто каму сагрозіць.

І Трахім гэтаксама ўпарты:

— Будзем бачыць.

Добра ўзлаваўся ён.

Лёг на свой ложак і на хату плячыма адвярнуўся. Так пад паўдня сонца бралася, як ён лёг. Зараз жонка паклікала дачок (у іх сыноў няма). Селі за стол. Уліла

ім Трахіміха аднае стравы міску (капусты, здэцца, ці то буракоў) — з'елі. Другую поўную паставіла на стол (не то куцця там была, не то крупнік — нешта забеленае) — і гэту спаражнілі. На гэтым і годзе — пад'елі. Трахім усё ляжыць. Хочацца і яму. Сліны повен рот нацякло. Глытае ён яе ціхенька і цярпіць. Гэта ўсё што не прывычан, што першы раз. А далей:

«Ацярплюся,— сабе думае,— і хацецца не будзе».

Меншая дачка, што ў хаце не была, сваркі не чула, хацела была спагадаць бацьку.

— Ідзеце ж і вы, татка! — пазвала.

Трахім нічога на яе словы не адказаў, а Трахіміха насварылася:

— Даміцэля! Нашто ён табе? Надта ты ўпраўная — усюды язык уткнеш. Спагадаеш. Хай от ляжыць — хоць ён не ўстане!

— І не ўстану,— аказаўся Трахім.

— І прасіць не будзем. Будзем бачыць, да чаго далежышся.

Так і не пайшоў Трахім палуднаваць.

А зараз сон яго змарыў. Прачнуўся аж тады, як сядзелі за сталом, вячэралі. Спаў на хату вачыма абярнуўшыся, дык толькі пралупіў вочы, паглядзеў ды зноў заплюшчыў. І духу не ўказаў, пакуль не павячэралі. Дочкі не раз цікавалі на яго, і бацькі не заўважылі, што не спіць, а слухае, стаіўшыся, што на хаце будзе рабіцца, што будзе гаварыцца пра яго. Вельмі ж хацелася Трахіму гэта на свае вушы пачуць. Ужо як яму добра б было сербануць цёплай толькі што зваранай заціркі, а потым сцярпеў і носам ні разу не чмыхнуў, каб хоць пах яе залавіць. Хацелася было ведаць, хваліць ці ганіць будуць яго пакуту.

Тады, як быў паўабуўшыся і апрануўшыся, сырамятнаю папругаю падпяразаны, дык першы дзень Трахім і праспаў. А ўвечары так, без сну, лежачы пачалі бакі пабольваць. Надумаўся, што калі ўсёй зімы пралежаць нельга, дык месяц яшчэ можна сяк-так пракачацца, калі чым найболей спаць. Паляжаў трохі — новае надумаў: што гэта да таго, што шмат адзежы адзета, і ў бакі муляе, і неймаверныя думкі просяцца ў галаву.

Узяў падлягчыўся: сеў на ложку — сцягнуў боты, раскруціў анучы, распеpacked распераззаўся, распрануўся ды зноў лёг. Ужо лёг не на смех — коўдраю накрыўся. Дармо, што коўдра падшываная, а холадна пад адною ёю. Кажухом яшчэ ўвярцеўся паверсе.

Ужо й сон ад Трахіма ўцёк. Як не мэдзіўся* ён, каб

і лепей легчы і мацней вочы заплюшчыць, не бярэ.

Адумаўся, што гэта затым, што нераздзеты лёг — лішняя вопратка муляе, а сон не прыстае. Скінуў з сябе верхнюю вопратку, пад галовы сабе палажыў. У адным ісподнім пад коўдру палез. Паправіў кажух наверсе.

Аж палягчэла чалавеку, як сцішыўся. Усяго бяда, што мала помачы ад усяе яго турбацыі*: сну як не было, так і няма. Аж пакуль на дзень не стала займацца, пракачаўся Трахім. А тады так моцна прыкархнуў, што й сняданне праспаў.

Есці хочацца. Не еўшы не вытрываць. І ратунку брыдка прасіць.

Адумаўся, што і месяца не пралежыш, а пралежаў бы з тыдзень, каб ціхенька сабе хіба прыкрадаў штодзень хоць па такой лусце, як пастуху ў торбу даць у поле.

Ляжыць Трахім.

У роце высахла, а ён і не зварухнецца.

Ляжыць і думу думае здрадніцкую:

«От каб крошачку... Каб хоць з лыжачку... Каб хоць кропельку — у роце прамачыць. Больш бы нічога не хацелася. Пакаштаваў бы й годзе сказаў».

Якраз і з хаты ўсе выйшлі. Ніхто не ўбачыць, каб і ўзяў чаго.

Памаленьку адхінуў Трахім коўдру. Ціхенька на дыбачках, прыслухоўваючыся, каб хто не найшоў, падышоў ён к насценнаму шкапчыку паглядзець, ці не льга будзе як дастаць чаго.

Ды — дудкі. Замкнёна, і нідзе такоўскай шчыліны не відаць, каб праз яе скібку хлеба выцягнуць. Нічога не зробіш, ключа не меўшы.

Гэтаксама падышоў Трахім і к печы. Адчыніў засланку, паглядзеў, што там ёсць. А што ў печы будзе — адны гаршчкі стаяць там. Жалезнікаў* і глінянікаў паўнюсенька.

Далікатненька паставіў Трахім засланку пры качарэжніку, каб не стукнула, каб хто з двара не пачуў. Узяў вілкі. Выцягнуў самы большы гліняны гаршчок. Зняў з яго гнушку*. Паглядзеў, дык там капуста. А тлустая ж яна, з баранінай. Скалкі* плаваюць паверсе. Такая смачная, харошая — хоць ты яе нагбом напіся. Так Трахіму хочацца напіцца — проста не вытрываць.

Няма лыжкі. Нідзе міскі не знайсці. Усё пазамыкана. Але калі чалавек у горы, дык ён без усякай выгады абыдзецца і без лыжкі прымайструецца пад'есці, калі голад прыспічыць. І Трахім узяў кварту* ля вядра з чыстай

вадою. Поўну начэрпаў капусты. Хоць ад кварты й горача ў рукі, але з рук яе не пушчае Трахім. Кепская іх кварта, гарачая. З медзі яна, салдаты ў вайну з снараду неяк вылілі ды Трахіму на памяць пакінулі.

Толькі калі стане з раніцы не шанцаваць чалавеку, дык не шанцуе і пад вечар. Пакуль Трахім у кварце капусту студзіў, нехта ў сенцах скрыпнуў дзвярыма. Не давялося яму, беднаму, і разу глынуць. А такая была на погляд капуста смачная, харошая, з бліскучымі скалкамі. Аж шкода...

Спалохаўся Трахім. Супэнду ўпусціў кварту з капустаю вобземлю. Хапіў гнушку, каб накрыць гаршчок, ды й тае ў руках не ўтрымаў. Упусціў. Разбіў аб прыпек.

Старасць — не радасць. Возьмецца пажылы чалавек якую далікатную работу рабіць — рукі ў яго трасуцца. А як перапуд які, дык і саўсім тады ходырам заходзяць — ведама цапу-лапу... Гэтае самае сталася й з Трахімам.

Добра толькі тое, што ён скора здагадацца мог. Прыйшло ў памяць яму, спалоханаму чалавеку, што льга і на ката віну зляжыць. Не было калі Трахіму меркаваць, добра гэта будзе ці блага. Хутчэй на свой ложак пабег, коўдраю ўкрыўся. Усяго бяда, што кажух вобземлю зваліўся, але не пара было падымаць. Нехта ў хату прыйшоў.

Сцішыўся Трахім. Прыплюшчыў вочы. Дыхнуць моцна баіцца. Толькі вушы натапыраў, каб па голасу пазнаць, хто зайшоў у хату.

— Што гэта за рабункі?

Толькі пачуў Трахім голас, дык і смел стаў. Дачка Даміцэля яму не вялікі страх.

— Што тут было? — пытаецца яна другі раз.

Пасмялеў Трахім. Даміцэля — дачка добрая. Яна бацьку спагадае. Просіць ён яе:

— Хадзі сюды, Даміцэлька!

— Гэта вы тут былі, татка?

— Я, Даміцэлька...

Больш Трахім не можа гаварыць. Солана ў роце стала. Сляза слязу пабіваючы, пацяклі раўчукі з вачэй.

Зблізку як паглядзела Даміцэля на Трахіма — шкода ёй бацькі стала. Давай яго цешыць:

— Дармо! Што ж там такое, калі й вы.

— Даміцэлька! Ты ж прымі там усё, скажы, што — кот.

— Добра. Я прыму. Скажу, што — кот.

— Ну, глядзі ж.

Не таго Трахім плача, чаго думала Даміцэля. Яна

папрымала ўсё — і гаршчок на сваё даўнейшае месца паставіла, і печ засланіла, і хату ў тым месцы замяла, дзе наліта было, і кварту выпаласкала, выцерла скарачом* — а ён усё не перасціхае. Усхліпвае і ўсхліпвае. Надта ж ужаліўся ён.

Ізноў падышла Даміцэля да бацькі.

— Чаго ж вы, татка? Што вам баліць?

Дзе ён скажа, што баліць. Нічога ў яго не баліць. Гора ў чалавека, дык і плача. З тае прычыны йдуць слёзы з вачэй, што над сваім дабром волі не мае, сваё дабро замыкаюць ад гаспадара. Дзе ж ён гэта скажа?! Дачка цешыць, а Трахім і не скардзіцца.

— Я так сабе. Што мне будзе балець?

— Дык не плачце ж! Чаго ж вы?

Трохі разважыла бацьку ды пайшла Даміцэля за парог. Яна з мацераю й з меншаю сястрою цэпам малацілі гарох у таку. Не было калі доўга ў хаце забаўляцца. Трэба было глядзець работы.

Адумаўся Трахім. Адным плачам сам сабе ў горы не паможаш.

— Даміцэля! — паклікаў дачку.

Аж з двара мусіла яна вярнуцца ў хату.

— Што вам, татка?

— Дай ты мне, дачушка, хлеба скібачку.

Даміцэля ведае дома ўсе ўходы. Выняла ключ з пячуркі. Адамкнула насценны шкапчык. Не скібку, але дужаватую лусту ўкавяліла й дала Трахіму. А сама і нож на тым месцы, дзе брала, палажыла, шкапчык замкнула і ключ у пячурку зноў схавала.

Напрамілуй бог яе Трахім просіць:

— Глядзі ж, не кажы нікому нічога.

— Добра. Не скажу.

Пайшла Даміцэля работу рабіць, а Трахім стаў хлеб есці. Такі яму просты, нясеяны хлеб смачны здаўся, што ніколі такога пірага на Вялікдзень не каштаваў. І ў касьбу не еў з такою ахвотай. Цяпер Трахім і пераканаўся, што не ад адной работы есці хочацца, а можа хацецца і ад лежні. Гэты раз яму ад лежні так захацелася, што не вытрываць. Але Трахім не галодны. Не душыцца ён хлебам, а толькі каштуе, толькі лепшую форму лусце дае. Жуе і прыслухоўваецца, каб хаця смак быў у памяць, каб да смерці ведаць, які ён.

Як ні мэдзіўся ён з хлебам, але такі, пакуль жонка ў хату, з'еў усю лусту. З'есці-то чыста з'еў, але крошак не ў галаве было пазбіраць, не здаўмеўся іх далоў з падушкі

стрэсці. Па іх Трахіміха й пазнала, што не шчырым пастом посціць ён, а загадзя прызапашаны хлеб ціхенька жвакуе, на ложку лежачы.

— От ты які галадамір! Работы рабіць не хачу, а есці — есць.

Калі ўспала яна на яго, калі раскрычалася, разлякаталася. Не так ёй таго хлеба шкода, але нашто ж бо быў задзёр.

Не вытрымаў-такі Трахім жаночай звягі. Мусіў адзявацца, абувацца, апратвацца ды йсці на сяло. Каб дома быць, трэ было вушы затыкаць. Немаведама, як сцерпіцца трэба чалавеку, каб жаночую звягу ціхенька слухаць. Спрыцен Трахім да гаворкі, а да сваркі не варт. Ад першага слова спудлуе яго Трахіміха.

А ўсе кажуць на Трахіма, што валачашчы ён чалавек. Нехаця звалачэшся, калі дома ў сваёй хаце неспакой. Няма чаго ганіць Трахіма — благое яго жыццё. Здаўна звык свайго дому не пільнавацца. Цяпер дык, каб і хацеў, цяжка яму было б пакінуць сваю благую (ці то добрую — я не ведаю) моду. Абы толькі паснедаў, дык і цягне схадзіць даведацца людзей, як яны жывуць, пачуць.

А таго самага дня, як кінуў жыць аб шчырым пасце, пайшоў Трахім у Баркаўцы ды й давай расказваць, як цыган сівую кабылу хацеў ад яды адвучыць.

— Ваду,— казаў,— і сама, бэцю, кіне піць.

Яго й праўда была: не даў есці — кінула ваду піць. Але ад першага тыдня ў трэску высахла, як у хваробе якой паляжаўшы. Потым не ўстала на ногі, а ўрэшце й саўсім іх выпрастала.

Было б гэта самае й Трахіму. Толькі ён не такі дурны, як тая сівая цыганская кабыла,— як прыпёр голад, пайшоў каля гаршкоў шныпарыцца*. Цяпер, пасля таго, ходзіць па сяле ды смяецца з дурной цыганскай работы, з яго практыкаў.

Штукар наш Трахім. Змалку яго на ўсякія штукі здало. Бывае, штукуючы, сам сябе да жалю давядзе, але свае натуры не пакідае.

## ЛАРЫСА ГЕНІЮШ
## (1910—1983)

**Ларыса Антонаўна Геніюш (дзявочае прозвішча Міклашэвіч) нарадзілася ў былым маёнтку Жлобаўцы Ваўкавыскага павета. Скончыла Ваўкавыскую гімназію. Муж**

яе, І. П. Геніюш, набываў медыцынскую адукацыю ў Празе, і ў 1937г. маладая сям'я выехала ў Чэхаславакію, дзе іх і напаткала вайна.

Друкавацца пачала з 1939 г. Вершы Л. Геніюш, напісаныя ў перыяд расстання з Бацькаўшчынай, прасякнуты шчырай замілаванасцю, любоўю і сумам па Айчыне, тугой па родных мясцінах. У Чэхаславакіі выходзіць яе першая кніжка вершаў «Ад родных ніў» (1942).

У час вайны Геніюшы вярнуліся на Беларусь. Сталінскія рэпрэсіі і вайна глыбокімі ранамі працялі сэрца Ларысы Антонаўны — у Казахстане на высылках памёрла яе маці, трагічна загінуў бацька, браты Аркадзь і Расціслаў не вярнуліся з фронту... Душою пакутуючы за лёс народа, Ларыса Геніюш стварае вершы, прасякнутыя прарочымі прадчуваннямі народнага і асабістага гора. Яна як бы прадбачыць свой лёс, прадвызначаны нядоляй.

1948 г.— трагічны для Геніюшаў, менавіта ў гэтым годзе яны былі арыштаваны і прыгавораны Вярхоўным судом БССР да 25 гадоў папраўча-працоўных лагераў. У 1956 г. пасля высылкаў Геніюшы прыехалі ў Зэльву на пастаяннае жыхарства.

Увесь час, нягледзячы на нялёгкія жыццёвыя абставіны, Л. Геніюш пісала вершы. У 1967 г. выходзіць зборнік паэзіі «Невадам з Нёмана», зборнікі для дзяцей «Казкі для Міхаські» (1972) і «Добрай раніцы, Алесь» (1976), лірычныя зборнікі «На чабары настоенае» (1982), «Белы сон» (1990), у 1993 г. выходзіць кніга ўспамінаў Л. Геніюш — «Споведзь».

Паэзія Л. Геніюш вельмі багатая і разнастайная. Паэтэса шырока выкарыстоўвала беларускі фальклор, вобразы вуснай народнай творчасці. Нямала вершаў яна прысвяціла гістарычным асобам Беларусі — Ефрасінні Полацкай, Францыску Скарыне, Кастусю Каліноўскаму. Шчымлівыя, душэўныя вершы Ларысы Геніюш прысвечаны самаму дарагому — сваёй Айчыне. Блакіт неба, разлогі-палі, сінявокія рачулкі, беларускія вёсачкі, спакойныя, праўдзівыя і добрыя людзі — да ўсяго Ларыса Антонаўна ставіцца са шчырай любоўю і замілаванасцю. Яна любіць сваю Бацькаўшчыну, народ беларускі, гатова дзеля іх на любую ахвяру.

Творчая спадчына Ларысы Геніюш не ўся сабрана і выдадзена. Многія творы яшчэ ў рукапісах і, на жаль, пакуль што не дайшлі да чытачоў.

## МОЙ ЛЁН І СНЫ

Кволы лён мой напіўся расы —
быццам з воблакаў сіні наліўся.
Буду ткаць дываны, паясы
для таго, хто мне ўночы прысніўся...

Будзе кужаль за снег той бялей,
пояс ўзорны, як межанька наша;
пазірацімуць людзі ў сяле,
калі мілы яго падпаяша!..

Няхай, змыты дажджамі, расце,
хай сінее у ранні імглістым
так высокі, як тое трысцё,
як той шоўк, так мяккі, валакністы!

Мама кажа: — Ты зрэб'е аснуй!
Яно болей патрэбна у хаце.
А мне хочацца толькі вясну
Ды палі свае родныя ткаці.

Кажа мама: — Вось світкі няма!
За сукно трэ, дачушка, узяцца...
Ах, сукно вытча мама сама —
там жа ўзорам палі не ірдзяцца!

Вельмі шэрае тое сукно,—
я ж хачу ткаць вясёлкі і краскі;
аснаваць так прадно за прадном,
каб дыван быў, як родная казка!

Так цвяцісты, як нашы лугі,
як палі з васільковаю грывай;
быццам Нёман шырокі, даўгі,
быццам хвалі яго мігатлівы.

Ты ж расці, валакністы мой лён...
Апалю цябе рожавым раннем,
спраду, вытку дзявочы свой сон,
аснаваны гарачым каханнем!

Ўсё, што цешыць, і ўсё, што баліць,
на палотны узорам раскіну:

хвалі, краскі, калоссе, палі —
ўсю красу наймілейшай Краіны!

## НІШТО ТАК НЕ МІЛА

Ніштo так не міла, як хатні агонь,
што сэрца астылае грэе.
Нішто так не міла, як родны загон,
што сам калісь хлебам засеяў.

Нішто так не міла, як бацькавы кут,
як гул калаўроткаў увечар,
як гоман вясёлы цапоў на таку,
як дзедава казка ля печы.

Нішто так не міла, як шнур нашых хат,
гасцінныя нашы парогі
і вербы, што сталі зялёныя ў рад
ля стрункай далёкай дарогі.

## ЁСЦЬ КРАЙ АДЗІН

Ёсць край адзін пад прамяністым небам,
даступны сяння толькі маім сном,
дзе гожы луг ля цёмна-сініх грэбляў
засланы снежна-белым туманом.
Там недзе ў хвалях рэкаў пераЗвонных,
ў палёх, дзе зацвітаюць васількі,
у ачох дзяўчат і ясных лехаў лёну
губляе неба цудны свой блакіт.

Далоні й сэрца зроднены з раллёю,
а душы з краем ў наквеці галін.
Там Нёман пенным бурыцца прыбоем,
ніў хусцем ярым сцелюцца палі.
Шуміць пшаніца залацістым чубам,
звісае з вецця перламі авёс,
заносліва ірдзіцца сіні лубін,
а грэчка кволая лунаецца з палос.

Ёсць край адзін, аквечаны юргіняй,
край, тканы зеленню узорыстых краснох,
край, вышыты у пацеркі калінаў,
дзе ноч з расой сядае на парог
і чэша косы доўга, задумлёна,

ўплятае зоры ў цемень валасоў,
блядыя рукі выцягае сонна
і надзіць месяц, каб апаў далоў.

Ёсць край адзін, так свету мала знаны,
дзявочы край між сіні і зарніц,
дзе дню насустрач конь іржэ буланы,
гатовы ў полі вецер даганіць.
Вятрамі чэсаны і росамі умыты,
дзе гоні з сонцам мерае сявец,
і гнецца ў пояс каласамі жыта...
Ёсць край адзін — мой цэлы, цэлы свет!

## ЕФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ

Мінуласць ляжыць надмагільным вянком
над тымі, што ў смерці застылі,
ззяе святлом праз цемру вякоў
святое імя Ефрасінні.

А доля ж была ў крывіцкіх жанчын
з кудзеляю, з прасніцай злучана.
Яна ж за асветніцкі слаўны пачын
дастойна прайшла ў неўміручасць.

Ад Лады, вяснянай красуні ў бары,
ад моцы Ярылы, Сварога
знайшла сярод вечна паганскай пары
да мудрасці новай дарогу.

Яшчэ над Дзвіною старыя багі
ў сялібах людзьмі карагодзяць,
яе ўжо прывабіў свет праўды другі,
што неслі Кірыл і Мефодзій.

У пушчы-лясы адыходзяць далей
продкаў сівых абаронцы.
Пісьменніцтва, новая вера мацней
за ўсіх багоў грому і сонца.

Народ яшчэ даўніх мілуе багоў.
З каменя ім стодзіва ставіць.
Абараняць іх у пушчах гатоў
і моц над людзьмі славіць.

Дарэмна. Другія стаяць алтары.
У Прадыславы мэта —
святыні, цэрквы, манастыры —
тагачасныя універсітэты.

Вяртаецца ў край з навукай, з дабром,
братэрства і мір у ім сее.
Валодае смела князёўна пяром,
людзьмі завалодаць сумее.

Асветніцтва наша, духоўны ўладар,
паганства і цемру скарыла,
каб Полацк узвысіць.
На шлях яе мар
з Полацка выйшаў Скарына.

У сэрцы чарніцы палае агонь.
Падзеі тых дзён па парадку
збірае на славу народа свайго
і летапіс піша нашчадкам.

У келлі маленькай, у ціхім Сяльцы,
не марыць пра узнагароду.
Не толькі царкве яе веліч душы —
жывому народу і роду.

Адчула: народ не учора паўстаў.
Не заўтра канец нам прысудзяць.
З мінуўшчыны слаўных падзеяў і спраў
мы ёсць.
Мы былі,
мы будзем.

* * *

Не згінай мяне, я не сагнуся,
Не баюся ні страхаў, ні зла.
Нездарма я з зямлі беларускай
Непахіснай сасною ўзрасла.

Напрасткі йду няходжанай сцежкаю,
Мудрасць продкаў ў гарачай крыві,
Ні прад кім не схіляю паспешна
Крыху гордай сваёй галавы.

Абмінаю ўсю набрыдзь*, што вокал,
Чалавечы мой блытае лёс.
Гляджу ўдаль, не маргнуўшы нат вокам.
Розум цемру праніжа наскрозь!

## ДЗЯДЫ

Смалу і дзёгаць ў пушчы здабывалі
з старых, вякамі пачарнелых пнёў
і мёдам залацістым налівалі
рады гліняных, паленых збаноў.

Аружжа цвёрдае кавалі сабе самі,
вастрылі стрэлы, нацягалі лук,
часамі быў аружжам толькі камень
ці двое дужых гартаваных рук.

І дзік, і лось, мядзведзь — асілак буры,
пад сілай рук не раз у лесе паў.
Цвярдое ложа пакрывалі скуры,
кругом сплывалі з дзераўляных лаў.

Як дуб, магутныя, адважныя, як зверы,
адужалі ў лясох суровае жыццё.
Перад цяжкою кованай сякерай
паганы вораг назаўсёды ўцёк.

Калі ж дружынаю за стол дубовы селі
і кубкі пенным мёдам налілі,—
не зналі меры буйнаму вяселлю
сівыя продкі нашае зямлі.

Калі ж народ агнём раскідаў віці,
каб існі дружна Краю бараніць,—
каўшы кідалі з мёдам залацістым,
каваць жалеза ды смалу паліць.

Пад горды сцяг збіраліся дружыны
грудзямі-мурам ворага спаткаць,
нашчадкам імя слаўнае пакінуць
ды родных пушчаў недругу не даць.

Героям сыпаліся курганы-магілы,
міналі славы поўныя вякі,

аж покуль вораг хітры не асіліў
вялікі род з-пад Нёмана-ракі.

Не ўзяў нам пушчаў, ветрам калыханых,
магутных замкаў, слаўных гарадоў
і не прысвоіў славы на курганах,
дзе тлеюць нашых попелы дзядоў.

І часта вецер ноччу на магіле
азвецца стогнам волатаў сівых:
— Мы Край грудзьмі сваімі баранілі,
каб ўнук ў няволі, ў сораме заціх?

Каб нашы землі, нашы пушчы, рэкі
чужак сваёй краінай называў
ды слаўна племя мучыў сёння здзекам
і нават мове волі не даваў?

Так стогнуць сэрцы волатаў магутных,
як быццам вецер жалем галасіў
аб тым, што Край наш ў ланцугі закуты,
што ўнук аб славе дзедавай забыў.

## РОДНАЯ МОВА

Мова родная, мова дзядоў!
Іншай мовы мы сэрцам не чуем.
Мілагучнасцю любых нам слоў,
быццам музыкай, душы чаруеш.

Мы за вокнамі дзень залаты,
нашых рэкаў пявучыя хвалі,
роднай хаты святыя куты
ў гэтай мове раз першы назвалі.

Мова наша — буйны цветабой!
Пралілася ў ёй першая радасць...
Словы матчыны сыпаліся ў ёй,
як пялёсткі з адцвіўшага саду.

Любай песняй старою гучыш
з-пад калыскі, з гадоў тых дзяціных,
салаўіным разлівам ўначы,
звонам хваляў прыткой ручаіны.

З-пад вясковых прыветлівых стрэх
мілагучна звініш ад світання,
бо дзявочы рассыпчасты смех
быццам першае ў сэрцы каханне!

Ты — вясною аквечаны луг,
шум дубровы магутны, пявучы,
непадайны сталёвы ланцуг,
што нам сэрцы нязломныя лучыць!

Так балюча і гэтак даўно
стогне любы народ ў паняверцы;
ты адна толькі ясным прадном
нам снуешся праз нівы, праз сэрцы.

Святы прадзедаў ты нам адказ,
якім слаўна ў харомах гудзела!
Ты як неба, як сонца для нас,
ты як наквеццю сад заінелы.

Мова родная, мова дзядоў!
Іншай мовы мы сэрцам не чуем.
Мілагучнасцю любых нам слоў,
быццам музыкай, душы чаруеш.

## ТРЫ ДАРОГІ

Агарнуў хлапца раз такі сумлеў —
перад сабою ён тры дарогі меў.
Па адной пайдзе — стане важным ён,
ды не знаціме невясёлых дзён.

Ад курганаў тых, ад сяла далей,
а найдалей — дык ад сваіх людзей.
Будзе мець там моц, грошы звонкія,
жаль часамі мо за старонкаю...

А другая йдзе к шчасцю скораму,
і ідуць па ёй нашы ворагі.
Пашто крыллі мець, пашто вольным быць?
Лепш за тую медзь ворагам служыць!

Быццам недруг, жыць з яго платаю
ды не чуці слёз тых за кратамі.

Хай сабе ў сяле з плячэй згорбленых
ападзе жыццё шэрай торбаю.

Хай магілаў ў ноч прыбаўляецца,
хай браты свае адхіляюцца...
Сцежка трэцяя йдзе няроўная,
праз бары, лугі праз чароўныя,

паміж сёламі, паміж хатамі,
паміж сэрцамі паміж братнімі.
Ўжо не ворагі не магутныя,
а вітацімуць рукі скутыя.

Рукі цвёрдыя ды мазольныя,
сэрца з крыўдаю паднявольнаю!
Вочы з просьбамі, душы з ранамі
ўсё пытацімуць свету ранняга.

Пры дарозе той чабор сцелецца,
узышло на ёй волі зелейца.
Паліваць яго трэба з ласкаю,
нат слязамі, нат крывёй уласнаю.

Каб расло яно ды магутнае,
красавалася, рвала путы нам.
Гэй, зарэе там ранне светлае!
Прывітанне шлюць дзеўкі ветліва...

Гэй, лунае там даль бярозамі...
Вораг вязніцай страшыць грознаю,
гневам пеніцца, грозіць смерцяю —
ўсё ж пайшоў дзяцюк сцежкай трэцяю...

Сонца лашчыла асалодаю,
краскі сыпала зямля родная.
Вецер калыхаў пахам ліпавым,
на дарогу з ніў росы сыпалісь.

## АЛЕСЬ ЖАЎРУК (1910—1942)

**Таленавіты беларускі паэт нарадзіўся ў Сянно, у сям'і служачага. Яго сапраўднае імя Аляксандр Дзмітрыевіч Сінічкін. Дзяцінства будучага паэта было нялёгкае, маці**

адна выхоўвала чацвёра дзяцей. Сінічкіных у гарадку ведалі і паважалі: дзеці ў акушэркі раслі паслухмяныя, сумленныя, працавітыя. Рамантык і аптыміст, Шура рана пачаў пісаць вершы, якія змяшчаў у насценнай газеце «Смех і слёзы». Друкавацца пачаў у абласной газеце «Магілёўскі селянін» і бабруйскай акруговай газеце «Камуніст», калі яшчэ вучыўся ў восьмым класе.

А. Д. Сінічкін скончыў Рагачоўскі педтэхнікум, настаўнічаў на Палессі ў славутым тады саўгасе «Сосны», пасля паступіў на вучобу ў Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і літаратуры, займаўся ў аспірантуры пры АН БССР.

Алесь Жаўрук піша вершы апантана, хутка, адзін і разам са сваім сябрам А. Ушаковым. Што тады хвалявала паэта? Як і многіх — інтэрнацыянальная дружба, рэчаіснасць у Іспаніі, а найбольш — любасць да беларускага роднага краю. Залішні пафас тады не бракаваў, бо паэт пісаў шчыра, узнёсла, выразна. Алесь Жаўрук сціплымі сродкамі ўмеў паглыбіцца ва ўнутраны свет чалавека, у сутнасць жыцця наогул.

Жаўрук выдае кнігі «Ручаіны» (1936), «Дняпро выходзіць з берагоў» (1938). Паэт адчувае душу дзіцяці, падлетка, юнака, таму ў сааўтарстве з А. Ушаковым ён піша творы для дзяцей: паэмы «Пра майго таварыша» (1939), «Пра слаўных папанінцаў нашага дзетсада» (1939) і зборнік вершаў «Пра майго катка» (1950).

У 1939 г. паэт прызваны ў армію. З пачатку вайны быў на фронце ваенным карэспандэнтам. Ён пісаў артыкулы, вершы, у якіх заклікаў біць ворага.

Паэт, воін, грамадзянін загінуў пры масавым налёце авіяцыі пад Сталінградам. Пакінуў ён нам не вельмі багатую літаратурную спадчыну, але досыць прыкметную, шчырую і лірычную.

У 1960 г. выйшла кніга А. Жаўрука «Выбранае».

## ПЕСЕНЬКА

Кожны дзень увечары
Песня калабродзіла,
Ліхтары успыхвалі
Ў парку ля кіно.
Стройная і лёгкая,
Ты заўжды праходзіла
Кожны дзень увечары
Паўз маё акно.

Я не ведаў, любая,
Хто, адкуль ты гэткая,
Лідай ці Наташаю —
Як завешся ты;
Ці кіруеш ў небе ты
Лёгкай авіэткаю,
Ці рыхтуеш к сесіі
Нудную латынь.

Толькі бачыў: слалася
Даль табе рамонкамі,
Яблыні працягвалі
Снежных кветак бель,
Частыя гармонікі
З салаўямі звонкімі
Гімны адмысловыя
Ладзілі табе.

Ноч ішла па вуліцах
Ў песнях, у гармоніках,
Майку атуляючы
Белую тваю.
І сядзеў гадзінамі
Я на падаконніку,
Палахлівасць лаючы
Прыкрую сваю.

Ліўнямі пявучымі
Чэрвень пачынаецца,
Далі клічуць смоламі,
Свежасцю лясной.
З гэткімі турботамі
У мяне зрываюцца
Ўсе мае экзамены
Гэтаю вясной.

Як дрымотным ветразем
Подыха чаканага,
Як даліне прагнучай
Быстрае ракі,—
Так у цэлым горадзе
Мне тваёй, каханая,
Нестае маленькае
Дужае рукі.

## ТУГА

Помню жнівень позні гэты,
Помню: над вадой стаім...
Ліда Іванова, дзе ты
З простым прозвішчам сваім?

Ля высокай нашай брамы
Стрэў цябе выпадкам я —
З тога часу мы сябрамі
Сталі, светлая мая.

Два гады мінулі роўна,
Толькі цішаю начной
Ўсё мне сніцца смех чароўны,
Крок знаёмы за сцяной.

Мы ж з табою дзён без ліку
У чыталках правялі,
Мы з табою на залікі
Вечна першымі ішлі.

Толькі як раскідаў шаты
За акном вячэрні змрок.
Не са мной —
                з другім ішла ты
У кіно ці на каток.

Шлях мігцеў пад ліхтарамі...
Я душыў сваю тугу:
Мы ж лічыліся сябрамі,
Я спрачацца не магу.

Я імкнуўся быць цвярозым:
Кніжку браў,
Гартаў лісты,
Толькі зноў
                ішлі на розум
Ноч марозная і ты.

Ды нарэшце нечакана
Звёў увечары нас лёс:
Памятаю, чамаданы
На вакзал табе я нёс.

Ты спяшалася. Праз залу
Мы прайшлі да цягніка.
Ты мне шчасця пажадала
Пасля трэцяга званка.

Вось вагон хіснуўся лёгка
І паплыў...
Бывай, спакой!
Дзесьці ты цяпер далёка —
Не дастаць цябе рукой,
Не паклікаць.

Ў сінім світры
Ноч. Снягі, як дываны,
Ціхі гарадок Дзімітраў
Сніць прадранішнія сны.

Дні вяртаць дарэмны спробы,
Як жа міма ты прайшла,
Ты ж ударніцай вучобы,
Ты ж выдатніцай была.

Ўсё ў жыцці магла, умела,
Не пытала ні ў каго.
Як жа ты не зразумела
Сэрца простага майго.

## ЗМІТРОК АСТАПЕНКА (1910—1944)

Змітрок (Дзмітрый Емяльянавіч) Астапенка нарадзіўся на Смаленшчыне, у вёсцы Калеснікі. Сын настаўніка, Змітрок Астапенка вырашыў пайсці бацькавай дарогай і ў пятнаццацігадовым узросце паступіў у Мсціслаўскі педагагічны тэхнікум. Ён даўно марыў аб літаратуры, паэзіі і знайшоў тут аднадумцаў — Юлія Таўбіна і Аркадзя Куляшова. У тэхнікуме Змітрок пачаў пісаць вершы і выступаў з імі ў друку. Яшчэ ў 1928 г. Змітрок Астапенка атрымаў ад Я. Коласа кнігу з надпісам, у якім народны пясняр выказвае ўпэўненасць, што З. Астапенка будзе вядомым паэтам. Гэты надпіс быў своеасаблівай рэцэнзіяй на першыя творы пачынаючага паэта.

У 1929 г. паэт пераехаў у Мінск. Ён пісаў не толькі вершы, але і творы для дзяцей, займаўся перакладамі.

Адзін за адным выйшлі паэтычныя зборнікі З. Астапенкі «На ўсход сонца» (1931), «Краіне» (1931), «Абураныя» (1932), кніжка-малюнак для дзяцей «Трактар» (1933). Напісаў навукова-фантастычны раман «Вызваленне сіл» («Маладняк», 1932). Пасля смерці выйшлі яшчэ дзве кніжкі «Выбранае» (1957) і «Вершы і паэмы» (1968).

У 1936 г. З. Астапенка быў арыштаваны і асуджаны на восем гадоў пазбаўлення волі. Змірыцца з лёсам палітычнага вязня, так званага ворага народа, было не ў натуры З. Астапенкі. У 1942 г. яму ўдалося ўцячы з лагера і прабрацца на фронт. Тут ён напісаў дзесяткі вершаў, апавяданняў, публіцыстычных артыкулаў. Гэтыя творы — дзённік душы паэта і мужны летапіс жыцця яго пакалення. У гады вайны З. Астапенка напісаў аповесць у вершах «Ганна», паэму «Два таварышы», баладу «Помста партызана», вершаваную нізку «Спаленая вёска» і сваю лепшую рэч: паэму «Эдэм». Творы З. Астапенкі вылучаюцца майстэрствам будаваць сюжэт, багатай канкрэтыкай вобразаў, імкненнем да іх псіхалагічнай распрацоўкі.

Паэзія Змітрака Астапенкі — гэта сумленны і таленавіты дакумент мужнай чалавечай душы, што вынесла на сабе ўвесь драматызм і цяжар сваёй супярэчлівай эпохі, не зламалася, не страціла сябе.

Загінуў З. Астапенка ў кастрычніку 1944 г. на адным з горных пераваламў Татраў.

## НА ШЧАСЦЕ ПЕСЕНЬ

Прымі мяне ў свае абыймы,
Непераможнае жыццё!
Рукамі дужымі, грубымі
Расклаў я светлы свой касцёр.

На вогнішчы яго вясёлым
Дрыжыць мільённы шумны смех —
Аб чым прыснілі мае сёлы,
Зямлёй натруджаны лямех.

Гняла пачварная прытуга
У моры згадак і надзей.
На шчасце песень, цвёрдасць духа
Я не згубіў між дробных дзей.

Збярогшы песень белы статак,
Прайду, як сон мае зямлі.

Пакіну іншым сотні згадак,
Як тыя, што да нас прайшлі.

Начэй не сплю ў глухую бессань
З усімі разам і за ўсіх.
А сэрца ў тым жа ладзе б'ецца,
Як б'ецца ў сяброў маіх.

Спакойна будучыню стрэнем,
Ва ўсіх якая уваччу .
Такім, як дыямент, як крэмень,
Сягоннячы я быць хачу.

Я буду першым з самых першых —
І сынам сонечнага дню,
Аддаўшы краю ў шчырых вершах
Сваю сумленную данню.

## ЛЕС

Зноў ты, лес!.. Дыхнуў і будзіш сілы...
Зноў шумяць дубовыя лісты,
Лёг таемна змрок зялёна-сіні
На твае вяршыні і кусты.
Сцежка, пратаптаная звярамі,
Цягне ў нязведаны паход.
На траве — вясёлкавыя плямы
Сонца і расквечаных лістот.
Радасна і шумна лес ракоча...
Ён — не мне, я знаю, што не мне...
Кожная галінка і лісточак
Ладзіць гімны проспе* і вясне.
У гэтым шуме — радасць і прыгожасць,
Лес шуміць, і шастаюць лісты.
Ногі дзеразою мне трыножаць
Нізкія пукатыя кусты.
Я блукаю... Сцежку загубіў я...
Ўсюды лес... Навокал звон лісця.
Хіляцца з насмешкаю рабіны,
Ясені ад смеху шалясцяць.
Ціха йду. Шумяць-звіняць асіны,
У траве звярыныя сляды.
Зноў ты, лес! Дыхнуў і будзіш сілы,
І шумяць дубовыя лісты.

* * *

Высокі дом, шчаслівы дом,
Рукой сумленнай майстра зроблен.
З высокіх яблынь звоняць кроплі
Увечар за яго вакном.

Пасля дажджу такая радасць
Прайсці проставалосы сад.
Няспынна пахне палісад,
І спеюць агуркі на градах.

Я зноў прыйшоў у гэты дом.
Тут будзе спын маім шуканням.
Навала шумная з дажджом
Над ім зацiхла на змярканні.

Нікога ў ім цяпер няма,
Нікога й не было, прызнацца.
Супольнікаў сваіх па працы
Я зроду жаднага не маў.

Яны прайшлі, як шум дажджу,—
З тым разышоўся, той — памершы...
Я зноў сам-насам тут хаджу,
Выношваючы ў думках вершы.

Увечары, калі ў сад
Ўрываецца наземны вецер,—
Пішу на той жа самы лад
Пад лопат яблынькава вецця.

З героямі маіх паэм
Цяпер ніколі я не ладжу...
Яны супроць адменных тэм...
...Ўвесь повен сад глухога плачу.

Дажджу свінцовых кропляў...
Вось
Я зноў адзін з сабой сам-насам.
Самота нелюдская скрозь,
Ажно задумаешся часам.

Глыбокай ноччу нада мной,
Здаецца, нехта ў белым стане...

Сад пахне шалаю вясной,
І белы месяц на паркане.

Магчыма, гэта зноўку тая —
Ў звычайныя прыйшла часы,
І гладзіць ціха валасы,
І тое, што пісаў,— чытае.

Я зноў спакойны. Нада мной
Той самы свет, якім быў зроблен.
Сад пахне даўняю вясной,
Ўсе дрэвы ў шуме звонкіх кропляў.

Даволі позна. Усе ўжо спяць.
І я ізноўку ў сваіх вершах
Не адступаю ні на пядзь
Ад светлых дум маіх найпершых.

Да позняй ночы прахаджу,
Наскрозь запоўнены, шчаслівы...

Усё ідзе, як шум дажджу,
Як светлых вёснаў цёплы лівень.

* * *

Добры дзень, мая красуня,
Беларуская зіма...
Ля дарог бялеюць пуні
І стаяць кляны тарчма.

На абветраным прасторы
Снег праносіцца ў імглу...
І шапоча, і гаворыць,
І нямее на шляху.

І пад ветру гучны посвіст
Над сумётамі лагчын
Пяць дарог сышліся ў ростань
І пабеглі ўдалячынь.

З аднаколерным аблічам,
З гібкім выкрутам змяі
Пабрысці з сабою клічуць
У нязнаныя краі.

Палі белыя палотны
На далёкія шляхі.
Адзінота. Адзінота...
І наўсцяж снягі, снягі...

Мару, думаю і шчыльна
Прытуляюся да стрэх.
У палёх нібы дзяўчына
Рассыпае ціхі смех.

Паглядае з-за сумётаў
Ля маўклівага сяла
Казка-сон, што незваротна
Адышла і адцвіла.

Мары, мары і лятункі!..
Гэта бродзіць-грае кроў...
Палкасць слоў і пацалункаў
Не вароціцца ізноў.

На аснежаным прасторы
Ветры коцяцца ў імглу...
Снег ляціць, і не гаворыць,
І нямее на шляху.

Свежым сенам пахнуць пуні.
Мары, мары... ўсё хлусня!
Добры дзень, мая красуня,
Невыказная зіма!..

## АЛЕСЬ ДУБРОВІЧ
## (1910—1942)

Алесь Дубровіч, сапраўднае імя Аляксей Рыгоравіч Рэдзька, нарадзіўся ў вёсцы Галубічы, што на Віцебшчыне.

Скончыў вясковую школу, займаўся самаадукацыяй. Алесь Дубровіч удзельнічаў у рэвалюцыйна-вызваленчым руху ў Заходняй Беларусі. У 1933 г. прымае ўдзел у першым нелегальным з'ездзе пісьменнікаў, які ўтварыў Літаратурны фронт сялянска-рабочых пісьменнікаў Заходняй Беларусі. У 1934 г. паэт быў арыштаваны і пасаджаны ў віленскую турму на Лукішках, дзе адбыў два гады. Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР (1939) працаваў у сялянскіх камітэтах, выбіраўся старшынёй сельса-

**вета. Быў дэлегатам Народнага сходу ў Беластоку (1939). Перад Вялікай Айчыннай вайной працаваў у Віленскай раённай газеце. З пачатку вайны — падпольшчык.**

**Жыццё Алеся Дубровіча рана абарвалася: ён быў расстраляны нямецка-фашысцкімі захопнікамі.**

**Што датычыць творчага шляху, то друкавацца Алесь Дубровіч пачаў з 1928 г. у газеце «Доля працы», а таксама ў перыядычных выданнях «Літаратурная старонка», «Беларускі летапіс», «Калоссе». Змяшчаў вершы ў турме на Лукішках — у рукапісным часопісе палітвязняў «Краты» пад псеўданімам Макар.**

**Паэзія Алеся Дубровіча ўслаўляе герóіку змагання за свабоду роднага краю, сцвярджае багацце духоўнага свету беларускага народа. Яна арганічна спалучае публіцыстычны пафас і мяккі лірызм. «У асобе Алеся Дубровіча наша паэзія страціла паэта значных магчымасцей»,— так пісаў у артыкуле пра яго творчасць паэт Валянцін Таўлай.**

**Нізкі яго вершаў змешчаны ў калектыўных зборніках «Мы іх не забудзем» (1949), «Сцягі і паходні» (1965), «Крывёю сэрца» (1967), «Ростані волі» (1990).**

## МЫ

Мы — скрыўджаных няпраўдай струны,
Адным распалёны агнём.
Мы гімн пакуце граем сумны
І славу барацьбе пяём.

Натхненне наша у змаганні
За шчасце новага жыцця,
Мы летуцім аб светлым ранні,
І шмат у песнях пачуцця.

Мы сэрцам полымным і чыстым
Асвецім шлях сябрам другім,
І верым — песняй урачыстай
Мы перамозе зложым гімн.

## КІНУ СВАЕ ДУМЫ

Кіну свае думы жураўліным лётам —
Хай лятуць да сонца, у далёкі край.
Сам пайду і сяду пад лазовым плотам
І пра тое сонца буду ціха граць.

І хоць скасцянеюць пальцы на марозе,
Не пакіну кратаць залацістых струн,
Хай зімой завеі выюць на дарозе
Ці ў барах сасновых плачуць, як лясун.

А як пашарэе белы снег пад плотам —
Падкручу ў цымбалах кожную струну
І на ўсіх, залітых ранняй пазалотай,
Я зайграю з ветрам маладым вясну.

І па хатах людзі вечарам лучынным
Пра вясну, пра сонца будуць гаварыць;
Выйдуць на узгоркі з туманоў лагчынных,
Каб вясеннім сонцам грудзі апаліць.

Дык ляціце ж, думы, жураўліным лётам,
Каб хутчэй сустрэцца з сонцам і з вясной!
Я іграць не кіну пад лазовым плотам,
Рукі не самлеюць, воч не сплюшчу сном!

## ВОСЕНЬ

Ў небе ў'ецца хмарамі
восень непагодная,
туманом, імшарамі
сцелецца галодная.
З ветрам, расшалелая,
цешыцца свабодаю,
лісце пажаўцелае
ліжа, як галодная.
Але мне дарэмна ты
церушыш мак роспачы —
ветрык думак росквіты
не затопча поўначчу.
Я надзеі праменем
ў дні вясенне-зорныя
распалю іх полымем,
бурна-непакорныя.
Веру, што гарт выкуем
барацьбой штодзённаю,
з праўдаю вялікаю
зможам ноч асеннюю.

# ЯНКА ЧАБОР
# (1911—1943)

Янка Чабор (Іван Сцяпанавіч Патаповіч) нарадзіўся ў вёсцы Рачканы, што непадалёку ад Ляхавіч. Пасля заканчэння Віленскай беларускай гімназіі паступіў вучыцца ў Віленскі універсітэт. Разам з В. Таўлаем, П. Пестракам, А. Дубровічам і інш. быў ініцыятарам стварэння Літаратурнага фронту сялянска-рабочых пісьменнікаў у Вільні.

Жыццё Янкі Чабора было вельмі насычаным — акрамя публікацый у «Беларускай газеце», ён рэдагаваў часопіс «Літаратурная старонка», быў арганізатарам кааператыўнага руху ў вёсках Заходняй Беларусі, вёў значную культурна-асветніцкую работу. У 1934 г. быў асуджаны ўладамі Польшчы на 5 гадоў турэмнага зняволення як арганізатар Літаратурнага фронту сялянска-рабочых пісьменнікаў. Вершы, напісаныя Я. Чаборам, носяць маральна-выхаваўчы, павучальны, іншы раз — публіцыстычны характар. Яго вершы змешчаны ў калектыўным зборніку «Ростані волі».

* * *

Гэй, арліна мая сіла,
Ты ўзнімі мяне увысь.
Над маёй старонкай мілай
Ты крыламі размахніс.

Заспяваю песню люду,
Каб пакінуў ён цярпець.
Заклікаці моцна буду,
Што даволі ўжо галець.

Буду клікаць люд рабочы
З хатаў, вёсак, гарадоў,
Каб скідалі цемру ночы,
Што лягла ў цягу гадоў.

Каб жыццё стварылі самі,
Каб збіраліся ў паход.
— Гэй, я знаю, лопнуць тамы,
Зварухнецца наш народ!

Пойдзе рэчышчам ён новым
Да дабра усіх людзей,
Створыць розумам здаровым
Дабро людскасці усёй!

## ЮЛІ ТАЎБІН
## (1911—1937)

Сапраўднае імя паэта — Юлій Абрамавіч Юдаль. Нарадзіўся ў г. Астрагожск Варонежскай вобласці ў сям'і аптэкара. У 1921 г. пераехаў з бацькамі ў Мсціслаў, дзе вучыўся ў сямігодцы. Скончыў Мсціслаўскі педагагічны тэхнікум, потым Беларускі дзяржуніверсітэт. У 1933 г. быў беспадстаўна прыгавораны да двух гадоў высылкі на Урал. Жыў у Цюмені.

Першыя вершы Ю. Таўбіна з'явіліся на старонках часопіса «Маладняк Калініншчыны» ў 1926 г. А ў 1930 г. выйшаў яго першы зборнік «Агні». Неўзабаве ўбачылі свет і іншыя яго зборнікі: «Каб жыць, спяваць і не старэць» (1931), «Тры паэмы» (1931), «Мая другая кніга» (1932), паэма «Таўрыда», пасля смерці «Выбраныя вершы» (1957) і «Вершы» (1969).

Пачатак 30-х гг.— перыяд, калі розныя беларускія паэты звярталіся да жанру публіцыстычнай лірыкі, і Ю. Таўбін — адзін з актыўнейшых у гэты час беларускіх паэтаў-публіцыстаў («Знаёмства чатырох», «Каляндар»).

У час знаходжання ў Сібіры Ю. Таўбін вывучаў англійскую мову, шмат перакладаў з яе. Частка яго перакладаў змешчана ў «Анталогіі новай англійскай паэзіі» (1937). Перакладаў і з іншых моў.

У 1937 г. Ю. Таўбін быў прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны толькі пасля смерці, у 1956 г.

### ВЯСНА

Вясна!.. За акенцам вясна...
Ахлынулі цяжкія думы,
І зноў заклікае яна
Вясёлым і ўзрушаным шумам.

Вясна!.. Маладая вясна!..
На вуснах — жывая усмешка...
Цяпер бы блукаць да відна
Ў лясах незнаёмаю сцежкай.

Цяпер бы ў палях заспяваць
Пра сіні Дунай і атаву...

Вітаць пералётную раць,
Як павадак змые заставы...

Дзень добры, мая старана!..
З вясёлай і шчырай вясною!..
Вясна... За акенцам вясна,
І ўсё веснавое са мною.

* * *

Панарама лясоў і балот,
Краявіды імшыстых нізін...
І на Захад, на Поўнач, на Ўсход —
Я ды край мой — адзін на адзін.

Будзь здароў!..
Пакахай і пястуй
У абдымках ліпнёвых начэй...
Чуеш сэрца ўстрывожаны стук,
Бачыш палкасць гарачых вачэй...

Я прыйшоў ад каменных будоў,
Ад асфальтавых сцежак і троп,
Я прынёс табе шчырасць-любоў
І ў напевах — жалезны настрой.

Я прыйшоў на прасторы палос
Палюбіць і сказаць, што я сын
Родных сэрцу лясоў і балот,
Краявідаў імшыстых нізін.

* * *

Люблю я край, дзе вечары
Ў далёкім небе сцелюць столкі
І промні ранішняй зары
Вітаюць юныя пасёлкі.

Там дымнай заніззю палі
Не будуць звіты і затканы,
Там буры-ветры размялі
Сляды забытага кургана.

Цвітуць сады... Сінее высь...
Бруіцца зорнае насенне...
Як добра будзе тут каліс
Зарыцца з галавою ў сене!

Ці пад няўпынны зорны бег
У неабсяжным сінім глянцы
Раскласці вогнішчы-начлег
Ля стромкіх сосен на палянцы.

Калоссяў спелых сумны звон
Супыняць людзі, бы асілкі,
І прынясуць ім буйны плён
Зубцамі жорсткімі касілкі.

А потым прыйдзе лістапад,—
І восень смуглая угледзіць,
Як будзе вецер лашчыць сад
І граць на яблынькавай медзі.

Ах, гэты край нізін і круч,
Равы, суглінкавыя пашы...
Табе ў адзнаку — «Беларусь»
Надалі назву продкі нашы.

## ВАЛЯНЦІН ТАЎЛАЙ
## (1914—1947)

**Валянцін Паўлавіч Таўлай нарадзіўся ў Баранавічах у сям'і чыгуначных тэлеграфістаў. Дзяцінства паэта прайшло ў в. Рудаўка Слонімскага раёна, куды сям'я пераехала пасля звальнення бацькі польскімі ўладамі як «неблаганадзейнага». У 1927 г. паступіў у Віленскую беларускую гімназію, але ў 1929 г. за ўдзел у студэнцкай забастоўцы супраць фашызацыі гімназіі быў выключаны і прымусова дастаўлены на вёску. В. Таўлай вёў у Рудаўцы падпольную работу, за што ў канцы 1929 г. быў арыштаваны і заключаны ў турму, у якой прасядзеў амаль год.**

**Па рэкамендацыі Віленскага акружкома камсамола ў кастрычніку 1930 г. Валянцін Таўлай накіраваны ЦК КПЗБ у БССР. З 1930 г. па 1932 г. паэт жыў у Мінску, працаваў у газеце «Звязда», вучыўся на вячэрнім курсе газетнага аддзялення літфака Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Друкаваўся ў часопісах і газетах. У 1932 г. В. Таўлай адклікаsuccessful ЦК КПЗБ на падпольную работу ў Заходнюю Беларусь, дзе ён працуе рэдактарам «Беларускай газеты» (у Вільні), рыхтуе да друку першы літаратурны часопіс «Літаратурная старонка». Літаратурныя**

псеўданімы паэта — Янка Дванаццаты, Паўлюк Сірата, В. Тарскі.

У 1934 г. Таўлай быў зноў арыштаваны — пасля двух з паловай гадоў следства ён быў прыгавораны да васьмі гадоў турмы. Знаходзячыся ў няволі, быў арганізатарам і членам рэдкалегіі літаратурнага штомесячніка камеры палітвязняў віленскай турмы Лукішкі пад назвай «Краты», які выдаваўся толькі ў рукапісе.

22 верасня 1939 г. палітычных вязняў у гродзенскай турме вызваліла Чырвоная Армія. З гэтага часу і да пачатку вайны В. Таўлай жыў у г. Лідзе, дзе працаваў літработнікам гарадской газеты «Уперад», друкаваўся ў розных газетах і часопісах.

У час вайны В. Таўлай быў сувязным партызанскага атрада ў былой Баранавіцкай вобласці, разведчыкам спецгрупы «Буравеснік».

Пасля вызвалення Беларусі працаваў адказным сакратаром навагрудскай раённай газеты «Звязда», а з 1945 па 1947 г.— старшым навуковым супрацоўнікам, намеснікам дырэктара Літаратурнага музея Янкі Купалы ў Мінску.

В. Таўлай пачаў друкавацца вельмі рана — у 1928 г., але толькі у 1947 г. выйшаў яго першы зборнік «Выбранае», які вызначаецца высокай паэтычнай узнёсласцю і цэласнасцю. Прызнанне Таўлая, як і многіх іншых таленавітых паэтаў, прыйшло пасля яго смерці. Потым былі выдадзены і такія зборнікі паэта: «Выбраныя творы» (1951, 1958), «Вершы і паэмы» (1955), «Творы» (1961), «Выбраныя вершы і паэмы» (1967).

Валянцін Таўлай плённа працаваў і як перакладчык. Ён перакладаў творы А. Міцкевіча, І. Крылова і інш. Пісаў таксама літаратурна-крытычныя (пра творчасць Я. Купалы і Я. Брыля) і публіцыстычныя артыкулы.

## СКАВАНЫ БУНТАР

Навокал ціш... Звініць ланцуг шнура...
Гарачым тварам я да крат прынік...
Таемна скрозь... А тамака — за мурам —
гучаць шагі — то ходзіць вартаўнік...

Я — малады!
Хачу п'янець прасторам
і араматы траўкі
раскошна удыхаць,
хачу лунаць арлом

над полем і над борам,
хачу кахаць!
Прастору!
Волі мне!
Гэй — месца для разгону!
Я болей не магу
гібець ў астрожным сне.
Тыраны!
Бойцеся бунтарскага праклёну:
праклён скаванага
мільёны ўскалыхне.

## ЛУКІШСКІЯ ВЕРШЫ

Калі наспее ў сэрцы гром
і задрыжаць Лукішкі —
пішу я вершы не пяром,
не ў запісную кніжку.

Тут і агрызак алаўка
недатыкальней табу,
а знойдуць — аднаго чакай:
за ўсё адкажуць скабы!..

Але нашто душой крывіць?
Знайсці — не іх рукамі:
я верш пад ззянне бліскавіц
запісваю у памяць.

Няхай вісіць загад-пятля
і суліць карцэр, голад...
Спалі маланка вас датла,
халодныяназолы!

Я сам і пасядзець магу,
а вершам — часу шкода:
шумець ім трэба на сцягу
і калыхаць паходы.

Глядзі ў ваўчок як дзень, так ноч —
не ўбачыш, чорт зіркаты,
што я заўзята і даўно
пілую вершам краты.

## БАЦЬКУ

Зноў цябе, мой родны, сустракаю
за маўклівай брамаю турмы.
Не такая то сустрэча, не такая,
пра якую летуцелі мы!..

Слова шчырае на вуснах вяне —
ўсё чужыя вушы на віду...
Толькі вочы свецяцца вітаннем,
толькі сэрцы гутарку вядуць.

Ціхі сум апаў табе на вочы,
выглядае з іх і любасць, і дакор,
быццам кажаш: «Сыне, мой сыночак,
ну калі ж ты выйдзеш на прастор?

Вось каторая вясна ўжо будзе
прыбіраць, аквечваць наш садок!
Гэты мур вясну ізноў астудзіць,
замарозіць у карэнні сок...»

Ах, мой любы! Хто ж тугі не знае? —
І ў турме яна разносіць боль...
Толькі ноччу на пасцель, хоць з краю,
сесці пані гэтакай дазволь.

Мы яе, праклятую, ўсё гонім,
каб не путала ні думкі, ні крыла,
і яснеем, калі ў холадзе далоні
пачынаюць зацiскацца і палаць.

Не ў адным мільёне рук заўзятых,
да крыві зацiснутых, ізноў
спее сіла нашае расплаты
з катамі, праклятымі даўно.

Прыйдзе час —
абваліцца пад ломам
гэты мур падточаны, стары
і на першым сонечным праломе
абмяняюцца слязой сябры.

Пот абцёршы, выйдзем, хто не згінуў,
п'яныя ад полымя, ў крыві.

Толькі ты, мой родны, мой адзіны,
да хвіліны гэтай дажыві.

## АБ МАІХ ВЕРШАХ

Маякоўскі па-сяброўску радзіў
не збываць адразу верша з рук:
напісаў — замкні яго ў шуфлядзе,
як адлежыцца — судзі, здавай у друк.

Не забыцца добрае парады,
колькі мог, і пан мне «дапамог»,
замыкаючы замест шуфляды
з вершамі і аўтара ў астрог.

Праўда, іх судзілі — не затоіш —
і шпікі, якога ні вазьмі,
кожны прысягаў на крыж за тое,
што не вершы гэта — дынаміт.

Пракурор праз кодэкса артыкул
углядаўся ў кожны мой радок,
нават пальцам асцярожна тыкаў
і ацэньваў: за радок — гадок.

Адсылаў ізноў ляжаць на нары,
шліфаваць і вершы, і бакі
і аб друку час ад часу марыць:
жыў на свеце Скарына такі...

Наляжаліся — аж скабы забалелі
вершам, аўтару, народу-чытачу.
Вершы многія ад гэтага ссівелі,
многіх — і зусім не далічу...

Толькі аднаго адкінуць нельга:
шліфаваў радок, як сталь звяна;
ланцугі тады на мне звінелі,—
можа, й вершы ад таго звіняць.

* * *

Гэта ўсё — знаёмыя шляхі.
Аглянешся — затанулі ўдалеч.
На адных — палын расце глухі,
на другія — зоры ападаюць.

Пры юнацтве, што здалёк звініць,
і арлы садзіліся ахвоча,
часам — каб да лёту заманіць,
часам — каб выдзёўбваць вочы.

Але мы, ўлюбіўшыся насмерць
у шляхі, пракладзеныя ў заўтра,
навучылі песню разумець,
што ў змаганні і загінуць варта.

Вокам на шляхі куды ні кінь,—
тлеюць косці звестуноў прадвесня
і ляжаць жалобныя вянкі
анямелых з болю верных песень.

Не даклічацца ніякая вясна,—
голас расплывецца ў чыстым полі,
не збудзіўшы стомленага сна
змагароў, загінуўшых за волю.

Але хай высокі маладняк
боль магіл кране карэннем шчырым,—
і насустрач заўтрашняга дня
нашы песні зазвіняць з-пад жвіру.

## МІНУЎ АСТРОЖНЫ ДЗЕНЬ

### 1. Вечар

Апаў паволі цень,
паволі гоман сціх:
мінуў астрожны дзень,
як многа дзён другіх.

Вячэраць я не мог,
вячэра — слоў шкада:
казалі, што гарох,
далі — адна вада.

Пасля прыйшлі жадаць
спакойнае начы:
лічыць і замыкаць
на ўсе замкі, ключы.

Мінуў астрожны дзень,
як многа дзён другіх,
а колькі ж праміне
яшчэ дзянькоў такіх?

### 2. Трызна

Сплыве змрок з-за крат
атрутай на душу...
Не на вясёлы лад
я гэты верш пішу.

Жалоба цень кладзе
на верша тонкі стан:
яшчэ адзін мой дзень
сканаў, як арыштант.

Стаю ля смерці дня —
ля братняе труны:
і доля ў нас — адна,
і крыўды ў нас — адны...

Саджуся я ў журбе
за стол жалобны свой,
і трызны па табе
не спраўлю, браце мой.

## ДА МОЛАДЗІ

Гэй ты, моладзь, гэй ты, моладзь,
Лёс будучы краю!
Хто няшчасце можа здолець?
Толькі ты! — я знаю.

Дык прымі ж ты лёс народу
Да смелага сэрца
І здабудзь яму свабоду,
Не давай памерці.

Вызваль народ ад пакуты,
Пей змагання песню,
І ланцуг, якім мы скуты,
Хутка, хутка трэсне!

## МАСЕЙ СЯДНЕЎ

## (Нарадзіўся ў 1915 г.)

Масей (Майсей Ларывонавіч) Сяднёў нарадзіўся ў вёсцы Мокрае Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Саматэвіцкай сямігодкі вучыўся ў Мсціслаўскім педагагічным тэхнікуме (1930—1932 гг.).

У 1933 г. паступіў на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне Мінскага вышэйшага педагагічнага інстытута, але на апошнім курсе (кастрычнік 1936 г.) быў арыштаваны. Высланы на Калыму, дзе адбыў 5 гадоў у лагерах.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны перавезены ў Мінск на перагляд справы, а ў час акупацыі апынуўся на волі. Жыў у вёсцы Мокрае.

У 1943 г. выехаў у Беласток, затым у Берлін. Спачатку жыў у Германіі, настаўнічаў у беларускай гімназіі ў Міхельсдорфе. У 1950 г. перасяліўся ў ЗША, выкладаў рускую мову ў адным з універсітэтаў штата Індыяна. У 1969—1983 гг. працаваў на радыёстанцыі «Свабода» (Мюнхен, ФРГ). Жыве ў горадзе Глен-Коў (ЗША).

З першымі вершамі і апавяданнем выступіў у друку ў 1933 г. у перыядычных газетах і часопісах.

У час вайны ў Беластоку быў падрыхтаваны зборнік вершаў «Ад сына твайго, Беларусь» (меўся выйсці ў Кёнігсбергу, але згарэў падчас пажару).

Аўтар кніг паэзіі «У акіяне начы» (Рэгенсдорф, 1946), «На край света» (Міхельсдорф, 1947), апавяданні (Рэгенсбург, 1947), «Ачышчэнне агнём» (Глен-Коў, Нью-Йорк, 1985) і раманаў «Раман Корзюк», «І той дзень надышоў».

Ім напісаны ўспаміны пра Янку Купалу і Якуба Коласа.

Усё найбольш значнае, што створана М. Сяднёвым, прысвечана Беларусі і сабрана ў кнізе «Ачышчэнне агнём».

Творы М. Сяднёва вабяць перш за ўсё нацыянальнымі, чыста беларускімі тэмамі, крынічнай мовай, высокімі пачуццямі, з'яднанымі тугой па Радзіме. Яго лірычны герой — сціплы, адкрыты чалавек, з па-сапраўднаму беларускім цярплівым характарам, безаглядна ўлюбёны ў далёкі, але дарагі і незабыўны край.

## АДЗІНСТВА ХАРАСТВА

Свет разнастайны і багаты. Многа
у ім і з'яў, і фарбаў, і прымет.
Але ў блісканні сонца агнявога
адзінствам харáства чаруе свет.

Растуць зялёным морам травы,
пасля дажджоў такая цішыня!
І сонца вогненная слава
нясе ў руках паходню дня.

Як мудрасць звечная стагоддзяў,
яго нам асвятляе шлях.
Зажмурыш вочы на выгодзе —
і свет звініць тады ў вушах.

Зямля імчыць. І ные цела.
З зямлёй плывеш у забыцці.
Мая душа яшчэ не мела
такога шчасця у жыцці.

Нібы радзіўся зноў ты. Яснасць,
і глыбіня нябёс, і пышны цвет.
Гатоў ад радасці рукамі ўсплясчуць —
адзінствам харáства так вабіць свет.

## СОСНЫ

Са ўсіх сіл намагаліся сосны шумець —
мне хацелі паведаць быліну вякоў.
Я маўкліва стаяў, я хацеў зразумець
іх даўгую аповесць без слоў.

Сосны веццем ківалі, вяршыняй траслі
і скідалі кару, нібы медзь.
Я ж маўкліва стаяў — чалавек на зямлі,—
іхнай мовы ніяк я не мог зразумець.

Сосны дыхалі цяжка асілкам-камлём,
пашчапацца на трэскі хацелі яны:
не знаёмы мы з іхнім стагоднім жыццём,—
спіць быліна сівой старыны.

## У ДАРОЗЕ

Падае снег апаўночы,
ліпне на голлі ялін.
Дрэмле маўклівая змрочнасць
ціхіх далін.

Падае снег. Пасцілае
ночцы пасцель на начлег.
Белае поле без краю —
снег і снег.

Поўніцца радасцяй сэрца,
шчасцем нязнаных уцех.
Што гэты снег!
Мне здаецца —
тае ад сэрца снег.

Сэрца маё весяліцца,
б'ецца гарачы ў ім смех.
Сэрцу майму толькі сніцца
белы апоўначы снег.

## ЖЫЦЦЁ

Добра жыць на свеце бесклапотным
і не мець ніякіх нудных спраў,
выйсці ў поле, нахадзіцца, потым
заваліцца ў зелень цёплых траў.

Сонцу ледзь зажмураныя вочы
падстаўляць і чуць яго цяпло.
І тады і верыць нат не хочаш,
што з душы зямное адплыло.

Цешышся сабою і ўсім светам,
разамлеласць спешчаную п'еш.
Мімаволі робішся паэтам,
сам сабою наплывае верш.

...Светлае заносіць лёгкім дымам,
дум няўтомных зноў снуецца ніць.
Бесклапотным быць нам немагчыма,
немагчыма на зямлі не жыць.

## СНЕГАПАД

Развітаўся з табой назаўсёды як быццам я — горда і смела
У завулках завеямі злосна круціла зіма.
Да цябе я не йшоў, хоць і сэрца хацела,—
я чакаў, покуль ты не паклічаш сама.

Цэлы тыдзень у хату маю ветры лютыя білі.
Кажны дзень я ішоў да цябе і вяртаўся назад.
Але раптам спакой лёг на цэлыя мілі,
і уночы пачаўся лагодны, як пух, снегапад.

Раніцою было невымоўна ўсё бела.
Як размочаны цукар, сінявата-халодная гасла імгла.
Чысціні дакрануцца нага нічыя не пасмела,
толькі сцежка адна да парога твайго пралягла.

## РАЗВІТАННЕ З ЛЕТАМ

Яшчэ зямля ў зяленіве жыве
і сонцам жнівеньскім яшчэ сагрэта,
ды бачу я па смуглай сіняве —
канчаецца раптоўна лета.

Нішто да сонца так вясёла не імкне,
і глыбіня нябёс ужо не тая...
Там, на радзіме, ціха без мяне
апошнім цветам краскі адцвітаюць.

Не давялося мне ў палёх пажыць,
пачуць, як сок зямлі ўпіваюць травы.
Злавіць, замёршы сэрцам, ніць
яшчэ нязведанай праявы.

Не давялося мне... Ды што казаць,
мне шмат чаго ў жыцці не давялося.
І толькі сніцца мне азёраў гладзь
ды недаслуханы напеў калосся.

Яшчэ зямля ў зяленіве жыве
і сонцам жнівеньскім яшчэ сагрэта,
ды бачу я па смуглай сіняве —
канчаецца раптоўна лета.

## ДОМІК У МІНСКУ

Драўляны дом, блакітны дом!
Маіх найлепшых мар прытулак!
Ці так жа ўсё сваім акном
глядзіш на вузенькі завулак?

Ці шчасцем ты сваім багат,
ці шашаль сцены твае губіць?
Ці так жа ўсё зялёны сад
тваю ідылію галубіць?

Скажы ты мне, скажы ты мне,
дзе зараз тая, што начамі
малілася сваёй вясне —
такая... з сінімі вачамі?

Ці ёй цяпер, як і тады,
ад нечага ўсё сумна, цяжка?
Як пражывае малады
свой век прыгожая манашка?

Што з ёй цяпер? Свой ціхі сум
яна ў вачох па мне ці носіць?
Гаротнасць цяжкіх яе дум
каго развеяць яна просіць?

Драўляны дом, пястуй свой сон,
гадуй у садзе свой спачынак!
Ты мар найлепшых пантэон,
адзіны дум маіх прыпынак.

# ЛЕАНІД ГАЎРЫЛАЎ
# (1918—1941)

**Леанід Рыгоравіч Гаўрылаў нарадзіўся ў вёсцы Бердаж на Гомельшчыне. Бацька яго працаваў сезонным рабочым. Сям'я вельмі часта пераязджала з месца на месца. І толькі перад самай вайной Гаўрылавы асталяваліся на жыхарства на торфазаводзе «Давыдаўка» каля Гомеля.**

**Вучыўся Леанід вельмі добра і старанна. Атрымаўшы сярэднюю адукацыю, ён паступіў на вучобу ў Мінскі белпедтэхнікум, а потым у Інстытут народнай гаспадаркі. У 30-я гг. пачынаецца яго літаратурная дзейнасць. Вершы**

Леаніда Гаўрылава друкаваліся ў альманаху «Аднагодкі», у газетах «Гомельская праўда» і «Літаратура і мастацтва». Літаратурная справа захапіла маладога паэта, таму ён пераходзіць вучыцца на літаратурны факультэт Гомельскага педінстытута, які заканчвае ў 1940 г. Пасля чаго Леанід Гаўрылаў прызываецца ў армію і служыць на граніцы ў танкавых войсках механікам-вадзіцелем.

Заўчасная смерць не дала паэту на ўсю моц разгарнуць паэтычныя крылы. Акрамя таго, большасць яго твораў загінула ў рукапісах у гады вайны. Асобныя творы паэта змешчаны ў зборніках «Мы іх не забудзем» (1949), «Крывёю сэрца» (1967).

Выйшаў у свет толькі адзіны зборнік вершаў Л. Гаўрылава «Вернасць» (1961), калі яго ўжо не было ў жывых. Зборнік быў складзены дзякуючы маці паэта, якая ў гады ліхалецця здолела зберагчы творы свайго сына.

## МАЛАДЗІК

Спавіты тугою
У пасмах журбы
Сухі маладзік
На галінах вярбы
Павіс над гарою,
А потым і знік.

Журылася матка,
Туманіўся зрок,
І зоры слязамі
Мігцелі здалёк,
Шаптаў ёй здагадку
Шырокі разліў:

— Шмат хваль уцякае,
Іх чуе вярба,
Не ведае іх
Ні вайна, ні журба,
Ім смех нецікавы,
І плач не для іх.

Шмат хваль уцякае
Ў прасторную сінь,
Іх толькі адных
Папытаеш:
— Дзе сын?..

Ды доля цяжкая,
Ці ж скажуць яны?

* * *

Запахнуць ноччу духавітай травы,
Лагоднасцю павее ад ракі,—
І блізкае становіцца яскравым,
Хвалюючым, кранаючым такім.

Бляск месяца, і вішань белых цені,
І пустацвет гарбузны на плятнях
Снуюць запеў, і лёгкім летуценнем
Спавіта песня аб цвітучых днях.

У водары палёў плыве здалёку
Узрушаны і жвавы вобраз твой,
Плыве спакоем зорак яснавокіх
Над вішнямі, над хатай, над травой.

Чаму ж усё сама ты не прыходзіш
На бераг мой, дзе лодкі чарадой
Калышуцца, дзе нізка над вадой
Каліны сняць каханне на выгодзе?

Я жду цябе, паніклыя туманы
Па цёплай разасланіся вадзе,
Дзесь плюхнуў сом, і качкі крык стрыманы
Успалашыў сон дзеркача ў лазе.

Бяскрайнія шумлівыя прасторы
Шмат выткалі квяцістых пуцявін.
І як мне разгадаць тут, па каторай
Ты пройдзеш між узгоркаў і нізін?

Мы ў човен сядзем, плёскатам вясла
Маладзіка разломім палавіну,
Каб лётам смелым, лётам сакаліным
Дужэла песня, спела і расла.

## ПАЭТУ

У пошуках слоў
глыбіні пачуццёвай,
Каб выказаць шчырыя
думкі свае,—

Я часта хвалююся
    ў віры жыццёвым,
А поўнасці цэльнай
    ніяк нестае.

І зараз я слоў
    не знайду ў хваляванні,
Сказаць вам ад сэрца,
    па-простаму так,
Каб вы адчувалі
    маё прывітанне,
Як вашу спагаду
    шануе юнак.

Мо я не паэт,—
    хараствам славасека
Не ўмею за выдумкай
    плюшчыць павек.
Я бачу ў паэце, у вас,
    чалавека
І хочу сказаць гэта
    як чалавек.

Прабачце нязграбнасці
    гэтага верша
(Пяру маладых
    уласцівы яны),
Радкі мае —
    кволыя водпрыскі першай,
Зялёнай маёй
    паэтычнай вясны.
. . . . . . . . . . . . . . .
Мне помніцца першая
    наша сустрэча.
А гэта зусім так
    нядаўна было.
Я гэтак наіўна
    і так недарэчы
Прыехаў сюды,
    занядбаўшы сяло.

І ваша адна
    чалавечая чуласць
Жывіла, вяла,
    акрыляла мяне!

Пагэтаму зараз
так шчыра хачу я
Узнесці яе
за вясну
па вясне!

## АЛЯКСЕЙ КОРШАК
## (1920—1945)

Аляксей Ігнатавіч Коршак нарадзіўся на Случчыне, у вёсцы Вуглы Капыльскага раёна Мінскай вобласці.

Коршак пачаў пісаць вершы яшчэ ў дзесяцігодцы, яго першыя вершы былі змешчаны ў газеце «Літаратура і мастацтва».

У 1938 г. ён пастулае на літаратурны факультэт Мінскага педінстытута імя Максіма Горкага, дзе вучыцца тры гады. Будучы ў інстытуце, Аляксей многа працуе над сабой, захапляецца мовай, літаратурай і іншымі навукамі. Студэнты жартаўліва называлі свайго сябра «хадзячай энцыклапедыяй». Доўгі час ён рэдагаваў літаратурны часопіс інстытута. Аляксей меў цудоўны характар, празрыстую душу. Ён наскрозь свяціўся нейкай незвычайнай дабрынёй, быў вельмі шчырым у адносінах да сяброў, разумным і простым чалавекам. Ён быў завадатарам літаратурных вечароў, якія заўсёды праходзілі ажыўлена і цікава.

Вершы А. Коршака вызначаюцца асаблівым шчырым лірызмам, сардэчнай цеплынёй. Гэта творы пра вялікае сяброўства, студэнцкае жыццё, юнацкія пачуцці, красу маладосці. Аляксей Коршак па складу свайго паэтычнага таленту быў найбольш блізкі Максіму Багдановічу, у яго ён вучыўся майстэрству, яму прысвяціў адзін з лепшых сваіх вершаў.

У час Вялікай Айчыннай вайны Аляксей Коршак быў разведчыкам, але малады паэт не спыняў творчай працы. Цяжкія выпрабаванні, суровыя абставіны баявога жыцця для маладога паэта з'явіліся крыніцай творчага росту.

Загінуў Аляксей Коршак ва Усходняй Прусіі.

Малады паэт пакінуў невялікую спадчыну — асобныя вершы змешчаны ў калектыўных зборніках «Мы іх не забудзем» (1949), «Крывёю сэрца» (1967). Асабісты зборнік паэта выйшаў у 1963 г.— «Апаленыя пялёсткі». Талент

**Аляксея Коршака, на жаль, не паспеў расквітнець. У творах паэта выяўляецца высакародная душа маладога чалавека нашай эпохі.**

## МАКСІМ БАГДАНОВІЧ

Б'ецца мора аб бераг дзікае,
Пер'е пены губляе скрозь.
Зноў з тугою, як свет, вялікаю
Ён прыйшоў сюды з краю кроз*.

Кіпарысы вакол, як волаты.
Вецер гне іх і не сагне.
Кінься ўдалеч і стрэнеш волю ты
Ці на хвалях, ці мо на дне.

Блудзіць погляд жывымі далямі...
Што там бліснула на скале?
Белы ветразь мільгнуў між хвалямі
І у пеннай растаў імгле.

Можа, гэта Страціму-лебедзю
Расставанне з жыццём прыйшло?
Ці патала ў сухотах з'едзенай
Маладосці твае крыло?

З дарагімі юнацтва рысамі
Адыходзіць яна без слёз...
Вузкаплечымі кіпарысамі,
Здэцца, свет тут увесь зарос.

А далёка, дзе край азёрамі
Заглядзеўся у неба сінь,
Ночы сыплюць густымі зорамі,
Ветры сцелюць лісцё асін.

Скарга, лепшую долю хвалячы,
Высцілае прастораў гладзь.
Трэба, трэба у тыя далечы
Песню славы, як гром, паслаць.

Б'ецца мора аб бераг дзікае,
Дык тугу ад сябе гані,
Хай палаюць ярчэй вялікія
Залатыя жыцця агні.

Несучы у душы ўзрушанай
Мора сіняга грозны гнеў,
Ён прыбег у пакой аглушаны,
Ён за столік з паперай сеў.

І калі ён, ад кашлю стомлены,
Адышоў ад гарачых слоў,
На паперы гарэлі полымем
Палкі верш і жывая кроў.

## ЖУРАВІНЫ

Тут зара, як хустка, палыхала,
Воблакам барвовым плыў усход.
Як упала ў возера — прапала,
Патанула ў глыбі сонных вод.

Дзень высокі ўстаў на пуцявінах,
Толькі засталіся ў бары
Спелыя, як ранак, журавіны —
Кроплі патануўшае зары.

## ВЕЧАР

Белы месяц локцем на сасну
Абапёрся й думае аб нечым.
На руках калышучы вясну,
У пратсторах марыць шэры вечар.

Белакрылых зорак сотні стай
Паплылі павольна над крыніцай.
Абступіў раку высокі гай,
Хоча срэбнай свежасці напіцца.

Цішыня бязмоўная плыве,
Апускаецца ў кустах ракіты.
Сук бярозы, падаючы, рве
На кускі рачныя аксаміты.

Часам птушка спуджана ўзляціць
Над густою роснай асакою.
Хараства другога не знайсці,
Тону ў шчасці гэтым з галавою.

## ЛАСТАЎКА

Простае, звычайнае здарэнне.
Думы ж! Паспрабуй іх супыні.
З поўным песень радасных бярэмем
Ластаўка мільгнула ў вышыні.

Погляд твой сачыў за ёй: стралою
Жвава праімчалася яна.
Села на вяршку кудлатай хвоі,
Вырасшай ля самага акна.

Ціха пасядзела. Спачывання
Доўга не сцярпела. Ў вышыню
Успырхнула і ў сінім акіяне
Песні панясла насустрач дню.

Шчасная, ў паветраных абшарах
Весела купалася яна.
Потым знікла ў небе, нібы мара,—
Сіняя ўтапіла вышыня.

Знікнула... Ты поглядам за ёю
Доўга ў далі ясныя плыла.
Сэрца агарнулася тугою
Лёгкаю, як майская імгла.

Мілага, напэўна, вобраз любы
Дум паклікаў сонечных палёт...
Дзе ён, чарнавокі, чарначубы,
Сёння свой кіруе самалёт?

Мо над сенажаццю ці шырокім
Морам зелянеючай тайгі...
Як ляціць ён — нізка ці высока,
Сумны ці вясёлы, дарагі?

Пэўна, шлях любімаму далёкі,
Гэткі, як і ў радасным жыцці,
Хутка ці няхутка чарнавокі
Любую пабачыць прыляціць?

Простае, звычайнае здарэнне:
Ластаўка мільгнула — і ўсяго.
Колькі ж незвычайных летуценняў,
Клопатаў і думак — ад таго.

## У ЛЕСЕ

Лізне агонь чырвоным языком
У твар імглу, і тая ўбок адходзіць,
І падыходзіць зноў яна. Кругом
Аб нечым шэпча, нейкі шорах водзіць.

Маўкліва сосны мараць навакол,
На медзі іх камлёў святло і цені.
І адзінокі дуб ўпёрся ў дол
Упаў прад ім ядловец на калені.

Глядзяцца зоры зверху ў гэты лес.
О, як забыць пра гэтую хвіліну:
Шчарбаты месяц вышай лез і лез
І зачапіўся краем за хваіну.

І скрозь спакойна. Скрозь тут ціш і ціш —
У травах росных і ў празрыстых зорах.
Яна паўзе ад хвой да ног маіх,
Глынае кожны гук і кожны шорах.

І я, што ў песнях славіў гоман той,
Шукаў уцехі ў гуле, ў воч ірдзеннях,
Сяджу ўначы і п'ю ўначы спакой
І зорак ясных зорнае натхненне.

## СЛОЎНІК

**абжэ́нь** — абгані
**абло́нь** — заліўны луг
**асві́р** — журавель калодзежа
**ба́шта** — вежа
**бро́сня** — плесня
**бурно́с** — традыцыйная верхняя вопратка з даматканага сукна
**буса́йла** — п'яніца, гуляка
**валато́ўка** — высокае пясчанае месца
**віці́на** — дубец
**вы́пруціцца** — памерці
**габдзю́р** — кіпцюр
**га́рнец** — мера сыпкіх і вадкіх цел, роўная 3,28 літра
**гіге́ль** — хвошч
**гну́шка** — накрыўка
**го́нцы (го́ні)** — старая мера ворнай зямлі ад 50 да 100 м
**жале́знікі** — чыгуны
**загне́т** — прыпечак
**загрышпа́леныя** — пазелянелыя ад старасці
**замаглява́лася** — забылася
**згелк** — шум
**ка́йстра** — дарожная торба
**канты́чка** — зборнік каталіцкіх царкоўных песень
**капагі́** — рыдлёўкі
**ква́рта** — мера вадкіх і сыпкіх рэчываў, роўная чацвёртай часткі га́рца (га́рнец)
**кро́зы** — летуценні, мары
**лагані́ць** — гаварыць, балабоніць
**ліха́рдзікі** — прысмакі
**лёх** — падзямелле, склеп
**маляту́ры** — насценныя малюнкі, фрэскі
**манапо́лька** — дзяржаўная крама, у якой прадавалі гарэлку
**мару́ха** — мядзведзь
**масяжо́выя** — латунныя
**мэ́дзіцца** —важдацца, валаводзіцца
**на́брыдзь** — чужыя людзі, непрыемныя для мясцовых жыхароў перасяленцы

**насе́ка** — прылада дрывасекаў
**нэ́ндза** — галеча, беднасць
**паку́рці** — сабакі
**палаві́чнік** — арандатар
**пла́хта** — посцілка
**пляба́н** — пробашч, які кіруе вясковай парафіяй
**поле́р** — свецкая выхаванасць, лоск
**прашка́піцца** — правініцца
**про́спа** — абуджэнне
**прысо́к** — гарачы попел
**радно́** — тоўстае палатно з грубай льняной пражы
**ры́мка** — струна скрыпкі
**ска́лкі** — тлушчавыя кроплі ў страве
**скара́ч** — ручнік з доўгімі махрамі
**скрыдэ́лка** — крыльца
**смагле́й** — хутчэй
**спана́трыць** — скеміць, прызвычаіцца рабіць што-небудзь
**спудлава́ць** — схібіць, зрабіць промах; спудзіць, спалохаць
**стадо́ла** — хлеў, гумно, стайня на заезным двары
**тра́нты** — лахманы, старая падраная адзежа
**трафу́нак** — выпадковасць, знарочыстасць
**тру́нкі** — ласункі
**турба́цыя** — турботы, клопаты
**уваві́ць** — з'есці
**угру́нь** — імкліва, стрымгалоў
**уле́ва** — праліўны дождж
**хусцё** — бялізна
**це́шка** — свіння
**ціцюля́ць** — бегаць
**цно́та** — маральная чысціня
**чэрэ́н** — месца на печы каля коміна
**шак жа ж** — аднак
**шалыга́н** — шалапут
**шны́парыцца** — корпацца, поркацца
**шо́ран** — шэрань

## ЗМЕСТ

*Вяртанне да крыніц. І. Ківель* . . . . . . . . . 3
**Ян Чачот** . . . . . . . . . . . . . . . 7
*** А мая ж ты кветачка . . . . . . . . 8
*** Поле, поле шырокае... . . . . . . . . —
*** Калі ў зямлю зерне кінеш... . . . . . . 9
**І. Легатовіч** . . . . . . . . . . . . . . 10
Скажы, вяльможны пане... . . . . . . . . —
**В. Дунін-Марцінкевіч** . . . . . . . . . . —
Залёты . . . . . . . . . . . . . . . 12
**Ф. Савіч** . . . . . . . . . . . . . . 41
Дзе ж тое шчасце падзелася?.. . . . . . . 42
**А. Вярыга-Дарэўскі** . . . . . . . . . . 43
Думка . . . . . . . . . . . . . . . 44
*** Бо шчасце, бо долю... . . . . . . . . 45
**У. Сыракомля** . . . . . . . . . . . . . —
Смерць салоўкі . . . . . . . . . . . . 46
Паштальён . . . . . . . . . . . . . . 47
Што ўмею намаляваць . . . . . . . . . 49
**В. Каратынскі** . . . . . . . . . . . . . 50
Дзве будоўлі . . . . . . . . . . . . . 51
Уставайма, братцы!.. . . . . . . . . . . 53
*** Хочаш вялікае штосьці сатварыць... . . . . 54
**Ф. Багушэвіч** . . . . . . . . . . . . . —
*** Прэч бутэлькі, люлькі, карты!.. . . . . . 56
Калыханка . . . . . . . . . . . . . . —
Песня . . . . . . . . . . . . . . . . 58
Воўк і авечка . . . . . . . . . . . . . —
Сведка . . . . . . . . . . . . . . . 59
Палясоўшчык . . . . . . . . . . . . . 61
**А. Абуховіч** . . . . . . . . . . . . . 62
Воўк і лісіца . . . . . . . . . . . . . 64
Суд . . . . . . . . . . . . . . . . 65

Старшына . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 65
**Я. Лучына** . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
Дзень за днём . . . . . . . . . . . . . . 67
Старасць не радасць... . . . . . . . . . . 68
З паэмы «Ганузя» . . . . . . . . . . . . 70
**К. Лейка** . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
Кульгавы дзядзька Раман . . . . . . . —
На надворку і ў хаці . . . . . . . . . . 75
Юрко і бусел . . . . . . . . . . . . . . 76
Бчолы . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77
**Стары Улас** . . . . . . . . . . . . . . . . —
Не спанатрыў . . . . . . . . . . . . . . 78
У дажджлівы час . . . . . . . . . . . . 82
Боязна . . . . . . . . . . . . . . . . . . 83
**К. Каганец** . . . . . . . . . . . . . . . . —
Засульскія Турэ . . . . . . . . . . . . . 84
Вітаўка . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
Прылукі . . . . . . . . . . . . . . . . . 87
Навасадскае замчышча . . . . . . . . . . 89
*** Ветры буйныя загулялі... . . . . . . . . 90
Наш сымболь . . . . . . . . . . . . . . . 91
**Ядвігін Ш.** . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Шчаслівая . . . . . . . . . . . . . . . . 92
Васількі . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
Дзед Завала . . . . . . . . . . . . . . . —
**А. Гурыновіч** . . . . . . . . . . . . . . . 99
*** Дзякуй табе, браце, Бурачок Мацею... . . 100
Бор . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
**А. Паўловіч** . . . . . . . . . . . . . . . 102
Родныя малюнкі . . . . . . . . . . . . . 103
Маладая гаспадынька . . . . . . . . . . 104
Лепшая рада . . . . . . . . . . . . . . . 105
Раманс . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
**Цётка** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
*** Скора прыйдзе вясна . . . . . . . . . 107
Лес . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 108
Восень . . . . . . . . . . . . . . . . . . 110
Лета . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 111
**Г. Леўчык** . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Мая прадмова . . . . . . . . . . . . . . 112
*** Не нам, беларусам, не нам... . . . . . . —
Годзе! . . . . . . . . . . . . . . . . . . 113
*** Не бачыў цябе я ніколі... . . . . . . . —
Мы жывём надзеяй... . . . . . . . . . . —
Жальбай зноў спатыкаю вясну... . . . . . 114

Ніхто маіх не знае слёз... . . . . . . . . . . . . —
Чаго ж я ў журбе... . . . . . . . . . . . . —
Школьны званок . . . . . . . . . . . . . 115
*** Хто адрокся сваіх... . . . . . . . . . . . —
**Я. Журба** . . . . . . . . . . . . . . . . . . 116
Перад святам . . . . . . . . . . . . . . 117
Да роднай краіны . . . . . . . . . . . . 119
Усход сонца . . . . . . . . . . . . . . —
Адрадзілася прырода . . . . . . . . . . . 120
За Айчыну . . . . . . . . . . . . . . . 121
У купальскую ноч . . . . . . . . . . . . —
Як люблю я цябе, Беларусь! . . . . . . . . 122
**У. Галубок** . . . . . . . . . . . . . . . . . 123
Вясковыя астраномы . . . . . . . . . . . 125
Адукаваная кабыла . . . . . . . . . . . . 126
Сляды старыны . . . . . . . . . . . . . 128
Чужое смачней . . . . . . . . . . . . . . 129
Смерць старца . . . . . . . . . . . . . . 130
**Я. Купала** . . . . . . . . . . . . . . . . . . 133
За свабоду сваю . . . . . . . . . . . . . 135
*** Хоць ты, сэрца, лопні, трэсні... . . . . . . —
Сярод раз'юшаных сатрапаў... . . . . . . . . 136
Там . . . . . . . . . . . . . . . . . 137
Выйдзі . . . . . . . . . . . . . . . . 138
Яна і я . . . . . . . . . . . . . . . . 139
На куццю . . . . . . . . . . . . . . . 152
**Я. Колас** . . . . . . . . . . . . . . . . . . 158
Залаты прамень . . . . . . . . . . . . . 160
Стары лес . . . . . . . . . . . . . . . 164
Балотны агонь . . . . . . . . . . . . . 168
Покліч . . . . . . . . . . . . . . . . 170
Поле . . . . . . . . . . . . . . . . . 171
Тры жаданні . . . . . . . . . . . . . . —
На полі вясною . . . . . . . . . . . . . 172
На адзіноце . . . . . . . . . . . . . . 173
**В. Ластоўскі** . . . . . . . . . . . . . . . . . 175
Вясковыя археолёгі . . . . . . . . . . . 176
Троцкі замак . . . . . . . . . . . . . . 180
Прывід . . . . . . . . . . . . . . . . 183
**М. Грамыка** . . . . . . . . . . . . . . . . . 185
Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . 186
Апошняе даруй . . . . . . . . . . . . . 187
Янку Купалу . . . . . . . . . . . . . . 188
Ліпень . . . . . . . . . . . . . . . . 189
**Зм. Бядуля** . . . . . . . . . . . . . . . . . —

Дзень добры! . . . . . 190
Мары паэта . . . . . 191
Зімовая казка . . . . . —
*** Ад плачу птушкі невядомай... . . . . . 192
*** Думкі апоўначы — кветкі расістыя... . . . . . 193
Вясной . . . . . —
Кветка . . . . . 194
Шаптаў чарот . . . . . 195

**А. Гарун** . . . . . —
Мае думкі . . . . . 196
Шчасце Мацея . . . . . 197
Спрэчка . . . . . 202
Хатка . . . . . 203
Песня . . . . . 204

**Ц. Гартны** . . . . . 205
Клянінка . . . . . 206
Да надзеі . . . . . —
*** Мець бы жыццё бессмяротнае мне... . . . . . 207
Сымонка-інжынер . . . . . —
Дойдзем, сынок . . . . . 214

**В. Адважны** . . . . . 217
Спрэчка пад касьцёлам . . . . . 218
Перапісь у вёсцы Луконіцы 1921 г. . . . . . 228

**К. Сваяк** . . . . . 231
Брату настаўніку . . . . . 232
Не чаруй . . . . . —
Загляне сонца... . . . . . —
Шчасце . . . . . 233

**С. Палуян** . . . . . 234
Вёска . . . . . —
Хрыстос уваскрос! . . . . . 236
Калі друкавалася першая беларуская «Біблія»? . 238

**М. Багдановіч** . . . . . 239
Максім і Магдалена . . . . . 240
У вёсцы . . . . . 243
Возера . . . . . 245
На чужыне . . . . . —
Варона і чыж . . . . . 246

**А. Гурло** . . . . . —
Ахвяра . . . . . 247
Паднявольная вясна . . . . . 248
Колькі мукі . . . . . —
Мая песня . . . . . 249
Мора . . . . . —
Замкавая гара . . . . . 250

**З. Верас** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 251
Для нашых прыяцеляў . . . . . . . . . . 252
Я не баюся . . . . . . . . . . . . . . . 253
*** Беларусь, ты краю родны!.. . . . . . . . . —
**М. Гарэцкі** . . . . . . . . . . . . . . . . . 254
Малацьба . . . . . . . . . . . . . . . 255
Князёўна . . . . . . . . . . . . . . . 258
Паясок . . . . . . . . . . . . . . . . 259
У чым яго крыўда? . . . . . . . . . . . . 260
**А. Мрый** . . . . . . . . . . . . . . . . . 267
Няпросты чалавек . . . . . . . . . . . 268
Колектыў Яўмена . . . . . . . . . . . . 279
**І. Дварчанін** . . . . . . . . . . . . . . . 289
Дзвіна . . . . . . . . . . . . . . . . . —
«Толькі проза» . . . . . . . . . . . . . 290
**Л. Родзевіч** . . . . . . . . . . . . . . . 291
Заклік . . . . . . . . . . . . . . . . . 292
Мінуўшчына . . . . . . . . . . . . . . 293
*** Беларусь мая мужыцкая... . . . . . . . —
Беларуская казка . . . . . . . . . . . . 294
О мудрасць! . . . . . . . . . . . . . . 296
*** Хто душой і шчырым сэрцам... . . . . . 297
**К. Крапіва** . . . . . . . . . . . . . . . . 298
Заява . . . . . . . . . . . . . . . . . 299
Вол і Авадзень . . . . . . . . . . . . . 300
Стары і Малады . . . . . . . . . . . . . 301
Давялося свінні на неба глядзець... . . . . . 302
**М. Чарот** . . . . . . . . . . . . . . . . . 303
Звон . . . . . . . . . . . . . . . . . . 304
*** Я пясняр лясоў, балота... . . . . . . . 305
Босыя на вогнішчы . . . . . . . . . . . —
**К. Буйло** . . . . . . . . . . . . . . . . . 318
То не песня... . . . . . . . . . . . . . 319
*** Ціхім гоманам гордых вяршынь... . . . . . —
Лебядзіная песня . . . . . . . . . . . . 320
Курган . . . . . . . . . . . . . . . . . —
*** Дзе Вілья у Нёман ліе свае хвалі... . . . . 322
Курганная кветка . . . . . . . . . . . . 323
**А. Моркаўка** . . . . . . . . . . . . . . . —
Я жыў . . . . . . . . . . . . . . . . . 324
Стукні ў дзверы . . . . . . . . . . . . . 325
Золак . . . . . . . . . . . . . . . . . 326
**У. Жылка** . . . . . . . . . . . . . . . . —
Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . 328
Дзед . . . . . . . . . . . . . . . . . . —

*** Толькі той, чый вольны дух... . . . . . . . . 329
Маёй маці . . . . . . . . . . . . . . . . 330
*** Месячыку-месяц... . . . . . . . . . . . 332

**У. Дубоўка** . . . . . . . . . . . . . . . . —
Лісіца, Леў і Воўк . . . . . . . . . . . . 334
Вяльможны Пых . . . . . . . . . . . . . 335
Дождж у Мазыры́ . . . . . . . . . . . . 338
Яна пасыпала на дошчачку зярнятак . . . . . 339
Вялікі кошык падняла матуля . . . . . . . —

**С. Баранавых** . . . . . . . . . . . . . . . —
Хлопчык Петручок . . . . . . . . . . . . 340
Раніцаю . . . . . . . . . . . . . . . . 344

**М. Зарэцкі** . . . . . . . . . . . . . . . . 348
Чаплюк . . . . . . . . . . . . . . . . . —
У Саўках . . . . . . . . . . . . . . . . 354

**Я. Пушча** . . . . . . . . . . . . . . . . . 359
Снежаньская свежасць . . . . . . . . . . 360
Ліст да паэтаў . . . . . . . . . . . . . —
Чаму так сэрца любіць? . . . . . . . . . . 362
Дажынкавае . . . . . . . . . . . . . . . —
Я раніцы кланяўся ў пояс . . . . . . . . . 363

**М. Машара** . . . . . . . . . . . . . . . . —
Роднае поле . . . . . . . . . . . . . . . 364
Жніва . . . . . . . . . . . . . . . . . 365
Клён . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Вёсцы . . . . . . . . . . . . . . . . . 366
Званар . . . . . . . . . . . . . . . . . 367

**М. Явар** . . . . . . . . . . . . . . . . . 368
Паклон чалавечаму страданню . . . . . . . —

**Т. Кляшторны** . . . . . . . . . . . . . . . 369
*** Завечарылася бярозавая просінь... . . . . . 370
Успамін . . . . . . . . . . . . . . . . —
*** Аб чым шумяць над возерам бярозы?. . . . . 371

**П. Галавач** . . . . . . . . . . . . . . . . 372
Не так . . . . . . . . . . . . . . . . . 373
Навела без назвы . . . . . . . . . . . . 375

**Н. Арсеннева** . . . . . . . . . . . . . . . 383
Пралескі . . . . . . . . . . . . . . . . 384
Пытанне . . . . . . . . . . . . . . . . 385
Вясёлка . . . . . . . . . . . . . . . . —
Лебядзіная песня . . . . . . . . . . . . . 386
У гушчарах . . . . . . . . . . . . . . . 387
Малітва . . . . . . . . . . . . . . . . —

**П. Трус** . . . 388
Як пажоўкнуць лісты . . . —
*** Зіма... І золкія завеі... . . . 391
Трыялеты . . . 393
У нядзелю . . . —
*** То не гул завірухі мяцежнай... . . . 394
*** Плакалі ветры ў дуброве параненай... . . . 395
**У. Хадыка** . . . —
*** Дрыжыць, калоціцца дрыгва... . . . 396
*** Я доўга і ўпарта марыў... . . . 397
*** Абрысы старадаўняй пушчы... . . . —
**М. Васілёк** . . . 398
*** Што плачаш, песня?.. . . . 399
Там краіна мая . . . —
За працай . . . 400
Віхор . . . 401
Ой, не вечна... . . . —
**С. Новік-Пяюн** . . . 402
Зорачкі . . . 403
Казка . . . 404
Жыццё . . . —
Зіма . . . 405
**А. Салагуб** . . . —
Восень у астрозе . . . 406
*** Я не буду грудзьмі надрывацца . . . 407
А хто ў полі?.. . . . —
**А. Звонак** . . . 408
Цень Ефрасінні . . . 409
*** Плывуць над полем журавы... . . . —
*** Асенні холад, стынь і бездарожжа... . . . 410
Дзвіна . . . 411
**Ф. Каравацкі** . . . 412
Голас з Лукішак . . . —
Садоўшчына . . . 413
**Э. Самуйлёнак** . . . 414
Урачыстая меса . . . 415
**В. Каваль** . . . 420
Мацней за смерць . . . 421
Як вясну гукалі . . . 426
**Ю. Лявонны** . . . 430
Зімовая радасць . . . —
Не схіляюся . . . 431
**А. Мілюць** . . . —
Яшчэ ўзыдзе сонца . . . 432
Покліч . . . —

З родных песень . . . . . . . . . . . . . . 432
Брату . . . . . . . . . . . . . . 433
**М. Засім** . . . . . . . . . . . . . . —
Вясна . . . . . . . . . . . . . . 434
На з'езд заходніх беларускіх пісьменнікаў у г. Вільна ў 1933 г. . . . . . . . . . . . 435
Ліст з турмы . . . . . . . . . . . . . —
**С. Дарожны** . . . . . . . . . . . . . 436
Пад высокім сонцам . . . . . . . . —
Веснавое . . . . . . . . . . . . . 437
*** Ніяк за імі не паспець... . . . . . . . . 438
**В. Маракоў** . . . . . . . . . . . . 439
*** Эх, прастор сінякудрых палёў... . . . . . —
*** Зялёны месяц над ракою... . . . . . . . . 440
Таварыш Нюрын . . . . . . . . . . . 441
**П. Граніт** . . . . . . . . . . . . . —
Хітры асаднік і мужык-здагаднік . . . . . . 442
Хачу спаткаць вясну . . . . . . . . . 443
**С. Крывец** . .. . . . . . . . . . . . . —
Дубок . . . . . . . . . . . . . 444
Чаму не йду ў літаратуру . . . . . . . 445
Мы жывём . . . . . . . . . . . . 447
*** Аплакаў долю я сваю... . . . . . . . . 448
Аднойчы . . . . . . . . . . . . —
**Л. Калюга** . . . . . . . . . . . . 449
Трахім — штучны чалавек . . . . . . . . . . —
**Л. Геніюш** . . . . . . . . . . . . . 457
Мой лён і сны . . . . . . . . . . . 459
Нішто так не міла . . . . . . . . . . 460
Ёсць край адзін . . . . . . . . . . . —
Ефрасіння Полацкая . . . . . . . . . 461
*** Не згінай мяне, я не сагнуся... . . . . . . 462
Дзяды . . . . . . . . . . . . . . 463
Родная мова . . . . . . . . . . . 464
Тры дарогі . . . . . . . . . . . . 465
**А. Жаўрук** . . . . . . . . . . . . . 466
Песенька . . . . . . . . . . . . . 467
Туга . . . . . . . . . . . . . . 469
**З. Астапенка** . . . . . . . . . . . . 470
На шчасце песень . . . . . . . . . . 471
Лес . . . . . . . . . . . . . . 472
*** Высокі дом, шчаслівы дом... . . . . . . . 473
*** Добры дзень, мая красуня . . . . . . . 474
**А. Дубровіч** . . . . . . . . . . . . 475
Мы . . . . . . . . . . . . . . . 476

Кіну свае думы . . . . . . . . . . . . . . . . 476
Восень . . . . . . . . . . . . . . . . . . 477
**Я. Чабор** . . . . . . . . . . . . . . . . . 478
*** Гэй, арліна мая сіла... . . . . . . . . . . . —
**Ю. Таўбін** . . . . . . . . . . . . . . . . . 479
Вясна . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
*** Панарама лясоў і балот... . . . . . . . . . 480
*** Люблю я край, дзе вечары... . . . . . . . . —
**В. Таўлай** . . . . . . . . . . . . . . . . . 481
Скаваны бунтар . . . . . . . . . . . . . . . 482
Лукішскія вершы . . . . . . . . . . . . . . 483
Бацьку . . . . . . . . . . . . . . . . . . 484
Аб маіх вершах . . . . . . . . . . . . . . . 485
*** Гэта ўсё — знаёмыя шляхі... . . . . . . . . —
Мінуў астрожны дзень . . . . . . . . . . . . 486
Да моладзі . . . . . . . . . . . . . . . . 487
**М. Сяднёў** . . . . . . . . . . . . . . . . . 488
Адзінства хараства . . . . . . . . . . . . . 489
Сосны . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
У дарозе . . . . . . . . . . . . . . . . . 490
Жыццё . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Снегапад . . . . . . . . . . . . . . . . . 491
Развітанне з летам . . . . . . . . . . . . . —
Домік у Мінску . . . . . . . . . . . . . . . 492
**Л. Гаўрылаў** . . . . . . . . . . . . . . . . —
Маладзік . . . . . . . . . . . . . . . . . 493
*** Запахнуць ноччу духавітай травы... . . . . 494
Паэту . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
**А. Коршак** . . . . . . . . . . . . . . . . . 496
Максім Багдановіч . . . . . . . . . . . . . . 497
Журавіны . . . . . . . . . . . . . . . . . 498
Вечар . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Ластаўка . . . . . . . . . . . . . . . . . 499
У лесе . . . . . . . . . . . . . . . . . . 500
Слоўнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . 501

Вучэбнае выданне

**Першацвет адраджэння**

**Вучэбны дапаможнік па беларускай літаратуры для старэйшых класаў сярэдняй школы**

Складальнікі:

**Федасеенка** Марыя Аляксееўна, **Прохарава** Таццяна Паўлаўна, **Разанава** Галіна Мікалаеўна, **Марчук** Георгій Васільевіч, **Новікава** Аліна Сяргееўна, **Садаўнічы** Эдуард Васільевіч.

Загадчык рэдакцыі *А. А. Дзераш.* Рэдактары *Л. В. Цікунова, С. С. Аніскевіч.* Вокладка мастака *М. Рыжага.* Мастацкі рэдактар *Р. І. Красінскі.* Тэхнічны рэдактар *С. І. Ліцкевіч.* Карэктары *Т. М. Вядзернікава, С. Т. Асташэвіч, В. С. Бабеня, С. А. Яновіч.*

Здадзена ў набор 29.08.94. Падпісана ў друк 19.01.95. Фармат $84\times108^{1}/_{32}$. Папера друк. № 1 Гарнітура літаратурная. Высокі друк з ФПФ. Умоўн. друк. арк. 26,88. Умоўн. фарба-адбіт 27,3. Ул.-выд. арк. 27,91 Тыраж 67 000 экз. Заказ 1314.

Выдавецтва «Народная асвета» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 4. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

# ПЕРШАЦВЕТ АДРАДЖЭННЯ